Каспусь Цвірка

ЛІСЦЕ ЗАБЫТЫХ АЛЕЯЎ

SHOUT
SHARE
IT

Annotation

Гэта кніга вандраванняў, кніга неспадзеўных дарожных сустрэч і прыгод. Але тут — падарожжа не ў нейкія экзатычныя краіны, а. па далёкіх і блізкіх кутках нашай, здавалася б, такой знаёмай і адначасова такой незнаёмай Беларусі. Аўтар у розны час аб'ездзіў мясціны, звязаныя з біяграфіямі вядомых паэтаў Я. Чачота, У. Сыракомля Ф. Багушэвіча, Я. Купалы і інш., і гіра ўсё, што бачыў і чуў у дарозе, пра былі і паданні роднай зямлі жыва і ўзнёсла расказаў у сваіх мастацкіх нарысах.

-
-
-

Кастусь Цвірка

Лісце забытых алеяў

Эсэ

О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,
Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы...

Уладзімір Караткевіч

Там возера Свіцязь як шыбіна лёду.

МАЛЮШЫЧЫ

Паўз дарогу — перакапаныя, у грудах палі-бульбянішчы з пабэрсаным-параскіданым цяўнікам, усё яшчэ жоўтыя, хоць і добра парадзелыя бярозавыя пералескі пад цёплаю ватаю аблачын, пасівелыя лапіны ўшчэнт скапычаных каровамі паплавоў, на якіх часам выхапіць вока бруднавата-рыжага, з ваўчкамі ў грыве, каня, выпушчанага некім на волю.

У гэту дарогу мы збіраліся яшчэ з вясны.

Сама ж задума падарожжа ўзнікла ў мяне значна раней. Тады, калі мяне захапіла, пацягнула ў кнігасховішчы і архівы гэта, шмат у чым загадкавае імя ў нашай літаратуры — Ян Чачот.

У 1855 годзе Уладзіслаў Сыракомля казаў, што яму вядомы толькі два пісьменнікі, якія пісалі па-беларуску: «...адным з іх быў незабыўнай памяці Ян Чачот, другі — В. Дунін-Марцінкевіч». Першыя беларускія вершы Я. Чачот напісаў недзе каля 1818 года. Дунін-Марцінкевіч жа пачаў літаратурную дзейнасць значна пазней, у саракавых гадах, калі Ян Чачот яе ўжо заканчваў. Ян Чачот быў для Дуніна-Марцінкевіча пуцяводнай зоркай, першапраходцам у раскарчоўцы ўдзірванелай беларускай нівы. І, вядома ж, не толькі для Дуніна-Марцінкевіча. Цяжка наогул пераацаніць значэнне гэтага прыкладу для развіцця беларускай літаратуры. Гэта быў сапраўдны подзвіг: на мове цёмнага і зацюканага беларускага мужыка, якога і за чалавека не лічыла ганарлівае панства, не пасаромеўся пісаць радавіты шляхціц! Ды і не абы-які шляхціц, а сам Ян Чачот, адзін з кіраўнікоў шырокавядомага таварыства філаматаў, першы сябра вялікага Адама Міцкевіча!..

Узяўшыся хоць як-небудзь асвятліць вельмі ж ужо затуманеную постаць Яна Чачота, я не мог не пабываць у мясцінах, звязаных з яго імем.

У падарожжа па сцяжынах Яна Чачота я знайшоў вельмі добрага напарніка. Можна сказаць, тут мне просва пашанцавала. Бо ім, гэтым напарнікам, быў не хто іншы, як мой даўні прыяцель Леў Паўлавіч Мірачыцкі — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР. «Добрым» ён быў для мяне з усіх бакоў: першае — таму, што Леў Паўлавіч аказаўся земляком Яна Чачота, другое — ён якраз рыхтаваў да друку нарыс пра родныя мясціны Адама Міцкевіча — пашыраны варыянт выдадзенай ім раней сціплай кніжачкі «Сцежкамі вялікага паэта». А, як вядома, Міцкевічавы сцежкі вельмі часта перапляталіся з Ча чота^ьімі. І многія з іх Леў Паўлавіч ужо абхадзіў, калі працаваў у музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Цяпер ён хацеў узнавіць свае ранейшыя ўражанні. Так што нашы інтарэсы шчасліва супадалі. Апрача таго, Леў

Паўлавіч і праўда добры па натуры чалавек: памяркоўны, сціплы, захоплены гісторыяй... Словам, лепшага спадарожніка мне нават цяжка б было і прыдумаць.

І вось пад колы машыны імкліва сцелецца шараватая, са сталёвым водбліскам роўнядзь «алімпійскай» магістралі. «Жыгуль» ідзе лёгка, паслухмяна падначальваючыся кожнаму, нават самаму малому руху маіх рук, якія моцна — хаця б усё было добра — трымаюць гладкае, але не слізкае, бо з «зазубрынамі», кола руля.

З Брэсцкай шашы мы паварочваем на Мір — недзе за ім, у Карэліцкім раёне, у вёсцы Малюшычы, і нарадзіўся ў 1796 годзе Ян Чачот. Доўгі час гісторыкі літаратуры — і польскія, і беларускія — называлі месцам нараджэння паэта вёску Рэпіхава, куды пераехалі яго бацькі пазней. Гэту памылку — як ні дзіўна — паўтарыў нават літаратуразнавец Навум Перкін, які спецыяльна вывучаў жыццё і творчасць Яна Чачота. І дарэмна усё-такі яна была «гіратыражавана» ў 1980 годзе выдавецтвам «Мастацкая літаратура», што пасмяротна выпусціла кнігу артыкулаў Перкіна «Абсягі думкі», сярод якіх аказаўся і артыкул пра Яна Баршчэўскага і Яна Чачота, — трэба ж было, мусіць, хоць у зносцы напісаць правільна. Дарэчы, пра сапраўднае месца нараджэння паэта было вядома ўжо ў 1937 годзе з артыкула Леанарда Падгорскага-Аколава «Чачот нязнаны», апублікаванага ў польскім часопісе «Лех» (у нумарах 3-4). Аўтар змясціў там выпісы з «Метрыкі хрышчэння» за 1781-1827 гады, якая вялася парафіяльным касцёлам у Варончы. У «Метрыках», было ясна напісана, што Яна Чачота, «сына радавітай шляхецкай сям'і Чачотаў — Тадэвуша і Клавы з дому Гаціскіх», прывезлі сюды хрысціць «з двара Малюшыца» і што абрад хрышчэння адбыўся б ліпеня 1796 года. Пра сапраўднае месца нараджэння Яна Чачота расказаў у 1958 годзе на старонках часопіса «Маладосць» (№ б) і мой цяперашні спадарожнік. Але і гэта публікацыя засталася незаўважанай нашымі літаратуразнаўцамі. Папраўку ў біяграфіі паэта яны зрабілі толькі тады, калі ў 1966 годзе газета «Літаратура і мастацтва» змясціла нататку Я. Бравера «Звесткі з біяграфіі Яна Чачота», у якой даваліся выпіскі са знойдзенай у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі справы аб дваранскім паходжанні роду Чачотаў. Якраз на публікацыю Я. Бравера і спасылаецца выдадзеная ў 1969 годзе двухтомная «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. II). Трэба сказаць, што ў «Гісторыі», там, дзе ідзе гаворка пра нараджэнне Яна Чачота, усё-такі дзве недакладнасці яшчэ засталіся. Першая недакладнасць звязана з назвай вёскі: трэба пісаць не Малюшыцкі, як значыцца ў польскіх выданнях, а Малюшычы, як

ёсць у сапраўднасці. Другая недакладнасць датычыць даты нараджэння паэта. Ян Чачот нарадзіўся не 17 ліпеня, як піша ўслед за «Гісторыяй беларускай дакастрычніцкай літаратуры» таксама БелСЭ і маскоўская «Литературная энциклопедия», а трошкі раней. Бо, як відаць з памянёных «Метрык», яго хрысцілі ўжо б ліпеня. Леанард Падгорскі-Аколаў выказваў меркаванне, што Ян Чачот нарадзіўся 24 ці 26 чэрвеня, на святога Яна — таму і імя атрымаў Ян. Даследчыка прывяла да гэтага вываду — і прывяла правільна — сама логіка фактаў.

Але і яму — у сваю чаргу — не трэба б было ламаць галавы, калі б ён разгарнуў другі том «Паэзіі філаматаў», які падрыхтаваў і выдаў у 1922 годзе ў Кракаве Ян Чубэк: там на некалькіх старонках даецца апісанне імянін Яна Чачота, якія спраўляліся 24 чэрвеня 1819 года і дзе Адам Міцкевіч прачытаў у яго гонар свае «Ямбы». 24 чэрвеня, або па новым стылі 7 ліпеня, відаць, і трэба лічыць днём нараджэння паэта.

Усё гэта, між іншым, лішні раз гаворыць аб тым, што Ян Чачот яшчэ па-сур'ёзнаму ў нас не вывучаўся. Па сутнасці, мы не толькі не паднялі архіўныя матэрыялы, якія расказваюць пра аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, але не прачыталі нават таго, што аб ім напісана ў літаратурных крыніцах...

Першы наш супынак быў у Баярах — роднай вёсцы Мірачыцкага, якая якраз ляжала па дарозе ў . Малюшычы. Загналі машыну ў двор, патупалі да бацькоўскай хаты Льва Паўлавіча. Папраўдзе, гэта была не хата, а добры дамок, мураваны, вельмі акуратны. Пабудаваны ён быў, як расказаў мне Леў Паўлавіч, яшчэ «за польскім часам», недзе ў дваццатых гадах. Наогул жа ў Баярах Мірачыцкія пасяліліся даўно — недзе ў шаснаццатым ці семнаццатым стагоддзі, пакінуўшы сваё «родавае» сяло Міратычы, што каля Свіцязі. Ад назвы гэтага сяла, між іншым, і прозвішча Льва Паўлавіча. Яго далёкі продак славіўся як майстар на ўсе рукі, вялікі выдумчык, вынаходнік. Расказвалі, быццам ён змайстраваў нават драўляны веласіпед — гэта тады, калі веласіпедаў яшчэ і ў паміне не было. Даведаўся пра таленавітага майстра-самародка пан з Асташына (вёска непадалёк ад Баяр) і — невядома ўжо якім чынам — дамогся, каб пан з Чамброва, што валодаў Міратычамі, перадаў гэтага майстра яму. Асташынскі пан пасяліў яго ў Баярах. Пра выдатныя здольнасці новага пасяленца адразу ж даведаліся баярцы. Ды і не толькі баярцы — людзі з усяго навакольля. Быў ён чалавек добры, бескарыслівы. Калі каму-небудзь трэба было змайстраваць ці паправіць нейкую рэч у гаспадарцы, казалі: «Ідзі да міратыцкага чалавека — ён табе ўсё зробіць». Мірачыцкі — гэта і ёсць перайначанае ад міратыцкі,

чалавек з Міратыч. Цікава, што ўмельства, дапытлівасць, працавітасць сталі родавай традыцыяй Мірачыцкіх. І сёння жыве ў Баярах дзядзька Льва Паўлавіча — Уладзімір Якаўлевіч Мірачыцкі, выдатны майстар кавальства. Знаным кавалём быў і бацька, удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 года (ён служыў пад Масквой памочнікам машыніста на паравозе). Майстрамі на ўсе рукі, вельмі паважанымі людзьмі сярод вяскоўцаў былі таксама і яго сыны — браты Льва Паўлавіча — Міхась і Кастусь. Кастусь, які закончыў аж два тэхнікумы і выбіраўся старшынёй калгаса, трагічна загінуў колькі гадоў назад: капаў калодзеж, аб'ехала зямля — ёю і заваліла чалавека. Кастусь якраз і быў — пасля смерці бацькі — гаспадаром дамка, да якога мы цяпер пад'ехалі.

У доме Мірачыцкіх сустрэлі нас вельмі ветліва, запрасілі ў пакоі. Дома была сама гаспадыня — братавая Льва Паўлавіча — і яе дачка Таня, студэнтка універсітэта ў Мінску, са сваімі сябрамі. Леў Паўлавіч паказаў мне сямейныя рэліквіі, падахво ціў злазіць на гарышча — там ён захоўваў свае кнігі, якія збіраў яшчэ са школьных гадоў і якія не змяшчаліся ў яго сціплай мінскай кватэры. Знаёмыя назвы кніг, знаёмыя прозвішчы пісьменнікаў, сярод якіх шмат беларускіх. Адразу відаць чалавека, які любіць родную літаратуру, нашу гісторыю.

Потым нас пасадзілі за стол — перакусіць з дарогі. І тут, за сямейным сталом, зусім нечакана я разгаварыўся з чалавекам, які быў з роду... Чачотаў! Ім, гэтым чалавекам, аказаўся не хто іншы, як сама гаспадыня хаты, братавая Льва Паўлавіча — выкладчыца роднай мовы і літаратуры Цырынскай сярэдняй школы Марыя Мікалаеўна Мірачыцкая, да замуства — Чачот. Родам яна з суседняй вёскі Аканавічы. Там, як яна мне расказала, палавіна вёскі носіць гэта прозвішча. Праўда, толькі з націскам на першы склад — Чэчат. Дарэчы, Леў Паўлавіч лічыць, што і Яна Чачота правільней было б так называць. Але наўрад ці можна з гэтым пагадзіцца: Чэчат усё ж, мусіць, паланізаванае слова. Чэчатаў шмат і ў Цырыне. Ёсць яны і ў іншых тутэйшых вёсках.

Ці не ўсё гэта сведчанне таго, што якраз тут — самыя глыбінныя карані Яна Чачота, зямля яго дзядоў і прадзедаў?

Цікавая дэталь: Чэчаты з Цырына былі вядомыя тым, што захапляліся мастацтвам, літаратурай. Яны заўсёды славіліся як завадатары мастацкай самадзейнасці. Добра помняць цырынцы, напрыклад, Тоню Чэчат, якая ў 30-х гадах ставіла спектаклі па п'есе «Збянтэжаны Саўка» і іншых творах, а таксама Алесю Чэчат, якая зноў жа ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці, а ў час Вялікай Айчыннай вайны стала партызанкай...

Мы доўга не затрымаліся ў доме Мірачыцкіх. Падзякаваўшы гаспадыні за гасціннасць, рушылі далей па сваім маршруце.

Ехаць давялося не доўга. Мінавалі толькі прыгра вайкавыя вёскі Асташын, Любанічы, Сэрвач, якія відаць былі адна ад адной, і калі наблізіліся будынкі наступнай вёскі, Леў Паўлавіч даў знак спыніцца.

Паставілі машыну на пляцоўцы каля прыдарожнага магазіна і пакіравалі да бліжэйшай хаты. У парозе ўбачылі дзвюх жанчын, падышлі да іх. Жанчыны спляталі ў вянкі цыбулю, што ляжала згруджаная каля іх ног, на падлозе сенечак.

— Дык гэта ж не Малюшычы, — сказалі яны, калі мы пачалі распытваць пра вёску. — Гэта Даўгінава. А Малюшычы — далей, — яны паказалі на хаты другой вуліцы, што ішла ад гравійкі ўбок.

— А не адна гэта вёска? — папытаўся я.

— Цяпер-то яны зліліся. Але ўсё роўна тут — Даўгінава, а там — Малюшычы.

Жанчыны расказалі нам, што Даўгінава — навейшая вёска. Яе склалі перасяленцы з наднёманскага Даўгінава. Перасяліліся людзі і назву роднай вёскі ўзялі з сабой. Цяпер і Даўгінава, і Малюшычы ўваходзяць у адзін калгас — імя Калініна.

Мы вярнуліся да машыны і скіравалі ў сапраўдныя Малюшычы. Прыпыніліся ў пачатку вёскі і, пакінуўшы машыну пры плоце, пайшлі па вуліцы пеша.

Малюшычы аказаліся даволі вялікай вёскай. Светлыя і прасторныя дамы, сярод якіх нямала цагляных, зробленых па-сучаснаму. Вуліца чыстая, асфальтаваная. На адным з будынкаў убачылі шыльду: «Малюшыцкая сярэдняя школа». Памкнуліся туды — усё ж цікава было б пагутарыць з настаўнікамі, але якраз быў выхадны, і на дзвярах школы вісеў замок.

Параўняліся са светлым акуратным дамком канторы калгаса. Каля дамка стаяла пры плоце белая «Ніва». Пэўна ж, гэта машына старшыні, і мы застанем яго на месцы.

Але ў канторы ўбачылі толькі маладзенькую чарнявую дзяўчыну за вылічальнай машынкай і пажылую жанчыну, якая выйшла да нас з суседніх дзвярэй.

— Старшыня ездзіць па калгасе. З прадстаўніком вобласці, — сказала нам жанчына. — Але пачакайце, я па радыё скажу, што яго чакаюць...

І жанчына знікла за дзвярыма.

— Я аб'явіла, пасядзіце трохі, — сказала яна, вярнуўшыся.

Мы прыселі каля стала, разгаварыліся.

Старшынёй калгаса тут Аляксандр Аляксандравіч Зантовіч. Працуе ў калгасе даўно. Вельмі дзелавы чалавек. Шмат будуе і гаспадарчых будынкаў, і жылля. Дабіўся добрых паказчыкаў па многіх галінах гаспадаркі. Тут жанчына пачала называць лічбы, якія сапраўды гаварылі аб выдатных дасягненнях калгаса.

— Але паглядзіце лепей во гэта, — і жанчына не без гонару падала нам чырвоную папку. — Сёння ўручылі. Якраз перад вашым прыездам быў сход усяго калгаснага актыву...

Я разгарнуў папку.

Перада мной ляжала Ганаровая грамата Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ. У ёй гаварылася, што гэтай Ганаровай граматай узнагароджваецца калгас імя Калініна Карэліцкага раёна — пераможца ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае правядзенне зімоўкі жывёлы, павелічэнне вытворчасці і продажу прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд 1982/83 г. І яшчэ жанчына паказала нам Ганаровую грамату Міністэрства сельскай гаспадаркі і Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў работнікаў сельскай гаспадаркі, якой узнагароджваўся за тыя ж поспехі калектыў малочна таварнай фермы Малюшычы калгаса імя Калініна.

— Ферма адсюль блізка. Калі хочаце — можна падысці, — сказала нам жанчына.

Мы з ахвотай згадзіліся — балазе так і не дачакаліся старшыні калгаса.

Ферма была даволі вялікая. Старыя і новыя пабудовы. Сярод іх вылучаўся доўгі цагляны кароўнік, відаць былі збудаванні для сіласу.

Да нас надышоў загадчык фермы Сымон Сымонавіч Шайбак, невысокі, сярэдняга веку чалавек. Ён ахвотна пачаў расказваць пра работу, пра шчырых і руплівых працаўніц фермы.

Вядома, усё гэта было цікава. Добра б было бліжэй пазнаёміцца з гэтымі людзьмі, напісаць пра іх.

Дарэчы, у мяне раней была мара: як можна глыбей вывучыць сучасную калгасную вёску, паказваць у нарысах самыя важныя праблемы сельскай гаспадаркі. Але розныя акалічнасці перашкодзілі мне заняцца гэтым. І галоўная «акалічнасць» (толькі цяпер, у пачатку 90-х гадоў, калі я дапаўняю свае нататкі, можна казаць пра яе) — гэта нядрэмная наша цэнзура, што доўгія гады маналітам стаяла на варце ўсіх «заваёў» і «ўстояў», і блізка не прапускаючы ў друк думкі і меркаванні, якія б адрозніваліся ад даўно ўстаялых, «агульнапрынятых». Даходзіла нават да таго, што па-за крытыкай станавіліся нават ніжэйшыя чыны партапарату. Пісаць пра сельскую гаспадарку дазвалялася толькі ў плане ўдасканалення калгасна-саўгаснай сістэмы. Пра тое, каб мяняць яе — не магло быць і гаворкі. Якраз таму і «ўцёк» я ў гісторыю. А што значыць гісторыя для грамадства — тлумачыць, мусіць, няма патрэбы. Добра сказаў, напрыклад, пра важнасць вывучэння

гісторыі вядомы рускі пісьменнік Васіль Пяскоў: «Радзіму можна параўнаць з агромністым дрэвам, на якім не злічыць лістоты. І ўсё, што мы робім добрага, дадае яму сілы. Але ўсякае дрэва мае карані. Без каранёў яго паваліў бы нават слабы вецер. Карані жывяць дрэва, звязваюць яго з зямлёй. Карані — гэта тое, чым мы жылі ўчора, год назад, сто, тысячу гадоў назад. Гэта наша гісторыя. Гэта нашы дзяды і прадзеды. Гэта іх справы, якія маўкліва жывуць побач з намі, у стэпавых каменных бабах, разьбяных ліштвах, у драўляных цацках і дзівосных храмах, у цудоўных песнях і казках. Гэта слаўныя імёны палкаводцаў, паэтаў і змагароў за народную справу... Без мінулага немагчыма ні добра зразумець, ні ацаніць па-сапраўд наму сённяшняе...» Залатыя словы!..

На малюшыцкую ферму я зайшоў нездарма. На гэтым жа самым месцы, дзе размясціліся яе пабудовы, і быў некалі той фальварак, які арандаваў яшчэ ў васемнаццатым стагоддзі бацька Яна Чачота і дзе нарадзіўся будучы паэт і фалькларыст.

Сымон Сымонавіч расказаў, што перад вайной можна было ўбачыць тут рэшткі фальварка. Сёння ж ад яго не засталося і знаку. Затое навокал ляжалі тыя ж узгоркавыя палеткі, якія бачыў некалі малы Ян Чачот. За фермай, у лагчыне, відаць быў пасак маленькай рачулкі Малюшыца, якая і сёння, пэўна, вабіць да сябе вясковую дзятву... Тое, што тут нарадзіўся адзін з пачынальнікаў нашай літаратуры, — нікому ўжо і не ў галаве. На месцы фальварка — бруд, смурод. Вось так шануем мы святыя месцы! Хто ж паважаць будзе нас, калі мы самі сябе не паважаем?

Ходзячы па Малюшычах, мы напаткалі на вуліцы паважанага веку бабулю. Загаварылі да яе: яна-то павінна шмат чаго расказаць пра вёску. Але бабуля адправіла нас у сваю хату:

— Мой чалавек усё вам раскажа — ён старэйшы за мяне і больш ведае. Толькі моцна кажыце, бо ён недачувае.

Дзядуля — гэта быў 90-гадовы Бурдо Іван Фёдаравіч — і праўда аказаўся вельмі гаваркі, з добрай памяццю. Вось толькі мы ніяк не маглі падступіцца да яго, каб што-небудзь дапытацца: як ні крычалі яму на вуха, ён адказваў нам зусім не тое, пра што мы пыталіся. Але тут нам на падмогу прыйшоў яго сын — калгасны механік Мікалай Іванавіч, што якраз быў дома. Калі ён даведаўся, хто мы такія і чаго прыехалі, ён адразу зразумеў, што нам трэба. Пытанні, якія нас цікавілі, ён дакладна, хоць і на свой лад, перадаваў старому, нахіляючыся да самага яго вуха.

Як мы і чакалі, аб знаходжанні тут Чачотаў дзядуля нічога нам не мог сказаць. Затое ён успомніў, што за пяць кіламетраў ад Малюшыч, у вёсцы Сёгда некалі і праўда быў памешчык з такім прозвішчам — Чэчаг. Ён меў там свой маёнтак. Івану Фёдаравічу

было гадоў шаснаццаць, калі ён пазнаўся з тым панам. Гаспадар маёнтка ў Сёгдзе запомніўся яму як вельмі добры чалавек: гаваркі, «прастак», нават «сам садзіў бульбу...».

Мне прыгадалася, што і Ян Чачот, паводле сведчанняў яго сучаснікаў, быў вясёлы і гаваркі. Што ж да яго дэмакратычнасці, то пра гэта і казаць не трэба. Ці не ёсць тут якая-небудзь сувязь, можа, родавая традыцыя?

Нямала цікавага паведаў нам Іван Фёдаравіч пра вёску Малюшычы, пра яе мінулае. Як расказваў яму яшчэ бацька, тут некалі жыў памешчык Дубічынскі, «паляк». Калі ў 1860 годзе (чамусьці якраз гэты год запомніўся Івану Фёдаравічу) «узбунтавалася Польшча, каб аддзяліцца», то Дубічынскі «сабраў сваю чэлядзь» і далучыўся да «мяцежнікаў». Расказваючы пра «мяцеж», Іван Фёдаравіч звязаў з ім і імя легендарнага Тадэвуша Касцюшкі, якога назваў так — «кароль Касцюшка». За ўдзел у тым паўстанні Дубічынскага арыштавалі, а яго маёнтак быў канфіскаваны царскімі ўладамі. Купіў яго свяшчэннік з-пад Баранавіч — Савіч...

Але самым цікавым было для нас мясцовае паданне, якое расказаў Іван Фёдаравіч.

Паданне пра апетае Адамам Міцкевічам возера Свіцязь, да якога ад Малюшыч дванаццаць кіламетраў.

Калі Іван Фёдаравіч пачаў расказваць, мы слухалі, баючыся прапусціць хоць слова. Бо адразу адчулі, што гэта было не простае паданне...

Але спачатку — само паданне.

Калісьці на тым месцы, дзе цяпер плешчацца Свіцязь, былі два хутары. У гаспадара аднаго хутара свяціла голымі латамі бядняцкая хаціна, у другога ж — красаваўся раскошны прыгожы палац. Бедны хутаранін меў сына, багаты — дачку. Хлопец і дзяўчына моцна пакахалі адно аднаго, хацелі пажаніцца. Але багацей і думаць не хацеў аддаваць дачку за сына бедняка. Тады хлопец наважыў любой цаной разбагацець — толькі б заваяваць каханую дзяўчыну. Выйшаў ён сярод ночы на вялікую дарогу. Калі праязджалі па ёй купцы-гандляры, перастрэў іх, перабіў, а грошы забраў сабе. За тыя грошы пабудаваў ён багаты дом-палац, можа, нават прыгажэйшы, чым у суседа-багацея. Цяпер багаты хутаранін не супярэчыў дачцэ выходзіць за каханага хлопца. Згулялі вяселле. Маладыя муж і жонка сталі жыць у яго доме. Праз нейкі час муж прызнаўся жонцы, якім чынам дасталося яму багацце. Паслухаўшы яго расказ, жонка сказала яму схадзіць на магілу забітых ім купцоў і паслухаць, што яны будуць там казаць. Пайшоў туды яе чалавек і праўда пачуў з-пад зямлі голас купцоў. Купцы гаварылі пра тое, што іх забойца ўсё роўна, рана ці позна, а

будзе пакараны. Вярнуўшыся з могілак, гаспадар расказаў пра пачутае жонцы. Каб адхіліць бяду, надумалі асвяціць дом. Паклікалі свяшчэнніка. Асвяціў дом свяшчэннік і паехаў. Але па дарозе ўспомніў, што забыўся малітоўнік. Вярнуўся назад, а на месцы тых хутароў — пляскалася ўжо возера. Па вадзе плаваў толькі столік з малітоўнікам. Калі свяшчэннік дастаў свой малітоўнік, столік адразу ж пайшоў на дно.

Даслухаўшы дзядулю, мы пераглянуліся са Львом Паўлавічам: ці не тое гэта паданне, што легла ў аснову Чачотавай балады «Свіцязь»? Вельмі важнай балады. Адной з тых, якія мелі самае непасрэднае дачыненне да нараджэння на беларускай зямлі цэлага напрамку, а лепш сказаць, эпохі ў гісторыі літаратуры — рамантызму, пра што больш падрабязна скажацца пазней...

Балада Яна Чачота «Свіцязь» да апошняга часу была не вядома шырокаму чытачу, і ў першую чаргу беларускаму. Між тым яна вельмі шмат можа сказаць нам аб характары літаратурнай творчасці аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, аб прынцыпах выкарыстання ім фальклору ў сваіх творах, наогул аб светапоглядзе паэта.

Сюжэт Чачотавай балады — для параўнання — такі. На месцы Свіцязі некалі стаяў горад з той жа назвай. У аднаго багатага чалавека была вельмі прыгожая («цуда з цудаў») дачка. Дзяўчыну пакахаў хлопец-бядняк, хацеў ажаніцца з ёй, але бацька не дазволіў дачцэ выходзіць замуж за такога жаніха. Хлопец намерыўся прасіць дапамогі ў д'ябла. Выйшаў на «расстайныя дарогі», свістам паклікаў «нячысціка». Той не прымусіў сябе доўга чакаць: тут жа выскачыў на дарогу — «такі страшны, такі брыдкі... пазногці — як крукі, лапы — курыныя, нос — як дзюба, казліны хвост, у куцым фраку, у губе — агонь, валасы — са змеяў». Убачыўшы чорта, хлопец хацеў пусціцца наўцёкі. Але д'ябал пачаў яго сарамаціць: «Калі ўжо надумаўся ісці — ці ў пекла, ці да неба, — то не трэба баяцца». Жаданне стаць багатым, каб заваяваць любую дзяўчыну, перамагло, і хлопец, слухаючыся д'ябла, на валовай скуры «накрымзоліў» уласнай крывёй «абавязацельства». За гэта, сказаў яму чорт, «паможам табе забіць купца... І ўсе забярэш грошы... І будзеш жыць ціха, добра і спакойна, з жонкай і дзецьмі купацца у раскошы і шчодрым багацці... А як міне сорак гадоў, даб'ешся гонару быць у пекле...» Сказана — зроблена. Хлопец выходзіць на дарогу. Па ёй вяртаецца з Зэльвы, з кірмашу, купец, які прадаў там свае тавары — «вязе дукаты, талеры... вязе поўныя рукі падарункаў, якіх чакаюць дзеці і жонка». Раптам у возе купца — так падстроілі д'яблы — ломіцца кола. Пакуль ён папраўляў тое кола, настае ноч. Чэрці пускаюць купецкі караван па бездарожжы, падымаюць яшчэ на яго буру. Калі караван

пад'язджае да слупа на расстайных дарогах, хлопец-бядняк нападае на купца і, не зважаючы на яго просьбы, забівае разам з прыслугай. Перад смерцю купец праклінае забойцу, папярэджваючы, што за гэта яго чакае страшная помста. Праклён і прадказанне кары чуе хлопец і тады, калі ідзе да ручая змыць з рук кроў.

Назаўтра хлопец выпраўляецца з вялікімі грашыма ў руках да бацькоў дзяўчыны. Убачыўшы ў яго такое багацце, яны адразу ж згаджаюцца выдаць за хлопца дачку. Ажаніўшыся, малады гаспадар выкупляе ў караля цэлы горад Свіцязь. Цяпер усе працуюць на яго, нясуць яму даніну. Тыя ж, хто не захацеў цярпець крыўды новага гаспадара, уцякаюць са Свіцязі, кідаючы гэта нядобрае месца.

У поўным дастатку і раскошы жыве забойца, згодна з д'яблавай умовай, усе сорак гадоў. У тую ж ноч, калі мінуў вызначаны тэрмін, яму паказваецца ў сне галава забітага купца. Назаўтра, каб неяк забыцца, супакоіцца, забойца запрашае да сябе ў палац як можна болей гасцей на банкет. У самы разгар застольнай гамонкі сярод шматлікіх страў — на вялікі жах усіх гасцей — ізноў, ужо не ў сне, а наяве — паказваецца на стале галава забітага купца, якая паўтарае свой даўні праклён. І ў той жа момант усчынаецца страшэнная бура, б'юць перуны. Расчыняецца насцеж акно, і праз яго ў дом урываецца «д'ябальская зграя», якая хапае забойцу. Але не толькі ён адзін гіне; увесь горад Свіцязь правальваецца скрозь зямлю. На яго месцы ўтвараецца возера — сённяшняя Свіцязь.

Завяршаў баладу Ян Чачот такімі паэтычнымі радкамі:

> І сёння, калі у Наваградак едзеш
> Цяністай дарогаю з Мышы,
> Вады там люстэрка чысцюткае ўгледзіш
> Ты ў мройнай лясістае цішы.
> Тут, людзі расказваюць, чутна бывае,
> Як звоняць званы пад вадою,
> І хваля часамі брусы вымывае
> З смалою — застылай слязою...[1]

Як мы ўбачылі, і ў пачутым ад дзядулі паданні, і ў баладзе Чачота — адзін і той жа сюжэт. Няма ніякіх сумненняў, што якраз гэта народнае паданне і ўзяў паэт за аснову сваёй балады. Вядома, Ян Чачот творча перапрацаваў яго, увёўшы ў канву свайго твора яшчэ адно, вельмі распаўсюджанае ў той час — і ў Польшчы, і ў Беларусі, асабліва сярод шляхты, — паданне пра пана Твардоўскага, што прадаў душу чорту. Але ж сюжэтны

стрыжань для сваёй балады паэт узяў, паўтараю, з народнага падання пра возе ра Свіцязь, таго, што пачулі мы цяпер у Малюшычах. Мы, такім чынам, натрапілі на самую крыніцу Чачотавай паэзіі, крыніцу, якая, аказваецца, не перасохла і праз дзвесце без малога гадоў! Хіба ж гэта не адкрыццё?

РЭПІХАВА

З Малюшыч нам трэба было па логіцы ехаць у Рэпіхава, услед за сям'ёй Тадэвуша Чачота, які атрымаў там пасаду аканома ў маёнтку Тызенгаўза.

Але ў нас было малавата часу на такую, зусім не блізкую, дарогу, якую да таго ж трэба было яшчэ шукаць. Таму мы вырашылі адкласці гэту паездку на потым.

Забягаючы наперад, скажу, што, пакуль я чакаў тое «потым», маю задачу, хоць і часткова, выканаў настаўнік з Баранавіч краязнавец Аляксандр Пятровіч Шоцкі, мой даўні знаёмы (праўда, завочна, па перапісцы).

Зацікавіўшыся мясцовай тапанімікай, ён наважыў адшукаць тое Рэпіхава, дзе жыла сям'я Чачотаў. Але сярод скрупулёзна сабраных ім геаграфічных назваў Баранавіцкага раёна Рэпіхава, на яго здзіўленне, чамусьці не аказалася, хаця ва ўсіх даведніках пісалася, што яно — «пад Баранавічамі», «каля Новай Мышы».

Зазірнуўшы ў «Геаграфічны слоўнік польскіх і іншых славянскіх земляў», Аляксандр Шоцкі прачытаў там, што Чачотава Рэпіхава трэба шукаць каля рэчкі Ліпніца — правага прытоку Шчары.

І вось краязнавец у час школьных канікул выпраўляецца ў падарожжа. Па шляху з Крывошына ў Нетчын, у межах Ляхавіцкага раёна, ён і знаходзіць даўно апусцелае ўжо ўрочышча Рэпіхава. Калі паглядзець на карту, то гэта месца здасца ўсё ж не надта і далёка ад Баранавіч, ну і ад Новай Мышы — так што даведнікі не вельмі і памыляліся.

На месцы маёнтка Рэпіхава, які належаў магнатам Патоцкім, А. Шоцкі сустрэў цяпер толькі «здзічэлы і напалову знішчаны парк». У парку ўсё ж засталася яшчэ прыгожая ліпавая алея, некалькі старых таўшчэзных дубоў ды гэтакіх жа кедраў, лістоўніц, яваравў, бяроз.

Пра сваю паездку А. Шоцкі расказаў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва». Пры гэтым ён выказаў шкадаванне, што

«гэты куточак прадаўжае гібець» і «што адзін толькі дзяцел барабаніць тут дзюбай па дрэвах, лечыць іх і ратуе парк ад вымі рання». Заканчваў краязнавец свой ліст у рэдакцыю такімі словамі: «Хочацца верыць, што ў хуткім часе прыйдзе сюды дбайны гаспадар. Памаладзее стары парк і стане служыць людзям. Дзесьці на відным месцы з'явіцца мемарыяльная дошка, якая паведаміць, што тут жыў Ян Чачот — адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, сябра вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча».

Праз колькі часу ў той жа «Літаратуры і мастацтве» было змешчана паведамленне, у якім гаварылася, што ліст А. Шоцкага быў разгледжаны ва ўпраўленні культуры Брэсцкага аблвыканкома, а таксама ў Ляхавіцкім райвыканкоме Саветаў народных дэпутатаў, які прыняў рашэнне аб добраўпарадкаванні парку ў Рэпіхаве, прычым аддзелу культуры райвыканкома і раённаму таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры даручана ўстанавіць там мемарыяльную дошку ў гонар Яна Чачота. Хвала краязнаўцам! Хвала тым уладам, якія гэтак хутка, без аніякай цяганіны прымаюць такія мудрыя пастановы!

У Рэпіхаве, куды пераехала сям'я Чачотаў недзе на сумежжы двух стагоддзяў — XVIII і XIX, і праходзілі дзіцячыя гады паэта. Але, мусіць, не толькі ў самім Рэпіхаве, а яшчэ недзе паблізу — на рацэ Мышанка, як відаць з твораў Яна Чачота: што ж, беззямельнаму Тадэвушу Чачогу, бацьку паэта, даводзілася не раз мяняць месца службы. Як бы там ні было, да ад'езду на вучобу ў Навагрудак Ян Чачот быў з бацькамі ў Навамышанскай каталіцкай парафіі, у якую ўваходзіла і Рэпіхава. Усё ж нездарма Адам Міцкевіч называў Чачота — «Ян з Мышы».

Тут, у ваколіцах Новай Мышы, Ян Чачот і пазнаў жыццё беларускага селяніна, яго мову, назаўсёды палюбіў і запомніў яго песні, казкі, паданні. Пра зацікаўленасць Яна Чачота, яшчэ ў дзіцячыя гады беларускім фальклорам сведчаць яго балады «Калдычэўскі шчупак», «Мышанка», «Узногі», напісаныя паводле мясцовых паданняў і пачутых ад людзей быляў.

У баладзе «Калдычэўскі шчупак» Ян Чачот скарыстаў паданне пра шчупака, які пераплыў нейкай падземнай ракой з Калдычэўскае возера (яно было непадалёк ад селішча Чачотаў, у цяперашнім Баранавіцкім раёне) у возера Свіцязь. У аснову балады «Мышанка» леглі аж два пачутыя ў маленстве паданні. Першае — пра дачку нейкага Мышкі, вельмі гожую дзяўчыну, якая, уцякаючы ад рыцара з княжацкага замка, кінулася ў раку — толькі б не трапіць у рукі гвалтаўніка; ён жа, гэты рыцар, на месцы гібелі дзяўчыны загадаў закласці горад, даўшы яму назву Мыш. Другое паданне, якое скарыстаў у сваёй баладзе Ян Чачот,

таксама было пра паходжанне назвы гэтага мястэчка: чалавек, які яго залажыў, быццам бы сказаў, што назаве яго той істотай, якую першай убачыць, устаўшы раніцай; першай жа ўбачыў ён мыш...

У баладзе «Мышанка» Ян Чачот прапеў сапраўдную песню замілаванасці рацэ свайго маленства:

О, мілы ўспамінак! Рачулка Мышанка!
Ізноў цябе бачу я ў бляску заранак.
Ты першая ў свеце мая каханка,
Праплыў тут жыцця майго ранак*.

Недзе тут, у сваёй Навамышанскай парафіі, пачуў Ян Чачот і праўдзівае, вельмі жудаснае паданне (што ўзнікла з сапраўднага факта) пра ліхога пана-прыгонніка з маёнтка Узногі, паданне, якое вылілася потым у адну з найцікавейшых балад паэта. Паколькі балада вельмі многа дае нам для разумення Яна Чачота, паколькі яна зусім недвухсэнсоўна паказвае яго ярка выражаны дэмакратызм, яго адносіны да прыгнечанага беларускага люду і стаўленне да жорсткіх і хцівых прыгоннікаў, урэшце, да самога прыгону, трэба спыніцца на гэтым даволі вялікім і важным у многіх адносінах творы больш падрабязна.

Пачынаецца балада Яна Чачота грозным папярэджваннем пана, уладальніка маёнтка Узногі сваім падданым:

Гэй, хамы нягодныя! Я вам дазволіў
У лесе маім браць — і то па білету —
Падгнілую леж усяго, і каб болей
Не ссеклі і розгі — запомніце гэта!
Гэй, хамкі нікчэмныя! Красці — даволі!
Каб болей ні ягадкі з лесу, ні грыба!
Ну, хіба ж вы сеялі іх тут, палолі?
Маё усё гэта, мая тут сядзіба!
І вашыя душы, як гэтыя дрэвы,
Належаць мне толькі па праву.
Каб зналі: не будзеце слухаць мяне вы,
Знайду на вас хутка я ўправу!
І ты будзь жа пільны заўсёды, ляснічы,
Ды пушчу вартуй адмыслова.
У тых, хто залезе сюды па здабычу,
Здзірай кажухі з плеч без слова!
Ніводны звярок і ніводны арэшак
Прапасці ў мяне не павінен!
Запомняць хай добра: не любіць пан смешак.
Усіх пакарае, хто вінен!..*

Раскрыўшы перад чытачом хцівае, нікчэмнае нутро самазадаволенага прыгонніка, Ян Чачот са спагадай паказвае бязвыхаднае становішча бяспраўнага беларускага мужыка, які не можа выконваць поўныя самых страшных пагроз загады свайго пана:

Ды хто ж гэта жыць мужыку забароніць!
Ці ж можна уседзець у цёмнай хаціне,
Дзе ў місе крупіна крупы не дагоніць,
А скваркі, малой хоць, няма і ў паміне?
А прыйдзе вясна — скрозь падчысціць падполлі,
Не знойдзеш нідзе і з мякінаю хлеба.
Адна крапіва. Ды і тая без солі.
За нешта ж купіць яшчэ соль гэту трэба.
Таму вось мужык красці дрэва і лезе,
На рынак вязе — хоць на грошык разжыцца.
Дармо, што бізун панскі бачыцца ў лесе —
Ну, хіба ж жывому ў магілу лажыцца?*

Растлумачыўшы такім вось чынам, што да чаго, Ян Чачот прыступае да канкрэтнага апавядання пра беднага селяніна, які, запрогшы схудалыя валы і заткнуўшы за пояс сякеру, глухім часам выпраўляецца ў панскі лес у дровы. Але толькі пачаў ён класці тыя дровы на воз, як падскочыў ляснічы. Назаўтра па загаду жорсткага пана слугі хапаюць селяніна, прывязваюць да азярода і б'юць розгамі і вяроўкай. Скатаваны селянін ледзь даходзіць да сваёй хаты, дзе і памірае. Разам з ім памірае ад голаду і знясілення і яго хворая жонка. У хаце засталіся толькі малыя дзеці і стары дзядок. Старшая дачка памерлых, каб неяк накарміць сваіх меншых брацікаў і сястрычак, крадком ідзе ў лес —сабраць ягад. Але і яе заспяе там ляснічы, які цягне дзяўчыну ў двор да пана. Пан загадвае прынесці розгаў, агаліць бедную дзяўчыну і, не зважаючы на просьбы дамашніх, лупцаваць тымі розгамі.

Расказваючы пра гэтыя дзікія катаванні, Ян Чачот бескампрамісна становіцца тут на бок пакрыўджаных, на бок запрыгоненага селяніна, якога хоча абараніць ад разбэшчаных «уладароў падданых душ», ад прыгону наогул:

Дачка дарагая! Унучка мая ты!
Каб быў там я ў гэту часіну,
Я ганьбіць цябе не дазволіў бы катам,

Лепш сам пры табе я загінуў!..*
Дзяўчына, расказвае далей Ян Чачот, не вытрымала катаванняў:
Памерла ад голаду, болю і сораму,
Адпомсціць за ўсё даручаючы Богу*.

З дарослых у сям'і застаўся цяпер стары дзядуля. Каб пакарміць унукаў, дзядок падаўся ў бліжэйшае мястэчка — выжабраваць хлеба. Па дарозе ён зайшоў у лес і пачаў выламваць сабе падарожны кій. Гэта ўбачыў той жа ляснічы, які і прывёў старога да панскага палаца. Пан размахваецца і б'е дзядка, які падае долу і тут жа памірае, «за ўсё сваё загубленае племя помсту даручаючы Богу».

Пасля гэтага малыя дзеці пайшлі самі жабраваць, а гаспадарку пан перадаў другому селяніну. Так жорстка была загублена панам сялянская сям'я.

Але на гэтым балада не заканчваецца.

Калі надышоў час збору арэхаў, апавядае далей Ян Чачот, гаспадар Узногаў едзе з сям'ёй і слугамі ў лес. Тут усім гуртам збіраюць арэхі, якіх багата ўрадзіла ў той год. Але нечакана грыміць сярод яснага неба гром, што запальвае лес. Аўтар падрабязна апісвае лясны пажар, у якім гіне панскае дабро.

Каб узмацніць эфект кары пану за ўсе яго злачынствы, паэт уводзіць у канву апавядання казачныя матывы. Лясныя птушкі, замест таго каб уцякаць ад пажару, ператвараюцца раптам у прывіды закатаваных панам мужыкоў, кідаюцца на свайго прыгнятальніка і яго сям'ю і раздзіраюць усіх на кавалкі...

Сваю баладу Ян Чачот заканчвае разважаннем пра сялянскую нядолю, заклікае да вызвалення селяніна ад прыгону — так, як гэта зроблена за мяжой, у «чужых краінах», дзе сяляне цяпер быццам бы сталі самі «як паны».

Пра тое, як дапамагалі Яну Чачоту ў яго паэтычнай практыцы пачутыя ў маленстве беларускія народныя казкі, паданні, песні, прыказкі і прымаўкі, а таксама захаваныя ў памяці звычаі, павер'і селяніна, можна б было гаварыць яшчэ вельмі многа.

Прываблівають балады Яна Чачота і тым, што ў іх даюцца апісанні рэальных, а не выдуманых мясцін, паказваюцца часта рэальныя людзі, якіх аўтар ведаў сам, сапраўдныя жыццёвыя факты. Адзін толькі цікавы момант. У баладзе «Звон на горцы ў Пазяневічах» сустракаецца імя нейкага Антосіка, якому прысвячаецца цэлая страфа:

Тут быў і Антоська, пра «цуды» якога
Пагудкі хадзілі усюды,

І людзі, дурныя, няслі, як да Бога,
У Дарава золата груды*.

Аўтар нідзе не дае тлумачэння, што ж гэта быў за Антосік. Як паказваюць польскія даследчыкі, Ян Чачот упамінае тут рэальную асобу — непісьменнага пастуха з вёскі Дарава пад Баранавічамі Антося Голеца, які з пятнаццаці гадоў стаў вядомы як знахар, што лячыў у 1814-1816 гадах самыя розныя хваробы. Цікава, што да яго трапіла была і маці Адама Міцкевіча са старэйшым сынам Аляксандрам, пра што ён успамінае сам у адным з пісем.

Многа пісалася тады пра цудадзействы Антосіка ў віленскім друку. Наслухаўшыся пра незвычайныя здольнасці Антосіка, гродзенскі губернатар у 1816 годзе накіраваў у Дарава спецыяльную камісію. Камісія паведамляла, што Антосік лечыць сваіх пацыентаў «углядваннем у вочы і твар, а потым інстынктам вызначае, якое трэба даць лякарства». Лякарствы тыя камісія прызнала няшкоднымі, а іх незвычайную «эфектыўнасць» тлумачыла «сляпой верай у іх». І ўсё ж распараджэннем губернатара Антосіку была забаронена «лячэбная практыка». У абарону незвычайнага лекара выступіў на старонках перыядычнага выдання «Паментнік магнетычны Віленьскі» палкоўнік польскага войска Міхал Пашкоўскі. Ён расказаў, што Антосік у 1816 годзе вылечыў яго падданага ў Налібаках Кароля Шэмета, якога ніяк не маглі вылечыць дактары. Але і абарона палкоўніка не памагла ўжо Антосіку. Як хутка стала вядома з віленскіх газет, ён быў аддадзены памешчыкам Чаркоўскім у рэкруты.

Пра Антосіка Ян Чачот, вядома ж, чытаў у газетах. Але ведаў ён пра незвычайнага лекара яшчэ, як зноў сцвярджаюць польскія даследчыкі, да шуміхі вакол яго імя ў друку: Антосік жа быў з родных мясцін паэта...

І такіх прыкладаў «жыццёвасці» балад Яна Чачота можна б было даць тут нямала.

Інакш кажучы, калі добра прыгледзецца да творчасці Яна Чачота, то няцяжка ўбачыць, што якраз тут, у Рэпіхаве, у ваколіцах Новай Мышы і Баранавіч, яе самыя глыбінныя карані.

НАВАГРАДАК

Чыстая і звонкая раніца, ужо добра выстуджаная здаровым перадзімнім холадам. Барвовае, зусім няцёплае сонца, якое колькі хвілін назад неяк незаўважна ўсплыло над узгорыстым полем, толькі там-сям прабіваецца на цемнаваты асфальт скрозь даволі густую яшчэ тут лістоту пасвятлелых ясеняў і заўсёды зялёных таполяў, што дзвюма роўнымі сценкамі выструніліся ўздоўж дарогі. Кроны іх так перапляліся ўверсе, што здаецца, быццам мы едзем доўгім зялёна-залатым тунелем.

Ён, гэты тунель, толькі зрэдку перарываецца невялікімі прагаламі, поўнымі такога вабнага ўвосень сонца.

Пераначаваўшы ў Валеўцы, у гасціннага гаспадара добра дагледжанага вясковага дома, вядомага краязнаўца, аўтара даволі змястоўных кніг пра паходы школьнікаў па шляхах паэтаў і герояў роднага краю настаўніка Уладзіміра Аляксандравіча Урбановіча, мы прастуем у старажытны, слаўны многімі падзеямі свайго вельмі цікавага гістарычнага мінулага горад Навагрудак.

І вось яны — дзе брукаваныя каменем, дзе заасфальтаваныя, а дзе і проста «без пакрыцця» — вулачкі і вуліцы вечна новага, хоць і старога горада.

Спачатку мы спрабуем коламі машыны брукаванкі садовай ускраіны. Тут можна пачуць яшчэ голас пеўня, убачыць у глыбіні цеснага ад розных прыбудовак і дрэў двара, як жанчына, закасаўшы па локаць рукавы кофты, мые ў цынкавых ночвах, пастаўленых на старым услоне, бялізну, улавіць вухам глухі шоргат рыдлёўкі, якой перакопваюць — відаць, ужо на зіму — агарод...

Тут гэтак жа, як і было
у Ягоную пору:
таксама пахне мятай,
той самы вецер ад бору...
Тут тая ж мова і песні,
тыя ў садку незабудкі,
толькі болей галасу
ў сённяшнім Навагрудку.

Гэта ўсплылі ў памяці перакладзеныя мною раней радкі верша польскага паэта Станіслава Рышарда Дабравольнага, які хацеў у ім выказваць сваё ўражанне ад наведання радзімы Адама Міцкевіча.

Брукаванка прывяла нас на цэнтральную плошчу горада, дарожны знак падказаў месца аўтастаянкі, куды мы і павярнулі. Стаянка была ў двары напалову разбуранага, з грудамі бітай цэглы і друзу ўсярэдзіне даўняга дамініканскага касцёла Святога

Міхала, да якога, як сказаў мне Леў Паўлавіч, і прымыкала тая школа, дзе вучыліся ў пачатку XIX стагоддзя Адам Міцкевіч з Янам Чачотам. Гэта тут пачыналася дружба вялікага польскага паэта з пачынальнікам новай беларускай літаратуры, дружба, якую абодва яны пранеслі праз усё жыццё.

І Чачот, і Міцкевіч пра сваё сяброўства ў Наваградскай школе заўсёды ўспаміналі з цеплынёй, даражылі і ганарыліся гэтым сяброўствам. Калі ў 1818 годзе філаматы святкавалі дзень нараджэння Адама Міцкевіча, Ян Чачот, як бы парушаючы загадзя падрыхтаваны сцэнарый урачыстасці, весела, па-сяброўску перапыніў Тамаша Зана, які першы выйшаў вітаць імянінніка, і сам узяўся «зачынаць» гэту ўрачыстасць, кажучы вершам так: «Мы склалі з Занам сцэнарый: ён павінен быў пачынаць свята, а я меўся заканчваць яго і прынесці вершы «на дэсерт». Але даруй мне, Тамаш, што... мушу разбурыць наша тварэнне. Бо якім вокам глянуў бы на мяне Адамэк, калі б ты пачаў весці рэй, а я сядзеў у кутку, як дурачына (я, нашай супольнасці частачка!), нічога не кажучы, хоць мне столькі можна расказаць пра нашу дружбу. Ён сказаў бы тады: «А дзе ж мой сябрук, з якім у адной школе лёталі па калідорах, лазілі па брамках і брамах, ловячы аднаго з папоўскіх прыслужнікаў і даючы яму добрага чосу, а калі той усчынаў дзікі піск, мы, брыдзячыся, са смехам адпускалі яго і на голас званка хутчэй беглі ў клас... А хто лепей, чым я з Янам, карыстаючыся шыфраванай мовай, абдурваў прафесараў?..» Думаў бы яшчэ Адам, што я забыўся пра нашы клятвы на Псей-горцы памагаць адзін аднаму, стаяць гарой адзін за аднаго... Хоць мы ў сваволі траціліся маладыя гады, заўсёды на чале класа стоячы ў мілай згодзе, перамагаючы ўсіх адвагай, часцей балбатнёй, былі мы першыя ў нікчэмным вучэнні... Хаця нас пераўзыходзілі іншыя сваім выглядам: былі высокія, як чаплі, а мы, як сарокі, малыя, усё ж святыя дамініканцы, якім мы смела і горда, са з'едлівай насмешкай выказвалі сваю агіду, міжволі адводзілі ад нас узброеную бізуном руку...»

У сваю чаргу Адам Міцкевіч склаў да дня нараджэння Яна Чачота 24 чэрвеня 1819 года свае прывітальныя «ямбы», у якіх таксама ўспомніў школьныя часы ў Наваградку:

Яне! Музы наперабой бляск твайго верша ўслаўляюць,
Мне ж памагчы не хочуць — я сам заспяваю.
Са мной ты заўсёды — дома я ці ў прыволлі:
Каго ж больш люблю я, хто ж мілейшы мне болей?
Яшчэ на парозе жыццёвым, у галасе вуліц,
Адны ў нас навукі былі, перапалкі і гулі.
Хто ж, апроч нас з табой, Яне, гэтак сваволіў,

Што аж трэсліся сцены, бывала, у школе?
Хто ж да нас белакаптурным так смела пярэчыў,
Пад палкі іх горда падстаўляючы плечы?..
Хаця гіра чарцей мы спрачаліся да пасінення,
Хаця, пра душу маю дбаючы, на богамаленні
Мяне ты з аблок, куды я ўсё лётаў у марах,
Зноў да Бога вяртаў, таўхануўшы мне ў карак,
Думка адна ўсё ж была ў нас, адна да навукі рахуба,
Пакуль не ўзяў цябе ў лапы свае Людвік Дзюба[2].
Пачаў ты тады ад стоіцкіх цнот ухіляцца
І жыць не так набожна, жыццём захапляцца.
Тады, сіл паднабраўшы, нібы з крыніцы чароўнай,
Ты перамог Адама фізічна й духоўна...*

Як відаць з гэтых сяброўскіх прызнанняў, ні Адама Міцкевіча, ні Яна Чачота ўжо не задавальнялі казённыя, часта схаластычныя «навукі», якія ім убівалі ў галовы з дапамогаю бізуноў «белакаптурныя» (ад адзення — белы каптур) — святыя ксяндзы-дамініканцы, каго яны не раз «абдурвалі» сваёй «шыфраванай мовай». З затхлых цемнаватых калідораў дамініканскай школы іх неадольна цягнула на волю, на прастор, дзе віравала сапраўднае жыццё, з усімі яго бедамі і радасцямі, з яго здзіўляючымі кантрастамі і супярэчнасцямі, і дзе людзі рупіліся зусім іншымі, чым у школе, вельмі далёкімі ад кніжных, турботамі. Неадрыўныя ад жыцця, ад свайго мінулага і сучаснасці, гэтыя людзі часта ў саміх сабе неслі гісторыю: напрыклад, бацька Адама Мікалай Міцкевіч быў удзельнікам паўстання пад кіраўніцтвам славутага, ужо авеянага легендамі мяцежнага генерала Тадэвуша Касцюшкі і мог нямала цікавага расказаць сыну, як і яго сябру, Яну Чачоту.

Расказы бывалых людзей, асабліва такіх во абпаленых у бойках, як Мікалай Міцкевіч, паўстанцаў, мэты якіх так і засталіся няспраўджанымі, бударажылі розумы і сэрцы дапытлівых юнакоў, гэтакіх непадобных да іншых, часта старэйшых па ўзросце («даўгіх, як чаплі») і тупаватых, няздатных да навукі, але паслухмяных «шкаляроў». Ды і самі сябры добра ўжо бачылі праявы ганебнага нацыянальнага і сацыяльнага ўціску, парадаксальнай няроўнасці паміж людзьмі, бачылі, як пад нядрэмным цівунскім вокам дзень пры дні, з веку ў век лье крывавы пот, у тры пагібелі згінаецца на полі растлусцелага і тупога ад самазадаволенасці пана-самадура зусім бяспраўны перад законам, аддадзены ў поўную ўладу прыгонніка мужык-хлебароб, які корміць свет, а сам ужо недзе пасля каляд часта толькі ў сне бачыць скарынку чорнага хлеба.

Пра гэта ўжо тады, у школьныя часы, пачыналі задумвацца абодва юнакі, надзеленыя ад прыроды чулай душой і добрымі сэрцамі. Ужо тады са спагадай, з павагаю глядзелі яны на просты люд, з якім сустракаліся на колсным кроку — і ў самім Наваградку, і ў яго ваколіцах. Ці не гэта спагада, гэта павага і цягнула іх больш уважліва прыгледзецца да народнага жыцця, вывучыць вусную паэзію беларуса-селяніна, яго звычаі, абрады, вераванні? Пра зацікаўленасць Яна Чачота і Адама Міцкевіча народнай творчасцю ўжо ў часы навучання ў Наваградку сведчыць іх блізкі сябар і зямляк, таварыш па Віленскім універсітэце і Таварыстве філаматаў Ігнат Дамейка, які піша ў сваіх успамінах: «Два нашы студэнты Наваградскай школы з гадоў маленства добра ведалі наш літоўскі (г. зн. беларускі. — К. Ц.) люд, палюбілі яго песні, прасякнуліся яго духам і паэзіяй, да чаго вядома ж, прычынілася і тое, што малое мястэчка Наваградак не шмат чым адрознівалася ад нашых вёсак і засценкаў. Школьнае жыццё было хутчэй сельскае. Сябры хадзілі на кірмашы, на царкоўныя ўрачыстасці, бывалі на сялянскіх вяселлях, дажынках і хаўтурах. У тыя школьныя часы ўбогая страха і народная песня распалілі ў абодвух першы паэтычны агонь. Адам хутка ўзнёсся да высокай сферы сваіх цудоўных твораў, Ян жа да смерці застаўся верны народнай паэзіі...»

Ад дамініканскага касцёла мы скіравалі перш на высокі, яшчэ здалёку бачны зялёны курган, можна сказаць, у самым цэнтры Наваградка — Курган бяссмерця. Курган гэты быў насыпаны ў 1924—1931 гадах у гонар вялікага наваградчаніна Адама Міцкевіча, генія польскай літаратуры. Насыпаны не толькі беларусамі і палякамі, закаханымі ў яго паэзію, але і прыхільнікамі таленту вялікага паэта з самых розных канцоў свету, што прыязджалі сюды, каб пакланіцца яго «краю гадоў дзяціных».

Па вільготных ад расы сходах узняліся на вяршыню кургана. Адсюль у жаўталісці садоў і прысадаў добра відаць быў ці не ўвесь Наваградак — з высокімі, шматпавярховымі сучаснымі дамамі ў цэнтры і драўлянымі, па-гарадскому дагледжанымі — па ўскраінах.

І сярод вялікага збежышча дамоў і дамкоў хаваліся ў золаце дрэў нешматлікія, праўда, але ж вельмі яркія памяткі далёкага мінулага, якія пакінула нам гісторыя гэтай зямлі і якія так ці інакш звязаны з імем Адама Міцкевіча. Зусім блізка адсюль чырва неў чарапічным дахам заснаваны яшчэ ў XIV стагоддзі вялікім князем літоўскім Вітаўтам фарны касцёл, дзе 22 лютага 1799 года быў ахрышчаны будучы вялікі паэт. У другім месцы, заслонены прысадамі, бялеў Дом-музей Адама Міцкевіча, адбудаваны на тым

жа самым месцы, дзе стаяў некалі пад вартай раўнюткіх таполяў бацькоўскі дом паэта і дзе праляцела яго дзяцінства. Унізе гойдаўся вершалінамі дрэў пасаджаны ў гонар Адама Міцкевіча гай — «Гай Міцкевіча». Недалёка адсюль была і гара Міндоўг, пра якую пісаў у сваіх творах паэт...

Кожнаму, хто прыязджае ў Наваградак, адразу кідаюцца ў вочы высачэзныя сцены разбуранага старажытнага замка, якія ўзвышаюцца над горадам. Пабудаваны замак быў, здаецца, яшчэ недзе ў XII стагоддзі, калі Наваградак з'яўляўся сталіцай Вялікага княства Літоўскага. З гэтым замкам звязана нямала бурных гістарычных падзей, яркіх старонак гераічнага змагання навагрaдчан з іншаземнымі прышэльцамі і ў першую чаргу з крыжакамі.

Падняўшыся па крутым схіле на Замкавую гару, мы не без душэўнага ўзрушэння падышлі да магутных сцен велічнага замка, кожны камень якога быў яскравым сведкам неспакойнага мінулага краю. Здаецца, прыкладзі вуха да гэтых абпаленых і пашчэрбленых старажытных камянёў і адразу пачуеш бразгат зброі, шматгалоснае ржанне коней, баявыя воклічы і перадсмяротныя крыкі воінаў. Добра пачуў галасы сівой мінуўшчыны малады Адам Міцкевіч, фантазію якога не магла не абудзіць маўклівая веліч замка:

Замак заснуў — ні агню і ні дыху,
Толькі на вежах бяссонная варта
Воклічам цішу палохае ўпарта...
Раптам дайшло вартавому да слыху:
Постаці нейкія нібы на гонях...
Чорныя цені за імі гурбою...
Блізка ўжо... скачуць у чвалам на конях...
Панцыры зззяюць, і бразгае зброя...
(Пераклад. С. Дзяргая)

Гэта — з паэмы «Гражына», якая стала сапраўдным помнікам Навагрaдку.

Але ёсць яшчэ адзін, хаця магчыма і сціплейшы, паэтычны помнік гэтаму старажытнаму гораду — балада Яна Чачота «Наваградскі замак», на пісаная на некалькі гадоў раней за паэму Адама Міцкевіча. Балада Яна Чачота каштоўная тым, што захавала народнае паданне пра зруйнаванне замка шведамі. У паданні і ў баладзе расказваецца пра тое, як наваградскі князь здаў ворагу замак. А было гэта так. Князь закахаўся ў шведку, якую падаслалі яму ворагі. Дзяўчына, як яе навучылі шведскія военачальнікі, паабяцала князю выйсці за яго замуж, калі ён

здасць замак. Пры гэтым запэўніла, што Наваградак застанецца цэлы, «не дазнаецца згубы». Але аказалася зусім інакш: шведы зруйнавалі замак і з жорсткасцю расправіліся з навагрaдчанамі. Ян Чачот падае ў баладзе захаваныя ў народнай памяці страшныя карціны гэтых распраў. Як людзей «клалі на воз і ўціскалі жэрдкаю, бы сена», а малых дзяцей ставілі за лаву і прыціскалі гэтай лавай да сцяны: такая «жорсткая забава, кажа, Ян Чачот, была ў гэтых дзікіх тыранаў...».

Пасля Замкавай гары мы зайшлі ў Дом-музей Адама Міцкевіча, у якім, дарэчы, некалі працаваў і мой спадарожнік.

Цяперашні дырэктар музея Лілія Уладзіміраўна Усэнка правяла нас па музейных залах, расказала пра найбольш цікавыя экспанаты, пахвалілася навейшымі набыткамі. Так, у музеі ўсё робіцца, каб найлепш расказаць наведнікам пра вялікага Адама Міцкевіча, пра яго сувязь з роднай Навагрaдчынай, раскрыць вытокі чароўнай міцкевічаўскай паэзіі.

Ну, а як жа паказваецца ў музеі першы сябар Адама Міцкевіча, беларускі паэт і фальклярыст Ян Чачот, з імем якога столькі было звязана ў генія польскай літаратуры?

Як гэта ні дзіўна, Лілія Уладзіміраўна паказала мне ў экспазіцыі толькі невялікі партрэт Яна Чачота сярод такіх жа партрэтаў іншых сяброў-філаматаў — Юзафа Яжоўскага, Францішка Малеўскага, Ігната Дамейкі і Юзафа Кавалеўскага. І ўсё!

І наогул — ходзячы па Навагрaдку, я, акрамя гэтага партрэціка ў музеі, нідзе не знайшоў ніводнай, нават самай маленькай, памяткі пра пачынальніка нашай літаратуры і першага беларускага фальклярыста Яна Чачота, хоць яго жыццё таксама было вельмі цесна звязана з Навагрaдкам і Навагрaдчынай. У Навагрaдскім жа павеце нарадзіўся і правёў ён свае дзіцячыя гады: і Малюшычы, і Рэпіхава якраз адносіліся тады да гэтага павета. У Наваградку разам з Адамам Міцкевічам вучыўся паэт, сюды прыязджаў ён і пазней з Вільні — і ў сям'ю сябра, і да сваіх бацькоў у вёску Лоўчыцы, недалёка ад горада (у цяперашнім Мітрапольскім сельсавеце), куды яны пераехалі з-пад Новай Мышы, узяўшы ў арэнду панскі фальварак. На Навагрaдчыну вярнуўся паэт і пасля ссылкі. Карацей кажучы, Навагрaдчына — радзіма і Адама Міцкевіча, і Яна Чачота. Дык ці ж справядліва, што навагрaдчане, аддаўшы ўсю, якую было можна, даніну пашаны Адаму Міцкевічу, амаль зусім забылі Яна Чачота?

Так, вельмі непараўнальныя гэтыя дзве постаці: Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Але ж гэта толькі ў дачыненні польскай літаратуры, для якой Чачот сапраўды зрабіў як паэт не вельмі

многа. Што ж да нашай, беларускай літаратуры і культуры ў цэлым, то тут значэнне Яна Чачота непамерна ўзрастае. Як-ніяк, ён першы значны беларускі паэт, першапраходзец у новай беларускай літаратуры і адначасова першы наш фальклярыст і, я сказаў бы, першы мовазнавец. Ды і наогул — ці не занадта была заніжана ў нашым літаратуразнаўстве ацэнка дзейнасці Яна Чачота, які аказаўся ў вялікім цяні Адама Міцкевіча, ці не пара нам больш уважліва прыгледзецца да Чачотавай спадчыны?

У асяроддзі філаматаў, ды і ўсёй віленскай моладзі, Ян Чачот быў прызнаным «дударом» — аўтарам шматлікіх песень, вершаў, розных зарыфмаваных прывітанняў, сцэнак. Большасць з гэтых твораў нідзе не публікавалася. Ды Ян Чачот і не ставіў перад сабой такой мэты. Яны былі прызначаны для непасрэднага выканання на сходках моладзі, на сяброўскіх імянінах філаматаў, да якіх усе яны вельмі старанна рыхтаваліся. Пасля разгрому віленскіх згуртаванняў моладзі царскімі ўладамі і закрыцця ў 1832 годзе Віленскага універсітэта песні Чачота, як і іншых філаматаў, паступова забыліся. Але частка іх захавалася ў розных паперах, якія трапілі ў віленскія архівы. Упершыню большасць з філамацкіх твораў Яна Чачота пабачылі свет толькі ў наш час, праз сто гадоў пасля іх напісання, а канкрэтней, у 1922 годзе, калі польскі літаратуразнавец Ян Чубэк сабраў і выдаў у Кракаве двухтомную «Паэзію філаматаў».

Песні і вершы да студэнцкіх урачыстасцей пісалі (а часта і проста імправізавалі) разам з Янам Чачотам яшчэ Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ануфры Петрашкевіч і іншыя філаматы. «Аднак, заўважае вядомы польскі фальклярыст Станіслаў Свірка ў сваёй кнізе «З кола філамацкага перадраматызму», выдадзенай у 1972 годзе ў Варшаве, наймацней адбілася ў жыцці філаматаў песенная творчасць якраз Чачота. Не было імянін, маёўкі ці сяброўскага сходу, якога б Янак (альбо Ян з Мышы — як яго таксама звалі) не аздобіў сваімі сардэчнымі «песенькамі», як заўсёды, патрыятычнымі, народнымі па сваім духу, нярэдка напісанымі на матыў песні беларускага люду...»

Тыя песні Яна Чачота, і польскія, і беларускія, якія дайшлі да нас дзякуючы публікацыі Яна Чубэка і іншых польскіх даследчыкаў, паказваюць нам не абы-які песенны талент паэта. Напеўнасць, «крылатасць», непасрэднасць і празрыстасць верша — гэтыя якасці дазвалялі Чачотавым песням вельмі лёгка класціся на музыку.

Зрэшты, Ян Чачот звычайна пісаў іх на гатовы ўжо матыў добра вядомых яму беларускіх народных песень. Пры гэтым ён не забываўся зазначыць на матыў якой канкрэтна народнай песні трэба было спя ваць напісаны ім верш.

Вельмі любілі філаматы, ды і наогул віленская моладзь, напрыклад, вясёлую, жыццярадасную песню Яна Чачота «Што старыя за вар'яты», напісаную дзесьці ў 1818 ці 1819 годзе на матыў беларускай народнай песні «Чаму дзеўку не любіць, калі дзеўка ладна», што адзначыў сам аўтар. Вось гэта песня ў маім перакладзе:

Што старыя за вар'яты:
Мелюць без прычыны,
Быццам час. свой марна трацім
Мы каля дзяўчыны.
І ўсё пхнуць нас да работы,
Хоць таго не знаюць,
Што да працы я ахвоты
Без дзяўчат не маю!
З любай стрэнуся, бывае,
Прыгарну к сабе я,
Сэрца радасцю палае,
Галава яснее.
Жыць тады, сябры, ахвота,
Хораша наўкола.
Мігам робіцца работа
З песняю вясёлай!
Дык мяліце ж без прычыны
Вы, старыя людзі, —
Вас паслухаем тады мы,
Як дзядамі будзем!

Такой жа бадзёрай, аптымістычнай была вельмі папулярная таксама сярод моладзі песня Яна Чачота «Прэч, прэч, сум, нудоты...». У прыпісцы да яе аўтар адзначыў, што напісана яна на матыў песні «крывічан», як зваў ён беларусаў, песні, якая пачыналася словамі: «Сем дзён малаціла, чах, чах — зарабіла...» Ахвотна спявала моладзь і песні Яна Чачота, якія былі ім створаны на матывы беларускіх народных песень, што пачыналіся такімі словамі (іх зноў-такі аўтар прыводзіць — каб ведалі, як іх спяваюць): «Ой валы ж мае да палавыя», «Бяду сабе купіла да за свае грошы», «Як не бачу Петруся, то я з ветру валюся» і інш.

У многіх песнях Яна Чачота адбіліся антыўрадавыя настроі моладзі, вольналюбівыя ідэі аўтара. Гэтыя творы, якія выконваліся на розных студэнцкіх сходках і ўрачыстасцях, віленская моладзь заўсёды сустракала бурнымі воплескамі, а самога аўтара часам падымала «на ўра».

Але самы вялікі поспех у студэнцкай моладзі, большая частка

якой паходзіла з апалячанай беларускай шляхты, мелі тыя філамацкія творы Яна Чачота, што былі напісаны па-беларуску. Сам факт звароту да мовы запрыгоненага, бяспраўнага мужыка-беларуса гаварыў аб многім, і перш за ўсё аб адкрытым дэмакратызме паэта, аб адмаўленні ім бесчалавечнага прыгонніцкага ладу. Гэты дэмакратызм, як бачым, імпанаваў і перадавой віленскай моладзі.

Першымі з беларускіх твораў Яна Чачота, якія дайшлі да нас, былі тыя, што напісаў паэт да імянін старшыні Таварыства філаматаў Юзафа Яжоўскага, які быў родам з Украіны.

Спраўляліся гэтыя імяніны 7 сакавіка 1819 года і называліся «Яжовыя» — па прозвішчу віноўніка ўрачыстасці.

Сам Ян Чачот, які заўсёды выступаў са сваімі вершамі на. падобных урачыстасцях, гэты раз прыехаць на свята не здолеў. Як службовец «Масы радзівілаўскай» — спецыяльнага бюро па ўпарадкаванні архіваў князёў Радзівілаў, ён у гэты час быў камандзіраваны ў Мінск. Адтуль паэт і прыслаў свае вершы сябрам у Вільню, выказаўшы пры гэтым — зноў-такі ў вершаванай форме — шкадаванне, што ў той час, як яго прыяцелі «апаражняюць бутэлькі» ў вясёлым застоллі, ён «посціць, як святы», у Мінску, дзе яго прымушае «маршчыніць чало мазольная пасада пісара». Прысланыя вершы Яна Чачота зачыталі на ўрачыстасці Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, а тыя, што былі прызначаны для спеву, выконваліся жаночым і мужчынскім хорамі. Беларускія вершы і песні Яна Чачота склалі сабой цэласную драматычную сцэнку, прызначаную для выканання на ўрачыстасці ў гонар Юзафа Яжоўскага. Дзейнымі асобамі былі тут вясковыя людзі, якія быццам бы прыйшлі павіншаваць імянінніка.

Першы выйшаў з віншаваннем цівун, беларуская мова якога была перасыпана польскімі словамі і выразамі — характэрная для такіх «падпанкаў» гаворка. Цівун (здаецца, гэту ролю выконваў Тамаш Зан) пачаў так:

> Чулі мы гэта, што есць вашэць украінец
> І контэнт[3], што ўрадзіўся ў жызнай краіне,
> Як абачыў, што ў нас нявелькі дзядзінец,
> Сказаў: «Як брыдко мешкаюць[4] ліцвіне[5]...»

Далей цівун жартам аспрэчвае імянінніка, кажучы не без іроніі, што там, на Украіне, вельмі добра: «Хаты злепкі з гною, бо вы лесу не маеце...» І хоць там вельмі родзіць жыта і пшаніца («бо ў вас грунт харошы, чарназёмны, тлусты»), але ж усё роўна ўкраінскія чумакі едуць па прыбытак у Беларусь — любяць валацужнічаць.

Аднак мы ім назоліць[6] не хочам ніколі,
І ты, мілы панічу, не смейся з нас, просім.
Усё гэта дзеецца па нябескай волі.
Гультай часты, дзе добра.
Мы больш працы зносім.
Пагадземся. Мы людзі добрае есць душы.
Не будзь і ты ніколі ліхім, панічэньку.
Не трэба ламаць тае, скуль груш дастаў, грушы,
Помні, што ты вучышся ў нашым Вілейку[7].
Згода. Але сягоння мы ся даведалі,
Што Вашы імяніны, святога Язэпа,
А каб Вы к сабе нашу прыхільнасць пазналі,
Ідзем гэта, не сядзім у хаце, як Мазепа.
Будзем цябе віншаваць. Я есць цівун з двара.
Гэта — сельскі дзесятнік, ён лысіну гладзіць,
Ён знаець іспраўніка, знаець асэсара,
Маскалёў[8] на кватэру, як чартоў, нам садзіць.
Там войт, што уса круціць, чалавек бывалы,
Быў у Гданьску, у Кралеўцу плаваў на віціне,
Ось там стаіць маладзец, жаўнер дасканалы,
Ён, бядак, кабылінку з'ядаў у Мадліне.
Там у куце музыка: як ён добра граець!
«Свінні ў рэпе», і «Дзюбу», і польскія танцы.
А гэта ёсць Алёнка, очы ў дол спушчаець,
А там бачу: Альжбетка ў сіняй катанцы.
Но, зачніце, дзявочкі, пану заспявайце,
Ён вам дасць па ўстужачцы, борзда зачынайце.

Тут перад Юзафам Яжоўскім і ўсімі ўдзельнікамі свята ўзнікае цэлая група па-святочнаму апранутых дзяўчат, якія хорам спяваюць Чачотаву песню:

Што ж мы Вашэці скажам,
Простыя з сяла дзяўчата?
Якія ж песні звяжам?
У нас мысль не багата!
Але як мыслім, чуем,
Так табе заспяваем,
Так цябе павіншуем —
Няшчырасці не знаем.
Лісічка, жоўты грыбок,
Слімакоў не баіцца;
Не точыць яго чарвячок,
Ён у лесе здароў блішчыцца.

Конік па полю дурэе,
Хоць копы вазіць не дбае,
Салавей хораша пее,
Самічку к сабе склікае.
Будзь, як лісічка, здаровы,
Як конік, вясёл пры трудзе.
Няхай тваё пісьмо, размовы,
Як салаўя голас будзе.

Пасля дзяўчат выходзяць наперад хлопцы, якія спяваюць:

Мы ад сахі, ад бараны,
Мала вам спяваці будзем!
Чытаць, пісаць не учаны,
Ат сабе трохі загудзем.
Колька ў снопе есць зернетак,
Толька жый шчаслівых лётак;
А калі замнога гэта,
Аглядай сотнае лета.
Колька за адным пакосам
Касец добры траў схэндожыць[9],
Толька табе перад носам
Бог няхай чырвонцаў зложыць.
А як мы заўшэ[10] да леса
Ад некрутаў уцякаем,
Так няхай бяда да беса
Уцячэ, пех ей не знаем.
Няхай цябе панны любяць
І часта просяць зазулькі, —
Калі з табой ся зашлюбяць
І ад'едуць ад матулькі.

Тут ізноў дзяўчаты змяняюць хлопцаў. Яны расказваюць у песні, што сярод іх ёсць прыгожая паненка, якая яснейшая і бялейшая за малако, «што блішчыцца ў даёнцы», «цнатлівая і разумная», і раяць імяніннику «свацею жычліву», якая паможа яму здружыцца з той паненкай: «Будзеш мець краску жонэнку».

Вось асобныя радкі гэтай песні:

Ужо даўно шчабятала
Сарока нам на паркане,
Яна міламу казала:
Да едзь жа ж ты да нас, пане.

Прымуць там з хлебам, соллю,
Там пачцівых людзей любяць...

Дзяўчат перабівае зноў хлапечы хор. Хлопцы расказваюць у песні, што яны пачулі, быццам бы людзі «вельмі брыдка» казалі аб імянінніку. Нібы ён усё «заслепен» у кніжках, а на паненак і не глядзіць! Далей згадваецца нейкая Гертруда, якая жыве за сцяною ў Яжоўскага, але ён не карыстаецца гэтым. Хор раіць яму жартам:

Папраўся, мілы паночку,
Любі ладныя дзяўчата...

Бо, спявалася далей у песні, калі завітае старасць, ужо нельга будзе зведаць шчасце кахання.

Калі хлопцы закончылі песню, выходзіць войт, які кажа да іх:

Што ж маўчыце? Ці вам ся ўжо песні урвала?
Чы вы іх так складаці ўмееце мала?

На гэта адзін са спевакоў адказвае — зноў жа вершам:

Не, бацька, у нас песні, колька рыб у Нёмні,
Але на тое, мілы галубчыку, помні,
Што мы па-руску леем, а нашы панове
Па-польску ўсё гавораць; кепска нашай мове!..

У вершаванае перамаўленне ўключаецца другі са спевакоў, які прапануе сябру Мікіту праспяваць «тую песню, што для сваёй Алёнкі спяваў напрадвесню...». Мікіта адразу згаджаецца. Песню Мікіты варта прывесці цалкам:

О, мая ты зорка ясна,
Доўга ж цябе любіць буду?
Уздыхаць яшчэ напрасна
І цярпець на сэрцы нуду?
Не будзеш ты літавацца
Над няшчасным Мікітою?
Час табе, міла, пазнацца,
Што ты для мяне мукою.
Цярплю доўга, выглядаю
Пацехі ад цябе, люба;
Няхай жа ўжо яе маю,

Не будзь ты для мяне згуба.
Ці ж дагэтуль не пазнала,
Што я за табою гіну?
Хочаш жа, каб аглядала
Маея смерці гадзіну?
Пазнай, любая Алёнка,
Тваё шчасце, тваю долю;
Будзеш меці усютэнька,
Панюю дам табе волю.
У мяне сотня авечак
Па зялёнай ходзіць пашы;
Кароў, бычкоў, цялушэчак
Поўны есць аборы нашы.
Чарназёмны мае нівы,
Пшаніцу родзяць буйную;
Садок есць, у нём грушы, слівы,
Хату маю некурную.
Не будзеш меці швагеркі
Ані з дзевера назолы;
Я не прывык да кватэркі,
Будзеш жыці, як анёлы.
Не вельмі ж я то і брыдкі,
Глядзеўся у чыстым ручаю;
Гэта ужэ былі б збыткі
Назваць мяне негадзяю.
Эй, любі мяне, Алёнка,
Застань маёю жаною;
Узойдзе для нас шчасця слонка,
Добра будзець з Мікітою.

На заканчэнне ўсёй гэтай невялічкай пастаноўкі бярэ слова дзесятнік, які, звяртаючыся да імяніннка Юзафа Яжоўскага, просіць у яго прыняць усе гэтыя шчырыя зычэнні ад сялян.

Беларускія вершы Яна Чачота ўдзельнікі свята сустрэлі з вялікай прыхільнасцю. Гэта была падзея: публічна, перад цветам віленскай моладзі і студэнтамі, якіх сабралася нямала (да імянін жа кіраўніка філаматаў былі прымеркаваны яшчэ і імяніны другога Юзафа — Кавалеўскага), на ўвесь голас гучала адлітая ў паэтычныя строфы беларуская мова — мова лапцюжнага непісьменнага мужыка! Аб тым уражанні, якое зрабілі тады на слухачоў беларускія вершы і песні Яна Чачота, сведчыць хаця б той факт, што адзін з гэтых слухачоў Ігнат Дамейка, які, апынуўшыся ў эміграцыі ў далёкай Чылі, стаў славутым вучоным-

геолагам (яго імя і цяпер носяць, напрыклад, горны хрыбет у Андах і знойдзены ім мінерал дамейкіт), нават праз 50 гадоў прыгадаў строфы з песні «Што ж мы вашэці скажам», прывёўшы іх у сваіх успамінах.

Песні з Чачотавай драматычнай сцэнкі ў гонар Юзафа Яжоўскага былі адразу ж падхоплены моладдзю, якая вельмі ахвотна іх спявала.

Папулярнай сярод моладзі была і яшчэ адна беларуская песня Яна Чачота «Да пакіньце горла драць». Напісаў яе паэт да імянін сябра-філамата Дзіянісія Хлявінскага. Выконвалася гэта песня — з адпаведнымі папраўкамі — і на імянінах іншых філаматаў.

Да нас песня дайшла (праўда, не цалкам) у варыянце, які спяваўся на імянінах Францішка Малеўскага (Яроша) — сына рэктара Віленскага універсітэта. Пачыналася гэта жартоўная песня так:

Да пакіньце горла драць,
Да пакіньце, братцы, спяваць!
Да клікнейма адно раз:
Будзь здароў, наш Ярош!
Благаславі яго Спас!..

Тут у рукапісе, які данёс да нас гэту песню, аказаўся пропуск. Пасля пропуску ішлі такія радкі:

Да дай красну дзевачку,
Каб ён з сэрца пакахаў,
Да з гарэлкай пляшачку —
Сват ад яго к ней ехаў.
Гайда, гайда, гайда, гайда!..

У канцы абыгрывалася беларуская народная іншасказальная формула, якую звычайна казалі сваты ў час сватання.

Пра той вялікі поспех, які выпаў на долю гэтай вясёлай песні, расказвае ў пісьме да Адама Міцкевіча 16 лістапада 1819 года сам аўтар: «На імяніны Дзіянісія я напісаў некалькі мужыцкіх песень (заўважце, некалькі. — К. Ц.), сярод якіх апошняя «Да пакіньце горла драць» найбольш прыйшлася даспадобы Тамашу (Зану. — К. Ц.), ён прыдумаў да яе, як ты ведаеш, матыў і лез з ёй да ўсіх, як цыган на кірмашы. А раз спадабалася песня, я мусіў напісаць вершы і для Яроша і той самы верш «Да пакіньце горла драць» перарабіць для яго. І не толькі гэта, але і «Што ж мы вашэці скажам», разахвочаныя, спявалі. Словам, на імянінах і чыталі, і

спявалі...»

Адаму Міцкевічу не проста спадабаліся беларускія песні Яна Чачота — і тыя, што ён сам чуў на імянінах Юзафа Яжоўскага, і гэта, апошняя, «Да пакіньце горла драць», пра якую ён ведаў з пісем сяброў-філаматаў. У гэтых песнях ён убачыў нешта больш значнае, больш важнае, чым звычайныя творы. Сваё захапленне песнямі Яна Чачота ён выказаў у пісьме да яго ад 27 лістапада таго ж года: «Што мяне... узрадавала — прызнаюся табе па-філамацку — гэта твая песня, правільней, твае песні, я бачу ў іх агромністы і хуткі прагрэс з часу твайго ўступлення на пісьменніцкую дарогу. Лёгкасць, ды прытым агонь, сапраўды піндараўскі[11], пераўзышлі нават тыя надзеі, якія я ўскладаў на цябе. Прэч з дарогі, Заны, прэч, Адамы! Не ляпуйся, калі ласка! Ты пішаш усё лепш...»

Беларускія песні Яна Чачота ведалі і спявалі ўсе філаматы. Ведаў і спяваў іх з сябрамі і Адам Міцкевіч. Адзін маленькі факт, пададзены ў пісьме Тамаша Зана да Верашчакаў ад 31 кастрычніка 1820 года. Едучы неяк у Вільню, Тамаш Зан заначаваў у заезным доме ў Канвалішках. Раптам сярод ночы яго будзіць гучны і вясёлы спеў:

Да пакіньце горла драць!..

Калі ён прахапіўся, то ўбачыў перад сабой двух сваіх сяброў Адама Міцкевіча і Яна Чачота. Яны ехалі з Вільні ў Наваградак і таксама спыніліся на гэтай станцыі. Даведаўшыся, што тут начуе іх сябар Тамаш Зан, яны такім во чынам і выказалі сваю радасць ад сустрэчы.

Бачачы такую прыхільнасць Адама Міцкевіча да твораў на беларускай мове, Ян Чачот і ў гонар ягонага вельмі чаканага ўсімі філаматамі прыезду з Коўна піша прывітальны верш зноў-такі на беларускай мове. У час хвалюючай сустрэчы ён пад бурныя воплескі сяброў і прачытаў Адаму Міцкевічу гэты верш, у якім выказаў радасць іх усіх:

Едзе міленькі Адам,
Глядзіце, а онь, а онь,
Ды ён харашэнькі сам,
Пад ім — вараненькі конь.
Золатам пояс ззяе,
Аж ад бляску снег тае,
На шапцы сіні баран,
Хто бы думаў, што ён пан!
Так а дзет харашэнька,
Едзе, едзе барздзенька.
Гайда...

Заканчваўся верш такімі шчырымі сяброўскімі прызнаннямі:

Без цябе ўсё тут смутна,
Па табе плача гай,
І рэчкі плывуць мутна,
У жалобе ўвесь край.
Наш ты міленькі Адам,
Насмуціў жа ты нас досць.
Наградзі смутак нам
І будзь у нас доўга госць.

Калі разам з іншымі філаматамі і філарэтамі Ян Чачот быў кінуты ў турму ў Вільні, ён свае самыя гарачыя пачуцці выказвае якраз у беларускіх песнях, на мове свайго народа. Пра тое, як узрушыла сяброў па няволі адна з такіх песень Яна Чачота, расказваюць у сваіх мемуарах філарэты Оттан Слізень і Антоні Эдуард Адынец, прыгадваючы адзін і той жа выпадак — развітанне з Янам Чачотам, Тамашом Занам і Адамам Сузінам перад самай адпраўкай іх у далёкі і цяжкі нявольніцкі шлях, ва ўральскую ссылку. Вось згадкі студэнта Віленскага універсітэта Отана Слізеня: «Колькі дзён перад адпраўкай трох асуджаных да пакарання (Зана, Чачота і Сузіна) усім дазвалялася іх наведаць. Дзверы ў камеры Зана ў кляштары ўсе гэтыя дні амаль не зачыняліся...» Калі Слізень таксама прыйшоў развітацца з дарагімі сябрамі, «у камеры было ўжо некалькі філарэтаў, сярод іх — Міцкевіч, Адынец, Пясецкі, Фрэйенд, два Таматавы браты, Чачот, Сузін і хтосьці яшчэ... Усіх я знайшоў моцна расчуленымі, бо якраз у гэтую хвіліну Чачот пад акампанемент гітары Тамаша спяваў толькі што складзеную ім песню на народнай гаворцы, песню жаласную, развітальную, што сваей мелодыяй і зместам выклікала ўсеагульны плач...» Калі Чачот скончыў свой спеў, успамінаў Оттан Слізень, усе ў вялікім расчуленні пачалі абдымаць Тамаша, Сузіна і Чачота, а Міцкевіч, стаўшы ў цэнтры, «бледны і ўзрушаны», пачаў сваю імправізацыю... З іншымі дэталямі расказвае пра гэтае ж развітанне Антоні Адынец: «Было нас некалькі дзесяткаў вечарам у камеры Тамаша Зана, куды неўзабаве зайшлі Сузін і Чачот. Апошні заспяваў пад гітару толькі што складзеную ім песню на народнай гаворцы:

Да лятуць, лятуць да дзікія гусі,
Да нас павязуць да далёкай Русі...

Далей у песні расказвалася пра гусей, якія адлятаюць на поўдзень, у той час як асуджаных павязуць на поўнач, і хто ведае, ці вернуцца яны калі-йебудзь назад. І так глыбока ўзрушыла ўсіх гэтая песня, што яна выклікала агульны плач, а спявак стаў аб'ектам абдымкаў». Тут Адынец таксама згадвае імправізацыю Адама Міцкевіча, што пачыналася такой страфой:

О любыя сёстры! І што ж гэта стала?
Я бачу: вязуць на вазах праз туманы
Па гразкіх дарогах, палях-перавалах
Зусім маладзенькіх хлапцоў у кайданах...*

Зварот да «сясцёр» наводзіць на думку, што песню Чачота і імправізацыю Міцкевіча слухалі і дзяўчаты — ім таксама было дазволена развітацца са зняволенымі перад дарогай на Урал.

Як паказвае Адам Мальдзіс у кнізе «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (Мінск, 1969), у Яна Чачота былі ў той час і іншыя беларускія творы, і сярод іх п'еса ў гонар Адама Міцкевіча, напісаная для тэатра: аб ёй упамінае ў адным з пісем Рамуальд Зямкевіч. На жаль, гэта п'еса, як і шмат іншых твораў паэта, да нас не дайшла.

На маю думку, беларускія песні і вершы Яна Чачота філамацкага перыяду, якія тут упершыню, здаецца, паказваю я нашаму чытачу ў такім вось найбольш поўным, не раскіданым выглядзе, па сённяшні дзень не ацэнены як трэба ў літаратуразнаўстве. Вядома, калі мераць іх сённяшнімі меркамі, у іх шмат можна знайсці недахопаў, асабліва моўных. Але ж не трэба забываць, што Ян Чачот быў, як ужо гаварылася, першапраходцам у беларускай паэзіі, ён ішоў па цаліне, яму трэба было яшчэ ўздымаць гэту, кажучы словамі Янкі Купалы, «скібіну слова».

Тым не менш у беларускіх творах Яна Чачота сапраўды ёсць тая «лёгкасць», той паэтычны «агонь», пра што казаў Адам Міцкевіч. Мова твораў Чачота, калі апусціць не такія ўжо і шматлікія паланізмы, мала чым адрозніваецца ад сённяшняй беларускай літаратурнай мовы. Яна ў яго даволі багатая, гнуткая, з многімі адценнямі. Узорам для Яна Чачога служыла мова беларускіх народных песень, матывы якіх ён шырока выкарыстоўваў у сваёй творчасці.

У філамацкіх беларускіх вершах Яна Чачота, і перш за ўсё ў драматычнай сцэнцы, можна ўбачыць выразныя адзнакі часу, некаторыя асаблівасці побыту беларускай дарэформеннай вёскі, яе сацыяльную структуру. Даволі жывым, «бачным» паўстае перад намі вобраз цівуна, які выступае тут ад імя сялян, не адрываючы і

сябе ад іх, і які выяўляе немалую дасведчанасць у многіх рэчах, нават у гісторыі. Хай, можа, ён тут трохі і ідэалізаваны, але ўсё ж няма ў ім той аднабаковасці, якую мы прывыклі бачыць у гэтым сацыяльным тыпе, што стаў сімвалам прыгонніцтва. Вельмі прываблівае ў сцэнцы вобраз вясковых дзяўчат-сялянак. Хоць дзяўчаты спачатку — такі ўжо ў беларусаў характар! — і «прыбядняюцца» (быццам не могуць «звязаць» песні, бо іх, бачыце, «мысль не багата»), але ж папраўдзе ўмеюць яны і «звязаць» словы, і скласці цудоўныя песні. Ды і пачуццё ўласнай годнасці ў іх ёсць: яны прама кажуць панічу, што сярод іх знойдуцца і такія, якія будуць годныя і яму ў жонкі, трэба толькі ўмець пасватацца. Праўдзівая ў Чачота і характарыстыка вясковых хлопцаў. Хоць яны «ад сахі, ад бараны... пісаць, чытаць не ўчаны», але ж таксама ўмеюць і песню спець, і выказацца як трэба. З твора відаць і іх адносіны да рэкруцтва, ад якога яны звычайна ўцякаюць у лес. Надзвычай цікава тое, што сялянскія хлопцы выказваюць трывогу за лёс сваёй мовы, называючы яе «рускай», мовы, якой цураюцца паны, што «па-польску ўсё гавораць». Вядома ж, Ян Чачот у вусны сваіх герояў уклаў сваю ўласную заклапочанасць аб мове народа.

Ян Чачот і потым пісаў вершы і песні на беларускай мове, якія ён змясціў у сабраных ім фальклорных зборніках у 1844 і ў 1846 гадах. Гэта былі ўжо больш дасканалыя ў мастацкіх адносінах творы, палепшылася і іх мова, пашырылася тэматыка. У іх таксама паэт праявіў сваю павагу да роднага народа, выказаў сваё спачуванне да яго незайздроснай долі. Так, у вершы «Да мілых мужычкоў» паэт пісаў:

Да і я ж вам памагу
Песенькі спяваці,
Ды і я ж міжы вамі ўзрос
Пры бацьку і маці.
І мне Бог на свеце даў
Гора гараваць
Штобы лепш я вас любіў
І ўмеў спагадаць
Ой, што ж вы напелі тут,
Да якога дзіва!
Шкода, што на голас ваш
Старонка драмліва.
А як прачнецца з сна
Гэта Дабрадзейка,
Пэўна, будзе слухаць вас
Лепш, як салавейка.

Але гэтым пазнейшым вершам Яна Чачота больш пашанцавала. Апублікаваныя яшчэ гіры жыцці аўтара, яны адразу трапілі ў поле зроку даследчыкаў і гісторыкаў літаратуры і былі дэталёва разгледжаны — як з мастацкага, так і з ідэйнага боку. Таму паўтарацца тут няма патрэбы.

Значэнне беларускіх твораў Яна Чачота, як кажуць, цяжка пераацаніць. Пачаўшы расцярэбліваць дарогу для новай беларускай літаратуры, ён стаў выдатным прыкладам для наступных пакаленняў творчай інтэлігенцыі «паўночна-заходняга краю» ў стаўленні да народа, яго культуры і мовы. Якраз у гэтым — важнейшая заслуга Яна Чачота перад нашай літаратурай.

З літаратурнай спадчыны Яна Чачота вялікую цікавасць маюць таксама напісаныя ім у 1818-1819 гадах на польскай мове балады, якія адыгралі надзвычай важную ролю ў творчай біяграфіі яго славутага сябра — Адама Міцкевіча.

Да нас дайшло восем балад Яна Чачота, якія ён заснаваў на вуснай паэзіі народа.

Вышэй былі разгледжаны некаторыя з іх — «Свіцязь», «Калдычэўскі шчупак», «Узногі», «Мышанка», «Наваградскі замак», у якіх паэт выкарыстаў пачутыя ім у народзе паданні роднага краю. Народныя паданні сталі сюжэтамі і такіх яго балад, як «Бекеш», «Звон на горцы ў Пазяневічах», «Радзівіл, ці заснаванне Вільні».

Польскія даследчыкі як след не ацанілі яшчэ мастацкія вартасці балад Яна Чачота. Галоўныя іх недахопы яны бачаць у рыхласці кампазіцыі, зацягнутасці апавядання, а таксама ў тым, што аўтар слепа трымаўся фальклорнай асновы ў кожнай з балад, а галоўнае — карыстаўся гутарковай мовай, «засмечанай» шматлікімі «правінцыялізмамі», «дыялектызмамі», інакш кажучы, беларускімі словамі і выразамі.

Затое з боку фальклярыстыкі польскія вучоныя надаюць баладам Яна Чачота надзвычай важнае значэнне, бо яны данеслі да нас з самага пачатку XIX стагоддзя вельмі многа каштоўнейшых звестак з галіны фальклору, амаль цалкам беларускага. Ва ўсіх васьмі баладах Янам Чачотам было «зафікса вана», як падлічыў Станіслаў Свірка, дванаццаць паданняў і народных казак, якія леглі ў аснову балад, а таксама дзесяць матываў з галіны народных вераванняў і звычаяў. Прычым як народныя паданні і казкі, так і гэтыя матывы пададзены аўтарам з вялікай дакладнасцю, што было дрэнна для гэтых балад як для мастацкіх твораў і вельмі добра як для фальклорнай крыніцы.

Доўгі час у літаратуразнаўстве нічога не было вядома нават пра існаванне большасці з гэтых балад Яна Чачота.

Упершыню пра іх расказаў у польскім друку ў 1886-1889

гадах, г. зн. праз шэсцьдзесят гадоў пасля напісання, Ян Рыхтэр, які натрапіў у паперах аднаго з сяброў паэта — гаспадара маёнтка Цешаўля Наваградскага павета Адольфа Кабылінскага — на рукапісны сшытак з Чачотавымі баладамі. Але хутка гэты сшытак ізноў на доўгі час выпаў з поля зроку даследчыкаў. Яго лічылі беззваротна згубленым. Другі раз яго знайшоў у 1953 годзе — зноў праз шэсцьдзесят з лішнім гадоў! — другі польскі даследчык Чэслаў Згажэльскі: як выявілася, перададзены ў бібліятэку Асалінскіх у Львове, сшытак быў няправільна зарэгістраваны і патануў у папяровым моры, адкуль ён і быў выпадкова выцягнуты на святло. І толькі нядаўна — яшчэ амаль праз дваццаць гадоў, а канкрэтней, у 1972 годзе, — усе восем знойдзеных балад Яна Чачота былі апублікаваны — упершыню! — Станіславам Свіркам у памянёнай кнізе «З кола філамацкага перадрамантызму». Інакш кажучы, больш чым сто пяцьдзесят гадоў яны былі схаваны ад воч чытачоў.

І хоць балады Яна Чачота нідзе не публікаваліся, яны былі вядомы сябрам-філаматам, у тым ліку і Адаму Міцкевічу.

Балады Яна Чачота надзвычай зацікавілі генія польскай літаратуры, у якой ён тады толькі шукаў сваю дарогу.

Як вядома, у першых сваіх творах Адам Міцкевіч прытрымліваўся прынцыпаў класіцызму. Творы «Мешка, князь Наваградка», «Пані Анэля», у якіх малады паэт ішоў ад Вальтэра, верш «Гарадская зіма», дзе відаць творчае перайманне ў польскага класіцыста Трамбецкага, «Ода да Бруна», «Ода да Пыры», санеты «Прыпамінаю», «Ужо з пагодных нябёс...», узорам для якіх паслужылі творы Гарацыя і Петраркі, паэмы «Бульба», «Жывіля» і іншыя творы, напісаныя з 1817 па сярэдзіну 1819 года, былі цалкам вытрыманы ў стылі класіцызму.

Тады, калі Адам Міцкевіч і ў сваёй паэтычнай практыцы, і нават у публіцыстычных выступленнях адстойваў прынцыпы гэтага літаратурнага напрамку, яго сябры-філаматы Ян Чачот і Тамаш Зан настроілі ўжо свой паэтычны слых на новыя павевы часу. А гэта быў час, калі ў выніку нарастання ўсееўрапейскага руху за разняволенне народаў устарэлыя каноны класіцызму станавіліся ўсё больш цеснымі для літаратуры, якая імкнулася адлюстраваць новыя, больш радыкальныя настроі ў перадавых колах грамадства. Адзін з галоўных шляхоў абнаўлення літаратуры перадавыя яе прадстаўнікі бачылі ў звароце да народнага жыцця, да фальклору. Гэты шлях адным з першых сярод філаматаў якраз і выбраў шчыры народалюбец Ян Чачот, які з поўным усведамленнем важнасці сваёй справы ўзяўся за мастацкае асваенне фальклорнай спадчыны свайго беларускага народа, што і адлюстравалася ў яго песнях і баладах ужо ў

1818-1819 гадах.

Адама Міцкевіча з самага пачатку прывабіла гэта тэндэнцыя ў творчасці сябра, прымусіла яго самога задумацца над сваімі творчымі прынцыпамі. Вядома, такі вялікі пералом у творчасці Адама Міцкевіча, як пераход яго да рамантызму, не быў просты і не мог быць абумоўлены якой-небудзь адной толькі прычынай. Перш за ўсё гэты пералом трэба, мусіць, растлумачыць унутранай неабходнасцю паэта ярчэй выка заць сябе і свой час, знайсці найбольш эфектыўныя, калі можна так сказаць, сродкі ўздзеяння на чытача. Да гэтага ж, вядома, прычынілася і знаёмства з рамантычнымі плынямі ў заходнееўрапейскай літаратуры і перш за ўсё захапленне творчасцю вялікага нямецкага паэта Фрыдрыха Шылера, які ў яго чытацкіх інтарэсах заняў месца Вальтэра.

І ўсё ж у пераходзе Адама Міцкевіча на пазіцыі рамантызму прыклад Яна Чачота быў ці не самым вырашальным.

Больш за ўсё цікавілі Адама Міцкевіча балады сябра. Дагэтуль ён ведаў англійскія балады, захапляўся баладамі Шылера, заснаванымі галоўным чынам на матэрыяле антычнай міфалогіі, з цікавасцю чытаў шырока вядомую баладу аўтара «Дзівосных прыгод барона Мюнхаўзена» Готфрыда Аўгуста Бюргера «Ленору» і яе шматлікія пераробкі. Вядома ж, знаёмыя былі яму і польскія балады, якія засноўваліся галоўным чынам на класічных сюжэтах і на ўзорах заходнееўрапейскай літаратуры. І вось тут ён даведваецца, што балады — гэты галоўны жанр рамантычнай літаратуры — піша яго самы блізкі сябар Ян з Мышы! І галоўнае — сюжэты для сваіх балад ён бярэ не з антычнай міфалогіі, не з заходнееўрапейскай літаратуры, а з паданняў і казак таго самага простага люду, сярод якога жыў і сам.

«Прышлі мне «Свіцязь» і іншыя твае новыя творы «Бекеша» і г. д., зробіш мне найвялікшую ласку», — піша Яну Чачоту 22 верасня 1819 года Адам Міцкевіч з Коўна, куды ён тэрмінова выехаў на пасаду настаўніка.

Просьбу Адама Міцкевіча Ян Чачот не адразу задаволіў. У пісьме да свайго сябра 30 верасня ён тлумачыў гэта перш за ўсё тым, што хацеў яшчэ перапісаць, дапрацаваць свае балады, а зрабіць гэта «не было калі». Тое ж самае кажа ён і ў другім пісьме — ад б кастрычніка: «Вершаў сваіх не пасылаю, бо поўнасцю яшчэ і не паправіў і не маю часу — то праз тое, то праз другое — паправіць. Абяцаю, аднак, зрабіць гэта адразу ж, як толькі змагу». Але Ян Чачот усё не знаходзіў магчымасці дапрацаваць і перапісаць свае творы. Міцкевічу ж не цярпелася іх прачытаць, і ён ізноў, ужо 27 лістапада, піша сябру: «Дарэмна, і не магу даўмецца, чаму дарэмна, так доўга вымольваю твае «Бекешы»,

«Свіцязі» і г. д., і г. д. Неабавязкова перапісваць, можна хаця б і так прыслаць, за што абдыму цябе на каляды». Баладу «Свіцязь», прычым неперапісаную, непапраўленую, Ян Чачот усё ж, як гэта можна бачыць з далейшай перапіскі, паслаў свайму сябру. Астатнія ж наважыў патрымаць у сябе. «Бекеша» і «Арыёна» (балада, якая да нас не дайшла. — К. Ц.) таму не пасылаю табе, — апраўдваўся Ян Чачот у пісьме да Адама Міцкевіча 7 снежня, — што яны ў мяне ў адным экземпляры, што « Арыён» яшчэ in crudo[12] патрабуе, каб я яго хоць збольшага падчасаў; што абедзве тыя балады мне нават самому не вельмі падабаюцца, а «Бекеш», выстаўлены пад удар крытыкі маладога Юзафа (так у адрозненне ад Юзафа Яжоўскага называлі сябры філамата Кава леўскага, які на адным з пасяджэнняў таварыства выступіў з разглядам Чачотавай балады, прачытанай там аўтарам. — К. Ц.), нямала атрымаў сінякоў, і я хачу цяпер сядзець, пакуль калі-небудзь не папраўлю, ціха. Хацеў бы паслаць табе найсмачнейшыя ласункі; што ж пасылаць яшчэ не апрацаваныя чарнавікі! Так што выбачай, можа, прышлю, можа, не; але калі будзеш у нас, то прачытаю табе з ахвотай».

Ян Чачот, вядома ж, выканаў урэшце сваё абяцанне, і Адам Міцкевіч меў магчымасць пазнаёміцца з усімі яго баладамі.

Першыя свае балады Адам Міцкевіч напісаў 20 снежня 1819 года (ці 3 студзеня 1820 года па новым стылі). Цікава, што з'яўленне іх зноў-такі звязана, ужо непасрэдна, з імем Яна Чачота, які ў той час якраз цяжка хварэў. Вось як піша пра гэта сам Міцкевіч у пісьме да свайго сябра: «Яне! Атрымаў твой ліст, поўны і сяброўскіх выразаў, і гарачай фантазіі. Чытаў яго, як і ўсе вашы пісьмы і як часта твае, з расчуленасцю. Вельмі ўсцешыўся, што ты зусім ужо здаровы; беражы сябе і не выходзь з дому. Хвароба твая страшна мяне напужала. Ярош напісаў мне пра яе; але ці яго паведамленне здалося мне занадта кароткім, ці проста я ўбіў сабе ў галаву, што ад мяне нешта тояць, што ты ў небяспецы. Якраз перад гэтым памёр тут адзін з гэтай хваробы, а некалькі чалавек цяжка захварэлі ёю. Усе гэтыя акалічнасці так мяне ўзбаламуцілі, што ўночы я не мог спаць, а калі, урэшце, заснуў, то мне прыснілася, нібы ты памёр; я ўскочыў, сказаў запаліць свечку і пачаў чытаць псалмы (як трывога, дык да Бога). Выбіваў з галавы соннае глупства і ў гэтым адурэнні напісаў дзве кароценькія балады, вельмі мізэрныя баладкі; адну толькі я сам зразумею, другую папраўлю, змяню і прачытаю вам на Занавым свяце...»

Адна з гэтых балад называлася «Люблю я...».

Гэта балада, як сцвярджаюць польскія літаратуразнаўцы, стала пераломным пунктам у творчасці Адама Міцкевіча, а разам

з тым і ва ўсёй польскай літаратуры, паклаўшы ў ёй пачатак новаму напрамку — рамантызму.

Услед за баладай «Люблю я...», якую аўтар прачытаў у Вільні сябрам і якую яны ўсе вельмі ўпадабалі, ён па звароце ў Коўна ўзяўся пісаць новыя творы ў гэтым жанры. На працягу 1820-1821 гадоў Адам Міцкевіч стварыў цэлае «трона» цудоўных балад, якія ў 1822 годзе выйшлі асобным выданнем пад назвай «Балады і рамансы» — кніга, што распачынала сабой новую эпоху ў гісторыі польскай літаратуры.

Пра ролю Яна Чачота ў нараджэнні рамантызму ў польскай літаратуры добра расказаў Станіслаў Свірка ў напісаных ім раздзелах кніг «Народнасць у Міцкевіча», якая выйшла ў Варшаве ў 1958 годзе, «Гісторыя польскай фальклярыстыкі: 1800-1863» (Варшава, 1970) і ў памянёнай яго кнізе «З кола філамацкага перадрамантызму». Вядомы польскі фальклярыст прыйшоў да вываду, што «... тыя «песенькі» і «балады» Чачота былі галоўным імпульсам, які падштурхнуў Міцкевіча ў кірунку народнасці, а калі казаць больш канкрэтна, у кірунку баладнасці...». Вядома, даводзіць даследчык, на Адама Міцкевіча ўплывалі і іншыя філаматы, асабліва Тамаш Зан і Ану фры Петрашкевіч, якія таксама выкарыстоўвалі беларускі фальклор у сваёй паэтычнай творчасці, але ўсё роўна «найвыдатнейшым піянерам народнасці сярод філаматаў быў Чачот, якраз яго ўплыў на Міцкевіча аказаўся ў гэтым плане наймацнейшым...». Так, разважае далей польскі вучоны, Ян Чачот «не навучыў... Міцкевіча пісаць рамантычную паэзію, таму што сам гэтага не ўмеў, аднак паказаў яму новую крыніцу творчасці і новую дарогу. Таму што быў Чачот філамацкім маяком, які стаяў на віленскіх ростанях класіцызму і рамантызму і які нязменна паказваў на народнасць. Міцкевіч пайшоў у тым кірунку, і дарога тая прывяла яго да вялікай рамантычнай і народнай паэзіі».

Вось так — ні больш ні менш.

Ды за адно ўжо гэта трэба б было побач з Курганом бяссмерця ў гонар Адама Міцкевіча ставіць у Наваградку вялікі помнік і Яну Чачоту!

Адам Міцкевіч быў, вядома ж, вельмі ўдзячны за ўсё свайму сябру. Недарэмна, прысвячаючы сваю першую, сапраўды праграмную кнігу «Балады і рамансы» сябрам-філаматам, першым сярод іх ён назваў імя Яна Чачота.

Трэба яшчэ дадаць, што Ян Чачот не толькі паказаў сапраўдную дарогу ў літаратуру Адаму Міцкевічу, але і не скупячыся даў яму з сабой у гэту дарогу добрую кайстру сюжэтаў і вобразаў для яго паэзіі.

Станіслаў Свірка, супаставіўшы балады Яна Чачота з

пазнейшымі «Баладамі і рамансамі» Адама Міцкевіча, знайшоў вельмі многа прыкладаў творчага выкарыстання таго багатага фальклорнага і жыццёвага матэрыялу, які ўтрымліваўся ў творах яго сябра.

Так, балада Яна Чачота «Свіцязь» памагла Адаму Міцкевічу напісаць аж дзве балады — «Вяртанне таты» і «Свіцязь». У баладзе «Вяртанне таты» быў выкарыстаны з Чачотавага твора момант вяртання дадому купца і напад на яго на расстайных дарогах рабаўніка, а ў «Свіцязі» — паданне пра затапленне горада. Свірка прыводзіць прыклады і тэкставых запазычанняў Адама Міцкевіча з балады Яна Чачота — такое дапускалася ў філамацкай сям'і.

У баладзе «Свіцязь» Адам Міцкевіч выкарыстаў асобныя моманты і з іншых балад Яна Чачота. Напрыклад, з «Мышанкі» ён узяў, як заўважае польскі даследчык, «матыў воднай русалкі» (дарэчы, гэты матыў добра прыдаўся Міцкевічу і для яго «Свіцязянкі») і матыў чароўнага зелля — толькі ў Чачота гэта зелле канкрэтнае і называецца, як у народзе, мінутка (ён нават прыводзіць у прыпісцы яго лацінскую назву), а Міцкевіч прыдаў той расліне новыя ўласцівасці і назваў яе кветкамі «царамі». Свірка знаходзіць у міцкевічаўскай «Свіцязі» таксама асобныя даволі выразныя запазычанні з балады Яна Чачота «Калдычэўскі шчупак».

Вельмі цікавыя сляды творчага пераасэнсавання фальклорнага матэрыялу Чачотавых балад бачыць даследчык і ў іншых баладах Адама Міцкевіча.

Акрамя таго, многія вобразы і матывы балад Яна Чачота (ды і не толькі балад) выкарыстаў Адам Міцкевіч і ў іншых сваіх творах, у тым ліку ў такіх найбольш значных, як «Дзяды» і «Пан Тадэвуш». Так, жорсткі пан-самадур, гэтак ярка намаляваны Янам Чачотам у баладзе «Узногі», з'явіўся ў другой частцы міцкевічаўскіх «Дзядоў» як прывід, які нідзе не знаходзіць сабе месца: за здзекі з прыгонных сялян гэты ліхі пан прысуджаны цярпець на тым свеце страшэнныя пакуты голаду і смагі. У Адама Міцкевіча, як і ў Яна Чачота, сяляне, якіх закатаваў і замучыў голадам іх пан, ператвараюцца ў птушак, што цяпер нападаюць на яго...

Разам з тым трэба тут сказаць, што Ян Чачот не лічыў літаратуру галоўнай справай свайго жыцця. Ён быў надзіва самакрытычны і ведаў цану свайму таленту. Хоць Адам Міцкевіч вельмі шчыра захапляўся яго творамі, пісаў яму, што не бачыць у сябе вышэйшых талентаў, чым у яго, усё ж Ян Чачот не прыняў такой завышанай ацэнкі сваёй творчасці. У 1820 годзе ў пісьме да Адама Міцкевіча ён, віншуючы сябра з поспехамі ў паэзіі, выказвае разам з тым шкадаванне, што сам ён «улез» у паэзію і

трапіў у «лік вершапісцаў»: «Вялікая розніца — пісаць вершы і пісаць вершы сапраўдныя! Як неба ад зямлі!»

Сваё прызванне бачыў Ян Чачот у іншым — у збіранні і вывучэнні беларускага фальклору, якому ён прыдаваў вялікае значэнне ў змаганні за народнасць літаратуры, за яе дэмакратызацыю.

Пра фальклярыстычную дзейнасць Яна Чачота зноў-такі напісана даволі многа. Ёй аддадзена належнае і ў беларускай, і ў польскай фальклярыстыцы. Роля гэтай дзейнасці ў развіцці нашай культуры, нашай літаратуры агромністая. Упершыню — так, ізноў упершыню! — Ян Чачот сваімі зборнікамі беларускіх народных песень, якіх ён выпусціў на працягу 1837-1846 гадоў цэлых шэсць, паказаў, што за неацэнныя багацці хаваюцца ў народзе. Сабраныя Чачотам беларускія народныя песні, а таксама прыказкі і прымаўкі і сёння не ўстарэлі, і сёння без іх не абыходзяцца ні хрэстаматыі беларускага фальклору, ні анталогіі і зборнікі, у тым ліку і цяперашняе шматтомнае выданне вуснапаэтычнай творчасці беларускага народа, якое выходзіць у Акадэміі навук БССР. Яны і сёння застаюцца выдатнай крыніцай для літаратурнай творчасці, крыніцай, якая ніколі не перасохне.

СВІЦЯЗЬ

Калі навагрудскія ўбачыш прасторы, Ракітнік разгалісты, нізкі, Каня супыні ля Плужынскага бору, Каб глянуць на возера зблізку...

І мы, паслухаўшы добрай парады Адама Міцкевіча, і праўда сунялі свайго «каня» на асфальтаванай аўтастаянцы ў глыбіні светлай паляны сярод таго самага бору, таго лесу, што ідзе сюды ад колішніх уладанняў памешчыкаў Верашчакаў — недалёкай вёскі Плужыны, якая і дала яму назву.

Была раніца, і выгоністыя спакойныя хвоі з грабняком ды арэшнікам уперамешку, што шчыльнай сцяной падступалі з аднаго боку да стаянкі, і раскідзістыя харашуны-дубы, якія, невядома адкуль прыблытаўшыся сюды, на святло, разышліся хто куды па паляне, ужо скінулі з сябе цёмную посцілку ночы і нерухома, нібыта яшчэ ў сне, стаялі, адкрытыя воку, у рэдзенькім сяйве туману, нікуды не спяшаючыся, нікуды, апрача неба, не імкнучыся: тут жа даўно і назаўсёды знайшлі яны сабе на зямлі месца, даўно абжылі гэты куток.

З-за шырокіх камлёў застылых у сваёй нерухомасці дубоў, з-за іх навіслага над зямлёй вецця адразу ж заяснела перад намі шырокая, як акінуць вокам, прастрань святла, што зусім невядома дзе злівалася з небам. Свіцязь!

Зялёным грудом, густа ўсыпаным яшчэ не пабурэлымі жалудамі, прайшлі пад шатамі дубоў да берага. Туман ужо развеяўся, і возера ляжала перад намі ва ўсёй сваёй красе. Чыстае, празрыстае. Што шкло. Аж відаць быў на дне — і далёка ўперад — надзіва белы пясок. Усё — і цемнаватая паласа лесу на тым беразе, і лёгкія белыя аблачынкі над ёю, і бледная зорачка каля іх, што чамусьці яшчэ не згасла ў святле раніцы, — выразна і хораша адбівалася ў гэтай дзівоснай люстранай чысціні. Здавалася, само неба апусцілася тут, сярод векавечных лясоў. Але хіба лепей скажаш за Міцкевіча:

Гушчар лесу пахне чаборам і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна лёду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых.
Калі пад'язджаеш начною парою
І станеш да возера тварам, —
Мігцяць зоркі ў небе, мігцяць пад табою,
Мігціць там і месяцаў пара.
Не знаеш, — з-пад ног, можа, гэта шкляная
Ідзе аж да неба дарога
Ці неба шкляное скляпенне схіляе
Табе аж пад самыя ногі!
І той, другі, бераг убачыць не ў сілах —
З вышынямі возера зліта.
Нібыта вісіш ты на птахавых крылах
У нейкім бяздонні блакіту!..
(Пераклад А. Бялевіча)

Ля возера не было ні душы. Цішыня. Толькі далятаў аднекуль з лесу роўны — з невялікімі перапынкамі — стук дзятла.

Ідучы берагам Свіцязі, слухаючы яе дрэвы, яе неба, мы маглі толькі парадавацца, што жалезная рука цывілізацыі амаль не кранулася гэтага цудоўнага кутка Беларусі. Згодна з пастановай нашага ўрада ў 1970 годзе тут створаны Свіцязянскі ландшафтны заказнік плошчай 1034 гектары. Пад абарону дзяржавы ўзяты звонкія чырванаствольыя хвайнякі, цяністыя дубровы, светлыя вясёлыя бераснякі, непаўторныя ясеневыя ды кляновыя закуткі з усім багаццем падлеску і такой разнастайнай тут фаўнай. Вучоныя знайшлі тут нямала рэліктавых раслін, сярод якіх,

напрыклад, такая ніжэйшая раслінная форма, як тэтрадыніум яванікум, што сустракаецца толькі на далёкім востраве Ява. У самім возеры былі адшуканы таксама вельмі рэдкія віды падводнага царства.

Пакручастыя сцежкі, што віліся берагам Свіцязі, паўз камлі дрэў і вываратні, прывялі нас да белага шматваконнага дома, які стаяў проста ў лесе, на невялічкай палянцы. Гэта быў славуты пансіянат «Свіцязь».

Ад пансіяната ішла к возеру асфальтаваная дарожка. Напаткаўшы яе, мы спачатку звярнулі па ёй уніз, пад бераг, адкуль вёў на самае возера нешырокі дашчаны памост на палях. Мы падышлі па ім да пансіянацкіх рыбакоў — паўнаватага чырванашчокага мужчыны і немаладой жанчыны, што стаялі побач, у канцы памоста. Жанчына неяк няўмела выцягнула з вады сваю вуду, нервова зняла з кручка адвіслы чарвяк і, насадзіўшы новы, ізноў закінула вуду назад, у возера, нецярпліва торгаючы раз-пораз вудзільнам. Мужчына ж, прыкленчыўшы, спакойна выцягваў з вады сваю даўгую многапаплаўковую леску, на якой заманліва бліснула спачатку адна, а потым і другая рыбіна. Не спяшаючыся, як бывалы рыбак, ён зняў з кручкоў рыбу — двух даволі ладных акунёў і, бултыхнуўшы іх у бляшанае вядро, дзе капашыліся яшчэ такія ж пузачы, павярнуўся ізноў да сваёй вуды-лескі. Жанчына, у пластмасавым вядзерцы якой не відаць было ні рыбінкі, толькі нядобра зіркнула на ўлоў суседа і яшчэ больш замітусілася каля сваёй дапатомнай вуды.

— Што, абмінае вас рыба? — паспачуваў жанчыне мой спадарожнік. — А вы ціхенька во з гэтай, бляшанай, пасудзіны ды ў гэту, пластмасавую...

Але жанчына не прыняла жарту: дэманстратыўна адвярнулася ад нас, не прамовіўшы ні слова. Каб не напрасіцца на непажаданыя кампліменты, мы хутчэй пакінулі рыбакоў, як кажуць, пры сваіх інтарэсах: што ж, кожны адпачывае па-свойму...

Каля пансіяната мы разгаварыліся з трыма жанчынамі, што праходжваліся па дарожцы.

— Усё тут добра, але толькі сумна, — у адзін голас сказалі яны нам. — Надта ж глуха...

Вось табе і маеш! У такім чароўным лясным куточку, сярод такой непаўторнай прыроды, каля такога дзівоснага возера — і сумна? Але ж, мусіць, у кожнага свае прычыны суму, не кожнага, відаць, можа задаволіць адна прыгажосць прыроды, цішыня. Чалавеку, які прыехаў сюды проста адпачыць, нічога не рабіць, нічым не займацца, вядома ж, будзе тут сумна. Як, зрэшты, і ўсюды. Відаць, сум — гэта не што іншае, як бяздзейнасць, бязмэтнае правядзенне часу, той душэўны стан, калі чалавек не

ведае, дзе прыкласці рукі, дзе сябе дзець. Творчаму чалавеку гэта не пагражае. Такая заціш для яго — ідэальнае месца працы. І недарэмна, як расказаў нам дырэктар пансіяната «Свіцязь», мой знаёмы і фамільят Мікалай Аляксандравіч Цвірка, частыя госці гэтага вабнага дома адпачынку якраз літаратары. І не толькі беларускія. Не адзін раз «адпачываў» тут, напрыклад, вядомы рускі паэт Андрэй Вазнясенскі, якому нямала нашапталі паэтычных радкоў нетаропкія свіцязянскія хвалі...

Але Свіцязь для нас не толькі цудоўны куток прыроды. Свіцязь — гэта сімвал паэзіі вялікага Адама Міцкевіча, які быў непарыўна звязаны з роднай зямлёй. Свіцязь — калыска яго натхнення, адна з яго муз. І гэта вельмі добра падкрэслівае высокая мармуровая стэла з барэльефам паэта, устаноўленая на беразе возера насупраць пансіяната. На стэле золатам выбіта шчырая мара Адама Міцкевіча, выказаная ім у паэтычных строфах з эпілога «Пана Тадэвуша»:

О, мне дажыць бы да гэткай уцехі,
Каб мае трапілі кнігі пад стрэхі,
Каб за кудзеляй сялянкі, прысеўшы,
Песні любімыя даўнія спеўшы
Пра сірацінку-красуню, якая
Вечарам гнала птушыную стаю,
І пра дзяўчыну, што скрыпку любіла,
Ды за ігрою свой статак згубіла, —
Каб і мае ўзялі кнігі сялянкі,
Простыя кнігі, як іх калыханкі.
(Пераклад М. Танка)

Сёння мара паэта, можна сказаць без перабольшання, збылася. Яго кнігі знойдзеш у любым кутку Беларусі, ну і, вядома ж, пад сялянскімі «стрэхамі». Чытаюцца яны па-польску, па-руску і ў перакладзе на беларускую мову, мову, якую добра ведаў з дзяцінства і вельмі высока ставіў Адам Міцкевіч, называючы яе «самай гарманічнай і з усіх сялянскіх моў найменш зменена й...»

На возеры Свіцязь разам з Адамам Міцкевічам не раз бывалі, прыязджаючы да Верашчакаў у Плужыны, і яго сябры Ян Чачот і Тамаш Зан, якія таксама, у меру сваіх талентаў, выказалі — зноў жа ў форме балад — шчырае захапленне чароўнай красой гэтай жамчужыны беларускай прыроды...

К полудню наляцеў аднекуль вецер, і па возеры пабеглі частыя невысокія хвалі, глуха б'ючыся аб бераг, рассыпаючыся на мноства срэбных пырскаў. Ідучы назад пад гэты спакойны і роўны плёскат хваляў, пад лёгкі пошум узбярэжных хвой, мы думалі аб

адным: аб красе жыцця на зямлі, аб вечнасці, аб невыказных чарах паэзіі, якая непадуладная смерці, паэзіі, якая так хораша і проста яднае сваім высокім агнём людскія сэрцы.

ТУГАНАВІЧЫ

Нешта невыказна тужлівае і разам з тым светлае чуецца ў гэтай назве.

Туганавічы...

Яна, гэта назва, навечна асвечана зыркім полымем першага юнацкага кахання Адама Міцкевіча, з ёй, з гэтай назвай, звязаны самыя шчаслівыя і, мусіць, самыя горкія хвіліны жыцця песняра тых вунь пакатых пагоркаў, пабурэлых іржэўнікавых лагчын, таго ўнуранага ў сябе пацямнелага лесу, што цягнецца роўным пасам за такім прасторным, спярэшчаным восенню полем.

Мы прыехалі ў Туганавічы пад вечар. Сонца, пачырванелае, круглае, ужо вісела над гарызонтам, выразна і неяк надзіва ясна акрэсліваючы кожную купіну на абыдзеным плугамі паплоўчыку, кожную грудку на ўзараным палетку, кожны кусцік ці цудам уцалелае дрэўца на ўзмежку.

У гэтай празрыстасці асенняга надвячорка адразу ж па выездзе з даўгога, у арабінах ды вербах, сяла, а раней мястэчка Цырын мы за невялікай лагчынай, якую пераразае напал зусім нешырокая стужка Сэрвачы, убачылі дружную грамаду высозных старых ліп ды таполяў Туганавіцкага парку. Дык, значыць, Туганавічы — зусім недалёкая ваколіца Цырына! Таго самага, які ўспамінае Адам Міцкевіч у «Пане Та дзеўшы» і пра які піша ў «Калдычэўскім шчупаку» Ян Чачот.

Спынілі машыну каля былых варот панскай сядзібы і зашамацелі чаравікамі па апалым лісці тапалінай алеі ў глыбіню парку.

Гэта ж вунь там, за старымі дуплістымі ліпамі, каля затравелай сажалкі, стаяў некалі раскошны белы дом з калонамі, увесь у кветках, у кустах бэзу, язміну, акацый... З зеляніны дрэў выглядвала зграбная каплічка, відаць былі розныя прыбудоўкі і гаспадарчыя будынкі. Усё было тут дагледжана і прыбрана, на ўсім бачылася клапатлівае вока гаспадара.

Сонечным летнім днём 1818 года перад прысадамі дома сунялася параконная брычка, і з яе саскочылі двое маладых, акуратна апранутых людзей, якія, паціху перамаўляючыся,

скіравалі па цяністай тапалінай алеі да памешчыцкага дома. Гэта былі студэнты Віленскага універсітэта Тамаш Зан і Адам Міцкевіч. Тамаш ішоў упэўнена, ён чуў сябе тут як свой, бо ўжо не раз бываў у гэтай гасціннай гаспадзе: запрашалі яго сюды браты Верашчакі — Міхаіл і Юзаф, з якімі ён шчыра пасябраваў, калі яшчэ вучыўся ў Мінскай гімназіі. Пасля смерці бацькі браты разам з маткай сталі гаспадарамі маёнтка. Ведаючы гасціннасць Верашчакаў, Тамаш Зан падгаварыў прыехаць сюды на адпачынак і Адама Міцкевіча, запэўніўшы яго, што яму тут таксама спадабаецца.

Не думаў, не гадаў тады дзевятнаццацігадовы юнак, чым стане для яго гэта закінутая сярод беларускіх палёў сядзіба, якую буру пачуццяў будзе выклікаць у яго праз усё жыццё адна толькі яе назва — Туганавічы. І ўсё праз яе, Марылю, сястру Міхала і Юзафа...

Калі падыходзілі ўжо да шырокага ганка Тугана віцкага дома, Адам Міцкевіч і ўбачыў яе ўпершыню: яна, як расказваюць, толькі на адзін момант, нібы спуджаная птушка, мільганулася перад ім у сваім белым убранні, але гэты момант, гэта белае ўбранне запомніліся яму назаўсёды.

Спачатку Марыля не зрабіла асаблівага ўражання на Адама Міцкевіча. Але паступова, сустракаючыся з ёй пад раскідзістым голлем туганавіцкіх ліп, чытаючы разам раманы Жан-Жака Русо і Гётэ, разважаючы з ёй пра літаратуру, пра жыццё, слухаючы яе ігру на фартэпіяна, ён адчуў, як цягне яго да гэтай мілай і непасрэднай дзяўчыны, як хочацца яму слухаць яе голас, яе смех... І ўсё ж невядома да чаго іх прывяло б сяброўства, калі б не замужжа Марылі. Вестка пра тое, што Марыля, так лёгка забыўшыся на патаемныя вячэрнія сустрэчы ў ліпавай альтанцы і на дарожках парку, на пацалункі і маладыя клятвы, гэтак раптоўна выйшла замуж за графа Путкамера, проста ашаламіла хлопца. Толькі цяпер усвядоміў ён, што страціў, толькі цяпер зразумеў, як яе кахае. «...Любая мая Марыля, — пісаў ён да яе пазней, — я цябе шаную і кахаю, як багіню. Каханне маё такое ж бязвіннае і нябеснае, як і сам яго прадмет». І далей: «Але я не магу ўтрымацца ад страшэннага хвалявання, калі ўспамінаю, што я страціў цябе назаўсёды, што я буду толькі сведкам чужога шчасця, што ты забудзеш мяне; часта ў адну і тую ж хвіліну я малю Бога, каб ты была шчаслівая, хаця б і забылася пра мяне, і адначасна гатоў закрычаць, каб ты памерла... разам са мной!..» І яшчэ: «Дарагая, адзіная мая! Ты не бачыш прорвы, над якой мы стаім!..»

У адным з вершаў, прысвечаных свайму каханню, Адам Міцкевіч пісаў у 1823 годзе:

«Прэч з маіх воч!..» І я знікну без следу,
«Прэч з майго сэрца!» І сэрца скарыцца.
«Прэч з маёй памяці!» З гэтым, ты ведай,
Век наша памяць не можа згадзіцца.
Быццам той цень, чым далейшы, тым большы,
Кіне на шлях свой цямнейшыя крылы,
Так мая постаць, далей адышоўшы,
Памяць маю большым крэпам акрые.
Там, дзе страчаліся шчаснай парою,
Дзе расставаліся сумнай хвілінай,
Буду заўжды неразлучны з табою,
Бо ўсюды частку душы я пакіну...
(Пераклад М. Танка)

Апынуўшыся ў далёкай эміграцыі, адкуль ужо не было дарогі назад, на радзіму, Адам Міцкевіч не пераставаў тужыць па сваёй каханай:

Ніколі, нідзе не магу я расстацца з табою!
Ідзеш ты па моры, па сушы ў дарогу са мною,
Сляды твае бачу на схілах, высокіх і слізкіх,
І чую твой голас у шуме каскадаў альпійскіх;
Наўкол азірнуся, і страх валасы падымае:
Баюся сустрэцца з табой, але прагна жадаю...
Скажы мне, была б ты шчаслівай і вернай каханню,
Калі б падзяліла са мною прыгоды выгнання?
Ах! Я за руку цябе ўзяў бы і горнай цяснінай
Павёў бы за песняю следам як друг твой адзіны.
Кідаўся б я першым у кіпень імклівых струменяў,
Пад ногі табе намасціў бы ў рэчцы каменняў,
Прайшла б ты па іх, забываючы стому і мукі,
А я саграваў бы твае пацалункамі рукі.
Зайшлі б на начлег мы ў хату альпійца старога,
Цябе я плашчом ахінуў бы ад холаду злога,
Каб ты ля агню на плячы маім ціха заснула
І ўстала шчаслівай, як ноч праляцела, не чула...
(Пераклад М. Калачынскага)

Ці не яно, гэта светлае, поўнае высокіх узлётаў і няспраўджаных надзей каханне, і распаліла ў сэрцы Адама Міцкевіча той вялікі паэтычны агонь, які даў свету магутныя тварэнні чалавечага духу, што навечна застануцца для людзей нязгасным светачам у іх дарозе да вяршынь дасканаласці?

Вобраз Марылі Верашчакі можна ўбачыць не толькі ў творах, непасрэдна ёй прысвечаных ці з ёй звязаных, такіх, напрыклад, як «Да М...» («Прэч з воч маіх...»), «Да*** (Марылі)», «Няўпэўненасць», «Сон», «Курганок Марылі», «Сябрам», «Люблю я...», але і ў многіх іншых творах, у тым ліку у «Дзядах» і «Пане Тадэвушы». У паэме «Пан Тадэвуш» вельмі ж нагадвае Марылю адзін з асноўных вобразаў твора — паненка Зося, у якую закахаўся малады пан Тадэвуш. І паэтычнае апісанне іх спатканняў у Сапліцове — не што іншае, як прымружаныя туманам часу ўспаміны пра хвалюючыя спатканні самога Адама Міцкевіча з Марыляй у Туганавічах. Ды і ўся паэма «Пан Тадэвуш», напісаная ў эміграцыі, у далёкім Парыжы, — узнёслая песня першаму каханню, роднай зямлі. Як піша ў сваёй кнізе «Край гадоў дзяціных», выдадзенай у 1970 годзе ў Любліне, польская пісьменніца Моніка Варненская, «з сэрца паэта вялікі боль кахання, перажыты ў Туганавічах, вычараваў строфы несмяротнай прыгажосці. А калі пасля многіх гадоў прытупіліся пакуты і сцішылася вострая горыч успамінаў, тады «час адступіўся і вярнуў твары...». Ізноў, як наяве, вярнуўся «край гадоў дзяціных», падхарошаны смуткам. Вярнуліся вобразы наднёманскіх ваколіц і роднай Літвы, якая «ёсць як здароўе». Вярнуліся Туганавічы, каб стаць фонам аднаго з найцудоўнейшых твораў, якія ведае сусветная ііаэзія».

Марыля Верашчака была, можна сказаць, музай і натхненнем Адама Міцкевіча. Той вялікі агонь кахання, што запаліла яна ў сэрцы маладога паэта, быў пераліты ім у чароўныя строфы яго бессмяротных вершаў, паэм, санетаў, якія і праз стагоддзі будуць саграваць людскія душы, радаваць чытача чысцінёй і прыгажосцю пачуццяў.

І яшчэ адну немалаважную ролю адыграла Марыля Верашчака ў паэтычнай біяграфіі Адама Міцкевіча. Яна, як і Ян Чачот, памагала схіліць яго да крыніц народнай паэзіі беларусаў, а тым самым — выйсці на дарогу рамантызму. Аб гэтым прызнаваўся сам паэт: «Паслухаўшы аднаго разу вельмі цікавую легенду, якую расказаў рыбак, Марыля, павярнуўшыся да мяне, усклікнула: «Вось паэзія! Напішы што-небудзь такое». Гэтыя словы глыбока запалі мне ў душу, і адсюль пачаўся мой паэтычны шлях».

Марыля была адукаваным па сваім часе чалавекам, цікавілася мастацтвам, някепска ведала літаратуру, асабліва французскую, якую чытала ў арыгінале. І ці не галоўным кумірам быў для яе Жан-Жак Русо, які, відаць, і навучыў яе з павагай ставіцца да простага народа, да яго культуры. Марыля, якая з дзяцінства ведала вуснапаэтычную творчасць беларускага люду, пачала

пасля гэтага свядома цікавіцца ёю, магчыма, нават запісваць народныя песні.

Ва ўсякім разе, добра вядома, што яна любіла выконваць на фартэпіяна беларускія народныя песні. З асаблівым пачуццём спявала Марыля Адаму Міцкевічу простую песню беларускага мужыка «Да цераз мой двор», якая быццам бы спецыяльна была складзена пра іх абаіх, пра іх такое нешчаслівае каханне:

Да цераз мой двор,
Да цераз мой двор
Цяцера ляцела,
Да не даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
За каго я хацела:
З кім стаяла,
Размаўляла
Да падарачкі брала;
З каго кпіла,
Смяялася,
Сама таму дасталася...

Ці не гэта цікавасць Марылі Верашчакі да фальклору і стала прычынай таго, што з ёй амаль да канца жыцця падтрымліваў сяброўскія адносіны Ян Чачот? Аб гэтым сведчыць іх перапіска, якая пачалася з 1823 года. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР, у фондзе Тамаша Зана, захоўваецца многа пісем Яна Чачота да Марылі, якія пісаліся пасля яго ссылкі.

Дарэчы, Марыля Верашчака ў той час не была адзінокая сярод беларускіх шляхцянак у сваёй зацікаўленасці вуснай паэзіяй простага люду. Варта ўспомніць тут Марыю Чарноўскую, што ўжо ў 1817 годзе выступіла ў віленскім друку з артыкулам «Рэшткі славянскай міфалогіі ў звычаях вясковага люду на Белай Русі», у якім яна вельмі хораша апісала важнейшыя абрады і святы сялян з Чэрыкаўшчыны, падаўшы адначасова і некалькі беларускіх песень у арыгінале. Прыкладна ў гэты ж час зацікавілася беларускім фальклорам, рабіла яго запісы Эмілія Плятэр, тая Плятэр, якая праславілася ў польскім паўстанні 1830-1831 гадоў супраць царызму і пра подзвіг якой вельмі паэтычна расказаў Адам Міцкевіч у вершы «Смерць палкоўніка». Важна прыгадаць і яшчэ адну фалькларыстыку таго часу — Канстанцыю Флемінг, жонку Зарыяна Даленгі Хадакоўскага...

Думаецца, такі «прыліў» у фалькларыстыку ў першай палове XIX стагоддзя жанчын не быў выпадковы. Тут зноў жа, відаць,

«папрацаваў» перакананы нарадалюбец Жан-Жак Русо, якім з самых юных гадоў зачытваліся ў нас ці не ўсе адукаваныя засцянковыя шляхцянкі.

Каб давяршыць партрэт Марылі Верашчакі, скажам яшчэ, што яна да канца жыцця засталася верная дэмакратычным ідэалам і не была ў баку ад палітычных навальніц свайго часу. Яна даволі актыўна памагала паўстанцам 1830-1831 гадоў, а пасля разгрому паўстання прычынілася да наладжвання сувязі падпольшчыкаў з паўстанцкім эміграцыйным цэнтрам, які рыхтаваўся падняць народ на новую, рашучую бітву з царызмам. Антыўрадавая дзейнасць Марылі Верашчакі была выкрыта царскімі ўладамі, і ў 1833 годзе яна разам са сваім мужам Ваўжынцам Путкамерам, які таксама быў звязаны са змоўшчыкамі, трапіла ў турму, дарэчы, у той жа самы кляштар базыльянцаў у Вільні, у якім дзесяць гадоў назад адбывалі пакаранне філаматы і філарэты і куды яна разам з іншымі «літвінкамі» прыносіла перадачы зняволеным сябрам. Марылі і яе мужу, што сядзелі ў розных камерах, адарваныя ад дзяцей, ад свету, толькі праз паўгода ўдалося тады адкупіцца і выбавіцца з няволі.

Не абышло сям'ю Марылі і паўстанне 1863 года. У чэрвені арыштавалі ў Вільні замешаных у паўстанні пасынкаў старэйшай дачкі Зосі, што была замужам за школьным інспектарам Андрэем Каліноўскім. У доме жандары ўчынілі вобыск. Марыля не магла не прыехаць у Вільню. Здарылася так, што яна трапіла на Лукішскую плошчу ў час, калі адбываўся страшны абрад пакарання смерцю Зыгмунта Серакоўскага. Гэта зрабіла на Марылю жахлівае ўражанне. За ўдзел у паўстанні быў. схоплены царскай жандармерыяй у Туганавічах зяць Марылінага брата Юзафа Канстанцін Туганоўскі, нашчадак князёў Туганаў. Не вытрымаўшы жорсткіх пакаранняў, ён памёр у віленскай турме. Летам гэтага ж года арыштавалі ў маёнтку Руткевічы на Палессі і Марылінага зяця Яна Рыхлевіча, які ўваходзіў у Лідскі паўстанцкі камітэт. Толькі цяжарнасць уратавала ад арышту і яго жонку — малодшую Марыліну дачку Караліну, якая таксама мела сувязь з паўстанцамі. Пэўне ж, тыя вялікія перажыванні і прычыніліся да смерці Марылі ў 1864 годзе. Вось як піша пра гэта ў 1885 годзе яе сын Станіслаў Путкамер да Уладзіслава Бэлзы, біёграфа Адама Міцкевіча: «Матка мая нарадзілася 24 снежня 1799 года ў Туганавічах, памерла 27 снежня 1864 г. у Бражэльцах, другой нашай вёсцы побач з Балценікамі. Не перажыла выпадкаў таго часу. Пахавалі яе ў парафіяльным касцёле ў Беняконях. Вельмі пакутуючы перад смерцю, у канцы вымавіла словы, якія былі апошнія: «За край, за пакутнікаў...»

Аб часе знаходжання Яна Чачота ў Туганавічах прамых

звестак я не знайшоў. Але ж многія факты гавораць аб тым, што ён, гэтак жа як і яго неразлучныя сябры Адам Міцкевіч і Тамаш Зан, быў тут даволі частым госцем. Гэта відаць хаця б з балады «Калдычэўскі шчупак», якую Ян Чачот прысвяціў аднаму з гаспадароў Туганавіч Міхалу Верашчаку. Уступ балады пачынаецца з такіх сяброўскіх «прызнанняў»: «Першага ў свеце люблю гультая, першага цябе, Міхале...» З гэтага ўступу можна ўбачыць, наколькі блізкія яны былі сябры — Міхал Верашчака і Ян Чачот. Дык ці ж мог ён не наведаць свайго сябра ў яго такім гасцінным доме? Тым больш што і Чачотавы бацькі жылі непадалёку — у Лоўчыцах. Зрэшты, у баладзе ёсць і прамы расказ пра бачанае ім у Туганавічах. Кажучы пра Яна Верашчаку з Пясчанкі, Ян Чачот піша, што ён «найдзіўна піў, найдзіўна еў, як вы сёння ў Туганавічах, ніколі за стол адзін не садзіўся, купаўся з сябрамі ў прысмаках...» І далей, зноў вяртаючыся да Міхала Верашчакі, малюючы яго «спосаб жыцця»: «Відаць кроў яго ў табе, Міхале: гатоў ты скінуць кашулю і лезці па шыю ў багністыя хвалі, і тут жа моцна ціскаеш Крысю. Віном не пагарджаеш, прагнеш бойкі, але яе табе не дае доля, і цяпер мірную люльку курыш і рыбу ловіш у Сарваны. Прабач, што з табою ісці не згадзіўся я, бо былі важныя прычыны: чым лавіць рыбу, хацеў ісці я побач з гожай Марцэлінай...»

Гэта Марцэліна, пра якую піша Ян Чачот, была зусім рэальная асоба. Тамаш Зан у пісьме да Адама Міцкевіча ад II студзеня 1823 года, расказваючы, што ў Туганавічах ён весела правёў час у кампаніі харошых дзяўчат, упамінае сярод іх і «гэту мілую Марцэліну», якая была, як мяркуе ў кнізе «Міцкевічаўскія рэаліі» Леанард Падгорскі-Аколаў, таварышкай дачок генерала Ксаверыя Несялоўскага з недалёкай Сэрвачы — Ванды і Ідаліі. Яна Чачота, значыцца, цягнула ў Туганавічы не толькі сяброўства з Міхалам Верашчакам, але яшчэ і тая прывабная шляхцянка Марцэліна.

Ад даўняй сядзібы Верашчакаў у Туганавічах цяпер застаўся толькі во гэты стары апусцелы парк. Леў Паўлавіч, які некалі, будучы супрацоўнікам музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку, клапаціўся аб захаванні парку, адразу ж падвёў мяне да той зялёнай палянкі, дзе стаяў некалі памешчыцкі дом. Ад яго засталіся толькі рэшткі зарослага травой падмурка: дом згарэў яшчэ ў першую сусветную вайну. Недалёка адсюль мы ўбачылі дзве невялікія затравелыя ўпадзіны. Гэта ўсё, што засталося ад тых дагледжаных некалі прыгожых ставоў, якія так хораша апісаў Адам Міцкевіч у «Пане Тадэвушы»:

А від сапраўды быў прыгожы, маляўнічы!
Ставы два пахілілі да сябе абліччы,

Як пара закаханых: правы быў глыбокі,
Без траваў, чысты, гладкі, як дзяўчыны шчокі,
А левы чуць цямнейшы, як твар маладога,
З загарам і пушком абсыпаны нямнога.
Пяском залачоным свяціўся злёгку правы,
Як ясным воласам, а левы кучаравы,
Лазой наежаны і вербамі чубаты,
Абодва зелені вянком былі абняты...
(Пераклад П. Бітэля)

— А цяпер паглядзім альтанку Марылі, — сказаў Леў Паўлавіч, кіруючыся да высозных ліп, што выглядалі з-за маладога пад леска.

Альтанка ў Туганавіцкім парку мне вядома была з кніг Міцкевіча і пра Міцкевіча. Гэта ж у ёй, у той альтанцы, і сустракаўся малады, тады яшчэ нікому не вядомы Адам Міцкевіч з Марыляй Верашчакай, тут, у схове густой лістоты, пад неўтаймаванае цёхканне салаўя, вялі яны свае размовы, праседжваючы да позняй ночы...

Што значыла для Адама Міцкевіча гэта альтанка, відаць з маналога Густава, героя «Дзядоў», вуснамі якога выказаў паэт сваё перажыванне ад запозненай сустрэчы з Туганавічамі:

...Быў я і ў садзе, асеннім, бязлістым,
Такім жа, як колісь, вечарам, светлым і чыстым.
Гэтак жа сама хмары цямнілі нябёсы,
Той жа месяц асвечваў на купінах росы,
Тым жа снежным сяйвом поўніў туман прасторы,
Тыя ж у небе танулі халодныя зоры,
Убачыў тады я і ззянне зорачкі ўсходняй —
Яна, тая зорачка, свеціць мне й сёння.
Зноў пёк мае грудзі той жа агонь гарачы.
Усё тут было, як даўней — толькі яе я не ўбачыў!
Іду да альтанкі... Чую пошум якісьці.
Мо яна? Не! То вецер прабег жаўталісцем.
І зноў цішыня. Дрэвы стаяць паныла.
Альтанка! Майго шчасця калыска й магіла...*

Можна зразумець таму, з якім душэўшым хваляваннем падыходзілі мы да гэтай альтанкі. Яе ўтварылі пасаджаныя роўным кружком ліпы, якія спляліся ўверсе ў суцэльную жывую страху. Толькі што гэта? Адна з шасці ліп альтанкі Марылі, гэтай «калыскі і магілы» Міцкевічавага шчасця, ляжала распасцёртая на

зямлі, падмяўшы пад сябе кусты і дрэўцы маладога падлеска. Толькі высокі пашчапаны пень бялеў на яе месцы. Так, аджыла свой век, не ўстаяла перад магутнымі хвалямі буры, якая, відаць, нядаўна пранеслася тут. Другія ліпы альтанкі таксама ўжо былі блізкія да гэтага ж.

Мы моўчкі глядзелі на такі бязлітасны разбой прыроды. Цяжка было звыкнуцца з думкай, што на зямлі ўжо не будзе гэтага жывога сведкі натхнення вялікага паэта, гэтага непаўторнага помніка генію сусветнай літаратуры.

Успамінаючы ў эміграцыі пра гэтыя ліпы альтанкі, Адам Міцкевіч, звяртаючыся да іх, пісаў:

Родныя дрэвы! Калі неба дазволіць,
Каб да вас я вярнуўся, сяброў маіх верных,
Ці знайду яшчэ вас! Яшчэ вы жывыя?

Упершыню — праз сто пяцьдзесят гадоў пасля таго, як пісаліся гэтыя радкі, — можна з жалем адказаць паэту, што яго «родныя дрэвы» ўжо не ўсе жывыя, што яны пачынаюць падаць ад старасці.

Калі мы вось так, прыгорбіўшыся, стаялі перад зялёным яшчэ, але ўжо мёртвым дрэвам, да нас незаўважна падышоў малады хлопец і таксама стаў побач.

— Бачыце, што робіцца, — паказаў ён вачыма на зламанае дрэва. — Гіне альтанка Марылі...

Хлопец — гэта быў Мікола Бобрык, з суседняй Паланечкі, дзе ён робіць тэхнікам-механікам, здаецца, у бальніцы — прыехаў сюды спецыяльна паглядзець міцкевічаўскія мясціны. Ён быў тут яшчэ малым: яго прывозіў сюды бацька, просты калгаснік, каб паказаць свайму сыну Туганавіцкі парк і камень філарэтаў, пра якія ведаў з твораў Адама Міцкевіча.

Паглядзець міцкевічаўскія і філаматаўскія славутасці прывёз сюды Мікола і сваіх таварышаў — мы ўбачылі іх каля машыны з чырвоным крыжам, што стаяла за дрэвамі, на дарозе.

Мікола шчыра трывожыўся за долю альтанкі і пытаўся ў нас, што можна зрабіць, каб захаваць яе.

І праўда, што можна тут зрабіць? Як перахітрыць прыроду? Мо падсаджваць на месцы палеглых дрэў новыя? Нешта трэба б прыдумаць абавязкова, каб і новыя пакаленні людзей маглі сваімі вачыма ўбачыць жывыя памяткі творчай біяграфіі геніяльнага паэта, прычасціцца да тайны вялікай паэзіі. Думаецца, альтанку, як і ўвесь Туганавіцкі парк, ды і ўсё, што звязана тут з Імем Адама Міцкевіча і іншых філаматаў, маглі б узяць пад сваю апеку вучні Цырынскай сярэдняй школы, якая зусім побач, — каб па-

сапраўднаму ўшанаваць і зберагчы гэтыя «міцкеві чаўскія рэаліі».

За Туганавіцкім паркам амаль адразу пачыналася вёска Карчова. Мы пад'ехалі сюды, каб распытаць дарогу ва ўрочышча Кут, да камення філарэтаў.

Сухаватая жанчына з поўным капуснага лісця драцяным кашом на сагнутым локці рукі закінула другую, незанятую руку паўзверх дашчаных варотцаў, мерачыся адкінуць на тым баку зашчапку.

— Цётка, пачакайце трошкі... — паспяшаўся я да жанчыны.

Яна адняла назад руку, з цікавасцю паглядзела на мяне і Льва Паўлавіча, які таксама ішоў за мной раз'езджанай машынамі вуліцай вёскі.

Калі я папрасіў яе паказаць дарогу ў Кут, яна перапытала:

— Туды, дзе камень філярэтаў?

— Ага, туды, — здзівіўся я гэтакай яе здагадлівасці. — Але чаму вы думаеце, што нам трэба якраз гэты камень?

— Ды многія ж туды едуць... Да каменя...

Мы папыталіся ў жанчыны, чаму ён так называецца, той камень.

— Ды колісь нейкія філярэты збіраліся там на маёўкі... А што гэта былі за яны, дык я і не ведаю...

Ну што ж, нам было даволі і гэтага: мы даведаліся, што памяць пра «філярэтаў», як вымаўляла жанчына, і сёння — праз столькі часу — жыве, аказваецца, сярод людзей.

Толькі чаму назвалі камень якраз імем філарэтаў, а не філаматаў?

Як вядома, спачатку ў Віленскім універсітэце ўзнікла Таварыства філаматаў — сяброў навук. Яго ўтварылі ў 1817 годзе Тамаш Зан, Адам Міцкевіч і Юзаф Яжоўскі, якія ўвялі ў яго яшчэ трох студэнтаў. Паколькі розныя згуртаванні, тым больш тайныя, строга забараняліся царскімі ўладамі, філаматы былі вельмі асцярожныя ў падборы новых членаў. Выбіраліся толькі надзейныя і здатныя да навук, да літаратурнай творчасці студэнты. Таму Таварыства філаматаў было нешматлікай арганізацыяй. За ўвесь час свайго існавання ў яго ўваходзіла толькі дзевятнаццаць чалавек. Найбольш вядомымі з іх, апроч названых вышэй, былі Ян Чачот, Ануфры Петраш кевіч, Францішак Малеўскі, Дзіянісій Хлявінскі, Дамінік Ходзька, Казімір Пясецкі, Ян Сабалеўскі, Ігнат Дамейка, Міхал Рукевіч. У 1818 годзе Таварыства было падзелена на два аддзелы: I — літаратуры і маральных навук, II — фізічных, матэматычных і медыцынскіх навук. Першапачатковай мэтай Таварыства было, як пісалася ў статуце, маральнае ўдасканаленне і ўзаемадапамога ў набыцці адукацыі. Але ўжо ў новым, прынятым у 1818 годзе,

статуце мэта Таварыства пашыралася. Апрача «ўласнага самаўдасканалення», філаматы павінны былі садзейнічаць «па меры мажлівасці ўсеагульнай асвеце», рыхтуючы гэтым самым грамадства да змагання з царызмам. Дзеля пашырэння сваіх ідэй філаматы стварылі больш прадстаўнічую арганізацыю — напаўлегальнае Таварыства «прамяністых», якое хутка было рэарганізавана ў тайнае Таварыства філарэтаў — сяброў дабрачыннасці. Таварыства філарэтаў складалася з чатырох аддзелаў — фізіка-матэматычнага, юрыдычнага, літаратурнага і медыцынскага. Два першыя, акрамя таго, падзяляліся яшчэ на асобныя саюзы. Кіраўнікамі ўсіх гэтых падраздзяленняў філарэтаў былі ў асноўным члены Таварыства філаматаў, якое стаяла на чале арганізацыі, з'яўлялася яе ядром. Напрыклад, літаратурным аддзелам, у які ўваходзіў толькі адзін саюз пад назвай «Блакітны», кіраваў Ян Чачот. Сярод 26 членаў гэтага аддзела мы бачым імёны вядомых у свой час літаратараў, грамадскіх дзеячаў — Аляксандра Ходзькі, Дамініка Ходзькі, Ежы Ягелы, Руфіна Юндзіла, Юзафа Кавалеўскага, Фелікса Кулакоўскага, Мікалая Казлоўскага, Міхала Кулешы, Антонія Эдуарда Адынца, Людвіка Папроцкага, Яна Вернікоўскага, Тамаша Зана, Міхала Данейкі, Тамаша Красоўскага, Францішка Левандоўскага, Тамаша Масальскага, Тэадора Мілакоўскага, Ігната Станкевіча, Тадэвуша Зялінскага. Агульнае кіраўніцтва Таварыствам філарэтаў было даручана Тамашу Зану, які лічыўся яго прэзідэнтам.

На пасяджэннях філарэты, як і філаматы, чыталі свае навуковыя працы, рабілі агляды айчыннай і замежнай прэсы, вялі дыскусіі па розных пытаннях навукі і грамадскага жыцця. Адной з форм работы Таварыства было правядзенне маёвак, на якія філарэты стараліся прывабіць паболей моладзі, дзеля чаго рабілі ўсё, каб гэтыя маёўкі праходзілі як мага весела і прыгожа. Да іх старанна рыхтаваліся, складалі цэлыя сцэнарыі іх правядзення, пісаліся і развучваліся спецыяльна напісаныя да іх вершы і песні, драматычныя сцэнкі. Часта маёўкі прымяркоўвалі да імянін каго-небудзь са сваіх таварышаў.

Філаматы многа рабілі, каб ствараць філарэцкія філіі і ў правінцыях. Кожны з філаматаў абавязаны быў, выехаўшы на канікулы ў родныя мясціны, весці работу сярод насельніцтва, арганізоўваць тайныя згуртаванні. Тут асабліва праявіў свой арганізатарскі талент філамат Міхал Рукевіч, які стварыў у Беластоку Таварыства згодных сяброў, а ў Свіслачы таварыства «Заране». Міхал Рукевіч знайшоў нават шлях да афіцэраў Літоўскага асобнага корпуса, што быў раскватараваны ў Гродзенскай губерні, і арганізаваў сярод іх таварыства «Ваенныя сябры», якое хутка было выкрыта і разгромлена царскімі ўладамі

за спробу ў 1825 годзе, праз дзесяць дзён пасля паўстання дзекабрыстаў у Пецярбургу, сарваць прысягу Мікалаю I.

Да нас няшмат дайшло звестак пра арганізаваныя філаматамі згуртаванні моладзі ў правінцыі, так званыя філіі Таварыства філарэтаў. Тлумачыцца гэта перш за ўсё тым, што ўсе дакументы, звязаныя з імі, філарэты пасля выкрыцця царскімі ўладамі тайных саюзаў моладзі аддалі агню.

Філія Таварыства філарэтаў, відаць па ўсім, была створана і дзесьці паблізу Туганавіч, хутчэй за ўсё ў мястэчку Цырын. Пра гэта ж тут, як-ніяк, было каму паклапаціцца: у Туганавічах падоўгу гасцявалі, прынамсі, чатыры філаматы, ды не простыя філаматы, а самыя завадатары згуртавання — Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Ян Чачот і Ігнат Дамейка, блізкі сваяк Верашчакаў. Калі б уявіць, што каля каменя ў Куце збіраліся на свае сходкі адны толькі яны (што пры іх актыўнасці было зусім немагчыма), то яго, гэты камень, назвалі б няйначай як каменем філаматаў, бо ў першую чаргу Зан, Міцкевіч, Чачот, Дамейка былі філаматамі, а потым ужо філарэтамі...

Вузенькай травяной вулачкай мы выехалі за вёску. Дарога павяла ў нестары бераснячок, з якога ў левым баку прасвечвала свежаўзаранае поле. Далей у лесе засвяцілі чырвонымі камлямі хвоі.

Камень быў з аднаго боку як бы ўсечаны і нагадваў сабою невялікую скалу. Ляжаў ён каля самай дарогі, у падножжы лясного ўзгорка, што даволі крута ішоў уверх. Так, на гэтым узгорку было вельмі добра наладжваць філарэтам свае сходкі. Тым больш і мясцінка ж зацішная, у баку ад вялікіх дарог, наводшыбе ад вёскі. Прастор і воля!

Праз шмат гадоў пасля гэтых сходак філарэтаў прыехаў да іх каменя з далёкай Украіны выдатны савецкі паэт і акадэмік Максім Рыльскі. Стоячы ў гэтым зацішным яры, слухаючы несціханы пошум старых хвой, ён жыва ўявіў тых высокаадукаваных і эрудзіраваных маладых людзей, якія шчыра і горача кляліся змагацца за свой край, за родны народ, што праз вякі валачыў тут ярмо прыгонніцтва, за волю і роўнасць паміж усімі людзьмі. А ўявіўшы, Максім Рыльскі радкамі свайго санета вярнуў нам той далёкі і смутны час, вярнуў тыя гарачыя сходкі юнакоў-патрыётаў, светлыя воблікі першых нашых вестуноў ачышчальных рэвалюцыйных бур, што пранесліся потым па краі:

Бярозы, сосны, і пясок, і яр,
Птушыны свіст, і вецер, і яліны.
Зацішна тут. Не дойдзе гук адзіны
Да тых шпікоў, што рассылае цар.

Віюцца ў высі перламуты хмар,
Якіх няма над землямі чужыны...
Тут крылле ўзнёс у свой палёт арліны
Міцкевічаў палымянёвы дар.
Нібы з насення добрага пшаніца,
Тут веліч думкі з крозы каласіцца,
Тут слова воля гарт дае людзям.
Тут, горды верш замысліўшы употай,
З прарочым зрокам слухае Адам
Прамоўцаў палкіх — Зана і Чачота.
(Пераклад У. Дубоўкі)

І БЫЛІ ЯШЧЭ ДАРОГІ...

Мы прайшлі толькі некаторымі сцяжынамі Яна Чачота, тымі, на якіх пазнаваў ён жыццё, якія навучылі яго любіць і ненавідзець, якія выводзілі яго ў людзі, у свет, на дарогу змагання за праўду, за народную долю. Амаль усе гэтыя сцяжыны цесна перапляталіся са сцяжынамі вялікага Адама Міцкевіча, з якім так хораша ступалася па зямлі, так светла і шырока думалася. Сцяжыны роднай Навагрудчыны...

Але былі ў Яна Чачота яшчэ іншыя сцяжыны, іншыя дарогі.

Была ў яго біяграфіі Вільня, дзе зноў-такі яму пашчаслівіла ісці поруч з Адамам Міцкевічам, дзяліць з ім усе радасці і нягоды студэнцкага і службовага быцця, сумеснай дзейнасці для дабра радзімы.

Помняць Яна Чачота гулкія калідоры і аўдыторыі Віленскага універсітэта, дзе ён вучыўся і з захапленнем слухаў лекцыі выдатнага польскага гісторыка і грамадскага дзеяча Іаахіма Лялевеля, які пазней разам з Карлам Марксам і Фрыдрыхам Энгельсам актыўна ўдзельнічаў у інтэрнацыянальнай Дэмакратычнай асацыяцыі ў Бруселі. Ян Чачот разам з Адамам Міцкевічам былі вельмі блізка знаёмыя з Лялевелем, нават сябравалі з ім.

Недзе ў Вільні (цяперашнім Вільнюсе) па сённяшні дзень хаваюцца тыя будынкі, дзе кватараваў колісь Ян Чачот, часам удвух з Адамам Міцкевічам, і дзе застыла ў сценах рэха галасоў маладых патрыётаў, іх гарачых спрэчак.

Пашукаўшы, можна знайсці тут і дом Шымана Малеўскага, рэктара універсітэта, дом, дзе былі шырока адкрыты дзверы для філаматаў, у дружную сям'ю якіх уваходзіў і сын гаспадара — Францішак. Гэты дом быў асабліва дарагі для Яна Чачота, бо жыло ў ім яго самае светлае і чыстае каханне — маладая, гожая, вельмі грацыёзная Зося Малеўская, адна з дзвюх Францішкавых сясцёр, якая так хораша і міла іграла на фартэпіяна, зачароўваючы — і ігрой, і сабою — усіх сяброў-філаматаў. Ян Чачот напісаў Зосі Малеўскай — ні многа ні мала — сто песень, многія з якіх яна выконвала, як падказваў аўтар, на матывы народных, часцей за ўсё беларускіх, песень...

А ў ваколіцах Вільні, магчыма, і цяпер раскашуе той зацішны бярозава-ясеневы гай, дзе любілі збірацца на свае вясёлыя сходкі філаматы і філарэты, уся віленская моладзь і дзе Ян Чачот выступаў са сваімі дзёрзкімі антыўрадавымі вершамі, якія

знаходзілі ў маладых сэрцах самы гарачы водгук. Гэты гай віленская моладзь празвала Янавым, або Чачотавым. Цікава, ці захавалася гэта назва сёння?

Тут, у Вільні, сярод іншых даўнейшых камяніц высіцца базыльянскі кляштар, той самы кляштар, які ў 1823 годзе царскі паслугач Навасільцаў ператварыў у турму, куды былі кінуты члены выкрытых ім тайных згуртаванняў моладзі — Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Антон Слізень, Адам Сузін, Юзаф Яжоўскі, Юзаф Кавалеўскі, Фелікс Кулакоўскі, Ян Сабалеўскі, Тэадор Лазінскі, Ануфры Петрашкевіч, Мікалай Казлоўскі і іншыя. Ідэйнаму кіраўніку філаматаў прафесару універсітэта Іаахіму Лялевелю ўдалося вырваць з турмы толькі Адама Міцкевіча, якога ён узяў на парукі і які тым не менш наведваў там сваіх сяброў. Але і Адам Міцкевіч не пазбегнуў высылкі з «заходняга краю» ў Расію. Яго разам з Янам Сабалеўскім, Юзафам Яжоўскім, Францішкам Малеўскім адправілі на першым часе ў Пецярбург. Самы суровы прысуд быў вынесены сенатарам Навасільцавым Тамашу Зану, Яну Чачоту і Адаму Сузіну — турма і ссылка. Адам Міцкевіч, як расказваюць, доўга плакаў, даведаўшыся аб гэтым жорсткім прысудзе тром яго сябрам. Галоўнае, у чым абвінавачвалі Яна Чачота, было тое, што ён «у вершах і прамовах выказваў шкодныя намеры».

Такім чынам, была ў біяграфіі Яна Чачота і ссылка. Многа доўгіх гадоў пакут і выпрабаванняў. Спачатку яго завезлі на Урал, у гарадок Кізіл, дзе, згодна з прысудам, пратрымалі шэсць месяцаў у «крэпасці». Пра тое, колькі яму давялося там перажыць, відаць з яго пісем. Вось як пісаў ён з Кізіла ў кастрычніку 1825 года Ануфрыю Петрашкевічу і Юзафу Завадскаму: «Усю зіму аж да 15 мая я пражыў у халаднейшай за Сібір абвахце, заўсёды з салдатамі перад вачамі і з рознымі каравульнымі, якія забруджвалі мой пакой сваім тытунём і размовамі. У гэтай дзіравай і недагледжанай хованцы часам быў такі жахлівы холад, што я змушаны быў сядзець тут адзеты, як у павозцы — у кажуху, паліце, цёплых ботах, рукавіцах і шапцы. Я так замярзаў колькі разоў, што не ведаю, як яшчэ не захварэў — калі б не ўнутранае цяпло, можна б было ператварыцца ў лёд. Схаваныя рукі былі ўсё роўна застылыя, гэтак жа сама і душа. Так што, мой пане Завадскі, пра тое, каб пісаць, і ў галаве не было. А да ўсяго гэтага не па-людску да мяне тут аднесліся... Губернатар, кузіна якога тут замужам за камендантам, на пытанне, ці можна мне пісаць да бацькоў, загадаў — ці не з любові да сваіх? — каб у мяне ні пяра, ні чарніла, ні паперы не было. Тут жа загад быў даведзены да дзяжурных. Мне і раней перашкаджалі пісаць дадому розныя фармальнасці, а цяпер я зусім пазбавіўся гэтай адзінай

прыемнасці — пісаць, што мроіцца. Зрэшты, на такім халодным гарызонце і сярод усялякіх прыкрасцяў ні пра што асаблівае не мроілася — такое прыніжэнне было вельмі прыкрае і ўсякую ахвоту што-небудзь грымзоліць адбіла...» З Кізіла Яна Чарота выслалі ва Уфу. Беларускі гісторык Валянцін Грыцкевіч знайшоў у Цэнтральным дзяржаўным архіве Башкірскай АССР, у фондзе Арэнбургскага грамадзянскага губернатара за 1824-1830 гады, цікавыя звесткі аб знаходжанні Яна Чачота ва Уфе. Ёсць там, напрыклад, такі запіс: «Студэнт Іван Фадзееў сын Чачот — перайменаваны ў канцылярыста ў мінулым 1828 годзе ліпеня з 14 дня, знаходзіцца на кватэры і працягвае служэнне ў канцылярыі пана Арэнбургскага губернатара, займаецца пісьмаводствам і ад казны ўжо ніякага жалавання не мае, а атрымлівае адпаведна працы грошы».

З Уфы Яна Чачота ў 1831 годзе перавялі ў Цвер, дзе ён прабыў два гады і дзе ў час эпідэміі халеры ледзь не загінуў ад раз'юшанага натоўпу гараджан, якія паверылі пушчанай некім плётцы, быццам бы ён разам з іншымі ссыльнымі вінаваты ў эпідэміі...

Там, у далёкай ссылцы, Ян Чачот не ўпаў духам, не апусціў рук. Ён і ў тых суровых умовах застаўся верны сваім народазнаўчым інтарэсам, захапіўшыся збіраннем мясцовых этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, якія пасылаў свайму сябру-філамату манголазнаўцу Юзафу Кавалеўскаму ў Казань, куды той быў высланы. Матэрыялы гэтыя, на жаль, загінулі ў час паўстання 1863 года ў варшаўскай кватэры Юзафа Кавалеўская, які к гэтаму часу вярнуўся ў Польшчу. Валянцін Грыцкевіч у Рукапісным аддзеле Дзяржаўнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе знайшоў пісьмо Кавалеўскага вучонаму-ўсходазнаўцу У. У. Грыгор'еву, дзе ён піша: «...І гэты стос пісьмаў (Чачота), каля 200 аркушаў, у час разгрому маёй маёмасці ў Варшаве прапаў без вестак. Цяжка, цяжка аб гэтым пісаць».

І ўсё ж гэта толькі маленькія, як кажуць, «разрозненыя» звесткі аб тых дзесяці гадах сібірскай ссылкі Яна Чачота, толькі іх прыглушаныя адгалоскі. Той, хто захацеў бы адхіліць заслону часу і паказаць ад пачатку да канца жыццё паэта ў ссылцы, павінен быў бы падняць усе тыя матэрыялы — яго і пра яго, якіх нямала, пэўна ж, захоўваецца недзе ў архівах. На некаторыя з гэтых матэрыялаў ужо натрапілі рускія даследчыкі.

Быў яшчэ ў біяграфіі Яна Чачота і Лепель, куды яго ў 1833 годзе перавёў цвярскі губернатар, ратуючы ад несправядлівага абвінавачвання, звязанага з памянёнай вышэй эпідэміяй халеры. У Лепелі нешчаслівага выгнанніка ўладкавалі ў кіраўніцтве сістэмы Бярэзінскага канала, дзе дырэктарам быў сын цвярскога

губернатара. Апынуўшыся на Беларусі, Ян Чачот разгарнуў шырокую дзейнасць па збіранні песенных скарбаў беларускага народа, пра што марыў яшчэ ў Вільні.

Нарэшце ў 1839 годзе яму, як пішацца ў цыркуляры міністэрства ўнутраных спраў, «государь император высочайше повелеть соизволил: дозволить высланному за прикосновенность к обществу филоматов в Оренбургскую губернию, а потом поступившему на службу по ведомству путей сообщения бывшему студенту Виленского университета, а ныне губернскому секретарю Чечоту возвратиться на родину Гродненской губернии в Новогрудский уезд без учреждения за ним полицейского надзора».

Нават без паліцэйскага нагляду! Воля! Пасля шаснаццаці адабраных гадоў жыцця!

Куды ж было кінуцца цяпер былому арыштанту? Вядома ж, дадому, на родную Навагрудчыну!

Першага, каго ўспомніў там Ян Чачот, быў апякун філаматаў ліберальны граф Храптовіч з яго надзвычай багатай бібліятэкай у Шчорсах, дзе асабліва любілі працаваць Адам Міцкевіч і Францішак Малеўскі. Граф Храптовіч, ведаючы схільнасць Яна Чачота, адразу ж даў яму там пасаду бібліятэкара — пасаду, пра якую можна было толькі марыць. У Шчорсах Ян Чачот мог цалкам аддацца свайму любімаму занятку — збіранню і публікацыі асобнымі зборнікамі беларускага фальклору.

У 1844 годзе Ян Чачот вымушаны быў пакінуць працу ў бібліятэцы. Апошнія тры гады жыў ён у сваіх сяброў — спачатку ў Вяржбоўскіх у Далматаўшчыне, потым у Рафала Слізеня ў Вольнай і Бортніках.

Пасля цяжкая хвароба прывяла яго ў Друскенікі, «на воды». Але лячэнне не дало ніякага выніку, і 23 жніўня 1847 года Ян Чачот, не дасягнуўшы нават свайго 50-годдзя, памірае ў ваколіцах Друскенікаў — вёсцы Ротніца. Адам Міцкевіч, са спазненнем даведаўшыся аб смерці свайго сябра, з болем у сэрцы пісаў 26 чэрвеня 1853 года Ігнату Дамейку з Парыжа ў Чылі: «Дарагі Ігнат, вось што-кольвек пра нашых былых сяброў і мінулыя часы. З двух канцоў зямлі, якія аддзялілі нас адзін ад аднаго, мы бачым парознаму цяперашнія часы, у мінулым жа мы сустракаемся паранейшаму. Не ведаю, ці вядома табе, што ад нас пайшоў твой ранейшы знаёмы, а мой стары друг (з першага класа) Ян Чачот. Дзень яго смерці нам невядомы. Мы даведаліся толькі, што ён памёр. Прыблізна ў той час, калі ён памёр, мне ўсё снілася пра яго адно і тое ж: што ён прыехаў у Парыж, а я з-за нейкіх перашкод не магу з ім пабачыцца. Гэта мучыла мяне ў сне, і я прачынаўся сумны. Мне доўга не хацелася верыць звесткам пра

яго смерць, якія ў нас так цяжка праверыць. Цяпер я ведаю пэўна, што ён памёр. Доўгія гады і многа ўспамінаў звязвалі мяне з ім. Перад смерцю ён выдаў беларускія песні, і яны там у нас выклікалі многа спачуванняў...»

Друскенікі. Сюды я прыехаў з сынам — на адпачынак. Ціхі, увесь у зеляніне цяністых ясеняў і ліп гарадок, падпяразаны шырокім пасам блакітнага Нёмана. Курорт усесаюзнага значэння.

Дабірацца да Ротніцы было вельмі проста: мы селі на гарадскі аўтобус — «тройку» і праз хвілін пятнаццаць сышлі ў зялёным, вельмі акуратным пасёлку, з даволі шыкоўнымі, часта муравanымі дамамі.

Тут жа, каля самага аўтобуснага прыпынку, адразу за плотам і пачыналіся ротніцкія могілкі, што падыходзілі адным бокам да ўтравелага касцельнага двара.

Магілу Яна Чачота знайсці было зусім няцяжка. Прайшлі туды, дзе былі старыя могілкі, і праз колькі часу блукання на іх убачылі акуратна агароджаны з усіх бакоў сціплы, але даволі прыстойны чатырохвугольны помнік, на якім здалёку кінулася ў вочы выбітае залатымі літарамі прозвішча Яна Чачота. І — як тут было не здзівіцца, не ўзрадавацца? — на магіле паэта я ўбачыў слоік са свежымі гваздзікамі! Ды ўжо дзеля аднаго гэтага можна было сюды ехаць!

На фасадным баку помніка зусім добра яшчэ чыталіся выбітыя 136 гадоў назад вельмі прачулыя і вельмі дакладныя радкі верша на польскай мове Антонія Эдуарда Адынца, філарэта, малодшага сябра Яна Чачота і Адама Міцкевіча:

Сваю маладосць прысвяціў ён навукам і цноце,
Век сталы ён мужна пражыў у няспынных цярпеннях.
Любоў да сяброў і да Бога — істоты яго была зместам.
Цяжкое жыццё яго ўсё — да збавення дарогай.
Імя яго злучана будзе навекі ў айчыне
З Адамам Міцкевічам і Томашам Занам.
Хто ведае іх, перад каменем гэтым схіліся,
Падумай, ўздыхні і за ўсіх іх траіх памаліся.
(Пераклад М. Танка)

Сцяжыны Яна Чачота... Многа яшчэ на іх нязведанага, схаванага ад нас заслонай часу. У сваіх, можа быць, трохі раскіданых нататках я, вядома ж, не мог раскрыць ва ўсёй паўнаце гэту вельмі прывабную постаць у гісторыі нашай літаратуры і культуры ў цэлым. Шматбаковая дзейнасць Яна Чачота, паэта, фальклярыста, этнографа, мовазнаўцы, грамадскага дзеяча, яшчэ чакае свайго ўдумлівага, сур'ёзнага

даследчыка, таго, кажучы купалаўскімі словамі, «новага., а мудрага гісторыка», які, зняўшы густыя напластаванні часу, ва ўсёй велічы высвеціць перад намі гэты яркі вобраз аднаго са слаўнай кагорты сейбітаў разумнага, добрага, вечнага.

1983—1991

Дарогамі Тамаша Зана

МЯСАТА

У Мясату я падбухторыў з'ездзіць са мною Генадзя Каханоўскага. А ехаць туды, як выявілася, вельмі проста — і мне, мінчуку, і яму, маладзечанцу: Мясата ж — адзін з прыпынкаў электрычкі «Мінск — Маладзечна». Значыць, мы з двух канцоў дарогі — я з Мінска, Генадзь з Маладзечна — можам там і з'ехацца. Нам трэба было толькі выбраць час «сустрэчы на Эльбе».

Час гэты падабраў Генадзь, а калі казаць дакладней, дык яго знаёмая настаўніца беларускай мовы і літаратуры Мясацкай дзевяцігодкі, актывістка краязнаўства Яўгенія Васільеўна Костачка, якой ён — відаць, па тэлефоне — расказаў пра нашу задуму. Яўгенія Васільеўна, адразу ж ухапіўшыся за намер двух літаратараў наведаць Мясату, папрасіла зрабіць гэта першага верасня: яна хацела, каб мы выступілі ў школе на ўрачыстым адкрыцці новага навучальнага года і правялі першы ўрок, прысвечаны 500-годдзю Францішка Скарыны. Калі Генадзь сказаў мне па тэлефоне пра такую просьбу, я, не вагаючыся, адразу даў згоду: што ж, урок той — а намячаўся ён роўна на дзевяць гадзін раніцы — пэўне ж, зойме не шмат часу, пасля яго застанецца яшчэ ўвесь белы дзень, і мы паспеем як след пазнаёміцца з Мясатой і яе ваколіцамі.

Раніца першага верасня была светлая, з халадком. Я сеў у электрычку недзе каля сямі гадзін — у самую бадзёрую пару. І вось за акном — узгорыстая Маладзечаншчына. Любуючыся свежымі жаўтавымі ржэўнікамі з параскіданымі каткамі саломы, сіратлівымі, у быльнягу прысадамі пакінутых хутарскіх астраўкоў, каляіністымі пясчанымі дарогамі, што губляліся ў падступных лясах-пералесках, я перад кожным прыпынкам «вастрыў» вуха, каб

разабраць прыглушаны дынамікам голас машыніста з яго аб'яўкамі: хаця б не прапусціць «маёй» Мясаты.

Мясата... Для большасці пасажыраў, што едуць у Маладзечна, гэтая назва, пэўне ж, нічога не кажа: ці мала якія ёсць у нас вёскі! Для мяне ж яна — не са звычайных. Яна выклікае ў мяне цэлы рой добрых думак, адразу пераносячы ў адшумелае XIX стагоддзе. Мясата ж — радзіма Тамаша Зана.

Імя Тамаша Зана стала шырока вядомым пасля гучнага працэсу над філаматамі і філарэтамі ў 1823-1824 гадах у Вільні, з якога людзі даведаліся аб выдатна арганізаваных і даволі прадстаўнічых тайных згуртаваннях беларускай моладзі, накіраваных супраць царызму. Па сутнасці яны былі блізкія сваімі задачамі і ідэямі дзекабрысцкім арганізацыям, якія ўзніклі якраз у гэты час у Расіі і на Украіне. Філаматы ўжо наладжвалі з імі кантакты. Выкрыццё віленскіх згуртаванняў моладзі перашкодзіла больш цесным іхнім сувязям. Можна смела сказаць: калі б Таварыства філаматаў не было ліквідавана царскімі ўладамі, яно знайшло б спосаб падтрымаць паўстанне на Сенацкай плошчы Пецярбурга ў снежні 1825 года. Зрэшты, тыя з філаматаў, якім удалося выбавіцца з кіпцюроў царскіх паслугачоў і пазбегнуць турмы і высылкі «ў аддаленыя губерні Расіі», і праўда падтрымалі выступленне дзекабрыстаў. Адзін з іх, блізкі сябар Тамаша Зана, Яна Чачота і Адама Міцкевіча філамат Міхал Рукевіч прычыніўся да выступлення раскватараванага на Беласточчыне Літоўскага асобнага корпуса царскіх войск супроць самога Мікалая ў тым жа снежні 1825 года, яскрава выказаўшы гэтым самым сваю салідарнасць з рускімі рэвалюцыянерамі. І, відаць жа, нездарма адбываў філамат-дзекабрыст Міхал Рукевіч ссылку ў Сібіры разам са сваімі рускімі сябрамі па няволі Мікітам Мураўёвым, Сяргеем Валконскім, Сяргеем Трубяцкім, братамі Бястужавымі. Дарэчы, дзякуючы М. А. Бястужаву захаваўся зроблены ім у ссылцы партрэт нашага славутага земляка.

Тамаш Зан быў галоўным арганізатарам радыкальных згуртаванняў моладзі ў Вільні. Якраз ён разам з Адамам Міцкевічам і Юзафам Яжоўскім быў ініцыятарам стварэння Таварыства філаматаў, якое стала ядром усіх іншых прагрэсіўных арганізацый на Беларусі. Ён жа арганізаваў і больш шырокае, разгалінаванае згуртаванне — Таварыства прамяністых (тых, хто быццам бы выпраменьвае высокую духоўнасць), легальную арганізацыю, якую неўзабаве ён змушаны быў пераўтварыць у тайную пад назвай Таварыства філарэтаў (сяброў дабрачыннасці), стаўшы яго кіраўніком (прэзідэнтам). Ад першапачатковай назвы гэтага таварыства, якую Тамаш таксама прыдумаў сам, яго празвалі «архіпрамяністым» (самым прамяністым). Тамаш Зан быў

сапраўдным кумірам моладзі, якая заўсёды хінулася да яго, брала з яго прыклад мужнасці, арганізаванасці. Ён мэтанакіравана рыхтаваў моладзь да будучай бітвы з царскім самаўладдзем, за вызваленне роднай яму Беларусі ў рамках былой Рэчы Паспалітай ад дэспатызму.

Пра ролю Тамаша Зана ў згуртаванні прагрэсіўных сілаў грамадства Беларусі і Літвы, пра тое, якую вялікую надзею ўскладвала на яго як свайго прызнанага лідэра перадавая моладзь краю, выразна кажа Ян Чачот у вершы «У дзень урачыстасці ў гонар Тамаша Зана 29 мая 1821 года»:

Не трэба тужыць... Новай славы праменне
Азорыць яшчэ нашых прадзедаў цені —
Хай знаюць, што й сёння іх родныя нівы,
Дзе колісь паказвалі мужнасці дзівы,
Усё ж нараджаюць сыноў яшчэ годных...
Да дзеяў рыхтуемся высакародных
Мы сёння, дух будзячы ўсюды ў краіне —
Хоць цемра навокал, усё ж ён не згіне...
О брацці! Нам Заўтра шчаслівае ззяе!
Яго перад намі Тамаш расчыняе.
Ён першы, яго паказаўшы ясноты,
Павёў нас да славы дарогаю цноты —
Мы з ім палюбілі свой гурт і ў забавах
Задумалі разам вялікую справу...*

Сенатар Мікалай Навасільцаў, якога царскія ўлады прыслалі ў Вільню для расследавання дзейнасці тайных арганізацый, адразу ўбачыў у асобе Тамаша Зана самага актыўнага завадатара моладзі, надзвычай небяспечнага для рэжыму рэвалюцыянера. У рапарце ў Варшаву царскаму намесніку вялікаму князю Канстанціну ён даносіў, што якраз Тамаш Зан быў заснавальнікам прадстаўнічага Таварыства філарэтаў, «тайнай мэтай» якога мелася быць «рэвалюцыя ў думках». І нездарма ж складзеная самім царом Аляксандрам I камісія, у якую ўвайшлі сенатар Навасільцаў, міністр асветы Шышкоў і генерал Аракчэеў, самы суровы прысуд з усіх двухсот пакараных філарэтаў вынесла якраз яму, Тамашу Зану, «як стваральніку і кіраўніку ўсяго таварыства»: цэлы год крэпасці ў Арэнбургу і пасяленне там без права вяртання на радзіму. Цар Аляксандр I зацвердзіў гэты прысуд.

На працэсе над філаматамі і філарэтамі Тамаш Зан паказаў сапраўдную мужнасць і высакароднасць. Каб выгарадзіць сваіх сяброў па арганізацыі, ён усю віну за яе дзейнасць узяў на сябе. Вельмі добра расказаў пра гэта Адам Міцкевіч у сваіх славутых

«Дзядах», дзе побач з іншымі філаматамі намаляваў прывабны вобраз Тамаша Зана пад яго ж імем. Вось якія словы ўкладае вялікі паэт у вусны Тамаша (падаю іх у перакладзе на рускую мову В. Левіка):

Один лишь путь у нас к спасенью остается:
Кому-то на себя принять вину придется
И, выручая всех, погибнуть одному.
Я в нашем обществе главою был, а значит,
Я должен пострадать за вас, мои друзья...

І ён свядома, без нараканняў пайшоў на гэтыя пакуты. Уяўленне пра роспачны, змрочны настрой зняволенага і выгнанніка, адарванага ад радзімы, ад родных і блізкіх, пра безвыходнасць яго становішча можа даць напісаны Занам у 1825 годзе ў крэпасці верш «Выгнаннік»:

Каму тут свой выказаць смутак?
Хто згаслую верне надзею?
Трывожна і цяжка чаму так
На сэрцы? Хто хмары развее?
Няма ні сястры тут, ні брата.
Мая ты найлюбая, дзе ты?
Ад вас, родных ніў, перакатаў
Мяне аддзяляе паўсвету...
Бязмоўе. Для вока, для вуха
Усё тут няміла, ў чужыне.
З кім словам абмовіцца? Глуха.
Адзін між чужых — бы ў пустыні.
Ды не без сваіх і край свету:
Тут друга, здараецца, бачу.
Ён гэткі ж выгнаннік, ён гэту ж
Тут кару нясе, так жа плача.
Сляза тут у хвалі Урала
Спадзе, і яны будуць несці
Яе не да родных прычалаў,
А ў мора Хвалынскае дзесьці.
Хто ўздых тут мой цяжкі пачуе?
Ледзь вырвецца ён, як завея
Падхопіць яго, завіруе,
Па стэпе татарскім развее.
Я тут падуладны буранам.
Навее ўспаміны мне хмара.
Былое маё — за туманам.

Жыццё — як далёкая мара*.

Але турма і ссылка не зламалі «найпрамяністага». Ён і там, на далёкім Урале, адседзеўшы прызначаны тэрмін у глухіх і халодных турэмных сценах, застаўся верны ідэалам маладосці. Імя Тамаша Зана я нечакана сустрэў на старонках рамана вядомага рускага пісьменніка Эрнста Сафонава «Казенные люди». На аснове знойдзеных на Урале дакументаў Э. Сафонаў расказаў пра ўдзел славутага філамата ў тайнай арганізацыі рускіх рэвалюцыянераў у Арэнбургу, пра шчырую дружбу з яе кіраўніком Пятром Кудрашовым, рускім паэтам, творы якога друкаваліся побач з творамі Аляксандра Пушкіна ў такіх выданнях, як «Вестник Европы», «Календарь муз», «Весенние цветы», «Полярная звезда», «Отечественные записки»...

Пра няскоранасць духу, пра актыўную палітычную дзейнасць у ссылцы Тамаша Зана шмат новых і цікавых фактаў падаў гісторык Валянцін Грыцкевіч у сваёй кнізе «Ад Нёмана да берагоў Ціхага акіяна». З яе мы даведваемся, напрыклад, што Зан у 1833 годзе прымаў удзел у змове ссыльных, якія рыхтавалі ўзброенае паўстанне супроць мясцовых улад з тым, каб уцячы потым за мяжу.

Але Тамаш Зан заслужыў нашу пашану не толькі як змагар супроць царскай тыраніі, як будзіцель грамадскага руху за разняволенне. Вельмі вялікая яго роля і ў культуры, перш за ўсё ў нараджэнні на Беларусі новага, прагрэсіўнага літаратурнага напрамку — рэвалюцыйнага рамантызму. Якраз ён, Тамаш Зан, адным з першых звярнуў увагу на народную паэзію, вуснапаэтычную творчасць беларускага народа як на новую, прынцыпова важную крыніцу абнаўлення літаратуры. А зварот да фальклору, як вядома, быў характэрны якраз для паэтаў-рамантыкаў.

Ужо ў студэнцкай камедыі «Грэцкія піражкі», напісанай у 1817 годзе, Тамаш Зан падаў добры прыклад выкарыстання беларускага фальклору, перш за ўсё прыказак і прымавак, характэрных для нашай мовы выслоўяў. Вось некаторыя з іх: «На злодзею і шапка гарыць», «Не адзін Гаўрыла ў Полацку», «Баба з калёс — калёсам лягчэй», «Хто ўкраў парасё, у таго ў вушах пішчыць». Матывы і вобразы народнай творчасці беларусаў бачым мы і ў яго аб'ёмістай паэме «Табакерка» (1818), дзе даволі цікава апісваецца беларускае вяселле, язычніцкае свята Купалле, расказваецца пра русалак, пра розныя звычаі і абрады беларусаў. У тканіну твора аўтар арганічна ўплятае ў сваёй апрацоўцы беларускія народныя паданні. Паводле паданняў нашага народа

былі напісаны і найбольш цікавыя Занавы балады — «Цыганка», «Свіцязь-возера» і іншыя.

Гэтыя творы Тамаша Зана разам з баладамі і беларускімі песнямі Яна Чачота сваім уплывам сталі вызначальнымі ў літаратурнай долі іх агульнага сябра Адама Міцкевіча, пра што ўжо не раз адзначалася ў літаратуразнаўстве.

Тамаш Зан, як і ўсе пісьменнікі Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, пісаў на польскай мове, якая была мовай тагачаснай літаратуры, усяго нашага справаводства. І ўсё ж такіх польскамоўных пісьменнікаў, прадстаўнікоў беларускай спольшчанай шляхты, як Тамаш Зан, Адам Міцкевіч і часткова польскамоўны Ян Чачот, трэба з поўным правам аднесці да пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння. Перш за ўсё таму, што яны ўпершыню асновай сваіх твораў рабілі вуснапаэтычную творчасць роднага ім беларускага народа, паказалі яе глыбіню, высокую эстэтычную вартасць. Яны скіроўвалі ўвагу грамадскасці на самабытнасць традыцыйнай культуры беларусаў, на адметнасць іх як асобнай нацыі, адным словам, адкрывалі перад шырокім светам цэлы народ, які дагэтуль вельмі ж спрытна «прысвойвалі» больш моцныя суседзі, імкнучыся раздзіраць яго на часткі. Акрамя таго, усе тры названыя паэты выразна праявілі ў шматлікіх творах свой «краёвы» патрыятызм, апяваючы родную «Літву», сілай мастацкага слова ўваскрашаючы яе шматвекавую гісторыю. Яны, можна сказаць, ушчыльную падышлі ўжо і да стварэння ўласна беларускай літаратуры. Першым крокам да гэтага былі іх выказванні аб самабытнасці, аб мілагучнасці і прыгажосці беларускай мовы, да якой усе яны ставіліся з глыбокай павагай і прыхільнасцю. Другі крок — спробы асобных з іх пісаць на гэтай мове, а таксама ўводзіць яе ў канву сваіх польскамоўных твораў.

Інакш кажучы, якраз з польскамоўнымі пісьменнікамі Беларусі першай паловы XIX стагоддзя трэба звязваць нараджэнне новай беларускай літаратуры. Асноўная іх заслуга ў тым, што яны падрыхтавалі для яе глебу, пасеялі першае зерне нашага нацыянальнага адраджэння. Іх творчасць — гэта першапачатковы этап у гісторыі новай беларускай літаратуры, этап, без якога зусім немагчыма растлумачыць увесь працэс яе развіцця. Лічу вялікай недарэчнасцю, што творчасць паэтаў-рамантыкаў, як, дарэчы, і іншых польскамоўных, а таксама лацінскамоўных беларускіх пісьменнікаў мы выключылі з поля свайго зроку, гэтак нядбайна ігнаруем. Яна ж, апрача ўсяго, — наша жывая гісторыя.

Варта сказаць і пра адносіны канкрэтна Тамаша Зана да беларускай мовы. Як і ўсе філаматы, ён добра яе ведаў і шанаваў. Ён сам падкрэсліваў у сваіх успамінах, што яшчэ ў час вучобы ў

Мінскай гімназіі «мужыцкай мовай Міншчыны ахвотна карысталіся студэнты», што яна не чужая была і студэнтам Віленскага універсітэта, дзе вучылася пераважна моладзь з беларускіх губерняў. Тамаш Зан свядома браў для сваіх вершаў, балад і іншых твораў беларускія словы і выразы. На гэта неаднаразова звярталі ўвагу польскія і беларускія літаратуразнаўцы. Напрыклад, Станіслаў Станкевіч у сваёй кнізе «Беларускі пачатак у польскай паэзіі першай паловы XIX стагоддзя», якая выйшла ў трыццатых гадах на польскай мове ў Вільні, прыводзіць цэлы спіс «беларускіх правінцыялізмаў», якія ён знайшоў у творах Зана. Сярод іх ён называе такія, як «Чым хата багата, тым ці будзень рада», «ні тое ні сее», «кішэня», «бусі» (пацалунак), «харошы», «хвост», «галубчык», «глячык», «кажан», «кужэльны», «краска», «наўда», «неахайны», «акрайчык хлеба», «аруд», «паспець», «рана», «русы», «што», «заклікаць» і іншыя. На аснове сваіх назіранняў С. Станкевіч робіць вывад, што Тамаш Зан быў адным з самых першых і самых гарачых прыхільнікаў «культывавання краёвай літаратуры». Якраз таму, трэба думаць, вельмі горача вітаў Тамаш Зан беларускамоўную творчасць свайго сябра Яна Чачота. Каб даць шырэйшы ход Чачотавым беларускім творам, ён сам складаў на іх музыку, з ахвотай спяваў іх разам з сябрамі. Ёсць усе падставы меркаваць, што Тамаш Зан таксама пісаў на беларускай мове. Але паколькі беларускія творы не было дзе друкаваць, яны маглі б толькі цудам захавацца, дайсці да нас. Мне думаецца, што і пра большасць беларускіх вершаў Яна Чачота наўрад ці сёння б мы ведалі, калі б ён не здагадаўся апублікаваць іх у сваіх фальклорных зборніках пад выглядам народных песень...

Тамаш Зан паходзіў з тыповай беларускай шляхты. Сапраўднае прозвішча яго продкаў — Зань. Так гучала прозвішча і Тамаша, але ў час вучобы ва універсітэце яно чамусьці «пацвярдзела». Дзед Тамаша Зана — таксама Тамаш — быў бурмістрам у Радашковічах, дзе меў нейкія зямельныя надзелы. Адначасова ён арандаваў недалёкі адсюль маёнтак Селішча. Продкі Тамаша Зана па мацерынай лініі жылі ва Уздзе. Былі яны уніятамі. Відаць, уніятамі былі і Зані. А гэта азначае, што ўсе яны ў мінулым — праваслаўныя. Тыповыя метамарфозы беларускай шляхты.

Бацька Тамаша — Кароль Зань — атрымаў у спадчыну ўладанні ў Радашковічах. У яго былі ўсе ўмовы для спакойнага сямейнага жыцця. Але сядзець у зацішку ў той бурлівы час — а гэта была мяжа XVIII-XIX стагоддзяў — ён не мог. Калі ў краі выбухнула паўстанне супраць царызму, Кароль Зань ідзе ў шэрагі барацьбітоў за волю на чале з Тадэвушам Касцюшкам. Пасля

разрому паўстання ён вяртаецца дамоў. Але, пачуўшы пра рэпрэсіі ў адносінах да паўстанцаў, Кароль Зань на нейкі час сыходзіць з дому, уцякае кудысьці аж пад Крулявец. Цяжарную ж жонку Кацярыну з першым сынам Вінцэнтам адвозіць у маёнтак Селішча да брата, дзе яна павінна была пачакаць, пакуль вызваліцца куплены Занам перад ад'ездам невялікі маёнтачак Халецкоўшчына ў гэтым жа Вілейскім павеце. Ды вось бяда: нейкім чынам згубіліся дакументы на яго куплю, і Кацярына нечакана засталася і без грошай, і без дома. Даведалася яна пра гэта якраз тады, калі выехала ўжо ў Халецкоўшчыну. Затрымалася яна ў Мясаце, дзе і нарадзіла Тамаша. Трэба думаць, адбылося гэта ў панскім доме, у Тышынскіх.

Як мяркуюць біёграфы паэта-філамата, жонцы паўстанца небяспечна было заставацца ў Мясаце, бо праз вёску якраз праходзілі казацкія войскі. Яна вымушана была ўцячы ў лес. Памагла ёй перабыць ліхі час тутэйшая сялянка, якая напаткалася ў лесе: яна хадзіла сюды да свайго мужа, што хаваўся ад рэкрутчыны. Гэтая сялянка нават стала для Тамаша «мамкай»: карміла яго сваімі грудзьмі.

Але ёсць і другая версія пра месца нараджэння Тамаша Зана: нібы гэта было ў мясцовай, мясацкай карчме. Як бы там ні было, але Мясата — месца яго прыходу ў свет.

Ад станцыі Мясата да самой вёскі — ісці кіламетры два праз поле. Усё ж я, здаецца, не спазніўся: калі прыйшоў, якраз выстройвалі дзяцей у вестыбюлі школы на ўрачыстую лінейку. Генадзь Каханоўскі мяне ўжо чакаў. Нам далі слова, і мы павіншавалі дзяцей з пачаткам новага навучальнага года, ну, а потым «правялі» першы «ўрок» у старэйшых класах — расказалі пра нашага славутага асветніка і першадрукара, пра пакручастыя шляхі нашай гісторыі, пра ўздзеянне беларускай культуры ў сярэднявеччы на ўсё ўсходняе славянства, у першую чаргу на «Масковію».

Пасля «ўрока» Яўгенія Васільеўна Костачка паказала нам школьны музей, які яна «курыруе». Для яго адвялі звычайны класны пакой. Вядома, больш за ўсё тут фотаздымкаў. Ну, і кнігі, і рукапісныя альбомы, дзе паказваецца гісторыя вёскі, школы. Тут жа і стэнд, прысвечаны Тамашу Зану. І этнаграфічныя рэчы. Музей пакуль што сціплы, аматарскі. Але галоўнае — ён ёсць, і — таксама галоўнае — што дзеці самі збіраюць для яго матэрыялы. Вядома, пад кіраўніцтвам Яўгеніі Васільеўны. Думаю, такія краязнаўчыя музеі павінны быць у кожнай школе. Яны ж, як нішто лепей, абуджаюць у дзяцей цікавасць да свайго краю, даюць ім першыя навыкі і смак даследчыцкай працы і, напэўна ж, павінны падказаць каму-небудзь з іх магістральную дарогу ў жыцці.

Акрамя таго, гэтакія музеі могуць стаць своеасаблівымі цэнтрамі вывучэння кожнай мясцовасці. Сабраныя дзецьмі прадметы сялянскага побыту, запісаныя на магнітафонную стужку расказы старых людзей пра іх жыццё, пра мінулае вёскі, а таксама захаваныя ў іх памяці мясцовыя песні, казкі, паданні', прыказкі, прымаўкі, выслоўі, загадкі — гэта ж каштоўнейшы наш скарб, матэрыял для вывучэння нашага краю. Калі б такое зрабіць у кожнай школе, мы мелі б жывую, з цікавейшымі мясцовымі фактамі карціну даўно мінулага і сённяшняга дня Беларусі.

Уражанне ад сустрэч у школе было ў нас абодвух самае прыемнае. Вядома, не таму, што нас добра прынялі. А таму, што мы пабывалі ў сапраўды беларускай школе, дзе шануецца родная мова, дзе выхоўваюцца сапраўдныя грамадзяне Беларусі, патрыёты бацькоўскай зямлі, а не Іваны, якія не помняць, хто яны і адкуль. Як часта даводзілася бываць мне ў школах, дзе нават слова беларускага не пачуеш і не ўбачыш на надпісах — усюды руская мова. Як быццам ты трапіў у Расію: Звычайна дырэктарамі такіх школ падбіраліся зверху ідэйна падкаваныя, адданыя партыі, а не народу камуністы, гэтакія фанабэрыстыя «ўсёзнаўцы», што намёртва ўбілі сабе ў мазгі жалезныя каноны іх тэорыі аб будучым зліцці ўсіх нацый, пад якім (зліццём) разумелася чамусьці толькі звычайная іх русіфікацыя і якое — таксама чамусьці — праводзілася пад лозунгам інтэрнацыяналізму. У такіх школах я бачыў знешне спагадлівыя, ілжыва ветлівыя адносіны да мовы нашага народа, у сапраўднасці ж адназначна асуджанай такімі «моцна падкаванымі» дырэктарамі ды і асобнымі звышстараннымі настаўнікамі на выміранне. Сваю інтэрнацыянальную задачу яны бачылі ў тым, каб паскорыць гэты «аб'ектыўны» працэс, каб унесці «пасільны ўклад» у знішчэнне культуры, мовы народа, а значыць, і самога народа, ператварыўшы яго ў безаблічнае насельніцтва, якое можна лёгка тады далучаць да любой іншай дзяржавы. Сумна, што ў гэтым вялікім злачынстве перад нашым народам часта ўдзельнічалі і там-сям удзельнічаюць і сёння самі ж дзеці гэтага народа, якіх у шырокім свеце называюць калабарацыяністамі, а ў народзе — проста здраднікамі. Сумна, што такіх здраднікаў свайго народа нямала можна сустрэць сярод педагогаў. Ім жа так лёгка пасеяць у юных душах чорнае семя нацыянальнага нігілізму. У Мясацкай школе мы ўбачылі сапраўдных педагогаў, далёкіх ад такой фанабэрыі, шчыра зацікаўленых у патрыятычным выхаванні сваіх вучняў, у іх духоўным здароўі. Як прыемна было чуць на «лінейцы» і пасля яе з вуснаў і настаўнікаў, і вучняў, і самога дырэктара нашу чыстую беларускую мову! І з розных плакатаў, насценных надпісаў не зганялі яе тут, як у іншых школах.

Тон у гэтым, як мы зразумелі, задае сам дырэктар Алег Анатольевіч Радзюкевіч, ветлівы, немітуслівы, па-сапраўднаму інтэлігентны малады чалавек, з якім мы разгаварыліся ў яго кабінеце. Як выявілася, Алег Анатольевіч — сын настаўніка, які яшчэ ў пачатковай школе вучыў некалі майго хаўрусніка Генадзя Каханоўскага. Генадзь расказаў мне, што гэта быў сапраўдны беларускі інтэлігент, чалавек высокай культуры. Нават тады, у першыя пасляваенныя гады, ён вучыў дзяцей шанаваць свой народ, яго мову, фальклор.

Асабліва запала Генадзю ў памяць, як настаўнік спяваў разам з дзецьмі беларускія народныя песні. Якраз Анатоль Сцяпанавіч Радзюкевіч адзін з першых абудзіў у ім любоў да роднай зямлі, зацікавіў краязнаўствам. Але за такое, як вядома, не гладзілі ў той час па галоўцы. Аднаго разу вучні, прыйшоўшы раніцай у школу, не дачакаліся свайго настаўніка. Яны доўга не маглі зразумець, чаму позніцца Анатоль Сцяпанавіч — раней жа такога ніколі не здара лася. Усё растлумачылі вучні з Баяраў, адкуль яны хадзілі сюды, у Насілкаўскую школу пад Маладзечнам, і дзе жыў таксама Анатоль Сцяпанавіч. Яны расказалі шэптам, што сярод ночы настаўніка «схапіў хапун». Як жа, было за што: «нацдэм», гаварыў па-беларуску. А яшчэ сеяў «крамолу»: вучыў дзяцей любіць родны край.

Гэта было ў 1947 годзе. Адбываў пакаранне Анатоль Сцяпанавіч у лагеры ў Карагандзе, дарэчы, разам з беларускімі пісьменнікамі Сымонам Хурсікам, Пятром Бітэлем і Юльянам Сергіевічам, гэтакімі ж самымі «нацдэмамі». Нягледзячы на ўсё, сын, як бачым, пайшоў па бацькавай дарозе — стаў настаўнікам, пераняўшы ад бацькі любоў і пашану да свайго краю, роднага народа.

Аддаўшы «доўг» школе, мы маглі цяпер спакойна пачынаць сваю вандроўку. Але калі развіталіся з настаўнікамі і сышлі са школьнага ганка, Генадзь надта ж «узрадаваў» мяне тым, што «ў нашым распараджэнні» ёсць машына. Гэта яго сябар маладзечанскі мастак Кастусь Харашэвіч папрасіў, каб мы з Генадзем сёння ж выступілі яшчэ ў Маладзечне, у школе, дзе робіць яго жонка. Ён лса ў сваю чаргу падручаўся павазіць нас да выступлення па намечаным маршруце. Калі мы стаялі ўтрох каля машыны і меркавалі, як усюды паспець, я зразумеў, што трапіў у нейкае сіло, што наша вандроўка зрываецца.

— Не трэба нам, Генадзь, гэтая машына, — сказаў я прама, спрабуючы змяніць сітуацыю. — Яна ж толькі пашкодзіць нам, а не паможа! Ці ж мы прыехалі на гастролі?

Але Генадзь з Кастусём пачалі мне даводзіць, што «ўсё ўжо дамоўлена», што нас чакаюць у школе, што мы ўсё ж паспеем

пабыць там, дзе хацелі. Толькі трэба хутчэй садзіцца і ехаць! Вось так — хутчэй ехаць! Знаёміцца з цікавымі мясцінамі з акна аўтамабіля!

Мне ўспомнілася тут адна размова. Калі я апублікаваў у часопісе «Полымя» дарожны нарыс пра Яна Чачота, мне пазваніў Уладзімір Караткевіч. Хоць мы былі знаёмыя даўно, мне ніколі не даводзілася з ім перазвоньвацца. Тым не менш голас яго я пазнаў адразу.

— О, Валодзя! Вельмі рад чуць твой голас у маёй хаце!

Я шчыра ўзрадаваўся яго званку. Адно — што мне звоніць Уладзімір Караткевіч, паважаны ўсімі і мой любімы пісьменнік. Другое — што ён, значыцца, ужо выйшаў з бальніцы: перад гэтым я нямала чуў трывожнага пра яго хваробу.

— Як жа ў цябе са здароўем?— неяк само сабой вырвалася ў мяне.

— А! — адказаў ён, нібы адмахваючыся ад нечага надакучлівага, і адразу перайшоў на тое, дзеля чаго пазваніў.

Ён прачытаў мой нарыс. Прачытаў з цікавасцю. У ім жа — пра трагічную долю аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Яна Чачота. Валодзя расказаў мне, як сам шукаў у Друскеніках яго магілу. Тут жа, як між іншым, успомніў ён і пра Мірачыцкага, з якім я разам падарожнічаў па мясцінах Яна Чачота, нават прадэкламаваў пра яго нейчую даволі дасціпную, але зусім не злую чатырохрадковую эпіграму (на жаль, я яе не запомніў). Яшчэ паабяцаў пашукаць для мяне «фоткі» — Яна Чачота ці яго мясцін. Потым выказаў адно істотнае пажаданне: калі будзе рыхтавацца гэты нарыс для кнігі, каб я дапоўніў яго нейкімі цікавымі дарожнымі прыгодамі, нечаканымі сустрэчамі з людзьмі — каб ён лепей чытаўся.

— Правільна, Валодзя, я сам адчуваю, што ў ім гэтага не хапае. Але бяда ў тым, што мы былі ў падарожжы ўсяго тры дні, прытым на машыне, і ў нас проста не шмат было нейкіх цікавых сустрэч, — апраўдваўся я. — Да таго ж я ўжо здаў кнігу з гэтым нарысам у выдавецтва.

— Шляпа!..

Размова гэтая была недзе ў маі ці чэрвені 1984 года. А ў ліпені мяне ашаламіла вестка: памёр Уладзімір Караткевіч!..

Я расказаў Генадзю пра тую размову з Уладзімірам Караткевічам. Ён, вядома ж, згадзіўся, што паспешлівасць, верхаглядства тут не будзе ні мне, ні яму на карысць, таму паабяцаў сёння ж вярнуцца яшчэ сюды разам са мною без машыны.

Так што мы змаглі ўсё ж, хоць і не шмат, а пахадзіць тут «сваімі нагамі».

Калі мы ішлі з электрычкі ў Мясату, Генадзь падвёў мяне да вялікага прыдарожнага каменя-помніка з выбітымі імёнамі тых славутых людзей, што розным часам праязджалі тут з Вільні ў Мінск і далей — М. Агінскага, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, І. Буйніцкае, С. Буднага, Ц. Гартнага, М. Гарэцкага, М. Гогаля, Дз. Давыдава, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ул. Лугаўскога, К. Паўстаўскага, Я. Судрабкална, Ул. Сыракомля Б. Тарашке віча, В. Таўлая, П. Цвіркі, М. Чарота, Т. Шаўчэнкі, Ядвігіна Ш.

Задума гэтага незвычайнага помніка належыць якраз яму, Генадзю Каханоўскаму. Узнікла яна ў час, калі ён працаваў у краязнаўчым музеі ў Маладзечне. Са сваёй ідэяй ён пайшоў у Маладзечанскі райком партыі. Усе мы добра ведаем, як «рашаліся» такія «пытанні» ў падобных кіраўнічых установах. Усё, што не ўкладвалася ў даўно заезджаныя схемы, што не працавала на марксісцка-ленінскую догму, сустракалася тут з насцярогай. Выкладзеная на паперы ідэя ўзгаднялася, абмяркоўвалася, высвятлялася, абкатвалася і ўрэшце... клалася пад сукно, дзе беззваротна і гінула: хаця б чаго не выйшла! Вырашаць станоўча — азначала браць кіраўніку адказнасць на сябе. А што, калі больш высокі чын «узрит» тут што-небудзь «не тое», не «наши идеи»?

Але ўсё ж і ў гэтых амярцвелых кабінетах сустракаліся людзі, якія і ў жалезных рамках Сістэмы імкнуліся рабіць нешта для свайго народа. Такім чалавекам быў сакратар Маладзечанскага райкома партыі (па ідэалогіі) Вячаслаў Антонавіч Ляшковіч, які клапаціўся пра беларускую культуру. Да яго якраз і падышоў Генадзь са сваёй прапановай.

Спачатку Вячаслаў Антонавіч засумняваўся, ці варта рабіць такі памятны знак: дагэтуль жа ён не чуў, каб былі дзе-небудзь помнікі дарогам.

— А мы зробім, дык ужо й будзе, — пераконваў Генадзь сакратара.

Але другое сумненне ў Ляшковіча было больш сур'ёзнае:

— А ці не абвінавацяць нас у якім нацыяналізме?

Тут Генадзь заспакоіў Вячаслава Антонавіча тым, што на камені ж будуць выбіты імёны не толькі беларускіх славутасцяў, але і рускіх, украінскіх, літоўскіх... Так што наадварот: помнік будзе «выхоўваць інтэрнацыяналізм».

Застрахаваўшыся такімі довадамі, ідэалагічны сакратар даў «дабро».

Камень для помніка Генадзь знайшоў сам. Яшчэ перад гаворкай з Ляшковічам. Калі вандраваў з сынам Алесем па роднай Маладзечаншчыне. Тры дні ішлі яны ад вёскі да вёскі берагам пакручастай Ушы — ад самых яе вытокаў да вусця. Генадзь

расказаў мне, якія багатыя былі ў яго і ў школьніка-сына ўражанні ад сустрэч з прыродай, з людзьмі, ад начлегаў — ці то ў стозе сена, ці ў сялянскай хаце. Генадзь са сваім Алесем адшуквалі па дарозе гістарычныя памяткі, знаёміліся з цікавымі мясцінамі, звязанымі з нейкімі падзеямі мінуўшчыны і славутымі людзьмі. Дарэчы, адной з мэтаў падарожжа было для Генадзя — зацікавіць сына краязнаўствам, нязмушана скіраваць яго на тую ж дарогу, якой ішоў і сам. Такія вось тонкія «педагагічныя прыёмы» далі свой вынік: Генадзеў сын па-сапраўднаму зацікавіўся гісторыяй роднага краю, пайшоў вучыцца на гістарычны факультэт універсітэта, стаў, як і бацька, кандыдатам гістарычных навук. Выдатны прыклад разумнага ненавязлівага выхавання!

Але вернемся да тэмы нашай гаворкі. Камень, пра які мова, Генадзь з сынам знайшлі якраз у ваколіцы Мясаты, недалёка ад Ушы-ракі. Асабліва прывабіў ён Генадзя тым, што сваім пярэднім бокам нагадваў у контуры карту Беларусі.

Калі помнік быў устаноўлены, пра яго загаварыла прэса. Нават «Правда» і «Известия» яго заўважылі. І недарэмна: сэнс каменя-знака, думаю, не толькі ў тым, каб увекавечыць памяць пра выдатных людзей, якія сюдой праязджалі. Гэта ж у першую чаргу — помнік Дарозе, па якой з Еўропы на Беларусь, а з Беларусі далей — у Масковію — ішла культура. Ну, а ўсё лепшае, мусіць, і ў адваротным кірунку.

Месца нараджэння Тамаша Зана шукаць нам доўга не трэба было. У цэнтры Мясаты кожнаму кідаецца ў вочы стары, абшарпаны, з аблезлай атынкоўкай даволі вялікі будынак. Гэта — дом паноў Тышынскіх, якія жылі тут аж да 1939 года. Яшчэ нядаўна тут была школа, пакуль пабудавалі новую, амаль побач. Дом, як піша ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» Анатоль Кулагін, пабудаваны ў пачатку нашага стагоддзя. Пабудаваны, вядома ж, на месцы, дзе некалі, яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя, стаяў іншы дом, у якім і прыйшоў у свет Тамаш Зан і ад якога цяпер не засталося і следу.

Зрэшты, «след» ёсць — гэта сама сядзіба, «двор», як і цяпер яе называюць. Ад вуліцы і з бакоў сядзіба абсаджана раўнюткімі шэрагамі таполяў, ліп, клёнаў, ясеняў, бяроз. Адразу ж за сядзібай між аеру ды асакі шыецца ўнізе рачулка Пісараўка (некалі яна называлася Мясата), тут жа, каля вёскі, яна зліваецца з Ушой. Як расказаў нам васьмідзесяцітрохгадовы Аляксей Васільевіч Бурак, да якога мы завіталі, раней тут было чысцюткае возера, што аж кішэла рыбай. Сам Аляксей Васільевіч быў млынаром. Млын таксама стаяў тут недалёка. Добра помніць ён і пана Казіміра Тышынскага, які быццам быў міністрам шляхоў зносін Польшчы. Яго пад старасць «вазіў халуй на калясцы». Бываў Аляксей

Васільевіч і ў панскіх пакоях. Усё там выглядала прыгожа, чыста, светла. Люстры, карціны, кнігі. Калі ў 1939 годзе «прыйшлі сюды бальшавікі», паны паўцякалі. Дом быў разрабаваны, кнігі парасцягвалі. У доме цяпер — нейкі склад. Зарасло, засыпалася зямлёй і тое чароўнае возера.

На гэтай сядзібе, дарэчы, нарадзіўся і жыў вядомы ў Польшчы літаратурны крытык XIX стагоддзя Аляксандр Тышынскі, які тут і памёр.

Мясата — даволі вялікая вёска: яе адзіная вуліца цягнецца, мусіць, кіламетры два. Але мы захацелі прайсці яе з канца ў канец. Кожная ж вёска нечым цікавая. Во старая, традыцыйнай пабудовы хата з патрэсканымі бярвёнамі сценаў, з маленькімі вокнамі. А як не спыніцца перад гэтымі разьбянымі ліштвамі, не паразгадваць, што ўкладваў гаспадар-разьбяр у свае малюнкі-сімвалы. Там бачым цікавы двор, зарослы зялёнай муравой, з роўненька вытаптанай, нібы ток, белаватай дарожкай паўз вокны хаты. Там нашы вочы запыняюць па-мастацку аздобленыя вароты, акуратны гожы плот, за якім раскашуе белаватае суквецце памятнай з дзяцінства шышкастай гашты...

Людзей на вуліцы сустракаем не шмат — усе ў агародах ды на сотках за хатамі: цяпер жа самая пара парадкаваць гародніну, капаць бульбу.

Зайшлі ў сельскую бібліятэку: якраз была адчынена. Стэлажы застаўлены кнігамі. Газеты, часопісы. Толькі «самаадукоўвайся»!

Маладая дзяўчына, бібліятэкарка, расказала, што чытачоў у бібліятэцы нямала. Простыя вяскоўцы.

Сама дзяўчына жыве ў Маладзечне, ездзіць сюды на работу электрычкай. Работа ёй вельмі падабаецца. І сама вёска. Тым больш што і яе бацькі родам адсюль, з Мясаты. Прозвішча іх — Сушко. Пачуўшы гэтае прозвішча, я адразу ўспомніў нататку пра Мясату ў «Геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх» (што выдадзены ў Польшчы ў XIX стагоддзі), у якой расказваецца, што ў XVIII стагоддзі ўся вёска разам з людзьмі была спалена шведамі (гітлераўцы, значыцца, былі не першыя, хто такім жахлівым спосабам вынішчаў беларусаў). З усёй Мясаты тады выратаваўся адзін чалавек — Сушка. «Цяпер там, —пісалася ў слоўніку, адпаведны том якога выйшаў у 1885 годзе, — многа Сушкаў». Вось гэтак, усё нейкім цудам, і выжывалі мы, беларусы, у гісторыі.

МІНСКАЯ ГІМНАЗІЯ

Пасля Мясаты жонка паўстанца з малымі дзецьмі на руках ізноў апынулася ў Селішчы, куды неўзабаве, пачуўшы пра амністыю, вярнуўся і сам Кароль Зань. Застаўшыся цяпер без сваіх уладанняў (да яго страт, вядома ж, прычыніўся ягоны актыўны ўдзел у «касцюшкаўскай інсурганцыі»), ён мусіў шукаць работу ў заможных гаспадароў. Былы паўстанец уладкоўваецца аканомам у адстаўнога палкоўніка польскіх войск Трэмбіцкага ў недалёкім маёнтку Вязынь.

Тут, у Вязыні, і прайшло маленства Тамаша, тут браў ён «навуку жыцця», тут у дзяка Аляшкевіча пачаў вучыцца грамаце. Адсюль маці адвозіць потым малога да сваіх бацькоў у мястэчка Узду, дзе ўладкоўвае яго ў парафіяльную школу. Пасля смерці дзеда Тамаш разам з бабуляй ізноў вярнуўся да сваіх бацькоў у Вязынь. Цяпер хлапчук працягвае вучобу ў гувернёра Калантая ў суседняй Слабадзе (вучыцца разам з дзецьмі нейкіх Мікуцкіх). Праз некалькі месяцаў, у 1807 годзе, яго разам з малодшым братам Ігнасем пасылаюць у Мінск, у гімназію.

З усіх названых Занавых мясцін мне, на жаль, не ўдалося пабываць у Селішчы, Вязыні і Слабадзе — вёсках былога Вілейскага павета. Узду ж хоць і даводзілася наведваць, але яшчэ да таго, як я зацікавіўся філаматамі і канкрэтна Тамашам Занам. Ці засталіся там якія сляды, якія памяткі ад «архіпрамяністага»? Ці ведаюць там мінулае сваёй мясцовасці?

Зрэшты, а як мы, мінчане, ведаем сваю сталіцу? Дзе, напрыклад, была тая Мінская гімназія, у якой вучыўся Тамаш Зан? Ды і ці толькі Зан?

Мне захацелася хоць што-небудзь даведацца пра яе. Зацікавіўшыся гэтай даўняй навучальнай установай Мінска, я спачатку кінуўся да энцыклапедычнага даведніка «Мінск — горад-герой», выдадзенага ў 1976 годзе: дзе ж, калі не тут, шукаць звесткі пра Мінскую гімназію? Але дарэмна: толькі згадка, што яна была — і не болей. Не знайшоў я асобнага артыкула пра яе і ў «Беларускай савецкай энцыклапедыі», і ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі». Толькі мільганулася назва Мінскай гімназіі і ў таўшчэзнай «Гісторыі Мінска» 1967 года, дзе багацейшая шматвяковая гісторыя старажытнага горада згубілася ў безлічы пустазвонных рэляцыі! пра «трыумфальнае шэсце Вялікага Кастрычніка па беларускай зямлі» і ператварэнне Мінска ў «квітнеючы індустрыяльны цэнтр рэспублікі». Нават у «фундаментальных працах» навукова-даследчага Інстытута педагогікі БССР «Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі» (1968) і «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 года» (1985) пра Мінскую гімназію

сказана толькі мімаходзь. З гэтай «багатай» літаратуры я нават не змог зразумець, дзе ж знаходзілася Мінская гімназія. Я ўжо быў упэўнены, што ад яе і следу даўно не засталося, раз пра гэта маўчаць такія паважаныя выданні. Але мне хацелася знайсці хоць прыблізнае яе месца. Я распытваў пра яе гісторыкаў, краязнаўцаў. Яны толькі паціскалі плячыма. Памаглі мне дзве кнігі — «Рэха даўняга часу» Зянона Пазняка і «Площадь Свободы» Уладзіміра Дзянісава. З іх я даведаўся, што Мінская гімназія месцілася ў будынку былога базыльянскага кляштара, які, хай і ў зменены выглядзе, захаваўся да нашага часу. А будынак той не што іншае, як стары Дом прафсаюзаў на плошчы Свабоды, у якім я бываў многа разоў! Як той казаў — знайшоў сякеру пад лаўкай! Што ж, гэта яшчэ раз гаворыць, як ведаем мы свой горад.

І вось я сабраўся на экскурсію да плошчы Свабоды, дзе хадзіў дагэтуль тысячы разоў. Але цяпер ішоў сюды спецыяльна, каб ужо другімі вачамі агледзець гістарычнае месца Мінска, якое некалі мела назву Верхні (або Высокі) рынак, а пазней — Саборная плошча і толькі ў савецкі час — плошча Свабоды (хоць свабодай тут, здаецца, ніколі і не пахла).

Пачынаю сваю экскурсію ад ГУМа. На плошчы прыпыняюся каля аднаго са старых будынкаў — вельмі пагляднага шматпавярховага дома з мемарыяльнай дошкай у гонар кіраўніка дзекабрысцкіх арганізацый Мікіты Мураўёва, які бываў тут у 1821-1822 гадах. Бываў у мінскага губернатара, чыё ведамства тут месцілася, і ў губернскай бібліятэцы, дзе ён працаваў над першым, мінскім варыянтам вядомай канстытуцыі дзекабрыстаў. А яшчэ раней гэта быў будынак езуіцкай школы, якая ўваходзіла ў комплекс кляштара езуітаў. Асобныя пабудовы комплексу, хоць і ў зменены выглядзе, захаваліся да сённяшняга дня. Але пра іх — хоць бы які надпіс! І мы, мінчане, нават не здагадваемся, якія помнікі мінуўшчыны вакол нас. Я прайшоў — туды і назад — па вуліцы Рэвалюцыйнай (былой Койданаўскай), якая падыходзіць да плошчы. Вузенькая, уся са старых, своеасаблівай архітэктуры дамоў, з якіх ні адзін не падобны на іншы, з арачнымі ўездамі ў зацішныя дворыкі, з фігурнымі вокнамі — сапраўдны прытулак вякоў. На вуглу Рэвалюцыйнай і плошчы Свабоды можна ўбачыць і дом, у якім месціўся вядомы Інбелкульт — Інстытут беларускай культуры, на базе якога ўзнікла ў 1928 годзе Акадэмія навук БССР. Тут жа, пры Інбелкульце, працавала і Цэнтральнае бюро краязнаўства, выходзіў часопіс «Наш край». Але зноў вы дарэмна будзеце шукаць пра гэта хоць якога-небудзь напамінку. Хаця што тут здзяўляцца: гэта ж было «гняздо нацдэмаў», якімі шчодра запаўняліся раскіданыя па неабдымных прасторах «Союза свободных советских республик» незлічоныя астравы Архіпелага

Гулага і ямы шматлікіх Курапатаў.

На другім баку вуліцы кожнаму кідаецца ў вочы шматаконны дом з мемарыяльнай дошкай нямецкаму антыфашысту Фрыцу Шменкелю. Гэта — адзін з будынкаў былога гасціннага двара, колішні купецкі клуб. За пабудовамі гасціннага двара мяне сустракае велічны гмах кафедральнага сабора, даўняга кляштара бернардзінак. Гэта сюды ў бурлівыя 1863-1864 гады кідалі зняволеных паўстанцаў, сярод якіх была і дачка Вікенція Дуніна-Марцінкевіча — Каміла; Агінаю магутныя векавыя сцены сабора і пераходжу на другі бок вузенькай вуліцы імя Кірыла і Мяфодзія (нядаўняй вуліцы імя Бакуніна), дзе перада мною ўстае не менш велічны храм — былы кляштар бернардзінцаў. Добра ўсё ж пахадзіць вось так, без спешкі паміж гэтых старых муроў, што шчасліва выстаялі ў спусташальных віхурах найкрывавых часоў. Тут жа нібы сама вечнасць размаўляе з табой.

Каб не прапусціць якіх памятак Саборнай плошчы (якраз так хочацца яе называць сёння), я абыходжу ўвесь тыльны бок яе ўсходняй часткі. Але паколькі там вядзецца нейкае будаўніцтва (спадзяюся, яно звязана з рэстаўрацыяй старога цэнтра горада), я спускаюся да ўзбярэжжа Свіслачы і, мінаючы «Журавінку», ступаю на вуліцу Інтэрнацыянальную, падымаюся па ёй уверх, ізноў на Саборную плошчу, толькі ўжо з другога боку. Злева, на Цэнтральнай плошчы, дзе яшчэ за маёй памяццю маячыла гіганцкая постаць «бацькі ўсіх народаў», будуецца ізноў нешта агромністае, нешта архісучаснае, што адсюль засланяе ўсю плошчу, а адтуль, з боку Ленінскага праспекта, вядома ж, гэтую ціхую, забытую мінчанамі старую вулачку, з цэлым шэрагам даўніх, не нашага стагоддзя, дамоў. Тут, на гэтым адрэзку Інтэрнацыянальнай вуліцы, таксама нямала цікавых помнікаў, звязаных з гісторыяй нашай культуры. Напрыклад, будынак першай публічнай гарадской бібліятэкі, якая была названа імем А. С. Пушкіна. А ў глыбіні двароў я пазнаю не раз бачаны на фотаздымках у друку даўгі аднапавярховы дом выдатнага беларускага мастака XIX стагоддзя Валенцін Ваньковіча, які быў знаёмы з Аляксандрам Пушкіным, Адамам Міцкевічам, Францішкам Малеўскім, маляваў іх партрэты. Можна толькі падзівіцца, што мы дасюль яшчэ не зрабілі тут музей, дзе кожны з нас мог бы палюбавацца выдатнымі палотнамі славутага мінчаніна, даведацца пра долю мастака. Тое ж самае трэба сказаць і адносна выдатнага кампазітара Беларусі XIX стагоддзя Станіслава Манюшкі, які ў 30-х гадах жыў вунь у тым трохпавярховым доме — вугал Інтэрнацыянальнай і Энгельса. І для яго таксама даўно просіцца тут музей. Але мы не толькі музеі не стварылі гэтым слаўным сынам Беларусі, а нават не

дадумаліся прымацаваць на сценах іх дамоў хоць мемарыяльныя табліцы ці якія памятныя знакі.

Апошні перад плошчай будынак на вуліцы Інтэрнацыянальнай — і ёсць Дом прафсаюзаў, адзін з карпусоў колішняга кляштара базыльянаў, дзе і месцілася Мінская гімназія. Вось і фасадны бок будынка, простага, строгага — як і належыць сапраўднаму кляштару.

Непадалёк ад дзвярэй бачу на сцяне аж дзве мема рыяльныя табліцы, якіх раней не заўважаў. Адна з іх урачыста абвяшчае пра «архіважную падзею» ў гісторыі Мінска — чарговае выступленне «усесаюзнага старасты». Каля яе я ўбачыў шчуплага, сярэдніх гадоў чалавека ў паношанай куртцы — ён чытаў надпіс на той табліцы. Калі я таксама супыніўся тут, ён павярнуўся да мяне:

— Я ўжо, мусіць, дзесяць такіх во пліт бачыў. Ну й што з таго, што ён некалі выступаў тут? Нашто нам ведаць пра кожны іхні чых?

Гэта быў шафёр нейкага прыгараднага саўгаса. Яго грузавая машына стаяла тут на пляцоўцы: чалавек чакаў дырэктара саўгаса, які недзе забавіўся ў горадзе.

Я цалкам згадзіўся з шафёрам: гэтакімі плітамі, шматлікімі бронзавымі ці гранітнымі ідаламі сваіх правадыроў, іх «вялікімі» імёнамі, якімі па сёння засмечаны назвы вуліц усіх гарадоў і пасёлкаў, назвы саміх гэтых гарадоў і пасёлкаў, усякіх устаноў і прадпрыемстваў, «самая перадавая ў свеце» партыя, узурпіраваўшы ўладу, засланяла ад народа ўсю яго многавекавую гісторыю, хавала Праўду.

Другая табліца, здаецца, навейшая, прымацаваная трохі далей ад дзвярэй, была для мяне проста добрым сюрпрызам: яна ж ушаноўвала якраз тую самую Мінскую гімназію, якую я спярша збіраўся шукаць немаведама дзе!

Выбітыя на табліцы словы паведамлялі пра тое, што ў гэтым будынку ў 1803 годзе была адкрыта Мінская гімназія. Потым ішоў пералік тых славутых людзей, якія ў ёй вучыліся. Пачынаўся пералік якраз з Тамаша Зана. За ім значыліся такія знакамітыя імёны, як Яўстах Тышкевіч (беларускі вучоны-краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі; быў ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, Лонданскага археалагічнага інстытута), Станіслаў Манюшка (беларуска-польскі кампазітар, дырыжор і педагог), Уладзімір Спасовіч (публіцыст, літаратуразнавец і грамадскі дзеяч; быў прафесарам крымінальнага права Пецярбургскага універсітэта; прататып адваката Фецюковіча ў рамане Ф. Дастаеўскага «Браты Карамазавы), Бенядзікт Дыбоўскі (заолаг, прыродазнавец, публіцыст; быў прафесарам Варшаўскага універсітэта; удзельнік

паўстання 1863-1864 гадоў; вывучаў гісторыю і этнаграфію Беларусі), Аляксандр Ельскі (беларускі пісьменнік і краязнавец; быў членам Акадэміі ведаў у Кракаве, аўтар каля Ю тысяч артыкулаў пра гарады і вёскі Беларусі ў «Геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх»), Антон Трусаў (беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гадоў на Беларусі; быў адным з арганізатараў Рускай секцыі 1-га Інтэрнацыянала, перапісваўся з К. Марксам), Іван Гольц-Мілер (рускі паэт-рэвалюцыянер, аўтар папулярнай рэвалюцыйнай песні «Слухай»), Янка Лучына (беларускі паэт-дэмакрат), Мікалай Мінскі (рускі паэт), Эдуард Пякарскі (вучоны і рэвалюцыянер, аўтар «Слоўніка якуцкай мовы»; быў ганаровым акадэмікам АН СССР), Ядвігін Ш. (беларускі пісьменнік) і, як адзначалася на табліцы, «іншыя вядомыя дзеячы літаратуры, мастацтва, навукі, вызваленчага руху супроць царызму».

Прыемна было ўсведамляць, што нехта ж паклапаціўся пра такое вельмі разумнае ўшанаванне Мінскай гімназіі, адзначыўшы сапраўды выдатных людзей, якія тут вучыліся.

Мне цяжка было ўстрымацца, каб не зайсці ўсярэдзіну будынка. Сапраўды, духам даўніны павеяла ад старых сцен, ад даўнейшай, багата аздобленай трывалай лесвіцы, ад скляпеністай столі, таямнічых нішаў, даўгіх калідораў з усялякімі пераходамі, ад унутранага дворыка, што добра праглядваецца з калідорных вокан. Тут, па гэтых во калідорах, і бегалі калісьці гімназісты, поўнячы дом гоманам і шумам.

Мінская гімназія ўтварылася не на пустым месцы — на базе Мінскай губернскай школы, першапачатковая гісторыя якой сягае аж у XVII стагоддзе, калі тут актывізаваліся езуіты.

У часы Тамаша Зана Мінская гімназія налічвала дзвесце з лішнім навучэнцаў. Гэта была сямікласная навучальная ўстанова. У першых двух класах студэнты (так называлі гімназістаў) вывучалі польскую і лацінскую граматыкі, арыфметыку, «пачаткі» геаграфіі, вучыліся таксама каліграфіі, атрымлівалі ўрокі маральнасці. У кожным з двух класаў быў свой настаўнік. З трэцяга класа кожны прадмет выкладаўся асобным настаўнікам. У старэйшых пяці класах праходзілі польскую літаратуру, рымскую літаратуру, гісторыю, геаграфію, лацінскую і грэчаскую мовы,, гісторыю права, фізіку, матэматыку, хімію, заалогію, батаніку, аграномію, маляванне. Замежныя мовы — нямецкая і французская — былі не абавязковыя, вывучаліся па жаданні студэнтаў. Да замежных адносілі і рускую мову.

Настаўнікам першага класа быў Міхал Галаўня, які вучыў дзяцей у мінскіх школах з 1788 года. У сваіх «Мемуарных нататках», напісаных у 1850 годзе па просьбе вядомага

беларускага вучонага-краязнаўца Канстанціна Тышкевіча, Тамаш Зан казаў пра свайго настаўніка як пра «нешта пачцівае, набожнае і гарбатае» і адзначаў, што ён быццам бы набыў свае веды, плаваючы па Нёмане, Дзвіне і Прыляці на віцінах ды стругах. У другім класе Тамаша вучыў Ян Пілецкі — «даўганосая скамянеласць», якая ажыўлялася толькі пры чытанні «Граматыкі» Катынскага. Пра гэтую «Граматыку польскай мовы» варта сказаць колькі слоў асобна. Яна вучыла не толькі грамаце, але і выхоўвала дзяцей у польскім патрыятычным духу, для чаго там былі падабраны найбольш яркія ў гэтым плане ўрыўкі з твораў польскіх пісьменнікаў. Аб сіле ўздзеяння «Граматыкі» Катынскага на моладзь сведчыць той факт, што на працэсе над філаматамі і філарэтамі ўлады разам з прафесарамі і студэнтамі Віленскага універсітэта абвінавачвалі ў пашырэнні польскага патрыятызму і яе, граматыку, якая падлягала цяпер забароне.

Тамашу Зану запомніліся таксама многія настаўнікі-прадметнікі. Польскую літаратуру, напрыклад, вёў экс-езуіт Феліцыян Міхалоўскі, які сам любіў свой прадмет і перадаваў гэтую любоў вучням. Гісторыю права выкладаў памочнік дырэктара гімназіі Ян Лапінкевіч, фізіку — Ігнат Абламовіч, латынь і грэчаскую мову — Кароль Тгыль, матэматыку — Ян Сухецкі, маляванне — Ігнат Брушкевіч. Гімназійным капелянам быў Ян Жылінскі, які імкнуўся абуджаць у дзяцей польскі патрыятызм. Нямецкую мову і літаратуру выкладаў вельмі дасведчаны і паважаны ўсімі настаўнік Готліб Стэнзлер, але нават яго лекцыі з усёй гімназіі наведвала, напрыклад, у 1808 годзе ўсяго 13 чалавек. Французскай мове ў гімназіі не пашанцавала, бо яе выкладаў зусім не падрыхтаваны стары француз Джон Підо. Што ж да рускай мовы, то яе вёў да 1809 года былы вайсковец Андрэй Захарэўскі з Магілёўшчыны, на лекцыі якога збіраліся хіба што пасваволіць ды пасмяяцца. Як згадвае Тамаш Зан, ён уночы весяліўся «пры пуншы і гуслях», а ўдзень спаў «у мундзіры і ў хустцы, каб заўсёды быць гатовым да лекцыі». Ён нібы знарок вучыў дзяцей непрыязнасці да рускай мовы, выкладаў яе абы-як, больш рабіў выгляд, што выкладае. Дзецям ён казаў так: «Дело не делать, от дела не бегать». Запомніўся Зану і такі «дыялог» у класе: «Господин учитель, голова болит». — «Ну, так иди домой: префект не придет — твое счастье, придет — скажу: бежал». Вядома, за такую прамату, за вясёласць, і бесшабашнасць дзеці не маглі не любіць Захарэўскага. Студэнты нешта карыснае і ўзялі ад яго. Цікава, што Зан праз сорак з лішнім гадоў успомніў, як ён, Андрэй Захарэўскі, расказваў студэнтам пра Баву-каралевіча, пра жар-птушку і іншыя рускія народныя казкі. У 1809 годзе гэты настаўнік усё ж быў звольнены, а яго месца заняў Ян Астраумаў,

чалавек бязвольны, няздатны да выкладчыцкай працы. Былі выпадкі, што студэнты нават білі яго.

Важным момантам навучання ў Мінскай гімназіі было тое, што яна імкнулася даць выхаванцам як мага болей практычных ведаў, асабліва звязаных з гаспадараннем на зямлі.

Тамаш Зан вучыўся добра, ён належаў да найбольш здатных вучняў. Вось яго адзнакі, пастаўленыя, відавочна, настаўнікам аднаго з першых класаў: «Тамаш, сын Кароля, Зань з Вілейскага павета, католік, гадоў Ю. Здароўе — добра, уважлівасць — добра, латынь — добра, маральнасць — добра, геаграфія — добра, арыфметыка — добра, фармаванне характару — добра». У старэйшых класах Тамаша Зана асабліва адзначалі за добрае веданне матэматыкі, фізікі, за поспехі ў маляванні.

Актыўны ўдзел браў Тамаш Зан і ва ўсіх студэнцкіх зборах і забавах. З трэцяга класа навучэнцы ўтваралі сваё вучнёўскае кіраўніцтва, свае суды. Як відаць, у Мінскай гімназіі і набыў Тамаш Зан першы вопыт самастойных студэнцкіх згуртаванняў.

Вядома ж, шмат дало Тамашу Зану для агульнага развіцця і тагачаснае грамадскае жыццё Мінска. Перш за ўсё студэнты не маглі не наведваць прадстаўленні Мінскага тэатра, які месціўся ў тым жа будынку, што і гімназія. А па-за сценамі гімназіі, тут жа, на Высокім рынку, які з XVII стагоддзя зрабіўся адміністрацыйным, гандлёвым і культурным цэнтрам Мінска, можна было ўбачыць прадстаўленні батлейкі, вандроўных скамарохаў, дрэсіраваных смаргонскіх мядзведзяў, розныя шэсці, абходзіны рэлігійных свят. Асобныя вобразы з тагачаснага побыту мінчан запомніліся Зану назаўсёды: «Яўрэйка з абаранкамі, немец з грэцкімі піражкамі, званар-езуіт, вар'ят Янка, смаргонскія мядзведзі, гукі царкоўнага звона, сад Карнеева, Залатая Горка і Кальварыя, архірэй Пацёмкін — вакол усяго гэтага і круціліся думкі мінскіх дзяцей да 1812 года».

Як бачым, тут згадваецца і немец з грэцкімі піражкамі, вобраз якога вывеў потым Тамаш Зан у сваёй камедыі «Грэцкія піражкі».

Тут, у Мінскай гімназіі, робіць Тамаш Зан і свае першыя спробы ў паэзіі. Як прыгадвае ён сам, настаўнік Брадоўскі, навучаючы дзяцей правільна выкладаць свае думкі, загадваў ім перарабляць вершы Нарушэвіча і Красіцкага на прозу, а прозу, казкі — на вершы. Тамаш Зан на аснове пачутай ад бабкі Далеўскай беларускай народнай казкі пра курку і знесенае ёю залатое яйка напісаў даволі вялікі верш, здзівіўшы ім і вучняў, і настаўнікаў.

Самымі блізкімі сябрамі Тамаша Зана ў Мінскай гімназіі былі браты Верашчакі з Навагрудчыны — Міхал і Юзаф. Асабліва моцна падружыўся ён з дабрадушным і таварыскім Міхалам. Іхняя

дружба цягнулася ўсё жыццё. Дзякуючы ёй Тамаш Зан пазнаёміўся і пасябраваў потым з сястрой Верашчакаў Марыляй: у час навучання ў Віленскім універсітэце ён быў частым госцем у іх маёнтках — у Туганавічах і Плужынах. Якраз праз Тамаша Зана ўведаў Марылю і Адам Міцкевіч. Цікавая ўзнікае тут думка: гэта ж калі б не было Мінскай гімназіі, якая звяла Верашчакаў і Зана, Адам Міцкевіч, пэўне ж, ніколі не ведаў бы нават пра існаванне Марылі, а значыць, не было б якраз гэтага яго вялікага кахання да яе, а тады, у сваю чаргу, не было б ні «Дзядоў», ні «Пана Тадэвуша», ні мноства выдатных міцкевічаўскіх балад, санетаў, вершаў, на якія натхніла паэта яго каханая, інакш кажучы, не было б вялікага паэта сусветнага значэння, не было б Адама Міцкевіча! Вось што такое яго вялікасць Выпадак! Ці, можа, — Збег Акалічнасцей? А мо ўсё гэта называецца проста — Наканаванне?

І на завяршэнне — думкі, на якія наводзіць знаёмства з навучаннем у Мінскай гімназіі. Гэта была тыповая на Беларусі навучальная ўстанова. На яе прыкладзе можна бачыць наогул характар асветы на беларускіх землях у пачатку XIX стагоддзя. Як Мінская гімназія, так гімназіі і іншыя навучальныя ўстановы ў беларускіх гарадах, мястэчках, сёлах былі польскія. Выкладанне ўсіх прадметаў вялося на польскай мове, усе настаўнікі павінны былі выхоўваць у дзяцей польскі патрыятызм, даводзіць, што яны — палякі, а ўсе беларускія правінцыі — неад'емная частка Польшчы.

Гэта была сапраўдная польская экспансія на Беларусі, яе «ціхая» заваёва, пра якую нашы гісторыкі гавораць чамусьці — мо з нашай традыцыйнай беларускай далікатнасці? — напаўголасу. Пачалася яна, зрэшты, многа стагоддзяў назад, з аб'яднання Вялікага княства Літоўскага і Польшчы ў 1385 годзе, калі палякі ў выніку Крэўскай уніі пасадзілі на свой трон вялікага князя літоўскага Ягайлу. З гэтага часу пры дапамозе каталіцызму польскія феадалы павялі паступовую, але няўхільную паланізацыю Беларусі, вынікам якой стала амаль поўнае апалячванне к XIX стагоддзю верхніх, найбольш адукаваных слаёў беларускага грамадства. Гэтая вялікая нацыяналь ная трагедыя павяла за сабой такія страты ў культуры, якія нам ніколі не ўдасца нават падлічыць.

Здавалася б, з канца XVIII стагоддзя, калі Беларусь была адарвана ад Польшчы і далучана да Расіі, працэс паланізацыі будзе спынены. Але атрымалася якраз наадварот. Цар Аляксандр I, імкнучыся задобрыць польскую грамадскасць, даў палякам самыя шырокія правы ў Беларусі, на якую ў Расіі глядзелі як на частку Польшчы. Палякі ж са стратай сваёй дзяржаўнасці

прыкладалі ў гэты час усе намаганні для згуртавання гвалтоўна падзеленай на часткі нацыі. Важнейшым сродкам такога згуртавання была асвета. У Беларусі кіраваць ёю цар даручыў свайму прыбліжанаму, польскаму магнату Адаму Чартарыйскаму. «Няма чаго казаць, — успамінаў потым А. Чартарыйскі, — што я выкарыстаў добрыя да мяне адносіны цара і скіраваў галоўную ўвагу на грамадскую адукацыю, якой з гэтага часу надаў нацыянальны характар... Віленскі універсітэт цалкам зрабіўся польскім; я запрасіў туды лепшых вучоных з маіх суайчыннікаў і некаторых вядомых вучоных з іншаземцаў... На працягу далейшых гадоў уся паверхня Польшчы (тут перш за ўсё маецца на ўвазе Беларусь, Літва, частка Украіны, дзе распаўсюджвалася яго «папячыцельства») пакрылася школамі, у якіх дадзена была поўная свабода развівацца польскасці». Ян Снядэцкі, рэктар Віленскага універсітэта ў 1807-1815 гадах, навучальнай установы, на якую была ўскладзена арганізацыя асветы на Беларусі, загадваючы інспектарам школ звяртаць галоўную ўвагу на вывучэнне там польскай мовы, даводзіў ім, што «гэта неабходна для таго, каб вучні перасталі быць чужаземцамі на сваёй зямлі і каб пры дапамозе вывучэння польскай мовы станавіліся сапраўднымі сынамі айчыны». Інакш кажучы, каб беларусы на сваёй, беларускай зямлі станавіліся палякамі — усё шыварат-навыварат! Трэба з сумам канстатаваць, што паланізатарам Беларусі ўдалося зрабіць тут шмат.

ВЫВЕРЫ

Вучыцца далей у Мінскай гімназіі перашкодзіла Тамашу Зану хвароба. Таму бацькі вырашылі забраць яго разам з братам Ігнасем дамоў. А «домам» іхнім стаў цяпер фальварак Выверы, які бацькі ўзялі ў арэнду.

Выверы былі селішчам Заняў аж да 1819 года, пакуль уладальнікі фальварка Юшынскія не прадалі' яго Міхалу Агінскаму. Тут прайшлі самыя яркія дзіцячыя і юнацкія гады Тамаша Зана. У зборніку «Перапіска філаматаў» у пяці тамах вельмі часта мільгае гэтая назва, праўда, трохі перайначаная — Іверы: сюды, да бацькоў, ляцелі з Вільні многія лісты Тамаша Зана, сюды прыязджаў ён сам на канікулы, тут любіў блукаць па ваколіцах.

І вось мы ідзём з Генадзем Каханоўскім у Выверы. Чорнае,

нядаўна ўзаранае поле непадалёк ад дарогі, вясёлы гурт маладых фарсух-бярозак у вабнай зялёнай даліне, сіняя палоска лесу каля небакраю. Занавы ваколіцы.

Спачатку мы завіталі ў школу. Там даведаліся, што на месцы былога фальварка жыве цяпер сама завуч школы Соф'я Васільеўна Галюк з сям'ёй. Доўга не думаючы, пайшлі шукаць яе двор.

У агародзе перад домам адразу ўбачылі пажылую жанчыну. Гэта была маці Соф'і Васільеўны Марыя Іванаўна Акуліцкая. Сустрэла яна нас з насцярожанасцю. Але калі расказалі ёй, хто мы і чаго завіталі, яна з ахвотай пачала ўспамінаць пра былую панскую сядзібу. Убачыўшы нас, падышоў к плоту з суседняга двара немалады, са здаровым сялянскім загарам чалавек, які назваўся Уладзімірам Захаравічам Акуліцкім.

Ад іх мы даведаліся, што якраз абодва іхнія двары і займаюць былую панскую сядзібу. Больш таго, Уладзімір Захаравіч нават жыве ў доме тых паноў. Дом драўляны, з трох бакоў ашаляваны. Толькі адна сцяна, якая падыходзіць амаль да плота, што падзяляе абодва двары, не ашалявана, з пачарнелага ўжо ад вятроў і часу і патрэсканага бярвення. Толькі дом здаўся мне нейкім залішне кароткім. Я папытаўся ў гаспадара, чаму ён такі.

— Правільна, ён быў даўжэйшы.

І гаспадар расказаў нам незвычайную гісторыю дома. Некалі панскую сядзібу з домам купіў яго дзед Паўлюк. Для гэтага трэба было залазіць у пазыку. Каб выплаціць яе, мусіў працаваць да сёмага поту. Душыліся нішчымніцай, хадзілі босыя — усё ішло на выплату. З горам папалам пазыку адолелі. А пасля смерці дзеда сядзіба была падзелена паміж яго сынамі. Але выявілася, што частка панскага дома, які дастаўся бацьку Уладзіміра Захарэвіча, заходзіла на зямлю брата. Невялікі лапік, але ж — зямля! Яна была даражэй за ўсё. Ніхто не ведае, якія там былі спрэчкі, але бацьку Уладзіміра Захаравіча давялося... адразаць ці не палову дома, каб вызваліць зямлю брата: у другім месцы ён чамусьці браць зямлю не захацеў. Да адрэзанага дома прыладзілі новую сцяну: яе, мабыць, таму і не шалявалі, што была ўсё ж навейшая, больш наглядная.

Не менш драматычная метамарфоза адбылася і з панскім склепам — «дворнай лядоўняй», якая дасталася другому брату, мужу Марыі Іванаўны. Склеп быў вялікі, ладны, над ім высілася шыкоўная драўляная надбудова, з нямецкім вуглом. Пэўна, стаяла б яна і сёння, калі б не калектывізацыя. Гаспадар Марыі Іванаўны ў калгас ісці не захацеў, намерыўся трымацца да апошняга. Але Саветы ўжо мелі вялікі вопыт «заахвочвання» сялян уступаць у калгасы. Гэты вопыт яны з поспехам скарыстоўвалі і тут, у Заходняй Беларусі. Адзін з выпрабаваных спосабаў такога

«заахвочвання» — душыць непакорлівых драконаўскімі падаткамі. Гаспадар Марыі Іванаўны павінен быў выплаціць дзяржаве — ні многа ні мала — шэсць тысяч рублёў! Гэты падатак называлі чамусьці «кульзборам». Выплачваючы той «кульзбор», Акуліцкія прадавалі ўсё, што толькі маглі. Сала, дамашнія рэчы — усё ішло ў падатак. Якраз тады давялося ім прадаць і тую драўляную надбудову над склепам. Аголены склеп гаспадар вымушаны быў проста абляпіць зверху глінай.

Гэты «кульзбор», дарэчы, Акуліцкім удалося такім чынам выплаціць. Але рабілі гэта дарэмна: улады тут жа абклалі іх гаспадарку новым «кульзборам», ізноў трэба было плаціць такія ж самыя шэсць тысяч рублёў! Але другую шкуру здзіраць ужо не было з чаго, і Марыя Іванаўна мусіла ісці на паклон Кісялю («Такі быў маленькі чалавечак») — прасіцца ў калгас, які ён узначальваў.

— Ці не яго прозвішча значыцца на помніку насупраць школы? — папытаўся я.

— Яго, чыё ж яшчэ.

На гэтым помніку мы адразу запынілі свае вочы, калі заходзілі ў школу. Стаіць ён на самым відным, ганаровым месцы. Такі пампезны, з граніту. На ім выбіты імёны камунараў 1918 года. Яны, як пішацца ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», «збіралі ўраджай у нацыяналізаваных маёнтках Тучына, Ізабеліна, Лешна, здавалі яго Чырвонай Арміі». Калі пасля вайны сагналі тут людзей у калгас, стар шынёй яго прызначылі, вядома ж, аднаго з тых «камунараў» — Паўла Кісяля.

Але хоць імя старшыні і ўвекавечана на граніце, мы ніводнага добрага слова ў Выверах пра яго не пачулі. Надта ж шчыраваў у тых нацыяналізацыях-калектывізацыях. Да таго ж быў ён малаадукаваны, амаль непісьменны. Калі трэба было нешта напісаць, ён рабіў безліч памылак. З яго смяяліся, што замест таго каб напісаць «насыпаў» (напрыклад, скрыню бульбы), ён пісаў — «насікаў». Дапрасіцца ў яго чаго-небудзь, хаця б якога каня, каб што прывезці, таксама было не проста. Але, як нам расказвалі, «калі паўлітра паставіш, то дасць, што просіш».

І вось пад «мудрае кіраўніцтва» гэтага «чалавечка» і давялося ісці Марыі Іванаўне са сваім гаспадаром і дзецьмі.

Дворная лядоўня і дасюль стаіць аблепленая глінай. Затое амаль нічога не змянілася ўсярэдзіне склепа, куды завяла нас гаспадыня, каб паказаць. Склеп вялікі, прасторны, з тоўстымі мураванымі сценамі і столлю — рабіўся на вякі.

Ад панскай сядзібы засталася яшчэ закінутая, забруджаная, нікому цяпер непатрэбная сажалка за дарогай. Ну, і роўны шнур старых, пазгінаных у тры пагібелі карабатых вербаў паўз дарогу,

што, як расказала Марыя Іванаўна, «вядзе праз пуць на гасцінец». Той гасцінец, якім некалі прыязджаў сюды з Вільні Тамаш Зан і якому пастаўлены ў Мясаце помнік.

Пазнаёміліся мы збольшага і з самой вёскай Выверы. Вёска даволі вялікая, у ёй многа новых, цагляных дамоў. А ў час, калі тут распрадавалі зямлю, як расказаў нам былы калгасны брыгадзір Аляксей Мікалаевіч Раманоўскі, было ўсяго адзінац цаць хат. Цікава, што гэтую ж лічбу падае і згаданы «Геаграфічны слоўнік...», адпаведны том якога выйшаў у 1893 годзе. Выходзіць, якраз недзе перад гэтым годам і распрадавалася тут зямля, на якой і ўзнікла тады вёска. Значыць, у першай палове XIX стагоддзя тут быў толькі фальварак. Сяляне ж жылі тады ў Раеўшчыне, якая амаль прымыкае да Выверaў.

У Раеўшчыну мы заязджалі на «Масквічы» Кастуся Харашэвіча. Кастусь суняў тады машыну каля чародкі цяністых таполяў ды вербаў, за мастком праз нейкую рачулку, здаецца, Крыніцу.

— Паглядзіце, якія тут магутныя дрэвы! — паказаў ён па ходу той рачулкі, што гублялася ў кустоўі. — Гэта ўсё, што засталося ад даўнейшага вялікага парку.

Кастусь расказаў, што яшчэ нядаўна хадзіў ён зарослымі дарожкамі гэтага парку, любуючыся велічнымі клёнамі ды ліпамі, а таксама піхтамі і шмат якімі яшчэ рэдкімі дрэвамі ды кустамі. На добры лад парк можна было б паднавіць, дагледзець. Сюды ж бегалі гуляць дзеці, хадзілі з кніжкамі школьнікі. Ды і даросламу чалавеку хіба ж пашкодзіла б краса? Але старшыня мясцовага калгаса «Усход» загадаў знесці, раскарчаваць парк. Гэта было якіх тры ці чатыры гады назад. Калі Кастусь падышоў тады да старшыні з пратэстамі, той толькі адмахнуўся ад яго, як ад назойлівай мухі:

— А, идите вы... Мне надо хлеб растить...

Цяпер усе мы ведаем, як ён і яму падобныя «растили» гэты хлеб. Ні хлеба, ні красы не маем мы сёння пасля іх гаспадарання на нашай зямлі.

МАЛАДЗЕЧАНСКАЕ ПАВЯТОВАЕ ВУЧЫЛІШЧА

Выверы былі зусім недалёка ад Маладзечна. Таму пасля выздараўлення Тамаша Зана бацькі паслалі яго разам з малодшымі Ігнасем і Сцяпанам давучвацца якраз сюды, у Маладзечна, у павятовую школу, якую толькі што перавялі з Бабруйска.

Знайшлі ў горадзе прыстойную кватэру, дзе разам з імі пасялілася і бабка Далеўская, каб глядзець хлопцаў. Кожную нядзелю яны спяшаліся да бацькоў у Выверы, куды часцей за ўсё ішлі пеша.

Павятовае вучылішча ў Маладзечне было чатырохкласнае, з двухгадовым курсам навучання ў двух старэйшых класах. Хаця тут выкладалася менш прадметаў, чым у Мінскай гімназіі (не было, напрыклад, логікі і будаўніцтва — прадметаў, якія ўваходзілі ў курс лекцый па матэматыцы, а таксама батанікі, грэчаскай і нямецкай моваў), але настаўнікі былі даволі падрыхтаваныя. Матэматыку і фізіку вёў магістр філасофіі Адам Юркоўскі, літаратуру і права — магістр філасофіі Ігнат Довят, граматыку — Мацей Нарушэвіч, гісторыю і святое пісьмо — Вінцэнт Шумскі, рускую мову і маляванне — Аляксей Зорка, французскую— Фердынанд Мілер... Адзін з настаўнікаў — Галаўня — перавёўся сюды з Мінскай гімназіі. Усіх іх Тамаш Зан успамінаў потым з удзячнасцю. Асобным настаўнікам ён не забываўся перадаваць у пісьмах з Віленскага універсітэта паклон.

Вялікі след у душы Тамаша Зана пакінула вайна 1812 года.

З паходам Напалеона на Расію беларуская шляхта звязвала вялікія надзеі на адраджэнне былой Рэчы Паспалітай, адной з састаўных частак якой было Вялікае княства Літоўскае. «Нягледзячы на нястомную дзейнасць Міхала Агінскага, — піша пра настроі спольшчанай беларускай шляхты Я. Івашкевіч у кнізе «Літва ў 1812 годзе» (1912), — нягледзячы на шырокую агітацыю за польска-расійскую садружнасць, немагчыма было схіліць польскую грамадскасць да ідэі аб еднасці з Расіяй. Вочы ўсіх былі скіраваны на Захад, на Напалеона, які быў для гэтых людзей паўбогам, ідэалам зямной сілы, прысланай з неба для адбудавання Польшчы, з'яднанай з Літвой». Энтузіязм, які ахапіў «літоўскую» шляхту з уступленнем французаў на беларускія землі, добра выказала «Газэта тымчасова міньска» ад 8 ліпеня 1812 года: «Непераможныя атрады вялікага Напалеона, цара французаў і італьянскага караля, сёння ўвайшлі ў наш Мінск.

Гэты гістарычны дзень вызваліў нашу правінцыю з ярма няволі і вярнуў нас Айчыне». Па ўсёй Беларусі шляхта арганізоўвае свае ўзброеныя атрады, якія ўліваюцца ў «вялікую» армію Напалеона. На вайну супроць «маскаля» пад напалеонаўскія сцягі рвецца і чатырнаццацігадовы Тамаш Зан. Толькі бацька не дае яму здзейсніць гэты юначы парыў.

Але не прайшло і паўгода, як вялікі энтузіязм шляхты змяніўся не меншым расчараваннем: вялікая армія Напалеона бясслаўна кацілася назад, пакідаючы на сваім шляху безліч замёрзлых трупаў. Гэтую страшную карціну на свае вочы бачыў у Маладзечне і Выверах і Тамаш Зан, які надзвычай цяжка перанёс крах сваіх ілюзій. Тым не менш Напалеон застаўся для яго, як і для большасці шляхецкай моладзі, героем, сімвалам барацьбы з царскім абсалютызмам. І нездарма ж яго равеснікі і сябры Адам Міцкевіч і Ян Чачот, якія таксама з энтузіязмам сустракалі ў Наваградку армію французскага імператара, яшчэ ў 1819 годзе ў пісьмах адзін да аднаго дадавалі да сваіх імён і імя свайго куміра — Адам Напалеон, Ян Напалеон.

Пасля разгрому напалеонаўскай арміі ідэя вызвалення з-пад «маскоўскага ярма» не толькі не аслабела, але яшчэ больш узмацнілася ў асяроддзі вучняў Маладзечанскага павятовага вучылішча. Гэта добра праявілася, напрыклад, у вайсковых гульнях. Школьнікі падзяляліся на дзве «арміі»: рус кую—армію Марса, які ўвасабляў грубую сілу, і польскую — армію Апалона, бога любві. На чале арміі Марса быў Юзаф Сухоцкі, а арміі Апалона — Тамаш Зан, якога высока ставілі вучні за «мінскую вучонасць». Памочнікам Зана стаў яго сябар Леанард Ходзька, будучы сакратар кампазітара Міхала Агінскага.

Пра баявы настрой Тамаша Зана сведчаць і яго вучнёўскія творы, якія потым выкарыстала ў працэсе над філаматамі следчая камісія як доказ «непажаданага накірунку думак» і з якіх зрабіла вывад, што ён «яшчэ з дзяцінства, з павятовай маладзечанскай школы зневажаў урад і пісаў нядобранадзейныя вершы, а таксама стварыў там нейкае таварыства». Асабліва ўхапілася следчая камісія за напісаны ў 1815 годзе Занам «Марш для студэнтаў апалонаўскага войска», у якім быў прамы заклік рыхтавацца да вайны за вызваленне айчыны з-пад улады царскай Расіі, і яго невялічкую незакончаную камедыю «Сталасць у сяброўстве», якая таксама была напісана ў маладзечанскім вучылішчы ў 1813-1814 гадах і якая зноў жа была накіравана супроць царскага самадзяржаўя. Твор «Сталасць у сяброўстве», ад якога захаваліся толькі ўрыўкі, — выразна аўтабіяграфічны: у ім якраз апавядаецца пра моцнае сяброўства двух школьніках, адзін з якіх Слаўзан (тут адразу ўгадваецца Тамаш Зан) стварае вучнёўскі

полк пад назвай Апалона, а другі — Ходзьслаў (Леанард Ходзька) становіцца яго баявым памочнікам. Цікавы ў творы маналог Свенталюба — яшчэ аднаго сябра Слаўзана. З маналога мы даведваемся, што Слаўзан любіць літаратуру, яго пакой запоўнены кнігамі, што ён ніколі не бывае хмуры, заўсёды вясёлы, з майстэрствам іграе на скрыпцы. У процілегласць яму Свенталюб ходзіць смутны, яго гняце жаль з прычыны заняпаду Польшчы, ён зайздросціць тым, хто лёг за яе ў бітвах, і вельмі шкадуе, Што цяпер нічым не можа ёй дапамагчы.

З характару школьных гульняў, з вучнёўскіх твораў можна ўявіць, які дух, які юначы запал нёс у 1815 годзе з Маладзечна ў Віленскі універсітэт семнаццацігадовы Тамаш Зан.

Будынак Маладзечанскага павятовага вучылішча, у якім у 1811-1815 гадах вучыўся кіраўнік віленскіх згуртаванняў моладзі, захаваўся па сённяшні дзень.

Сюды мяне прывёў у першы ж дзень нашай вандроўкі Генадзь Каханоўскі.

Толькі паглядзець даўнюю школу аказалася не проста: яна цяпер апынулася ў двары станкабудаўнічага завода. Быў якраз выхадны дзень, субота, і вахцёрка ў прахадной прапусціць нас туды адмовілася. Генадзь назваў сябе і мяне, папулярна расказаў, чаго нам трэба было прайсці ў заводскі двор, паказаў свой дакумент, але Жэня, як назвалася жанчына, і глянуць на той дакумент не захацела.

— Тады дайце нам тэлефон якога начальства, — папрасіў Генадзь.

— Можаце пазваніць дзяжурнаму па заводзе, — і Жэня прадыктавала нам яго тэлефон.

Але калі Генадзь, дазваніўшыся да дзяжурнага, перадаў Жэні трубку, жанчына пачала даводзіць яму, што па вуснаму дазволу яна прапусціць на завод чужых людзей не можа. Дамовіліся, што дзяжурны сам падыдзе да прахадной.

Хоць мы і спяшаліся на электрычку, давялося чакаць яго. Мы даволі доўга тапталіся ў прахадной, пакуль, нарэшце, не ўбачылі пажылога чалавека, які, накульгваючы на адну нагу, паволі, з прыпынкамі ішоў у наш бок.

Дзяжурнага па заводзе — галоўнае тут начальства ў выхадны дзень — звалі Міхаіл Антонавіч Шэжык. Стрымана паздароўкаўшыся з намі, ён, не спяшаючыся, зайшоў у будку вахцёра і строгім начальніцкім голасам папытаўся ў нас, хто мы і што нам трэба.

Генадзь падрабязна расказаў пра ўсё. Выявілася, што Міхаіл Антонавіч ведае яго, чытаў нават яго кніжку пра Маладзечна, тым не меней папрасіў дакумент. Калі Генадзь падаў яму той

дакумент, Міхаіл Антонавіч пачаў паволі яго разглядваць, удакладняць нейкія там моманты. Толькі калі мы не вытрымалі і пачалі трохі жартам, трохі ўсур'ёз ушчуваць яго за такую цяганіну, Міхаіл Антонавіч, які рабіў гэта не з нейкай падазронасці, а з простай чалавечай цікаўнасці, прапусціў нас на завод і сам падахвоціўся паказаць будынак былой школы.

У поўным выглядзе даўнюю маладзечанскую навучальную ўстанову мы, на жаль, не змаглі ўбачыць. Яна была аблеплена з бакоў нейкімі прыбудовамі, заціснута паміж вытворчымі будынкамі. Да таго ж толькі работнікі завода маглі бачыць гэты помнік гісторыі і архітэктуры, пабудаваны ў 1762 годзе як кляштар антытрынітарыяў. Пра тое, што гэта не абы-які будынак, сведчыла мемарыяльная табліца, якая расказвала пра тое, што пазней тут была настаўніцкая семінарыя і што ў ёй вучыліся такія славутыя людзі; як беларускі паэт Міхась Чарот, удзельнік трох рэвалюцый генерал-маёр Л. А. Калядка, героі грамадзянскай вайны І. А. Біч, камбрыг П. М. Шаранговіч, вядомыя дзеячы рэвалюцыйнага і нацыянальнага руху Заходняй Беларусі Ф. І. Валынец, А. Р. Капуцкі, П. В. Мятла, С. А. Рак Міхайлоўскі, герой руска-турэцкай вайны (1877-1878) К. В. Хруцкі.

На жаль, у спісе не знайшлося месца іншым выдатным людзям, якія тут вучыліся, — беларускаму драматургу Касьяну Вясёламу (В. І. Аўдзею), шырока вядомаму ў свеце беларускаму спеваку Міхалу Забэйду-Суміцкаму, усходнязнаўцу, даследчыку духоўнай культуры беларускіх татараў, прафесару Пецярбургскага універсітэта Антону Мухлінскаму, літаратурнаму крытыку, прафесару Варшаўскага універсітэта Аляксандру Тышынскаму (чыю сядзібу мы аглядалі ў Мясаце) ... А яшчэ ж выкладчыкамі тут былі мяркуемы аўтар «Тараса на Парнасе» Канстанцін Вераніцын, вядомыя фальклярысты і этнографы М. Я. Нікіфароўскі, Ю. Ф. Крачкоўскі...

Але што тут здзіўляцца: мемарыяльная табліца на былой навучальнай установе Маладзечна — яшчэ адзін прыклад скажэння, наўмыснай кастрацыі нашай гісторыі, вылучэння адных асоб і замоўчвання іншых, тых, хто не ўкладваўся ў жорсткія рамкі камуністычнай «прапаганьбы».

На добры толк хіба ж наогул трэба было адгароджваць ад людзей гэты помнік нашай гісторыі, культуры? Адсюль жа ішло святло асветы яшчэ ў часы ўсеагульнай цямноты, тут жа былі сабраны ўсе інтэлектуальныя сілы старога Маладзечна і не толькі Маладзечна. Таму ці не разумней было б будынак былога павятовага шляхецкага вучылішча і пазнейшай настаўніцкай семінарыі і адначасова архітэктурны помнік XVIII стагоддзя нейкім чынам рэстаўраваць і ператварыць у музей асветы і

культуры Маладзечаншчыны? Тым больш што ў 1910 г. тут ужо быў адкрыты музей. А яшчэ ж тут была вялікая семінарская бібліятэка, існаваў у 1905-1911 гадах тэатр, дзе ставіліся творы М. Гогаля, А. Чэхава, А. Астроўскага.

ВІЛЬНЯ

Як расказаў мне аднаго разу Адам Мальдзіс, у нейкай замежнай кнізе ён вычытаў такую фразу: «Вільнюс — самы дзіўны горад у свеце: ён стаіць на беларускай зямлі, населены палякамі, а лічыцца сталіцай літоўскай дзяржавы». У гэтых словах, мусіць, адбілася, як у кроплі вады, уся складанасць нашай гісторыі, яе хітраспляценні, доля старажытнай Вільні.

Вільня, у ваколіцы якой і сёння пачуеш чысцюткую беларускую гаворку, з часоў сярэднявечча была грамадска-культурным цэнтрам Беларусі, усяго Вялікага княства Літоўскага, гэтай магутнай і сапраўды вялікай дзяржавы, афіцыйнай мовай якой на працягу вякоў з'яўлялася мова беларусаў — асноўнага яе насельніцтва. Тут, у Вільні, працавалі выдатныя беларускія асветнікі старажытнасці Францішак Скарына, Пётр Мсціславец, браты Мамонічы, Лаўрэнцій Зізаній... Тут у 1578 годзе была заснавана езуітамі вышэйшая навучальная ўстанова краю — акадэмія, якая ператварылася потым у вядомы ў шырокім свеце Віленскі універсітэт.

У Вільню, сталіцу свайго краю, па святло ведаў здаўна цягнулася беларуская моладзь.

Нямала маладых людзей з беларускіх губерняў паклікаў Віленскі універсітэт і ў пачатку мінулага стагоддзя.

Асабліва прыкметны след у гісторыі Вільні і Віленскага універсітэта пакінулі студэнты гэтай наву чальнай установы, якія ў 1817 годзе арганізаваліся ў славутае Таварыства філаматаў і іншыя згуртаванні моладзі галоўным чынам з беларускіх земляў.

Тут, у Вільні, разгортвалася ўся дзейнасць філаматаў. Тут іх помняць векавыя сцены універсітэта, многія старадаўнія муры, вуліцы і завулкі, помняць віленскія ваколіцы з выразна беларускімі назвамі Пагулянка, Паплавы, Закрэт, Антокаль, Папоўшчына, дзе яны наладжвалі маёўкі, сяброўскія ўгодкі, філамацкія сходы, на якіх гучалі палкія прамовы, вершы, спяваліся песні. Тут на галовы маладых хлопцаў, змагароў за волю зусім неспадзявана абрынуўся жорсткі град рэпрэсій, вельмі

хутка параскідаўшы ўсіх членаў дружнай філамацкай сям'і па самых розных кутках свету.

Амаль усім ім ужо не суджана было ў жыцці хоць адным'вокам глянуць на свой, дарагі сэрцу горад, які з усіх зямных шырот свяціў ім зыркай і такой недасягальнай зоркай: там жа навекі засталіся іх маладосць, каханне, іх нязбытныя мары, высокія юнацкія парывы. Толькі двум ці тром сябрам з усёй філамацкай сям'і выпала вялікае шчасце праз многія і многія гады, ужо ў сталым узросце адчуць пад нагамі такі знаёмы і родны брук віленскіх вуліц.

Такім шчасліўцам быў самы «прамяністы з прамяністых» Тамаш Зан.

АПОШНІ ПРЫСТАНАК ВЫГНАННІКА

З уральскай ссылкі Тамаша Зана, гэтага «небяспечнага палітычнага злачынца», бунтаўшчыка спакою ў паўночна-заходняй частцы Расійскай імперыі, адпусцілі толькі праз трынаццаць гадоў. А дамоў, на радзіму — яшчэ пазней.

Адпускалі яго недарэмна. Сваю ролю адыграла тут захапленне Тамаша Зана прыродай Урала і прылеглых да яго земляў. Гэтае захапленне зблізіла яго там з многімі выдатнымі людзьмі. Вялікі ўплыў на «архіпрамяністага» зрабіла сустрэча і знаёмства з сусветна вядомым вучоным-натуралістам з Германіі Аляксандрам Гумбальтам, які прыязджаў на Урал у вучоную экспедыцыю. Пад яго ўздзеяннем Тамаш Зан з уласцівай яму апантанасцю заняўся вывучэннем геалогіі і батанікі. Праз колькі часу яму даручаюць геалагічную разведку на шырокіх прасторах Прыуралля. У пошуках карысных выкапняў і мінералаў, а таксама з мэтай больш шырокага вывучэння краю Тамаш Зан аб'ездзіў многія мясціны Урала, Прыуралля, Тургайскага стэпу. На Волзе пад Самарай ён адшукаў нафту, у Зауральскім стэпе — багатыя паклады золата, каля Троіц кай крэпасці — медную руду. Тамаш Зан стварыў мінералагічны музей у Арэнбургу. Першымі экспанатамі былі там рэчы, сабраныя ім у шматлікіх навуковых экспедыцыях.

Улічваючы немалыя заслугі Тамаша Зана ў вывучэнні уральскай прыроды і асабліва знаходку пакладаў золата, 3 мая 1837 года «государь император всемилостивейше соизволил разрешить Заиу оставить, буде пожелает, службу в Оренбургском

крае, с правом продолжить оную в других губерниях или возвратиться на родину». Але са зваротам Тамаша Зана на радзіму ўлады ўсё ж не спяшаліся. Спачатку яму дазволілі прыехаць у Пецярбург, дзе ён, уладкаваўшыся бібліятэкарам у Горным інстытуце, заняўся выданнем сваіх прац пра прыродныя багацці Урала агульным аб'ёмам сто друкаваных аркушаў. Аднак надрукаваць такую аб'ёмную кнігу Тамашу Зану не ўдалося. Па сённяшні дзень мы не ведаем, дзе дзеўся яе рукапіс.

А зварот на Беларусь, нягледзячы на царскае «всемилостивейшее соизволение», усё адцягваўся. Больш таго, Тамаша Зана неўзабаве пасля прыезду ў Пецярбург нечакана выклікалі ў канцылярыю вядомага III аддзялення імператарскага ведамства і паведамілі там, што яго вырашылі вярнуць назад у Арэнбург у суправаджэнні жандара: паліцыя даведалася пра новыя факты ўдзелу беларускага выгнанніка ў арэнбургскай змове 1833 года. Ратаваць «архіпрамяністага» кінуліся яго віленскія сябры, якія аселі ў Пецярбургу, і ў першую чаргу Францішак Малеўскі, у сям'і якога ён знайшоў цеплыню і спагаду. Наўрад ці дапамаглі б тут захады сяброў, бо справа непакорлівага бунтара дайшла да самога шэфа жандараў, галоўнага начальніка III аддзялення графа А. Х. Бенкендорфа.

Але, на шчасце, за Тамаша Зана заступіўся арэнбургскі генерал-губернатар граф Васілій Аляксеевіч Пяроўскі, які высока цаніў ссыльнага філамата за яго геалагічныя адкрыцці, за шырыню ведаў. Гэта выратавала «архіпрамяністага» ад новага вітка «блуканняў па пакутах».

Улады затрымлівалі Тамаша Зана ў Пецярбургу яшчэ таму, што ў Вільні ў гэты час было не зусім спакойна. Там, у былым Віленскім універсітэце, цяпер Медыка-хірургічнай акадэміі, пад кіраўніцтвам беларускага паэта Францішка Савіча ўтварылася новае тайнае згуртаванне студэнтаў, да якіх далучыліся некалькі прафесараў і віленскіх рамеснікаў і з якімі наладзіў кантакт вядомы рэвалюцыянер Сымон Канарскі. Новую змову супраць царызму выкрылі акурат у час знаходжання Тамаша Зана ў Пецярбургу. Атмасфера ў Вільні была напружаная. Пускаць туды легендарнага кіраўніка філарэтаў было тое самае, што кідаць іскру ў бочку з порахам. Затрымка са зваротам на радзіму, якая была цяпер так блізка, вельмі прыгнятала Тамаша Зана. «Відаць, не раней як праз два ці тры гады змагу я вярнуцца дадому, што мяне вельмі засмучае, — пісаў ён сваёй нязменнай сяброўцы Марылі Верашчака (цяпер Путкамер) у 1838 годзе. — Ніколі да гэтага не адчуваў я так цяжка сваё выгнанне, як цяпер — у бляску славутай сталіцы Расіі».

Так і атрымалася, як прадугадваў выгнаннік: толькі ў 1841

годзе яму дазволілі вярнуцца на радзіму, ды і то як супрацоўніку Горнага інстытута. Наколькі пакутлівае было чаканне звароту, гаворыць псіхічны надлом Тамаша Зана, пра што з вялікай роспаччу паведамляе Марылі Путкамер Францішак Малеўскі ў самым пачатку 1840 года. Ён ужо быў упэўнены, што назаўсёды «страціў свайго даўняга друга, добрага Тамаша». Але, на шчасце, прыступы вар'яцтва паўтараліся ўсё радзей і, нарэшце, зусім прайшлі.

Няма чаго казаць, якая хвалюючая была сустрэча Тамаша Зана з роднай зямлёй пасля семнаццаці гадоў разлукі. Не менш хвалюючай была яна і для яго сяброў, блізкіх, знаёмых і нават для тых, хто нарадзіўся тут пасля яго выгнання і ведаў пра «архіпрамяністага» толькі з расказаў ды з твораў Адама Міцкевіча. Адразу па прыездзе ў Вільню Тамаша Зана акружылі яго сябры. У той жа дзень прыехала з Балценік Марыля Путкамер і забрала яго да сябе ў маёнтак, дзе яго вельмі кранула Марыліна дачка Зося, якая спявала яму, іграючы на фартэпіяна, Чачотавы песні. Разам з Марыляй і сваім братам Ігнасем наведаў ён сям'ю Балінскіх у Яшунах, Марыліных братоў, а сваіх даўніх сяброў Верашчакаў — Юзафа ў Смольчыцах і Міхала ў Дварцы. Ва ўсіх шляхецкіх сядзібах Тамаша Зана прымалі з вялікай радасцю і цеплынёй, прымалі як героя, як вяртанца з іншага свету.

У адным з такіх маёнткаў, у вёсцы Аборак на роднай Маладзечаншчыне, у сям'і добрых знаёмых Дэдэркаў Тамаш Зан напаткаў маладую паненку з недалёкай Маліноўшчыны Брыгіду Свентажэцкую, якая зачытвалася рамантычнай літаратурай, захаплялася творчасцю свайго сучасніка Адама Міцкевіча і якая шмат наслухалася пра высакародства, мужнасць і трагічную долю філаматаў і філарэтаў, ну і, вядома ж, пра іх галоўнага завадатара. Дзяўчыну да глыбіні душы ўсхвалявала незвычайная сустрэча з самым «прамяністым» філаматам, героем міцкевічаўскіх «Дзядоў», гэтай жывой легендай. Ужо з самага першага знаёмства Брыгіда закахалася ў яго без памяці. Тамашу Зану таксама прыйшлася да душы гэтая рамантычная і гожая паненка. Расказваючы ў пісьме да Марылі Путкамер пра свае пачуцці да Брыгіды Свентажэцкай, Тамаш Зан пісаў: «Я ўбачыў у ёй самую Літву, якая вітае свайго сына з выгнання, убачыў у ёй анёла, які нагадвае мне маю маладосць, боства, якое прадракае мне шчаслівую будучыню».

Абое закаханыя пачалі думаць аб жаніцьбе. Але і тут былі свае перашкоды. Перш за ўсё тое, што Тамаш Зан быў не цалкам яшчэ вольны, звязаны з Горным інстытутам у Пецярбургу, заданні якога ён выконваў на Беларусі, вышукваючы па ўсёй яе тэрыторыі розныя «скамянеласці». Перш чым жаніцца, яму трэба было, як ён

сам прызнаваўся, «замяніць цяперашнюю службу на іншую, у межах краю, а за пасаг купіць або ўзяць у арэнду які-небудзь больш-менш прыстойны маёнтак». Але толькі ў 1846 годзе яго вызвалілі ад працы ў Горным інстытуце і дазволілі пасяліцца ў Беларусі. І вось 29 кастрычніка «маладыя» змаглі пайсці пад вянец — Тамашу Зану было ўжо тады пяцьдзесят гадоў.

Шлюб бралі ў мястэчку Лебедзева пад Маладзечнам. Адсюль вяселле на пяцідзесяці вазах рушыла ў родавы маёнтак Свентажэцкіх — Маліноўшчыну. Вяселле было мнагалюднае, урачыстае. Цягнулася яно аж да Задушнага дня. З'ехалася ўся радня Тамаша Зана, сярод якой ужо не было ў жывых яго бацькі — магіле яго ў Лебедзеве ён пакланіўся адразу па прыездзе сюды. Прыехалі, вядома ж, яго самыя блізкія сябры Марыля і Ваўжынец Путкамеры, браты Верашчакі Юзаф і Міхал. Вось толькі не змог прыехаць на ўрачыстасць аніхто з сяброў-філаматаў: ні Адам Міцкевіч з Парыжа, ні Ігнат Дамейка з Сант-Яга ў Чылі, ні Міхал Рукевіч і Ану фры Петрашкевіч з Сібіры, ні Юзаф Кавалеўскі з Казані, ні Францішак Малеўскі з Пецярбурга... Хоць бы нейкім цудам яны і змаглі б прыляцець на вяселле дарагога сябра, усё роўна іх сюды не пусцілі б улады: яны ж былі выгнаны назаўсёды з роднай зямлі. Не было на вяселлі і Яна Чачота, які жыў цяпер на Беларусі, на сваёй Навагрудчыне.

Чаму ж не прыехаў, не прыляцеў на крылах на Занаву ўрачыстасць адзін з самых блізкіх сяброў — Ян Чачот?

Тут маглі быць дзве прычыны. Першая — хвароба Яна Чачота, якая змусіла яго праз колькі месяцаў пусціцца ў Друскенікі на лячэнне. Другая прычына — трэшчыны ў шматгадовым сяброўстве Чачота і Зана. На гэтых «трэшчынах», мусіць, варта спыніцца больш падрабязна. Што ж магло разладзіць іх сардэчную, яшчэ з філамацкай пары дружбу?

Тут праглядваюцца таксама два чыннікі.

Першы — гэта спрэчка іх яшчэ ў ссылцы аб адносінах да «маскалёў».

Ян Чачот стаяў на тым, што з імі ў філаматаў не павінна быць ніякога супрацоўніцтва, ніякіх адносін: гэта ж — «ворагі». Тамаш Зан, наадварот, не мог ад каго б там ні было адгароджвацца. Жывы, таварыскі па сваёй натуры, ён з усімі знаходзіў агульную мову, хутка завязваў сяброўства. Выйшаўшы з крэпасці, з турмы, ён хутка зблізіўся з рускімі афіцэрамі ў Арэнбургу, з губернскім начальствам, ахвотна наведваў многія дамы тых самых «Маскалёў», бавіў з імі вольны час, даваў урокі дзецям высокіх чыноў. Даведаўшыся пра такія зносіны Зана з «ворагамі», Ян Чачот напісаў яму гнеўнае пісьмо, у якім абураўся гэтакімі яго паводзінамі, называючы іх «здрадай» айчыне, сябрам-філаматам і

Богу. Дарэчы, такія не пісьмы паслаў Ян Чачот і Адаму Міцкевічу, у якіх таксама дакараў яго за наведванні маскоўскіх салонаў, за ўдзел у свецкіх забавах. У адказ Адам Міцкевіч растлумачваў Яну Чачоту беспадстаўнасць яго абвінавачванняў, не адабраючы яго «цяперашні стаіцызм», яго погляды на адносіны з рускімі, сярод якіх ён сустракаў нямала такіх жа праціўнікаў царскай тыраніі, як і яны самі. Горача абараняючы Зана ад несправядлівых нападак Чачота, ён яшчэ раз напамінаў пра мужнасць «архіпрамяністага» ў час віленскага працэсу над філаматамі, запэўніваў, што ён «і цяпер зрабіў бы гэтак жа пры падобных абставінах». Падагульняючы свае меркаванні аб спрэчцы Чачота з Занам, Адам Міцкевіч так заканчваў адзін з лістоў да іх: «Калі б які анёл убачыў гэтыя вашыя сваркі і перапросіш, ён гневаўся б, смяўся і плакаў бы адначасова».

Але паколаты збан склеіць было ўжо не лёгка.

Тым больш што гэтыя «трэшчыны» вельмі паглыбіў яшчэ адзін важны чыннік — каханне Яна Чачота і Тамаша Зана да Зосі Малеўскай, іх суперніцтва.

Як ужо не раз пісалася, дачка рэктара Віленскага універсітэта і сястра філамата Францішка Малеўскага Зося была сапраўднай музай Яна Чачота. Пазнаёміўшыся з ёй на адной з вечарын у рэктарскім доме і захапіўшыся яе ігрой на фартэпіяна, Ян Чачот пакахаў яе назаўсёды, хоць і без надзеі на ўзаемнасць.

Ён прысвяціў ёй мноства сваіх песень у Вільні, пра яе трызніў на далёкім Урале:

Трызню табою, адзінай,
О маё шчасце, дзяўчына!
Дзе ты, жыццё маё, ранне,
Ты, маё ў свеце каханне?
Ты за той дальняй смугою!
Не за адной ты гарою,
Не за аднымі барамі,
Не за аднымі гарамі!

Хаця Чачот і ведаў, што Зося Малеўская яго не кахае і ўжо, напэўна ж, ніколі не пакахае, усё ж мроіў пра яе, цешыўся ў далёкай ссылцы, што яна ёсць у свеце:

Любоў да сям'і (філамацкай. —К. Ц.) і Зосі
Мне ўцехаю стала адзінай,
Мне ўцехаю стала адзінай
І смуткаў нязводных прычынай.

Аб сіле пачуцця Яна Чачота добра кажа і хвалюючая рэліквія, якую нейкі час назад разам з паперамі філаматаў атрымаў адкульсьці з Савецкага Саюза Літаратурны музей імя Адама Міцкевіча ў Варшаве — складзены канвертам лісток паперы з прымацаванай на ім пасмачкай залацістых валасоў і запісаным пасярэдзіне чатырохрадкоўем (мне давялося ўбачыць яе пры наведанні музея):

Пасмай валасоў во гэтай
Так душа мая сагрэта!
Хоць яны — тугі прычына,
Іх цалую безупынна.

Як выявілася, гэта рэліквія — Яна Чачота, з ягоным вершам і валасамі Зосі Малеўскай. Насіў ён іх па ўсіх шляхах-дарогах з 1818 года і да канца жыцця!

Тамаш Зан таксама закахаўся ў грацыёзную Зосю Малеўскую з першых філамацкіх вечарын у доме рэктара універсітэта, толькі ён хаваў свае пачуцці. Есць сведчанні, што і Зося не была абыякавая да гэтага стройнага, чорнавалосага, лабастага хлопца, лідэра моладзі, які да таго ж прапаведаваў чысціню і высакароднасць у адносінах да слабага полу, як і наогул дабрату, спагадлівасць да ўсіх людзей. Асабліва разгарэлася гэтае пачуццё рамантычнага кахання, калі ў час працэсу над філаматамі і філарэтамі Тамаш Зан быў кінуты ў муры базыльянскага кляштара ў адзіночнае заключэнне. Невядома, як бы склаліся іх адносіны, калі б не турма і шматгадовая ссылка Тамаша Зана.

У кожным разе ў маладзенькай рэктарскай дачкі каханне да «трохкутнага», як называлі часам Тамаша Зана сябры за своеасаблівую канфігурацыю яго лба, не набыло яшчэ такой моцы, каб кінуць абжыты і ўтульны бацькоўскі дом з фартэпіяна і пусціцца ўслед за сваім абраннікам у беспрытульную далеч пад сібірскія маразы і завеі, тым больш што ў іх і намёку пакуль што не было пра які-небудзь шлюб. Зося паўздыхала па сваім герою і пры першай магчымасці выйшла замуж, стаўшы паняй Брахоцкай.

Як і Чачот, Тамаш Зан тужыў на Урале па Зосі. Яго дзённік, які вёў у ссылцы і які выйшаў у Польшы асобнай кнігай, вельмі добра данёс да нас гэтую ту гу: «Наймілейшая, найдаражэйшая! Толькі ты ў маёй думцы і ў сэрцы, ты мой плач і маё жыццё! Божа, паслухай маю малітву, блаславі, Божа, няхай жа будзе воля твая!»

Але ў адрозненне ад Яна Чачота Зося не засланіла Тамаша Зана ад дзяўчат. Бываючы часта ў доме генерала арэнбургскай дывізіі Жамчужнікава (сваяка літаратараў Жамчужнікавых, якія разам з А. Талстым хаваліся пад псеўданімам Казьма Пруткоў),

дзе даваў урокі яго сыну, Зан неўзабаве па вушы закахаўся ў генеральскую дачку Жэню. Нават мерыўся ажаніцца з ёй, на што схільныя былі і яе бацькі, але сама яна выйсці за яго чамусьці не рашылася.

Як бы там ні было, Зося заставалася і для Тамаша Зана далёкай і нязбытнай марай, частачкай маладосці. Таму ў першы дзень па вяртанні ў Вільню з семнаццацігадовай ссылкі ён і пайшоў у дом Малеўскіх — на сустрэчу з юнацтвам, дзе знайшоў сваё каханне з маленькім сынком Кастусём на руках. Пра гэтую сустрэчу вяртанец так расказаў Францішку Малеўскаму ў сваім пісьме: «Зося была першая, хто мяне сардэчна прывітаў, бо Марыня (Зосіна сястра. — К. Ц.) і пані рэктарша былі яшчэ на набажэнстве ў касцёле святога Яна. Дружба нашая сапраўдная, прыгожая, бо захавалася аж адсюль. Костусь — гожы анёлачак... У тваім доме засталося ўсё па-старому, толькі фартэпіяна іншае і на ін шый месцы, яно даўно ўжо не адкрывалася (ад смерці рэктара). Усё ж для мяне былі праспяваны «Вілія» і «Ніна»... а таксама Чачотавы песні: «Што мы вашэці скажам...» (Як мы яшчэ раз можам пераканацца, беларускія песні Яна Чачота былі своеасаблівым сімвалам філамацкага сяброўства.)

У тым жа 1841 годзе вярнуўся ў свае родныя мясціны і Ян Чачот, але нават такі знаўца яго біяграфіі, як Станіслаў Свірка, нідзе не знайшоў нават упамінку пра наведванне паэта свайго нязбыўнага кахання, што было, мусіць, невыпадкова. Нідзе не знайшлося таксама следу пра сустрэчу Зана з Чачотам пасля іх вяртання на радзіму.

Па вяселлі Тамаш і Брыгіда Заны намерыліся зрабіць своеасаблівае падарожжа па Беларусі, каб адведаць сваіх блізкіх і знаёмых. «На свята Божага Нараджэння, — успамінае Зан,:—мы адведалі Навагрудак Ігнася (Занавага брата. — К. Ц.). Дварэц Верашчакаў, Далматаўшчыну Вяржбоўскіх, Паланечку Радзівілаў, Бортнікі Слізеняў, Крошын Юрагаў, Вольну Рафаля Слізня, Куль Бжазоўскіх, Сляпянку Ваньковічаў, Аборак Дэдэркаў, Беніцу Швыкоўскіх, Манулы Багдановічаў. На Тры Каралі былі мы ў Лепелі».

Тамашу Зану не цярпелася заняцца гаспадаркай у сваім кутку. Такі. куток адшукаў яму Ваўжынец Путкамер, муж Марылі. Зан набыў яго за дадзены ў пасаг грошы ў Адольфа Дабравольскага. Гэта маёнтак Кахачын пад Оршай. Але адправіцца туды Зан з жонкай яшчэ не мог, бо яго трымалі абавязкі перад Горным інстытутам. Давялося пабыць яшчэ ў маёнтку бацькоў Брыгіды Свентажэцкай. Тут і нарадзіўся ў іх першы сын Віктар (другое імя — Серафін). Хроснай маткай яго была Марыля Путкамер.

Урэшце Зан з сям'ёй змог перабрацца ў свой маёнтак, пачаў яго абжываць. Праўда, асаблівай радасці ад свайго набытку ён не меў. Гаспадар скардзіцца ў адным з пісем Марылі Путкамер на адарванасць ад родных і блізкіх, наракае на сваю долю: «Вязень над Віліяй, бадзяга над Урал-ракой, жабрак і пакутнік над Нявой, хворы над Нёманам, чыноўнік над Дзвіной; не прытуліла мяне сяброўства на Літве, горная справа на Жмудзі, сваяцтва і вучоная сябрына на Чорнай, грамадзянства і набожнасць над Дняпром і на Белай Русі. Няўжо ж пакуль я жыву, буду вечным выгнаннікам і пілігрымам?»

Усё ж яму давялося жыць і гаспадарыць у гэтым закінутым і забытым Богам кутку Беларусі да канца жыцця.

Каханыя, як відаць з Занавых пісем, была вёска, што ляжала дзесьці «пад Оршай».

Каб даведацца што-небудзь канкрэтнае пра Каханыя, я ўзяўся праглядаць розныя геаграфічныя даведнікі. Перш за ўсё я разгарнуў у аддзеле рэдкай кнігі бібліятэкі Акадэміі навук не раз мною памянёны вельмі грунтоўны «Геаграфічны слоўнік...». На жаль, Кахачына ў ім я не знайшоў. Не аказалася яго і ў «Слоўніку населеных пунктаў Віцебскай вобласці» Яўгена Рапановіча, які выйшаў ужо ў наш час і ў якім пададзены ўсе, нават самыя малыя населеныя пункты Віцебшчыны. Значыць, трэба з сумам канстатаваць, што такой вёскі ўжо не існуе на Беларусі...

Якім жа чынам і ў які час выпала са «спісаў», сцерлася з карты Беларусі вёска ці вёсачка Кахачын, вядомая мне толькі тым, што тут закончыў сваю драматычную адысею «вечны выгнаннік і бадзяга», а яшчэ бунтар і інсургент, паэт і ўрэшце добры сем'янін «архіпрамяністы» Тамаш Зан? Мо згарэла ў адной са шматлікіх войнаў, што пракаціліся па Беларусі? А можа, у нашы часы «вялікіх пераўтварэнняў» трапіла ў злачынныя спісы «неперспектыўных» і была -задушана ў пятлі чыноўніцкіх пастаноў?

Як бы там ні было, але месца, дзе яна стаяла, недзе ж засталося. А значыць, засталася і яе назва, якая, пэўне ж, стала цяпер недзе простым урочышчам, як гэта звычайна здараецца.

Толькі як знайсці гэтае ўрочышча? Відаць, трэба ехаць на месца, «пад Оршу». Тым больш што ў мяне ж ёсць і арыенцір: былое мястэчка Смаляны, дзе ў 1855 годзе знайшоў свой вечны спачынак «архіпрамяністы».

У пошукі апошняга прыстанку Тамаша Зана мы з Генадзем Каханоўскім таксама дамовіліся ехаць разам. Калі прыкідвалі час паездкі, мне сустрэўся на вуліцы Анатоль Жалязоўскі, намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі.

— Ці не захацеў бы ты з'ездзіць у складзе пісьменніцкай

групы на святкаванне юбілею Уладзіміра Корбана, на яго радзіму? На «рафіку», як трэба...

Радзіма Уладзіміра Корбана — Аршаншчына.

Дык гэта ж, мусіць, на лаўца і звер бяжыць! Памеркаваўшы, што пасля ўрачыстасці можна ж будзе адлучыцца і ў Занавы мясціны, я даў згоду і папрасіў запісаць у групу яшчэ Генадзя Каханоўскага.

Я ўжо ўяўляў, як мы, два да ўсяго цікаўныя краязнаўцы, будзем блукаць незнаёмымі дарогамі і сцежкамі Аршаншчыны, разам шукаць там сляды Тамаша Зана, дзяліцца ўражаннямі ад сустрэч з людзьмі, з помнікамі мінуўшчыны. Ды тут зноў мае планы зблытаў Генадзь. Ужо напярэдадні паездкі, зайшоўшы ў наш кабінет у рэдакцыі «Полымя», я на сваім рабочым стале знайшоў запіску ад Генадзя. Запіска была для мяне, як удар па галаве якой балдавешкай: «Кастусь! Я іду на вяселле да сваёй роднай сястры: аддае дачку. Не выпадае ехаць. Надта хацелася пад'ехаць, але... блізкая радня, няёмка. Сам я забыўся пра свае клопаты...»

Што ж мне аставалася цяпер рабіць? Ехаць аднаму ў незнаёмыя мясціны — зусім не тое. Мо адкласці паездку? Але ж я ўжо запісаўся, у маіх руках — камандзіроўка. Памеркаваўшы і так і гэтак, выра шыў канчаткова: трэба ехаць — як будзе, так і будзе.

І вось гладзюткай аўтастрадай, што прастуе недзе аж на Маскву, бяжыць-куляецца наш аўтобусік. Сядзяць тут больш за ўсё «вожыкаўцы», цяперашнія і былыя: сам галоўны рэдактар Валянцін Блакіт, далей Іван Стадольнік, Пятро Сушко («Пётр І»). А яшчэ — наш саюзаўскі начальнік Анатоль Жалязоўскі, родам з-пад Оршы, а таксама не менш паўнамоцны адзін з падначальнікаў Бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў Пятро Ліпай — «Мяне не Чапай» (альбо «Пётр ІІ»), вядомы ўсёй пісьменніцкай сям'і «лімаўскі» фатограф Уладзімір Крук і я, «прымкнёны Шэпілаў». А вязе гэтую каманду наш нязменны саюзаўскі шафёр Пятро — «Пётр ІІІ».

Вядома, добра вось так, скінуўшы з плячэй цяжкую ношку бясконцых клопатаў, калывацца сабе на мяккім сядзенні, пазіраць у акно, за якім праплывае наша палявая-лясная зямля з яе простымі, але заўсёды мілымі сэрцу краявідамі. Ну, вядома, і пагаманіць у такой разнаякай кампаніі, уволю пасмяяцца, пажартаваць, а то і зацягнуць пад настрой якую песню, што сама папрасілася на язык. Дарога ёсць дарога!

Калі пад'язджалі к Аршанскаму раёну і, звярнуўшы з магістралі, скіравалі проста на Барань — радзіму Уладзіміра Корбана, я дастаў з кішэні блакнот — занатоўваць назвы «населеных пунктаў» на дарожных указальніках: а можа, яны неяк

памогуць мне адшукаць Занаў Каханыя? Перад вачамі замільгалі: Коханава — Звенячы — Ляўкова — Шапчына — Лісуны — Тумінічы — Зубрэвічы (гэта ж — радзіма нашага сябра Янкі Сіпакова) — Клюшнікава і, нарэшце, Барань, дзе мы і спыніліся і адразу пачалі знаёміцца з новай для большасці з нас мясцінай.

Для мяне гэта было цэлае адкрыццё: я трапіў у горад, пра існаванне якога дасюль нават не падазраваў. Горад гэты — Барань. Не мястэчка, не гарадскі пасёлак, а сапраўдны, прытым немалы сучасны горад! Вось яшчэ адзін доказ нашага, у першую чаргу майго «веданння» Беларусі!

Сустрэў нас перад будынкам гарвыканкома сам мэр горада. А быў ім шчуплы, падцягнуты, фізкультурнай камплекцыі малады чалавек, былы настаўнік беларускай мовы і літаратуры адной з бараньскіх школ. Звалі яго Юры Аляксандравіч Нагорны. Родам — з Навагрудчыны, з-пад Свіцязі. Усе мы з прыемнасцю адзначылі яго чыстую беларускую мову. І гаварыў ён па-беларуску не толькі з намі, літаратарамі. Беларуская мова жыве ў яго сям'і, па-беларуску ён гаворыць з людзьмі, выступае на сходах, па-беларуску вядзе і сесію гарсавета. Інакш кажучы, робіць так, як і павінна быць па ўсёй Беларусі, раз мы хочам называцца цывілізаванай нацыяй.

Барань — горад вельмі кампактны, з вялікім старым паркам у самым цэнтры, з сучаснымі дамамі, вядома ж, «каробачнага» (тут нікуды не дзенешся) тыпу, з прамымі шырокімі вуліцамі.

Пасялілі нас згодна з распараджэннем мэра не абы-дзе — у санаторыі! Высокі шматаконны гмах на беразе ракі Адроў. З вокан санаторыя адкрываецца шырокі краявід — светлы пасак ракі ў вербалозах ды вольхах перад самым фасадам, зялёная, вельмі вабная лугавіна ў рачной пойме, маляўнічыя залесеныя ўзгоркі за ракой, маўклівы цемнаваты хвойнік удалечыні. А стаіць санаторый на ўскраіне горада, да цэнтра якога ісці хвілін дзесяць, не болей!

Санаторый гэты пабудаваў для сваіх работнікаў завод «Чырвоны Кастрычнік», той, на якім працаваў Уладзімір Корбан і які называўся цвікавым. Толькі ён, вялікі, усесаюзнага значэння завод, які, дарэчы, і ўзгадаваў з колішняга пасёлка сапраўдны горад, мог дазволіць сабе такую раскошу. Праўда, санаторый амаль пусты: у кожнага ж завадчаніна недзе побач свой дом, свая кватэра. А персанал, вядома ж, працуе, зарплата ідзе. Можа, гэта адзін з безлічы нашых БАМаў, толькі ў мініяцюры?

На самім заводзе мы таксама змаглі пабываць. Паглядзелі збольшага цэхі, зазірнулі ў музей, які мае такую афіцыйную назву — «Народный музей революционной, боевой и трудовой славы оршанского завода «Красный Октябрь». Мноства фотаздымкаў,

схем, вымпелаў, узнагарод. З цікавасцю паслухалі мы расказ работніка музея пра гісторыю завода, што пачынаецца задоўга да рэвалюцыі. Аказваецца, на гэтым «цвікавым» заводзе яшчэ з вайны 1914 года вырабляўся калючы дрот. Цікава, у колькі зменаў працавалі цэхі па выпуску гэтай прадукцыі ў часы, калі ёю абгароджваліся незлічоныя астравы архіпелага Гулага? А яшчэ выпускалі тут кайданы. Нам паказалі стэнд, дзе расказвалася пра аднаго з рабочых цэха па вырабу кайданоў Івана Фаміча Кляўзы, які за рэвалюцыйную дзейнасць быў закуты пры царызме ў кайданы... уласнай вытворчасці. Дастаўшы з-пад шкла, нам паказалі яго аб'ёмісты дзённік, у якім ён скрупулёзна, з цікавымі дэталямі расказвае пра свой удзел у вядомых нам падзеях — гэты жывы дакумент часу. Шкада толькі, што ў музеі мы не ўбачылі саміх кайданоў — гэтую «важную» прадукцыю завода. Зрэшты, ніякага ўпамінку не было і пра тых, хто цягаў іх не толькі «ў змрочныя часы царызму», але і ў «светлую эру чалавецтва, адкрытую вялікім Кастрычнікам».

У Барані мы пабылі два дні! Сустрэчы, выступленні, экскурсіі, адкрыццё мемарыяльнай табліцы ў гонар Уладзіміра Корбана на вуліцы яго імя. Усё гэта, вядома, было цікава. Але ж мне рупіла іншае: знайсці на Аршаншчыне Занаў Каханыя, пабываць на яго апошнім прыстанку. Тут, у Барані, усе, у каго я ні пытаўся пра яго, толькі паціскалі плячамі.

Заставалася ехаць у Смаляны. Пэўне ж, Каханыя быў недзе недалёка ад Смалян, раз сюды прывезлі хаваць яго гаспадара.

Развітаўшыся пасля ўрачыстасцей з гасціннымі гаспадарамі Барані і сябрамі-літаратарамі, якія ад'язджалі ў Мінск, застаўшыся адзін як бізун, я сеў на рэйсавы аўтобус і пакаціў у Оршу, каб адтуль весці свае росшукі.

Як выявілася, Смаляны ад Оршы недалёка. Аўтобусы ходзяць туды рэгулярна. Але яшчэ ў Барані ласкава падручыўся звазіць туды мяне на сваёй машыне намеснік старшыні гарвыканкома Васіль Віктаравіч Дзяржыцкі. Па мяне ён пад'ехаў у Оршу, да гасцініцы.

Прыехалі мы ў Смаляны рана. Там Васіль Віктаравіч перадаручыў меня старшыні сельсавета Івану Сымонавічу Бутару. Іван Сымонавіч, добры і прыветлівы чалавек сталага веку, расказаў мне збольшага пра Смаляны. Мястэчка (цяпер яго чамусьці завуць вёска) даволі вялікае, тут дзве буйныя гаспадаркі — калгас «Новае жыццё» і саўгас-тэхнікум, які ўзнік на базе даўняй сельскагаспадарчай школы. Іван Сымонавіч быў дырэктарам гэтага саўгаса-тэхнікума. Сам ён з Вілейскага раёна, робіць тут з 1962 года. Для лепшага знаёмства з гісторыяй Смалян Іван Сымонавіч завёў мяне ў музей саўгаса-тэхнікума,

куды падышлі таксама яго загадчык Эдуард Іванавіч Іваноўскі і завуч саўгаса-тэхнікума — маладая абаяльная жанчына, імя якой я, на жаль, не запісаў.

Аказваецца, Смаляны — даволі старажытнае паселішча. У хроніках яны ўжо згадваюцца з канца XV стагоддзя як уладанне князёў Бельскіх. Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Аляксандр падарыў Смаляны сваёй жонцы Алене, дачцэ вялікага князя маскоўскага Івана Ш. Потым Смаляны былі падараваны вялікім князем літоўскім Жыгімонтам I праслаўленаму военачальніку Вялікага княства Літоўскага Канстанціну Астрожскаму, які са сваім 30-тысячным войскам недалёка адсюль, на рацэ Крапіўна ў 1514 годзе ўшчэнт разбіў 90 тысячнае войска вялікага князя маскоўскага Васілія Ш. Са Смалякамі звязана таксама імя рускага палкаводца Андрэя Курбскага, які, пасварыўшыся з царом Іванам Грозным, перайшоў на бок Вялікага княства Літоўскага, за што як узнагароду і атрымаў ад караля Жыгімонта Аўгуста гэтае мястэчка пад Оршай. Пазнейшымі ўладарамі Смалян былі князі Сангушкі, а з XIX стагоддзя, калі Беларусь апынулася ў складзе Расійскай імперыі, — рускія высокія чыны Сямёнавы, Цітовы.

У музеі на фоне ўсяго мінулага Смалян паказвалася гісторыя тэхнікума. Пачатак яму паклаў памешчык Цітоў, арганізаваўшы тут у 1900 годзе так званую ніжэйшую сельскагаспадарчую школу першага разраду. Рыхтавала школа спецыялістаў для буйных памешчыцкіх гаспадарак. Праіснавала яна да 1917 года. Праз год на базе гэтай школы ўтварыўся сельскагаспадарчы тэхнікум, які за гады свайго існавання выпусціў многія сотні спецыялістаў. Сярод выпускнікоў гэтай сельскагаспадарчай навучальнай установы — былы прэзідэнт Акадэміі навук БССР Васіль Феафілавіч Купрэвіч. Дырэктарам тэхнікума перад вайной быў Уладзімір Елісеевіч Лабанок, вядомы партызанскі камандзір, а потым дзяржаўны дзеяч Беларусі.

Але першае, што хацелася мне даведацца ад маіх новых знаёмых — зноў жа пра Кахачын. Дзіва: і тут пра яго ніхто нават блізка не чуў — ні старшыня сельсавета, які, вядома ж, назубок павінен быў вывучыць свае ваколіцы, ні загадчык музея, які родам з недалёкай адсюль вёскі, ні завуч саўгаса-тэхнікума. Нічога пра Каханыя не сказалі мне і навучэнцы саўгаса-тэхнікума, з якімі папрасіла мяне сустрэцца завуч.

Заставалася толькі задаволіцца наведаннем магілы Тамаша Зана. Шукаць яе мы пайшлі разам з Іванам Сымонавічам і Эдуардам Іванавічам.

Спачатку Іван Сымонавіч хацеў адгаварыць мяне ад гэтага: пасля дажджу, які толькі што скончыўся, там будзе быццам бы

гразка ды і праз кусты цяпер не прадзярэшся. Але ўбачыўшы, што я ўсё роўна не адступлюся, нехаця згадзіўся.

Ісці давялося зусім не доўга: смалянскія могілкі — у самым мястэчку, на высакаватым узгорку. І ніякай гразі там я не бачыў, і ні праз якія кусты нам не трэба было прадзірацца. Неахвоту старшыні сельсавета весці мяне сюды я зразумеў, калі мы падышлі да месца: так, парадак на могілках не з ідэальных, як, зрэшты, і ўсюды ў нас — на ўсеагульны наш вялікі сорам.

Магілу Тамаша Зана знайшлі адразу: пра яе ў Смаляках ужо ведалі, вучні Смалянскай школы нават узялі былі яе пад сваю апеку — добрая прыкмета часу, нашага духоўнага выздараўлення.

Перада мною сярод кустоўя былі два роўныя, аднолькавай прамавугольнай формы гранітныя помнікі з уманціраванымі жалезнымі рэйкамі, пры дапамозе якіх, відаць, мацавалася верхняя частка помнікаў.

На першым з іх было выбіта: «С. П. Брыгіда Зан», на другім, справа — «С. П. Тамаш Зан» (усё на польскай мове). А перад абодвума помнікамі, якраз пасярэдзіне ляжаў вялікі пляскаты валун з вычасанай на ім і добра адшліфаванай плітой. На гэтай пліце быў акуратна высечаны чыімсьці вельмі старанным долатам надпіс: «Мілы Богу і людзям Тамаш Зан, памяць якога ў блаславенстве... Жыў шэсцьдзесят гадоў. Памёр 7 ліпеня 1855 г. у Кахачыне». А трошкі ніжэй: «Брыгіда Зан з Свентажэцкіх пахавана побач з сваім мужам 23 жніўня 1900 г. ва ўзросце 81 г.» А яшчэ ніжэй ішлі больш дробныя літары, якія цяжка было разабраць. Укленчыўшы перад каменем, мы доўга прачышчалі літары ад даўнейшага моху. Іван Сымонавіч дастаў з кішэні сцізорык і, асцярожна адскрабаючы мох, вадзіў ім па жалабках літар. І ўсё ж цалкам прачытаць надпіс мы не змаглі. Нам удалося толькі разабраць пачатак і канец фразы: «Сын іх... памёр у 1854 г.» Прычым лічба «5» была не зусім выразная, і я ў блакноце, куды заносіў усе надпісы, паставіў пасля яе пытальнік. Ніяк не прачытвалася сярэдзіна фразы — нейкае доўгае слова (ці мо і не адно), якое пачыналася быццам бы на «С». Я толькі запісаў прыкладную канфігурацыю літар. У іх, відаць, хавалася імя Занавага сына, а магчыма, яшчэ нейкая інфармацыя.

Калі я агледзеў з усіх бакоў помнікі, замаляваў іх і занатаваў усе надпісы, мне захацелася паглядзець іншыя помнікі. І вось зусім неспадзявана недалёка ад месца пахавання Занаў я ўбачыў за кустом, здаецца, бузіны яшчэ адзін падобны помнік, толькі ўжо з жалезным, таксама чатырохвугольным верхам і такім жа жалезным, прыгожа аздобленым крыжам і прачытаў на ім вельмі выразны надпіс: «С. П. Абдон Зан. Памёр у 1903 г. дня 9 кастрычніка. Гадоў 54» і ніжэй: «Адпусці нам грахі нашы». Ды гэта

ж сын Тамаша Зана!

Агледзець помнік Абдону Зану было не проста: перашкаджала кустоўе ды высокае бадыллё. Да таго ж перад самым помнікам, на месцы магілы зеўрала... глыбокая яма. Гэта, як мне растлумачылі, «папрацавалі» рабаўнікі — нашы, савецкія вандалы. Што яны хацелі знайсці сярод касцей? Золата, каштоўнасці?..

Параўноўваючы помнік Абдону з помнікамі яго бацькам, якія былі выкананы ў адным стылі, я зразумеў, што і тут былі гэтакія ж жалезныя надбудоўкі над гранітам і гэтакія ж, з густам выкаваныя крыжы. Нехта, як бачым, паквапіўся і на жалеза святых крыжоў, надмагільных памятак...

Пасля наведання могілак у мяне быў яшчэ час знаёміцца «ў натуры» з самімі Смалянамі, у якіх, вядома ж, не раз бываў Тамаш Зан.

Першае, што кідаецца ў Смалянах у вочы, — гэта багацце помнікаў гісторыі і культуры і... наша варварства.

Калі я глянуў на мястэчка з ускраіны, перада мною адкрыўся велічны малюнак: злева ішоў у неба высозны гмах дамініканскага касцёла, правей вылучаліся сярод простых местачковых дамоў мураваная Аляксееўская царква, драўляная Спаса-Праабражэнская царква і на ўзгорку ўцалелая вежа даўняга замка.

Але калі я пачаў бліжэй знаёміцца з гэтымі архітэктурнымі помнікамі мінулага, мой энтузіязм змяніўся нечым адваротным.

Вось рэшткі старажытнага замка, які называюць — Белы Ковель. Пабудаваў яго ў XVII стагоддзі князь Сымон Сангушка. Як паказваюць гісторыкі, Сангушкі атрымалі Смаляны ад Андрэя Курбскага ў абмен на іх уладанне на Валыні — Ковель: непакорнаму ўцекачу-палкаводцу, пэўне ж, не зусім спакойна сядзелася паблізу пакінутай ім Масковіі на чале з грозным царом, і таму ён наважыў падацца далей ад яе межаў. Сангушкам жа Смаляны прыйшліся даспадобы, і яны, згадзіўшыся на абмен, замацаваліся тут на вякі. У памяць аб першапачатковым уладанні свой замак яны назвалі Белы Ковель — «белы» таму, што ён быў светлы, відаць, пабелены. Гэта было велічнае і прыгожае збудаванне, акружанае ровам з вадою. З багатым аздабленнем усярэдзіне.

У час Паўночнай вайны ў Смалянскім замку засеў атрад шведаў на чале з генералам Капіферам, каб абараніцца ад войска Пятра I. Тады ж, у 1708 годзе, ад ядраў рускай артылерыі, якая выбівала адтуль шведаў, замкавыя вежы былі разбіты, а сцены атрымалі першыя прабоіны. Дарэчы, ад шведаў, якія разам з іх военачальнікам былі там захоплены ў палон, рускія даведаліся аб шведскім корпусе генерала Левенгаупта, што рухаўся на дапамогу Карлу XII пад Палтаву, і дзякуючы гэтаму разбілі яго каля вёскі

Лясной, што мела ці не рашаючае значэнне для перамогі ў Палтаўскай бітве.

Нягледзячы на вялікія разбурэнні, Смалянскі замак у Паўночную вайну яшчэ не поўнасцю страціў свой першапачатковы выгляд. Далейшы заняпад замка, як сцвярджаюць гісторыкі, пачаўся з далучэннем Беларусі да Расіі ў канцы XVIII стагоддзя і асабліва тады, калі новы гаспадар Смалян царскі чыноўнік Сямёнаў прадаў замак нейкім гандлярам на цэглу. Цэглы гэтай хапіла і ім, і, відаць, пазнейшым ахвотнікам пажывіцца дармовым матэрыялам, бо руіны замка засталіся без прыгляду. Як мне расказалі смалянцы, з замкавай цэглы будаваліся кароўнікі.

У выніку ад велічнага замка Белы Ковель засталася толькі не да канца разбураная пяціпавярховая галоўная вежа, якая ўзвышаецца над мястэчкам як жывы сведка адшумелых стагоддзяў.

Я не адразу змог падысці да замка: і цяпер роў, што агінай ўзгорак з замкавымі руінамі, напоўнены вадой, мутнай, забруджанай зялёнай раскай. Толькі калі мне паказалі кладкі ў густым кустоўі, я падняўся па іх на той вельмі вабны зялёны ўзгорак, падышоў да магутных сцен з прахонам! акон і дзвярэй. Руіны замка зусім не дагледжаны, усярэдзіне і знадворку — поўнае запусценне, сляды чыіхсьці рыдлёвак, якія невядома што тут шукалі. І ўсё ж нават гэтая абабітая, абдзёртая, зруйнаваная вежа дае Добрае ўяўленне пра веліч Белага Ковеля.

Цікава, што з замкам народ і тут звязвае свае легенды. Набожная бабулька, з якой я разгаварыўся, на поўным сур'ёзе расказала мне, што аднаго разу вечарам да замка падымаўся, перайшоўшы кладку, мясцовы дырэктар школы і што быццам бы насустрач яму выйшла ўся ў белым княгіня. Наблізіўшыся, яна хацела падаць яму руку, але ён, спалохаўшыся здані, пусціўся адтуль наўцёкі.

— Гэта была заклятая княгіня, — закончыла свой расказ бабулька. — Кажуць, усе людзі, якія памерлі, некалі выйдуць з зямлі...

Што ж да касцёла, які так добра глядзеўся здалёку, дык ён быў сапраўдным шкілетам — адны голыя сцены, ды і тыя забруджаныя, абляпаныя нейкім мазутам, усярэдзіне і каля ўвахода рэшткі смецця, бітай цэглы, усялякага лому — праўда, нехта сабраў гэта ў кучкі. Бабулька, якая расказвала мне пра заклятую княгіню, паведала, что купал касцёла абваліўся зусім нядаўна: нішто ўжо яго не трымала — як жа, тут быў машынны двор калгаса, усю сярэдзіну касцёла выкінулі, выдралі, пераўтварыўшы ў смецце ўсе перагародкі, скульптуры, карціны, багатае аздабленне.

— А некалі ж усё тут аж блішчала, — расказвала бабулька. — Я не каталічка, але любіла сюды прыходзіць.

Побач з касцёлам я ўбачыў даўгі і невысокі мураваны будынак, на фасадзе якога прачытаў: «БССР. 1937. МТМ». Літары выбіты — не сатрэш. Таму я і паверыў быў надпісу. Але, падышоўшы бліжэй, я ўбачыў там зусім новую шыльду, з якой вынікала, што гэта была «Келейная», помнік архітэктуры XVIII стагоддзя. Калі я ўвайшоў усярэдзіну, на мяне патыхнула машынным маслам, саляркай і яшчэ невядома чым, нейкім смуродам. На зямлі (падлогі і следу не было) валяліся рэшткі аўтамабільных шын, жалезны лом, усялякі друз. Як і ў касцёле — голыя, толькі чымсьці заляпаныя, запаскуджаныя сцены.

Аляксееўская мураваная царква здалёку выглядала лепш, калі не лічыць нахілены набок жалезны крыж на самым яе версе — жыўцом вырывалі яго некалі камсамольцы, гэтыя «хунвэйбіны» дваццатых гадоў, ды так і не змаглі да канца вырваць. Кажуць, царкву маюць намер рэстаўраваны Я хацеў паглядзець яе бліжэй, але калі падышоў да рэчкі, за якой яна высілася на ўзгорку, то мусіў хутчэй падавацца адсюль прэч: гэтакім смуродам патыхнула на мяне ад рачной вады, бруднай, жоўтай, чымсьці падобнай на тавот.

— Хто ж гэта так забрудзіў рэчку? — папытаўся я ў жанчыны, што выглядвала з блізкага каля рэчкі двара.

— Гэта ж там свінарнік з цялятнікам... — паказала яна ўверх па цячэнні рачулкі. —. Адтуль ідзе нам пад нос гэтая поскудзь... Засмуродзілі ўсё на свеце...

Вось так на сённяшні дзень глумім мы, паскудзім, апаганьваем сваю ўласную зямлю, зямлю нашых дзядоў і прадзедаў. Быццам бы мы не дзеці сваёй бацькаўшчыны, а якіясьці прыблуды, якім наплявать на яе красу, на памяць продкаў, на ўсё святое. Гледзячы на гэтае спусташэнне, занядбанне старажытнага беларускага мястэчка, на вартыя жалю рэшткі велічных помнікаў мінуўшчыны, я ўспомніў перакладзены мной горкі верш украінскага паэта Дзмітра Паўлычкі пра тое, як не чужынцы, а свае ўласныя манкурты, «адукаваныя маголы» сталінскага гарту безаглядна нішчылі, руйнавалі па ўсёй нашай зямлі святую спадчыну стагоддзяў:

Тут таптала ўсё іх гвардыя:
Ад святынь — гіюстэч жуда.
Бы краінай неагляднаю
Пракацілася арда.

Ад'язджаючы са Смалян, я з аўтобуснага прыпын ку ў самым

цэнтры мястэчка яшчэ раз кінуў вокам на ўзгорак з могілкамі — адсюль яны былі як на далоні. Вунь і той схіл, тое зялёнае кустоўе, у цяні якога ўжо 135 гадоў спачывае «вечны выгнаннік» і паэт, «нефармальны» лідэр беларускай моладзі пачатку XIX стагоддзя Тамаш Зан. Паўз яго курсіруюць ніколі не бачаныя ім жоўтыя запыленыя аўтобусы, шмыгаюць туды-сюды хуткія «Жыгулі» ды «Запарожцы», грукочуць «Кіраўцы» ды «Беларусы» — плыве новая, зусім невядомая яму эпоха.

Я пакідаў Смаляны з адчуваннем не да канца выкананага абавязку перад самім сабой. Галоўнае — я не знайшоў у сваім падарожжы апошняга прытулку Тамаша Зана на гэтым свеце — яго абжытага маёнтка, ад якога засталася адна толькі голая назва — Кахачын.

Усё ж у мяне не прападала надзея адшукаць хоць яго месца. Не можа ж быць, каб не засталося ад Занавай сядзібы хоць якіх слядоў — няхай хоць бэзавых кустоў, старасвецкіх ліп ды клёнаў — гэтых заўсёдных вартаўнікоў чалавечага жылля на Беларусі.

У галаву прыйшла думка пашукаць дапамогі ў мясцовых краязнаўцаў. Дзеля гэтага па звароце ў Оршу я адразу пакіраваў у рэдакцыю раённай газеты «Ленінскі прызыў»: там жа пра іх павінны ведаць абавязкова. Ды ў рэдакцыі не толькі ведалі пра краязнаўцаў, а некаторыя з яе супрацоўнікаў самі аказаліся краязнаўцамі. Аднаго з іх я і сустрэў у кабінеце рэдактара. Гэта быў Юра Копцік, малады хлапец і малады журналіст, які выступае з даволі цікавымі артыкуламі не толькі ў сваёй газеце, але і ў рэспубліканскіх. Чытачы штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», напрыклад, не маглі абмінуць у мінулым годзе яго вельмі востры артыкул пра аршанскія Курапаты — «Крумкачы» на Кабыляцкай гары». Юра паказаў мне і апублікаваныя ў некалькіх нумарах сваёй газеты цікавыя дарожныя нататкі з паездкі ў групе «нефармалаў» на месца славутай бітвы польскіх і беларуска-літоўскіх войск пад Грунвальдам, каб адзначыць яе 580-я ўгодкі. У гэтых нататках мне ўбачылася пяро сапраўднага пісьменніка гістарычнага жанру, што так яшчэ ў нас занядбаны.

Ад Юры я ўведаў, што якраз ён і яго сябры, арганізаваўшыся ў гісторыка-краязнаўчую суполку «Повязь», самі, як сапраўдныя гаспадары сваёй зямлі, узяліся за ўпарадкаванне гістарычных помнікаў Аршаншчыны, знявечаных у шматгадовай вакханаліі невуцтва і раз-бою. Гэта яны, «нефармалы», наладзіўшы талаку, у вольны ад работы час прыязджалі ў Смаляны і расчысцілі страшэнныя завалы ў касцёле і дамініканскім кляштары, павесілі шыльды на помніках' мінуўшчыны. Да іх гэтыя помнікі былі яшчэ ў больш страшным стане. Члены таварыства «Повязь» паклапаціліся і аб ушанаванні магілы Тамаша Зана, якая дагэтуль

таксама была зусім занядбана.

Што ж да Кахачына, то Юра Копцік таксама нічога пра яго не ведаў. Нічога не мог сказаць пра гэтае паселішча і другі краязнавец, з якім мяне Юра пазнаёміў, — Вячаслаў Адамавіч Касперскі, пенсіянер, былы фінансіст, які абхадзіў Аршаншчыну ўдоўж і ўпоперак і які піша цяпер цікавыя ўспаміны пра сваё жыццё.

Вярнуўшыся ў Мінск, я рабіў далей свае росшукі нявысветленых момантаў з біяграфіі Тамаша Зана ў дзяржаўных кнігасховішчах і архівах.

Перш за ўсё мне хацелася даведацца пра Занавых дзяцей, іх лёс. Да гэтага штурхаў мяне загадкавы надпіс на надмагільным камені, які не ўдалося мне расчытаць.

Свой запіс тых слоў з канфігурацыяй нечытэльных літар я паказаў пры сустрэчы ў акадэмічнай бібліятэцы Генадзю Кісялёву — гэтаму Шэрлаку Холмсу беларускага літаратуразнаўства (яго кніга «Расшукваецца класік», напрыклад, чытаецца не з меншай цікавасцю, чым дэтэктывы Конан Дойля). Генадзь выказаў меркаванне, што запісаны мною год смерці загадкавага сына Тамаша Зана мог быць не 1854, дзе лічба «5» стаяла ў мяне пад пытальнікам, а 1889 (лічба «9» магла часткова сцерціся і трансфармавацца ў «4»). Якраз у гэтым годзе не стала Занавага сына Кліменція (або Клімента), нешта падобнае на імя якога Генадзь Кісялёў і ўгледзеў у маіх загагулінах. Кліменцій Зан працаваў у 80 х гадах мінулага стагоддзя прысяжным павераным у Вільні. Пра яго пісаў Генадзь Кісялёў яшчэ ў 1966 годзе ў кнізе «З думай пра Беларусь», дзе паказаў, што з Кліменціем Занам быў у блізкіх стасунках Францішак Багушэвіч, таксама прысяжны павераны той жа самай судовай палаты ў адным з будынкаў на Кафедральнай плошчы. Запіс на магільным камені бацькоў аб смерці Кліменція Генадзь Кісялёў растлумачваў тым, што гэты Занаў сын пакончыў жыццё самагубствам, таму згодна са звычаем яго маглі не пахаваць на могілках.

І праўда, вельмі лагічна выстраіў сваю версію вопытны даследчык Генадзь Кісялёў.

Аднак гэтая версія не спраўдзілася. Зацікавіўшыся сям'ёю Тамаша Зана, я даведаўся з літаратуры, што ён меў трох сыноў — Віктара, ці Віктарына (другое імя — Серафін), Абдона і Кліменція. Але быў і чацвёрты, які нарадзіўся якраз у 1854 годзе і памёр адразу пасля таго, як яго хрысцілі. Значыць, якраз гэты апошні хлопчык і ўшаноўваўся на магільным камені Занаў.

Каб высветліць долю апошняга прыстанка Зана, мне трэба было перш за ўсё даведацца, як доўга жыла там яго сям'я.

Смерць Тамаша Зана была для непрактычнай Брыгіды з

трыма малымі дзецьмі на руках зусім неспадзяваным вялікім ударам. Перад ёю ўстала пытанне: як ёй цяпер жыць, ці аставацца ў Кахачыне? Разгубленасць Брыгіды відаць з яе пісьма да Марылі Путкамер ад 15 жніўня 1855 года, якое варта прывесці тут больш-менш поўна: «Дарагая і любая Марыя! Колькі тыдняў назад я паслала пісьмо Зосі Каліноўскай (Марылкай дачцэ. — К. Ц.) у Вільню — выказала ў ім надзею хутка з Вамі ўбачыцца. Цяпер ужо сама разам з трыма сіротамі хачу выказаць перад Вамі свой боль, просячы Вашай малітвы і падмогі ў горы. Вы ўжо ведаеце, што Бог пазваў на Неба сапраўднага Анёла, якім быў наш Найдаражэйшы Тамаш. О, калі б я магла Вам, дарагая Марыя, выказаць боль, які поўніць маё сэрца! Вы, што любілі і цанілі яго ў жыцці, зразумееце, як цяжка стала мне жыць пасля адыходу гэтага Анёла, што быў для мяне цэлым светам і адзіным шчасцем на гэтай зямлі. Я страціла Мужа, Апекуна, Бацьку і адзінага павадыра, які вёў нас па гэтай беднай зямлі да лепшага... Так раптоўна прыйшла да яго хвароба, а за ёй і смерць, што мне ўсё гэта здалося сном — часам мне зусім не верыцца, што гэта праўда... Перад смерцю ён блаславіў дзяцей і мяне... Ён так суцяшаў усіх нас і вельмі шкадаваў, што пакідае нас сіротамі... дзякаваў мне за ўсе клопаты, да апошняй хвіліны аслабелымі ўжо рукамі прыціскаў мяне да свайго сэрца і прасіў змірыцца з Божаю воляю... Ён жыў і паміраў, як сапраўдны хрысціянін, хоць і нялёгка было яму паміраць, пакідаючы жонку і трое дзяцей са сціплымі сродкамі для жыцця. А дзеці, хоць яшчэ такія малыя (Віктару толькі што мінулася сем гадоў, Абдону — шэсць, а Клімэку — чатыры), але ад жалю аж млелі і заліваліся слязьмі. Не ведаю яшчэ, што буду рабіць — ці Бог дасць тут застацца з дзецьмі, ці перанесціся ў нашы мясціны, якія заўсёды былі такія мілыя для нябожчыка і для мяне самой, бо родныя. Як бы там ні сталася, заклінаю Вас, дарагая Марыя, каго ён лічыў самай вернай сваёй прыяцелькай, каб і Вы ў памяць гэтага Анёла захавалі для нас, сірот, такую самую прыязнасць і зычлівасць, якую ён меў да Вас. Бо ні для мяне, ні для дзяцей ніхто не можа быць больш даражэйшым, чым тыя, што паважалі яго і любілі так, як ён гэтага быў варты...»

Марыля Путкамер з усёй чуласцю жаночага сэрца адгукнулася на пісьмо Брыгіды. І вельмі хутка даўняя сяброўская прыязнасць Марылі да Тамаша Зана перайшла і на яго жонку, на дзяцей. Паміж абедзвюма жанчынамі завязалася сардэчная і шчырая перапіска. На жаль, мне не ўдалося пазнаёміцца з большасцю іх пісем, што друкаваліся, як сведчыць бібліяграфія, у розных польскіх выданнях, якіх у нашых «дзяржаўных» бібліятэках я не адшукаў. Але і з таго, што я прачытаў у розных «працах»,

відаць было, што Марыля чым магла дапамагала Брыгідзе Зан, якая з цягам часу змагла выехаць з Кахачына. Спачатку мяне збівала з тропу тое, што і сама Брыгіда, і сын Абдон былі пахаваны якраз у Смалянах, прытым ужо ў пачатку нашага стагоддзя: значыць, яны датуль жылі ў Кахачыне? Але яснасць унёс тут друг Занавай сям'і М. Гавалевіч сваёй публікацыяй у часопісе «Край» з нагоды смерці «пані Тамашовай» (1900, № 36), дзе расказаў, што яна, застаўшыся ўдавою, жыла «то ў сябе ў вёсцы, то ў Пецярбургу (можа, там працаваў старэйшы сын Віктар, доктар медыцыны. — К. Ц.), а найболей у Вільні (там жыў Кліменцій. — К. Ц.), адкуль на сталае жыхарства пераехала ў Панямонь» — маёнтак свайго сына Абдона, «вядомага грамадзяніна і саветніка камітэта Крэдытнага земскага таварыства». Маёнтак гэты быў на высокім беразе Нёмана «у Сувалкскай губерні». Якраз адсюль і прывезлі Брыгіду ў Смаляны, каб пахаваць побач з яе Тамашом — праз сорак пяць гадоў пасля ягонай смерці.

Выпадкова я натрапіў у бібліятэцы і на след самога Кахачына. У кнізе «З філарэцкага свету». У прадмове да змешчаных там успамінаў былога студэнта Віленскага універсітэта Міхала Чарноцкага, брата славутага славяназнаўца Адама Чарноцкага (Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага), я прачытаў, што ў 1848 годзе ён набыў у Магілёўскай губерні ў князёў Сангушкаў маёнтак Леднявічы, які «знаходзіўся за пяць вёрст ад Кахачына, уладання Тамаша Зана» (дарэчы, сам аўтар успамінаў таксама пахаваны на тых жа могілках у Смалянах; шкада, што я пазнавата пра гэта даведаўся — варта б было наведаць там і магілу гэтага малавядомага публіцыста). Леднявічы я вельмі лёгка знайшоў на карце. Гэта — вёска ў Какоўчынскім сельсавеце Сенненскага раёна. Усё правільна: частка сённяшняга Сенненскага раёна ўваходзіла некалі ў Аршанскі павет.

У Сенненскі раён мне з'ездзіць не ўдалося. Думаю, гісторыяй вёскі Каханыя, яе доляй зацікавяцца Сенненскія краязнаўцы. І, пэўне ж, знойдуць дакладнае яе месца. А на ім, хочацца верыць, паставяць нейкі памятны знак. Каб нават далёкія нашчадкі ведалі, што была на Беларусі такая вёска і што жыў там чалавек, з імем якога звязана адна з цікавых старонак нашай гісторыі. Дарэчы, такія знакі-помнікі трэба б было, думаецца, паставіць усім вёскам, усім паселішчам, якія існавалі на Беларусі і цяпер беззваротна зніклі з яе абшару. Кожная ж вёска ці іншае якое паселішча — гэта частачка нас саміх, наша гісторыя. І мы не павінны гэтак безадказна выкідаць іх са сваёй калектыўнай памяці, гэтак лёгка абкрадваць саміх сябе. Пара вяртаць нам страчаную гісторыю. Разам з забытымі паселішчамі нам трэба ўспомніць і ўсіх людзей,

якія рабілі гісторыю, якія пакінулі ў ёй свой след. Хай некаторыя з іх і блудзілі недзе ў дарозе, ішлі ў цемнаце не на тыя, што трэба, маякі і таму займелі імя «блудных сыноў Беларусі», але ўсё ж такі яны — яе сыны, і так, як маці не можа адцурацца ад сваіх дзяцей, што зрабілі нейкія памылкі, так і мы не павінны адварочвацца ад іх. Яны ж — факт нашай няпростай гісторыі. Галоўнае, што яны шчыра жадалі дабра свайму народу, шукалі для яго лепшую долю, аддавалі яму ўсе сілы і здольнасці, а то і жыццё. Як у адносінах да нашых запнутых вёсак, так і да лепшых сыноў Беларусі я вярнуў бы сёння крылаты лозунг следапытаў: нішто не забыта, ніхто не забыты.

Тайны Крашынскага парку

На алеі і на ўзбочнай зялёнай траве вялікага напаўздзічэлага парку — свежаапалае жоўтае лісце. Яго шмат яшчэ і на дрэвах — яркай святлянай лістотай аж палыхаюць раскідзістыя старасвецкія клёны, гэтакія ж старыя, там-сям з падсохлымі галінамі нязвыкла высокія ясені, стаўбунаватыя каштаны... Быццам у нейкія залатыя харомы, уваходжу я ў гэты старадаўні парк. Крашынскі парк...

Сюды, у Крашын, прывяла мяне загадка Паўлюка Багрыма, пошукі слядоў, мусіць, беззваротна страчанай намі Атлантыды беларускай літаратуры мінулага стагоддзя.

Ад яе, гэтай Атлантыды, збераглася, дайшла да нас, па-мойму, толькі маленькая частачка. І болей за ўсё гэта — альбо асобныя творы без імён аўтараў, альбо, наадварот, імёны без твораў. Нібы ўцалелыя пасля вялікага патопу выпадковыя шчэпкі пабудоў, нейкім чынам выкінутыя на бераг абыякавымі да ўсяго хвалямі.

Адна такая хваля вынесла на свет Божы і гэта журботнае імя ў беларускай літаратуры — Паўлюк Багрым. Разам з адным-адзіным ягоным вершам. Нібы адшліфаваны кавалачак бурштыну, падняў знаходку і, па-сапраўднаму яе ацаніўшы, не даў ёй згубіцца ў бяздоннай Леце разумны беларускі інтэлігент, юрыст, ўдзельнік паўстання 1831 года на Беларусі, ураджэнец Навагрудчыны Ігнат Яцкоўскі, які на чужыне, у далёкай эміграцыі, шчасліва збярог у памяці той шчымлівы Багрымаў верш і праз чвэрць стагоддзя пасля першага знаёмства з ім, у 1854 годзе, апублікаваў у Лондане ў сваёй кнізе ўспамінаў пад назвай «Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды», дзе ўпершыню расказаў людзям

пра трагічную долю ў самым зародку загубленага вялікадзяржаўем бясспрэчнага генія нашай літаратуры.

З кнігі Ігната Янкоўскага ўведалі мы і пра тыя драматычныя падзеі ў Крашыне ў 1828 годзе.

Увесь сыр-бор узгарэўся тут з дамаганняў гаспадара маёнтка ў Крашыне Станіслава Юрагі перавесці крашынцаў, былых панцырных баяраў, з вольнага стану ў прыгонных, у сваіх падданых. Паколькі дакументы на валоданне зямлёй у крашынцаў не зберагліся, суд і права былі на баку Юрагі. Але крашынцы не хацелі мірыцца са стратай вольнасці, з несправядлівасцю ўлад. Яны адмовіліся падначальвацца свайму «ўзаконенаму» гаспадару.

Уціхамірваць бунт улады накіравалі ў Крашын дзве роты салдат. «Пры гэтай экзекуцыі, — піша Ігнат Янкоўскі, — некалькі сялян былі збіты да смерці, звыш дзесятка сасланы ў Сібір або ў вайсковую службу, а двор і вёска моцна пацярпелі, бо тая каманда з афіцэрамі на працягу некалькіх месяцаў утрымлівалася за мясцовы кошт».

У падбухторванні крашынцаў да бунту ўлады абвінавачвалі тутэйшага ксяндза Войцэха Магнушэўскага. Адну з прычын гэтага падбухторвання бачылі ў незадаволенасці ксяндза жаніцьбай Юрагі з Антанінай Радзівіл і пераходам да яго Крашына. Крашын быў адным з маёнткаў князёў Радзівілаў. Каб завалодаць ім, паручнік польскіх войск Станіслаў Юрага і папрасіў быццам у князя Мацея Радзівіла рукі ягонай дачкі Антаніны. Вядома, збяднелы шляхціц быў не раўня магутнаму радзівілаўскаму роду. Але старэйшая за яго Антаніна, мусіць, моцна пакахала бравага афіцэра і вельмі хацела выйсці за яго замуж. Бацькам жа такі «няроўны шлюб», вядома, не мог быць даспадобы. Ды жаніху і нявесце пасадзейнічаў тут брат Антаніны Канстанцін Радзівіл, які пасябраваў са Станіславам Юрагам яшчэ ў 1813 годзе ў крэпасці Мадлін над ракой Віслай. Пасля жаніцьбы Крашын як пасаг за Антанінай перайшоў да Юрагі. Ксёндз, відаць, убачыў у гэтым шлюбе нешта нядобрае. Але галоўнай прычынай непрыязнасці справядлівага і добрага Войцэха Магнушэўскага да Юрагі і падбухторвання супроць яго прыхаджан-крашынцаў было іх гвалтоўнае заняволенне ўладаром Крашына.

Ігнат Янкоўскі расказвае, што ў час расследавання сялянскага бунту ў Крапівін прыехалі тагачасны папячыцель Віленскай навучальнай акругі сенатар Мікалай Навасільцаў (той, што чатыры гады назад расправіўся з філаматамі і філарэтамі) і рэктар Віленскага універсітэта Венцаслаў Пелікан, якія дачуліся, што быццам бы ксёндз Магнушэўскі самачынна, без дазволу універсітэта адкрыў у Крашыне парафіяльную школу і «прывівае там непакорнасць духу». Каб пераканацца ў гэтым, яны

намерыліся «злавіць яго ў путы ліслівасці» і выпытаць усё пра настроі школьнікаў. Паверыўшы ў добразычлівасць самага высокага начальства на ніве асветы, Войцэх Магнушэўскі пачаў «траціць патрэбную цвярдыню асцярожнасці» і выказвацца ў абарону ўзбунтаваных крашынцаў. Тут Навасільцаў папракнуў ксяндза, што ён кепска выхоўвае сваіх прыхаджан, не дае ім асвету. Не зразумеўшы «хітрыкаў» сенатара, Магнушэўскі расказаў, што ён якраз многа робіць у гэтым напрамку, што мае нават парафіяльную школу. Атрымаўшы такое прызнанне ксяндза, сенатар Навасільцаў захацеў азнаёміцца са школай. Для гэтага ксёндз загадаў паклікаць з вёскі лепшых вучняў, якіх і ўзяліся экзаменаваць прыезджыя. Сенатар з рэктарам пачалі хваліць ксяндза за добрыя веды вучняў, за тое, што сваім навучаннем ён «робіць паслугу краю». Паверыўшы ў шчырасць «экзаменатараў», Магнушэўскі пахваліўся яшчэ, што сярод ягоных вучняў ёсць сапраўдныя таленты. Тут ён папрасіў аднаго з іх пачытаць «уласныя вершы на беларускай гаворцы, напісаныя без чыйго-небудзь натхнення і ўзору». Хлопчык, якога аўтар называе Пётракам (як мяркуюць, памылкова альбо дзеля перасцярогі), дастаў сшытак і «пачаў чытаць свае журботныя элегіі, з якіх толькі некалькі строф засталося ў аўтара ў памяці — іх тут і прыводзім».

І Янкоўскі падае тэкст вядомага цяпер усім верша Паўлюка Багрыма «Заграй, заграй, хлопча малы...».

Паўлюк Багрым, як сведчыць Янкоўскі, прачытаў тады прыезджым «шэсць ці сем элегій».

Сшытак Багрымавых вершаў сенатар забраў з сабой і, ад'язджаючы, паабяцаў падумаць «пра лёс такога незвычайнага паэта». Падумаць-то ён падумаў, але зусім не так, як чакалі ксёндз і яго выхаванец: за «крамольныя» вершы хлопец быў аддадзены ў рэкруты, а ксяндза Магнушэўскага ўзялі пад варту. Усё гэта канчаткова дабіла старога і хворага ксяндза. Асабліва шкадаваў ён, што сваёй неасцярожнасцю стаў прычынай жорсткага пакарання таленавітага паэта. Свае разважанні пра Паўлюка Багрыма Ігнат Янкоўскі заканчвае такімі словамі: «Бёрнс, парабак з Англіі, пры менш цяжкіх акалічнасцях, уласным талентам, не падтрыманым ніякай навукай, забяспечыў сабе неўміручае імя, а сваёй сям'і — пашану і дастатак; Пётрак з Крашына за талент, дадзены яму Богам, зазнаў самае жорсткае няшчасце!»

Пра Крашынскі бунт і Паўлюка Багрыма цікавыя звесткі дадалі следчыя справы, што апублікавалі літаратуразнавец Ісідар Бас у сваёй кнізе «Літаратурныя пошукі, знаходкі, даследаванні» (Мінск, 1969) і Генадзь Кісялёў у «Пачынальніках» (1977).

З гэтых дакументаў відаць, што для расследавання бунту

крашынскіх сялян прыязджаў сам гродзенскі губернатар Бабяцінскі з чыноўнікам па асобых даручэннях Нечвалодавым і што якраз Нечвалодаву, а не Навасільцаву з Пеліканам чытаў Паўлюк Багрым па просьбе ксяндза Магнушэўскага вершы. Вось як піша пра гэта ў сваіх паказаннях сам Паўлюк Багрым: «Ад роду мне 15 гадоў, рэлігіі рымска-каталіцкай, вучыўся ў плябаніі чытаць, пісаць і пачаткам арыфметыкі ў кс. пробашча Войцэха Магнушэўскага і ў былога вікарыя нябожчыка кс. Піуса Гарбацэвіча. Пасля таго, прыслугоўваючы кс. пробашчу Магнушэўскаму, вывучаў розныя вершы, якія я перапісаў у арганістага пры плябаніі Георгія Арлоўскага, у іх ліку перапісаў і вывучыў вершы на простай польскай мове (г. зн. на беларускай мове. — К. Ц.) пад назвай «Размова хлопаў». Вершы гэтыя мною вывучаны ўжо каля пяці гадоў, але ніколі кс. плябан ні перад кім не прымушаў мяне ў сваёй прысутнасці расказваць іх, і я сам не помню, каб калі-небудзь і перад кім-небудзь расказваў гэтыя вершы. Але ў бытнасць п. гродзенскага цывільнага губернатара з чыноўнікам сваім п. Нечвалодавым у апошніх числах мая месяца гэтага года ў кс. пробашча Магнушэўскага ён, Магнушэўскі, у сваёй прысутнасці і бытнасці п. Нечвалодава загадаў мне памянёныя вершы прагаварыць на памяць, што я і выканаў, а потым па просьбе п. Нечвалодава і па загаду кс. Магнушэўскага перапісаў іх і, яшчэ раз прачытаўшы перад п. Нечвалодавым, аддаў яму асабіста...»

Як бачым, тут шмат што не стыкуецца з успамінамі Ігната Янкоўскага.

Галоўнае — з паказанняў самога Паўлюка Багрыма вынікае, што ён чытаў не свае вершы, а толькі перапісаны ім верш «Размова хлопаў» — варыянт вядомага беларускага верша Яна Баршчэўскага «Рабункі мужыкоў». Але тады ўстае пытанне: адкуль жа ўзяўся ў Ігната Янкоўскага верш «Заграй, заграй, хлопча малы...»? Тут магчыма такая версія: услед за вершам Яна Баршчэўскага Паўлюк Багрым, падахвочаны Магнушэўскім, чытаў і свае, але запісаў іх пад адзіным загалоўкам — «Размова хлопаў». А хутчэй за ўсё ён напісаў свае вершы пазней і паказаў іх разам з іншымі Ігнату Янкоўскаму як адвакату.

Што ж да наведвання Крашына самім сенатарам Навасільцавым і рэктарам Віленскага універсітэта Пеліканам, то гэта дакументальна, здаецца, не пацвярджаецца. Але пра падзеі ў Крашыне яны дасканала ведалі з данясенняў службовых асоб і на іх аснове прымалі «неабходныя меры».

Самае галоўнае, мы не ведаем, дзе дзеліся вершы Паўлюка Багрыма. Няўжо не была «падшыта» гэтая «крамола» ў якіх-небудзь справах? А можа, Багрымавы вершы згубіліся ў паперах

каго-небудзь з удзельнікаў тых далёкіх падзей і, некранутыя, пыляцца недзе на архіўных паліцах, чакаюць не дачакаюцца свайго Шэрлока Холмса?

Загадкі, загадкі...

Па-моўму, па-сапраўднаму разгадваннем іх у нас ніхто яшчэ не браўся. Ды, відаць, работа гэта — не для аднаго даследчыка. Каб разгадаць загадку Паўлюка Багрыма, трэба падступацца да яе, мусіць, з розных бакоў.

Перш за ўсё, відаць, варта больш уважліва прыгледзецца да ўсіх дзейных асоб той хвалюючай драмы пад назвай «Крашынскі бунт».

Толькі ці правільна будзе паказваць яе ў адных чорна-белых фарбах, як гэта бачым ва ўсіх без выключэння артыкулах і мастацкіх творах? Узяць хаця б Станіслава Юрагу. Ці папраўдзе такі ўжо быў ён звер, як малюецца ўсюды? Мусіць, не варта абмінаць тут заўвагу пра яго і звязаных з ім асоб, зробленую ў згаданых успамінах Ігнатам Янкоўскім, чалавекам перадавых поглядаў, спагадлівым да сялян (ужо тое, што ён захаваў у памяці праз многа год хвалюючы Багрымаў верш, шмат пра што гаворыць): «...мы ведалі ўсіх асоб, што дзейнічалі ў гэтай драме, з найлепшага боку і ў наўмыснай жорсткасці ніводную з іх не абвінавачваем...» Але паколькі «жорсткасць усё-такі адбылася», Ігнат Яцкоўскі, «не адважваючыся сам выносіць прысуд», імкнецца аб'ектыўна расказаць, з чаго ўсё пачалося. З яго тлумачэння вынікае, што Юрага хацеў свае спрэчкі з сялянамі наконт зямлі скончыць «па-прыяцельску». Але тут нібыта ксёндз Магнушэўскі перашкодзіў дамоўленасці. Тады Юрага «запатрабаваў сабе ўласнасці праз афіцыйныя ўстановы». Пачалося следства. Юрагу і сялянам прапаноўвалася прыйсці хоць да якога-небудзь пагаднення. «Аднак усе сродкі аказаліся дарэмнымі, а ўрад, узяўшы аднойчы гэту справу ў свае рукі, лічыў неабходным пераканаць бакі, што пастановы вышэйшай улады павінны быць выкананы, і дзве роты салдат, накіраваныя з гэтай мэтай у маёнтак, дамагліся здзяйснення статута, зацверджанага ўрадам». Вядома, я не збіраюся апраўдваць Станіслава Юрагу: усё ж гэта ён дамагаўся падпарадкавання сабе крашынцаў, але ж, як відаць, былі ў яго і «змякчальныя абставіны». У кожным разе з дакументаў не відаць, што ён выклікаў салдат для ўціхамірвання сялян.

Будучы скрупулёзны даследчык, я думаю, аб'ектыўна разбярэцца ва ўсім, дэталёва прасочыць біяграфію Станіслава Юрагі, які, дарэчы, паходзіў з багатага колісь княскага роду Гедройцяў.

Як відаць з дакументаў і кнігі Янкоўскага, на баку Станіслава

Юрагі ў яго спрэчцы з сялянамі быў і брат Антаніны, уладар Паланечкі Канстанцін Радзівіл. Гэта таксама не адназначная гістарычная постаць. У дарожных нататках пра Уладзіслава Сыракомляˆ мне ўжо даводзілася згадваць пра Канстанціна Радзівіла як ліберальнага князя, аднаго з кіраўнікоў літоўскага філіяла тайнага антыцарскага польскага Патрыятычнага таварыства, яго актыўнага дзеяча, які наладжваў сувязі з дзекабрыстамі для сумесных дзеянняў супроць царскага самадзяржаўя, дзеля чаго ён неаднаразова сустракаўся ў 1823 годзе з Аляксандрам Бястужавым. Імя Канстанціна Радзівіла сустракаў я і сярод карэспандэнтаў Рускага геаграфічнага таварыства, куды ён пасылаў матэрыялы па беларускай мове і этнаграфіі.

І яшчэ напрошваецца адно пытанне: ці не было якой-небудзь сувязі, хай і ўскоснай, паміж Паўлюком Багрымам і філаматамі? Пра філаматаў і філарэтаў пасля іх выкрыцця ў 1823 годзе гаварыла ўся Беларусь, і моладзь, вядома ж, не магла не зацікавіцца смелымі антыцарскімі вершамі паэтаў-філаматаў, у тым ліку і беларускімі. Не мог не ведаць гэтыя творы і цікаўны да ўсяго Паўлюк Багрым. Тым больш што самыя славутыя паэты-філаматы Адам Міцкевіч і Ян Чачот былі якраз з гэтага ж самага Навагрудскага павета, што і Паўлюк Багрым. А дзяцінства Яна Чачота праходзіла зусім блізка ад Крашына, на рацэ Мышанка, таксама «пад Баранавічамі». Як паказваў следчым ксёндз Магнушэўскі, Паўлюк Багрым на памяць ведаў як беларускі верш Яна Баршчэўскага «Размова хлопаў», так і «розныя байкі з Нарушэвіча, Эзопа і «Вядомосці Бруковых» — віленскага сатырычнага антыпрыгонніцкага часопіса. Вядома, называць творы нядаўна пакараных, высланых за межы Беларусі паэтаў-філаматаў Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Тамаша Зана ксёндз-дэмакрат зусім не мог. Можна з упэўненасцю сказаць, што творы паэтаў-філаматаў, паэтаў-землякоў Паўлюк Багрым таксама чытаў і перапісваў у свае сшыткі, толькі пра гэта нельга было і заікацца.

Дадатковым доказам знаёмства Паўлюка Багрыма з творамі філаматаў могуць быць і іх непасрэдныя кантакты з асобнымі дзейнымі асобамі той крашынскай драмы, кантакты, пра якія чамусьці яшчэ не згадвалі нашы літаратуразнаўцы.

Я прыводзіў ужо згадку філамата Тамаша Зана пра тое, што ў час яго вясельнага падарожжа па Беларусі восенню 1846 года ён разам са сваёй мала дой жонкай Брыгідай Свентажэцкай, аб'язджаючы блізкіх і сяброў, наведаў і Юрагаў у Крашыне.

Шукаючы вытокі гэтага сяброўства, я на ўсякі выпадак прагартаў выдадзеную ў Польшчы «перапіску філаматаў» у пяці тамах. Эўрыка! Сярод тых, з кім былі звязаны філаматы ў

1817-1823 гадах, знаходжу і Юрагаў, а канкрэтна — імя жонкі Станіслава Юрагі — Антаніны, з якой, аказваецца, сябравала каханая Адама Міцкевіча Марыля Верашчака (Путкамер). Прывядзём тут урывак з пісьма Марылі да Тамаша Зана ад 18 (30 па ст.ст.) верасня 1822 года: «Няхай пан Тамаш будзе такі добры і напіша мне пра пані Юрага, як яна сябе пачувае і дзе жыве. Пані Юрага вельмі мяне запрашала, каб я наведала яе ў Вільні да канца гэтага месяца, але я яшчэ не ведаю, ці здолею зрабіць гэта». У чарговым пісьме да Зана Марыля ізноў пытаецца пра здароўе «любай пані Юрага» і паведамляе, што збіраецца яе наведаць. Пра гэта Тамаш Зан паведамляе і Адаму Міцкевічу, які таксама, як вынікае з пісьма, ведаў Антаніну Юрага.

Перапіска паказвае, што Антаніна была замужам за Станіславам Юрагам ужо ў 1822 годзе, а не ў 1826, як падае, напрыклад, Сцяпан Александровіч у нарысе «Слядамі легенды», апублікаваным у яго кнізе «Незабыўнымі сцежкамі» (Мінск, 1959). Выходзіць, спрэчка паміж Юрагай і крашынцамі цягнулася не меней як шэсць гадоў?

Марыля Верашчака ведала Антаніну Юрага, відаць, з маленства: за чатыры ж кіламетры ад радзівілаўскага Крашына ў маёнтку Сачыўкі над той жа Шчарай жыла яе бабуля і іншыя сваякі.

Не мог не ведаць Антаніну Юрага і Марылін брат філамат Ігнат Дамейка, які наведваўся ў Сачыўкі і да агульнай для яго і Марылі бабкі, і да сваёй сястры, а потым і да мацеры, што з часам перабралася сюды. На ўсё жыццё запомніліся Ігнату Дамейку тутэйшая прырода і дзіцячыя забавы ў Сачыўках. «Нібы цяпер бачу, — пісаў ён на схіле жыцця, — як тры малыя Марылькі: мае дваюрадныя сёстры — Верашчака (пазнейшая Марыля), Залэнекая (паходжаннем з Касцюшкаў) і родная сястра, — трымаючы доўгую гірлянду з руж і язміну, спяваюць перад расчуленай бабуляй». Ігнат Дамейка ўспамінаў, як у час, калі жыла тут яго маці, гулялі вяселлі дзвюх яго сясцёр і брата Адама. «Тут, — згадваў Ігнат Дамейка, — развітаўся я з маткай, апошні раз пацалаваўшы ёй рукі (у красавіку 1831 года) — праз год яе ўжо не стала...»

Пасля паўстання 1831 года Ігнат Дамейка як яго ўдзельнік вымушаны быў пакінуць Беларусь, выехаць у эміграцыю. Толькі ў 1884 годзе, пасля больш чым паўвекавой разлукі змог ён наведаць бацькоўскі край. І больш за ўсё цягнулі Ігната Дамейку родная Мядзвядка, вёска ў цяперашнім Карэліцкім раёне, дзе ў 1802 годзе ён першы раз убачыў свет, і Сачыўкі, дзе былі пахаваны яго бабка, маці і дзе заставалася яшчэ яго радня. Гэтую хвалюючую сустрэчу падрабязна апісаў ён ва «ўспамінах выгнанніка», што выйшлі ў Польшчы асобнай кнігай пад назвай «Мае падарожжы».

Думаю, варта прывесці тут асобныя вытрымкі з кнігі, дзе гаворыцца пра Сачыўкі, Кра шын і ваколіцы. Вось як апісвае аўтар саму сустрэчу з краем яго дзядоў: «Галава мая поўнілася думкамі і ўспамінамі, я кідаў вачамі ва ўсе бакі. Ужо відаць былі вялікія белыя вежы Сталавіцкага касцёла, статкі кароў, што пасвіліся каля лянівай Шчары на шырокай даліне, удалечыні адкрывалася вёска Крашын, вятрак на ўзгорку; і вось з-за цёмных вольхаў паказаўся Сачыўскі двор, палепшаны, але не зменены. На ганку сустракала мяне многа гасцей і шматлікая радня — нашчадкі маіх братоў і сясцёр; справа ад ганка — дамашнія, слулсба, злева — грамада сялян. Гаспадар Язерскі і яго жонка... падалі мне на падносе хлеб, соль і мёд, а старшы з сялян, пакланіўшыся, прывітаў мяне: «Нех бэндзе пахвалены пан Езус». Я адказаў яму «навекі», і пачаліся поціскі і пацалункі. Якая гэта была радасць!..»

Перш за ўсё Ігнат Дамейка схадзіў пакланіцца магіле сваёй мацеры — упершыню пасля яе смерці, а таксама магіле бабкі. Могільнік быў зусім недалёка, на Паповай гары, паміж Сачыўкамі і Загор'ем. Як расказала мне ўраджэнка Загор'я паэтэса Ніна За горская, на гэтых могілках ужо нікога не хавалі, але людзі шанавалі гэтае месца, не пускалі туды жывёлу. Ды зусім нядаўна аж занадта разумны мясцовы начальнік загадаў узараць стары могільнік, дзе значыліся яшчэ магільныя курганкі, і засеяць яго збажыной. Вяскоўцы са слязамі на вачах расказвалі Ніне, як плугі выварочвалі з зямлі чарапы ды косці іх продкаў. Жанчыны журботна пазбіралі тыя астанкі і перазахавалі ў агульнай ямцы пад бліжэйшымі кустамі.

У свой прыезд Ігнат Дамейка меў магчымасць пабачыць абрад дажынак, паслухаць знаёмыя з дзяцінства песні беларускіх сялянак. Адна з газет пісала, што ён пры гэтым нават расплакаўся: «Якраз так спявалі вясковыя жанчыны на Літве пяцьдзесят гадоў назад».

Пасля полудня пачалі з'язджацца на сустрэчу з земляком, славутым вучоным Ігнатам Дамейкам шматлікія госці зблізку і здалёку — Радултоўскія, Верашчакі, Анцуты, Кабылінскія, Слізені, Абламовічы з Нясвіжа і іншыя, сярод якіх быў і «Завадскі з Крашына, унук паланецкай пані Радзівіл».

Назаўтра Дамейка разам з сям'ёй і сваім спада рожнікам Антоніем Эдуардам Адынцом выехаў у Крашын. «У дзесяць гадзін раніцы, — успамінаў Дамейка, — у Крашыне чакаў нас на імшу ксёндз у касцёле, пры якім пахавана мая сястра Язерская. Імша была жалобная. Пасля імшы пайшлі мы пакланіцца магіле маёй сястры, а потым — мураванай грабніцы сям'і Завадскага, дзе ляжаць яго бабка Юрага з Радзівілаў, матка і жонка, ад якой асталіся два прыгожыя хлопцы. Ласкавы гаспадар запрасіў мяне і

Адынца, каб мы на памяць недалёка ад дома пасадзілі па дубку. З ахвотай выканалі мы гэтую ганаровую місію — пасадзілі ў падрыхтаваныя ямкі два дубкі, а ксёндз асвяціў гэтае месца...»

Нельга абысці і яшчэ адно імя, звязанае з крашынскай драмай. Гэта — наглядчык вучылішчаў Наваградскага павета граф Адам Храптовіч. Ён удзельнічаў у следстве з нагоды крашынскага бунту і асабіста пазнаёміўся з Паўлюком Багрымам. Як паказваюць дакументы, ён «чуў памянёныя вершы, якія чыталі хлопчыкі, што служылі ў ксяндза Магнушэўскага», але рэктару універсітэта паведаміў, што «ў Крашынскім вучылішчы ніводнаму з вучняў яны не былі вядомыя». Як відаць, Адам Храптовіч імкнуўся апраўдаць Паўлюка Багрыма.

Граф Адам Храптовіч, гэтак жа як і бацька Іаахім Літавор Храптовіч, быў перадавы чалавек, ён удзельнічаў у паўстанні 1794 года. Гэта той самы Адам Храптовіч, у маёнтку якога ў ІПчорсах знаходзілі спагаду і прытулак філаматы Адам Міцкевіч, Францішак Малеўскі, Юзаф Яжоўскі, Тамаш Зан і іншыя, карыстаючыся яго багатай бібліятэкай, той самы Храптовіч, які прытуліў у сябе Яна Чачота пасля яго вяртання з уральскай ссылкі і даў яму працу ў той бібліятэцы. Вядома ж, Адам Храптовіч не мог не расказаць беларускаму паэту і фальклярысту Яну Чачоту пра таленавітага хлопца з Крашына, пра яго трагічную долю.

Вельмі пашырыў нашы ўяўленні пра ўзаемасувязі дзейных асоб крашынскай эпапеі амаль сенсацыйны артыкул Язэпа Янушкевіча «Ледзьве здымкі ўратаваў...», апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 4 лістапада 1988 года. У ім даваўся агляд матэрыялаў, прысланых на імя аўтара ў Інстытут літаратуры нашай Акадэміі навук з Польшчы 85-гадовым ксяндзом Каролем Жураўскім, які служыў перад вайной пробашчам у Крашынскім касцёле і збіраў усё пра Паўлюка Багрыма і гісторыю мястэчка. Жураўскі паведамляў, што ведаў хату Паўлюка Багрыма пад саламянай страхой і кузню, дзе ён працаваў, што гэтая кузня «месцілася дзесьці на дворскай тэрыторыі, бо такі быў звычай, што ў двары мелася кузня для направы інструментаў і для кавальскіх работ: падкоўвання коней, вастрэння і вырабу плугоў, сярпоў, барон і г. д.».

Сярод прысланых Жураўскім матэрыялаў была фотакопія запісу хрышчэння Паўла Багрыма ў Крашынскім касцёле, дзе ясна гаворыцца, што нарадзіўся ён 2 лістапада 1812 года і праз дзень быў ахрышчаны ксяндзом Магнушэўскім. Дакументы паказваюць таксама, што ў Паўла Багрыма былі яшчэ чатыры браты — Вінцэнт, Аляксандр, Валенцій, Станіслаў і дзве сястры — Ганна і Тэрэза, што маці паэта памерла 9 студзеня 1832 года ва ўзросце 40 гадоў, а бацька дажыў удаўцом да 1855 года.

Па-новаму глянуць на біяграфію Паўлюка Багрыма змушае і прысланая фотакопія пратакола аб шлюбе яго ў 1864 годзе, дзе падаюцца дакладныя звесткі пра абаіх «маладых». З ім мы даведваемся, што Павел Багрым быў «сынам Юзафа і Марыі з Стахоўскіх», а маладая — «дачка Юстына і Ядзвігі з Сівіцкіх-Рэўкоўскіх, што ён — «родам з мястэчка Крашын», а яна — з фальварка Канілова тутэйшай парафіі, што яму было ў той час — 52 гады, а ёй — 26, што абое — католікі, што ён — «з мяшчан», а яна — «са шляхецкага стану», што ён жыве ў парафіі ад нараджэння, а яна — шэсць гадоў, што ён — «вольнага стану», а яна — «удава» (муж яе загінуў у паўстанні 1863 года).

Публікацыя Язэпа Янушкевіча дала новыя звесткі пра адносіны філаматаў з Юрагамі. З яе мы даведваемся , што пры шлюбе дачкі Юрагаў Тэафіліі з князем Яўгеніем Робертам Святаполк-Завадскім летам 1843 года ў Крашыне адным са сведкаў быў Тамаш Зан.

Пра другіх сведкаў у артыкуле нічога . не гаварылася. Але ж мне было важна даведацца, з кім жа Тамаш Зан падзяляў гэтую місію. Таму давялося папрасіць у аўтара публікацыі дазволу прагледзець у Інстытуце літаратуры прысланыя яму матэрыялы. Выявілася, што разам з Тамашом Занам сведкамі пры шлюбе дачкі Юрагаў былі вядомы ўжо нам Канстанцін Радзівіл і Гектар Анджэй Прушынскі. Гэта таксама не абы-які факт. Ён гаворыць пра тое, што Тамаш Зан быў добра знаёмы з Канстанцінам Радзівілам. Завадатар студэнцкай моладзі мог пазнаёміцца з князем праз свайго дзядзьку — ксяндза Валентага Зана, які служыў нейкі час пробашчам у радзівілаўскай Паланечцы. Факт гэтага знаёмства наводзіць на думку, што Канстанцін Радзівіл, ведучы ў 1823 годзе ў Вільні перамовы з Аляксандрам Бястужавым, проста не мог не пазнаёміць з прадстаўніком дзекабрысцкай арганізацыі і Тамаша Зана як кіраўніка антыцарскага згуртавання моладзі і адначасова члена таго ж самага Патрыятычнага таварыства. П. Альшанскі, аўтар кнігі «Дзекабрысты і польскі нацыянальна-вызваленчы рух» (Масква, 1959), кажучы пра тую паездку ў Вільню рускага рэвалюцыянера, пераканаўча паказаў, што «Бястужаву ўдалося ўстанавіць сувязь з некаторымі кіраўнікамі Таварыства філаматаў». Цяпер можна сказаць з упэўненасцю, што адным з гэтых кіраўнікоў быў Тамаш Зан. Якраз з ім і меў сустрэчы Аляксандр Бястужаў.

Будачаму даследчыку, відаць, варта зацікавіцца і трэцім сведкам пры шлюбе дачкі Юрагаў — Гектарам Анджэем Прушынскім. Ці не продак гэта па якой-небудзь лініі выдатнага беларускага паэта Алеся Гаруна — Аляксандра Уладзіміравіча Прушынскага? У нашай жа гісторыі ўсё нейкім чынам

пераплецена.

Апрача публікацыі Язэпа Янушкевіча апошнім часам у друку з'явілася пра Паўлюка Багрыма нямала іншых цікавых матэрыялаў, якія дадаюць новыя штрышкі да біяграфіі паэта. Напрыклад, аўтару змешчанага ў часопісе «Родная прырода» (1978, № 2) нарыса «Лотаць цвіце...» Яраславу Пархуту ў час паездкі ў Крашын удалося пагутарыць з людзьмі, якія добра ведалі дачку Паўлюка Багрыма (называлі яе Багрымша) і яе дзяцей Фрыдрыха, Івана і Ванду; «Багрымша» ў 1914 годзе выехала з сям'ёй у Расію. Яраслаў Пархута нават натрапіў на след вершаў Паўлюка Багрыма. Быццам бы іх зберагаў адзін з завадатараў Крашынскага бунту Казімір Камінскі, які нібыта быў высланы не ў Сібір, як мы ведаем з літаратуры, а недалёка ад Крашына, ва ўрочышча Залужжа, дзе была вельмі кепская зямля («суцэльны глей») і дзе ён пражыў да канца сваіх дзён. Перад смерцю Камінскі перадаў «сшытак багрымаўскіх вершаў» свайму сыну Антону. Той хаваў іх за бэлькаю хаты і «толькі ў рэдкіх выпадках, калі збіралася ў хаце ўся радзіна, даставаў той сшытачак і чытаў вершы». Гэты сшытак нібыта загінуў у 1941 годзе. Ад яго засталася толькі зялёная вокладка. Яе паказала аўтару нарыса дачка Камінскага Алена, расказаўшы ўсю гісторыю пра Багрымавы вершы. Што гэта — рэальны факт ці яшчэ адна паэтычная легенда? У кожным разе ёю варта зацікавіцца літаратуразнаўцам. Тым больш што асобныя факты з артыкула Я. Пархуты пацвярджаюцца дакументальна. Напрыклад, тое, што завадатар Крашынскага бунту і праўда не быў сасланы ў Сібір. Пра гэта сведчыць апублікаваны ў згаданай кнізе Ісідара Баса дакумент, дзе гаворыцца, што гродзенскі цывільны губернатар вынес прапанову не высылаць у Сібір Казіміра Камінскага, «улічваючы яго малады ўзрост», а «аддаць у вайсковую службу, калі ён акажацца да яе здольны».

Важнае даследаванне прарабіў мастак Сымон Свістуновіч. Ён адшукаў выкаваныя Паўлюком Багрымам агароджы — своеасаблівыя творы мастацтва. Пра гэта мастак расказаў у газеце «Літаратура і мастацтва», (1984 г., 9 лістапада), падаўшы там і замалёўкі Багрымавага кавальства.

Вельмі сур'ёзны артыкул пра радзіму Паўлюка Багрыма ў мінуласці апублікаваў у дванаццатым нумары часопіса «Полымя» за 1988 год адзін з арганізатараў вельмі нашумелага ў канцы 80-х гадоў таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя» Анатоль Сыю. Ён намерыўся зазірнуць у далёкае мінулае Крашына, выявіць яго даўнейшых валадароў, прыгледзецца да людзей, што жылі некалі ў мястэчку, ну і прасачыць радавод самога Паўлюка Багрыма. Дзеля гэтага завадатар «Тутэйшых» не паленаваўся перагартаць

шмат якія старыя фаліянты і рукапісы, добра распытаць крашынскіх старажылаў, зазірнуць на іх гарышчы, дзе, аказваецца, і сёння можна знайсці цікавыя старадрукі і важныя дакументы. Адзін з такіх дакументаў, адшуканых Сысам, — копія «Акта даравальнага дакумента ад паноў Юрагаў панам Яну і Мікалаю Рачкоўскім, выданага года 1836 месяца ліпеня 2 дня». Цікавыя таксама меркаванні аўтара артыкула пра паходжанне Багрымаў з крымскіх татараў.

Калі я знаёміўся з дакументальнымі матэрыяламі пра Паўлюка Багрыма, у галаву лезла адна «крамольная» думка: а можа, гэта не ён аўтар верша «Заграй, заграй, хлопча малы...», можа, яго не «ўспомніў» праз дзесяткі гадоў, а напісаў сам Ігнат Янкоўскі? Наваградскі ж адвакат — не толькі аўтар мемуараў, але і вершаў на польскай мове. Паспрабаваць што-небудзь напісаць па-беларуску яго мог схіліць беларускі і польскі паэт Аляксандр Рыпінскі, гэтакі ж выгнаннік, з якім ён разам стварыў у Лон Дане незалежную друкарню. Тым больш што і ў яго, паўстанца, былі вялікія жыццёвыя ўзрушэнні, сугучныя таму вершу.

Але я адразу адкінуў гэтую версію: галоўнае, не было ніякай прычыны ў Янкоўскага публікаваць у дакументальных нататках такую няпраўду. У карысць аўтарства Паўлюка Багрыма трэба аднесці і яго вялікую цікавасць да вершаваных твораў і, што вяжнз,, дэ. беларускіх. Трагізм падзей у Крашыне, бяда, што абрынулася на самога Паўлюка Багрыма — усё гэта змушала яго ўзяцца за пяро, каб выліць неяк уласныя пачуцці, якія перапаўнялі сэрца юнака, прыгаворанага да салдатчыны.

Дарэчы, у 1828 годзе пятнаццацігадовага Паўлюка Багрыма маглі прыгаварыць да яе толькі на будучае, з тым, каб аддаць у вайсковую службу, калі ён, як гаварылася ў дачыненні да Казіміра Камінскага, «акажацца да яе здольны». Значыць, да салдатчыны Паўлюк Багрым жыў яшчэ колькі гадоў у Крашыне, жыў, прыгавораны да 25-гадовай няволі на чужыне. Якраз тады, пэўне ж, і пісаліся яго поўныя жалю і безвыходнасці вершы. Як бы там ні было, яны былі напісаны не пазней 1831 года, бо якраз у гэтым годзе Ігнат Янкоўскі апынуўся ў эміграцыі.

З цэлым роем самых розных меркаванняў, супярэчлівых думак і пытанняў у галаве, з надзеяй хоць што-небудзь з іх праясніць і выправіўся я ў Крашын.

Пад'ехаць са мной туды ласкава згадзіўся вельмі дасведчаны баранавіцкі краязнавец Аляксандр Пятровіч Шоцкі, пра якога мне ўжо даводзілася згадваць.

І вось — поўныя машыннага грукату вуліцы старажытнага мястэчка. Віхляючы імі, кіруем спачатку пад касцёл. Вядзе туды вузкая і ціхая вулачка. У канцы яе ўстае перад намі просты і гожы

будынак святыні. Перад ім на дзядзінцу прыхаджаніну адразу трапляе на вока наглядны камень з выбітымі на ім словамі — на латыні і па-беларуску: «Жыццё карот кае — радзіма вечная». Навокал — зялёны мур шаўкавістай травы. Азораныя скупаватым ужо сонцам, задуманыя прысады ў светлых барвах ранняй восені. Куточак цішыні і спакою ў мітуслівым свеце.

Доўгія гады касцёл маўчаў: ён быў спатрэбіўся тутэйшым гаспадарнікам, якія зрабілі з яго склад. Гаспадарнікі не вельмі цырымоніліся з аздобай інтэр'еру. Ратуючы святыню, мастак Сымон Свістуновіч дабіўся — ужо ў нашы часы — адкрыцця ў касцёле музея імя Паўлюка Багрыма, каб паказаць у ім прыгажосць старажытнай культуры беларусаў, высокі талент і ўмельства народа. Але прыджгала неяк з Баранавіч ідэалагічная начальніца, убачыла старыя рэчы, святы абраз і абурылася: як жа — рэлігійная прапаганда, ухваленне мінулага! Было загадана зняць абраз Хрыста, іншыя сумніцельныя экспанаты, а на іх месца вывесіць матэрыялы пра «дасягненні» тутэйшага калгаса, пра ветэранаў вай ны, герояў «высокіх ураджаяў». Словам, хацела бачыць замест музея філію кабінета палітасветы свайго РК КПБ. На такіх умовах Сымон Свістуновіч ствараць музей адмовіўся.

Праблему па-свойму вырашылі вернікі, што патрабавалі вярнуць касцёл сабе. Гады два назад ён, на вялікую радасць крашынцаў, ізноў пачаў дзейнічаць.

Дзверы ў касцёл адчыніла нам яго работніца пані Гражына, вельмі гаваркая, шаноўнага веку жанчына.

Касцёл сціплы, невялікі, але дагледжаны, акуратны, па-дамашняму ўтульны. На сцяне нашу ўвагу запыніў перапісаны чыёйсьці стараннай рукой у добрым абрамленні тэкст адзінага Багрымавага верша — у арыгінале і ў перакладзе на польскую і англійскую мовы. Ад гэтага верша, які тут вельмі да месца, святыня стала яшчэ больш блізкай, сваёй.

А вось і выкаваная ў 1881 годзе састарэлым ужо Багрымам славутая жырандоля — з металічнымі бутонамі кветак і раскрыленымі жаўранкамі. Тонкая, сапраўды майстэрская работа!

Жырандоля, як відаць, і прызначалася для касцёла. Яна шчасліва правісела тут амаль стагоддзе, перажыўшы не адну ваенную завіруху. Жырандоля святіла вернікам і ў апошнюю вайну. Паведаўшы гэта, пані Гражына хацела развеяць перад намі чыюсьці легенду — быццам пры немцах крашынцы, каб зберагчы люстру, утапілі яе ў Шчары. Жырандоля доўгі час вісела ў касцёле і тады, калі быў тут склад. Потым нейкі разумнік загадаў перанесці яе ў тутэйшы Дом культуры. Сёння жырандолю Паўлюка Багрыма вярнулі назад, на яе законнае месца. Але пакуль цягалі туды-сюды гэтую унікальную рэліквію, многіх

выкаваных рукою паэта жаваранкаў яна не далічылася: ведама, надта ж вабныя цацкі, чаму б не сарваць іх для дзетак!

Цікава расказвала нам пані Гражына і пра той даўні бунт. Адчувалася, што яна ведае пра яго не з кніг, а з калектыўнай памяці Крашына, з паданняў старых людзей.

— Нашы дзяды, — казала пані Гражына, — не падлягалі паншчыне: нехта з роду Кабякоў дабіўся ў цара вольнасці ім. Але тут паявіўся Юрага, прымак...

Пані Гражына падрабязна расказала, як Юрага надумаўся адабраць у крашынцаў нададзеныя царом прывілеі, што былі запісаны ў спецыяльнай кнізе. Гэтую кнігу крашынцы хавалі ў патайным месцы, бераглі як вока. Ды знайшоўся нейкі Ролік, п'яніца. Хітры пан даў Роліку гарэлкі і папрасіў паказаць тую кнігу, паабяцаўшы яе вярнуць. Але пан і не падумаў выконваць абяцанку. А людзям аб'явіў, што крашынцы — яго падданыя і таму павінны «ісці на паншчыну». Крашынцы працаваць на пана адмовіліся. Тады Юрага выклікаў «карны полк», што выстраіўся «ад канторы да Шчары». Непакорных крашынцаў разувалі і праганялі скрозь строй салдат, якія білі мужчын палкамі — «кроў аж у Шнару цякла».

Пра тутэйшага пана — я толькі не зразумеў, пра Юрагу ці якога іншага — расказала пані Гражына яшчэ цікавае паданне. Быццам у гэтага пана была вялікая сабакарня. Малых шчанят ён аддаваў сялянкам, каб тыя кармілі іх сваімі грудзьмі. Калі адно такое шчанё прывезлі ў суседнюю вёску Скарчава да маладой сялянкі, яе муж, убачыўшы, як яна корміць яго грудзьмі, схапіў тое шчанё і стукнуў ім аб вугал хаты. Літасці ад пана чакаць за такое было нельга, таму скарчаўскі мужык уцёк у лес, дзе жыў да канца сваіх дзён, хаваючыся ад панскіх паслугачоў.

Потым пані Гражына павяла нас на могілкі, што былі адразу за касцёлам. Магілу Паўлюка Багрыма мы ўбачылі адразу: вельмі прыстойны помнік, з матывамі паэтавай жырандолі, зрабіў над ёй Сымон Свістуновіч.

Мой спадарожнік Аляксандр Пятровіч Шоцкі паказаў мне яшчэ адзін цікавы надмагільны помнік. На ім пісалася, што тут пахавана Серафіна Скаратовіч з дому Стыпулкоўскіх. Гэта не хто іншая, як дваюрадная сястра Адама Міцкевіча — магілу яе Аляксандр Пятровіч адшукаў нейкі час назад зусім выпадкова. Аказваецца, недалёка адсюль, у фальварку Белая, жыла родная цётка Адама Міцкевіча Барбара Стыпулкоўская. Трэба думаць, да сваёй цёткі ў Белую, а значыць і ў Крашын мог прыязджаць у кампаніі «Яна з Мышы» і Адам Міцкевіч — яшчэ адна нітачка сувязі філаматаў з радзімай Паўлюка Багрыма.

Добрае ўяўленне пра Крашын, яго гісторыю, пра паэта-каваля

Паўлюка Багрыма дае даволі прадстаўнічы музей народнага мастацтва і рамёстваў яго імя пры тутэйшай сярэдняй школе, які мы наведалі пасля касцёла.

З матэрыялаў, прысвечаных Паўлюку Багрыму, адразу запыняюць увагу наведвальніка знойдзеныя Сымонам Свістуновічам мастацкія агароджы і веснічкі, што былі зроблены кавалём-паэтам — яны віселі на сцяне як экспанаты.

Як расказала нам загадчыца музея настаўніца Лідзія Іванаўна Голас, не вельмі даўно ў Крашыне можна было ўбачыць і зробленую Паўлюком Багрымам адмысловую брытву, але яе забраў у Мінск быццам бы «нехта з пісьменнікаў». Цікава, што пра гэтую ж брытву расказвае ў сваім пісьме да Язэпа Янушкевіча і ксёндз Жураўскі — ён сам трымаў яе ў руках. Ксёндз падрабязна апісаў брытву і нават зрабіў дакладны яе малюнак — на сярэдзіне ляза значылася прозвішча майстра: «П. Багрым». Таму вельмі праўдападобна гучыць пададзенае ў згаданым вышэй нарысе Сцяпана Александровіча легенда пра сцізорык. Легенда расказвала, што крашынскі пан паказаў Паўлюку Багрыму вельмі хітры ножык-складанчык з многімі ўпрыгожаннямі і што праз тыдзень паэт-каваль разам з панскім прынёс цюцелька ў цюцельку падобны на яго другі ножык, зроблены ўласнымі рукамі. Калі каваль паклаў на стол абодва ножыкі, пан не мог адгадаць, дзе свой, а дзе Багрымаў. Толькі надпіс «П. Багрым, Крашын» памог разгадаць загадку.

Лідзія Іванаўна паведала нам, што да апошняга часу жылі яшчэ людзі, якія помнілі сыноў Паўлюка Багрыма. Цікава прыгадваў пра іх, напрыклад, Міхаіл Станіслававіч Собка. Ён расказваў, што былі яны высокія, русыя, адзін з іх служыў на флоце. Урывак з успамінаў Собкі мы ўбачылі ў экспазіцыі музея. На жаль, у Крашыне нікога з продкаў Багрыма ўжо нельга знайсці. Усе дзеці паэта-каваля як быццам яшчэ ў першую імперыялістычную вайну павыязджалі з роднага дома — хто ў Польшчу, хто ў Расію, здаецца, у Сібір...

У Крашыне прыцягваў мяне сваімі нераскрытымі тайнамі парк, дзе стаяў некалі панскі дом. Недзе тут была і кузня, у якой рабіў спачатку бацька паэта, а потым і ён сам. Пані Гражына казала, што яна стаяла амаль насупраць панскага дома, на другім беразе Шчары, каля моста.

Ідучы ў парк, мы з Аляксандрам Шоцкім прыпыніліся каля таго моста. Але ніякага знаку ад кузні не было тут і блізка. Нехта казаў, што яна была злева ад моста (калі стаць тварам да панскай сядзібы). Бераг Шчары там зарос кустоўем, нейкім бадыллём, закіданы смеццем.

Не захаваўся ў парку і сам панскі дом. На месцы яго сёння

высіцца архісучасны Дом культуры з помнікам Леніну перад фасадам, з акуратнымі асфальтаванымі дарожкамі, з лавачкамі па баках. Парк з усіх бакоў агароджаны. Заасфальтавалі берагі азярца перад паркам.

Што ж, калгас «Перамога» — багаты, здаўна ён у перадавіках, і яму, вядома ж, лёгка было раскашэліцца на «сацкультбыт».

І ўсё ж, акультурыўшы так панскую сядзібу, новыя яе архітэктары, як мне здаецца, беззваротна загубілі нешта вельмі важнае, перш за ўсё, мусіць, яе душу, дух даўніны, пераемнасць традыцый. Ці ж кепска б было прыстасаваць пад клуб абноўлены панскі дом з яго архітэктурнымі асаблівасцямі і, па магчымасці, з адзнакамі былога побыту? Відаць, можна б было ўзнавіць у ранейшым выглядзе і сам двор, а таксама парк, які пры ўсіх яго асфальтаваных дарожках робіць уражанне закінутасці. І ці дазволіў бы сапраўдны гаспадар апаясваць увесь парк, хай і асфальтаванай, дарогай, па якой бясконца грукочуць машыны ды трактары? Гэтак жа апаясалі з усіх бакоў, узялі ў грукотнае асфальтавае кола і ціхае колісь азярцо перад сядзібай. Глядзіцца ўсё гэта як быццам эфектна: скрозь — асфальт, масты. Але каб прыйсці сюды чалавеку і адпачыць душой, уцячы хоць на хвілінку ад мітусні і машыннага грукату — гэтай «драбязы» якраз і не «прадугледзелі» новыя гаспадары, ці, лепш сказаць, гаспадарнікі, якія ўсё звыклі рабіць болей для паказухі, чым для людзей — такая асаблівасць эпохі.

Больш за ўсё мне цікава было ўбачыць, якія памяткі, апрача «мадэрнізаванага» парку і рэштак саду, захаваліся ад былой панскай сядзібы. Аляксандр Пятровіч падвёў мяне да гонкага, не надта старога дуба, што красаваўся за Домам культуры.

— Гэта — адзін з тых дубоў, што пасадзілі Дамейка і Адынец у 1884 годзе.

Адшукаў яго тут колькі гадоў назад якраз ён, Аляксандр Пятровіч Шоцкі, знаўца гісторыі роднага краю. Адшукаў і дабіўся, каб агарадзілі і бераглі як культурную каштоўнасць.

— А дзе ж другі дуб? — папытаў я, аглядваючыся навокал.

— Бачыце вунь музычную школу? — паказаў Аляксандр Пятровіч на невялікі аднапавярховы будынак, што стаяў непадалёку — з ганкам, закіданым жаўталісцем. — На яе месцы і рос, пэўна, той дуб. Калі будавалі школу, яго, вядома, і спілавалі...

Не засталося і таго памятнага каменя, што ляжаў тут і дзе было напісана, хто і калі садзіў гэтыя дубы. Знішчылі самую памяць.

Гадзін у дванаццаць Аляксандр Пятровіч пачаў развітвацца са мною: яму трэба было яшчэ паспець у школу на ўрокі, гадзінам к

дзвюм. Паколькі электрычкі ў гэты час не было, ён намерыўся ісці ў Баранавічы пеша.

— Тут недалёка. Ды і хадзіць я люблю, — заспакоіў мяне Аляксандр Пятровіч, паціскаючы на развітанне руку.

Астаўшыся адзін, я ізноў пайшоў блукаць па парку. У правым яго кутку я натрапіў яшчэ на адну важную памятку, што засталася ад былых уладароў маёнтка, — вялікі мураваны склеп, задзірванелы зверху. Праз адкрыты дзвярны прахон я ўвайшоў усярэдзіну. Шырокі, прасторны, ён разыходзіўся ўнізе ў два бакі, а дзе канчаўся, у цемнаце нельга было разабраць. Я хацеў агледзець склеп дэталёва, але адтуль так моцна патыхала дустам, што я адразу павярнуў назад. Белая атрута была парассыпае па ўсім склепе. Ясна — тут быў яе склад. Потым да мяне дайшло, што гэта ж не што іншае, як тон самы фамільны склеп гаспадароў маёнтка, дзе стаялі іх труны, — якраз ім прыходзіў пакланіцца ў свой прыезд Ігнат Дамейка. Я не мог уявіць, як іх выкідалі адсюль, як з магілы рабілі склад. Кажуць, парассыпаны па склепе дуст ужо ніяк нельга ні вымесці адтуль, ні выпаліць агнём. Так што той, што не ведае, што такое дуст, хто ніколі не бачыў яго і не нюхаў, хай едзе ў Крашын, у былы панскі парк, а цяпер «парк культуры і адпачынку працоўных»: там уволю можа ён надыхацца «славутай» атрутай стагоддзя.

Крашын. Гэтая назва навекі звязалася з імем загубленага нацыянальнага генія Беларусі. Таму ці ж можам мы быць абыякавымі да ўсяго, што там робіцца, да захавання жывых памятак старажытнага мястэчка, да самога аблічча радзімы Паўлюка Багрыма?

Зноў і зноў перачытваю адзіны, цудам уцалелы твор паэта, дзе, нібы сонца ў кроплі вады, адбілася цэлая эпоха ў жыцці беларускага народа, эпоха, імя якой — прыгон. Народная трагедыя паказана праз долю аднаго сялянскага хлопца, якога прыгонніцкая сістэма прывяла да поўнай безвыходнасці:

Заграй, заграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі, і ў цымбалы,
А я заграю ў дуду,
Бо ў Крашыне жыць не буду.
Бо ў Крашыне пан сярдзіты,
Бацька кіямі забіты,
Маці тужыць, сястра плача,
Гдзе ж ты пойдзеш, небарача?
Гдзе я пайду? Мілы Божа!
Пайду ў свет, у бездарожжа,
У ваўкалака абярнуся,

З шчасцем на вас азірнуся.
Будзь здарова, маці міла!
Каб ты мяне не радзіла,
Каб ты мяне не карміла,
Шчасліўшая ты бы была!..

Да якой жа мяжы адчаю мог быць даведзены чалавек, калі ён шкадуе нават, што нарадзіўся на свет, што нарадзіўся чалавекам, а не каршуном, калі адзіны ратунак бачыць ён у тым, каб абярнуцца ў ваўкалака, калі ён баіцца расці, а за тое, што ўсё ж вырас, ён дакарае кажана — чаму той не сеў некалі на яго:

Каб я большы не падрос
Ды ад бацькавых калёс?..

Гэта не проста верш. Гэта крык беларускай душы, што даляцеў да нас з далёкага стагоддзя.

Кажуць, геніяльнае — заўсёды простае. Тут — якраз той самы выпадак. І вельмі натуральная ў вершы, амаль у кожным радку сувязь з фальклорам, з народнымі вераваннямі і ўяўленнямі. Інакш і не магло быць: аўтар жа сам з народа, ён з яго ніколі не «выходзіў», ён неад'емная яго частачка, з ім паэт дзяліў агульную долю. Долю нявольніка на сваёй зямлі, нявольніка, які ўжо ўсвядоміў сябе чалавекам і які не хоча мірыцца з адведзенай яму ў жыцці роляй. Адсюль — абвостраная трагедыйнасць твора.

Пра трагічную долю Паўлюка Багрыма напісана нямала мастацкіх твораў, асабліва паэтычных. Але, мусіць, найбольш ярка выказаў нашу жальбу па загубленым беларускім Шаўчэнку Уладзімір Караткевіч у вершы «Паўлюк Багрым», дзе паэт-каваль убачыўся яму на схіле жыцця, пасля гвалтоўнай 25-гадовай недарэчнай салдатчыны:

Праз акенца сляпое
Шэры дождж глядзіцца ў хату,
У якой дагарае,
Бы ў небе асеннім зара,
Непатрэбная старасць
Адстаўнога паўстанца салдата,
Невядомага генія,
Беларускага песняра...
Мог бы славай грымець
Сярод годных паэтаў Еўропы, —
Гвалтам спуталі ногі,

Трымалі ўвесь час за руку.
Што пакіне ён?
Вершык у памяці хлопаў?
Кандэлябру ў касцёле
Ды кроў на гарачым пяску...

У трагедыі Паўлюка Багрыма Уладзімір Караткевіч убачыў трагедыю ўсяго народа, трагедыю Беларусі, з якой здзекуецца «п'яны, разбэшчаны гун», якую гнятуць прыхадні, што «тлустым задам расселіся на паднявольнай зямлі».

Беларусь мая, сонца,
Дарагая і родная маці!
На якіх раздарожжах
Згубіла ты шчасце сваё?
Ці удасца хоць дзецям
Шчаслівага дня дачакаці
Пасля мужнасці гэткай,
Пасля столькіх крывавых баёў?..

Але гэта — не крык адчаю. Гэта высокі парыў збалелай душы. Кажучы купалаўскімі словамі, «гэта крык, гэта енк, што жыве Беларусь». Якраз так, думаецца, трэба ацэньваць і верш Паўлюка Багрыма.

Дарога ў сто год

ЛЯ ВЫТОКАЎ

Песня рэек. Партфель і дубец. Паветра Зялёнай Дубровы. Артобус сярод жыта. Слабада — прозвішча сакратара райкома. Што чытаюць вясковыя дзяўчаты? Мова зямлі. Смольгава ці Смольгаў? Эх, Дарожка!

Грукочуць, татахкаюць па рэйках колы цягніка. Проста на яго з ранішняга паўзмроку нібы хтосьці адзін за адным кідае — але ўсё міма, міма! — чорныя, мокрыя яшчэ ад расы, тэлеграфныя слупы. Белая грамадка маладых бяроз, што, застылая, драмала ўперадзе, сярод поля, параўняўшыся з цягніком, схамянулася раптам, закружылася ў вясёлым карагодзе.

Рытм імклівай язды адразу завалодаў мною. Усе клопаты, усе мае штодзённыя непаладкі — цяпер ззаду. Яны ўжо мяне не дагоняць! Цэлы месяц — як здорава! — буду я ў дарозе.

Гэта — маё першае вялікае падарожжа. Мяне, аспіранта Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, уключылі ў склад этнаграфічнай экспедыцыі 1970 года. Маршрут — індывідуальны. Я павінен прайсці тымі сцежкамі, якімі болей чым сто гадоў назад хадзіў Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч).

Чаму якраз Сыракомля? Таму, па-першае, што ён наш зямляк, што ён апяваў у сваёй паэзіі Беларусь, яе разлогі і пушчы, расказваў пра долю беларускага мужыка. Таму, што ў жыцці і творчасці гэтага выдатнага наэта XIX стагоддзя, якога высока цапіў М. Горкі і на творы якога пісаў музыку Чайкоўскі, шмат яшчэ нявыяснага, нявысветленага. Таму, урэшце, што яго творчасць, яго праца як краязнаўцы і этнографа Беларусі — тэма майго даследавання.

Пра Уладзіслава Сыракомлю беларускі чытач, трэба сказаць, ведае няшмат. Чатыры гады назад у нас выйшаў толькі тоненькі томік яго выбраных твораў, польскіх, у неракладзе на беларускую мову, і беларускіх, якія захаваліся. А напісана ж ім вельмі многа. Яшчэ ў 1872 годзе, у дзесятую гадавіну смерці паэта, у Варшаве было выдадзена дзесяць тамоў адной толькі яго паэзіі. Акрамя таго, у Сыракомлі было яшчэ нямала празаічных твораў, навуковых прац, артыкулаў. І асноўнае месца ў гэтай вялікай спадчыне займаюць творы на беларускім матэрыяле...

Цягнік бяжыць на поўдзень ад Мінска. Недзе там, як сведчаць дакументы, у былым Бабруйскім павеце, — месца нараджэння

Уладзіслава Сыракомлі. З яго, з гэтага месца, і начну я сваё падарожжа, каб потым — крок за крокам — прайсці ўвесь шлях паэта. У дарогу я прыхапіў у Ленінскай бібліятэцы яго кнігу, выдадзеную ў 1854 годзе, «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах». На першай старонцы — яго партрэт: хударлявы, прадаўгаваты твар, добрыя, спакойныя вочы. Што ж, дарагі Сыракомля, павандруем разам — ужо ў новым веку — на тваіх некалі ваколіцах.

Перш за ўсё нам трэба, як ужо гаварылася, адшукаць — і не на паперы, а на самай зямлі — месца твайго нараджэння. Яшчэ ў 1850 годзе ты пісаў у сваёй аўтабіяграфіі: «Нарадзіўся я 29 верасня 1823 года на балоцістым Палессі, у вёсцы Смольгаў». У дзесятым томе «Геаграфічнага слоўніка Польскага каралеўства і іншых славянскіх зямель» за 1889 год пра Смольгаў сказана так: «Фальварак у заходняй частцы Бабруйскага павета, на паграніччы са Слуцкім паветам... пры дарозе з мястэчка Пагост да вёскі Таль». І далей гаворыцца пра тое, што тут нарадзіўся вядомы польскі паэт Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч). І Пагост, і Таль я знайшоў на сваёй карце. Гэта — у Любанскім раёне.

Ці ёсць цяпер што на месцы таго фальварка? Што з сябе ўяўляе? Вядома, пра паэта там ніхто нічога не раскажа. Як не раскажуць пра яго і ў іншых «яго ваколіцах», куды я паеду. Але ўсё роўна знайсці тое месца, пабываць там трэба. І не толькі дзеля таго, каб удакладніць факт яго біяграфіі, а яшчэ дзеля таго, каб пахадзіць па тых сцежках, якімі хадзіў паэт. падыхаць паветрам, якім ён дыхаў, паслухаць гаворку, якую ён слухаў, прыказкі, паданні... Нехта добра сказаў: каб лепш зразумець паэта, трэба пабываць на яго радзіме.

За Асіповічамі ад маладых «маслячковых» хвойнікаў, што прабягалі за акном вагона, дыхнула на мяне раптам родным светам маленства: гэта ж за імі, тымі іглістымі хвойкамі, хутка, праз колькі перагонаў, пакажуцца знаемыя хаты станцыі-раз'езда Фалічы, ад якой рукой падаць да маёй Зялёнай Дубровы. І я, убачыўшы гэтыя хаты, не мог, каб не сысці з цягніка, не заскочыць — хоць на гадзіну — у родную вёску. Да сваёй маці. Тым больш, што гэта была, па сутнасці, ужо не толькі мая радзіма, а і Сыракомлева, яго «ваколіцы»: мы ж, калі раздумаць, абодва «случчакі», абодва з таго краю, які некалі называўся Слуцкім княствам (удзел старажытнага роду Алелькавічаў) і які нават цяпер яшчэ, па традыцыі, посіць абагуленае імя — Случчына.

Заехаў дадому, а там якраз — чарга адпасваць каровы. Цяпер, калі нічога не скошана і не зжата, адной мацеры пасвіць — па лесе — не вельмі лёгкая работа. Так што — прабач, Сыракомля, — давялося паставіць за шафу свой вучоны партфель, надзець

дапатопныя штаны і ўзяць у рукі дубец.

Па праўдзе кажучы, я і тут не разлучаўся з Сыракомлем: мы ўжо добра падружыліся з ім, сталі як пабрацімы.

Досвітак быў дзіўна спакойны. Ад ночы, якая толькі што прайшла па зямлі, аставаўся яшчэ шэры прыцемак, здаровы летні халадок, што звычайна бывае перад гарачым днём, ды нерухомыя кроплі расы на драсёне і лопуху — імі густа зараслі вадасцёкавыя канаўкі паўз платы. Клікаць: «Каровы выганяйце!» — ці, тым больш, трубіць у прасмолены берасцяны рог, які запомніўся мне з маленства і якога ўжо, напэўна, не знайшоў бы і са свечкай ні ў чыіх сенцах, патрэбы якраз не было. Калі я пайшоў на сярэдзіну вёскі «займаць», каровы ўжо стаялі каля двароў, абціраючы галовамі належаныя за ноч бакі, сонна дажоўваючы сваю жвачку. На выгане, ужо сабраныя ў статак, яны адразу прыпалі да густой нізкарослай муравы.

Міла і хораша было мне слухаць ізноў, праз многа — аж страшна лічыць — год, як дружна грызуць яны ядкую траву, пакідаючы пасля сябе роўныя цемнаватыя дарожкі на белай расе. Быццам і не было горада, не было яго мітусяніны і таўхатні, яго грукату і шалёнага рытму. Жыццё нібы спынілася. А правільней — яно ішло, як і заўсёды, сваім адвечным, натуральным, нічым не прыспешаным ходам. Я неяк адразу настроіўся на гэты яго ход. Усе мае важныя праблемы, усе неадчэпныя думкі, якімі заўсёды была поўна галава, здаліся тут дробязнымі, не вартымі ўвагі. Яны бляднелі, адыходзілі недзе на задні план на фоне гэтай вось ціхай першароднай раніцы, гэтага чыстага — без хмурынкі — неба, бялявай зары, якая, яснеючы, роўна разлівалася над зямлёй, будзячы па алешніках і асацэ балоцін — птушыныя спевы і крыкі.

Я — дома. Тут — маё карэнне, пачатак мяне самога, мой працяг. Тут жылі мае дзяды, тут пасвіў, касіў, вяршыў стагі, спускаў бярозавы сок, араў, сеяў, баранаваў, звозіў снапы, малаціў мой бацька. Я першы кінуў адвечны хлебаробскі занятак маіх продкаў. Яны прыходзілі і адыходзілі, перадаючы — з рук у рукі — сваім наступнікам стары, але лёгкі і ходкі плуг з люстэркам лемяха; да паловы зрэзаную і ўсё яшчэ вострую, як брытва, касу з выгладжаным да бляску касільнам; берасцяную каробку-сяўню ды цупкі малацьбітны цэп. Усе мае папярэднікі — о, як мала я ведаю пра іх! — бралі гэта ў спадчыну як самы дарагі скарб. Я першы не ўзяў. Я разарваў доўгі спрадвечны ланцуг хлебаробскага племя...

Слухаючы музыку бацькоўскай зямлі, я пачынаю лепш разумець і Сыракомлю — у яго ж была душа селяніна. Калі лёс вымусіў паэта пакінуць родныя палеткі, ён адчуваў сябе як рыба, выкінутая з вады. У адным са сваіх апошніх вершаў вясковы лірнік параўноўваў сябе з салоўкам, які апынуўся «за кратамі з

дроту».

Мы прыгналі каровы, калі ўжо добра ўгрэла і скаціне нельга было абараніцца ад заедзі. Я скінуў размяклыя ад расы туфлі, пацяжэлыя штаны і, адпачыўшы ў халадку, палез у шафу — па маю дарожную вопратку.

У канцы вёскі я сеў у аўтобус з непрывычным маршрутам Старыя Дарогі — Зялёная Дуброва. Раней, каб дабрацца да горада, зялёнадуброўцы хадзілі за шэсць кіламетраў у Фалічы — на цягнік. Сёлета — па выхадных — пусцілі аўтобус.

У Старых Дарогах — ранічкай — я сеў на цягнік Мінск-Слуцк, даехаў да Урэчча, там перасеў на любанскі аўтобус.

Дарога ішла якраз праз вёску Таль, якую ўпамінаў «Геаграфічпы слоўнік». Гэта ўжо не вёска, а вялікае сяло, з некалькімі аўтобуснымі прыпынкамі. За сялом паабапал дарогі калыхалася жыта, густое, з цяжкімі каласамі. У ім танулі ўдалечыні калгасныя дамы пад шыферам. Гэта ж недзе тут і павінна быць вёска Смольгаў. Ці астаўся ад яе — амаль праз 150 год — які след? У чырванашчокага дзядзькі, які падсеў на прыпынку ў Талі, з заміраннем у сэрцы пытаюся, ці не ведае ён, дзе тут вёска Смольгаў.

— Смольгава? — адказаў дзядзька. — Ёсць такая. Вунь туды, кіламетры два адгэтуль, к Пагосту.

Я памкнуўся быў спыніць аўтобус, каб вылезці. Але тут жа раздумаў: чаго спяшацца. Смольгаў ж а цяпер ад мяне нікуды не ўцячэ. Паеду спачатку ў Любань, знайду там фатографа, магчыма, — і машыну.

На аўтобуснай станцыі людна, мітусліва. Людзі снуюць туды-сюды бесперапынна. Усе заняты сваімі клопатамі, сваімі клумкамі і чамаданамі. Цябе ніхто і не заўважае. Можаш так вось стаяць на адным месцы дзень, і гэта нікому не кінецца ў вочы. І я нейкі момант стаю, слухаю людскую гаману. Але ж трэба ісці. Толькі куды? У рэдакцыю газеты? У райвыканком? Райком? Ці не здасца там дробязнай, не вартай увагі мая справа?

Зялёная, падобная на вясковую, вуліца завяла ў цэнтр. У раённым гарадку ў цэнтры звычайна сабрана ўсё: райком партыі, райком камсамола, райвыканком, рэдакцыя раённай газеты, РДК, гасцініца, рэстаран або чайная, раймаг, харчовы магазін. На вочы трапілася шыльда: «Любанскі раённы камітэт КПБ». Чаму б не зайсці сюды? Падымаюся адразу на другі наверх. Стукаюся ў дзверы да загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі. Павітаўшыся, гавару пра мэту маёй паездкі.

— Гэта цікава, — падымаецца з-за стала загадчык, Сцяпан Іванавіч Ісайка. — Мы якраз ствараем музей. Можна будзе зрабіць стэнд пра Сыракомлю — усё ж такі зямляк. Зайдзіце, калі ласка,

да першага сакратара. Я таксама зараз падыду. Памяркуем.

Да сакратара, ды яшчэ першага, сам я ісці не адважыўся б. Я ведаю, як загружаны першы сакратар райкома партыі. Але раз прапанавалі — трэба зайсці.

У прыёмнай пытаюся, ці можна.

— Калі ласка, — адказвае мне дзяўчына-сакратарка.

— А там ёсць хто?

— Ёсць людзі.

Гэта трошкі здзівіла. Я думаў, што, каб папасці да такога начальства, трэба мала ці многа, а пацерці крэслы прыёмнай. А тут — заходзь, калі ласка. На дзвярах пад шклом — шыльдачка «Слабада А. І.». Гэта — прозвішча першага сакратара. Цягну на сябе ручку дзвярэй.

— Можна?

Каля стала стаяць, схіліўшыся, трое. Штосьці абмяркоўваюць: на тварах відаць заклапочанасць. На мяне ніхто не звярнуў асаблівай увагі: заходзь, калі хочаш. Гэта неяк адразу заспакоіла, зняло напружанасць. Падышоў да стала, даў «добры дзень». Сакратар (ён стаяў за сталом) кіўком галавы паказаў на крэсла — пачакаць.

Твар у сакратара адкрыты, просты. Бровы зведзены да пераносіцы: слухае, што даводзіць яму высокі, добра апрануты чалавек, і нешта абдумвае, паціраючы рукой лоб.

Я саджуся, прыслухоўваюся. Пастунова высвятляю, пра што тут гаворка. У адной школе раёна знялі з пасады дырэктара. Знялі таму, што не зжыўся з калектывам, супрацьпаставіў яму сябе, камандаваў, груба абыходзіўся з настаўнікамі. Пра гэта настаўнікі напісалі ў райком. Разбіраліся доўга, дэталёва, гутарылі з усім калектывам. І — знялі. Хоць па паспяховасці з прыходам гэтага дырэктара школа стала адной з лепшых у раёне, за што дырэктар не раз атрымліваў прэміі. Што ж, зазнаўся. А цяпер вось прыйшоў настаўнік школы, член партыі, і даказвае, што дырэктара знялі няправільна. Ён даўно ведае яго — гэта сумленны, прынцыповы камуніст, былы афіцэр Савецкай Арміі, паспяховасць узняў... Ну, строгі, дык нельга ж без строгасці...

Я разумею сакратара, тут ёсць над чым паморшчыць лоб: справа ідзе пра людскія душы.

— Што ж, — гаворыць урэшце ён, выпростваючыся, — прыйдзецца яшчэ раз вярнуцца да гэтага. Будзем разбірацца.

Канешне, тут адным махам не перасячэш вузел: яго трэба расплятаць.

Калі настаўпік выйшаў, сакратар павярпуўся да мяне.

Я растлумачыў, што ў мяне за справа.

— Усё ясна — пасадзейнічаем, — сказаў ён коратка і,

усміхаючыся вачыма, працягнуў мне руку. — Трымайцеся яго, — кіўнуў ён на Сцяпана Іванавіча (загадчык аддзела прапаганды і агітацыі таксама быў ужо тут).

Я падзякаваў — усё, аказваецца, проста робіцца ў добрых людзей. Не ведаю чаму — мо таму, што мяне адразу зразумелі ў райкоме, але, зачыняючы дзверы з таблічкай «Слабада А. І.», я адчуў сябе як бы раскаваным, павесялеў. Пасля толькі падумалася, што Слабада Аляксандр Іванавіч да таго ж Герой Сацыялістычнай Працы.

І вось рэдакцыйны «газон» імчыць па дарозе з Любані. Са мной — фатограф раённай газеты «Будаўнік камунізма» Сцяпан Рыгоравіч Дарожка, рухавы вясёлы чалавек, і яшчэ два хлопцы — вараціліы раённай прэсы. Хлопцы ссадзілі нас па краі вёскі, а самі падаліся далей — на нейкі сход у глыбінны калгас.

Мы ідзём па Смольгаве. Акуратныя, зробленыя па-сучаснаму хаты, разгалістыя векавыя ліпы ля платоў, шырокая вуліца. У вёсцы, як я даведаўся, 60 двароў. Ёсць клуб, бібліятэка, васьмігадовая школа, фельчарска-акушэрскі пункт. Смольгаў — цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». Веска ўваходзіць — да ведама біёграфаў Сыракомлі — у Юшкавіцкі сельсавет.

Пры вуліцы будынак з белай цэглы. Гэта праўленне калгаса. Зайшлі. За сталамі — пераважна дзяўчаты.

Пытаемся, як убачыць старшыню калгаса.

— А ён толькі што паехаў дадому, у Невалаж.

Невалаж — як бы працяг Смольгава. Зусім побач.

Ну што ж, завітаем.

Іван Яфімавіч Мурашка, малады, поўнага твару мужчына, быў без пінжака, у клятчатай сарочцы.

— Вы якраз у час, малайцы, — вітаючыся, сказаў ён з усмешкай. — Я толькі збіраўся снедаць.

Пасадзіўшы нас на крэслы, Іван Яфімавіч ускінуў на плечы пінжак, узяў у рукі сетачку.

— Пачакайце хвіліну — я зараз...

Праз «хвілінку» ён зноў затупаў на ганку, а яшчэ праз «хвілінку» на стале бліснула бутэлька «Расійскай».

За чаркай і добрай старшынёўскай скваркай выдатна гаварылася пра ўсё. Калгас, як высветлілася, не лепшы ў раёне, але і не ў хвасце — «з сярэдзінкі на палавінку». Мала моладзі. Усе бягуць у горад — там, бачыце, весялей. Але астаюцца і дома, асабліва ў апошні час. Калгас памалу набірае сілы і — хто ведае? — можа яшчэ пераходны сцяг атрымае...

За сталом сядзелі нядоўга (мы з Дарожкам выпілі — для прыліку — па чарцы, гаспадар яшчэ менш: «Не магу, хлопцы, — работа»). Івану Яфімавічу трэба было з'ездзіць у раён. Нам ён

прапанаваў праехаць трохі па калгасе: якраз падкаціў да двара «газік».

Машына ішла паміж дзвюх сцен збажыны. Сапраўды, пахваліцца тут было чым. Густыя, як шчотка, ячмяні, цёмна-зялёнае, са схіленымі каласамі, жыта.

— Ураджайны сёлета год, — кажу я да старшыні. — Колькі так цэнтнераў тут будзе з гектара? Прыкладна.

— Чакаем — цэнтнераў дваццаць... А раней, гадоў некалькі назад, — было ўсяго шэсць.

— Дык добры скачок?

— Аміячная вада памагла...

Аміячная вада? Так я і паверу! Ці ж сама сабой вылілася гэтая аміячная вада на поле?

Пакалясіўшы па калгасе, мы з Дарожкам зайшлі ў смольгаўскую бібліятэку: цікава, што чытаюць на радзіме Уладзіслава Сыракомлі, які некалі, у вершы «Непісьменны», пісаў ад імя беларускага мужыка:

> Я не зайздрошчу, крый мяне божа,
> Нікому ў свеце, ніякай сіле;
> Адно зайздросна мне толькі, можа,
> Што вас, Панове, пісаць наўчылі.

Месцілася бібліятэка ў звычайнай хаце. У адной палавіне — стэлажы кніг, у другой абсталявана маленькая чытальная зала. У бібліятэцы, як расказала мне загадчыца Марыя Кузьмоўна Ермаліцкая, — 8 800 тамоў кніг, чытачоў на абанеменце — 386.

Што ж, дзіўнага тут для мяне нічога не было. Для Сыракомлі ж, канешне, які марыў аб асвеце народа, гэта была б вялікая і радасная навіна. У яго час прыгоннікі не толькі не заахвочвалі сялян да асветы, а, наадварот — забаранялі вучыцца. Больш таго, селяніна, які браў у рукі кнігу, абвяшчалі бунтаўшчыком, за гэта яго жорстка каралі. Адзін такі выпадак з болем у сэрцы апісаў Сыракомля ў сваім драматычным творы «Вясковыя палітыкі». Да пана суддзі (які, дарэчы, лічыўся яшчэ ліберalам) прыйшоў аканом са скаргай на млынара Янку, быццам той бунтуе ўсю вёску. Што ж гэта быў за бунт? Аказваецца, млынар перастаў хадзіць у карчму, пачаў адгаворваць ад гэтага іншых сялян (а гэта ж удар па кішэні карчмара і гаспадара) і ў дадатак — чытае кніжкі! Паведамленне занепакоіла пана: «Калі хлоп паразумнее — тады ўжо вядома: не пойдзе на паншчыну... Чытанне!.. Хоча быць разумнейшы за мяне! Гвалт! Сканчэнне свету!» І ён загадвае пакараць селяніпа бізунамі, каб той больш не адважваўся браць у рукі кніжку.

Так, гэта — гісторыя. Але ведаць яе, думаю, вельмі не шкодзіць. Дарэчы, у Любані я прачытаў машынапісную гісторыю Любанскага раёна. Мяне здзівіла адна рэч — гэтую гісторыю аўтары пачынаюць з 1917 года. Як быццам да гэтага не існавала Любаншчыны! Праўда, асобныя факты і лічбы дарэвалюцыйнага часу пададзены ў прадмове. Як жа можна зразумець значэнне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, не ведаючы ўсёй папярэдняй гісторыі нашай краіны, у тым ліку Любаншчыны? Думаю, мы вельмі шмат трацім у нашай выхаваўчай рабоце, забываючы многія факты айчыннай гісторыі, не выкарыстоўваючы іх у нашай прапагандзе...

Але вернемся ў бібліятэку. Да стала падышла маладая дзяўчына з сімпатычнымі ямачкамі на шчоках — абмяняць кнігі.

— Ну, ну, што чытаюць смольгаўскія дзяўчаты? — як бы між іншым, пытаюся я, заглядваючы, якія кнігі запісвае бібліятэкарка.

— А вось паглядзіце, — працягвае Марыя Кузьмоўна картку.

Папытаўшы дазволу ў дзяўчыны, гартаю лісткі. «Вецер у соснах», «Основы земледелия», «Детская болезнь левизны в коммунизме» , «Руководство для растениеводства», «Основы политических знаний», Ясенін, «Математика», Бруна Ясенскі, Стэфан Цвэйг, Брэт Гарт, Пецёфі...

— Мяркуючы па кнігах, вы — студэнтка. Адгадаў?

— Не зусім, — смяецца дзяўчына. — Я працую ў калгасе. Вучуся завочна. У Горацкай акадэміі.

— І не сумна тут, у вёсцы?

— Наадварот, Смольгава мне падабаецца.

Дарэчы, чаму Смольгава? Я звярнуў увагу, што і ў раённай газеце так пішуць. Між тым, бібліёграфы Сыракомлі пісалі Смольгаў (і як варыянты — Smolków, Smołków). Як жа правільна? На вуліцы я прыпыніў старую жанчыну. Яна аказалася старажылам вёскі. Вольга Іванаўна Масальская. Ей, як яна сказала, пайшоў «восьмы дзесятак». На пытанне, як старыя завуць вёску, адказала так:

— Заўсёды называлі вёску толькі Смольгаў. Колькі я помню — Смольгаў і Смольгаў. Я не ведаю, чаму гэта цяпер так перакручваюць — Смольгава. Так — няправільна.

У яе голасе я адчуў незадаволенасць.

Значыць, гэта час змяніў, «абкатаў» назву. Так, як мора абкатвае камяні.

Але ці толькі час? Вельмі часта і ў нас саміх праяўляецца гэты неадольны сверб — мяняць, «прыхарошваць» геаграфічныя назвы. Пры гэтым мы забываем, што кожная пазва вёскі, горада, ракі, возера, нават малога ручая — гэта своеасаблівы гістарычны помнік. Многія з назваў узніклі вельмі даўно, яшчэ задоўга да

ўзнікнення пісьма, і з'яўляюцца адзінымі моўнымі сведкамі далёкіх часоў. Аналізуючы іх, чытаючы гэтую «мову зямлі», вучоныя вельмі шмат могуць даведацца і расказаць нам пра далёкае мінулае нашай бацькаўшчыны, пра тое, якія народы засялялі яе ў самыя розныя эпохі, пра гаспадарку, заняткі, культуру, мову нашых далёкіх продкаў.

Археолагі ва ўсіх канцах свету перакопваюць сёння горы зямлі, каб адшукаць у яе глыбіні маленькі гліняны чарапок. Кожны такі чарапок старанна ачышчаюць ад пылу, фатаграфуюць, беражліва пераносяць у кабінеты вучоных, у музеі. Ён — дарагі сведка мінуўшчыны. Можа, гэта якраз той ключык, які адамкне дзверы ў непазнаны дагэтуль дзівосны свет.

Гэтакія ж сведкі далёкіх тысячагоддзяў і геаграфічныя імёны. І чым лепш яны захаваюцца, чым меней будуць зменены, «адшліфаваны», тым больш каштоўным матэрыялам будуць яны для навукі. Да таго ж, на іх адшуканне не трэба траціць столькі сродкаў, працы, колькі траціцца на археалагічныя раскопкі. Геаграфічныя імёны на паверхні. Іх трэба толькі зберагаць.

У Смольгаве ніхто, каго я ні пытаў, не адказаў мне, адкуль узялася назва вёскі. А яна ж пра нешта расказвае, гэтая назва. Расказвае кожны дзень, ужо не адно стагоддзе. А мы ўсё не разумеем. Можа яна расказвае пра тое, што калісьці, магчыма, некалькі вякоў назад, нехта тут смоль гнаў? Гэта толькі мае асабістае, неабгрунтаванае меркаванне. А знойдзецца ж даследчык, які, магчыма, дакажа гэта. І, даказаўшы, раскрые цэлую старонку ў жыцці народа, невядомую нам сёння.

Мы з Дарожкам абышлі ўсю вёску. Я папрасіў яго сфатаграфаваць агульны яе выгляд, але веска была такая раскіданая, што ніяк не ўлазіла ў аб'ектыў. Дарожка палічыў, што трэба зняць хоць вуліцу з асобнымі, вядома, лепшымі, дамамі, пераважна цаглянымі (там сапраўды ёсць такія). Але як ён ні прымяраўся, добрага краявіду не мог выбраць. Дарожка сігануў цераз плот, пачаў пстрыкаць фотаапаратам адтуль. Але яшчэ загвоздка — вуліца была бязлюдная, усе якраз у полі. Пустую вуліцу здымаць нецікава. Дарожка знайшоў трох хлапчукоў. Двух пасадзіў на лаўку, трэцяга паставіў перад імі: «Гавары ім што-небудзь ды руку выцягні ўперад». Хлопчык ненатуральна выцягнуў руку і так — у напружанні — трымаў яе, пакуль Дарожка не закончыў фатаграфаваць. Ужо калі я вярнуўся ў Мінск, ён прыслаў мне здымкі. Вось і той хлапчук, што трымае (і як яму не балела?) ненатуральна выцягнутую перад сабой руку. У пісьме Дарожка папісаў: «Мусіць, чаго нам хацелася, не дасягнулі».

Дарэчы, веска Смольгаў, як я даведаўся з кнігі С.

Александровіча «Па слядах паэтычнай легенды», цікава яшчэ тым, што гэта ж тут, аказваецца, была тая жаданая «новая зямля», пра якую так марыў Міхал — бацька Якуба Коласа, прататып выдатнай паэмы. На гэтую зямлю, якую з такой цяжкасцю давялося купіць у Хадыкі («ядзяць іх мухі з камарамі!»), так і не перабралася сям'я Міхала, хоць Антось і прыязджаў яе засяваць. Яна назаўсёды засталася ў паэме як сімвал неажыццявімай пры панскім ладзе мары хлебароба аб вольным жыцці. Па сутнасці, у паэме Якуба Коласа «Новая зямля» ідзе гаворка пра зямлю, якую ў першай чвэрці мінулага стагоддзя арандаваў Аляксандр Кандратовіч і на якой нарадзіўся Сыракомля.

Таму, ходзячы па вуліцах і сцежках Смольгава, я з падвоенай увагай глядзеў на магутныя дрэвы прысадаў, на шырокія хвалі неспакойнага жытнёвага мора, што налівалася і спела пад шчодрым ліпеньскім сонцам, па чыстыя асфальтаваныя дарогі, па якіх няспынна спавалі машыны. Цяпер сапраўды гэта была — новая зямля.

СЛЯДАМІ ЛЕГЕНДЫ

З сівых вякоў. Адрас-Дзякавіцкія лясы. Літаратурная размова. Кніга пад назвай «Палессе». Была такая вёска. Буслянка на воданапорнай вежы. Усе ў Розе. Хмара над возерам. Парада ў старшыні калгаса. Валя і Лёня. Люсін Крым. Прабач, Князь-возера. Агонь і лёд. Партызанскі камісар. Пажар у вачах Хаўронні Іванаўны Хаміцэвіч. Драчова-Драчава. «Ну, та-ата!» Двойчы ўрочышча Хадыка. Сведка мінулага — лес.

Далей мой маршрут ішоў у глыбіню Палесся. Мне даўно рупіла пашукаць там невялікае лясное ўрочышча, якое дало назву аднаму з самых паэтычных твораў Уладзіслава Сыракомлі, паэме — або, як сам аўтар называў яе, гавэндзе — «Хадыка». У прыпісцы да першай яе публікацыі ў 1848 годзе аўтар паведамляў, што заснаваны твор на народным паданні пра пасеку Хадыка, што на Палессі, у акружнасці Дзякавіцкіх лясоў.

Паэма «Хадыка» ў перакладзе Максіма Лужаніна друкавалася некалькі гадоў назад у «Полымі», потым яна ўвайшла ў кніжку перакладаў выбраных твораў Сыракомлі. Чытачы, напэўна, помняць яе сюжэт. У Слуцкім замку, дзе мясцовы ваявода правіў суд, з'явіўся раптам, расштурхваючы людзей, увесь аброслы,

абшарпаны старац. Зняможаны і задыханы, ён упаў перад суддзёй. Аддыхаўшыся, загаварыў праз плач. Ён з Палесся, завуць — Хадыка. Быў асочнікам звяроў, меў у лесе хаціну. Аднойчы паклікаў яго ў двор пан лоўчы і паведаміў, што на паляванне прыбудзе сам Сапега вяльможны («гэта гетман літоўскі, не жарты, васпане»). Трэба асачыць мядзведзяў, абкружыць. «Будзь пільны і жвавы, — наказваў лоўчы асочніку. — Каб пад кулю яму зверына выбягала...» Але Хадыка, атрымаўшы наперад грошы, загуляў. Калі ж спахапіўся, астаўся адзін дзень да прыезду гетмана, а мядзведзь, як на тое, сышоў з пушчы. І вось: «Трубіць гучна аблава, страляе, гукае», — а мядзведзя няма. Так і паехаў ні з чым гетман, пры гэтым добра аблаяў лоўчага. Лоўчы сваю злосць рашыў спагнаць на асочніку. «Падхапілі мяне, — расказвае стары, — прывязалі да дрэва, лупцавалі гарапнікам з тоўстага дроту, падплываў я крывёю ад панскага гневу». Але не са слабых духам быў Хадыка. «Меў за дзягай тапор і, хоць вельмі знясілеў, засвяціў між вачэй таму пану абухам». Вядома, што чакала ў той час селяніна, які адважыўся ўзняць руку на пана. Хадыка ўцёк у пушчу. Там, у непраходнай палескай глушы, зрабіў ён сабе ў дупле агромністага дуба бярлогу. У гэтай бярлозе, хаваючыся ад людскога вока, пражыў ён — не многа не мала — трыццаць гадоў. Уся асноўная частка паэмы — гэта паэтычны расказ пра жыццё Хадыкі сярод векавечных лясоў Палесся. Як здабываў ён там ежу; як навучыўся разумець прыроду — птушак, звяроў, дрэвы; як, злавіўшы ў лесе пчаліны рой, памалу развёў цэлую пасеку; як яна, гэтая пасека, праца з пчоламі, памагла яму выжыць у адзіноце столькі гадоў. Пад старасць, расказваецца ў паэме, не вытрымаў Хадыка. Надта ж захацелася яму пабачыць людзей, аблічча якіх пачаў ужо забываць.

«Усіх людзей схапіў бы я ў абдымкі», — расказваў стары. І вось ён — у Слуцкім замку: судзіце... Заканчваецца паэма так:

Не ведаю, які быў дзень той судны,
Ды звапары са Слуцка мне казалі,
Што ў кляштары памер стары прыблудны,
Якога, быццам бы, Хадыкам звалі.

...А між бароў, сярод імшары дзікай,
Дасюль вядзецца пасека лясная,
Багата дзіў аб ёй апавядаюць
І называюць гэтак жа — Хадыка.

Прыгожая, чыста беларуская, з сівых вякоў легенда. Нечым падобная на паданне пра Машэку. Але ці існавала сапраўды такая

легенда? Можа, гэта толькі прыгожая кветка паэтычнай фантазіі? Усё гэта трэба даказаць. А каб даказаць — неабходна пашукаць легенду. Праўда, з таго часу, як мог чуць яе Сыракомля, прайшло сама меней 122 гады. За гэты час не адно пакаленне людзей змянілася на той зямлі. Але ж народныя паданні і легенды, як сцвярджаюць фальклярысты, жывуць доўга, яны пераходзяць з вуснаў у вусны, з пакалення ў пакаленне. Тым больш легенды тапапімічныя. Ва ўсякім разе, хай не сама легенда, то хоць бы назва ўрочышча, ды павінна ж захавацца, калі яно сапраўды існавала. Праўда, адшукаць нейкае маленькае ўрочышча, ды яшчэ ў глухіх бясконцых лясах, мусіць, нялёгкая задача. Ну, а ўсё ж? Адрас жа ў мяне ёсць — Дзякавіцкія лясы.

Дзякавічы я знайшоў на карце. Гэта веска ў Жыткавіцкім раёне. Каля самай большай ва ўсім Палессі блакітнай плямкі з надпісам «Чырвонае» — легендарнага Князь-возера, якое, дарэчы, таксама апісана ў паэме Сыракомлі.

Значыць, спачатку еду ў Дзякавічы. Тым больш, што недзе там, на Палессі, павінна быць і вёска Яскавічы, куды разам з сям'ёй, ва ўзросце, здаецца, аднаго года, пераехаў са Смольгава будучы паэт.

У пакоі адміністратара любанскай гасцініцы сядзелі тыя, каму не хапіла месца. Што ж, гэта не дзіўна: гасцініца ў Любані старэнькая, драўляная, на 24 ці 26 чалавек. Але ўсё ж я назваў бы яе гасцініцай у поўным сэнсе гэтага слова. Мне нямала даводзілася бываць у раённых і абласных гасцініцах. Як часта ўжо з парога цябе сустракалі халодныя, нерухомыя, далека не гасцінныя вочы, якія самі гаварылі: «Месцаў няма». Да адміністратара з такімі вачыма не падыходзь: усе твае просьбы, усе твае довады адскокваюць ад яго, як ад сцяны гарох. Начуй хоць пад плотам — яго справа малая. Тут жа было інакш. Невысокая шчуплая жанчына, загадчыца, не засланялася ад мяне бранябойным шчытом з гэтых двух штампаваных слоў: «Месцаў няма». Яна толькі паморшчыла лоб. Памаўчаўшы з хвіліну, сказала: «Пакуль усе месцы занятыя. Прыйдзецца вам пачакаць — пад вечар нешта прыдумаем». І вось, чакаючы, што прыдумае нам загадчыца гасцініцы, сядзім: вельмі гаварлівая жанчына гадоў трыццаці з вялікім падбародкам — інспектар нейкай санстанцыі, мужчына ў замусоленай куртцы, «пад мухай», здаецца, шафёр; маладая дзяўчына з Далёкага Усходу — студэнтка дарожнага факультэта політэхнічнага інстытута (прыехала сюды на практыку — пракладваць дарогі); капітан міліцыі з Мінска; загадчыца гасцініцы і я — вось больш-менш пастаянны сёння «экіпаж» адміністратарскага пакоя. Гаворка ідзе на самыя розныя тэмы. Пра гасцінічныя справы, пра злачыннасць, санітарыю, пра тое, як

кормяць у рэстаранах і сталовых, пра навуку і вучоных, нарэшце — пра літаратуру.

— Няма ў нас цяпер сапраўдных пісьменнікаў, — катэгарычна заяўляе шафёр. — Такіх, як Пушкін, Лермантаў.

— Як гэта няма? — падхопліваецца жанчына з санстанцыі.

— Ну, хто? Назавіце...

— Хаця б Шолахаў...

— Ну, дапусцім... Л яшчэ?..

— Юрый Герман...

— А Роберт Раждзественскі, Эдуард Асадаў? — падымае ад кніжкі вочы студэнтка з Далёкага Усходу. — Чым дрэнныя паэты?

Шафёр толькі ўсміхаецца: не пераканалі.

Я таксама ўмешваюся ў гаворку: мне здалося, што ў шафёра свой густ, свой падыход да літаратуры. Называючы асобных, найбольш выдатных, на маю думку, пісьменнікаў, стараюся давесці, што нашай — як усесаюзнай, так і беларускай — літаратуры ўсё ж ёсць чым ганарыцца.

Але шафёр стаіць на сваім:

— Усё гэта не тое...

Мы пачынаем падазраваць, што ён проста нічога не чытае, а спрачаецца толькі каб падражніць нас, і пераводзім гаворку на другую тэму.

Я больш слухаю. І то не з увагаю — пятае цераз дзесятае. Я жыву ўжо сваім далейшым падарожжам. Каб даведацца, як дабірацца ў Дзякавічы, іду па аўтастанцыю. У дыспетчарскай сказалі: трэба ехаць да вёскі Абоз. Аўтобус «Любань — Абоз» ідзе роўна ў 9 гадзін раніцы. Як ехаць далей — не ведаюць. Можа, спадарожнымі. Машыны там хадзіць павінны, бо ў Абозе, хоць вёска і Любанскага раёна, — Жыткавіцкі леспрамгас. Леспрамгас? А можа, гэта якраз тое, што мне трэба? Хто ж лепей ведае лес, як не работнікі лесу? Ну, што ж, астаецца толькі добра адпачыць перад дарогай.

Вечарам загадчыца гасцініцы ўсё-такі нас усіх парастасоўвала — каго ў нумар, каго на калідор, каго ўладкавала проста на прыватнай кватэры непадалёку. Нават вясковаму дзядзьку з малым хлопчыкам знайшлося месца па раскладушках на калідоры. Дзядзька быў вельмі давольны: раскладушкі — яму і сыну — паставілі побач, галава к галаве. Малы, зашыўшыся над коўдру з падбародкам, пасопваў посам каля самай бацькавай галавы.

Мне знайшоўся ложак у нумары. У пакоі — утульна, халадок. Стол засцелены чыстым беласнежным абрусам. На ім — графін з вадой, шклянка. У калідоры нехта пранёс транзістар. Я ўлавіў голас дыктара: «...У наступныя два дні тэмпература паветра будзе

24-27 градусаў цяпла, вецер умераны. На поўдні Беларусі — кароткатэрміновыя дажджы, часамі з навальніцамі...» Значыць, еду заўтра проста пад дождж...

Раніца была ясная, рэдзенькі туманок (ці мо дым?) слаўся, ужо асвечаны сонцам, па сіўцовых паплавах і канавах. З травы дарожнай абочыны — перад самым носам аўтобуса — узляталі павольныя вароны і чародкі шэрых маладых шпачкоў. Перада мной разгортвалася — старонка за старонкай — найцікавейшая жывая кніга, назва якой «Палессе». Толькі чытай. Праўда, з акна аўтобуса яе не прачытаеш. Гэта толькі перагортванне яе, разглядванне малюнкаў. Каб чытаць яе, трэба пачуць пад нагамі трывалую цвердзь дарогі, халадок травы...

Аўтобус прыпыніўся ў саўгасе «10 год БССР» — тым славутым саўгасе, пра які пісаў у паэме «Над ракой Арэсай» Янка Купала. Шафёр пабег у сталоўку — значыць, аўтобус пастаіць. Я выйшаў на вуліцу размяцца. Абапёрся рукамі на штыкетнік. Па двары тупаў пажылога веку дзядзька. Каля хлява ляжала куча граверу, знятыя з крукоў дзверы, у праёме відаць быў сталярны станок з дзвюх дошчак, стружкі. Дзядзька неўзабаве падышоў да мяне, таксама палажыў на штыкетнік локці. Разгаварыліся. Дзядзька робіць прыбудоўку да хаты, склеп. Але нестае лесу, цэменту... Мы не дагаварылі: да кабіны падышоў шафёр, адчыніў дзверцы. Я хацеў развітацца з дзядзькам, але ён таксама, накульгваючы на адну нагу, накіраваўся са мной да аўтобуса.

— Дык вы таксама едзеце? І куды?

— Да Абоза.

— Раз так, то давайце, дзядзька, сядзем разам — і я ж да Абоза.

Мусіць, ужо мне трэба, падумаў я, дапытвацца пра тое, дзеля чаго еду. Гэта ж тут недзе пачынаюцца тыя лясы. Буду распытваць усіх, з кім толькі давядзецца загаварыць. Пачну якраз з гэтага дзядзькі. Хай, можа, ён не ведае пра нейкае там урочышча з назвай Хадыка, дык хоць параіць, дзе яго шукаць. Але дзядзька нечакана адказаў:

— Хадыка? Ведаю — была такая веска...

— Як? Веска? І — была?

— ...Яе спалілі немцы.

— Як спалілі? — усё яшчэ не разумею я.

— Як... Не ведаеш, як палілі немцы вёскі. Прыйшлі, сагналі ўсіх у адну хату — і спалілі. І людзей, і вёску.

— І веска называлася Хадыка?

— Хадыка.

Вось як, аказваецца, павярнулася справа з прыгожай, з сівых вякоў легендай. Трагедыя асочніка Хадыкі адступіла раптам недзе

на задні план перад навейшай, непамерна большай трагедыяй — вёскі Хадыкі, трагедыяй, так знаёмай кожнаму беларусу.

— Скажыце, а як туды ехаць?

— Гэта — у Даманавіцкім сельсавеце... Лепш за ўсё вам вярнуцца назад, у «10 год БССР». Адтуль на Даманавічы ідзе аўтобус.

Аўтобус скакаў цяпер па тоўстых каранях, што перапляталі дарогу. Аб вокны шаргацелі калючыя сасновыя галіны, білі шышкамі. Усё ж у мяне было жаданне вылезці і пайсці назад, у «10 год БССР», каб хутчэй трапіць на месца тых дзвюх трагедый. Але чаму назад? У Сыракомлі ж ясна сказана: Хадыка — у акружнасці Дзякавіцкіх лясоў.

— Дзядзька, дык веска была не ў Дзякавіцкіх лясах?

— Не, у Даманавіцкіх.

Можа, гэта зусім не тое месца, якое я шукаю. Тым больш, што Хадыка, як сведчыць легенда, толькі невялічкая палянка ў лесе. Значыць, каб высветліць гэта, трэба ўсё ж з'ездзіць у Дзякавічы.

— А з Дзякавіч я дабяруся да Даманавіч?

— Не ведаю, аўтобусы там не ходзяць. Гэта — другая вобласць...

Усё ж я вырашыў канчаткова — паеду спачатку ў Дзякавічы. А там відаць будзе. Спяшацца тут няма чаго, час пакуль што ў мяне ёсць.

Мінулі лясную вёску Забярэзнік, і вось, нарэшце, канцавы пункт — Абоз, таксама сярод лесу. Веска Абоз разам з назвай узнікла нядаўна, пры Савецкай уладзе. Недалёка адсюль быў леспрамгас у вёсцы Пасталы. На месцы ж цяперашняй вёскі Абоз раней была стаянка коней, якімі тралявалі да Пасталоў лес, іншымі словамі — тут быў абоз. Ён і даў назву вёсцы, якая наўзабаве тут утварылася. Да гэтага ж тут, на лясной палянцы, быў хутар, у ім жыў нейкі Жыцька, якому (гэта было яшчэ да рэвалюцыі) пан за добрую службу даў тры гектары зямлі з лесам: карчуй і жыві сабе. Жыцька абжыўся тут.

Пра ўсё гэта мне расказаў той жа дзядзька, з якім я ехаў і які разам са мною сышоў у Абозе. Дабіраўся ён да свайго брата, лесніка, які жыве ў вёсцы Буда — два кіламетры ад Абоза (ці не расстарацца лесу?). Каб трапіць у Дзякавічы, мне таксама трэба было ісці да Буды — адтуль могуць быць машыны. Ды, кажуць, і аўтобус раз у суткі ідзе на Жыткавічы. Нам ізноў было па дарозе. Але, перш чым ісці ў Буду, я з дзядзькам зайшоў у кантору леспрамгаса— можа, туды, у Жыткавічы, ідзе якая машына. Але ў канторы толькі сядзела за лічыльнікамі жанчына. Ні начальства, ні машын цяпер тут не было — усе ў лесе. Можа, гэта і лепей — пойдзем да Буды пеша.

Ішлі вузенькай, але добра ўбітай лясной сцежкай. Паабапал віліся, у тым жа кірунку, другія сцежкі — каровіныя. На купінах ля самых ног сінелі на зялёных галіначках ягадніку спелыя чарніцы — толькі нагінайся ды кладзі ў рот. І я з асалодай смакаваў халаднаватыя ягады. Дзядзька ж на іх і не глядзеў — тут гэта, відаць, не навіна.

— Што ў вас з нагой, дзядзька?

Я папытаў і з няўпэўненасцю паглядзеў на яго: можа, пытанне нетактоўнае? Але дзядзька, памаўчаўшы, адказаў як бы з неахвотай:

— Параніла.

Мусіць, бачачы, што я не задаволіўся адказам, дадаў:

— Гэта яшчэ ў дзевятнаццатым годзе. Я служыў тады ў чэка, у Ленінградзе.

Я папрасіў дзядзьку расказаць, пры якіх усё ж абставінах яго параніла.

— Пры звычайных абставінах, — сказаў дзядзька...

Іх, дзесяць маладых байцоў-чэкістаў, паслалі ў вёску — там засела група белабандытаў, афіцэраў. Прыехалі туды ноччу. Афіцэры адбіваліся гранатамі — вінтовак у іх не было. Падаспела якраз на машыне другая група чэкістаў — падмога. У гэтым баі яго і параніла. Афіцэраў тады палавілі і, дапытаўшы, парасстрэльвалі. Дзядзька расказаў яшчэ, як тады было цяжка. Галадалі — хлеба не было. Пяклі хлеб з аўса: як ясі — ажно колюцца асцюкі. Да таго ж, быў ён цвёрды і гарэніў... Калі ён прыслаў такога хлеба дадому і там кінулі яго сабаку, то і сабака не ўзяў: панюхаў, панюхаў і адышоў.

За лесам адразу расло жыта, трохі далей відаць былі стрэхі хат. У вочы кінулася воданапорная вежа з буслянкай наверсе. На ёй стаяў бусел ці, відаць, бусліха, парадкуючы нешта сваёй доўгай дзюбай у гняздзе. Я пашкадаваў, што ўсё яшчэ не абзавёўся фотаапаратам. Можна было б зрабіць цікавую кампазіцыю пад назвай «Палескі пейзаж».

У вёсцы — ніякага руху, толькі куры грабуцца ў пяску каля платоў. Усе, вядома, на працы, на сене. Адны дзеці відны дзе-нідзе ў акне замкнёнай хаты. Але вунь і дарослы чалавек на лавачцы. Падыходзім да яго з дзядзькам.

— Скажыце, калі ласка, як заехаць у Дзякавічы?

— А я таксама туды, — адказаў малады чалавек. Каля яго стаяла чорная напакаваная сумка з замком «маланка». — І таксама не ведаю, як заехаць. Аўтобус на Жыткавічы будзе толькі вечарам. І ідзе ён не праз Дзякавічы, а бокам. Так што трэба чакаць якой машыны.

— Ну, што ж, пачакаем, удваіх весялей, — сказаў я і,

падзякаваўшы дзядзьку за тое, што правёў мяне ў Буду, прысеў на лаўку.

Малады чалавек быў таксама з Мінска, з Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі. Едзе ў камандзіроўку ў Дзякавічы. Там яго павінны чакаць таварышы — яны ў Дзякавічах ужо даўно. Даследуюць мясцовасць, вымяраюць паверхню перад асушкай балот.

Чакаць, на наша прыемнае здзіўленне, давялося няшмат. На вуліцы паказалася машына, крытая. Галаснулі. Машына спынілася, і шафёр сказаў, што едзе ў Дзякавічы. Лепей і не прыдумаеш.

Мінут сорак гоцання па каранях дрэў і дарожных выбоінах — і мы ў Дзякавічах. Вёска вялікая — мы даволі доўга яшчэ ехалі вуліцай. Праз акенца відаць былі хаты, правільней — сцены хат. На кожнай сцяне — пасярэдзіне — прыбіты дошчачкі. На адной сцяне — дошчачка з надпісам (мусіць, вугалем) «вядро», па другой — «лапата», на трэцяй — «багор». Перад вачыма так і мільгацелі: «вядро» — «лапата» — «багор», «вядро» — «лапата» — «багор», «вядро» — «лапата» — «багор»...

Машына — гэта была «тэхпомач» — высадзіла нас у цэнтры сяла. Тут, на прасторным двары-стадыёне, — двухпавярховы драўляны будынак Дома культуры, у якім таксама праўленне калгаса «Кастрычнік», Дзякавіцкая сельская бібліятэка. Побач з Домам культуры — невялікі дамок: «Выканаўчы камітэт Дзякавіцкага сельскага Савета Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці». За вуліцай, насупроць, — магазін.

Мой спадарожнік пайшоў шукаць сваіх, я ж накіраваўся ў праўленне калгаса. У канторы за сталамі — дзве зусім маладзенькія дзяўчыны і пажылая жанчына. На пытанне, як мне пабачыць старшыню калгаса, адказалі амаль хорам:

— Паехаў у Рог.

— Рог?

— Гэта так называюць урочышча нашы сенакосы.

— А сакратар партарганізацыі?

— І ён там.

— Ну, а камсорг?

— Усе сёння ў Розе. Ужо тыдзень, як туды паехалі касцы. Сёння павінны кончыць касіць. Прыедуць вечарам, а можа, уночы.

Я — цераз двор — накіраваўся ў сельсавет: трэба ж забяспечыць сабе начлег.

Тузануў дзверы з шыльдачкай «Старшыня» — зачынены.

— Старшыня сельсавета тут, — наказала жанчына на дзверы, з якіх выйшла.

Папрасіўшы дазволу, увайшоў у пакой. Там за сталом сядзела

толькі маладзенькая дзяўчына. Пажартавалі са мной, ці што?

— Я хачу ўбачыць старшыню сельсавета...

— Я — старшыня, — адказала нечакана дзяўчына.

Пазнаёміліся. Зваць яе — Лідзія Ігнатаўна Чаркас. Неўзабаве ў пакой зайшла зноў такая ж маладая дзяўчына (ці мо я ўжо так пастарэў, што ўсе здаюцца маладымі?). Гэта новы завуч школы — толькі што скончыла Мазырскі педінстытут.

— Значыць, тут дзяўчаты ўзялі ўсю ўладу ў свае рукі? — пажартаваў я.

— Выходзіць, так, — смяецца Ліда Чаркас. — Тут нас многа.

Пасядзеўшы ў сельсавеце, выйшаў на вуліцу: усё роўна з начлегам цяпер нічога не атрымаецца — усе на сене. «Падыдзіце вечарам — нешта знойдзем», — сказала старшыня сельсавета.

На адным двары я ўбачыў старую жанчыну і дзядка з рэдзенькай белай бародкай. Я папытаў у іх, ці ведаюць яны такое ўрочышча — Хадыка.

Дзядок пачухаў галаву.

— У нас тут няма такога...

— А я недзе чула, — сказала жанчына. — Па-мойму, гэта сяло... Туды — за Пісаравічы...

Я пытаў пра Хадыку і ў іншых людзей. Усе ў адзін голас адказалі мне, што паблізу Дзякавіч урочышча пад назвай Хадыка няма. Значыць, веска Хадыка, якую спалілі немцы, якраз і ёсць тое месца, пра якое пісаў Сыракомля, і затрымлівацца тут няма сэнсу. Пераначую і — на Даманавічы. Толькі як мне туды дабрацца? Аўтобусы ж у той бок не ходзяць. Надзея толькі на старшыню калгаса — калі не сёння, то заўтра раніцай ён, як мяне запэўнілі, павінен вярнуцца з Рога.

Да вечара было далекавата. Можна яшчэ схадзіць па Князь-возера — я даўно марыў пабачыць яго, самае вялікае возера Палесся, пра якое складзена столькі легенд. Да яго ад Дзякавіч, як мне сказалі, кіламетры тры.

Дарога ішла полем — на ім цвіла бульба, далей калыхалася жыта. За полем, удалечыні, сінеў лес. Сонца ішло ўжо да захаду, хоць было яшчэ высока і добра прыпякала. На паўдарозе мяне заманіў пад свой цень шырокі дуб. Тут я як знайшоў той брусок сала з хлебам, што — на ўсякі выпадак — загарнуў дома ў газету.

Паляжаўшы ў траве, рушыў далей.

Але нечакана пачуў збоку вуркатанне — мо самалёт? Паглядзеў — аж на неба, пачынаючы ад жыта, якое чамусьці пабялела, насоўвалася цёмна-сіняя, без прасветлінкі, хмара. Па ёй паласнула маланка.

Не ведаю, як каго, а мяне навальніца заўсёды неяк узрушае. Я не раз, асабліва ў дзяцінстве, трапляў пад яе разгул. Льюць,

лупцуюць па спіне, па твары, па галаве халодныя вадзяныя пугі, недзе зусім побач б'юць — аж закладае ў вушах — грамавыя гаўбіцы. Здаецца, вось-вось расколецца напалам зямля. Але ты, не эважаючы ні на што, смела ідзеш, мокры з галавы да пят, і на ўсе грудзі гарланіш, стараючыся перакрычаць навальніцу, дзёрзкую вясёлую песню, песню радасці — ад таго, мусіць, што вось спусцілі на цябе ўсё неба, усю яго ваду і агонь, цаляючы ў цябе, бухаючы з усіх гарматных ствалоў, а ты ўсё яшчэ жывы, і ніякі чорт цябе не бярэ!

А што, калі і цяпер, забыўшыся на ўсё, пайсці пад грымоты навальніцы? Сустрэць яе на самым беразе Князь-возера, каб яшчэ раз адчуць тую шалёную радасць найцяснейшага збліжэння з прыродай? Я нават прайшоў колькі крокаў далей, да возера, але хутка халодная развага ўзяла верх над гарачым парывам. Я змокну, а дзе сушыцца? Не, мусіць, такая рамантыка не для мяне.

Пакуль я ішоў назад, у Дзякавічы, хмара распаўзлася на асобныя шматкі, схавалася за даляглядам. Яна толькі сыпанула на дарогу рэдкімі кроплямі, нават не прыбіўшы пыл. Ну, што ж, усё правільна: з вялікага грому — малы дождж.

Ужо вечарэла, і мы з Лідай Чаркас пайшлі шукаць кватэру. Стукнулі ў адну хату — замок, у другую — таксама: усе яшчэ на рабоце. Цераз зялёны лужок з гусінымі лужынамі падышлі да трэцяй хаты.

— Валя! — гукнула Ліда ў вароты.

Валя — сімпатычная танклявая дзяўчына, здаецца, крыху маладзейшая за Ліду — выйшла з варот. Ліда растлумачыла, чаго мы прыйшлі.

— Пераначаваць? Чаму ж не — можна. Заходзьце.

— Ну, вось і добра, — сказала з палёгкай Ліда, — У іх месца досыць — жывуць удваіх з мужам. Яго пакуль няма дома, але нічога — ён не раўнівы, — усміхнулася дзяўчына.

Валя мяне ўжо бачыла, калі я заходзіў у праўленне калгаса. Яна — загадчыца бібліятэкі. Сядзіць там, на галубятні, са сваімі кнігамі.

Зайшлі ў хату. Валя пасадзіла мяне на канапу, дала з этажэркі стос «Раман-газеты», часопісы.

— Вы тут пасядзіце, а я згатую што-небудзь паесці.

Пры гэтым яна ўсміхнулася. Наогул, Валя вельмі вясёлая. Што б ні сказала, ніколі не забудзе ўсміхнуцца. Гэтак міла, непасрэдна.

Варачы на керагазе бульбу, яна заглядвала з кухні да мяне («Вы тут не сумуеце?»), прысаджвалася на канапу і ўсё расказвала — пра сваю работу, пра сваё, новае для яе, сямейнае жыццё.

— А будуць дзеці — яшчэ весялей стане, — устаўляю я слова.

— Ага, будуць, — падхапіла яна і засмяялася.

Я зразумеў яе.

— А ў вас дзеці ёсць? — панытала яна.

— Ёсць таксама, — адказаў я. У мяне гэтае «таксама» вырвалася міжволі. І, можа, недарэчы? Я паглядзеў на Валю. Але яна не звярнула на гэта ніякай увагі: значыць, усё правільна!

У хату заскочыла, кусаючы агурок, кірнаносая рыжуха гадоў пятнаццаці. За ёю хавалася, выціраючы брудным рукавом пад носам, малое хлапчанё — з гэтакай самай рыжай галавой. Гэта, сказала Валя, сястра і брат Лёні — яе мужа. Хата яго бацькоў побач — за агародам. Маладажонам гэта вельмі дарэчы: у іх з бацькамі пакуль што ўсё агульнае — і малако, і скварка... Цераз бульбу ідзе сцежка, якая злучае новую сям'ю са старой. Але ў маладажонаў ужо ёсць свае планы, як стаць на ногі. Яны збіраюць памалу грошы на свой дом (гэтая хата — не іх, яны яе наймаюць). А сабраць можна: абое ж кожны месяц нешта прыносяць у хату: і яна, і Лёня, які робіць механікам у калгасе, у рамонтнай майстэрні...

Павячэраўшы, мы пайшлі да Дома культуры. Каля сельсавета курылі мужчыны. «Вярнуліся з Рога», — сказала Валя. Я накіраваўся да праўлення калгаса. Мяне нагнаў невысокі малады мужчына. Гэта быў парторг. Яму ўжо расказалі пра мяне. Быццам прыехаў з Мінска карэспандэнт, па чыёйсьці скарзе. Я ўсміхнуўся — у мяне ўжо да гэтага пыталі: «Вы па пісьме прыехалі? Наскардзіўся хто?» Я заспакоіў парторга, што ніякай скаргі я не ведаю: проста заехаў у Дзякавічы пацікавіцца, як жывуць тут людзі, магчыма — напісаць пра гэта.

— Тады мо зойдзем у кабінет, пагаворым, што вас цікавіць, — прапапаваў ён.

— Ну, што ж, давайце зойдзем.

— Пятровіч! — гукнуў ён у той бок, дзе гаманілі мужчыны.

Да нас падышоў высокі, шыракаплечы мужчына-здаравяка. Гэта быў старшыня калгаса Кароткі.

— Ну, што ж, зойдзем пагаворым, — сказаў ён, калі мы пазнаёміліся, і, бразнуўшы ў кішэні ключамі, накіраваўся да Дома культуры.

Адчыніў дзверы кабінета, сеў за свой стол, сабраў паперкі, што ляжалі пасярод стала, і стосікам палажыў збоку.

— Я гатоў. Чым магу служыць?

Я паўтарыў тое, што казаў парторгу, і дадаў, што, вядома, мне цікава было б ведаць і пра калгас увогуле, пра гаспадарку...

— Ясна. Зараз паклічам брыгадзіраў — яны вам усё пабрыгадна выкладуць, — сказаў ён і гукнуў у акно.

Зайшлі брыгадзіры, селі з парторгам пры сцяпе, дзе стаяў рад

крэслаў, — якраз насупроць мяне. Неўзабаве да іх далучылася і Валя Чаркас, старшыня сельсавета. Так што — хоць пачынай нараду калгаснага актыву: усе ў зборы. Ды гэта, мусіць, і была маленькая нарада, лятучка на тэму: «Як лепш расказаць мінскаму карэспандэнту пра калгас».

Старшыия сказаў, што хваліцца пакуль няма чым. Ён тут не вельмі даўно. Быў сакратаром райкома партыі, сюды накіравалі на ўмацаванне. Але падняць гаспадарку нялёгка. І асноўная прычына — гэта Князь-возера.

— Праз яго мы ніяк не можам дабіцца дазволу на асушку балот. Я быў у другіх калгасах, дзе ўсё асушана, дык гэта ж любата: возьмеш у рукі сена з тарфянікаў — ну што чай. Даць бы нам такое сена — было б зусім іначай. Мы дзержым жывёлу на адных дзікіх травах, на асацэ. Карова толькі з гора яе есць. А што значыць скасіць гэтую асаку, выцягнуць з балота — там жа вады па пояс. Во сёння прыехалі адтуль — два тыдні, не вылазячы, сядзелі ў балоце. Але зрухі ўсё ж у нас ёсць. Балота асушваць ужо дазволена. Праблему захавання возера вырашылі — вада ў яго будзе паступаць з каналаў праз трубы. Так што і балота будзе асушана, і возера астанецца. Гэта я ўнёс такую прапанову...

Потым старшыня «даў слова» аднаму з брыгадзіраў:

— Раскажы пра сваю брыгаду.

Брыгадзір расказаў, колькі гектараў трэба яму скасіць, колькі скошана, пачаў пералічваць лепшых касцоў, даводзіць, па колькі кожны з іх скошвае за дзень...

Вядома, я з цікавасцю слухаў расказ брыгадзіра Міхала Чаркаса, які быў да таго ж студэнтам-завочнікам Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Мне падабалася, з якой павагай гаварыў ён пра людзей сваёй брыгады, пра іх справы. Напрыклад, пра Мікалая Васільевіча Кудзельку, Уладзіміра Паўлавіча Жураўлевіча, Уладзіміра Змітравіча Весялова, якія скошваюць — па балоце ў Розе — па 45-50 сотак за дзень. Ды яшчэ такога сенакосу, як асака. Мне самому даводзілася не раз касіць дома асаку, на Ласінай Балоціне, і я добра ведаю, якая гэта работа. Мне, ды і здаравейшым за мяне і спрактыкаваным мужчынам, паколькі помніцца, ні разу не ўдавалася скошваць за дзень болей за сорак сотак такой травы. Ад брыгадзіра я даведаўся таксама пра выдатнага трактарыста калгаса Міхала Мікалаевіча Рагалевіча, пра школьніцу Надзю Жураўлевіч, якая, памагаючы мадеры, стала ўзорнай даяркай... Вось бы пажыць тут, у Дзякавічах, сярод людзей, пазнаёміцца з імі. На жаль, мне трэба было ехаць далей — па сваім маршруце. Рабіць сваю справу.

На адыход старшыня сказаў мне, што машына будзе, мне трэба толькі падысці сюды заўтра раніцай, роўна ў сем.

Значыць, цяпер можна ісці спакойна спаць.

У хаце разам з Валяй была Лёнева маці. Сядзела на ложку, падпёршы далоняй шчаку. Думаць ёй, як высветлілася, было над чым. Дачка Люся — тая кірпаносая рыжуха — едзе заўтра ў Крым. Наймацца ў саўгас на працу — збіраць вінаград. Я ўсномніў, яна з Валяй, калі я еў маладую бульбу, усё валтузілася з чамаданам — нешта не замыкаўся.

У сенцах загрукала — было чуваць, як там укацілі веласіпед.

— Лёня прыехаў, — надхапілася Валя.

Мне ўяўляўся калгасны механік высокім, шыракаплечым, з асмужаным тварам. Убачыў жа я шчуплага хлопца, падобнага на тых студэнтаў з Інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, што жывуць у інтэрнаце паблізу маёй кватэры ў Мінску.

Ён сеў пры парозе разувацца. Маці таксама падышла. Пачала зноў пра Люсю: каб хаця ўсё добра было ёй у тым Крыме.

— Вам, мусіць, рабіць няма чаго, — зазлаваў раптам Лёня. — Надумаліся — Крым, Крым. Нашто ёй той Крым? Думаеце, тут не тое самае? Абы ездзіць. Хай лепш уладкуецца ў які тэхнікум. Як я: павучыўся — ёсць ужо свая спецыяльнасць... А то пралётае толькі дарэмна...

Маці адно слухала. Так і пайшла з хаты, схіліўшы ў маўчанні галаву.

Мы таксама доўга не сядзелі: і Валі трэба было заўтра, як і мне, рана ўставаць — яна павінна ехаць у Жыткавічы, на нараду культасветработнікаў. Аўтобус таксама ідзе ў 7 гадзін раніцы.

— Пайду скажу маці, каб разбудзіла.

— А унь жа на стале будзільнік, — падказаў я.

— Мы прабавалі ўжо ўставаць па будзільніку — чуць па вымове не схапілі, — засмяялася Валя. — Празвінеў — і не пачулі, ні я, ні Лёня. Хоць каля самай падушкі ставілі...

Рапіцай мы ішлі з Валяй да цэнтра калгаса. Нас дагнала Люся.

— Дык едзеш у Крым? — спытала Валя. — А чаму без чамадана?

— А, мама не пусціла... — адказала Люся з крыўдай у голасе. — Але я потым усё роўна паеду!..

Старшыня калгаса даў мне грузавую машыну. Я папрасіў шафера заехаць на хвілінку да возера — хоць адным вокам глянуць на яго. Але шафёр сказаў, што да возера з машынай не пад'едзеш: балоцісты бераг, да таго ж — яно ў баку ад нашай дарогі, трэба рабіць круг.

Ну, што ж, прабач, Князь-возера, — я так і не пабачыў цябе, хоць быў зусім побач. Другім разам — абавязкова! — я прыеду да

цябе спецыяльна, і не на дзень. Прыеду, каб пахадзіць па тваіх зялёных берагах, пагойдацца ў чоўне на тваёй ціхай хвалі, па тваіх зорах, што глядзяць з глыбіні яснымі летнімі начамі, паслухаць крыкі тваіх птушак, убачыць тваіх звяроў і рыб, твае краскі і травы, сярод якіх, як сцвярджаюць вучоныя, ёсць вельмі рэдкія, унікальныя. Легендарнае Князь-возера называюць «жамчужынай Палесся», «Палескім морам»! Магчыма, гэта дно таго дагістарычнага мора, пра якое яшчэ задоўга да новай эры пісаў Геродот.

Цяпер шырокім фронтам ідзе асушка палескіх балот. Таму трэба толькі вітаць прынятую ўрадам летам 1969 года пастанову аб стварэнні Прыпяцкага дзяржаўпага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка, дзе захаваецца частка Палесся. Такім запаведнікам, мусіць, трэба было б зрабіць і возера Чырвонае з ваколіцамі, каб захаваць тыповы для палескіх азёраў раслінны і жывёльны свет. Ужо цяпер цікавяцца ім вучоныя: на возера Чырвонае кожны год наладжваюцца экспедыцыі на вывучэпні фауны і флоры Палесся...

Машына скакала на выбоістых, з лужынамі і гразёй, дарогах. Шафёр быў мясцовы жыхар. У вайну партызаніў тут, у Дзякавіцкіх лясах. Я на ўсякі выпадак папытаў у яго пра Хадыку. Не, такой вёскі не чуў: яго атрад быў у процілеглым баку.

З-за хвой выплылі хаты, мільгануў указальнік з надпісам «Пісаравічы». Гэта ж адсюль той дзядзька, з якім я пазнаёміўся ў саўгасе «10 год БССР». Каля магазіна стаяла чалавек восем мужчын. Я папрасіў шафера прыпыніць машыну.

Падышоў да дзядзькоў, расказаў, што шукаю вёску Хадыку. Дзядзькі абступілі мяне, пачалі наперабой успаміпаць, хто з Хадыкі астаўся ў жывых. Нават усчалася спрэчка.

— Што тут спрачацца, — сказаў адзін з дзядзькоў. — Хадзем, я завяду вас да старшыні Даманавіцкага сельсавета — ён якраз тут жыве. Той усё ведае.

І вось мы гутарым са старшынёй сельсавета Барысам Рыгоравічам у яго кабінеце. Нагадаўшы вайну, я закрануў у ім вельмі балючую струну душы. Барыс Рыгоравіч быў тады падлеткам. На яго вачах палілі вёскі, людзей. Палілі яго самога. Ён уцёк з агню. За ім гналіся з аўчаркамі. Каб лягчэй было ўцякаць, ён скінуў лапці і бег босы па лёдзе.

— Заблытваючы след, я часта збочваў, — расказваў Барыс Рыгоравіч. — Вы не можаце ўявіць, як я тады імчаў! Ні адзін цяперашні чэмпіён свету мяне не мог бы дагнаць. А скакаў лепей за рысь — любы плот мог пераскочыць. Быў такі здаровы. Толькі гэта і выратавала мяне.

Вярнуўшыся з лесу на папялішча роднай вёскі, Барыс Рыгоравіч знайшоў усіх сваіх блізкіх і знаёмых спаленымі і

забітымі. Ад людзей асталіся груды касцей. Сярод іх пазнаў толькі труп бацькі. Адсюль хлапец, якому тады ўжо было 17 год, найшоў у партызаны, яго прынялі ў атрад імя Ламейкі сто першай брыгады.

— Усяго на Даманавіцкім сельсавеце, — расказваў далей Барыс Рыгоравіч, — за вайну загінула 1247 чалавек. Усе вёскі былі спалены. Многія з іх немцы палілі па некалькі разоў: спаляць, людзі пабудуюцца — зноў паляць. Па тры разы палілі, напрыклад, Даманавічы, Пісаравічы, Забродцзе. Тут была партызанская зона. На лёдзе Чырвонага возера быў партызанскі аэрадром. Немцы спаганялі сваю злосць на старых, дзецях і жанчынах. Самай першай была спалена разам з людзьмі якраз вёска Хадыка.

Я папытаў Барыса Рыгоравіча, што ён ведае пра Хадыку. Ён адказаў, што ўрочышча Хадыка раней уваходзіла ў Даманавіцкі сельсавет, цяпер адносіцца да Нова-Цярушкаўскага сельсавета Салігорскага раёна. Гэта — землі калгаса «Усход». Больш падрабязна пра вёску і яе гісторыю могуць расказаць толькі старажылы. Каб не траціць часу, мы і найшлі іх шукаць.

На вуліцы, адразу каля сельсавецкіх варот, сустрэўся нам пажылы дзядзька.

— О, на лаўца і звер бяжыць, — сказаў старшыня сельсавета, здароўкаючыся з дзядзькам, — Мы якраз да вас і хацелі ісці. Давайце, Змітрок Іванавіч, зойдзем на хвілінку да мяне.

Мы зноў вярнуліся — ужо ўтраіх — у сельсавет.

Змітрок Іванавіч Хаміцэвіч аказаўся адным з арганізатараў партызанскага руху на Палессі. Яшчэ 28 чэрвеня 1941 года ім была створана партызанская група з 22 чалавек. Дачуўшыся пра дзейнасць тады яшчэ малавядомага партызанскага камандзіра Каржа, партызаны вырашылі далучыцца да яго брыгады. Змітрок Іванавіч стаў камісарам атрада імя Бандараўца, атрада, які добра даўся ў знакі нямецкім акупантам. Змітрака Іванавіча добра ведаў Васіль Іванавіч Казлоў, сябраваў з ім, пра яго ён пісаў у сваёй кнізе «Людзі асобага складу».

— Вёска Хадыка, — расказаў мне Змітрок Іванавіч Хаміцэвіч, — утварылася ў 1912 годзе, Гэта была наша купча. Дата мне запомнілася таму, што мне тады стукнула якраз 10 гадоў. Раней там была палянка сярод лесу, урочышча. Называлася Хадыка. Даманаўцы купілі тую зямлю ў нясвіжскага пана, прозвішча яго, здаецца, Агаркоў. Перад вайной у вёсцы налічвалася 24 двары. Спалілі яе немцы ў 1942 годзе. У маім атрадзе былі партызаны з Хадыкі. Восіп Хаміцэвіч, муж і жонка Андруховічы... Іх дзяцей немцы спалілі. Расказвалі, яны былі ўцяклі з агню, дык паліцай Кузьма Хаміцэвіч зноў паўкідаў іх у агонь — такі быў звер. А маці

тых малых дзяцей, Ганна Андруховіч, і цяпер жыве. У вёсцы Яскавічы.

Яскавічы? Так, гэта былі тыя самыя Яскавічы, куды я мерыўся ехаць пасля Хадыкі. Я знайшоў іх на карце — аказалася, яны зусім недалёка ад Даманавіч. Не дзіва, што Сыракомля ведаў легенду пра Хадыку.

Я папытаў у Змітрака Іванавіча, ці не ведае ён, чаму ўрочышча называлася Хадыка, ці няма пра гэта якога-небудзь падання.

— Хадыка, — адказаў Змітрок Іванавіч, — ад слова хадзіць. З Даманавіч туды 15 кіламетраў, дарог ніякіх не было, хадзілі пеша праз лес. Таму — і Хадыка.

Ясна, гэта пазнейшае тлумачэнне назвы, так званая народная этымалогія. Але яна ўжо сведчыць аб тым, што Хадыка сапраўды было глухое, далёкае ад чалавечага жылля месца.

— А хто яшчэ, акрамя Ганны Андруховіч, астаўся з вёскі жывы?— папытаў я.

Наўрад ці мог бы хто лепей за саміх жыхароў вёскі расказаць мне пра паходжанне яе назвы.

— Хаўроння Іванаўпа Хаміцэвіч, але яна цяпер жыве ў вёсцы Таварышч.

— Ну, што ж, давайце з'ездзім да яе, — згадзіўся Барыс Рыгоравіч.

На вуліцы ён завёў свой матацыкл. Па пясчанай палявой дарозе, потым па лясной сцежцы мы хутка даехалі да маленькай, акружанай лесам утульнай вёсачкі.

Хаўронню Іванаўну засталі непадалёку ад яе двара — яна палола сваю норму буракоў. Пагаварыць прымасціліся на лавачцы пад ліпамі — у хаце спала малое дзіця («Даччыно, прыпаручылі глядзець мне, бабе»).

— Калі палілі нашу вёску, я пасвіла каровы, — расказвала Хаўроння Іванаўна. — Яшчэ тата прыходзіў: паглядзець, ці не баюся я адна пасвіць па лесе... Пабыў са мной трохі, памог мне сабраць каровы ў гурт... «Доўга ж не пасі, дачка, як пачне цямнець, то і гані». Сказаў так і пайшоў лесам дадому... Потым чую — страляюць. У мяне аж абарвалася нешта ўсярэдзіне: немцы!.. Я кінула каровы на руні (была якраз восень), пабегла ў лес... Адна... Толькі сабачка пры мне быў... Каровы самі пайшлі дадому... Пераначавала ў лесе, потым пайшла па лесе шукаць сваіх людзей... Аднаго чалавека знайшла, ён з коньмі ўцёк. Дрымак з Ляхавіч... Разлажылі агонь... Потым чуем— вішчаць свінні, коні ржуць... Не ведаю, праз колькі часу — пайшлі глядзець... Замест вёскі — адны галавешкі... Адзін будынак дагараў... А людзей — ні душы. І нічога, дажа ката няма... Дзе ж,

думаем, людзі?.. Глянулі ў калодзеж — аж там чалавек забіты. Хаміцэвіч Арцём. І больш — нікога... Думалі ўжо ісці ў лес шукаць, але адзін хлопец — мы яго сустрэлі раней у лесе, ён уцёк яшчэ да прыходу немцаў, — гэты хлопец глянуў на тое месца, дзе быў калгасны склад. А ж там — усе нашы, спаленыя, знявечаныя... Касцей — як картошкі... Не ведаю, колькі б мы там млелі, галасілі, каб нас не адцягнулі партызаны... Яны забралі нас у атрад... Я асталася адна — усе мае загінулі тады... І бацька, і сястра з хлопчыкам...

Успамінаючы, Хаўронння Іванаўна бралася рукой за шчаку, губы яе дрыжалі, а ў вачах — у мяне аж мароз прайшоў па скуры — я ўбачыў жах. Як бьщцам яны, вочы, цяпер вось глядзелі на груды касцей тых родных і блізкіх, з якімі яна, здаецца, яшчэ во нядаўна гаманіла, смяялася, сядзела за сталом, выбірала бульбу, спявала на радзінах...

На развітанне я ўсё ж папытаў Хаўронню Іванаўну, ці не ведае яна, чаму вёску называлі Хадыка.

— Раней было там урочышча Хадыка, — адказала жанчына. — А чаму яно так называлася — хто ж яго ведае... Урочышча даўнейшае...

Я разумею, вельмі цяжка ўтрымаць у памяці пасля перажытых жахаў нейкую там легенду пра далёкія часы. Тым больш, што сама рэчаіснасць была непараўпальна больш драматычная.

І ўсё ж я не траціў надзеі натрапіць на след. Магчыма, яе ведаюць старажылы суседніх вёсак. Я запісаў у сваю запісную кніжку іх назвы: Сухая Міля і Абедземля.

Але перш за ўсё трэба пабыць на самім урочышчы (так, цяпер ужо зноў урочышчы) Хадыка. Барысу Рыгоравічу звазіць мяне туды на сваім матацыкле не было часу. Ды гэта ўжо і не яго сельсавет, сказаў ён. Лепш за ўсё мне цяпер паехаць у Доўгае — адтуль да Хадыкі будзе бліжэй.

Барыс Рыгоравіч падкінуў мяне да вёскі Драчова (ці Драчава, як называюць некаторыя). Там я сеў на праезджы аўтобус, які высадзіў мяне на скрыжаванні дарог. Тры кіламетры хады па гравейцы — і я ў Доўгім, вялікай, доўгай вёсцы з шырокай і чыстай вуліцай.

Я так нахадзіўся і наездзіўся за дзень, што хацелася цяпер толькі адпачыць, таму адразу пайшоў у сельсавет. Старшыня сельсавета завёў мяне ў БМУ (Старобінскае будаўніча-мантажнае ўпраўленне Салігорскага раёна), якое размяшчалася ў Доўгім. Там камендант інтэрната гэтага БМУ адвёў мне цэлы пакой з дванаццаццю акуратненька засцеленымі ложкамі — выбірай любы.

Раніцай, пасвяжэлы, з новым запасам сіл, я ўжо быў у

старшыні доўгаўскага калгаса «40 год БССР» Івана Трафімавіча Слагады, вельмі добрага і сціплага чалавека. Іван Трафімавіч падвёў мяне да бартавой машыны, поўнай гаманлівых жанок і дзяўчат, і, пагаварыўшы з шафёрам, сказаў мне:

— Завязе на буракі ў Равецкі Лес палольшчыц, і ў перапынку, да абеду, можаце з ім пад'ехаць у Хадыку. Толькі доўга машыны, калі ласка, не затрымлівайце.

Ссадзіўшы за вёскай Равецкі Лес палольшчыц, якія хутка рассыпаліся па бураковым полі, мы паехалі шукаць Хадыку. Шафёр, Мікола Сцешыц, мой аднагодак, у тым баку не бываў. Але я з роспытаў ужо ведаў, што спачатку трэба ехаць зноў на гэтае Драчова — Драчаву. Адтуль да ўрочышча 7-8 кіламетраў.

Магазіншчыца ў Драчове паказала нам дарогу, якая вяла да Хадыкі. Але, сказала яна, ні разу там не бываўшы, можна легка збіцца. Яна параіла нам узяць з сабой хлапчукоў, што гулялі непадалёку, — яны там бывалі.

Пад'ехалі да хлапчукоў. На наша пытанне, ці ведаюць яны дарогу да Хадыкі, двое з іх адказалі, што яны адзін раз былі там. Хадзілі ў той бок у маліну і зайшлі паглядзець. Мы прапанавалі сесці ў кузаў і праехаць з намі. Малыя з ахвотай згадзіліся і ў адзін момант былі ў кузаве. Нават малы мурзаты цяльпук гадоў шасці ўскараскаўся і стаў пры кабіне. Але яго заўважыў бацька, які стаяў тут жа, ля варот.

— А ну злазь, Колька!

Але Колька пачаў прасіцца:

— Ну, та-а-та...

— Каму я кажу?..

— Ну, та-ата!..

Мы сказалі бацьку, што затрымлівацца ў Хадыцы не будзем, зараз жа вернемся назад, і з дзецьмі нічога не станецца. Але ён, пачуўшы, што едзем у Хадыку, загаварыў яшчэ настойлівей:

— Туды вельмі кепская дарога...

Як ні прасіўся малы, расцягваючы — ужо з плачам— сваё «ну, та-ата!», бацька быў няўмольны — давялося злезці.

Дарога і праўда была неважнецкая. Яма на яме. І ў кожнай — на ўсю шырыню дарогі — вада. Аб'ехаць ніяк нельга: паабапал цеснай сцяной стаіць лес. Густы, змрочны, з зараснікамі папараці між замшэлых камлёў. Ехалі проста на ваду. Шафёр аж пацеў, раз за разам пераключаючы хуткасці, круцячы руль. І гэтак — амаль усю дарогу.

Нарэшце пасвятлела — гэта кончыўся лес. Паказалася невялікая, прадаўгаватая палянка.

— Хадыка, — сказалі хлапчукі.

Мы вылезлі з машыны. Збоку ад дарогі на невялікім курганку

стаяў просты бетонны помнік. Я хацеў прачытаць, што на ім напісана, але ніякага надпісу не знайшоў, хоць малыя запэўнівалі, што надпіс быў. Сапраўды, пасярэдзіне помніка значыўся след ад шыльдачкі. Можа яна дзе валяецца ў траве? Хацелі прыўзняць пачарнелы вянок засохлых кветак, але туды раптам шмыганула гадзюка, што грэлася на сонцы.

У другім канцы палянкі мы знайшлі яшчэ адзін, падобны на гэты, помнік. І — таксама без надпісу. Пасярод палянкі стаяў абгароджаны трэці, малы помнічак, таксама з бетону. Абапёршыся на штыкеціны агарожы, мы прачыталі выбіты на ім, ужо замшэлы, надпіс: «З + П мирная жителька д. Ходыки сожжена немецкими захватчиками во время Отечественной войны 1941-1945 г.г.» Чытаючы ўголас надпіс, адзін з хлапчукоў вамест слова «Ходыки», што якраз пераносілася, сказаў спачатку «Хатыні».

Так, гэта сапраўды была яшчэ адна беларуская Хатынь, адна з тысяч. Хто быў у Хатыні, той бачыў даўжэзны рад адных толькі назваў тых вёсак Беларусі, якія разам з людзьмі былі спалены фашысцкімі акупантамі за час вайны. Прытым, там значыліся толькі вёскі, у якіх было не менш за пяцьдзесят двароў.

Анямелыя, мы — шафёр Мікола Сцешыц, трое хлапчукоў і я — хадзілі па зямлі, дзе 28 гадоў назад жылі людзі, па зямлі, якая, здаецца, і цяпер крычыць галасамі закатаваных дзяцей, жанчын, старых. Вось тут былі хаты — мы пазналі іх па сівым палыне і замшэлых цаглінах, што вытыркаліся з зямлі. А вось так ішла вуліца — яе ўсё ж можна было пазнаць. Збоку ад гэтай былой «вуліцы» — мусіць, на агародах — стаялі тры ігрушы-дзічкі — дзве зялёныя, адна ўжо ссохлая. І больш — ніякага следу. Адна палавіна былой вёскі засаджана лесам. На слупе, на бляшанай шыльдачцы, я прачытаў: «Н-Терушское л-во, ур. Ходыка. Мех. посадка сосны з березой. 1969 г. Пл. 4,9 га».

І як тут было не ўспомніць Панчанку:

Буду хату шукаць — а знайду руіны,
Буду маці гукаць—адгукнецца магіла
На пагосце старым пад вярбою пахілай.

Свае пачуцці, выкліканыя ўбачаным і пачутым, я таксама паспрабаваў выказаць у вершы, які так і назваў — «Хадыка».

Дубы ды сосны. Хвошч ды вязель.
Жывіцы выстаялай хмель.
Я думаў: стране даўгавязы
Над звонкай студняй журавель.

Я думаў: сонечную казку
Пакажуць ліштвы, а ў акне
Адчыніць вейкі — калі ласка! —
Блакіт нябесны ў сэрца мне.

Я думаў: ля прысад рабінавых,
На вуліцы, дзе мурава,
Акружыць стайкай вераб'інай
Мяне вясковая дзятва.

Дарэмна: у вянку яловым —
Вуглі ды некалькі цаглін.
Дыміць на печышчах вясковых
Расліна горкая — палын.

Той чорны дзень—як цень далёкі.
Ды ўсё запомніў гэты кут.
Па сёння — ледзь ступі— сарокі
Спалохана стракочуць тут.

Над палянкай, выглянуўшы з-за вяршалін дрэў, стаяла сонца. Яно не мінае ні адзін куточак на зямлі — яго хапае ўсім. Толькі, аказваецца, ёсць людзі, якім яго мала...

Шумелі паціху бярозы, недзе рыпела дрэва, тручыся аб другое дрэва. Цішыня. Хораша, мусіць, было тут людзям, у гэтай зялёнай глушы, сярод дрэў і птушак, сярод лясных красак і пчол. І я разумею асочніка Хадыку, які змог пражыць тут свае трыццаць год. А што гэта было якраз тое месца, я не сумняваўся. Вельмі ж падобная была гэтая пушча на тую, у якой апынуўся няшчасны прыгонны селянін:

Дамоў не трапіш, людзі не пачуюць,
І пошчаку ў адказ не прычакаеш.
Усё жыццё, папэўна, тут звякую,
Ніхто не знойдзе, нават з ганчакамі...
Ніхто не абзавецца і не крыкне,
Хіба гадзюка ў мокрых травах сыкне
Або на вадапоі, ля крыніцы,
Раўне мядзведзь і прамільгне лісіца.
І зноўку ціха... Толькі лёгкі вецер
Шуміць таемна у спрадвечным вецці.
А як жа шмат на баравых палянах
Пахучых зёлак і раслін мядзвяных...

Толькі ж дзе той дуб, у якім магло быць Хадыкава дупло? Дуба на палянцы няма. Толькі калі я зноў вярнуўся ў калгас «40 год БССР» і расказаў там пра паездку ў Хадыку, сакратар нартарганізацыі запытаў у мяне: «А пня ад дуба там не бачылі?» І расказаў, што ён, калі ездзіў туды пасля вайны, звярнуў увагу на той пень, бо быў надта вялікі і з дуплом.

Усе сляды легенды!

Пахадзіўшы па паляне, мы паехалі шукаць вёскі Абедземлю і Сухую Мілю: а раптам знойдзецца сама легенда?

Дарога і тут была з лужынамі (і адкуль яны сярод лета?), з тоўстымі жыламі карэння. Праехалі па ёй кіламетры чатыры, а лесу ўсё не відаць канца. На дарозе ўбачылі чалавека — ішоў, коцячы побач веласіпед. Гэта быў брыгадзір з калгаса «Усход» Іван Аляксандравіч Яфімчык. Ён расказаў, што вёскі, да якіх мы едзем, таксама былі разам з людзьмі спалены фашыстамі. Значыць, пра мясцовыя легенды няма ў каго і пытаць...

Мы вярнуліся назад і, апошні раз абвёўшы вачыма затравелую паляну, развіталіся са старадаўнім урочышчам Хадыка, дзе калісьці — так, ужо зноў калісьці — жылі людзі і паданні, дзе цяпер ізноў гамоніць з небам той самы вячысты бор — нямы сведка жахлівых чалавечых учынкаў.

«СМУТНЫ КРАЮ ПАЛЕССЕ»

Чым пахнуць палескія дарогі. Сустрэча з Церашковай. Лепш менш, ды лепш. Загадчык кішкі. За пяць капеек — сто галоў. Салацік па-доўгаўску. Пра што расказала афіша. БМУ, калгас і Глеб Успенскі. Зямлі пагрэбны паэты.

Па зялёнай зямлі, без дарог і сцежак, проста па каласах жыта, па галоўках лугавых красак, па голлі дрэў, прайшоў — з грымотамі — кароткачасовы, як сказалі б па радыё, дождж. І зараз — шырока і хораша — пахне свежай глебай, лісцем алешніку і — ад дарожнага гравію, з якога ідзе пара, — лазняй.

Гравейка, прамая і гладкая, вядзе мяне ў Яскавічы — мой далейшы «пункт прызначэння».

«Першае месца, якое я помню, — гэта Яскавічы», — пісаў Сыракомля ў сваёй аўтабіяграфіі.

У арбіты маіх вачэй плывуць ніколі не бачаныя дагэтуль

прасторы — Палессе. Хто з нашых, беларускіх, паэтаў не пісаў пра гэты дзівосны і самабытны край! Сапраўды, «шмат злажылі казак, і легенд, і песен, людзі пра балота, пра сваё Палессе» (Я. Купала).

Але першым, хто расказаў у сваіх паэмах і вершах пра палескую зямлю, быў Уладзіслаў Сыракомля, які некалі таптаў яе сцежкі, слухаў яе казкі, карміў яе камароў:

Смутны краю Палессе! З маленства знаёмы,
Так і свецяць мне вобразы даляў замглёных:
Прад вачамі снуюць, нібы сонныя мары,
Неаглядныя багнаў куп'істых абшары.
Гушча цёмных лясоў, дзе — нібыта ў скляпенні,
Ды рака, што ў чаротах цячэ ў задуменні,
Аваднёў, тых крылатых назолаў, дружына,
Матылёк, што лятае над воднай раўнінай,
Тая ціша, што часам парвецца уранні
Вострым жорава крыкам, буслоў клекатаннем,
Або плюханнем чоўна па хвалі спакойнай,
Калі з вонцерам выйдзе рыбак. Край чароўны!
Зноў плывуць у мой сон таго ветру павевы,
Жаўтапесак Палесся і панурыя дрэвы...

Гэтыя радкі з паэмы «Улас» я пераклаў сам: да сённяшняга дня твор беларускаму чытачу невядомы. А дарэмна: паэма вельмі хораша і паэтычна расказвае пра міпулае Беларусі, пра жыццё і быт, вераванні і паданні палешукоў, якія

Заслепеныя лесам, акружаныя вадою,
Тут сам-насам жывуць са сваёю бядою.
Ніякі новы звычай, ніякі павеў новы
Ані не змяніў іх адзення, іх даўняе мовы...
Таксама іх кормяць ягады, мёд і рыба,
Нішто тут не дадалося — трохі нэндзы хіба...

Як жа змянілася цяпер жыццё палешукоў, само Палессе? Я шаргачу чаравікамі па жорсткаму гравію дарогі і шукаю вачыма тыя пейзажы, якія маляваў паэт. Іх няма. Як і ўсюды, дзе я ні ездзіў. Яны — назаўсёды — засталіся толькі ў паэтычных строфах. На месцы тых «неаглядных багнаў» — паўсюдна красуе жыта, кусціцца ячмень, цвіце ружавата-белымі суквеццямі бульба. А вунь, пры боку дарогі, бягуць кудысьці, чапляючыся за белыя ролікі на слупах, поўныя гуду правады — новая казка Палесся.

Недзе на сярэдзіне дарогі, калі ногі папрасілі адпачыць, я

падняў руку перад запыленым грузавіком.

— Вы не ў Яскавічы? — папытаў я ў акенца кабінкі, калі машына прытармазіла.

— Залазь, — шафёр, перагнуўшыся, націснуў на ручку дзвярэй.

У машыне, побач з шаферам, сядзела танклявая дзяўчына гадоў дваццаці. Яна пасунулася, дала мне месца. Дзяўчына была жвавая, без ганарлівасці, і гаворка завязалася сама сабой. З размовы я даведаўся, што яна — з БМУ, едзе на аб'ект у Яскавічы. Там, на рацэ Морач, будуецца шлюз. А чаму б мне таксама не пабыць там, не пацікавіцца, што робяць палескія будаўнікі-мантажнікі? Я выказаў сваё пажаданне. Пры гэтым, канешне, назваў сябе і заадно папытаў пра яе.

— Я раблю інжынерам па працы, — адказала дзяўчына, — Прозвішча мае — Церашкова.

— Церашкова? — перапытаў я. — А не Валяй званць?

— Не, Ніна, — усміхнулася ў адказ дзяўчына.

Ніна Церашкова аказалася родам з Гомельшчыны.

Бацькі праслаўленай лётчыцы-касманаўткі, як мне вядома, таксама з Беларусі. Ці не ад Цярэшкі — назвы вядомай беларускай народнай гульні— паходзіць гэтае прозвішча?

Вось і шлюз. Кругом будаўніцтва — самазвалы, каўшы экскаватараў. Успыхвае зарыва электразваркі. Рака цячэ яшчэ сваім старым рэчышчам, але побач ёй падрыхтавалі ўжо другое, больш шырокае, прамое. Калі б я прыехаў крышку пазней, то не ўбачыў бы ўжо рапейшай Морачы, той Морачы, па чаротах якой лазіў малы Уладзіслаў Сыракомля, на хвалі якой не раз сустракаў ен рыбацкі човен ці шугалею (лодка, выдзеўбаная з камля дуба, такія лодкі рабілі якраз па Палессі, пра іх таксама гаворыць Сыракомля ў сваіх творах).

Ніна Церашкова прывяла мяне ў дашчаны дамок каля шлюза — да галоўнага інжынера БМУ Аркадзя Карніенкі, маладога хударлявага хлопца-ўкраінца. Ён трымаў у руках трубку радыёсувязі, шчоўкаў шматлікімі рычажкамі прыстасавання:

— Алё, алё! Як мяне чуеце? Пераходжу на прыём. — І зноў — шчоўканне рычажкамі. — Добра? Дык вось, яснавокая: перадай — не робіць ні адзін вібратар!.. Патрэбен трансфарматар... Або электрык. Няма чым ушчыльняць бетон. Прысылайце тэрмінова, бо будзе прастой! Чуеце?

Калі ён пагаварыў, Ніна пазнаёміла нас і пачала развітвацца:

— Прабачце, мне няма калі — чакае земснарад.

Сказала так, быццам земснарад — імя добрага хлопца, які чакае яе недзе там, ля ракі, і ніяк не можа дачакацца.

Аркадзь Карніенка робіць тут з 1962 года. Спечатку быў

прарабам, а тры гады назад яго прызпачылі галоўным інжынерам. Асноўная задача Старобінскага БМУ, расказаў ён, — асушка палескіх балот. На сённяшні дзень асушылі тры асноўныя масівы — Крывіцкі, Дзвінскі (калгас «Партызанскі край») і Ракітню. Усяго — больш за 300 тысяч га. Цяпер прыступілі да асушкі агромпістага Вялікалескага масіву і нізоўя ракі Морач. Там пакуль што захаваліся яшчэ непраходныя балоты. На іх месцы будуць пабудаваны два буйныя саўгасы, якія дадуць краіне тоны хлеба і мяса...

Тут я выказаў Аркадзю сваю трывогу: а што будзе з прыродай, з кліматам? Ці не здарыцца так, што на багатае вадою Палессе мы наклічам калі-небудзь засуху?

Аркадзь заспакоіў мяне, што гэтага не здарыцца:

— Праўда — у «10-годдзі БССР» на тарфяніках пракідаюцца белыя залысіны. Але гэта — ад няправільных севазваротаў. Трэба, каб тарфянікі на 40 працэнтаў былі заняты травамі — яны замацоўваюць глебу. Другая прычына — тое, што Мар'інскія балоты асушваліся прымітыўным спосабам — адкрытай сістэмай. Цяпер мы так не робім — будзем асушваць балоты толькі закрытым дрэнажом. Так, каб можна было, па меры неабходнасці, рэгуляваць узровень вады. Канешне, гэта будзе абыходзіцца даражэй, тэмпы будуць меншыя. Але — лепш менш, ды лепш.

Я папрасіў яго растлумачыць больш падрабязна пра гэтую новую сістэму асушкі балот.

— Вы філолаг? — папытаў ён. — Тады, канешпе, вам не ўсё панятна, — і ён узяў аловак.

Я слухаў Аркадзя, і мне было сорамна, што не ведаю такіх простых рэчаў. «Філоны мы, а не філолагі, — гаварыў я сабе. — У век тэхнікі — не ведаем тэхнікі. Летаем па версе, як матылі».

Потым мы глядзелі, як рабочыя ўстанаўлівалі арматуру. Хлапец гадоў семнаццаці, прымерваючыся вокам з адлегласці, паказваў ім далоняй рукі, наколькі патрэбна гэтую арматуру пасунуць. Рабіў ён гэта яшчэ няўпэўнена, увесь час азіраўся на галоўнага інжынера.

— Гэта наш новы майстар участка, — растлумачваў мне Аркадзь. — Толькі што скончыў Мазырскі тэхнікум. Міша добры хлопец — стараецца, з яго будзе толк...

Знізу, з будучага шлюза, поўз сюды, пад нашы ногі, тоўсты шланг, падобны на пажарную кішку. Дзядзька з папяросай у зубах час ад часу браў яго рукамі і накіроўваў праз насыпаны грудок зямлі, на якім мы стаялі, у бок рачной плыні — выпускаў ваду.

— Значыць, рака ўжо ўзята ў кішку? — пажартаваў я, падышоўшы да дзядзькі.

— Выходзіць, так, — адказаў ён з усмешкай. — Яно — не

зліваць, дык затопіць усю пляцоўку. Так што, некаму трэба і гэтую работу рабіць. Паставілі мяне. Вось і стаю, гляджу сваё дзела. Адным словам, загадчык кішкі!

Тут жа, за два крокі ад шлюза, былі Яскавічы. Найду пахаджу па вёсцы, а потым, к вечару, вярнуся сюды, каб зноў разам з меліяратарамі паехаць у Доўгае, дзе ў мяне забяспечаны начлег.

Сяло аказалася вялікае, стройнае, з шырокай вуліцай. Дамы даволі прыстойныя, з верандамі і шырокімі вокнамі. Над шыфернымі дахамі — тэлевізійныя антэны. Так, сённяшнія Яскавічы нічым не напамінаюць тыя Яскавічы, якія больш чым стагоддзе назад бачыў Уладзіслаў Сыракомля. Вось як пра іх пісаў паэт:

Сярод багнаў і бораў,
На пясочку на рыжым
Села вёска ў пакоры,
Як убогі пад крыжам.

Людзі ў зрэбных сярмягах,
Лапці ногі ім вяжуць,
Уваччу голад, смага,
Б'е ад іх дым і сажа.
Тырчаць пуняў і хатаў
Ломам сцены-шкілеты,
Замест гонтаў на латах —
Лахманы з ачарэтаў.

Гняздо ж бусел бяспечна
На страсе пачаў класці —
Селянін верыць вечна,
Што яго ў гэтым шчасце.

Не пляці гэтых божбаў...
Жывуць буслы пустынна,
Калі ж слухаць варожбаў, —
Шчасна й ваша краіна.

О, жывём мы шчасліва!..
Трудна хлеба век меці,
Глядзіць пусткаю ніва,
Пуста ў пуні і клеці.

Гэтыя строфы, перакладзеныя Янкам Купалам, — жывая гісторыя Палесся. Дзе, у якога этнографа знойдзеш такі вось

маляўнічы расказ пра жыццё і быт палешукоў часоў прыгону, ачмураных забабонамі, прыгнечаных галечай, вечнай бясхлебіцай?

Многа вады ўцякло з таго часу. Шмат пабачылі за стагоддзе Яскавічы. Ало, мусіць, піколі столькі не перацярпелі, як у міпулую вайну. Сяло было начыста спалена фашыстамі, спалена, як яны гэта ўсюды рабілі, разам з людзьмі — дзецьмі, жанчыпамі, старымі. Ад вялікага сяла не засталося ні кала ні двара. Зараз яно адрадзілася: панаехалі людзі, разбудаваліся. Цяпер тут — каля 180 двароў. У Яскавічах — васьмігадовая школа, аддзяленне сувязі, сельмаг, камбінат бытавога абслугоўвання. Сяло з'яўляецца цэнтрам сельсавета і саўгаса.

Пра ўсё гэта я даведаўся ад людзей, з якімі сустракаўся проста на вуліцы. Дарэчы, я думаў спачатку завітаць да Ганны Парфенаўны Андруховіч, якая, паводле слоў Дзмітрыя Івапавіча Хаміцэвіча, жыла ў Яскавічах. Але потым раздумаў: папомніўшы ёй пра спаленых дзяцей, я, канешне ж, зноў растрывожыў бы самыя балючыя яе раны. А так — яна, напэўна б, шмат чаго дабавіла да той трагічнай гісторыі маленькай беларускай вёсачкі Хадыкі.

Пад канец я затрымаўся каля магазіна — тут было людна. Сабраўшыся ў кружкі, гаманілі — пра тое, што набяжыць — мужчыны, пакурваючы папулярны тут «Север». Я таксама падышоў да аднаго кружка — на мяне асабліва ніхто не звяртаў увагі, бо тут быў, акрамя ўсяго, аўтобусны прыпынак, і многія чакалі аўтобуса. Мне вельмі цікава было паслухаць людскую гаворку. Якая чыстая, каларытная беларуская мова, колькі нечаканых, вядомых, але ўжо, здавалася, забытых слоў! І як хораша, патуральна льецца яна з вуснаў гэтых простых дзядзькоў і цётак, занятых сваімі адвечнымі гаспадарскімі клопатамі!

Я загаварыў да камлюкаватага, нябрытага дзядзькі, што стаяў крышку збоку — у руках ён трымаў сетку з буханкамі хлеба, між якімі былі зацісnуты абаранкі, размоклы кулёчак камсы (за пяць капеек— сто галоў, такую загадку загадаў пра яе адзін з дзядзькоў) і бутэлька «чарніла». Мне хацелася даведацца, ці няма тут паблізу ўрочышча або вёскі пад назвай «Чортаў Брод» — я забыўся пра гэта папытаць у тых, з кім гутарыў раней. Пра Чортаў Брод расказваецца ў адным з твораў Сыракомлі. Гэта — глухое палескае ўрочышча сярод непраходных балот. Магчыма, я знайду яшчэ адзін факт, які будзе гаварыць аб тым, наколькі блізкі паэт быў у сваёй творчасці да жыцця, да беларускага фальклору. Дзядзька сказаў мне, што ён ведае вёскі Жоўты Брод, Жылін Брод, а вось Чортавага не сустракаў. Можа, хто іншы раскажа. Сам дзядзька не яскавіцкі, жыве ён за некалькі кіламетраў адсюль — у

Савецкай Морачы. Ну, што ж, для мяне і гэта было цікава — усё-такі Брады каля Яскавіч ёсць. Дарэчы, а чаму — Савецкая Морач? Дзядзька расказаў мне, што раней тут — якраз на Марачанцы (так ён назваў раку Морач) — праходзіла савецка-польская граніца. На польскім баку была веска Морач. У 1924 годзе адтуль у Савецкуго Беларусь уцякалі ўсе, хто толькі мог — людзі не жадалі больш рабіць на паноў. Перабежчыкі з Морачы пабудавалі на савецкім баку новую вёску, якую і назвалі — Савецкая Морач. Да той жа, першай Морачы, дабавіўся эпітэт — Заходняя.

Вечарам я зноў быў у Доўгім. Мая палеская праграма была, як пішуць газетчыкі, вычарпана. Пераначую — і гайда далей.

Вячэраў у сталоўцы БМУ. На раздачы стаяла бялявая ружовашчакая дзяўчына з кропелькамі рабаціння, працавала яна весела, з усмешкай. Я бачыў яе тут, на гэтым жа месцы, і ўчора вечарам, і сёння — як снедаў.

— Што вам? — глядзела яна на чарговага кліента з падносам, трымаючы напагатове талерку.

А праз секунду глядзела ўжо на другога:

— Што вам?

Колькі разоў за дзень паўтарыла яна гэтае «што вам?», стоячы ў густой духаце кухні, дзе на шматлікіх плітках і плітах увесь час нешта варыцца, смажыцца, пячэцца, скварыцца! Можна толькі здзіўляцца, як яна яшчэ захавала пры гэтым «прысутнасць духу», не набыла той раздражнёнасці, праз якую так часта хапаемся мы, гарадскія, за «Кнігу скаргаў». Такую ж во ветлівасць мы, чэрствыя кліенты, як бы і не заўважаем. А варта б было. Варта б было хоць нечым ды адзначыць гэтую нялёгкую, сапраўды гераічную працу сціплых працаўніц рабочых — ды і не толькі рабочых — сталовак. Так, я ўпэўнен, што сярод іх таксама ёсць свае героі.

Праўда, гатавалі тут, як кажуць, не вельмі (відаць, на гэта былі свае прычыны). Узяць вось гэтую «салату»: буйна пакрышылі капусту, лінулі на яе алею — і гатова. На добры толк, яе трэба б было хоць перацерці. Але цыбатыя, хударлявыя хлопцы — асноўныя наведвальнікі сталоўкі, — заказваючы гэтую «жывую» капусту, ласкава называлі яе «салацік», а потым, за сталамі, у адзін момант пераціралі яе ўласнымі зубамі. Гледзячы на іх, я таксама са смакам з'еў сваю порцыю «салаты па-доўгаўску».

У 10 гадзін вечара ў клубе БМУ афіша абяцала канцэрт артыстаў Белдзярсфілармоніі, сярод іх я прачытаў імёны Ніжнікавай, Бражніка. На вуліцы, перад уваходам у клуб, тоўпіліся рабочыя БМУ і калгаснікі мясцовага калгаса. Я ўжо навучыўся іх адрозніваць. Зрэшты, і «вучыцца» тут не было чаго: раз малады — значыць, рабочы, пажылы — калгаснік. Аркадзь Карніенка казаў мне, што сярэдні ўзрост рабочых БМУ — 18-25

гадоў, трыццацігадовага называюць ужо старым. Старшыня ж калгаса Іван Трафімавіч, у сваю чаргу, скардзіўся, што ў калгасе асталіся адны старыя, уся моладзь перабегла ў БМУ.

Яго, Івана Трафімавіча, я якраз і ўбачыў тут, сярод людзей. Падышоўшы, я пацікавіўся, хто аплачвае канцэрт, Іван Трафімавіч адказаў, што аплачвае калгас сумесна з БМУ — па 150 рублёў: хай глядзяць і тыя, і другія.

Мне прыгадаліся шматлікія артыкулы, якія вырашалі праблему «моладзь і вёска». Апошні, які я чытаў, быў артыкул М. Дзелянкоўскага ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 5 чэрвеня. Асноўнай прычынай міграцыі сельскай моладзі ў горад аўтар лічыць неўладкаванасць быту ў вёсцы. На зусім сур'ёзнай ноце М. Дзелянкоўскі піша: «А ўзяць бытавое абслугоўванне. І зноў — не ў спрошчаным выглядзе: у вёсцы, маўляў, ёсць быткамбінат, пошта, магазін. Так, ёсць. Але куды ім да гарадскіх! Не купіш жа ў сельскім магазіне ні торта, ні марожанага, пі іншых прысмакаў. А абаранкі, булкі, белы хлеб...» І далей: «Спажывецкі падыход? Магчыма. Але і яго ўлічваць трэба. Булка свежая ці марожанае, скажам, дробязь. Ну, а тэатр, спартыўныя спаборніцтвы на высокім узроўні ці іншыя масавыя відовішчы, музеі, выстаўкі і г. д. А дзе ў вёсцы пастрыгчыся, зрабіць модную прычоску?..»

Усе гэтыя вельмі наіўныя довады легка разбіваюцца аб факт Доўгага: людзі жывуць абсалютна ў адных і тых жа ўмовах — у адной і той жа вёсцы, наведваюць адзін і той жа клуб, адны і тыя ж магазіны, пошту, сталоўку і г. д., а вось працаваць у калгасе не хочуць, стараюцца ўладкавацца ў БМУ.

Значыць, моладзь ідзе не з вёскі ў горад, а з калгаса на прадпрыемства — вось у чым соль. Але чаму? Можа, таму, што на прадпрыемстве, у адрозненне ад калгаса, нарміраваны рабочы дзень («ад і да»), цвёрдая зарплата? Не хачу быць тут катэгарычным — магчыма, і гэта мае значэнне. Але асноўная прычына, чаму моладзь пакідае зямлю, мне здаецца, усё ж не ў гэтым..

Нядаўна я прачытаў выдатныя нарысы Глеба Успенскага пра сялянскую працу. У адным з іх пісьменнік прызнаецца, што доўга не мог зразумець, што прымушае селяніна, у дадзеным выпадку Івана Ермалаевіча, усе без астатку сілы аддаць сваёй цяжкай працы, біцца ўсё жыццё, не бачачы свету, дзеля аднаго кавалка хлеба, не мог даўмецца, дзе «тайна бясплённасці і бясконцасці працы, з якіх сатканы дні, гадзіны і гады існавання Івана Ермалаевіча і многіх на яго падобных». Гэтую тайну ён разгадаў, дзякуючы глыбокаму вывучэнню душы хлебароба, яго псіхалогіі. Ею, гэтаю тайнаю, была, як даказаў пісьменнік, паэзія земляробчай працы: «Аказалася, што земляробчая праца, якая

забірае ў Івана Ермалаевіча ўсё жыццё, хоць і мае бачны вынік толькі ў тым, што Іван Ермалаевіч «не галодны» з усім сваім сямействам і скацінай, але ў той жа час у гэтай працы — усе яго найістотнейшыя інтарэсы. Іван Ермалаевіч «б'ецца» не толькі таму, што яму трэба пад'есці, плаціць падаткі, але і таму яшчэ, што земляробчая праца з усімі яе разгалінаваннямі, нечаканасцямі паглынае і яго душу, сканцэптроўвае ў сабе амаль усю яго разумовую і нават маральную дзейнасць, як бы задавальняе маральна. Ні ў якой іншай сферы, акрамя сферы земляробчай працы, зноў-такі ў безлічы яе разгалінаванняў і складанасцей, думка яго не такая вольная, не такая смелая, не такая напружапая, як іменна тут, дзе саха, барана, авечкі, куры, качкі, каровы і г. д.». Тут, у сваёй працы, піша Г. Успенскі, солянін — мастак, паэт, творца. Адсюль такая «ўлада зямлі», яе «цяга», якая прымушае селяніна ад цямна да цямна «круціцца» на полі, прачыпацца сярод ночы, цэлымі днямі думаць аб нейкай качцы ці «зялёненькай травінцы» жыта. Прычым, падкрэслівае пісьменнік, гэтую цягу і ўладу зямлі, якія пабочнаму воку здаюцца нязмерна цяжкімі, «народ нясе лёгка, як пустую сумачку».

Паэзія земляробчай працы, яку. «адкрыў» Глеб Успенскі, была магчыма ў апісаным ім выглядзе, канешне, толькі пры адсталай, патрыярхальнай, аднаасобніцкай сістэме гаспадаркі. Яна, гэтая паэзія, як паказаў выдатны нарысіст-псіхолаг, была ў яго час велізарнай сілай, на якой па сутпасці трымалася ўся тагачасная сельская гаспадарка, была тым адзіным рухавіком, пры дапамозе якога яна развівалася. Сёння, з увядзеннем новых, прагрэсіўных форм гаспадарання на сяле, з ростам спецыялізацыі сольскагаспадарчай вытворчасці, сама сабой знікае — як гэта ні шкада — і тая паэзія земляробчай працы, пра якую так хораша расказаў Глеб Успенскі.

Ці не таму і не прыжываецца сённяшняя моладзь на зямлі, на якой параджаецца, пазбаўляючыся яе «ўлады»? Ці не таму і расце, большыцца, як снежны ком, гэты паток моладзі — з вёскі ў горад? Чым яго можна прыпыніць? Тортам і свежымі булкамі, як раіць М. Дзелянкоўскі? Выбачайце. Што-што, а падобныя бытавыя «даброты» мала цікавяць маладога чалавека. Яго больш задавальняе рамантыка — вядома, не ўяўная, а сапраўдная, кліча справа, у якой ён можа найбольшым чынам праявіць сябе, дзе ён можа быць самім сабой, адным словам, вабіць паэзія — канешне, у шырокім сэнсе гэтага слова. Відаць, усё гэта больш знаходзіць цяпер моладзь у горадзе — на прадпрыемстве, у навукова-даследчым інстытуце, у той ці іншай установе.

Я не ведаю: што трэба зрабіць, каб усё гэта было і ў вёсцы, у калгасе. Ведаю адно: рабіць нешта трэба. Бо сёння таксама — я

думаю, з гэтым згодзіцца кожны — зямлі патрэбны, побач з нашай новай выдатнейшай сучаснай тэхнікай, паэты — людзі, якія любяць гэтую зямлю, якія не ўяўляюць без яе жыцця, якія адчуваюць сябе тут дома.

Зямлі патрэбны—
паэты,
якія
ёю жывуць і дыхаюць,
аб ёй, як аб маці, дбаюць,
якія,
перш чым з плугам прайсці,
думкамі
яе саграваюць.
Яны яшчэ ў снежні снежным,
калі за хатамі свет увесь белы,
у галаве
раўнютка ўзаруць яе і прабарануюць!
Яны яшчэ ў лютым лютым,
калі замятае снег зоры,
Кожны палетак засеюць
зярнят золатам.
А потым зноў яго перасеюць,
і не раз, а разоў, можа, дваццаць ці сорак.
І доўга думаць будуць,
дзе жыта пусціць, дзе проса,
куды колас вось гэты
Паставіць звінець...
Адным толькі ім, паэтам
(сапраўдным, не вершаплётам),
рада
Аддаць зямля ў рукі ключы
ад
залатаносных складаў.

Крытык Р. Бярозкін, прачытаўшы гэты верш у маёй кнізе «Чарназём», зразумеў яго так, быццам я заклікаю на зямлю паэтаў — членаў і не членаў нашага Саюза пісьменнікаў. А ў мяне і ў галаве такога не было. Што ж, значыць, я недастаткова ясна выказаў сваю думку, не здолеў як след данесці яе да чытача.

Пра ўсё гэта думалася мне, калі я тупаў каля клуба, чакаючы прыезду артыстаў.

Нарэшце яны прыехалі. Я ўбачыў знаёмы мне твар Бражніка. Людзі, што стаялі на вуліцы, паціснуліся ў клубную залу, а я

падаўся ў свой дванаццаціложкавы пакой — спаць: заўтра мяне чакала новая частка маёй дарогі.

НЯСВІЖСКІЯ НЕБАСХІЛЫ

На «новай зямлі». «Самаяздачка» і акно, расчыненае ў свет. Калгасны «стражнік». «Шпіён». Сонца горада. Сустрэча з паэтам. Попел князёў. Альба — звярынец Радзівілаў. Кацярынінскія бярозы.

Дзень гойданкі па дарозе Доўгае — Яскавічы — Старобін— Слуцк — Капыль, начлег на раскладушцы капыльскай гасцініцы, і вось, сышоўшы чыстым ядраным ранкам з чарговага аўтобуса, я апынуўся ў Кудзінавічах — вёсцы, куды пераехаў з Яскавіч, намерваючыся знайсці на «новай зямлі» сваё арандатарскае шчасце, Аляксандр Кандратовіч — бацька паэта.

Тут, па гэтай зялёнай мураве, па круглых, як маленькія курганкі, купінах, зрашочаных мурашкамі і чмялямі, па беламу і мяккаму (ступіш — і не пачуеш) пяску вуліцы — працягу палявой дарогі — хадзіла некалі маленства Уладзіслава Сыракомлі, тут, забываючы на вячэру, а то і сон, цэлымі днямі гуляў ён з вясковымі хлапчукамі ў «чыжыка» і «свінню», гарцаваў верхам на бярозавым «кані», тут, на зімовых вячорках, як зачараваны, слухаў ён, поўяня суму і жалю, цягучыя песні прыгонных беларускіх сялянак, адсюль, ахоплены прагай аблегчыць долю забітага беларускага мужыка, падаўся ён з набітым кнігамі і сшыткамі ранцам у Нясвіж па навуку.

Вёска Кудзінавічы знаходзіцца якраз на мяжы Нясвіжскага і Капыльскага раёнаў, але ўваходзіць у склад апошняга. Сельсавет — Пацейкаўскі.

Інфармацыю пра вёску даў мне яшчэ ў аўтобусе дзядзька з Кудзінавіч, які вёз з Капыля сетку хлеба. Мы разам з ім і выйшлі на прыпынку.

— А да каго вы ў Кудзінавічах? — папытаў ён.

Я не ведаў, што і адказаць. Моркавалася проста пахадзіць па вёсцы, пагутарыць з людзьмі. Але так вось і сказаць дзядзьку — ён, напэўна, не зразумее.

— Думаю зайсці ў школу, — адказаў я. Відаць, і сапраўды трэба б было пачаць са школы: з дырэктарам ці настаўнікам, якім легка можна растлумачыць мэту майго з'яўлення тут, усё ж

лацвей было б знаёміцца з вёскай.

— Але школа цяпер зачынена, — сказаў дзядзька. — І ні дырэктара, ні пастаўніка няма ў вёсцы — паехалі ў Мінск.

Раз так, сказаў я дзядзьку, то зайду да брыгадзіра. Але перш — пагляджу магазін.

У магазіне я папоўпіў свой сакваяж пачкам пячэння і кульком цукерак — хай ляжаць. Калі зноў выйшаў на ганак, убачыў у акне суседняй хаты тры ці чатыры прыплюснутыя да шыбы жаночыя і, здаецца, дзіцячыя насы і столькі ж пар вачэй па-над імі, што былі скіраваны ў мой бок. Ці не мой гэты чорны сакваяж і «дэголеўка» (капялюшык без палёў, які я купіў у Бабруйску, хоць і не ведаў, носяць яго ў нас ці не, ва ўсякім разе ні ў каго іншага, апрача дзяцей, я такога не сустракаў) выклікалі ў людзей такую цікавасць да маёй асобы?

Ідучы па вуліцы, убачыў на лаўцы дзвюх жанчын немаладога веку. Даў «добры дзень», прыпыніўся. Слова за словам — разгаварыліся, я прысеў да цётак.

Жанчыны былі вельмі словаахвотлівыя, з тых, каго хлебам не кармі, а дай пагаварыць. Цётка, што сядзела бліжэй да мяне, поўная, мажная, была родам з Пухавіцкага раёна. Я сказаў, што мы суседзі, бо я — са Старадарожскага раёна, расказаў пра сябе, пра сваю маці, якая, так вось, як і яны, жыве ў вёсцы, дзержыць карову. Заадно, нічога не тоячы, як мог, растлумачыў, чаго я тут, у Кудзінавічах. Гутарыць з імі было легка, бо яны разумелі мяне, я — іх. З размовы я даведаўся нямала цікавага пра вёску Кудзінавічы. Напрыклад, тое, што тут раней была невялікая рачулка, якая называлася Бабулька, з яршамі, уюнамі і ракамі. Цякла яна ў Нёман. Цяпер, калі скрозь панакопвалі канаў, асушылі балоты, рачулка знікла. І яшчэ — недалёка ад вёскі ёсць месца пад назвай Двор. Там некалі жыў пан. Цёткі добра яго помняць, хоць былі тады малыя. Помняць, як першы раз убачылі ў пана веласіпед. Спецыяльна хадзілі ў двор глядзець, як пан катаецца на гэтым дзіве з двух колаў, якое яны празвалі — самаяздачка. А зараз — унь якіх машын панараблялі. Да Кудзінавіч некалькі разоў на дзень ходзіць аўтобус. Праўда, зімой, калі намяце снегу, панасыпае гур, ніякая машына ўжо сюды не дапінае. Людзі, акружаныя снягамі, сядзяць тады дома, пры нагрэтых грубках, ды глядзяць тэлевізар — праз гэтае акенца відаць увесь свет.

Гаварылася шмат пра што. І, канешне, пра тое, што трывожыць хлебароба: як пратрымаць карову, нарабіць сена, што трэба б было зрабіць калгасу, каб маладыя гэтак не ўцякалі ў горад, чаго тут ім не хапае.

У час нашай гаворкі на лаўку падсеў дзядзька гадоў

пяцідзесяці пяці. Гэта быў, як мне сказалі цёткі, — «стражнік», калгасны вартаўнік. Ён сядзеў моўчкі, слухаў — і расказы цётак, і мае роспыты. А потым, падазрона аглядаючы мяне, пальнуў:

— А вам нашто гэта ведаць? Хто вы такі?

Я пачаў як можна прасцей растлумачваць дзядзьку прычыну майго з'яўлення ў Кудзінавічах. Але па яго вачах я бачыў, што маім словам ён не надта дае веры.

Цёткі таксама прыкусілі языкі, началі кідаць на мяне цікаўныя позіркі, як быццам толькі цяпер убачылі. Гаворка, як я ні стараўся яе працягваць, ужо не клеілася.

— Можа б, лепей правялі мяне, дзядзька, да брыгадзіра? — я зразумеў, што без афіцыёза тут не абысціся.

— А вы і самі знойдзеце, яго хата унь за выганам, — адказаў дзядзька тым жа — з цвёрдымі ноткамі — голасам.

Мне нічога не заставалася, як развітацца. Я ішоў з такім адчуваннем, быццам у чымсьці быў вінаваты.

Брыгадзіра (правільней, выконваючага абавязкі брыгадзіра, бо пастаянны брыгадзір хварэў) дома не было. Бабка, відаць, яго маці, сказала, што ён паехаў з жонкай у дровы. Прыйшлося яшчэ пагуляць па вёсцы — памазоліць людзям вочы.

Калі зноў вярнуўся да брыгадзіравай хаты, на двары — убачыў — стаялі калёсы з дрыўмі, пры аглаблі ляжалі хамут і сядзёлка. Каля гайка тупаў і сам гаспадар.

Паздароўкаўшыся, я назваў сябе, дастаў сваё камандзіровачнае пасведчанне. Брыгадзір — пажылы, павольны ў рухах чалавек — узяў паперку, запрасіў мяне на веранду, пасадзіў на лаве, сам таксама сеў побач са мной і пачаў — доўга, шавелячы губамі — чытаць. У час гэтага зацяжнога чытання ўвайшла яго жонка. Яна нахілілася да яго вуха і начала нешта шаптаць.

— Ды не, вось жа дакумант, — сказаў уголас брыгадзір, паказваючы ёй мае пасведчанне.

— Хто ж яго ведае, — сказала цётка — у яе быў агрубелы ад вятроў і сонца твар, патрэсканыя прыпухлыя рукі; павярнуўшыся да мяне, яна «датлумачыла»: — Гэта ж, кажуць, амерыканцаў з неба спускаюць. Каб нашу савецкую ўласць забраць... Хаця ж бы і вы не былі які шпіён...

Я не памыліўся, яна так і сказала: «шпіён». Мне гэта пачало ўжо надакучаць, і я не ўтрымаўся:

— Кіньце вы малоць глупства! Няўжо вы думаеце, што патрэбны нейкаму шпіёну?

Мае вельмі шчырае абурэнне, здаецца, заспакоіла жанчыну. Хаця не зусім, бо яна ўсё яшчэ паглядвала на мяне з падазронасцю — відаць, чутка пра мяне ужо разнеслася па вёсцы.

Усё гэта толькі раздражняла, псавала настрой.

Між іншым, з такімі недарэчнымі падазрэннямі я сустракаўся не ўпершыню. Аднойчы, калі я яшчэ працаваў на Беларускім радыё, мы ўдваіх з супрацоўнікам літаратурнага музея Янкі Купалы літаратарам Іванам Курбекам збіралі ў вёсцы Камуна Любанскага раёна матэрыял для перадачы «Гавораць героі паэмы «Над ракой Арэсай». Мы хадзілі ад хаты да хаты, запісвалі галасы першых камунараў, па ходу здымаючы фотаапаратам тое, што здавалася нам цікавым у вёсцы купалаўскіх герояў. І раптам на вуліцы наганяе нас хлапчук і кажа, што нас просіць старшыня сельсавета. Калі мы зайшлі ў сельсавет, старшыня — помніцца, ён быў без нагі — спытаўшы, хто мы такія, патрабаваў у нас дакументы. Мы дасталі свае пасведчанні з месца работы. Хоць яны былі з фотакарткамі, усімі пячаткамі і подпісамі, старшыня аб'явіў нам, што яны не сапраўдныя і патрабаваў даць другія. Пашпарты нашы былі ў любанскай гасцініцы, і больш нічога даць старшыні мы не маглі. Тады ён загадаў нам аддаць «рэпарцёр» і фотаапарат, дакументы таксама нам не вяртаў. Дзейнічаў ён вельмі рашуча, упэўнена. У сельсавеце — каля стала і ў дзвярах — стаяла нямала дужых вясковых хлопцаў, якія з цікавасцю назіралі, як старшыня затрымліваў «шпіёнаў», як званіў у раённую міліцыю, дакладваючы аб затрыманых, у якіх ён «изъял фотоаппарат и магнитофод». Нас, канешне, давялося потым адпусціць (трэба было бачыць, з якой незадаволенасцю аддаваў нам старшыня нашы — «магнітафоды»!), хоць мы і патраціліна гэты спектакль нямала дарагога нам часу...

Дарогай, па якой ездзіў некалі на вазку ў нясвіжскую дамініканскую школу Уладзіслаў Сыракомля, я — спачатку пехатой, потым на аўтобусе — дабраўся пад вечар да Нясвіжа.

Гарадок якраз «абзаводзіўся» ценямі. З акна нейкай вежы, што маячыла над усімі дахамі дамоў і хат, цаляла ў вочы чырвонае вячэрняе сонца, якое расплылося па шыбе. За Слуцкай брамай нехта раскручваў — здаецца, «Запарожцам» — белы шлейф пылу, які так і вісеў над усёй паласой дарогі.

Уладкаваўшыся ў гасцініцы, я выйшаў пагуляць па горадзе. Накіраваўся да радзівілаўскага замка, дзе, шапочучы чаротам, залацела возера. Пры вуліцы, агароджаны мураванай сцяной, ішоў у неба велічны фарны касцёл. Ён якраз быў адчынены — там нешта рамантавалі. Я ўвайшоў унутр. Справа, на сцяне, у вялікай пазалочанай рамцы мне адразу кінуўся ў вочы знаёмы партрэт Уладзіслава Сыракомлі. Гэта мяне не здзівіла: тут, у Нясвіжы, паэт быў дома. Тут, пачынаючы з 1833 года, гэта значыць, з дзесяцігадовага ўзросту, жыў — спачатку вучыўся, а потым і працаваў у радзівілаўскай канцылярыі — будучы паэт, тут ён

ведаў кожны камень на бруку, кожнае дрэва ў старажытным парку. Як ніхто лепей, ведаў ён і гісторыю горада, пачынаючы ад даўнейшых часоў. З яе, з гісторыі Нясвіжа, і пачаў ён па сутнасці сваю працу па даследаванні гісторыі Беларусі. Артыкул пра Нясвіж, які папісаў Ул. Сыракомля на падставе радзівілаўскіх архіваў, быў надрукаваны ў «Старажытнай Польшчы» Балінскага. Гісторыі Нясвіжа, яго быту і культуры, яго багатым гістарычным помнікам прысвечаны таксама вялікі раздзел у «Вандроўках па маіх былых аколіцах». Можна смела сказаць, што і па сённяшні дзень гэтыя працы па гісторыі Нясвіжа найбольш поўныя. Без іх наўрад ці абыдзецца і цяпер любы даследчык гісторыі нашых гарадоў і мястэчак. З прац Сыракомлі мы даведваемся, напрыклад, пра тое, што Нясвіж некалі адыгрываў вельмі значную ролю як у культурным, гаспадарчым, так і палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага. Яго называлі нават «другой сталіцай Літвы» пасля Вільні. У сваіх «Вандроўках» Сыракомля расказвае аб развіцці культуры, аб выдавецкай дзейнасці ў Нясвіжы выдатнага беларускага асветніка эпохі Адраджэння Сымона Буднага, чалавека энцыклапедычных ведаў, які добра валодаў многімі еўрапейскімі мовамі, у тым ліку чэшскай, італьянскай, грэчаскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, стараяўрэйскай, але які тым не менш пісаў і друкаваў свае творы на роднай яму беларускай мове. «Глупствам з'яўляецца, — гаварыў ён, — пагарджаць мовай адной краіны і ўзносіць да неба мову другой». На беларускай мове Сымон Будны напісаў і выдаў у 1562 годзе ў Нясвіжскай друкарні адзін з найбольш значных сваіх твораў — «Катэхізіс», прызначаны для «паспалітнага люду», а таксама іншыя кнігі.

Мяне захапілі яркія, багатыя фарбамі старажытныя роспісы — карціны на біблейскія тэмы, што былі на сценах і столі касцёла, а таксама шматлікія скульптурный ўпрыгожанні і прадметы дэкаратыўнага мастацтва. Пра іх я ведаў раней з літаратуры, у тым ліку ад Сыракомлі, але бачыў упершыню. Сам касцёл таксама быў цікавы для мяне як архітэктурны помнік мінулага. Пабудаваны ён быў яшчэ ў XVI стагоддзі па праекту італьянскага архітэктара Яна Марыі Бернардоні, якога запрасіў князь Мікалай Хрыстоф Радзівіл-Сіротка. Князь задумаў зрабіць у гэтым касцёле скляпенне для пахавання членаў свайго роду. Кажуць, і цяпер там стаяць дубовыя ацынкаваныя труны з пахаванымі князямі розных пакаленняў. Пра гэтыя труны мне ўспомніўся верш Уладзіслава Сыракомлі, у якім ён вельмі ясна, з характэрнай для паэта іроніяй і выкрывальнай сілай выказаў свае адносіны да «мажнаўладцаў» — прыгнятальнікаў народа:

З трун гнілізнай вее — хоць там арыстакраты
Ляжаць у бальзаміне, злажыўшы галовы.
Згнілі паны і пані, адно ўбор багаты,
Шкілет, герб гавораць пра іх шлях жыццёвы.

Хацелі застацца ў гісторыі, у памяці люду,
Золатам ды крывёю свае імёны пісалі.
Так, былі і яны людзі — тут блюзніць не буду.
Толькі што, каб яны раптам з труны паўставалі?
Зноў бы беглі да іх на паклон, па спагаду,
А яны адварочвалі б вочы з пагардай?..

З касцёла завяла мяне вуліца да замка, дзе цяпер санаторый «Нясвіж». Зялёныя агромпістыя насыпы-валы, тоўстыя мураваныя сцены палаца, вузкія высокія вокны, глушыня ўнутранага двара — адусюль веяла старажытнасцю, часамі, якія даўно праляцелі над светам, але якія, здавалася, нейкім чынам затрымаліся, зачапіліся тут за гэты вось грудок зялёнае зямлі.

Свае ўражанні ад велічы нясвіжскага замка Уладзіслаў Сыракомля выказаў у санеце, які так і назваў «Замак». Наогул, у Нясвіжы няма месца, якое б ён не апеў у сваіх паэтычных радках. Напрыклад, у цыкле санетаў «Успаміны Нясвіжа» паэт расказаў і пра Радзівілаўскія муры («Канторшчык бедны, там сядзеў я днямі»), і пра агульны выгляд горада («Малы занушчаны горад стаіць у руінах»), і пра Слуцкую браму, і пра радзівілаўскі звярынец Альбу з летнім палацам, які, дарэчы, як з абурэннем піша Сыракомля ў «Вандроўках», быў, ужо ў яго час, «рукою нейкага спекулянта перароблены на простую гаспадарчую ферму», ад чаго «пазбавіўся сваёй аздобы». Шмат нясвіжскіх пейзажаў першай палавіны XIX стагоддзя рассыпана і ў выдатнай паэме Сыракомлі пра яго «школьныя часы».

Пра ўсё гэта я ведаў, прачытаўшы Сыракомлю, асобныя радкі і строфы былі ў памяці. Таму, калі блукаў па Нясвіжу, было такое ўражанне, быццам горад мне даўно знаёмы і я цяпер толькі прыпамінаў, пазнаваў вядомыя мне мясціны.

На ўскраіне горада, за старым змрачнаватым паркам, мне падалося, што я іду якраз па той дарозе, якую некалі князь Кароль Радзівіл усыпаў соллю і ездзіў па ёй летам на санях, запрэжаных мядзведзямі. Дзядзька, які скошваў па броўках густы пырнік, пацвердзіў маю здагадку: сапраўды, гэта тая «белая» дарога, пра яе ён чуў ад старых. Пра гэтую дарогу, пра дзікія свавольствы князя пісаў і Сыракомля — як у нарысах, так і ў паэтычных творах. Князь марыў аб славе, аб людской памяці, а дабіўся таго,

што паэт «увекавечыў» яго як тупога і бяздушнага самадура, самахвальца, часовая «вядомасць» якога выросла на народнай крыві. Смяротны прысуд вынес яму паэт у сваёй «Народнай гутарцы» — «Ілюмінацыя», пачутай тут, у Нясвіжы, ад старой беларускай жанчыны.

Князь нясвіжскі Кароль, дайце веры мне, дзеткі,
Пэўна, мора меў грошы,
Нечувана нідзе, дый не бачана гэткай
І за светам раскошы.
Колькі птаства на кухню ішло, колькі трункаў,
Як іграліе музыкі,
Калі князь на дзівосы свае і частункі
Панства рознае клікаў.
От, вядома, шалеюць з раскошы магнаты,
Шум і смех у палацы;
Плацяць плачам за гэта змарнелыя хаты,
Плацяць чорнаю працай.

Гэта, так сказаць, «запеў» гутаркі, дзе дадзена агульная характарыстыка Кароля Радзівіла. Далей Уладзіслаў Сыракомля — вуснамі боларускай жанчыны — расказаў пра дзікі факт свавольства і здзеку з народа ўсеўладнага князя-самадура. Задумаўшы гучна правесці свае ўгодкі, князь загадаў усім жыхарам Нясвіжа паліць паходні. Жанчына, ад імя якой вядзецца апавяданне, не магла выйсці на вуліцу, каб паліць на сваім слупу ліхтар, — у яе на руках было хворае дзіця. Тады служка з ратушы, паразбіваўшы ў хаце вокны, вырваўшы з рук дзіця, сілай выцягнуў яе на вуліцу. Дзіця, якое заходзілася ад плачу, засталося ў напоўненай холадам хаце адно.

Там венгерскае п'юць, забаўляюцца госці
У раскошы, ў багацці,
А тут паліць святло і па сыне галосіць
Змізарнелая маці.

Калі ж князю крычаць пачыналі віваты,
Зычыць год яму многа,
Я дабегла да сына ў халодную хату,
Ды знайшла нежывога.

У гэтай гутарцы — увесь Сыракомля з яго нянавісцю да прыгнятальнікаў, з яго шчырым спачуваннем да жыцця

бяспраўнага беларускага селяніна.

Ходзячы па крывых нясвіжскіх вуліцах, я прыглядаўся да старых камяніц, да рэштак мураваных калон, гадаючы, дзе была, напрыклад, тая дамініканская школа, у якой вучыўся Сыракомля, і дзе той дамок, у якім кватараваў паэт. «Школа была ў кляшторы, а кватэры ў месце» (гэта значыць, у горадзе), чытаў я ў «Школьных часах». Але дзе канкрэтна яны былі? Я дастаў з сакваяжа і разгарнуў «Вандроўкі». З партрэта зноў глядзелі на мяне спакойныя вочы паэта, якія як бы гаварылі: што ж, разгадвай маю загадку, разгадвай, я сваё слова сказаў.

Сёння Нясвіж, канешне, змяніў свой выгляд. Новыя, шматпавярховыя дамы, школы, магазіны, адміністрацыйныя будынкі, нядаўна пабудаваная аўтастанцыя — добра ўпісваюцца ў стыль горада, мірна суседнічаюць са старажытнымі пабудовамі. І ўсё ж хацелася б, каб слаўнае мінулае горада неяк было ўвекавечана ў памяці нашчадкаў. Думаю, напрыклад, што помнікі такім двум выдатным сынам Беларусі, як Сымон Будны і Уладзіслаў Сыракомля, якія праславілі Нясвіж, якія аддалі яму добрую частку сваіх сэрцаў, — былі б тут вельмі да месца. Тым больш, што Нясвіж усё болей і болей прыцягвае да сябе сваімі старажытнымі помнікамі турыстаў, якія з цікавасцю пазнаёміліся б таксама з жыццём і творчасцю гэтых выдатных культурных дзеячаў.

У 1844 годзе, згуляўшы вяселле з семнаццацігадовай Паўлінай Мітрашэўскай, Уладзіслаў Сыракомля пакінуў сваю канцылярскую службу ў Нясвіжы і пераехаў з жонкаю ў Залуча — ціхі салаўіны куток на беразе Нёмана, дзе малады паэт задумаў пагаспадарыць на зямлі. Цяністай асфальтаванай дарогай, аздобленай высознымі кацярынінскімі бярозамі (якія, дарэчы, пачалі ўжо там-сям падаць), пагойдаў — праз сто з чвэрцю год — і мяне аўтобус услед за паэтам — да ціхаплыннага Нёмана.

КРАЙ ПАЭТАЎ

Птушкі Нёмана. Залуча — радзіма песень. З рукапісам і матыкай. «Гнёзды» паэтаў. Гід — Сыракомля. След аратага, які памёр 10 жніўня 1851 года. Як гараць кнігі? «На начлег, да зялёнага гаю». Нараджэнне песні.

У высокай, рыжаватай ад метлюкоў траве, не чапанай ні

каровінымі зубамі, ні авечым капытом (тут — сенакос), стракаталі нябачныя конікі. Над зелянінай лугоў — адсюль, з узгорка, яны відаць далека — стаяла, трохі прымружанае воблакамі, сонца. Аднекуль, здаецца, з таго унь раскідзістага куста, узляцела і пачала кружыць над паплавамі кнігаўка. Яе прарэзлівае «кні-гі! кні-гі!» то прыбліжалася да нас, то зноў аддалялася, прападаючы недзе за Нёманам. Ён, бацька Нёман, хаваючыся ў аеры, ішоў, аказваецца, зусім блізка. Яго лёгка было пазнаць па ланцугу лазнякоў, які, выгінаючыся, цягнуўся нізам логу.

Так, гэта было яно, Залуча (дарэчы, якраз так гавораць мясцовыя жыхары, а не Залучча, як пішуць некаторыя аўтары). Тое Залуча, дзе восем гадоў пражыў, арандуючы панскую зямлю, Уладзіслаў Сыракомля. Залуча, якім памечаны вельмі многія выдатныя творы паэта, напісаныя ў гэтым зацішным куточку беларускай зямлі, такія, да прыкладу, як «Хадыка», «Вясковы лірнік», «Добрыя весці» (на беларускай мове), «Пра закляты скарб», «Аб Заблоцкім і мыле», «Над калыскай», «Прысвячэнне літвінам народных гутарак», нарэшце, «Паштальён», верш, які потым стаў шырока вядомай рускай народнай песняй «Ямщик». Тут, у Залучы, паэт шмат працаваў над перакладамі польскіх паэтаў-лаціністаў, а таксама над даследаваннем па гісторыі Беларусі, яе гарадоў і мястэчак, быту беларускага селяніна.

«Залучы, часу ціхай працы і патайнага, нябачнага для вока набірання сіл, — пісаў у сваёй кнізе пра Сыракомлю А. Драгашэўскі, — абавязаны паэт найшчаслівейшым гадзінам свайго жыцця». Пасля Залучы, — працягваў крытык, — «новых канцэпцый, вышэйшых ці хоць бы інакшых адносін да свету, да людзей, да прыроды ўжо не спадзяваймася... Творы пісацца яшчэ будуць, але плынь паэзіі будзе ліцца выжлабленым ужо рэчышчам, страціўшы свой разгон».

Пра Залуча, пра беларускую прыроду ў паэта назаўсёды засталіся самыя светлыя ўспаміны:

У дні маладыя, у час мой шчаслівы
І я араў наднямонскую ніву.
Знаю, як люд там жыве у хацінах,
Як жаць грамадою выходзяць жанчыны.
Я тыя лугі ўсе па паху пазнаю,
Па смаку ваду з той бруі адгадаю.

Сюды, у ціхі паэтаў куток, мяне прыкаціла «Волга», якую мне далі ў рэдакцыі стаўбцоўскай раённай газеты «Прамень». Са мной былі фатограф газеты Міша Пражэнік і сакратар партарганізацыі мясцовага калгаса Мікола Кавальчук, хлапец гадоў дваццаці двух,

якога мы «прыхапілі» ў Аталезі — цэнтры калгаса. Абодва хлопцы вельмі зацікавіліся сваім земляком Уладзіславам Сыракомлем і з ахвотай ездзілі са мной па яго мясцінах.

Па шырокіх, здзічэлых кустах бэзу, што зелянеў, як астравок, сярод паджоўклага ўжо жыта, мы адразу пазналі на ўзгорку арандатарскую сядзібу. Пра яе нам расказала ў Жукавым Барку васьмідзесяцігадовая бабулька, дадаўшы пры гэтым, што недзе там, як чула яна ад старых, схавана залатая калясачка. Сярод травы мы знайшлі валун з падмурка, старыя, з імхом цагліны, не зусім яшчэ засыпаныя ямы — ці не ад склепаў? Так, якраз тут і стаяла, пэўна, Сыракомлева хата. Канчаткова ўнэўніліся мы ў гэтым, прачытаўшы раздзел «Вандровак» пра Залуча і верш «Пра маю старую хату», у якім паэт пакінуў вельмі дакладнае яе апісапне:

Паркановай трапіш вулкай
Да старой пахілай хаты.
Да зямлі яе прыгнула,
Мох страху закрыў і латы.

Цераз шчыліны ў драніцы
Можна немаль бачыць неба.
Гэта ўсё — мая святліца,
Лепшай мне нідзе не трэба.

Астракол, нібы на варце,
Каля весніц, перад ганкам.
А ў аградачцы, пры хаце,
Густалісты бэз альтапкай.

Праз аградку бачыш поле,
Як плыве здалёку Неман.
А пры шчыльным астраколе
Ля вулля пчаліны гоман.

Тут мае ўсё ў агародзе,
Хоць убога ў ім і дзіка.
Тут я ў радасці, ў нягодзе
З рукапісам і матыкай.
(Пераклад Ул. Дубоўкі.)

Магчыма, у гэтым кутку «ціхай працы» Сыракомля застаўся б да канца свайго жыцця, калі б аднойчы не напаткала яго няшчасце: смерць дзяцей. «Магіла на Стаўбцоўскім могільніку, —

пісаў пра гэта паэт, — забрала ў мяне двое дзяцей — маю самую светлую надзею на будучыню. Хто не быў бацькам, ніколі не марыў, не зразумее таго болю...» З гэтай часіны, — прызнаваўся ён, — «старана, так дарагая сэрцу, стала для нас невыноснай... Не ведаючы, дзе ўзяць сілы для таго, каб застацца сярод тых мясцін і тых успамінаў, кінуўшы жменю пяску на апошнюю дамавіну, вырашыў я, як сапраўдны бадзяга, падацца адсюль, куды вочы глядзяць». «17 верасня 1852 года, — з роспаччу працягваў Сыракомля... — развітаўшыся з добрымі прыяцелямі і кінуўшы затуманены слязамі погляд на дом, які перастаў ужо быць маім, і на аколіцы, так любыя сэрцу, рушылі мы ў дарогу на Мінск — да Вільні». (У Вільні, заўважу, паэт так і не знайшоў ужо шчасця: змучаны непасільнай працай, прыціснуты бясконцымі нястачамі, паэт хутка згас, пакінуўшы за плячыма ўсяго 39 год жыцця.)

Злева ад Залучы, калі стаць тварам да Немана, відаць хаты Жукавага Барка. Залуча — гэта бліжэйшая аколіца вёскі, яе выган. Нездарма паэт называў Жукаў Барок сваім. Мікола Кавальчук, які быў не абыякавы да гісторыі свайго краю, расказаў мне, што ў Жукавым Барку нарадзіўся знаны вучоны XVIII стагоддзя Саламон Майман, які быў знаёмы з Кантам і Гётэ і выдаў на нямецкай мове каля 30 прац па філасофіі і матэматыцы. Я ведаў пра Маймана з «Вандровак» Сыракомлі, які пісаў пра яго як пра «вялікага чалавека», «вядомага ў свеце вучонага», ведаў пра тое, што Майман некаторы час жыў у Нясвіжы, а вось што ён родам з Жукавага Барка — пачуў упершыню. Гаворачы пра Саламона Маймана, Мікола прызнаўся, што, як гэта ні сорамна, ён дасюль чамусьці нічога не ведаў аб пражыванні ў Залучы Сыракомлі і цяпер быў прыемна здзіўлены. Ён здзівіўся яшчэ больш, калі я расказаў, што ў Жукавым Барку ў той жа час, што і Сыракомля, жылі яшчэ два пісьменнікі — аўтар многіх раманаў і аповесцей з жыцця Беларусі Адам Плуг (сапраўднае імя Аытоні Пяткевіч; дарэчы, Пяткевічы і цяпер ёсць у вёсцы) і беларускі паэт Вінцэсь Каратынскі, якога, паводле сведчання літаратара Юльяна Гарайна, адкрыў тут Сыракомля, дапамог яму выйсці ў людзі. Адным словам, мы прыйшлі да вываду, што Жукаў Барок — цэлае гняздо паэтаў. Мусіць, якраз яго і меў на ўвазе крытык Спасовіч, калі пісаў у 1889 годзе ў артыкуле «Уладзіслаў Сыракомля»: «З усіх родных зямель нашых найбольш багаты не толькі на мінеральныя крыніцы, але і на кастальскія крыніцы самароднай паэзіі — край прынёманскі». І гэта гаварылася задоўга да таго, як у «прынёманскім краі» забілі новыя, магутныя і чыстыя «крыніцы самароднай паэзіі». Гэта — Нізок з аколіцамі, дзе загучалі такія самабытныя галасы нашай беларускай літаратуры, як Паўлюк Трус, Кандрат Крапіва, Пятро Глебка. Гэта — Пясочнае, якому мы

абавязаны многімі папулярнымі песнямі, напісанымі яго ўраджэнцамі — Анатолем Астрэйкам і Адамам Русаком. Гэта, нарэшце, — Мікалаеўшчына, калыска неўміручага Якуба Коласа, дзе сёння ўзышоў новы літаратурны падлесак — маладыя, здольныя беларускія паэты Мікола Маляўка, Алесь Камароўскі, Мікола Міцкевіч.

Пакінуўшы каля былой паэтавай хаты машыну, мы вырашылі прайсці па вуліцы Жукавага Барка. У праваднікі ўзялі Сыракомлю, разгарнуўшы яго «Вандроўкі»:

«Праз пясчысты насып уязджаем у вёску Жукаў Барок, — працавіты люд урабіў праз вякі бясплодныя пяскі — збажына тут буйней кусціцца, чым у аколіцы; люд сярэдняга росту, лагодных славянскіх рысаў твару, у чорных з дамашняй воўны сярмягах, заклапочана сноуе на сваіх шнурах. Вітаем яго па даўняму звычаю словамі: «Бог у помач» і ад сэрца зычым яму поспеху ў яго мазалю. Веска балоцістая, бо ў нізіне, і хоць малая — складаецца з якіх дзесяці хат — усё ж, дзякуючы таму, што побач Неман, — можа пахваліцца кузняй, млынам, царквой, плябаняй, лясніцтвам, вялікай новай карчмой і паромам».

Канешне, ні «чорных сярмяг», ні «шнуроў», ні балота не было тут цяпер і ў паміне. Але што ж, цікава, засталося са старых пабудоў? Каля берага Немана мы знайшлі стары каменны млын. Пануры, з бародкамі імху, зарослы быльнягом — колькі праз яго ўцякло вады!

Але мяне больш за ўсё цікавіла уніяцкая царква, якую, як піша на той жа старонцы Сыракомля, «каля 1720 году залажыу» тут «Кароль Станіслаў Радзівіл, літоўскі канцлер». Аказваецца, яна прастаяла тут усе свае 250 гадоў і толькі нядаўна была знесена. На яе месцы мы знайшлі кучы бітай цэглы і друзу. Мікола Кавальчук шчыра шкадаваў («Гэта было не пры мне, я б такога не дапусціў»). Ён пры гэтым расказаў мне, што ў царкве было шмат кніг, у тым ліку старажытных, а таксама рукапісных, дзе рэгістраваліся ўсе падзеі вёскі, асабліва нараджэнне, шлюб, смерць прыхаджан. Усе гэтыя кнігі, як яму сказалі, перавезлі ў Стоўбцы, пра іх павінны ведаць у раённым аддзеле культуры.

Я адразу ўзгарэўся паехаць зноў у Стоўбцы: гэтыя кнігі, асабліва рукапісныя, былі б для мяне выдатнай знаходкай. Яны, канешне ж, шмат чаго расказваюць пра ўсё «паэтычнае гняздо» — і пра Саламона Маймана, і пра Вінцэся Каратынскага, і пра Адама Плуга, і пра Уладзіслава Сыракомлю! У іх, пэўна ж, хаваецца нямала тайнаў, якія памогуць даследчыкам вельмі многае растлумачыць з гісторыі нашай культуры і літаратуры. Мне ж, у прыватнасці, яны б дапамаглі разгадаць «загадку Сыракомлі». У паэта, як вядома, ёсць нямала твораў, напісаных на матэрыяле

жыцця мясцовых сялян. Маючы пад рукамі запісы вясковых падзей, можна б было дакладна даведацца, наколькі праўдзівы быў паэт у сваіх творах, што было асновай яго творчасці, як ён выкарыстоўваў у ёй мясцовыя факты. Мне ўспомніўся, у прыватнасці, пранікнёны верш Сыракомлі «Араты да жаваранка», у якім паэт расказвае пра вельмі звычайную, а таму яшчэ больш жахлівую з'яву ў жыцці тагачаснага беларускага селяніна вясновы голад.

Ты ўжо звоніш, жаўраночку, я ару таксама.
Табе легка — заляці, брат, да нябеснай брамы,
Раскажы там аб ратаях, долі невясёлай:
Люд вясне не рад, бо ходзіць голад зноў па сёлах.

Чалавек прачнецца рана — рук кануць не ў сіле,
Песню сноў бы, толькі грудзі з голаду застылі.
Што нам кліч вясны-красуні, ранак той чароўны,
Калі зноў і зноў па мёртвых звоніць звон царкоўны.

У канцы верша стаіць дата: «10 красавіка 1851 г.». І месца напісання твора — «Залуча». Відаць, паэт гэты страшны голад бачыў якраз тут, у Жукавым Барку. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова перагартаць тыя рукапісныя кнігі з рэгістрацыяй смерці сялян за час, якім памечаны верш. Можна на падставе тых запісаў, дакументальна дамаляваць карціну той сялянскай бяды. І гэтым самым упэўніцца, якія жыццёвыя крыніцы жывілі творчасць паэта.

Гэтак жа сама можна, мусіць, даведацца і пра жыццёвую аснову верша «Пахаванне маладога аратага», напісанага ў тым жа, 1851 годзе, толькі 10 жніўня. У ім паэт з вялікім спачуваннем («Чую, як кроў мая стыне ля сэрца») расказвае, як вязуць на могілкі і хаваюць зусім яшчэ маладога селяніна, загубленага цяжкім паднявольным жыццём. Ёсць пра верш сведчанне Вінцэся Каратынскага, які быў сакратаром Сыракомлі: «Штуршок да напісання гэтага верша даў Кандратовічу сапраўдны выпадак у вёсцы Жукаў Барок, якую арандаваў паэт». Наколькі дакладныя гэтыя словы? Хто быў той «малады араты»? Адказ на гэтыя пытанні, напэўна ж, хаваецца ў царкоўных запісах — такая падзея не магла прайсці міма царквы.

Такім вось чынам можна б было «праверыць» шмат якія вершы Сыракомлі.

Але мае надзеі лопнулі, як той мыльны пузыр, калі я, вярнуўшыся ў Стоўбцы, зайшоў у аддзел культуры райвыканкома: там мне сказалі, што кнігі з жукаборскай царквы... спалілі.

Убачыўшы мае здзіўленне і расчараванне, Таіса Сцяпанаўна Дзіянава, супрацоўнік аддзела культуры, нараіла мне схадзіць да качагара, які паліў кнігі — магчыма, у яго што-небудзь ды засталося. Жыве ён недзе на вуліцы Гагарына. Зваць — Міхаіл Кандратавіч Пляскач. Што ж, на ўсякі выпадак трэба схадзіць. Вясёлы гаваркі дзядзька, у якога я папытаў, дзе жыве Пляскач, з ахвотай узяўся правесці мяне.

— Па носе пазнаю: вы — яго радня, — сказаў дзядзька.

Я толькі ўсміхнуўся, не спяшаючыся яго расчароўваць: у дзядзькі, мне здалося, засвярбеў ужо нос, нешта прадчуваючы.

Высокі, светлы дом Плескача хаваўся ў зеляніне дрэў і кустоў. Сад быў зайздросны, добра дагледжаны. Дзядзька, не гледзячы, адшчапіў прывычным рухам рукі дашчаныя зялёныя варотцы і ўпэўнена пашыбаваў на дывановай дарожцы на верандзе ў дом. Там нікога не аказалася, і дзядзька павёў мяне ў сад.

— Дзе ты там, старая развалюха? — гукнуў ён і, пачуўшы голас Плескача, дадаў:— Ідзі скарэй — госця табе прывёў. З тваёй, з Плескачовай, хеўры.

Пляскач, не надта стары, моцны чалавек, паволі расхінаючы галіны яблынь, падышоў да нас.

— Ну, пазнаёш? — пытаў дзядзька. — Пазнавай, пазнавай — нос у яго твой.

Пляскач акінуў мяне ўважлівым поглядам і паціснуў плячыма.

Каб не рабіць з сябе загадкі, я адразу растлумачыў, хто я і чаго сюды прыйшоў. Дзядзька, які мяне прывёў, пачуўшы пра нейкія кнігі, прыкметна расчараваўся і, даўшы «бывайце здаровы», хуценька паціснуў за вароты.

— Што праўда — то праўда, кнігі мы спалілі, — расказваў Пляскач. — Звалілі к нам, у качагарку — прайсці не было як. Яны там доўга ляжалі. Усе Стоўбцы хадзілі туды — што хто хацеў, тое і браў. Кніг гэтых было, можа, дзвесце — цэлая гара. Усякія там былі — і друкаваныя, і так, ад рукі пісаныя. Якім было мо па тысячы год — тоўстыя, счарнелыя, крыж залачоны пасярэдзіне. У другіх было запісана, калі хто радзіўся, вянчаўся, прычашчаўся. Я дажа сябе там быў знайшоў... Чакалі мы, чакалі, калі іх забяруць, асвабадзяць нам праход і — па кнізе, па кнізе — пачалі падпальваць імі ў печы. Нас тады чатырох было, качагараў. На змену палілі. Больш як на месяц хапіла іх для распалу...

— А хто прывёз іх да вас, гэтыя кнігі?

— Распараджаўся імі былы намеснік старшыні райвыканкома Ліцко, — адказаў Пляскач. — Не ведаю, можа, ён не ўсе нам скінуў...

Разам з інструктарам райкома партыі Сашам Турко, вельмі

цікаўным і дапытлівым хлопцам, які нядаўна закончыў універсітэт у Мінску і зараз піша кнігу па гісторыі Стаўбцоўшчыны, мы адшукалі шыкоўны, у зеляніне дом Ліцко. Жанчына, якая выйшла нам насустрач, сказала, што гаспадара дома няма — пайшоў купляць муку. Падышлі к магазіну. Саша адразу знайшоў у чарзе Ліцко.

— Кнігі? — павярнуўся да мяне сярэдпіх гадоў мужчына з поўным, старанна выгаленым тварам. — У мяне нічога не засталося — усё спалілі качагары,- і ён зноў адвярнуўся, даючы мне зразумець, што размова скончапа.

Выпадкова я даведаўся, што ў гаражы райвыканкома частка кніг, праўда, з другой, Вялікасульскай царквы, усё ж захавалася. «Я збіраўся паведаміць куды-небудзь у Мінск, — сказаў мне цяперашні намеснік старшыні райвыканкома таварыш Юнцэвіч, — і так не сабраўся дасюль».

Антон Уладзіміравіч дазволіў мне паглядзець гэтыя кпігі. Сярод іх я знайшоў камплекты «Мінскіх епархіяльных ведамасцей», кнігі царкоўных запісаў дзевятнаццатага і нават васемнаццатага стагоддзяў, дарэвалюцыйныя брашуры, кпігі на лацінскай мове. Канешне, некаму гэтыя матэрыялы будуць выдатнай крыніцай для даследаванняў. Таму, прыехаўшы ў Мінск, я пазваніў дырэктару Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР Мікалаю Іванавічу Сціхараву. Мікалай Іванавіч падзякаваў мне за паведамленне і сказаў, што адразу ж камандзіруе ў Стоўбцы каго-небудзь з работнікаў, каб забраць тыя матэрыялы ў архіў.

Мне падумалася, што, магчыма, і яшчэ дзе-небудзь вось так валяюцца ў скляпеннях і гаражах каштоўныя старыя кнігі, якія многае могуць расказаць пра гісторыю нашай зямлі. Дык чаму б не зацікавіцца імі мясцовай інтэлігенцыі, камсамолу і не паведаміць у адпаведныя арганізацыі. Давайце ж, дарагія таварышы, — захацелася мне звярнуцца да гэтай інтэлігенцыі, — пакончым, нарэшце, з такой нашай абыякавасцю да культурнай спадчыны народа. Мы ж — гаспадары сваёй зямлі!

Быў ужо мяккі празрысты надвячорак. Сонца яшчэ свяціла, але дзённая гарачыня патроху спадала. Далёкая паласа лесу, паплавы і палеткі збажыны і бульбы, нічым не затуманеныя (марыва ўжо знікла), праглядваліся прарэзліва ва ўсіх сваіх фарбах — як намаляваныя. І мне раптам уздумалася, не чакаючы заўтрашняга дня, цяпер вось і пачаць сваю далейшую вандроўку ў новую мясціну, звязаную з Сыракомлем — вёску Мархачоўшчына. Балазе яна зусім недалёка ад Стоўбцаў. У Мархачоўшчыне, куды пераехалі з Кудзінавіч бацькі Сыракомлі на новую арэнду, паэт правёў частку сваіх дзіцячых і юнацкіх гадоў: сюды прыязджаў ён

з Нясвіжа на канікулы, тут пасля заканчэння вучобы памагаў бацьку па гаспадарцы. Мне трэба было хоць адным вокам глянуць на тыя мясціны.

Я адправіўся туды пеша і, падсеўшы па дарозе на праезжы аўтобус, праз колькі часу быў там. Тыповая беларуская вёсачка, сярод лугоў і пералескаў. За агародамі, па зялёнай лагчыне, слаўся ўжо бялявы туман. Каля лесу стаяў роўны белы слуп дыму, які таксама потым апускаўся ўніз і вісеў на грудзях пацямнелага лесу раўнюткім поясам. Адразу, самі сабой, усплылі ў памяці радкі Сыракомлі з яго вялікай лірычпай паэмы «Народжаны Як Дэмбораг».

Вячэрнім часам, у светлым маі,
Як салавей у садку зазвоніць,
Мы з хлопцамі сельскімі мчымся па конях —
Ізноў на начлег, да зялёнага гаю...

Там столькі пссень, вясёлых жартаў,
Шчымлівых страхаў і пагаданак!
У вёсцы пеўні пяюць ужо ранак,
А нам не спіцца — шчырая варта!

Во дзе ты ўспіш гэтай ноччу маёвай:
То конь заржэ, то полымя блісне,
То птаства раптам, нібы наўмысне,
Ударыць трэллю з сядзібы альховай...

Гэтыя паэтычныя строфы, як і ўся паэма, прыйшлі адсюль, з Мархачоўшчыны. Якраз тут ганяў малады Людвік з вясковымі хлапчукамі на начлег імклівыя табуны коней, тут бачыў ён узыход і захад сонца, слухаў салаўіныя спевы і начныя шолахі лесу. Тут унершыню ўспыхнуў у сэрцы маладога паэта, узносячы яго да нябёс, магутны агонь маладога кахання.

Адсюль, ад Мархачоўшчыны, як я даведаўся, рукой падаць і да Мікалаеўшчыны — радзімы Якуба Коласа. Адна зямля, адны і тыя ж крыніцы жывілі, аказваецца, творчасць абодвух паэтаў.

Канешне, добра было б пахадзіць, як можна болей, па гэтай спеўнай зямлі, пажыць тут месяц-другі, пазнаёміцца з усімі вясковымі дзядзькамі і цёткамі, маладымі і старымі — яны, іх расказы, я ўпэўнен, далі б мне намнога больш, чым любыя, нават самыя выдатныя кнігі. Але на гэта патрэбен час, якога ў мяне вечна не хапае.

Вярнуўшыся ў Стоўбцы і пераначаваўшы ў гасцініцы, я сеў раніцай на аўтобус, які хутка завёз мяне ў гарадскі пасёлак Мір.

Гэта таксама — адна з «аколіц» Сыракомлі.

...У карчме было накурана. За столікам, застаўленым бутэлькамі і талеркамі з закуссю, лілася жывая, бесцырымонная гаворка: тут выкладваліся ўсе навіны, якія накапіліся пасля апошняга кірмашу ў аколіцы. Сыракомля, які таксама весяліўся тут з сябрамі, звярнуў увагу на сумнага, маўклівага дзядзьку, што сядзеў за суседнім столікам. «Можа, чалавеку няма за што выпіць?» Доўга не думаючы, Сыракомля наліў чарку і паклікаў да стала дзядзьку. Сябры пацясніліся, далі сесці. Калі чалавек выпіў, Сыракомля папытаў у яго, чаму ён такі сумны, што яго гэтак гняце. І вось дзядзька расказаў сваю гісторыю. Калі ён быў малады і служыў тут, у Міры, на пошце фурманам, пакахаў у адным сяле дзяўчыну. Ужо мелася быць вяселле, але здарылася няшчасце: дзяўчына заблудзілася ў час завірухі ў полі і замерзла. Везучы пошту, ён чуў, як яна клікала яго, але думаў, што яму гэта здалося. Вяртаючыся назад, ён знайшоў у снезе труп сваёй каханай...

Гісторыя, расказаная дзядзькам, вельмі ўсхвалявала Сыракомлю, і ён, вярнуўшыся з кірмашу ў сваё Залуча, запісаў яе так, як чуў, толькі ў форме верша. Праз колькі часу рускі паэт Трэфалеў пераклаў гэты твор на рускую мову пад назвай «Ямщик». Хутка пра гісторыю, пачутую Сыракомлем у Міры, спявала ўся Расія, уся Беларусь.

Когда я на почте служил ямщиком,
Был молод, имел я силенку,
И крепко же, братцы, в селенье одном
Любил я в ту пору девчонку.

Гэты варыянт гісторыі стварэння песні «Ямщик» расказала мне ў Міры пепсіянерка Аляксандра Мацвееўна Паўлоўская, якая якраз замяшчала на кароткі час сакратара мірскага гарпасялковага Савета. Аляксандра Мацвееўна, якая была актыўнай удзельніцай Беларускай работніцка-сялянскай грамады, вельмі цікавілася гісторыяй свайго краю, мясцовым фальклорам. Напрыклад, яна мне расказала, апрача ўсяго, паданне пра заклятую панну, якая, нібыта, ходзіць начамі па Мірскім замку. Ці не гэтае паданне легла ў аснову гутаркі Сыракомлі «Пра закляты скарб»? З таго, што расказала Аляксандра Мацвееўна, я даведаўся таксама, што калісьці ў Міры былі гандляры Заблоцкія.

Я адразу ўспомніў другую гутарку Сыракомлі— «Аб Заблоцкім і мыле». Значыць, з Міра, з тых вясёлых гулянак у карчме, паэт прынёс не адзін свой выдатны твор.

Калі ў пакой зайшла бібліятэкарка, Аляксандра Мацвееўна

сказала ёй, знаёмячы са мной: «Чалавек цікавіцца пра нашага Сыракомлю». І сапраўды, міране могуць з поўным правам называць паэта сваім. Тут ён быў як дома. Вось як пісаў Уладзіслаў Сыракомля Рамуальду Падбярэзскаму 18 чэрвеня 1848 года: «У сваіх вандроўках па Літве, магчыма, давядзецца табе праязджаць праз Мір, там папытаеш пра мяне ў любога, хто сустрэнецца (а там кожны ведае мяне па імю, прозвішчы, псеўданіме, празванні «паэт»), то раскажа табе, дзе Залуча...»

У Міры мне даўно хацелася паглядзець старажытны замак — выдатны помнік архітэктуры Беларусь Мірскі замак! Я не здзівіўся, убачыўшы яго ў рыштаваннях: па вельмі мудрым рашэнні нашага ўрада цяпер распачата рэстаўрацыя гэтага помніка культуры беларускага народа.

На ўнутраным двары я сустрэў рабочых, якія толькі што крылі жоўтай свежай дошчачкай дахі вежаў і цяпер — па рыштаваннях — сышлі долу перакусіць. Адзін з іх, Міхал Антонавіч Крупко, расказаў мне, што некалі ён служыў у гаспадара замка — князя Святаполка Мірскага — і што той хацеў поўнасцю аднавіць гэты замак, які дастаўся яму ў спадчыну. За адзін толькі агляд яго ён меркаваў мець ад наведнікаў вялікія прыбыткі нават у той, не «модны» на турыстаў, час.

Рабочыя расказалі мне, як яны будуць аднаўляць замак, што папраўляць, што дабудоўваць. Успомніўшы, што пра Мірскі замак пісаў у сваіх «Вандроўках» Уладзіслаў Сыракомля, я дастаў і разгарнуў кнігу. На самай першай яе старонцы быў малюнак Мірскага замка. Рабочыя вельмі зацікавіліся ім: гэтаму ж малюнку было прыкладна 120 гадоў. Параўноўваючы малюнак з «натурай», мы знайшлі месца, адкуль мастак маляваў замак. Аказалася, што на пярэднім яго плане не было цяпер той невялікай прыбудоўкі-тэрасы, што значылася на малюнку. Міхал Антонавіч сказаў, што пра гэта трэба будзе паведаміць галоўнаму інжынеру, які цяпер недзе ў Мінску. Я параіў яму запісаць назву кнігі — што ж, хай і сёння паслужыць Уладзіслаў Сыракомля на карысць справе.

Ад міран я даведаўся, што не вельмі далека адсюль знаходзіцца мястэчка Паланечка, пра якое я ўпершыню прачытаў у Сыракомлі, але чамусьці не верыў у сапраўднае яго існаванне: сама назва гучала для мяне неяк экзатычна.

З Паланечкай, з яе ўладаром звязана, аказваецца, яшчэ адна старонка жыццёвага шляху Уладзіслава Сыракомлі, якую, здаецца, ніхто не адгарнуу. Але перш — пра яго ўладара. Ім быў князь Канстанцін Радзівіл, які яшчэ ў 20-х гадах знаходзіўся ў цесных сувязях з прагрэсіўнымі арганізацыямі Польшчы, Беларусі і Расіі, з'яўляўся адным з кіраўнікоў антыцарскага Патрыятычнага Таварыства. На Канстанціна Радзівіла была ўскладзена важная

місія па наладжванню сувязей гэтай агульнапольскай арганізацыі з дзекабрыстамі. Дзеля гэтага ён неаднаразова сустракаўся ў Вільні з рускім рэвалюцыянерам Аляксандрам Бястужавым, меў з ім працяглыя гутаркі на рэвалюцыйныя тэмы, потым вёў перапіску. Вядома, Канстанцін Радзівіл не пазбегнуў бы кары, але Пецярбургскі следчы камітэт даведаўся пра гэта позна: калі следства над дзекабрыстамі закончылася. Даведаўся тады, калі было выкрыта Патрыятычнае Таварыства і Канстанцін Радзівіл аказаўся ў сувязі з гэтым арыштаваным. У саракавыя гады князь жыў у сваім маёнтку ў Паланечцы і, як відаць, не здрадзіў сваім ліберальным перакананням. Ён групаваў вакол сябе мясцовую прагрэсіўную інтэлігенцыю, прыкладаў памаганні па развіццю культуры краю.

Яркім сведчаннем гэтага з'яўляецца тое, што ў яго палацы ў Паланечцы знаходзілася рэдакцыя часопіса «Люд і час», які выдаваў Януары Філіповіч. Часопіс «Люд і час» меркавалася зрабіць цэнтрам культурнага жыцця краю «па Віліі і Неману». Адной з асноўных яго задач з'яўлялася вывучэнне мовы, звычаяў і фальклору мясцовага люду, г. зн. беларускага народа.

Уладзіслаў Сыракомля з ахвотай прыязджаў да князя Канстанціна Радзівіла, які даў прытулак рэдакцыі такога часопіса. Вось як гаворыць пра гэта ў сваіх «Карцінах з узбярэжжа Нёмана» Вінцэсь Каратынскі: «Кандратовіч... абыходзіў панскія дамы, ахвотна кружачыся толькі ў шэрай сферы. Адзіным з гэтага выключэннем быў дом князя Канстанціна Радзівіла ў Паланечцы».

У стварэнні часопіса, як відаць, Уладзіслаў Сыракомля прымаў самы актыўны ўдзел. Калі выйшаў першы нумар часопіса, паэт адразу ж адгукаецца на гэтую падзею станоўчай рэцэнзіяй у газеце «Tygodnik Petersburski». Гаворачы ў ёй пра змешчаныя ў часопісе апісанні абрадаў і вясельныя песні беларускага народа, сабраныя ў Падзвінні, Сыракомля заклікае мясцовую інтэлігенцыю збіраць народную паэзію: «Будзем жа цаніць гэтыя працы, рабіць усё, каб яны з'яўляліся і далей. Хочацца верыць, што мы хутка будзем мець камплектны збор песень народа з усіх мясцовасцей нашага краю». Заканчваючы рэцэнзію, Ул. Сыракомля прапаноўвае літаратарам падтрымаць маладое выданне.

На жаль, першы нумар часопіса «Люд і час» аказаўся і апошнім. Быў падрыхтаваны і другі нумар, але ён па невядомых прычынах не ўбачыў свету. Адзіны нумар «Люду і часу» стаў помнікам культурнага руху, які распачынаўся ў Беларусі ў першай палавіне XIX стагоддзя.

Да Паланечкі з Міра з'ездзіць мне не ўдалося: дзень ужо быў на зыходзе, і я проста не знайшоў у той бок ніякага транспарту.

«ПІЛІГРЫМ» У КАНЦЫ ВАНДРОУКІ

Сцежкі двух песняроў. Вучоныя думкі. Што такое адзінота? Горад Ізяслава. Купіць з лесам рэха. Каб не лопнуць. Памяць пра родны край.

З Міра я трапіў у Навагрудак, дзе сцежкі Сыракомлі перапляталіся са сцежкамі вялікага Адама Міцкевіча: абодва паэты, хоць і ў розны час, вучыліся, як сведчаць даследчыкі, у адной і той жа школе. Сыракомля, хоць і ў меншай ступені, чым Міцкевіч, але ўсё ж ведаў Навагрудчыну, хадзіў па яе дарогах. Ёсць весткі, што ён быў частым госцем у «міцкевічаўскіх» Шчорсах, дзе па матэрыялах бібліятэкі Храптовічаў займаўся вывучэннем гістарычнага мінулага Беларусі.

Пра ўсё гэта не забываюць навагрудчане. У даволі багатым краязнаўчым музеі Валеўскай сярэдняй школы, што за два кіламетры ад возера Свіцязь, ёсць добра аформлены стэнд пра Уладзіслава Сыракомлю. Экспанаты, звязаныя з жыццём і творчасцю паэта, бачыў я і ў Шчорсаўскім краязнаўчым музеі. На жаль, у вялікім, добра абсталяваным музеі Адама Міцкевіча ў самім Навагрудку не знайшоў пра Сыракомлю нічога, хоць, як вядома, «вясковы лірнік» быў выдатным прадаўжальнікам справы вялікага польскага паэта, яго дэмакратычпых традыцый.

Канешне ж, гэта ідзе ад нашага няведання гісторыі, у дадзеным выпадку, ад неразумення важнай ролі прагрэсіўнай польска-беларускай (польскай — па мове, беларускай — па паходжанню) інтэлігенцыі XIX стагоддзя ў развіцці грамадска-палітычнай думкі, культуры Беларусі. А яна ж у гэтай справе зрабіла вельмі многа. Уладзіслаў Сыракомля быў якраз адным з найбольш тыповых прадстаўнікоў гэтай інтэлігенцыі.

Узяўшы тэмай свайго даследавання творчую дзейнасць «вясковага лірніка», я паспеў к гэтаму часу перавярнуць нямала літаратуры, надыхацца ў літаратурным сэнсе пылам вякоў, падымаючы ў архівах Мінска, Вільнюса, Львова пажоўклыя ад часу паперы, многія з якіх пасля Сыракомлі не бачылі вочы даследчыкаў. Я перачытаў амаль усё, што выйшла з-пад пяра паэта. Тое, што здолеў знайсці ў кнігасховішчах Савецкага Саюза, а таксама і часткова ў Польшчы, наладзіўшы з асноўнымі бібліятэкамі ПНР перапіску і ўзаемны абмен фотакопіямі патрэбных матэрыялаў. І перада мной паступова вырысоўваўся творчы парітрэт выдатнага паэта-дэмакрата XIX стагоддзя, яго чалавечы воблік — такі, які быў у сапраўднасці. Больш правільна

зразумець паэта дапамагала мне і гэтае падарожжа па яго слядах.

Дык хто ж ён такі, гэты Уладзіслаў Сыракомля? Што значыць ён для нас, беларусаў? Якое месца павінен займаць ён у гісторыі нашай культуры?

Непрымірымы вораг прыгонніцтва, Уладзіслаў Сыракомля стаяў у самым цэнтры антыпрыгонніцкага руху на Беларусі. Вось як успамінала пра ўздзеянне яго паэзіі на грамадства таго часу Э. Ажэшка: «Як звычайна бывае, на гэты велізарны разумовы рух уплывала многа фактараў, у тым ліку і літаратура. Сялянскія аповесці Крашэўскага чыталі, разрывалі на часткі, развозілі. «Абломак» Качкоўскага меў поспех... але самае моцнае ўражанне тут, на Літве, рабіла паэзія Сыракомлі». Далей Э. Ажэшка гаворыць, што ёй добра запомніўся «вялікі дэмакратычны і, разам з тым, узвышаны дух» яго вершаў. Гэты «вялікі дэмакратычны дух» паэзіі Ул. Сыракомлі быў галоўнай прычынай таго, што «вясковы лірнік», як сцвярджаюць сённяшнія даследчыкі польска-рускіх літаратурных сувязяў, «побач з Бёрнсам і Шаўчэнкам быў адным з найбольш любімых паэтаў рускай інтэлігенцыі». А. М. Горкі ставіў яго ў адзін рад з Пушкіным, Шэлі, Гейнэ, Міцкевічам. Захоплены вялікім антыпрыгонніцкім пафасам творчасці Ул. Сыракомлі, яе глыбокай народнасцю, рускі крытык М. Аксакаў называў вясковага лірніка «сапраўды народным паэтам, народным гусляром». Высокім тытулам народнага паэта надзяляюць Ул. Сыракомлю ў розныя часы і польскія даследчыкі яго творчасці — Ю. Крашэўскі, А. Тышынскі, А. Драгашэўскі, Ул. Спасовіч, В. Кубацкі, Ю. Гамуліцкі, Ф. Беляк і інш.

«Я літвін», — казаў неаднаразова паэт і падкрэсліваў, што і яго «прапрадзед» быў «шчырым літвінам». «Літоўскім лірнікам», «літоўскім паэтам», «песняром Літвы» называлі Ул. Сыракомлю ў польскім, рускім і замежным друку пры яго жыцці і доўгі час пасля смерці. Вось што пісаў, напрыклад, М. Аксакаў: «Калі паэт можа прысвяціць усю сваю дзейнасць аднаму якому-небудзь прадмету, вакол якога, як бы вакол агульнага цэнтра, лунаюць і кружацца ўсе вобразы, думкі яго летуцепні, у якім, нібы ў фокусе, збіраюцца ўсе водгукі і ад якога ўсе любоўныя струны яго атрымліваюць асаблівы водгалас і каларыт, — то такім прадметам, бясспрэчна, з'яўляецца для Сыракомлі Літва. Куды б ні накіраваўся вольны лёт яго натхнення, у якую б сферу ні залятала думка яго, якія б ні кранаў ён струны душы — заўсёды... выступае з масы вобразаў усё адзін і той жа вобраз айчыны, які ён па-мастацку і любоўна малюе». Тое самае канстатуе, напрыклад, і В. Касцялкоўская, называючы Сыракомлю «песняром Літвы». У гэтым жа не раз прызнаваўся сам паэт:

Пра адно я толькі спяваю, хоць на розныя ноты:

Хай жыве наша Літва! Хай жывуць літвіны!

У вершы «Што ўмею намаляваць» Ул. Сыракомля таксама сцвярджае, што, калі ён бярэ ў рукі аловак, заўсёды ў яго атрымліваецца «альбо літоўская хатка, альбо касцельчык вясковы, альбо дворык літоўскі». «Нічога іншага, — гаворыць паэт, — я не ўмею маляваць на паперы: толькі тое, што палюбіў усёй сваёй душой».

Літвою Ул. Сыракомля, як і наогул яго сучаснікі, называў Беларусь. Тут (веска Смольгаў на Любаншчыне) у 1823 годзе нарадзіўся паэт, тут (спачатку на Палессі, а потым на Нясвіжшчыне і Стаўбцоўшчыне) правёў ён асноўную частку свайго жыцця. Апошпія дзесяць год (1853-1862) Ул. Сыракомля пражыў у фальварку Барэйкаўшчына, што на дарозе з Вільні да Ашмян. Тут паэт таксама быў сярод беларускага насельніцтва. Пра гэта сведчыць сам Ул. Сыракомля, сцвярджаючы, што «люд падвіленскі... гаворыць па-русінску», г. зн. па-беларуску. Тое, што Ул. Сыракомля, гаворачы пра Літву як сваю радзіму, меў на ўвазе не што іншае, як Беларусь, добра разумелі праз 50 год пасля яго смерці нават польскія аўтары. Ч. Янкоўскі ў артыкуле «Літва» Сыракомлі» пісаў, што, калі б Сыракомля ўстаў з магілы, то ён «аказаўся б не на Літве, а на Беларусі, дзе ўбачыў Кандратовіч святло і дзе пражыў свой век — паміж Залучам і Барэйкаўшчынай». Вядомы польскі літаратуразнаўца А. Брукнер, азнаёміўшыся з творчасцю паэта, прыйшоў да вываду, што Ул. Сыракомля «сапраўдны пясняр беларускай зямлі, ні ў якім разе не літоўска-жмудскай... яго «Улас» (г. зн. Wtas-Btażej — заўвага аўтара, — К. Ц.), «Янка — вартаўнік могільнік» і г. д., яго засцянковая шляхта, Лагода ці Дэмбарог нават — гэта сапраўдная беларуская кроў».

Тое, што Ул. Сыракомля быў усё жыццё ўлюбёны ў Беларусь, адразу кідалася ў вочы даследчыкам і біёграфам паэта. «Сыракомля, — пісаў у сваіх успамінах пра вясковага лірніка Г. Мяжэнскі, — перавышаў пачуццём і надзвычайнай любоўю да роднай зямлі, можна сказаць, усіх сучасных яму паэтаў... Словам, усё, што гэты чароўны паэт выліваў са сваіх збалелых грудзей, дыхае сапраўднай любоўю — любоўю да ўсяго таго, што сваё, што роднае!»

Матывамі патрыятызму прасякнута ўся творчасць Ул. Сыракомлі — паэзія, драматургія, проза, публіцыстыка. Паэт лічыў, што любоў да сваёй зямлі, да бацькаўшчыны — самае высакароднае пачуццё. Ён адкрыта асуджае тых, хто адракаецца ад свайго толькі таму, што яно сваё, хто, забываючы звычаі роднага краю, слепа пераймае ўсё замежнае, чужое, хто мяняе свой родны край на чужыну. Ні адзін з тых, піша паэт у адным з

вершаў, хто туляецца на чужыне, хто пазнаў там, «што дым родны значыць», цяпер, каб была магчымасць вярнуцца, «ішоў бы да Літвы абдзёрты і босы... Хворы, вярнуў бы здароўе сваёй душы ад шклянкі вады з Немана альбо Гарыні». У творах Сыракомлі можна знайсці нямала прачулых радкоў, прысвечаных родным аколіцам. Гэта вершы і паэмы пра «смутны краю Палессе» («Улас»), пра наднёманскія лугі, якія паэт можа пазнаць «па паху» («Кавалак хлеба»), пра камяніцы і паркі Нясвіжа, «дзе над сінім азерцам стаіць стары замак» («Пілігрым»), пра вуліцы Мінска, які паэт называе «родным» («Тост у доме В. Марцінкевіча», «У коле знаёмых у Мінску»), і г. д.

Патрыятызм Ул. Сыракомлі — і гэта даводзяць сённяшнія даследчыкі творчасці паэта — «быў не польскі ці літоўскі, а «лакальны», г. зн. беларускі» (А. Мальдзіс).

Адправіўшыся ў падарожжа па Польшчы (дарэчы, Ул. Сыракомля ўпершыню наведаў яе ў 1856 годзе, г. зн. усяго за 6 год перад смерцю, будучы ўжо шырокавядомым паэтам), ён заўважае: «Тут, на польскім баку Немана, усё не такое, як у нас». Падарожнічаючы па Польшчы, Сыракомля ні на міг не забывае пра свой родны край, сумуе па ім, а ўбачыўшы Карпаты, не можа ўтрымацца, каб не ўзняцца на высокую гару: магчыма, яму ўдасца ўбачыць адтуль «родную Літву».

Вядома, што Ул. Сыракомля наадрэз адмовіўся ад вабных прапаноў перабрацца жыць у Варшаву, дзе яму, як папулярнаму паэту і публіцысту, давалі пасаду рэдактара спачатку «Biblioteki Warszawskiej», а потым «Gazety Codziennej» — салідных польскіх выданняў таго часу. Вось як гаворыць пра гэта сам паэт у пісьме да А. Плуга: «Прапанову ўзначаліць рэдакцыю я не прыняў, прычыны ты павінен зразумець. Туга па краі, па сваіх, па Вільні забіла б мяне...»

Аб «лакальным» патрыятызме Ул. Сыракомлі вельмі яскрава сведчыць вершаванае апавяданне («гавэнда») «Жменя пшаніцы». Старому Сцяпану, войту, пра якога аўтар гаворыць, што «такога чалавека і са свечкай не знойдзеш», было даручана падабраць сабе замену. Каб выбраць са сваіх трох сыноў новага войта, мудры і справядлівы стары вырашыў зрабіць ім экзамены. Ён адправіў усіх трох у розныя краіны: «Хто з чужой стараны прынясе найбольшую карысць, той стане войтам». Старэйшы сын, Рыгор, вярнуўшыся з Нямеччыны, з захапленнем расказвае бацьку і грамадзе, «які быт у немцаў мілы», якія там капелюшы і кафтаны. «Што тут казаць пра сярмягу? — гаворыць сваім слухачам Рыгор. — Крой дзівацкі ў яе, нечуваны: адразу па ёй відаць галечу! Перакройма ж світкі на кафтаны!» — «Не, яму не быць войтам!» — сказаў па гэта сам сабе стары Сцяпан. Другі сын, які ездзіў у

Польшчу, у Кракаў, «тонам зуха» расказвае пра свае ўражанні: «Якая там мова! **Проша пана** (падкрэслена аўтарам. — К. Ц.), якія песні! Кожны напявае кракавяка. А мы спяваем так нудна...» І малады «зух» самаўпэўнена прапаноўвае сялянам: «Ведаеце, братва, якую дам параду? Кіньма нашы старыя песенькі, паспрабуем танцаваць кракавяк, а я буду весці рэй». Стары Сцяпан, які выказвае настроі і погляды сялян, адразу ж зазначае: «Не, не быць і гэтаму войтам!» І толькі трэці сын, Сымон, які з пашанай і любоўю ставіўся да культуры свайго народа і які прывёз з Украіны на развод жменю пшаніцы, заслужыў бацькава бласлаўенне на пасаду войта. Заканчваючы апавяданне, Ул. Сыракомля гаворыць, што толькі дурань «хоча нямецкім адзеннем пакрыць цела славяніна». Але большы дурань той, хто «пагарджае бацькоўскай зямлёй», хто мяняе родныя песні на «нейкую песеньку з чужой нівы».

Шчырую любоў паэта да Беларусі польскія шавіністы лічылі літоўскім сепаратызмам, тым сепаратызмам, у якім яны абвінавачвалі і выдатнага беларускага рэвалюцыянера Кастуся Каліноўскага, сапраўднага патрыёта Беларусі і разам з тым перакананага інтэрнацыяналіста. Ці не таму доўгі час творчасць Ул. Сыракомлі адсоўвалася недзе на задні план, ігнаравалася, на што звярнуў увагу яшчэ А. Драгашэўскі, дзівячыся «ўбоству літаратуры пра літоўскага лірніка». «Тэарэтыкі» тыпу С. Цывінскага проста заяўлялі, што ў наш век «значэнне Сыракомлі зменшылася», прызнаючы разам з тым, што яго творчасць будзе мець цікавасць больш доўгі час хіба толькі сярод шырокіх мас «на Усходніх Крэсах». Толькі сённяшнія літаратуразнаўцы Народнай Польшчы, узброеныя марксісцка-ленінскай метадалогіяй, рашуча адхіляюць гэтую недаацэнку творчасці выдатнага паэта-дэмакрата, пра што сведчыць, напрыклад, грунтоўны артыкул В. Кубацкага «Гавэнда пра Сыракомлю», дзе ён перакананўча даводзіць, што Ул. Сыракомля — паэт «далека не малой меры».

«Сепаратызм» Ул. Сыракомлі меў у сваёй аснове класавыя карані. Перад ім стаяла дылема: з кім ісці — з польскім панам, прыгоннікам, супроць беларускага селяніна ці наадварот — з беларускім селянінам супроць польскага пана. Ул. Сыракомля фактычна выбраў апошняе.

Паэт паслядоўна, з уласцівай яму публіцыстычнай страснасцю абараняў інтарэсы запрыгоненага беларускага селяніна, змагаючыся за яго разняволенне, за адмену бесчалавечнага прыгоннага права, якое зжыло сябе як эканамічна, так і маральна. «Я край мой кармлю ад веку і маю права звацца чалавекам», — заяўляў вуснамі свайго паэта селянін-беларус. Гэтае патрабаванне Сыракомлі аддаць народу ўсе яго чалавечыя

правы пазней падхопіць і ўзніме як неадкладны лозунг часу вялікі абаронца свайго народа Янка Купала. Дарэчы, паэзія Я. Купалы, які надзвычай высока цаніў вясковага лірніка за яго дэмакратызм, за тое, што ён не забыўся «слоў беларускіх», сваімі некаторымі матывамі, вобразамі вельмі пераклікаецца з творчасцю Сыракомлі, што дае падставу гаварыць аб уплыве Сыракомлі на Купалу як аб адным са звенняў пераемнасці беларускай літаратуры. Абодва паэты былі выразнікамі самых кроўных інтарэсаў беларускага народа на розных этапах яго гісторыі: «Не я пяю, а люд божы, які песню ва мне творыць», — гаварыў Ул. Сыракомля, падкрэсліваючы сваю непарыўную злітнасць з мужыком-беларусам, «адвакатам і прадстаўніком на Парнасе» якога быў.

Вельмі ярка і зусім недвухсэнсоўна выказаўся Ул. Сыракомля аб сваёй блізкасці да беларускага народа ў выдатным вершы «Вясковы лірнік». Паэт піша, што яго ліру «людзі пояць слязьмі». Таму ён спадзяецца, што рэха ад яго песень панясецца шырока на свеце — «ад краю да краю, да самага Дунаю, да самага Кіева». І калі-небудзь пасля яго смерці «ў акно суседа пастукае грамада чужых людзей» і скажа: «Прыйшлі мы паглядзець, дзе ваш лірнік спачывае, лірнік, знаны ў свеце». Слухаючы гасцей, «люд з усёй вёскі будзе дзівіцца і шаптаць, паціскаючы плячыма: «Адкуль яны, людзі з далёкіх краёў, ведаюць песні гэтай вёскі?» І, вядома ж, здагадаюцца, што гэта разнёс іх па свеце «наш лірнік вясковы», і таму з гордасцю «перад людзьмі з чужой зямлі ўсёй душой будуць славіць лірніка, што спяваў і жыў з імі».

Пад гэтым вершам значыцца: «Залуча, 18 студзеня 1852 года». Адсюль вынікае, што вёска, якая зможа ганарыцца сваім лірнікам і песні якой ён разнясе па свеце, быў Жукаў Барок (за паўкіламетра ад Залучанскай сядзібы паэта). Іншымі словамі, Ул. Сыракомля тут сам прызнаецца, што асновай яго творчаеці быў беларускі фальклор. І гэта зусім не голая дэкларацыя. Пра творчае выкарыстанне Ул. Сыракомлем беларускага фальклору ёсць нямала сведчанняў як польскіх, так і беларускіх даследчыкаў. Многія вершы Ул. Сыракомлі — гэта «творчае наследаванне і апрацоўка беларускіх песенных матываў» (С. Александровіч).

Як пясняр і абаронца народа Сыракомля не мог без сарказму і гневу гаварыць пра яго прыгнятальнікаў. Каб пераканацца ў гэтым, даволі перачытаць такія творы паэта, як «Ілюмінацыя», «Вызваленне сялян», «Лялька», «Нядзеля», «Эпітафія землеўласніку» і г. д. Свае адносіны да паноў вельмі выразна выказаў Ул. Сыракомля і ў вершы «Вясковы музыка», прысвечаным С. Манюшку. Стары музыка раіць маладому кінуць

свой «марны» занятак, бо ва «ўбогай вёсцы» яму не шмат заплацяць: «Тут рэдка абсеўкі, дажынкі, вяселлі, тут хлеба не вельмі, гулянак не вельмі». Малады падае думку, што трэба кінуць вёску, «дзе жывуць небаракі», і адправіцца са скрыпкай туды, «дзе багатыя людзі». «О дзіця! — адказвае на гэта стары, — ...лепш знямець са сваімі песнямі, чым стукаць у дзверы багатых... Нічым не кранеш іх, бо ў душы іх — холад, слухаюць яны з пагардай на твары». Усё гэта, вядома, не магло не раздражняць закаранелых прыгоннікаў. Так, клерыкальны «Przegląd Poznański» адкрыта нападаў на творы Ул. Сыракомлі якраз за тое, што ў іх ён убачыў «выбух... нястрыманага і ніяк не зразумелага нам гневу супроць паноў і князёў...» Ф. Беляк у заўвагах да выбранага Ул. Сыракомлі прыводзіць таксама яскравы ўрывак з верша Ф. Вэнжыка, які абвінавачваў вясковага лірніка ў тым, што ён «бэсціць» у асобных творах «польскую шляхту».

Супрацьпастаўляючы высокія маральныя якасці беларускага селяніна маральнай разбэшчанасці, фанабэрыі і ганарлівасці шляхты, Ул. Сыракомля смела выкрываў міф аб яе выключнасці, аб яе праве гаспадарыць над мужыком. Вельмі яскрава выказана гэта ў знойдзеным мною першапачатковым варыянце кнігі Ул. Сыракомлі «Вандроўкі па маіх былых аколіцах», які захаваўся ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літоўскай ССР. Разважаючы пра старажытнасць беларускіх вёсак, Ул. Сыракомля пісаў (гэты ўрывак выкраслены рукой цэнзара): «І не адно мужыцкае імя добра было вядома праз вякі ў сваёй ваколіцы, пакуль не з'явіліся імёны і гербы мажнаўладцаў. Калі б народ наш лепей помніў мінулае, калі б разумеў ідэі так званай гістарычнай арыстакратыі — як бы ён пасмяяўся з нашай пыхі, з таго, што мы ганарымся старажытным, трыста гадоў назад атрыманым гербам, ён, што тысячы год налічвае ў сваёй генеалогіі... Наш селянін не піша і не чытае гісторыі, але, верачы ў якое-небудзь сваё мясцовае паданне, з пагардай паглядае на шляхецкую расу, інстынктыўна адчуваючы, што мы — прыхадні адкульсьці, а ён — тутэйшы жыхар і гаспадар тутэйшай зямлі».

Якраз дзеля таго, каб беларускі народ успомніў сваё мінулае і тым самым усвядоміў, што ён «гаспадар тутэйшай зямлі», Ул. Сыракомля і ўзяўся падымаць з забыцця гэта мінулае, звярнуўшыся да гісторыі, да цікавай і самабытнай культуры беларускага народа. Гісторыі Беларусі быў прысвечаны ўжо самы першы твор Ул. Сыракомлі, які прызначаўся для друку, — вялікая і даволі грунтоўная нататка пра мінулае Нясвіжа, апублікаваная ў «Старажытнай Польшчы» М. Балінскага за 1846 год. Дарэчы, у арыгінале нататкі, які захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літоўскай ССР (аддзел рукапісаў, ф. 81—36, арк. 10-13), астаўся

неапублікаваны дадатак — апісанне каштоўнасцяў Нясвіжскага замка, якое і цяпер мае цікавасць для даследчыкаў нашай культуры. Гісторыі беларускіх мястэчак (Нясвіжа, Стаўбцоў, Койданава, Міра), быту беларусаў, іх вуснапаэтычнай творчасці прысвячае паэт і сваю кнігу «Вандроўкі па маіх былых аколіцах» (1853); пра вёскі і мястэчкі беларускага Прынёмання расказвае Ул. Сыракомля ў кнізе «Неман ад вытокаў да вусця» (1861). Вялікую цікавасць мае аб'ёмістая манаграфія Ул. Сыракомлі «Мінск», якая друкавалася ў двух нумарах часопіса «Teka Wileńska» (1857). У гэтай працы аўтар грунтоўна раскрыў гісторыю Мінска, якая прасочваецца па фоне ўсёй гісторыі Беларусі, расказаў пра быт і заняткі сучасных яму мінчан, а таксама на аснове фальклору беларусаў імкнуўся паказаць старажытную культуру «крывічан». Прытым, аўтар асабліва засяроджвае ўвагу на тых фактах з гісторыі Беларусі, якія найбольш красамоўна расказваюць пра яе славу, якія самі па сабе маглі ўздымаць нацыянальны дух беларусаў. Так, значнае месца адводзіць Ул. Сыракомля разгляду «Слова аб палку Ігаравым», якое, паводле яго меркавання, напісана «на царкоўнабеларускай мове», напісана мінчанінам, з прычыны чаго Мінск павінен карыстацца славаю горада «старажытнай паэзіі, мясцовай песні, на той самай мове, на якой спявае свае песні наш народ у час жніва». Шмат каштоўнага матэрыялу па гісторыі і культуры Беларусі можна знайсці і ў дарожных нарысах Ул. Сыракомлі «Экскурсіі па Літве ў радыусе ад Вільні» (т. I — 1857, т. II — 1860). Пра гістарычнае мінулае Ашмян, Смаргоні, багушэвічаўскіх Жупран, пра быт насельніцтва гэтых аколіц шмат цікавага расказана паэтам у дарожным дзённіку, які ён вёў, едучы ў 1856 годзе праз Беларусь у Варшаву. Гэты дзённік трапіўся мне ў рукі пры азнаямленні з матэрыяламі Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва Літоўскай ССР. Раскрыццю быту падвіленскіх беларусаў, іх вуснапаэтычнай творчасці прысвячае паэт шматлікія артыкулы ў «Віленскім весніку», у раздзеле «Мясцовы агляд», які вёў паэт будучы штатным супрацоўнікам газеты. Ёсць у Сыракомлі асобныя артыкулы пра Валожын, пра Нясвіжскі замак, пра ахову гістарычных помнікаў Беларусі. Захаваліся ў рукапісе накіды артыкула пра Маладзечна, дзе паэт меркаваў паказаць усю гісторыю горада, пачынаючы з далёкай старажытнасці.

Адным з найбольш важных клопатаў Ул. Сыракомлі была барацьба за права беларускага народа ствараць культуру на сваёй роднай мове. Пра гэта яскраве сведчыць даволі грунтоўнае «Кароткае даследаванне мовы і характеру паэзіі русінаў у Мінскай правінцыі», якое друкавалася ў трох нумарах «Gazety

Warszawskiej», а таксама чатыры артыкулы пра творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Насуперак шляхце, якая называла беларускую мову «хамскей», «гміннай», Ул. Сыракомля пісаў: «Прыгожае гэта адгалінаванне славянскай мовы — крывіцкі дыялект, і стары! Бо гэта мова нашага Літоўскага Статута і справаводства на працягу двух вякоў, XVI і XVII, і распаўсюджаная! Бо смела можна сказаць, што резмаўлялі на ёй тры чвэрці даўняй Літвы, люд, шляхта і паны; пазбавіўшыся свайго пісьмовага значэння, гэтая мова сёння асталася толькі адной спадчынай сялянскіх хат...» Паэт шкадуе, што «багатая калісьці, яго (беларускага народа. — К. Ц.) мова знаходзіцца цяпер у застоі, яна перастала ўзбагачацца, а тыя, што хацелі зрабіць яе пісьмовай і тым самым заахвоціць народ да кнігі, вымушаны змагацца з многімі цяжкасцямі».

Ул. Сыракомля горача падтрымліваў і абараняў ад нападкаў рэакцыянераў беларускую літаратуру. Пасля першых двух артыкулаў пра В. Дуніна-Мерцінкевіча ў той жа «Gazecie Warszawskiej» з'явіўся водгук на іх пана Ф. Скібіцкага, які падпісваўся псеўданімам У. Аўтар гэтага водгуку, што называўся «Творы на гміннай гаворцы», выступіў супроць Сыракомлі, які з вялікай радасцю сустракаў творы на беларускай мове.

Уладзіслаў Сыракомля ў сваім новым артыкуле разбівае адзін за адным усе довады пана Скібіцкага. Перш за ўсё, прыводзячы пастаўленае Скібіцкім-пытанне: «Ці творы, напісаныя на мове беларусінаў, заслугоўваюць такога радаснага вітання, безадносна на вертасць іх зместу?», Ул. Сыракомля з перакананасцю адказвае: «Любы, на любой мове напісаны твор не заслугоўвае радаснага вітання, калі ён нецікавы, непрыдатны; але калі якая-небудзь мова або гаворка з непісьмовай становіцца пісьмовай, кожная напісаная на ёй кніжка заслугоўвае ўвагі — як довад узнікаючай патрэбы пісання на гэтай мове або гаворцы...» На другое пытанне пана Скібіцкага: «Ці зможа гэтая мова (беларуская) перадаваць усе адценні думкі, быць прыдатнай для розных стыляў і ўдасканаліцца да такой ступепі, каб заслужыць назву асобнай мовы», Ул. Сыракомля зноў з глыбокім перакананнем адказвае: «Так, зможа, бо мае дастаткова лёгкасці і адначасова сілы, перадае ў паэзіі мяккія і далікатныя пачуцці, у жывой гаворцы мае лёгкія звароты, трапныя выразы. Нестае ёй многіх выразаў для перадачы таго, што не ўваходзіць у склад паняццяў і патрэб нашага народа, але ў меру развіцця асветы самога народа і літаратуры на яго мове гэтая мова патрапіць знайсці ў сваёй глыбіні выразы і словазвароты, якіх няма сёння. Кожная мова праходзіць эпоху дзяцінства». Адказваючы на трэцяе пытанне Скібіцкага, ці варта імкнуцца, як гэта робіць Сыракомля,

да ўдасканалення беларускай мовы як мовы асобнага народа, паэт-дэмакрат даводзіць, што не толькі варта, але і «неабходна». «Надзвычай разнастайную ўвогуле мову Славяншчыны, — піша Ул. Сыракомля, — шаноўны апанент дзеліць толькі на чатыры разгалінаванні — на мову расійскую, польскую, чэшскую і ілірыйскую. Не пярэчым, што гэтыя чатыры мовы стаяць на першым месцы сярод славянскіх дыялектаў па сваёй пісьмовай дасканаласці, але чаму ж іншым мовам не даваць развівацца, нашто ж, напрыклад, у мове беларусінаў бачыць толькі мешаніну моваў рускай і польскай? Ці тое ж самае не можна сказаць і пра маларасійскую мову? Калі так, то чаму ж шаноўны апанент чэшскую і ілірыйскую мову ўзвышае да годнасці асобных моваў? У іх жа таксама лёгка знойдзеш і рускія і польскія выразы». Далей паэт гаворыць пра самабытнасць, адметнасць беларускай мовы, выкрывае хлусню шавіністаў, быццам бы яна — толькі дыялект польскай або рускай мовы. У заключэнне аўтар выказвае ўпэўненасць, што беларуская мова будзе развівацца і ўдасканальвацца. «З усёй павагай да шаноўнага апанента, — піша Ул. Сыракомля, паўтараем: на гэтым полі працаваць можна і варта (падкрэслена аўтарам. — К. Ц.)». У сувязі з гэтым вясковы лірнік ад усяго сэрца заклікае паэта з большай адказнасцю і «ур'ёзнасцю ставіцца да мовы сваіх твораў, раіць яму, каб ён «асцерагаўся паланізмаў і кніжных выразаў, каб правінцыялізмаў адной ваколіцы і парафіі не прыпісваў усёй русінскай мове, каб тады толькі ўжываў чужыя выразы, калі не знойдзе адпаведных у мове, на якой піша».

Робячы разгляд беларускіх твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, Ул. Сыракомля заклікаў яго «выключна (слова «выключна» ён падкрэслівае. — К. П.) прысвяціць сябе» творчасці на беларускай мове. Падкрэсліваючы тую вялікую ролю, якая выпала на долю В. Дуніна-Марцінкевіча як беларускага паэта, Ул. Сыракомля ў рэцэнзіі на яго кнігу «Цікавішся? Прачытай!» зноў даводзіць, што «народная, русінская паэзія — вось арэна п. Марцінкевіча, няхай жа ён выступае на ёй як сапраўдны гладыятар».

Цяжка пераацаніць значэнне гэтых публіцыстычных выступленняў Ул. Сыракомлі для развіцця беларускай літаратуры. Яе парасткі патрабавалі тады асаблівай, павышанай увагі і падтрымкі, бо ўзышлі на вельмі неспрыяльнай глебе — у атмасферы варожасці пануючых класаў да беларускага народа і яго культуры. Гэтую ўвагу і падтрымку маладая беларуская літаратура і атрымала ад Уладзіслава Сыракомлі, імя якога было ў той час аўтарытэтнае. І трэба поўнасцю згадзіцца са сцверджаннем А. Лойкі і Н. Перкіна, што без гэтай падтрымкі «перш за ўсё» з боку Сыракомлі «Дунін-Марцінкевіч, магчыма, не

стаў бы тым, чым ён стаў для беларускай літаратуры». Нездарма беларускія паэты заўсёды шукалі ў Ул. Сыракомлі дапамогі, пісалі яму, як чалавеку, які робіць агульную з імі справу. Пра гэта яшчэ раз сведчаць тыя пісьмы В. Дуніна-Марцінкевіча і А. Вярыгі-Дарэўскага, якія асталіся пасля смерці (1969 г.) унучкі паэта — Былінскай.

Вядома, з усяго гэтага ўзнікае вельмі лагічнае пытанне: як жа так сталася, што Ул. Сыракомля, які гэтак горача вітаў кожны літаратурны твор беларускай мовы, клапаціўся аб удасканаленні беларускай літаратурнай мовы, аб яе чысціні, які быў не простай «зоркай», а якраз «сонцам» беларускага адраджэння, пісаў свае творы ўсё ж на польскай мове?

Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна звярнуцца да гісторыі. Як вядома, Беларусь, якая апынулася яшчэ ў XVII стагоддзі над пратэктаратам Польшчы, больш за дзвесце гадоў цярпела жорсткі нацыянальны прыгнет. Беларуская мова, якая раней была дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, паступова выцяснялася з літаратуры польскай мовай. Нават пасля ўз'яднання з Расіяй у канцы XIX стагоддзя польская мова яшчэ доўгі час лічылася афіцыйнай на беларускіх землях. «Усё, што думае аб грамадскіх справах, — пісаў пра гэты час З. Серакоўскі, — усё, што піша і чытае ў Заходнім краі, — усё гэта цадкам польскае». І таму пісьменнік, які хацеў нешта сказаць адукаванаму грамадству, вымушаны быў пісаць на польскай мове. А Ул. Сыракомля якраз і імкнуўся, як прызнаваўся сам, уздзейнічаць сваімі творамі на грамадскую думку. Перад сабой ён паставіў адну вялікую задачу — паказаць антычалавечую сутнасць прыгоннага права, пераканаць грамадства ў яго амаральнасці, у тым, што і мужык — чалавек, што ён павінен карыстацца ўсімі чалавечымі правамі, у тым ліку ствараць літаратуру на роднай мове. Якраз у гэтым —асноўны пафас усёй творчасці Ул. Сыракомлі. Паэт верыў, што вызваленне сялян можа адбыцца «зверху», па волі саміх памешчыкаў і цара. Таму і адрасавана яго творчасць пераважна шляхце, якую крытыкаваў паэт. А каб гэтая шляхта, ад якой залежала, на яго думку, вызваленне сялян, зразумела паэта, каб яго слова трапіла ў цэль, трэба было гаварыць з ёю на яе мове, г. зн. па-польску. Пісалі па-польску і сучаснікі Ул. Сыракомлі — В. Дунін-Марцінкевіч і А. Вярыга-Дарэўскі. Па-беларуску яны пісалі тады, калі звярталіся непасрэдна да селяніна, імкнучыся, як сцвярджаў В. Дунін-Марцінкевіч у пісьме да Ю. Крашэўскага, «заахвоціць яго якім-небудзь чынам да асветы і направіць маральна». Гэтае высакароднае імкненне беларускіх паэтаў да асветы роднага народа, як адзначалася, усімі сіламі падтрымліваў Ул.

Сыракомля. Разам з тым ён лічыў, што без поўнага сацыяльнага разняволення беларускага народа не можа быць сапраўднага развіцця беларускай культуры, літаратуры. За гэтае сацыяльнае вызваленне і змагаўся ў першую чаргу Ул. Сыракомля.

Літаратурная праца для Сыракомлі, як відаць з біяграфіі, была галоўным сродкам існавання. Праца на панскіх фальварках (спачатку — Залуча, а потым— Барэйкаўшчына), якія арандаваў паэт, давала мала, на што неаднаразова скардзіўся сам паэт. Каб пракарміць вялікую сям'ю, беднаму арандатару даводзілася вельмі многа пісаць, за што не раз папракала яго крытыка. Паэт прызнаваў: «Папрокі варшаўскіх газетчыкаў аб тым, што працую я паспешліва і шмат друкуюся, у значнай ступені справядлівыя, але маё становішча, святы абавязак па ўтрыманні трох дамоў сваёй радні прымушаюць мяне спяшацца». Пісаць на беларускай мове, якая была ў той час, як вядома, пад забаронай, азначала б для Ул. Сыракомлі пакінуць тыя дваццаць з лішнім «галодных губ», якія штодзённа чакалі «вынікаў яго пяра», без кавалка хлеба, пусціць сям'ю па свеце з жабрачай торбай. Гэта была ў той час вялікая «раскоша» — пісаць на беларускай мове. Але чаму ж тады, можа ўзнікнуць пытанне, гэтую «раскошу» дазволілі сабе сябры і землякі Ул. Сыракомлі, яго аднадумцы В. Дунін-Марцінкевіч і А. Вярыга-Дарэўскі? Справа ў тым, што як В. Дунін-Марцінкевіч, так і А. Вярыга-Дарэўскі пачалі пісаць толькі пасля таго, як сталі больш ці мепш матэрыяльна незалежныя. Ул. Сыракомля да канца жыцця так і пе «ўзбіўся» на свой кавалак зямлі.

Нягледзячы на ўсе гэтыя вельмі слушныя прычыны, Ул. Сыракомля ўсё ж не мог не пісаць і па-беларуску. На жаль, да нас дайшла толькі мізэрная частка беларускай спадчыны вясковага лірніка — вершы «Добрыя весці» і «Ужо птушкі пяюць усюды...». Але ў сапраўднасці беларускіх вершаў было значна больш. «Калі да нас дайшло так мала беларускіх вершаў Кандратовіча, — слушна заўважае ва ўступе да зборніка паэта польскі літаратуразнаўца, даследчык творчасці Ул. Сыракомлі Ф. Беляк, — то вінаваты ў гэтым у пэўнай меры ваенныя падзеі, але, бясспрэчна, што многія з іх кружылі ў рукапісах. Як вядома, і польскія творы, напрыклад, «На вызваленне сялян», «Авідзій на Палессі», «Сахар-мароз», хадзілі толькі ў рукапісах. А справа з беларускім пісьменствам была яшчэ горш, нават не было дазволена друкаваць перакладу «Пана Тадэвуша». Заканспіраваныя беларускія тэксты Кандратовіча жылі, але ва ўмовах тайнай прэсы, што нам сёння вельмі перашкаджае па-сапраўднаму ацаніць гэтую надзвычай няпоўную творчасць паэта». Беларускімі вершамі Ул. Сыракомля заклікаў народ сілай дабівацца сваіх правоў. Нездарма абодва беларускія вершы

вясковага лірніка былі напісаны ў часы найбольшага ўздыму пароднага руху: першы, «Добрыя весці», у 1848 годзе, — у перыяд «Вясны народаў»; другі, «Ужо птушкі пяюць усюды», — у 1861 годзе, — напярэдадні студзеньскага паўстання. Верш «Добрыя весці», за распаўсюджванне якога ў час паўстання 1863 года ссылалі ў Сібір, паказвае нам, як сцвярджае Ф. Беляк, «іншае аблічча паэта, найбольш рэвалюцыйнае».

Акрамя вершаў рэвалюцыйнага зместу, у Сыракомлі было яшчэ нямала беларускіх твораў больш «памяркоўных». Якраз іх ён хацеў выдаць разам з беларускімі вершамі В. Каратынскага асобным зборнікам, бо аб выданні такіх вершаў, як «Добрыя весці» і «Ужо птушкі пяюць усюды...», накіраваных супроць «цароў-паганцаў», не магло быць і гаворкі. Паводле сведчання А. Кіркора, многія з тых беларускіх вершаў Сыракомлі сталі народнымі песнямі, і іх «спяваюць усюды». Спрабаваў Сыракомля пісаць і лібрэта беларускай оперы для кампазітара Лапатынскага, але на шляху да ажыццяўлення гэтай задумы стаялі неадольныя перашкоды.

Уладзіслаў Сыракомля шырока адчыняў дзверы беларускай моўнай стыхіі ў сваіх польскіх творах, за што вельмі часта крытыкаваўся ў польскім друку. Так, крытык С. Лісоўскі, даючы высокую ацэнку кнізе перакладаў Ул. Сыракомлі з лацінскіх паэтаў, агаворваўся: «Праўда, сустракаюцца і недахопы, але яны, як відаць, з'явіліся вынікам паспешлівасці выпадкова. Дзіўна, напрыклад, гучыць для нас выраз на стар. 27: «Не заўсёды квеценню красуюць у агародзе», бо мы не разумеем, што азначае «красуюць», так, як не разумеем, што такое «сумёты»... і г. д. Гэта, праўда, дробязі, але бачыць іх нам непажадана. Нашто ж гэтыя правінцыялізмы, калі яны не для ўсіх зразумелыя». Без тлумачэнняў гэтых «правінцыялізмаў», а правільней — беларускіх слоў і выразаў, не абыходзіцца сёння ніводнае выданне твораў Сыракомлі — інакш паэт проста не быў бы зразумелы польскаму чытачу. Ф. Беляк, напрыклад, у складзенай ім кнізе выбраных твораў Ул. Сыракомлі дае вельмі шмат тлумачэнняў «правінцыялізмаў, частых у Сыракомлі». Так, ужо ў першай гутарцы паэта «Паштальён», што стала папулярнай рускай народнай песняй («Ямщик»), укладальніку давялося растлумачыць такія «правінцыялізмы», як «люлька», «сумёт», «чмыхнуць», «пісар», выраз «што табе так баліць» і нават самую назву «паштальён». Яшчэ больш было беларусізмаў у рукапісах Сыракомлі, але пры друкаванні занадта старанныя рэдактары імкнуліся «падгладзіць», «падшліфаваць» мову паэта. Не пазбегнуў гэтага і найбольш сумленны з іх — складальнік дзесяцітомніка Сыракомлі выдання 1872 года, з якога вось ужо

100 год перадрукоўваюцца творы паэта, В. Каратынскі. «Каратынскі, — заўважае В. Кубацкі, — знішчае ўсялякія рэгіянальныя рысы Сыракомлі — дыялектызмы, правінцыялізмы і «перыферыйныя архаізмы», гвалтоўна падцягваючы крэсавага паэта да агульнапольскай, варшаўскай літаратурнай нормы». Вядомы польскі мовазнаўца Ю. Трыпуцька, аналізуючы мову Сыракомлі, выявіў, як ён сам сцвярджае, «цэлы шэраг фанетычных, словатворных, сінтаксічпых і лексічных асаблівасцяў, якія можна растлумачыць толькі і выключна крэсавым паходжаннем паэта. Часам ён выкарыстоўваў іх свядома як стылістычпыя сродкі... найчасцей, аднак, рабіў гэта несвядома, бо былі яны, так сказаць, у яго ў крыві, бо яны складалі неад'емную частку яго ўласнай гаворкі і мыслення...» Заканчваючы сваю грунтоўную двухтамовую працу пра мову Уладзіслава Сыракомлі, Ю. Трыпуцька прыходзіць да вываду, што «ні ў аднаго яшчэ польскага пісьменніка не ўдалося выявіць такой вялікай колькасці беларускага элемента, як у яго. У адрозненне ад іншых іншаземных слоў і выразаў, гэты элемент ахоплівае ўсе часткі граматыкі і амаль усюды глыбока пусціў карэнне».

У творчасці Уладзіслава Сыракомлі знайшлі сваё адлюстраванне ўсе бакі жыцця Беларусі напярэдадні скасавання прыгоннага права. Па творах паэта мы можам вывучыць не толькі грамадскія ўзаемаадносіны перыяду крызісу феадалізму, але і ўмовы жыцця беларускага народа таго часу, яго быт, матэрыяльную і духоўную культуру. Без творчасці Сыракомлі, якая рабіла значны ўплыў на тагачасную грамадскую думку, мы не можам па-сапраўднаму зразумець і фармаванне поглядаў вялікага сына беларускага народа Кастуся Каліноўскага, сучасніка і ў многім аднадумца Сыракомлі. Адным словам, творчасць Сыракомлі — гэта шырокае акно ў тую далёкую ад нас эпоху.

Так разважаў я, ходзячы па сцежках Сыракомлі, успамінаючы прачытанае, знойдзенае ў архівах.

У Навагрудку я сустрэў «звяздоўца» Зіновія Прыгодзіча. Мы пахаўрусавалі з ім і ўжо разам блукалі па дарогах Навагрудчыны.

Тут усё, здавалася, было авеяна паэзіяй: зялёныя мурожныя ўзгоркі, шумлівае веча каласоў на бяскрайніх палетках, раскошныя, спакойна-велічныя бярозы абапал люстранога асфальту гасцінцаў, прымружаныя сіняватай смугой лясы ля далёкіх небасхілаў.

Мы вырашылі прайсці пеша да вядомага возера Літоўка, куды любіў хадзіць Адам Міцкевіч і дзе бываў, каненше ж, Уладзіслаў Сыракомля.

У небе плылі рэдзенькія белыя аблачынкі, над галавой снавалі пчолы. На поплаве, які ад празрыстых хваляў Літоўкі

цягнуўся нешырокай паласой уздоўж агародаў, цвілі рамонкі. Іх было так многа і былі яны такія буйныя, вясёлыя, што Зіновій не ўтрымаўся — пачаў складаць букет.

Пажылога веку жанчына, якая падграбала на мяжы, пад дубамі, сена, убачыўшы нас, перапыніла сваю работу.

— З горада, мусіць? — загаварыла яна да нас.

— Ага, з Мінска, — адказалі мы.

Жанчына, абапёршыся на граблі, глядзела на нас. Мы спыніліся каля яе, загаварылі.

Жыла яна адна, у той унь старой хаце, якую нядаўна купіла.

— Цікава, колькі ж вы за яе заплацілі?

Раней у мяне была мара: набыць у такой вось палявой цішыні, з такім вось возерам і такімі лясамі, звычайную сялянскую хату і, пакінуўшы «цывілізаваны свет», пасяліцца, як гэта зрабіў у мінулым веку вядомы амерыканец Генры Тора, сярод птушак і дрэў, расы і сонца. Але «цывілізацыя» мяне ўсё ж не адпусціла. Цяперашняе маё пытанне было запозненым адгалоскам тых юнацкіх летуценняў.

— А, вы зайдзіце паглядзіце, колькі за яе можна даць, ухапілася жанчына за гэтае мае пытанне.

— Ды мы проста так пацікавіліся, цётка.

— А вы зайдзіце, зайдзіце...

Хоць ужо накрапваў дождж, жанчына пакінула на сене граблі і навяла нас у хату. Хата была падзелена на дзьве палавіны. У першай, прыхожай, печ, на зэдліках падаконніках ціснуліся гладышы і слоікі, каля печы ложак, тут, мусіць, жанчына і спіць. Другая палавіна, святліца, пустая, толькі фікусы пасярэдзіне.

Жанчына пасадзіла нас за стол.

— Можа, малака выпілі б?

— Яно, калі можна, было б няблага...

Яна адразу замітусілася. Праз хвіліну паставіла перад намі гладыш малака, сыр, хлеб.

Сама, прысеўшы, глядзела на нас і гаварыла, гаварыла — як быццам даўно нас чакала і цяпер вось, дачакаўшыся, выказвала ўсё, што сабралася ў яе на душы.

— Ешце, ешце, я яшчэ прынясу... Малака ў мяне хапае — адна ж...

Мы пацікавіліся, а дзе ж жывуць і працуюць яе дзеці.

Жанчына, адразу спахмурнеўшы, адказала, што дзяцей у яе не было. Яна проста не выходзіла замуж. Увесь век адна.

— Вы ж ведаеце, як пры панах жылося. Адно гора. У маёй мамы было нас дзевяцера... У хаце — вечныя няхваткі. Пасватаўся да мяне адзін хлопец. Харошы такі, праўда — маўчун. Але не аддалі мяне за яго. Не было грошай на пасаг. Можна было б

прадаць каня, але што гэта за гаспадарка без каня? Чухаў, чухаў бацька патыліцу і нічога не прыдумаў. Рукі мае, да таго ж, таксама патрэбны былі ў гаспадарцы. Так і асталася ў дзеўках. Малодшыя сестры пападрасталі, замуж павыходзілі — мы ўжо трохі сталі на ногі тады. А мяне ўжо ніхто не браў — перарасла... Цяпер жывецца унь як добра, каб гэта, кажацца, тады так. І карову дзяржу, пакуль магу, і свіней...

Мы даўгавата-такі пасядзелі ў хаце. Пэўна, пабылі б яшчэ, але пацямнела ад хмары, недзе заварочаліся грымоты.

Калі мы, падзякаваўшы, усталі, каб ісці, вочы жанчыны адразу неяк згаслі.

— А можа б, пабылі яшчэ трохі, — сказала яна ціхім, няўпэўненым голасам.

Мы растлумачылі ёй, што хутка павінен падысці аўтобус; калі пачнецца дождж, нельга будзе ісці, а гэта ж апошні рэйс да Навагрудка.

Мы пайшлі. Жанчына прыцішана стаяла ў дзвярах і моўчкі глядзела нам уелед.

Свае «вандроўкі» я закончыў у старажытным горадзе Рагнеды і Ізяслава — Заслаўі, у якім таксама бываў і пра які пісаў Сыракомля.

Тут, у ваколіцах Заслаўя, паэт меў нават намер назаўсёды пасяліцца з сям'ёю. Ён прыязджаў ужо сюды купляць зямлю.

Было гэта за які год перад выездам у Вільню з залучанскай сядзібы. Якраз тады Сыракомля песціў мару аб набыцці ўласнай зямлі. Штурхала яго к гэтаму вельмі незайздроснае становішча арандатара. Арэнда амаль нічога не давала немалой ужо сям'і паэта. З мізэрных прыбыткаў ад яе часам нельга было нават пагасіць пану арэндную плату. Звычайна ў такім становішчы арандатары павялічвалі падаткі сялян, выціскаючы з іх усё, што толькі было можна. Сыракомля ж, будучы не толькі на словах, але і на справе перакананым дэмакратам, пайсці на гэта не мог. Каб звесці канцы з канцамі, ён карпеў над перакладамі з лацінскай мовы розных гістарычных прац, падрываючы сваё здароўе. Усё гэта перашкаджала яму займацца сваёй любімай справай — мастацкай творчасцю. Толькі свая зямля магла б даць яму такую мажлівасць. Прытым, уласная зямля вызваліла б паэта ад прыкрай неабходнасці быць, хоць і не паўнапраўным, гаспадаром прыгонных сялян — «братоў у сярмязе».

Паэт так марыў аб уласным кутку на зямлі, што нават пісьмо да рэдактара газеты «Віленскі веснік» А. Адынца з просьбай змясціць аб'яву аб куплі зямлі напісаў у форме верша. У ім Сыракомля гаворыць, што памешчыкі вясной мараць аб набыцці новых капіталаў, мараць сваім золатам закабаліць як мага болей

людзей. Яму ж, паэту, не трэба многа грошай, да якіх ён адносіцца «з пагардай», не трэба вялікіх надзелаў. Ён шчыра прызнаецца:

Была б страха, хоць і нізкай хаты,
Сэрда пры сэрцу, крынічка ў травах,
Тытунь для цыгаркі, шклянка гарбаты,
Больш ні пра што я не сніў бы нават...

Ды на арэндзе маёй дагэтуль,
На жаль, я не маю такой раскошы:
Амаль не родзіць пясчаны палетак,
З кішэні як бачыш знікаюць грошы...

Між тым, працягвае паэт, пан патрабуе хутчэйшай выплаты за арэнду, бо інакш зусім выганіць з яе, а ляснічы пагражае, што «на камінак дрэва не дасць мне». Таму Сыракомля просіць сябра-рэдактара, каб ён змясціў у сваёй газеце аб'яву пра тое, што адзін сціплы паэт «хоча купіць зямлі з чатыры валокі»,

Купіць страху, што яго заслоніць
Ад зімняй сцюжы і спёкі лета,
Дзе, вольны, з лютняй сваёй у далоні
Складаў бы песні ён ды санеты,

Дзе б мог ён бачыць з вакна небасхілы,
Вясковыя стрэхі, крыжы на магілах,
Альбо сустрэцца б мог з селянінам,
Свабодна паплакаць горкай часінай.

Няхай была б мне сялянская хата
Рада, калі б я яе наведаў.
Хай мяне дрэў акружалі б шаты,
І побач бачыў сядзібу суседа.

А калі б чуў я звон кос між ракітаў!
А калі б бачыў, як жнеі жнуць жыта!..
Як бы там пелася! Хіба ж не ўцеха:
З лесам ва ўласнасць купіць сабе рэха!

Нягледзячы на гэта, усё ж газета не дапамагла Сыракомлю.

Аднойчы паэт, завітаўшы да сваіх сяброў у Мінск, пачуў аб продажы ў яго ваколіцах зямлі. Ён праз колькі часу сеў у вазок і

рашуча пакаціў да прадаўца.

Прадаўцом аказаўся памешчык Юльян Гарайн, таксама літаратар. Цікава расказвае пра ўсё гэта сам Гарайн, які яшчэ да гэтага добра ведаў па друку Уладзіслава Сыракомлю як паэта, друкаваўся разам з ім у віленскіх выданнях, захапляўся яго вершамі, але вось асабіста з ім не быў знаёмы.

У пакой, піша Гарайн, увайшоў «малы чалавечак, нядбала апрануты, прыгнуты», але «з разумным выразам твару». «Досыць нязграбна пакланіўшыся, папытаў нясмелым, прыцішаным, ды ўсё ж сімпатычным голасам:

— Ці не вы будзеце Юльян Гарайн?

— Але, я. З кім маю гонар...

— Мяне зваць — Людвік Кандратовіч... Я чуў ад нашага, можна сказаць, агульнага прыяцеля, пана Жыські, што вы ў аколіцах Мінска прадаеце невялікі фальварачак. А я маю намер купіць якраз у гэтых мясцінах колькі валок зямлі».

Гарайн запрасіў яго сесці. Выкарыстоўваючы парады пранырлівага і хітрага гандляра Жыські, які падахвоціўся памагчы яму ў гэтай справе, Гарайн пачаў па ўсе лады расхвальваць свой фальварак Рабушкі, хоць замест прыбыткаў ён даваў яму адны толькі страты. У Рабушках, даводзіў прадавец, можна пабудаваць добрую карчму, пасадзіць туды паваротлівага чалавека, і ўжо адно гэта дало б двайны прыбытак уладальніку фальварка. Бо там куплялі б гарэлку не толькі мясцовыя сяляне, але і жыхары суседніх вёсак. Сыракомля адразу ж насцярожыўся:

— Дык, значыць, там у вас ёсць падданыя? — Жыська мне пра тое нічога не казаў.

Пачуўшы, што ў Гарайна ёсць там чатыры хаты з адзінаццаццю душ сялян, Сыракомля ўстаў і ўзяў шапку:

— Вольмі шкадую, што патурбаваў вас. Я хачу купіць фальварак без падданых. Сам з сям'ёю хацеў бы абрабляць зямлю. Бывайце здаровы!

Але размова на гэтым не скончылася. Сыракомля быў запэўнены, што падданыя сяляне з Рабушак выедуць пад Слуцк — яны даўно мараць пасяліцца на слуцкіх чарназёмах. Пасля гэтага паэт згадзіўся паехаць з Гарайнам на агледзіны фальварка.

І вось зграбны панскі вазок нясе абодвух у бок Заслаўя. Памалу распачынаецца гаворка. Пасля некалькіх роспытаў пра гаспадарчыя вартасці той мясцовасці Сыракомля нечакана папытаў:

— А ці ёсць там салаўі?

Пытанне здзівіла Гарайна. Ён пачаў больш пільна прыглядацца да свайго субяседніка, гадаючы, што ж гэта за чалавек. Гарайна цікавіла адно: як бы з найбольшай выгадай

збыць свой няўдалы фальварак, і ён ізноў загаварыў пра яго даброты:

— Ад Мінска — міль тры, ад Радашковіч, — дзе некалькі разоў на год, асабліва ў дзень Святой Тройцы, бываюць не горшыя, чым у Міры, — кірмашы, — дзве мілі, ад касцёла парафіяльнага ў Заслаўі — некалькі вёрст. А вунь Сёмкаў... Бачыце, якая тут лёгкасць для збыту прадуктаў. — Прытым, гляньце, якія ў гэтым баку ўраджаі! Жыта і пшаніца — як шчотка. Зараз пачнуць красаваць. Ячмяні такія бываюць густыя, што аж вылягаюць.

З размовы Гарайн даведаўся, што яго субяседнік знаёмы з вядомым пісьменнікам Юзафам Крашэўскім, што нават гасцяваў у яго.

— Можа, вы яго сваяк? — пазайздросціў Гарайн.

Сыракомля адказаў, што не сваяк, але што яны — свае па духу, бо абодва — літаратары. Гарайн, прыпомніўшы, што яго субяседніка завуць Людвік Кандратовіч, прызнаўся, што да гэтага часу не сустракаў яго імя ў друку, хоць ён і сочыць за літаратурай. Калі Сыракомля назваў сваё літаратурнае імя, Гарайн аж падскочыў ад здзіўлення: ён жа даўно ва ўсіх дапытваецца, хто хаваецца за гэтым імем — Уладзіслаў Сыракомля, якім падпісваюцца такія цікавыя творы.

— Дык гэта ж вы — перакладчык польска-лацінскіх паэтаў? Вы — аўтар «Дыферэнцыі» і гэтулькі цудоўных гавэндаў? Аўтар — «Выбрыкаў вяселага гумару»?.. І я пра гэта толькі цяпер даведваюся! Пан Людвік! Пан Уладзіслаў! Дык гэта ж вы той, хто ўжо на пачатку сваёй такой цяжкай літаратурнай працы стаў аздобай нашай літаратуры! А я так да вас аднёсся...

І Гарайн пачаў горача прасіць у яго прабачэння. За тое, што ён хацеў яму прадаць свой няўдалы фальварак. І гэтак жа маляўніча, як расхвальваў, пачаў бэсціць сваё ўладанне:

— Гэта ж — жыць там — нудота, змарнеў бы там са сваёй сям'ёй: зямля там цвёрдая, сухая, няплодная, на лугах — адзін сівец, лес — яловы, вады — няма, салаўі туды ніколі не залятаюць, знікла б там усё тваё паэтычнае натхненне! Гэта не для цябе месца! Давай заварочваць назад, бо я табе яго не прадам!

Але Сыракомля ўсё ж наважыў паглядзець фальварак. Калі прыехалі да Рабушак, паэт адразу ж згадзіўся са сваім прадаўцом, што фальварак для яго не падыходзіць. Галоўнае, не быў прыдатны для жылля панскі драўляны дамок: падгніў, схіліўся набок, у пакоях сыра і змрочна. Так і вярнуўся ні з чым Сыракомля на сваю арэнду ў Залуча.

А можа, яму не спадабалася мясцовасць?

Я вырашыў пашукаць тыя Рабушкі, сваімі вачыма паглядзець на тутэйшыя краявіды. Заслаўскія старажылы сказалі мне, што такая вёска сапраўды ёсць ля Заслаўя. Толькі прамой дарогі туды няма, лепш за ўсё ў Рабушкі ехаць праз Мінск. Я ўжо меркаваў так і зрабіць, але выпадкова сустрэў на вуліцы свайго знаёмага, аспіранта-завочніка сектара фальклору нашага інстытута Барыса (такое прозвішча), які якраз настаўнічаў у тых мясцінах. Ён сагітаваў мяне пусціцца туды пеша, нацянькі. Як сапраўдныя падарожнікі. Мы так і зрабілі.

Ішлі пакручастай палявой дарогай. Паўзбоч — дзве сценкі жыта. З-за пасвятлелых ужо сцяблін выглядваюць там-сям вясёлыя валошкі, на зялёную броўку дарогі выпаўзаюць пад ногі доўгія гірлянды чысценькіх бела-ружовых сподачкаў кветак карлікавай бярозкі. Пахне жытам, полем. А над галавой трапеча на адным месцы, чаруючы сваёй песняй, адвечны жаўранак.

Затым мы збочылі на сцежку, якая павяла нас праз лес. Лес быў яловы. Хоць стаяў дзень, у ім было змрочна. Пад высокімі густымі елкамі — ні травінкі: зямля спрэс засцелена рыжай ігліцай. Але хутка сцежка зноў вывела нас з ельніку на поле. Яна ўспаўзала на ўзгоркі, спускалася ў зялёныя лагчыны, бегла паўз бярозавыя пералескі, пакуль не ўлілася зноў у дарогу. Мінуўшы маленькую вёсачку Куты, мы адразу ўбачылі на ўзгорку дахі Рабушак. Перад вёскай — старая развесістая бяроза, далей — ліпы. Кругом лясы, пералескі. Не, усё ж такі мясціны тут — што трэба. Праўда, няма рэчкі, але ж затое якія ўзгоркі!

Мы заходзілі ў хаты, гутарылі з людзьмі. Пра вёску і яе жыхароў добра расказалі нам сямідзесяціпяцігадовы Іван Васільевіч Юркоўскі, цялятніца Анастасія Рыгораўна Вашкевіч, электрык Аляксандр Антонавіч Несцяровіч. Усе яны, іх бацькі спраку веку жывуць у гэтай вёсцы. Зараз у ёй налічваецца толькі дзевяць хат. Людзі працуюць у саўгасе імя Тэльмана. Рабушкі адносяцца да участка, цэнтр якога — у Браўках, суседняй вёсачцы. За два кіламетры ад Рабушак праходзіць Старавіленскі тракт, па якому цяпер курсіруюць аўтобусы.

Вядома, пры добрых абставінах Ул. Сыракомля мог бы тут прыжыцца. Чаго-чаго, а вясковай цішыні яму тут хапіла б. Ды і салаўі па сёння заліваюцца ў бярозавых пералесках. Можна толькі пашкадаваць, што так атрымалася ў паэта з купляй зямлі. Магчыма, зусім інакш склаўся б лес вясковага лірніка. Якраз гэтая спеўная зямля ўзрасціла потым Янку Купалу: яго Вязынка адсюль — рукой падаць.

ПАЕЗДКА Ў БАРЭЙКАЎШЧЫНУ

Замест эпілога

Вярнуўшыся з падарожжа па Палессі і Міншчыне, я ўсё ж адчуваў, што не да канца выканаў пастаўленую перад сабой задачу. Неадкрытай, зацягнутай даволі густым туманам невядомасці была для мяне Барэйкаўшчына — падвіленская вёска, куды перасяліўся і дзе жыў апошнія дзесяць гадоў Уладзіслаў Сыракомля.

Барэйкаўшчыну паэт атрымаў у арэнду ад графа Тышкевіча. Месца было далека не ідэальнае. Але нічога лепшага паэту знайсці не ўдалося. Вось як пісаў пра новую арэнду сам Сыракомля:

«Жыллёвы дом невялікі, але дагледжаны; з вакна далека відаць вёскі, замглёныя лясы і ўзгоркі, вялікі сад; народ працавіты, цвярозы і сумленны; на сценах некалькі дзесяткаў карцін, у шафах некалькі соцень добрых кніжак. Чаго ж тут болей трэба? Долі і хлеба! Першай мне ад нараджэння не дадзена, а другі тут цяжка здабыць, бо хоць зямля і ўраджайная, але яе тут — вельмі шчуплы кавалачак. Да таго ж тут — невялікая колькасць рук, не хапае работнікаў. Усё гэта не дазваляе ўзеяць гаспадарку на належны ўзровень».

Нягледзячы на матэрыяльныя нястачы, тут, у вясковай цішыні, паэту працавалася вельмі плённа. У Барэйкаўшчыне ім былі напісаны такія выдатныя творы, як «Кавалак хлеба», «Фрагменты пра Піліпа з Канапель», «Жменя пшаніцы», «Непісьменны», «Вясковая школа», «Улас», «Штогадовыя святы на Літве», «Школьныя часы», «Вызваленне сялян» і цэлы шэраг іншых.

Мяне цікавіла перш за ўсё, што сабой уяўляла сама вёска Барэйкаўшчына, сярод якіх людзей жыў там вясковы лірнік, адкуль, з якіх крыніц чэрпаў ён тэмы і вобразы для сваёй творчасці ў апошняе дзесяцігоддзе.

І вось — роўна праз год пасля маёй экспедыцыі па поўдні Беларусі — я з камандзіровачным пасведчаннем у кішэні анынуўся ў Рукайняйскім сельсавеце Вільнюскага раёна Літоўскай ССР. Ад шумлівай аўтамагістралі Вільнюс-Ашмяны ішла проста ў жыта пясчаная палявая дарога. У зялёным жытнёвым разліве танулі ўперадзе раскіданыя там і сям, як астраўкі, хаты вёскі

Барэйкаўшчыны. За высознымі старасвецкімі ліпамі мне хутка адкрылася прадаўгаватая драўляная школа, абсаджаная кругом кустамі, кветкамі. Яе мне паказаў дзядзька, што вёз аднекуль на кані поўныя, з верхам драбіны прывялай палявой травы. У школе, як я ўведаў яшчэ ў Вільнюсе, месцілася бібліятэка-музей Ул. Сыракомлі.

Бібліятэкарка, маладая чарнявая дзяўчына Ванда Даугевічутэ, сустрэла мяне ветліва. Даведаўшыся, хто я і чаго сюды прыехаў, яна спачатку паказала мне бібліятэку. Бібліятэка небагатая — што ж, людзей тут няшмат: летась з-за адсутнасці патрэбнай колькасці вучняў — галоўных яе чытачоў — нават была зачынена школа. Мне было цікава даведацца, што ёсць у бібліятэцы з беларускіх аўтараў. Аднак я ўбачыў тут толькі імя Уладзіміра Караткевіча, якога нейкімі невядомымі вятрамі занеслі сюды яго «Чырвоныя ветразі». Потым дзяўчына раеказала мне ўсё, што датычылася Ул. Сыракомлі. Аказваецца, школа — гэта якраз і ёсць хата самога паэта. Вядома, яна не раз рамантавалася, але ў цэлым засталася такой, як была. Ванда павяла мяне ў пакойчык, дзе былі выстаўлены экспанаты музея. У гэтым пакойчыку якраз і працаваў паэт — тут быў яго кабінет. З акна сапраўды адкрывалася поле і вясковыя хаты — значыць, мара Сыракомлі пра тое, каб ён мог «бачыць з вакна небасхілы, вясковыя стрэхі», хоць і часткова, але збылася. У пакойчыку паэта я ўбачыў яго фотаздымкі, кнігі, рукапісы. Але больш за ўсё зацікавіў мяне сонечны гадзіннік Сыракомлі — гладка выпаліраваны камень з цыферблатам, стрэлкамі якога былі праменні сонца.

Потым Ванда павяла мяне паказваць двор. Не вельмі далека ад хаты, сярод жыта, відаць былі рэшткі зруба старога калодзежа. З яго, расказваюць, брала ваду Сыракомлева сям'я. У вянку дрэў хаваўся арыгінальны стол, зроблены з жорнавага кола. За гэтым сталом, шукаючы адзіноты і цішыні, Сыракомля напісаў нямала ўзнёслых строф сваёй паэзіі.

Але галоўнае, што мне хацелася ў Барэйкаўшчыне, — гэта пазнаёміцца з людзьмі, пагутарыць з імі, пачуць расказы, паданні і асабліва мову аднавяскоўцаў паэта.

Ванда завяла мяне ў адну з бліжэйшых хат, да васьмідзесяцігадовага Баляслава Антонавіча Раманоўскага. Высокі хударлявы стары, пакашліваючы, з ахвотай расказваў пра сваё жыццё, пра сваю вёску. Старога дапаўняла, падсеўшы да стала, за якім мы сядзелі, яго дачка Уладзіслава, рухавая і гаваркая жанчына, работніца саўгаса «Рукойны». Жывуць тут яны здаўна. Іх дзяды і прадзеды таксама мясцовыя. З католікаў. Называюць сябе палякамі. Два сыны Баляслава Антонавіча пераехалі ў Польшчу, прыжыліся там. А яму самому і дачцэ падабаецца тут, дома.

Гаворка наша цякла вольна, натуральна. Мова гаспадароў хаты, як і іншых мясцовых жыхароў, нягледзячы на нязначную колькасць польскіх слоў, была усё ж у сваёй аснове, як адзначаў яшчэ і Сыракомля, беларуская, Я нават запісаў у блакнот нямала цікавых для мяне слоў і выразаў, якія добра папоўнілі мой лексікон. Напрыклад, у беларускай літаратурнай мове я дагэтуль сустракаў слова «падбярозавік» — грыб, вядомы ў маёй вёсцы пад назвай «бабка». Слова «падбярозавік» мне неяк рэзала вуха, яно здавалася мне штучным. Няўжо так кажуць у народзе? І вось тут, у Барэйкаўшчыне, я слова ў слова запісваю фразу: «І баравікоў прынеслі, і падбярэзнікаў, і лісічкаў». Вось, аказваецца, як народ кажа — «падбярэзнік». Проста, ясна і вельмі па-беларуску. Дык чаму б нам не ўводзіць якраз такія словы ў літаратурную мову?

Пабыў я ў Барэйкаўшчыне і яе ваколіцах некалькі дзён. Гутарачы з людзьмі, слухаючы іх гаворку, я лавіў сябе на думцы, што некаторыя характэрныя для гэтай мясцовасці словы і выразы я ўжо недзе чуў. Толькі потым успомніў: дык гэта ж у Францішка Багушэвіча — «папарскага салаўя». Віленшчына, Ашмяншчына — яго радзіма. Былы фальварак Свіраны, дзе нарадзіўся беларускі паэт, аказваецца, зусім блізка адсюль. Пра гэта мне сказаў былы загадчык Барэйкаўшчынскай пачатковай школы Мікалай Васільевіч Сабалеўскі, добры знаўца беларускай літаратуры, якую ён чытае ў арыгінале.

Дарэчы, пра школы. І ў Рукойнах (ці па-афіцыйнаму Рукайняй), цэнтры сельсавета (за паўтара кіламетра ад Барэйкаўшчыны), і ў іншых вакольных вёсках — школы польскія. Адкрыты яны па жаданню насельніцтва. Як расказаў мне дырэктар Рукайняйскай сярэдняй школы Леанід Ільіч Палонскі, у школе вучні вывучаюць некалькі моў: рускую, польскую, літоўскую і нямецкую. Апрача таго, усе яны нядрэнна ведаюць таксама беларускую. Так што ў гэтых адносінах школьнікі атрымліваюць даволі шырокую адукацыю, што дазваляе ім пасля заканчэння школы арыентавацца ў самай разнастайнай літаратуры.

Я добра пазнаёміўся з адным вучнем Рукайняйскай школы — сямікласнікам Янушам, сынам старшыні сельсавета Эдуарда Аляксандравіча Багуцкага, у якога я начаваў. З Янушам я разам спаў на сене ў адрыне. Перад тым як заснуць, мы доўга размаўлялі. Януш быў вельмі гаваркі. Ён расказваў мне шмат чаго пра школу, пра свае гульні, вучобу. Даведаўшыся, што я з Мінска, ён пачаў дэкламаваць па памяці «Дзеда і бабу» Кандрата Крапівы, «Святога Яна» Якуба Коласа. Праўда, не ведаў, хто напісаў гэтыя творы. Пахваліўся ён і сваімі поспехамі ў літоўскай мове. Ён нават можа ўжо чытаць трохі па-літоўску. Раней яе зусім не разумеў, як і наогул мясцовыя жыхары. Януш расказаў мне пра выпадак, які

быў тут пасля вайны. Прыехала з Вільнюса аўталаўка. Адзін хлопчык пайшоў туды купіць цукру. А лавачнік яму і кажа: «Мажукам цукру нера». Гэта азначала — дзецям цукар не прадаецца. Хлопчык перадаў готыя словы бацьку, прозвішча якога якраз было — Мажук. «Нехта, мусіць, набрахаў на мяне: Мажуку, бач, ужо і цукру не дае», — сказаў бацька і пайшоў выясняць прычыну.

Я аб'ехаў і абхадзіў многія вёскі і вёсачкі Рукайняйскага сельсавета. Запомніў такія з іх, як Крыжоўка (з 1 студзеня 1971 года яна, як і іншыя вёскі, атрымала новую назву — Крышкяліс), Ашмянка (Ашмянеле), Баравыя (Шылінай), Задворцы (Ужудварыс), Навасады (Науяседжай), Падчарпае (Паеджай), Міхайлаўка (Мікалішкес), Зацішша (Рамітэ). Цяпер я меў, хай не поўнае, але ўсё ж нагляднае ўяўленне пра гэты край, пра тую новую зямлю, якая ў апошнія гады паэта жывіла яго звонкую музу.

Знаёмячыся з людзьмі, сярод продкаў якіх жыў Ул. Сыракомля, я лепш разумеў многія творы паэта, лепш разумеў яго самога. Больш зразумелымі рабіліся мне і строфы верша Янкі Купалы «Вясковы лірнік», напісанага тут амаль 50 гадоў назад, калі адзначалася 50-я гадавіна з дня смерці Сыракомлі. Янка Купала, які таксама хадзіў па мясцінах вясковага лірніка, быў у Барэйкаўшчыне і Рукойнах, так пісаў у сваім вершы:

Выліць думку хачу — хай сноуе у бязмеры —
Думку-памяць, што ў сэрцы залегла,
Аб той зорцы, што некалі з добраю верай
Над зямелькай яснела і збегла.

Аб музыцы, што лірай сваёй чарадзейскай
Мне ў душы светач выклікаў новы,
Каб жыла, хоць на час, красай кветкаў-пралоскаў,
Як жыве вечна Лірнік вясковы...

Час патраніць усё пакрышыць, ацалеці,
Путы нават змарнеюць у плесні, —
Покі ж будзе душа хоць адна жыць на свеце,
Будуць жыці і лірнікаў песні.

Будзеш жыць! Будуць векі ісці за вякамі, —
Не забудуцца дум тваіх словы,
Як і слоў беларускіх, жывучы між намі,
Не забыўся ты, Лірнік вясковы.

Такім чынам, не знайшоўшы прыстанку ў «сваіх ваколіцах», паэт змушаны быў зняцца з бацькоўскай зямлі і адправіцца ў Вільню шукаць долі ў шырэйшым свеце. Якраз да часу ад'езду Сыракомлі ў Вільню адносіцца яго верш «Пілігрым у канцы вандроўкі», які лагічна завяршае як кнігу «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», так і ўвесь давіленскі перыяд жыцця і творчасці яе аўтара:

Вось, нарэшце, і абышоў я, радзіма,
Гарады твае, вёскі з кіем пілігрыма.
Блізка бачыў я вежы касцёлаў, крыніцы,
Падзямельныя склепы твае, камяніцы,
І, каб пахваліцца чым было можна,
Узяў я памятак колькі ў ранец дарожны:
Частку нёманскай хвалі, камень даўняй вежы,
Завушніцу з магілы, з дрэва лісцік свежы...
Удоўж і ўшыр абышоўшы ўсё Прынямонне,
Спачываю пад грушай развесістай сёння.
І перад тым, як выйсці на новую каляіну,
Усю, што прайшоў, дарогу позіркам зноў акінуў.
Там, над возерам сінім, замак глядзіць у зоры,
Там, на пагорку, бачу бацькаў знаёмы дворык.
Там хатка, дзе шчасце мяне абмінула,
Там цвінтар, дзе дзятва — мая кроў — заснула.
Там святыні, там блізкія стрэхі з саломы,
Звоніць знаёмае птаства, ходзіць вецер знаёмы.
І да мяне зноў вяртаюць нябачныя крыллі
Пачуцці, што некалі сэрца маё палілі,
І думкі, што ў галаве маёй віравалі...
О куткі мае мілыя! О родныя далі!..
Калі ў свет мяне кіне жыццёвым ветрам,
Набяру сабе у грудзі адгэтуль паветра,
Набяру яго шмат, каб надоўга хапіла,
Каб яно мае песні заўсёды жывіла.
Толькі чым, мае далі, узамен вам аддзячыць?
Можа, бласлаўленнем пілігрымскім, жабрачым,
З ветрам яго пусціўшы па родным абшары,
Каб збыліся людзей нашых лепшыя мары:
Над лясамі, над Нёманам, на мужычым загоне
Хай жа лепшую песню птушкі зазвоняць,
Закрасуюць хай збожжа пясчаныя нівы
І аратага сэрца устрапянецца шчасліва...
З болем адсюль пусціўся я ў новую пуцявіну
І памяць пра край свой родны — у песні навек пакінуў.

Ходзячы па ваколіцах Заслаўя і па яго вуліцах, я даволі-такі прытаміўся. Убачыўшы за паўрасчыненымі варотамі прамкамбіната зацененую лавачку ля прахадной, я прайшоў да яе і сеў адпачыць. З будкі ў прахадной выйшла пажылая, з вострымі вачыма нізкаслая жапчына:

— А вам чаго тут?

— Ды от хачу пасядзець трохі, цётка. Хіба няможна?

— Чаму ж не, пасядзіце. Толькі не заходзіць на тэрыторыю!

Жанчына прысела каля мяне на лаўку. Да яе якраз падышоў чарнявы, добра апрануты хлапец з лагодным тварам. Жанчына адразу пачала яго ўшчуваць — за тое, што не так, як яна хацела, перасыпаў ёй веранду. Хлопец цярпліва даводзіў ёй, што так якраз лічыцца добра. Але жанчына стаяла на сваім і са слязьмі ў голасе пачала абвінавачваць хлопца, што ён не хоча ёй памагаць, што ўсё робіць абы збыць з рук. Так ён і пайшоў, нічога не даказаўшы жанчыне, якая сыпала яму ўслед свае крыўды.

— Гэта сын, — сказала яна мне, трохі заспакоіўшыся. — Жыве тут, у Заслаўі, з жонкай і дзецьмі. Вы, мусіць, чулі трохі, пра што мы гаварылі. Але ж, канешне, не ўсё панялі. Я б вам расказала пра ўсё, але ж доўга гаварыць. А тут толькі доўга трэба. Я, ведаеце, люблю хадзіць на суд, слухаць. Дык от, бывае, калі падсудзімы надта загаворыцца, суддзя перапыняе яго і кажа: сакрашчона гаварыце, сакрашчона. А сакрашчона яно, ведаеце, не заўсёды і палучаецца. Дык от і тут так: сказаць сакрашчона — не поймеце. Але хай, папробую...

І жанчына добрую гадзіну расказвала мне «сакрашчона» пра ўсё, што ў яе набалела. Яна нават не звяртала ўжо ўвагі на тых, хто праходзіў на тэрыторыю прамкамбіната. Толькі зрэдку спыняла каго-небудзь:

— Вам куды? — і, паслухаўшы тлумачэнне, зноў паварочвалася да мяне. — Яно, сказаць па праўдзе, тут няма чаго і красці. Але я пытаю так проста, каб не стаяць тут без дзела. Аднаго прапушчу, а другога — вазьму і астанаўлю, патрэбую дакументы. Хай ведаюць, што ёсць стораж!

Пад канец, калі я сабраўся ісці, жанчына — не без удзячнасці за тое, што я выслухаў яе, — сказала:

— От пагаварыла з вамі, і аж лягчэй стала. Сыны мне, ведаеце, колькі раз казалі: хаця ты не гавары многа, не разнось пра нас абы-чаго па горадзе. А як жа мне не гаварыць. Калі буду маўчаць — я ж лопну.

Я толькі ўсміхнуўся, слухаючы шчырую споведзь жанчыны, якая, відаць, прывыкла ўвесь час быць сярод людзей і, выйшаўшы

на пенсію, не магла сядзець дома склаўшы рукі.

У Заслаўі я пачуў легенды, звязаныя з Рагнедай, расказы пра гераічныя справы мясцовых партызан, якія не давалі праходу гітлераўскім салдатам і паліцаям. Кожны камень, знойдзены на гэтай зямлі, быў, здавалася, частачкай самой гісторыі, сведкам слаўнага мінулага краю.

Тут у вочы кінулася мне ўся ў рыштаванні старажытная Праабражэнская царква. Яе, як і Мірскі замак, па рашэнню ўрада пачалі таксама аднаўляць. Для мяне, чалавека, што звязаў свой лес з інстытутам, у назву якога ўваходзяць такія словы, як «мастацтвазнаўства», «этнаграфія», «фальклор», было радасна бачыць падобнае. Мне ўспомніліся словы А. Кіркора: «Многа гістарычных помнікаў у Беларусі знішчана часам, яшчэ больш невуцтвам і абыякавасцю». Добра, што гэты час невуцтва і абыякавасці адыходзіць у нябыт...

Вечарам я сеў на электрычку, якая імкліва панесла мяне ў Мінск, адкуль я пачынаў сваё падарожжа. Вяртаўся я туды ўжо зусім з другога боку, скалясіўшы добрую частку поўдня Беларусі.

Тут грала дудка Бурачка

НА СУСТРЭЧУ З ПАЭТАМ

Даўно ўжо збіраўся я пахадзіць-паблукаць прытуманенымі часам, але, пэўне ж, яшчэ не зааранымі, не зусім зарослымі за паўтара стагоддзя сцяжынамі нашага славутага ваеўніка за народ, сапраўднага будзіцеля нацыі Францішка Багушэвіча, якога, неспакойнага, нікім не скоранага, куды толькі ні закідала мачыха-доля.

І вось летась надарылася добрая нагода: мне прапанавалі паехаць разам з экспедыцыяй Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры па мясцінах выдатнага паэта-дэмакрата XIX стагоддзя.

Экспедыцыйную групу музея склалі супрацоўнікі аддзела дакастрычніцкай літаратуры. Асабліва я быў рады, што ў гэтую вандроўку згадзіўся паехаць і мой добры знаёмы, літаратар, выдатны знаўца біяграфіі Багушэвіча, супрацоўнік Беларускага тэлебачання Уладзімір Содаль, які ўзяў з сабой і маленькую, з двух чалавек, тэлевізійную групу — здымаць Багушэвічавы мясціны ды «асвятляць» работу экспедыцыі. Меўся з намі паехаць і мастак Мікола Купава — рабіць замалёўкі Багушэвічавых мясцін, але як актывісту Беларускага народнага фронту «Адраджэнне»

яму трэба было прыняць удзел у падрыхтоўцы ўстаноўчага з'езда ў Вільні, адкрыццё якога прыпадала якраз на канец нашай экспедыцыі. Нам быў выдзелены невялікі, але даволі прасторны аўтобус, за рулём яго, нібы на троне, высока сядзеў фарсісты, з белазубай усмешкай пад заліхвацкімі вусамі шафёр Валера.

З Мінска, заварочваючы то ў адзін, то ў другі бок, у мясціны, так ці інакш звязаныя з імем Францішка Багушэвіча, мы кіравалі на Ашмяны, а канкрэтней — у прыашмянскую вёску Кракоўка, дзе для нас былі заказаны месцы ў гасцініцы калгаса «Маяк». Прыехалі туды вечарам. Гасцініца — адзін з тыпавых двухпавярховых дамоў, якія ўтварылі тут цэлую вуліцу. Асталяваліся, агледзеліся. Ад калгаснай гасцініцы да Ашмян — рукой падаць. Для нас гэта было вельмі зручна: адсюль лёгка можна ездзіць у блізкія і болей ці менеі аддаленыя ваколіцы Ашмян — радзіму паэта.

СВІРАНЫ

Больш за ўсё карцела пабачыць родны кут Францішка Багушэвіча — памятны яшчэ са школьнага падручніка фальварак Свіраны, пра які, апроч назвы, я нічога не ведаў. Гэтак жа, як і школьнікі, якія вывучаюць біяграфію паэта. Ды і што ж можа даць іх розуму і сэрцу адна сухая назва?

У Свіраны мы выехалі раніцай, паснедаўшы ў ашмянскай кавярні. Дарога ішла проста на старажытную Вільню.

Вось і літоўская мяжа, пра што апавяшчае стэла на ўзбочыне дарогі — «Літоўская ССР». Мінаем Меднікі з руінамі старажытнага замка. Дзесятак-другі кіламетраў па зямлі Літоўскай ССР — і Валодзя Содаль, які ўжо тут бываў раней, камандуе шафёру павярнуць налева. Зялёныя, аблашчаныя сонцам узгоркі. Рэдкія бярозавыя пералескі. А во перад вачыма і самі Свіраны.

Калі мы выйшлі з аўтобуса, перад намі адкрыўся шырокі, вельмі прыгожы краявід. У моры чэрвеньскай зеляніны на ўзгорках і ў далінах бялелі шыфернымі дахамі між вабных прысадаў астраўкі невялічкіх вёсак. Над імі плылі, купаліся ў блакіце неба лёгкія белыя воблакі.

Свіраны — адзін з тых шматлікіх астраўкоў. Вёсачка падзелена шашою на дзве часткі. Першая, левая, частка, як выявілася — больш даўняя, уласна Свіраны, дзе некалі і быў той

фальварак, у якім упершыню ўбачыў свет Францішак Багушэвіч. Сёння тут — тры хаты. Каля двароў нам кінуўся ў вока шнур раскідзістых старасвецкіх ліп. Гэта, як паведаў нам Содаль, была некалі алея, што вяла да фальварка. На правым баку шашы мы ўбачылі дзве хаты, за імі — трохі далей — відаць быў дах яшчэ адной. Вось і ўся вёска. Калі знаёмішся са Свіранамі, складваецца ўражанне, што людзі сяліліся тут хто як хацеў, не прытрымліваючыся асаблівага парадку. Таму называць Свіраны вёскай, відаць, можна толькі ўмоўна — тут жа мы не знайшлі нават традыцыйнай вясковай вуліцы. Проста прысуседзіліся адна да адной асобныя сядзібы, са сваімі пад'ездамі, з уласнымі сцежкамі-дарожкамі, прыцерліся, прызвычаіліся і стаяць сабе, не скардзячыся на нейкую нязручнасць.

З асаблівым нецярпеннем, нават з хваляваннем чакаў я сустрэчы з землякамі паэта. Перш за ўсё хацелася пачуць іх гаворку. Гэта ж мову тутэйшых сялян узяў Францішак Багушэвіч за аснову сваіх мастацкіх твораў. Як вядома, сучасная беларуская літаратурная мова ў яго час была яшчэ ў стадыі станаўлення, і Францішак Багушэвіч пісаў на той, якую чуў у маленстве. Якраз яе, , мову падвіленскіх мясцін, лічыў ён найбольш беларускай, найбольш чыстай, і таму, як успамінае яго сучаснік паэт Альгерд Абуховіч, аднаго разу Францішак Багушэвіч, прачытаўшы яго вершы, зрабіў аўтару заўвагу, што ў іх «не ўсюды бываюць уласцівыя беларускай мове акцэнты». На гэта ўраджэнец Случчыны, а калі вузей — Глушчыны, Альгерд Абуховіч адказаў Багушэвічу вершам:

У гаворцы ёсць ружніца (розніца. — К. Ц.)
Між маёю і тваёй:
Маёй — пушчы, Пціч граніца.
Ты — панарскі салавей.

Панары — узвышшы на поўдзень ад Вільні. Відаць, зялёныя ўзгоркі, што ўбачылі мы каля Свіран, таксама адносяцца да той панарскай грады.

Дык хіба ж не цікава было нам даведацца, як размаўляюць сёння на радзіме «панарскага салаўя»? Ці, можа, тутэйшыя людзі алітовіліся? Як-ніяк, ужо ж пяцьдзесят гадоў — не болей не меней — гэтыя землі ўваходзяць у склад Літоўскай ССР.

Першы, хто трапіўся нам у Свіранах, проста на шашы, быў пажылы дзядзька. Я прыпыніў яго, пазда роўкаўся.

— І куды сабраліся, дзядзька? — загаварыўшы, папытаў я.

— Да от сена троха выкасіў тутака... Дак падварушыць трэба...

Дзядзькава гаворка была мне як маслам па сэрцы. Такая паўнагучная, каларытная беларуская мова, з усімі яе «акцэнтамі». Тое, што ў ёй — не-не дый пракідвалася то польскае, то рускае

слова, зусім яе не псавала, бо ён любое слова вымаўляў на свой лад, падпарадкоўваў яго роднай беларускай мове. У дзядзькавай гаворцы вуха ўлавіла і мясцовыя асаблівасці — з гэтымі «троха», «тутака», а таксама з выразамі тыпу «ён адсюль выехаўшы», «ён у той вёсцы радзіўшыся» (у сэнсе выехаў, радзіўся). Дарэчы, гэтую асаблівасць мне даводзілася чуць і ў нас, у Браслаўскім раёне, які зусім недалёка адсюль.

— Ну і да якой вы, дзядзька, залічваеце сябе нацыянальнасці? — слухаючы з яго вуснаў такую гожую беларускую мову, папытаў я.

— Тутэйшы я... — І, падумаўшы, дадаў: — Палякі мы тутака... Беларускія палякі.

Я быў здзіўлены ўдвайне. Гэта ж сто гадоў назад многія беларусы, не ведаючы свайго сапраўднага паходжання, вось так называлі сябе — тутэйшыя. Але ж цяпер ужо семдзесят гадоў, як існуе Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, паўнапраўны член ААН, выпускаецца вялікая літаратура на беларускай мове, імя беларус добра вядомае не толькі ў нас, у Савецкім Саюзе, але і ва ўсім свеце. І вось на табе: ізноў — тутэйшы! Як быццам усе семдзесят гадоў гісторыя стаяла на адным і тым жа месцы, ці хто адкруціў яе назад, як тую кінастужку ў роліку! І другое: як трактаваць гэтае дзядзькава выслоўе — «беларускія палякі»? Калі б ішла гаворка пра палякаў, якія жывуць у Беларусі, то сапраўды, мусіць, можна было б так сказаць — беларускія палякі? Але ж дзядзька жыве ў сучаснай Літве. І яму лагічна было б сказаць— літоўскія палякі. Ды ён так не сказаў. Сам гэты яго «саманазоў» — беларускія палякі — кажа хіба пра тое, што ў дзядзькі яшчэ няма поўнай упэўненасці ў сваёй нацыянальнай прыналежнасці.

— А я думаю, што вы ўсё ж беларус, дзядзька!

На гэта дзядзька адказаў слова ў слова так:

— Я не помню, ці было такое гасударства — беларускае... А вось польскае — тутака было...

Логіка ў яго такая: раз ён і яго землякі, яго бацькі і дзяды жылі ў польскай дзяржаве — значыць, усе яны палякі. Палякам ён лічыць сябе яшчэ таму, што яго так запісалі ў метрыках. Яшчэ ў даўнія часы, растлумачыў дзядзька, «як хрысцілі на каталіцкую веру, тады на Палякоў усіх і папісалі».

Дык вось яна — разгадка паходжання падвіленскіх «Палякоў».

Дарэчы, пра тое, як «памагалі» ўжо ў складзе рускай дзяржавы «дахрышчваць» простага беларускага мужыка царскія «казакі з тутэйшага ды ў палякі (тым, што сілком пхалі ў рускую веру), вельмі цікава расказаў Францішак Багушэвіч у вершы «Хрэсьбіны Мацюка».

Мне шмат чаго хацелася яшчэ распытаць у дзядзькі — а быў гэта калгаснік калгаса «Іскра» Людвік Марцінавіч Корвень, які так добра расказваў пра тутэйшыя мясціны, навакольныя вёскі, але нас перапынілі нашы спадарожнікі — работнікі тэлебачання:

— Давайце мы вас здымем...

Мы з дзядзькам як сустрэліся, — так і размаўлялі, стоячы каля дарогі. Чаму б так, без усялякага папярэджання, і не здымаць нас, раз палічылі гэта патрэбным? Было б натуральна, без аніякай зададзенасці, а значыць, і праўдзіва. Дык не — работнікам тэлебачання здалося гэта «не тыповым». І яны пасадзілі нас на ўзбочыне дарогі, парассаджвалі вакол мяне і дзядзькі ўсіх астатніх членаў экспедыцыі і папрасілі падрыхтавацца. Мы «падрыхтаваліся», але калі пачалі па знаку ізноў размаўляць, нас перапынілі: нешта не запісваўся гук. Пакуль тэлевізійнікі корпаліся ў апараце, мы сядзелі і чакалі, хоць нам вельмі хацелася пагаварыць з дзядзькам. Калі праз нейкі час упарты апарат усё ж злітаваўся над намі і быў гатовы браць нашы галасы, настрой ужо сапсаваўся, і натуральнай нязмушанай гаворкі не атрымалася.

Добра пагутарылі мы з гаспадарамі бліжэйшай ад дарогі хаты ў правай, навейшай частцы Свіран. Гэта былі Філіповічы — Юлія Пятроўна і Станіслаў Казіміравіч, муж і жонка, людзі ў гадах. Тут у васемнаццатым ці дзевятнаццатым годзе ўзяў зямлю ў арэнду ад дзяржавы яшчэ бацька Станіслава Казіміравіча, які сам быў родам з суседняй (кіламетраў пяць адсюль) вёскі Карадзіцца — «прыезны», як сказала гаспадыня. Значыцца, на бацькаўшчыне сядзіць з сям'ёю цяперашні гаспадар хаты.

Я папытаўся ў Філіповічаў, ці ведаюць яны, што з іх Свіранаў родам класік беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч.

Не, нават не чулі пра такога.

— Можа, Марык ведае — ён жа ў школу ходзіць, — і жанчына паклікала чарнявага хлапчука, які па нечым стукаў малатком каля падпаветкі. Гэта быў унук Філіповічаў — ён прыехаў да дзеда і бабы на канікулы з Вільнюса, дзе жывуць яго бацькі і дзе ён вучыцца.

— Марык, — папытаў я, — а ці ведаеш ты, што ў вашых Свіранах нарадзіўся выдатны беларускі паэт Францішак Багушэвіч?

— Які, які?

— Францішак Багушэвіч.

— Які паэт?

— Беларускі.

Не, першы раз чуе пра гэта Марык Філіповіч, вучань восьмага класа, які, дарэчы, вельмі натуральна гаворыць з намі па-

беларуску.

Мы ўсім гуртам кінуліся запаўняць прабелы ў Марыкавай адукацыі, расказваць гэтаму вельмі цікаўнаму, як мы ўбачылі, хлапчуку пра яго земляка Францішка Багушэвіча, пра долю і змаганне паэта, пра ягоную творчасць. Валодзя Содаль скокнуў да аўтобуса і прынёс паказаць складзены ім і выдадзены ў 1986 годзе ў Мінску раскошны і даволі змястоўны альбом пра Багушэвіча. Трэба было бачыць, з якой цікавасцю гартаў яго Марык, пазнаючы на фотаздымках знаёмыя пейзажы, углядаючыся ў рысы твару самога паэта, а таксама яго бацькоў і блізкіх.

Потым узяўся чытаць змешчаныя там урыўкі Багушэвічавых вершаў.

— Ну, ну, пачытай уголас — паглядзім, як у цябе атрымліваецца, — папрасілі мы.

– На вяршынях сумна сосны
Зашумелі ціха,
Невясёлыя іх вёсны,
Бо наўкола ліха.
Бо наўкола пні, магілы,
Гора і няволя,
Вецер нішчыць рэшту сілы,
Рвуцца буры з поля...

Першы раз у жыцці, трохі спатыкаючыся, але ўсё ж даволі прыстойна пачаў чытаць Марык беларускую кніжку, беларускія друкаваныя вершы, вершы свайго земляка Францішка Багушэвіча, які яшчэ сто гадоў назад, звяртаючыся да братоў-беларусаў, горача заклікаў іх не пакідаць мовы нашай беларускай, «каб не ўмёрлі!». Каб не ўмёрлі як народ, як нацыя. Як гэта ні дзіўна, як ні сумна, але поўнае трывогі слова паэта па сённяшні дзень не дайшло да яго землякоў на роднай яму Вілейшчыне.

Адной з асноўных задач нашай экспедыцыі было — пашукаць для музея гісторыі беларускай літаратуры рэчавых этнаграфічных помнікаў з мясцін Францішка Багушэвіча. Асабліва важна было займець што-кольвечы з радзімы паэта. Таму, пакуль мы з Содалем гутарылі з землякамі Францішка Багушэвіча, работнікі музея — маладыя, вельмі шчырыя дзяўчаты, паспелі абысці ўсе хаты ў Свіранах, пытаючыся ў людзей больш за ўсё прадметы ткацтва, у якіх, мабыць, лепш чым дзе праяўляецца народны геній. Але, як вельмі часта здараецца з намі, непаваротлівымі беларусамі, і сёння мы катастрафічна запазніліся: усё найбольш цікавае з ткацкіх вырабаў «тутэйшых» — узоры народнага адзення, посцілкі, сурвэткі, ручнікі — выманілі падчыстую работнікі віленскіх музеяў: так, літоўцы не спяць у шапку! Дзяўчатам удалося набыць толькі адзін ручнічок ды кавалак

кужалю — усё, што засталося ад шматколернага багацця свіранскіх ткачых.

Але як можна было вяртацца з радзімы Францішка Багушэвіча з такім скупенькім набыткам?

Дапамагчы музейным работнікам падахвоціліся мы з Содалем, два старыя ваўкі такога збіральніцтва.

Звычайна, калі распытваеш людзей пра этнаграфічныя рэчы, яны вельмі «пераканаўча» даводзяць, што ў іх нічога цікавага няма. А калі добра агледзіш хату ды панадворак, то вока не-не ды і наткнецца на каштоўную, часам вельмі рэдкую, унікальную рэч, якой, бывае, проста няма цаны. Гаспадары толькі падзівяцца, бо яны і думаць не думалі, што гэтая звычайная для іх непатрэбшчына можа каго-небудзь зацікавіць.

Мы з Содалем намерыліся добра абследаваць хаты. Зайшлі спярша да даўніх Валодзевых знаёмых — Субачаў, якія прыехалі сюды з-пад нашых Пастаў. На жаль, знайсці тут і праўда нічога не ўдалося. Бо хата Субачаў не так даўно пабудавана. Да іх на гэтым месцы жылі Тамашэвічы. Калі выбіраліся адсюль, усё сваё пазабіралі. Былы гаспадар Фэлька Пятровіч Тамашэвіч выехаў недзе ў Вільню. А цешча, якой ужо сто ці болей гадоў, быццам бы жыве ў Польшчы. Калі Субачы ўлезлі ў новую хату, усе старыя рэчы, што засталіся і выйшлі даўно з ужытку, спалілі як непатрэбныя. Колькі такім во чынам яркіх помнікаў старога сялянскага побыту пайшло ў нас з дымам!

Ад Субачаў проста праз сад зайшлі ў суседні панадворак. Каля калодзежа сустрэлі самога гаспадара — Станіслава Адамавіча Ермалковіча. Станіслаў Адамавіч тут старажыл, сядзіць на бацькаўшчыне. Дзядзька расказваў нам, што тут даўней былі нейкія пабудовы — праўда, не за яго памяццю. Часам плуг і сёння выворвае тут даўнейшую цэглу — чырвоную, моцную, хоць цяпер з яе печ выкладвай. Калісьці тут быццам бы жылі «нейкія папы». Успомнілася, што маці Францішка Багушэвіча была з сям'і Галаўнёў, што яна — пляменніца уніяцкага біскупа Адрыяна Галаўні і што жылі Галаўні якраз у Свіранах. Дык ці не памяць пра гэтых «папоў» і захавалася ў народзе? І яшчэ адну немалаважную дэталь паведаў нам дзядзька: за Субачамі, «на горцы, быў калісьці могільнік», так казалі старыя людзі. Мы з Содалем бачылі гэтую горку — там цяпер поле. Ад могільніка — ніякага знаку. Ці не тут хавалі продкаў Францішка Багушэвіча па мацерынай лініі?

У Ермалковіча мы таксама папыталіся, ці чуў ён што гіра свайго славутага земляка Францішка Багушэвіча?

— Я чуўшы, — так, «па-тутэйшаму» адказаў Станіслаў Адамавіч: пра гэта ён прачытаў у раённай газеце «Дружба», якая выходзіць на рускай мове (і, здаецца, яшчэ на польскай, а мо і

літоўскай).

Але галоўнае, што нам трэба было ад Ермаловіча, — гэта добра агледзець яго хату, хату старую, праўда, яшчэ моцную. Дзядзька не пярэчыў. І што важна — дазволіў нам злазіць на гарышча. Працуючы ў свой час у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, я ў нярэдкіх экспедыцыях па зборы этнаграфічных памятак для акадэмічнага Музея старажытнабеларускай культуры шмат папалазіў па такіх во гарышчах — там жа часта чакаюць этнографа сапраўдныя скарбы! У Ермалковіча былі там больш навейшыя рэчы — для часовага захоўвання, але іх я абмінаю, заглядваю ў самыя глухія куткі, пад кроквы. Во даўнейшае крэсла з паўкруглай спінкай. Часткі кроснаў. Чаўнакі, вітушкі. Самаробная, даволі арыгінальная рамка для карціны. А што гэта за выгладжаная жардзінка з прыладжанай збоку драўлянай дужкай? Відаць, не кожны здагадаўся б, што гэта за штуковіна. Але я добра ведаю яе, яна яшчэ нядаўна бытавала ў маёй Зялёнай Дуброве, нават у нашай сям'і карысталіся ёю. А завецца яна — хадун альбо хадунок. Прылада, пры дапамозе якой вучаць малых дзяцей хадзіць. ˆСардзінка ўверсе ўстаўляецца ў лсалезнае вушка на бэльцы, а ўнізе ставіцца ў выемку — так, каб яна магла круціцца. Ставяць дзіцянё ў той абручык, малеча абапіраецца на яго локцямі і — пабегла само вакол жардзінкі. Проста і мудра! Калі я выцягнуў з гарышча гэты хадунок, Содаль быў у захапленні: што яшчэ можа быць для музея цікавейшае з месца нараджэння паэта! Гэта ж, пэўне, і маленькі Францішак вучыўся гут, у Свіранах, хадзіць у такім во хадунку!

РУКОЙНЫ

Са Свіран мы пакіравалі ў тутэйшы сельсавецкі цэнтр-мястэчка Рукойны (цяпер, па-літоўску, — Рукайняй), дзе хрысціўся Францішак Багушэвіч.

Рукойны — для мяне месца не новае. Сюды я прыязджаў, калі ў пачатку сямідзесятых гадоў вандраваў сцяжынамі Уладзіслава Сыракомля Сыракомлева Барэйкаўшчына адсюль кіламетраў шэсць — толькі ў бок Вільні. Гэтага ж самага Рукайнянскага сельсавета. Сыракомля жыў у Барэйкаўшчыне з 1852 па 1862 год, вельмі часта наязджаючы ў Вільню, дзе супрацоўнічаў у газеце «Кур'ер Віленьскі». Малады Францішак Багушэвіч, навучаючыся ў гэты ж час (1852-1861) у Віленскай гімназіі, ездзіў да сваіх бацькоў на Ашмяншчыну праз Рукойны і Сыракомлеву Барэйкаўшчыну. І ці ж мог гімназіст Францішак Багушэвіч, які, пэўне ж, з юнацтва захапляўся паэзіяй, не зацікавіцца асобай вядомага ва ўсёй «Літве» Уладзіслава Сыракомля не ведаць яго асабіста? Будучы «панарскі салавей» мог убачыцца, а мо і пазнаёміцца з «вясковым лірнікам» і ў Рукойнах, і ў Барэйкаўшчыне, і ў Вільні. Тым больш што яны былі не толькі землякі, але, як сведчаць іх творы, і браты па духу, аднадумцы ў адносінах да беларускага народа, да якога ставіліся з глыбокай павагай і сыноўняй любоўю, шанавалі яго культуру, мову. Нездарма ж пісаў потым Францішак Багушэвіч у польскім часопісе «Край»: «Паэтычныя творы Сыракомлі павінны быць у кожнай сям'і як скарб, што перадаецца з пакалення ў пакаленне». Дарэчы, сустрэцца яны маглі і ў самой гімназіі, дзе вучыўся Францішак Багушэвіч, бо там быў у 1855 годзе заснаваны Віленскі музей старажытнасцей, у рабоце якога самы актыўны ўдзел прымаў Уладзіслаў Сыракомля, выбраны ў 1856 годзе ў лік яго членаў-супрацоўнікаў. Гімназіст Багушэвіч таксама меў дачыненне да гэтай важнай культурнай установы. Цікавае супадзенне: якраз у тым жа 1856 годзе ён падараваў музею старажытнасцей каштоўныя рэчы, сярод якіх былі — відаць, знойдзеныя на Ашмяншчыне — старажытныя манеты, славянскі гадальнік, ядро ад гарматы, крыж са славянскім надпісам, скамянелая ракавіна. Ці ж мог энтузіяст народнай культуры Уладзіслаў Сыракомля, які таксама падараваў музею нямала цікавых рэчаў, не зацікавіцца гэтымі каштоўнасцямі, не папытацца, хто іх адшукаў і прынёс у музей?

Папалуднаваўшы ў цеснаватай, але вельмі прыстойнай

сталоўцы, пайшлі шукаць пробашча мясцовага касцёла. Даволі сціплы, нічым не адметны яго дамок быў на галоўнай, самай шумнай і пыльнай вуліцы, па якой бесперапынна грукаталі машыны. Вельмі звычайны, просты, са спакойным выразам твару ксёндз (звалі яго Альфонс Тамулайціс) запрасіў нас на сціпленькую веранду, што была ад вуліцы, за крокі тры ад яе (так што ўвесь вулічны грукат быў тут), і ўважліва выслухаў нас. Так, пра Францішка Багушэвіча ён ведае, што ж да нашай просьбы паказаць кнігу метрычных запісаў, то гэтага ён зрабіць не можа, бо яна захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільнюсе. Ну, а касцёл, дзе ў 1840 годзе хрысціўся будучы паэт, ён пакажа з ахвотай.

Высокі мураваны касцёл у Рукойнах мы ўбачылі здалёку. Гожы, велічны будынак. Вельмі гарманічны.

Увайшлі ўсярэдзіну. Гулкая, урачыстая цішыня. Добрыя, спагадныя лікі святых.

Альфонс Тамулайціс раскрыў нам усю даволі драматычную гісторыю касцёла, які быў пабудаваны тут у даўнія часы, але які не раз палілі, перараблялі пад царкву, ізноў узнаўлялі. Сам ксёндз тут ужо добра абжыўся, ведае людзей. Вядзе набажэнства на польскай і літоўскай мовах. Пра сваіх прыхаджан, жыхароў Рукойнаў і прылеглых вёсак, ён, жартуючы, кажа:

— Яны размаўляюць па-беларуску, моляцца па-польску, а лаюцца па-руску.

Ад Альфонса Тамулайціса пачулі мы і такую навіну: учора па літоўскім тэлебачанні перадавалі пра ўстаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту, які павінен адкрыцца ў Вільні ў суботу; прадстаўнікі «Саюдзіса» заклікалі літоўцаў гасцінна сустрэць сваіх суседзяў-беларусаў, памагчы дэлегатам з'езда з начлегам, паспрыяць у правядзенні іх вельмі важнага мерапрыемства.

Альфонс Тамулайціс пры гэтым выказаў вялікае здзіўленне, што нашы ўлады не дазволілі правесці з'езд БНФ дома, у Мінску: якая ж можа быць перабудова, калі не ўключаць у яе народ? Вядома, у «нефармалаў» можа быць свой погляд на нейкія рэчы, свае падыходы, што не супадаюць з агульнапрынятымі, з партыйнымі «ўстаноўкамі». Але ці ж гэта довад для непрыняцця руху, для яго ганьбавання? Такое стаўленне да БНФ толькі абвастрае абстаноўку, яшчэ больш настройвае людзей супраць улад. Адзіна правільным было б тут, думаецца, —шукаць шляхі да паразумення з «нефармаламі». Але бяда ў тым, што многія нашы кіраўнікі даўно ўжо згубілі — і ў пераносным, і ў прамым сэнсе — агульную мову з народам. Добра засвоілі яны, на жаль, толькі адну мову — мову камандаў.

З касцёла мы паспяшаліся ў сельсавет — дзяўчатам з музея

трэба было аформіць купленыя ў Свіранах рэчы.

У тую сваю першую паездку я таксама заходзіў у сельсавет. Не зусім звычайнае было тое наведванне гэтай паважанай установы. Калі я адчыніў тады сельсавецкія дзверы, то адразу ж памкнуўся ізноў іх зачыніць, бо ўбачыў за імі... шумнае застолле: напэўна, не туды трапіў! Але мне не далі гэта зрабіць: дзве зусім незнаёмыя жанчыны, не цырымонячыся, весела падхапілі мяне, нібы свайго, пад рукі і сілком пацяглі да здвоеных сельсавецкіх сталоў (так, гэта быў сельсавет), за якім сядзела чалавек дванаццаць падлітых жанчын і мужчын. На сталах, у талерках і проста на разасланых газетах, была раскладзена багатая закусь, пасярэдзіне цьмяна паблісквaў напалову спарожнены гранёны графін, стаялі запацелыя бутэлькі віна. Я не паспеў апомніцца, як ужо сядзеў у гэтай шумнай незнаёмай кампаніі, і мне, як «штрафніку», налівалі з графіна і падносілі паўнюткую «малянкоўскую» шклянку празрыстай вадкасці. «Сёння ў Рукойнах вяселле, і, значыць, усе павінны гуляць і весяліцца! Такі ў нас звычай!» — растлумачвалі мне, насядаючы, каб выпіў. Потым на ўсю моц (а каго ж баяцца, калі сама ўлада тут) спявалі песні, сярод якіх, помніцца, была і «Касіў Ясь канюшыну», іншыя беларускія песні. А паўнатвары расчырванелы хлапец у расхрыстанай тэнісцы, бліснуўшы планкамі, расцягнуў спеўныя мяхі баяна... Нягледзячы на такую гаману, мне здолелі тады і пячатку паставіць на камандзіроўцы, і памаглі знайсці начлег. У сваіх ранейшых нататках пра тую паездку я, вядома, пасцярогся пісаць пра гэта аж занадта «цёплы прыём» у сельсавеце, пра шырыню характару рукайнянцаў. Але цяпер, за даўнасцю часу, думаю, можна ўспомніць. Тым больш што і людзі ж ужо амаль праз два дзесяткі гадоў тут, у сельсавеце, пэўне ж, зусім іншыя.

Так, не толькі былі тут іншыя людзі, але і новы будынак сельсавета. Той, помніцца, быў у простай драўлянай хаце. Гэты ж — сучасны, двухпавярховы, з новых матэрыялаў. Прасторны хол з дывановымі дарожкамі, мяккаю мэбляю. Акуратныя светлыя кабінеты. Ну, і адпаведная строгасць.

Я з работнікамі музея таксама зайшоў да старшыні сельсавета. Ім была даволі прыемная і тактоўная жанчына Леанарда Феліксаўна Сапкевіч. І якраз родам са Свіран. Больш таго, тыя дзве этнаграфічныя рэчы дзяўчаты і набылі не ў каго іншага, а ў яе радні — Александровічаў...

Калі мы расказалі пра мэту нашай экспедыцыі, Леанарда Феліксаўна з вялікай ахвотай узялася нам памагаць. Яна ўспомніла, што краязнаўствам займалася ў Рукойнах настаўніца мясцовай школы Рэгіна Станіславаўна Кузьміцкая, і тут жа ўзялася званіць ёй, распытоўваць пра матэрыялы, звязаныя з

Францішкам Багушэвічам. Леанарда Феліксаўна таксама знайшла і дала нам адрас краязнаўца — настаўніка гісторыі Медніцкай школы Аляксандра Феліксавіча Алянковіча, які родам з вёсачкі Уляны, суседняй са Свіранамі, — ён даўно цікавіцца сваім земляком Францішкам Багушэвічам, змяшчае пра яго ў віленскіх газетах артыкулы.

Вельмі ўзрадавалася Леанарда Феліксаўна нашай прапанове правесці ў Свіранах літаратурнае свята ў гонар 150-гадовага юбілею Францішка Багушэвіча вясной 1990 года. Яна і сама пра тое ж думала, але не ведала, як гэта зрабіць. Як чалавек дзелавы, Леанарда Феліксаўна папрасіла нумар тэлефона музея, дала свае «каардынаты». Гэтае свята, казала яна, трэба арганізаваць як найлепш. Каб на ім былі не толькі людзі са Свіран, але і з усёй ваколіцы. Хай бы даведаліся яны ўрэшце пра свайго славутага земляка, паслухалі яго творы. Леанарда Феліксаўна папрасіла нас, каб на гэтае свята мы абавязкова сагітавалі сучасных беларускіх паэтаў. Каб землякі Францішка Багушэвіча змаглі паслухаць з вуснаў саміх аўтараў прыгожае беларускае паэтычнае слова.

КУШЛЯНЫ

Другая наша паездка была ў Кушляны.

Фальварак Кушляны Ашмянскага павета набылі продкі Францішка Багушэвіча яшчэ ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Бацька паэта Казімір Багушэвіч перавёз сваю сям'ю са Свіранаў у родавае гняздо недзе каля 1846 года, калі малому Францішку было якіх шэсць гадоў. З Кушлянамі звязаны, можна сказаць, самыя лепшыя гады жыцця Францішка Багушэвіча, тут палюбіў ён маляўнічыя краявіды роднай зямлі, адкрыў для сябе душэўную шчырасць, прыродную дабрыню і працавітасць мужыка-беларуса, тут пачаў шукаць шляхі да яго вызвалення са шматвекавой няволі і цямноты.

Паступіўшы ў 1852 годзе ў Віленскую гімназію, Францішак Багушэвіч ніяк не парываў з домам — Вільня ж адсюль была зусім блізка. У любую вольную хвіліну ён ехаў да бацькоў, бавіў тут канікулы.

Адсюль, з Кушлян, дзесьці ў 1865 годзе, ужо сталым чалавекам, уцякаючы ад кары за ўдзел у завірусе студзеньскага паўстання, пусціўся ён на доўгія гады ў вялікі, не заўсёды

прыветлівы свет, інакш кажучы, у горкае выгнанне.

Цэлых дваццаць гадоў кідала яго доля па цярністых шляхах далёкай Украіны і яшчэ больш далёкіх кутках неабсяжнай Расіі, па незнаёмых гарадах, мястэчках, сёлах.

Але куды б ні трапляў Францішак Багушэвіч у пошуках прытулку і кавалка хлеба, душа яго заўсёды была дома, адсюль ірвалася яна на родную Віленшчыну, да асмужаных кушлянскіх палёў і пералескаў.

У мёр бы то, мусіць, я тут,
Каб не жменька той роднай зямлі, —
пісаў паэт.

І вось у 1883 годзе, калі ён быў ужо сямейным чалавекам, яму надарылася першая магчымасць вяр нуцца дадому: Францішак Багушэвіч прачуў, што ў Вільні для такіх, як ён, юрыстаў якраз адкрыліся вакансіі. І ён адразу ж скарыстоўвае гэтую магчымасць, не ўважаючы на наладжаныя на Украіне важныя сувязі, на абяцанае начальствам павышэй не па службе.

Працуючы адвакатам у Вільні, паэт цяпер мог часта наведвацца ў Кушляны. Але для яго было гэтага вельмі мала. Ён марыць стала пасяліцца ў дарагім сэрцу кутку, жыць сярод простага вясковага люду, на бацькоўскай зямлі. Мара пра ўласную хату ў Кушлянах, туга па родным кутку вельмі выразна чуецца ў яго вершы «Мая хата», які ўвайшоў у выдадзены ў 1891 годзе зборнік «Дудка беларуская»:

Бедна ж мая хатка расселася з краю,
Між пяскоў, каменняў, ля самага гаю,
Ля самага бору, на беражку лесу,
Ніхто тут не трафе, хоць бы з інтарэсу.
Як няма гарэлкі, няма куска хлеба,
Дык які ж інтэрас, каму сюды трэба?!
Ды хоць няма хлеба, жабраваць не буду,
Пражыву як-кольвек ад працы, ад труду!..
Клікалі ж у госці і клічуць суседзі.
Не пайду, не трэба, бо, кажуць, заедзі
Ад чужога хлеба губы абсядаюць,
Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць.
Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце,
Не пайду да вас я, хіба ў арэшце.
А хоць сілай навет адарвалі б з дому,
Калісьці вярнуўся б, як мядзведзь да лому.
Заваліцца хата, зарастуць пакосы,
Усё б я вярнуўся, хоць голы і босы!..

Паэтава мара хоць на схіле гадоў, але ўсё ж збылася. Нечакана атрымаўшы ў 1896 годзе ў спадчыну добрую суму грошай, Францішак Багушэвіч нарэшце будуе ў Кушлянах свой дом. Але толькі праз два гады ён цалкам вызваляецца ад сваёй адвакацкай дзейнасці і канчаткова пасяляецца на бацькаўшчыне.

Уяўляю, якое гэта было шчасце для паэта — жыць на сваёй зямлі! І — пісаць! А пісаць тут было пра што. З успамінаў сучаснікаў паэта мы ведаем, што ён часта заводзіў сяброўства з простымі сялянамі, любіў распытваць людзей пра іх жыццё, пра розныя гісторыі, запісваў усё пачутае на паперу. Ці не адсюль і яго апавяданні? Толькі за два апошнія гады паэт падрыхтаваў аж дзве новыя кнігі — «Беларускія апавяданні Бурачка» і зборнік вершаў «Скрыпачка беларуская». Як гэта ні шкада, але абедзве кнігі бясследна загінулі. Пэўне ж, яны яшчэ раз паказалі б свету незвычайны талент Францішка Багушэвіча, лішні раз засведчылі б, якога вялікага паэта мела наша літаратура ў другой палове XIX стагоддзя.

Творы Францішка Багушэвіча, якія ён ахвотна чытаў — відаць, адразу пасля напісання — сваім суседзям і знаёмым, мелі вялікі водгалас у людскіх сэрцах. Яны надзвычай лёгка запаміналіся, падоўгу захоўваліся ў народнай памяці. У пачатку шасцідзесятых гадоў, калі я працаваў на Беларускім радыё, мне давялося запісаць на плёнку аднаго старога жупранца, здаецца, гэта быў Невядомскі, — ён чытаў па памяці, як рэпу грыз, адзін за адным вершы, якія чуў яшчэ ад самога Багушэвіча. Мне здалося, што асобныя з тых вершаў я не сустракаў у кнігах паэта. Нешта тады перашкодзіла мне дакладна ўсё гэта праверыць. Можа, сярод расказаных вершаў былі і тыя, што склалі потым «Скрыпачку беларускую»? Тую магнітафонную стужку я здаў тады ў фанатэку Беларускага радыё. За такі доўгі час яе там, вядома ж, ужо недзе размагнічылі. Сёння мне застаецца толькі пашкадаваць за гэтакую сваю нядбаласць.

У Кушлянах нас сустрэлі дырэктар будучага дома-музея Францішка Багушэвіча малады паэт Алесь Жамойцін і сакратар партарганізацыі кушлянскага калгаса Леанід Уладзіміравіч Грышан.

Я ўжо раней ведаў: Жамойцін з вялікім энтузіязмам узяўся за аднаўленне сядзібы Францішка Багушэвіча. Уступіўшы ў СП, ён не кінуўся абіваць высокія парогі, каб асесці ў сталіцы, атрымаць там добрую пасаду, а папрасіўся туды, куды яго паклікала прызванне. Прыдбаў там сабе дом, перавёз сям'ю. Словам, «усур'ёз і надоўга» звязаў свой лёс з зямлёй Францішка Багушэвіча, з музейнай работай. Галоўнае, Алесь зусім невыпадковы для му Зея чалавек. Пра яго цікавасць да роднай гісторыі, да спадчыны Францішка

Багушэвіча сведчаць артыкулы, якія ён друкаваў у рэспубліканскіх часопісах, яго вершы і паэмы на гістарычную тэму. Адзін з яго твораў — «Кастусь Каліноўскі» — даводзілася і мне рыхтаваць да друку ў «Полымі».

Ездзячы па Беларусі, я ніколі не прамінаў пазнаёміцца з мясцовымі краязнаўчымі музеямі. Колькі ў іх штатах сустракаў я абыякавых, зусім выпадковых людзей! «І падабаецца вам гэтая работа?» — папытаўся я неяк у адным раённым краязнаўчым музеі ў маладой, расфарбаванай дзяўчыны, яго работніцы. «Не вельмі, — прызналася яна. — Але недзе ж трэба рабіць...» Такіх вось «Недзе ж трэба рабіць» — хоць плот гарадзі ў нашых краязнаўчых музеях. Часцей за ўсё гэта «пазваночныя» (па выразу Анатоля Вялюгіна) — асобы, якіх «па званку» ўладкавалі «добрыя дзядзькі» на быццам бы «не пыльную» для іх музейную работу. Такія работнікі толькі займаюць чыёсьці месца ў гэтых важных асяродках культуры, што мацуюць нашы повязі з гісторыяй, выхоўваюць у нас высокую духоўнасць.

Таму прыход у музеі такіх, як Алесь Жамойцін, энтузіястаў трэба толькі вітаць.

Адразу па нашым прыездзе ў Кушляны Алесь наважыў паказаць нам напытаную ў адной хаце ў ваколіцы цікавую старую камоду, каб набыць яе для будучага музея. Я быў рады такой прапанове: мне вельмі цікава было пабачыць кушлянскія ваколіцы, бліжэй пазнаёміцца з зямлёй Багушэвіча.

Паехалі туды сваім аўтобусам. Дарога ішла лесам. Аўтобус ледзь праціскваўся між галінастых хвой, не без цяжкасці пераадольваючы глыбокія гразкія лужыны. Праз колькі часу выбавіліся на святло, паехалі ледзь прыкметнай палявой дарогай, якая неўзабаве зусім скончылася. Аўтобус пачаў валюхацца па ўдзірванелых грудах нейкага лугу, потым зусім суняўся, бо далей можна было вельмі лёгка засесці: між травы пабліскавала вада. Мы пайшлі пеша, пераскокваючы з купіны на купіну, і праз які кіламетр убачылі адзінокую закінутую сядзібу ў старых прысадах.

Апрача пашарэлай, але ўсё ж даволі моцнай хаты, якая была на замку, у двары стаялі яшчэ пакінутыя гаспадарчыя пабудовы, таксама з моцнага, не кранутага шашалем бярвення. На панадворку раскашаваў быльнёг, між штакецін пахіленага плота лезла жыгучка-крапіва, шугала цемналістая, надзіва буйная лебяда, на сярэдзіне двара, пачуўшы нежылы дух, адваёўваў сабе надзелы жорсткі сівы палын — горкая трава запусцення.

Якая гэта тыповая цяпер карціна! Такія во пакінутыя хаты, зарослыя травою двары можна напаткаць сёння ў любым кутку Беларусі. Катастрафічна гіне, адыходзіць у нябыт традыцыйная беларуская вёска, самі сабой рушацца цяпер і гэтакія адзінокія

хутары, якія неяк жа выстаялі ў бязлітасных бурах часу, перажыўшы бязглуздыя кампаніі па іх ссяленні.

З аднаго боку пад хутар, каля якога мы тупалі, падыходзіў лес. На ўскрайку яго, адышоўшыся на сіўцовую лугавіну, стаяў не блізка — на адлегласці адзін ад аднаго — гурт шырокіх цяністых дубоў. Каля іх пасвіўся статак пярэстых кароў — відаць, недзе за лесам была вёска. На другі бок ад хутара — аж да асмужанай паласы далёкага хвойніку — ільснілася сівавата-зялёным жытам вялікае раўніннае поле, па якім часам беглі цені ад воблакаў, што зрэдку наплывалі на сонца. І хоць бы дзе гук ад машыны ці якога матацыкла! Нават дарогі нідзе не відаць было. Як быццам мы трапілі ў нейкі іншы свет, на зусім іншую планету, якая не дайшла яшчэ да «машыннай» цывілізацыі, ці проста вярнуліся ў мінулае стагоддзе! Цішыня, прастор, воля. Не веру, што не знайшлося б ахвотніка ўзяць тут зямлю, пасяліцца у гэтым выдатным для жыцця кутку, самастойна, без чыёйсьці ўказкі павесці тут гаспадарку, стаць ўладаром сваёй долі!

З гэтымі думкамі я падышоў да Леаніда Уладзіміравіча, пацікавіўся, як у іхнім калгасе прыжываецца арэнда, ці дае калгас каму-небудзь зямлю.

— А хто яе возьме? — адказаў Леанід Уладзіміравіч.

— А мо трэба б пашукаць такіх людзей? Вы шукалі?

— Не, не шукалі і шукаць не думаем. У нашым калгасе і так усё добра. Прадукцыі здаём дзяржаве шмат. Да таго ж яшчэ невядома, як павернецца палітыка з гэтай арэндай... — прыкладна так адказаў мне сакратар калгаснай партарганізацыі.

Дзіўна, гэта ж самае я чуў у другім баку Беларусі, у Слуцкім раёне. На семінары творчых работнікаў, які праводзіў там Мінскі абком партыі. У шыкоўным Доме культуры вёскі Казловічы, дзе падводзілі вынікі знаёмства з калгасам імя Кірава, аднаму з калгасных старшынь, што прысутнічаў там і выступіў з расказам пра поспехі свайго калгаса, я паставіў рубам такое пытанне: «Калі б вам прынёс хто-небудзь з калгаснікаў заяву з просьбай выдзеліць яму ў доўгатэрміновую арэнду ўчастак зямлі, ці далі б вы на гэта згоду?» — «Не, не даў бы», — цвёрда, нават з ноткай выкліку адказаў старшыня перад вялікай аўдыторыяй. І гэта нягледзячы на афіцыйную ўстаноўку на арэнду як на адзін з самых дзейсных метадаў гаспадарання. У адказе чулася і прыхаванае тлумачэнне гэтай цвёрдасці: «У нас і так усё добра». Ён гэтак, праўда, не сказаў, але такія словы вынікалі з яго паведамлення-выхваляння. Смеласць старшыні, як я зразумеў з далейшых нашых афіцыйных і неафіцыйных гутарак на семінары, грунтавалася яшчэ на тым, што і пэўныя партыйныя кіраўнікі са скептыцызмам ставіліся да арэнды, робячы стаўку на калгасы і

саўгасы. Мне яны ў прыватных размовах даказвалі, што гэтая форма яшчэ не зжыла сябе. Тое, што калгасная сістэма давяла сельскую гаспадарку да развалу, яны тлумачылі адміністрацыйным націскам на калгасы зверху, рэгламентацыяй іх дзейнасці, грубым камандаваннем імі. Калі б цалкам вызваліць іх ад залішне клапатлівай апекі вярхоў, даць ім поўную самастойнасць, тады б яны быццам бы паказалі, на што здатныя.

Але ж, даўшы самастойнасць калгасным кіраўнікам, ці вызвалім мы простых калгаснікаў ужо ад іхняй апекі, ад іхніх камандаў?

Трэба ўсім нам як найхутчэй зразумець, што толькі вызвалены селянін можа пракарміць краіну. Ды ён — развяжыце толькі яму па-сапраўднаму рукі — за самы кароткі час свет накорміць хлебам. Ажывуць расквітнеюць тады і нашы вёскі, і такія во закінутыя хутары...

Але я, здаецца, адступіўся ўбок, ці не залішне расфіласофствааўся.

Хоць гаспадароў хутара мы не знайшлі (яны перабраліся недзе ў Вільню), нам усё ж удалося паглядзець тую даўнейшую камоду. Выглядала яна сапраўды прыгожа. З разьбяным раслінным узорам вельмі тонкай работы, з фігурным люстэркам у драўляным абрамленні, арыгінальная па форме камода, вядома, магла б быць выдатнай аздобай Багушэвічавага музея: яна ж, можна сказаць, і з яго мясціны, і з яго часу.

Вырашана было звязацца з гаспадарамі і закупіць гэтую каштоўную рэч.

З хутара зноў вярнуліся ў Кушляны.

У Кушлянах мне давялося пабываць з групай пісьменнікаў амаль дваццаць пяць гадоў назад, ў час святкавання 125-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча. Тады на сваім месцы стаяў пастарэлы драўляны паэтаў дом, пабудаваны ім у 1896 годзе. Вядома, ён ужо шмат у чым адрозніваўся ад першапачатковага, бо — можа, нават не раз — рамантаваўся, да яго дадаваліся нейкія дабудоўкі, нешта адкідалася. І ўсё ж аснова была тая ж самая, гэта быў, можна сказаць, той самы дом. Дом Францішка Багушэвіча. І яго, відаць, трэба было б у аснове сваёй захаваць, адкінуўшы розныя пазнейшыя дабудоўкі, узнавіўшы, магчыма, нейкія старыя, першапачатковыя дэталі.

Выклікала ў мяне ўнутраную нязгоду тое, што расчышчаючы пляцоўку каля дома, «архітэктары» будоўлі знеслі бульдозерам, ссунулі разам з верхнім пластом зямлі здзічэлае кустоўе былога саду Багушэвіча, магчыма, пасадлсанага яго рукой. Сярод друзу сіратліва тырчала толькі зноў жа асуджаная на знішчэнне грыўка густога сліўняку, які, пастаянна абнаўляючыся, шчасліва дажыў

да нашага часу і яшчэ невядома колькі б рос тут, каб яго не чапалі. А чаму б не зберагчы гэты сліўняк, чаму б не пашукаць тут парасткаў і іншых дрэў, якія наўрад ці поўнасцю пазасыхалі? Іх жа можна б было як трэба пачысціць, даглядзець па-гаспадарску, падсадзіць да іх новыя дрэвы і кусты. Гэта быў бы хоць і абноўлены, амалоджаны, але сад Багушэвіча! А не сад, пасаджаны на месцы саду Багушэвіча.

Больш за ўсё, аднак, засмуціла нас з Содалем «апрацоўка» падмурка даўнейшай хаты, у якой жылі яшчэ з сям'ёй бацькі Францішка Багушэвіча, а мо і яго дзяды, хаты, у якой рос і гадаваўся сам паэт да яго адыходу «ў людзі». Падмурак гэты, выкладзены з камянёў, змацаваны нейкім даўнейшым растворам, быў на той жа сядзібе, непадалёку ад дома Францішка Багушэвіча. Калі мы падышлі туды, то ўбачылі ў самай сярэдзіне гэтага падмурка... бульдозер, які паспеў ужо развярнуць яго частку.

— Як жа так можна, Алесь? — пачалі мы па-сяброўску ўшчуваць Жамойціна. — Падмурак жа трэба зберагаць...

Алесь пачаў запэўніваць нас, што падмурак застанецца...

— Крытыкаваць мы ўсе ўмеем, а вот каб памагчы рабіць музей, то не надта каго і знойдзеш, — умяшаўся ў размову парторг.

Мы з Содалем, пачуўшы сябе вінаватымі, прыкусілі языкі — што ж, нас, беларусаў, заўсёды вельмі лёгка паставіць на месца.

Мусіць, не надта спадзеючыся, што падмурак даўняга жылля Багушэвічаў усё ж захаваецца, Содаль зняў з плячэй фотаапарат, пачаў пстрыкаць ім, беручы ў кадры то ўвесь добра бачны ў траве падмурак, то яго асобныя часткі, у тым ліку разбураныя, з вывернутымі бульдозерам камянямі: хоць на здымку, але рэшткі былога Багушэвічавага дома цяпер назаўсёды захаваюцца для нашчадкаў!

Вядома, за тыя амаль сто гадоў, як не стала паэта, шмат што змянілася на яго радзіме. Змяніўся ўвесь архітэктурны ансамбль сядзібы Багушэвічаў. Час бязлітасна знішчыў большасць гаспадарчых пабудоў, два калодзежы з жураўлямі, дзе сям'я брала ваду, сажалку, альтанку на Лысай гары, уязную браму пры каплічцы, змяніў, а то і зусім сцёр дарогі. Содаль яшчэ нядаўна бачыў тут старую дарогу, якой ездзілі Багушэвіч у Солы. Цяпер дарогу зааралі, засеялі збажыною — ад яе ўжо ані знаку. Чыясьці рука знішчыла дуб, што стаяў непадалёк, дуб, які помніў Багушэвіча. Чаму б яго не пакінуць? Без усяго гэтага як жа можна ўявіць атмасферу жыцця паэта?

Што-нішто з Багушэвічавай сядзібы, на шчасце, усё ж захавалася. Прыдарожная каплічка, пабудаваная ў памяць паўстанцаў 1863-1864 гадоў. Таксама мураваная гаспадарчая

пабудова. Высаджаная самім паэтам алея ў парку. Ну, і, вядома ж, захавалася зямля Багушэвіча, палі, лясы, узгоркі. Усё, што засталося, што выстаяла ў віхурах часу, вядома ж, усім нам трэба беражліва цяпер захоўваць, шанаваць. Тое ж, што было знішчана часам і нашай няўвагай, трэба ўзнавіць. Гэтае ж месца — запаведнае, наша нацыянальная святыня.

Агледзеўшы Багушэвічаву сядзібу, мы пакіравалі да мемарыяльнага каменя на Лысай гары, да якога любіў хадзіць і адпачываць сам паэт і на якім у год смерці Францішка Багушэвіча яго сябры выбілі словы: «Памяці Мацея Бурачка. 1900 г.».

Ішлі туды той самай паэтавай алеяй. Аб чымсьці сваім ціха шумелі пастарэлыя цяпер бярозы. Збоку падыходзілі пад алею замшэлыя хвоі змешанага лесу. З узбочных купін чырванелі спелыя па зёмкі, пракідаліся чарніцы. З другога боку з-за бяроз і каштанаў алеі прасвечвала шырокае поле, якое там-сям горбілася невысокімі ўзгоркамі, вабіла зялёнымі пералескамі. Над полем клубіліся белыя, месцамі пацямнелыя воблакі, з якіх накрапваў рэдзенькі дожджык. Вось, яна, Багушэвічава зямля. І як гэта добра, што яна ёсць, што ў любы час можна прыйсці сюды, паблукаць гэтымі ціхімі палямі і зарослымі травою алеямі, далучыцца душою да простай і суровай паэзіі дарэшты адданага роднаму люду Мацея Бурачка.

Мне хацелася паболей ведаць пра Багушэвічаву зямлю, пра яе людзей, таму я завёў гаворку з парторгам Леанідам Уладзіміравічам, з якім ішоў поруч цяністай паэтавай алеяй. Леанід Уладзіміравіч з ахвотай пачаў расказваць пра гэтыя мясціны, ну, і, вядома, пра свой калгас. Раней калгас называўся «Радзіма Багушэвіча» (ён адносіцца да Смаргонскага раёна), але з той прычыны, што суседні калгас з цэнтрам у Жупранах (там ужо Ашмянскі раён) назвалі імем Францішка Багушэвіча, то іхняму, каб не блытацца, далі іншую назву — «50 лет СССР». Я, мусіць, дапусціў тут бестактоўнасць, бо ў мяне вырвалася:

— А чаму такая дзікая назва?

— Як гэта дзікая? — у голасе парторга я пачуў ледзяныя ноткі і, каб змякчыць сітуацыю, пачаў даводзіць Леаніду Уладзіміравічу, што такія надта казённыя назвы не ўспрымаюцца людзьмі, што можна б назваць калгас не гэтакім складаным словазлучэннем, а неяк прасцей, якім-небудзь адным словам.

— Напрыклад? — лёд у голасе Леаніда Уладзіміравіча і не думаў раставаць.

— А чаму б не назваць так — «Кушляны»?

— Гэта назва не для калгаса...

Вось так — для калгаса звычайная, народная назва не падыходзіць. Для яго ў нас абавязкова трэба прыдумліваць нешта

звышідэйнае. Ці не такім во чынам і пайшлі па ўсім Савецкім Саюзе гуляць стандартныя назвы-агіткі, поўнасцю вымавіць якія часта не хапае духу. Асобныя ж з іх налічваюць да дзесятка, а можа, і болей слоў! Хто з нас не страчаў такую «папулярную» назву, як, скажам, «Калгас імя XXI (XXII, XXIII, XXIV і г. д.) з'езда КПСС». Давайце адкінем скарачэнні, разгорнем назву поўнасцю. Атрымаецца — «Калектыўная гаспадарка імя дваццаць першага з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза». Цэлых дзесяць слоў!

І наогул — якая казёншчына, якая ўбогасць, якая стандартнасць, урэшце, якая часам недарэчнасць у назвах нашых калгасаў! Я неяк зрабіў маленькае даследаванне: прагартаў падшыўкі ўзятых адвольна 20 раённых газет Беларусі, дзе ў розных зводках даюцца спісы калгасаў. Якія ж іх характэрныя назвы? На першым плане тут — імёны былых кіраўнікоў партыі і ўрада. Напрыклад, у дваццаці гэтых раёнах я налічыў аж дванаццаць калгасаў імя Калініна — больш як палова! Амаль у кожным раёне знойдзеш такія назвы, як калгас імя такога і такога з'езда партыі, часам нават па некалькі на раён. З раёна ў раён пераходзяць такія назвы, як «Ленінскі шлях» (ці «Шлях Леніна», «Шлях Ільіча»), «Чырвоны Кастрычнік», «Шлях да камунізму», «10 (40, 50 і г. д.) год Кастрычніка» (ці, адпаведна, БССР, СССР), «Маяк», «Перамога», «І Мая», «Запаветы Ільіча». Вельмі многа ў назвах «сцягоў» — «Кастрычніцкі сцяг», «Сцяг камунізму», «Сцяг Перамогі», «Чырвоны сцяг», «Сцяг Леніна», а яшчэ болей «святла» — «Светлы шлях», «Зара», «Ясная зара», «Рассвет», «Звязда», «Зорка», «Аўрора», «Іскра», «Полымя», «Усход», безліч «чырвані», «шляхоў». Есць нават такія «шэдэўры», як «Абарона краіны», «За мір», «За Радзіму» — звычайныя лозунгі!

Вынікі свайго даследавання я хацеў паслаць у якую-небудзь газету. З прапановай — называць калгасы імёнамі іх цэнтральных вёсак. Мы захоўвалі б такім чынам нашы народныя назвы. Але пасылаць такі допіс я перадумаў, бо прыйшоў да глыбокага пераканання, што пры далейшай дэмакратызацыі нашага грамадства, пры канчатковым пераходзе на эканамічныя метады гаспадарання калгасы ў цяперашнім выглядзе знікнуць. А разам з імі, як мякіна, адсеюцца і гэтыя бюракратычныя назвы, навязаныя людзям, як і самі калгасы, зверху.

Пра ўсё гэта я хацеў неяк сказаць парторгу, але ўбачыў, што яго не пераканаеш. Ну, і распытваць далей пра радзіму Багушэвіча стала бескарысна: расказваць пра што-небудзь у Леаніда Уладзіміравіча, як мне здалося, ужо не было настрою.

ЖУПРАНЫ

Жупраны — бліжэйшае ад Кушлян мястэчка. У часы Багушэвіча — цэнтр усёй ваколіцы. Сюды, у парафіяльны касцёл, з'язджаліся сяляне і шляхта з навакольных вёсак і фальваркаў, тут былі парафіяльныя могілкі.

Тапонім Жупраны сам Францішак Багушэвіч растлумачваў як зменены Зубраны, а Жупранская пушча была некалі Зубранскай — ад слова«зубр». Тут шумелі векавечныя пушчы з багатай дзічынай. Але пры Багушэвічу ўжо навакольныя пушчы моцна парадзелі, спустошыліся каралеўскімі ды панскімі паляваннямі.

Францішак Багушэвіч вельмі часта бываў у Жупранах — ці мала чаго трэба было ў парафіяльным мястэчку? Тут усё да драбніц было яму знаёмае, тут з кожным сустрэчным ён вітаўся як з сябрам.

Сюды поўным сонца і святла вясновым днём 1900 года па пясчанай палявой дарозе з Кушлян паволі цягнулася доўгая пахавальная працэсія. За труной, якая ціха плыла на возе, ішлі сяляне і людзі шляхецкага саслоўя, рабочыя-рамеснікі і, як сказалі б сёння, прадстаўнікі гарадской інтэлігенцыі. Гэта везлі хаваць паэта і адваката Францішка Багушэвіча.

Толькі два гады пажыў паэт пасля доўгіх гадоў блуканняў і пакут на бацькоўскай зямлі. Пэўна, жыў бы яшчэ куды больш (яму ж было толькі шэсцьдзесят), жыў бы, калі б не тыя гады вымушаных бадзянняў, калі б больш думаў пра сябе, а не пра іншых, калі б не яго няўрымслівы характар. Да заўчаснай смерці Багушэвіча прычынілася наладжаная яго сябрамі летам 1897 года экскурсія на лодках па Віліі і Нёмане да Коўна. Вось як расказвае пра гэта ў «Запісках Беларускага навуковага таварыства» (Вільня, 1938, с. I) адзін з сяброў паэта З. Нагродскі: «Едучы ў Коўна, участкі яе (экскурсіі. — К. Ц.) перажылі цяжкі момант: матурыст Швэнгрубэн чуць не ўтануў. Гэты выпадак страшэнна падзеяў на Багушэвіча, у якога зрабіўся як быццам нервовы «шок». А ўслед за гэтым, у той жа дзень, сталася такая рэч. Прыстаўшы да берага на начлег, усе пайшлі спаць у нейкую пуньку. Але Багушэвіч не хацеў спаць у душнай пуні і пастанавіў легчы пад голым небам на лужку. Хаця накрапваў дождж ык і Багушэвіча адгаворвалі ад гэтага, ён сказаў: «У 1863 годзе мы спалі ў горшых варунках». Закруціўся ў бурку ды праспаў ноч на траве. Ад гэтага застудзіўся, і ў яго зрабілася хвароба нырак, да якое пасля прылучыўся туберкулёз. У рэзультаце здароўе яго было зламана, і гэта давяло да перадчаснае смерці».

Пахавалі Францішка Багушэвіча на жупранскіх могілках

побач з бацькам і роднымі. На магіле быў пастаўлены вялікі дубовы крыж, на якім павесілі дудку, смык і скрыпку — сімвалы яго паэзіі. І яшчэ было ўскладзена на магілу некалькі стужак з надпісамі. Сярод гэтых надпісаў кідаўся ў вочы такі: «Змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы».

Нягледзячы на цяжкое, поўнае змагання і пакут жыццё, усё ж мы можам сказаць, што ў Францішка Багушэвіча была шчаслівая доля: пасля шматгадовых блуканняў па свеце ён здолеў-такі вярнуцца на сваю радзіму і спіць вечным сном у сваёй зямлі, сярод родных і блізкіх. Не шмат каму з беларускіх паэтаў у далёкім і не такім далёкім мінулым так пашанцавала!

Жупраны ляжаць на даволі бойкай дарозе: Мінск — Ашмяны — Вільнюс. Кожнага, хто праязджае тут, страчае ў прыдарожным скверыку бронзавы Францішак Багушэвіч. Паэт як бы запрашае наведаць яго радзіму.

І кожны, хто любіць сваю Беларусь, яе народ, хто шануе яе лепшых сыноў, даражыць нашай культурай, не можа не прыняць гэтае запрашэнне. Ён абавязкова спыніць тут сваю машыну і сходзіць пакланіцца магіле Францішка Багушэвіча, ну, і пастараецца, мусіць, трапіць у чырвоны касцёл, дзе ў знак асаблівай пашаны да паэта неўзабаве пасля яго смерці на сцяне, на самым відным месцы, была ўмуравана мармуровая дошка з яго партрэтам. Праўда, партрэт ужо іншы, «палепшаны». Той, першапачатковы, недзе ў пасляваенны час нейкі наш сучасны варвар выняў адтуль, каб зрабіць музейным экспанатам. Па сённяшні дзень, кажуць, ён пыліцца недзе ў запасніках Ашмянскага краязнаўчага музея. Як жа пасля такога мы можам называць сябе цывілізаванымі, культурнымі людзьмі? На мой погляд, не ўпрыгожвае нас і тое, як мы ўшаноўваем магілу Францішка Багушэвіча. У мой першы прыезд тут стаяў зроблены нейкім мясцовым майстрам стандартны цэментавы помнік. Цяпер, прыехаўшы ў Жупраны, мы ўбачылі гранітны помнік з барэльефам паэта — пастаўлены ён быў у 1975 годзе. Замест магільных курганоў, пад якімі прах паэта, яго бацькі і іншых членаў сям'і Багушэвічаў, ляжалі дзве вельмі акуратненькія пліты — адна на месцы магілы Францішка Багушэвіча, другая — для ўсіх астатніх Багушэвічаў. Як быццам гэтым самым ушанована ўся іх сям'я. Але ці так гэта? Перад маімі вачамі стаіць зроблены ў 1929 годзе Язэпам Драздовічам малюнак «Магіла Багушэвічаў у Жупранах». На ім — асобныя курганкі для кожнага з членах сям'і, з крыжамі і паўкруглымі камянямі ў галовах. Ці трэба было парушаць, мяняць усё гэта? Ці не паздзекаваліся мы тым самым са святых магіл? Нікому ж, напрыклад, і ў галаву не прыйдзе ставіць які помнік над простым магільным курганком Льва Талстога ў Яснай

Паляне, які нязмерна больш хвалюе сэрца за любую мастацкую выдумку.

Радзіму Францішка Багушэвіча я пакідаў з гнятлівым пачуццём. Ці не зашмат у гэтым мемарыяльным комплексе знішчана, часцей за ўсё нашай няўвагай, а мо і нашым бескультур'ем самых розных памятак, звязаных з біяграфіяй аднаго з першапраходцаў роднай беларускай літаратуры? Ці не зашмат тут усялякіх падробак, «падхарошванняў»?

Успамінаецца паездка ў 1986 годзе на Шаўчэнка ўскае свята на Украіну. Мне пашчасціла пабываць тады на радзіме Тараса Шаўчэнкі — у сяле Морынцы Звянігарадскага раёна Чаркаскай вобласці, дзе нарадзіўся паэт, і ў блізкім адсюль сяле Кірылаўка (цяпер Шаўчэнкава), дзе прайшлі яго дзіцячыя гады.-На месцы роднай хаты вялікага Кабзара я ўбачыў толькі памятны камень з прымацаванай табліцай і надпісам на ёй, а там, дзе стаяла хата Шаўчэнкаў у Кірылаўны, — абеліск і камень з магілы бацькі.

Вярнуўшыся ў Чаркасы, дзе сабраліся ўсе ўдзельнікі свята, каб правесці там літаратурны вечар, я выказаў аднаму з арганізатараў урачыстасці паэту Івану Драчу сваё здзіўленне: чаму гэта ўкраін цы не адбудавалі дасюль ні роднай хаты Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі ў Морынцы, ні хаты ў Кірылаўны, з якой пайшоў ён «у людзі».

— А нашто нам імітацыя, — адказаў на гэта Іван Драч. — Трэба захоўваць і аберагаць тое, што засталося, першароднае...

І праўда, украінцы свята аберагаюць кожную памятку, звязаную са сваім вялікім нацыянальным паэтам. Напрыклад, глінабітны дамок дзяка, у якога браў першапачатковую навуку маленькі Тарас, абнесены з усіх бакоў сценамі спецыяльнай пабудовы з дахам. На вякі захаваецца цяпер гэтая першая школка песняра Украіны.

Я расказаў пра гэта ў аўтобусе Содалю і ўсім таварышам па вандроўцы і выказаў сваю занепакоенасць, ці паслухаецца Алесь Жамойцін нашай парады зберагчы падмурак даўнейшай хаты Багушэвічаў.

Маю занепакоенасць падзяліў і Содаль. Ён параіў яшчэ раз пагутарыць з Алесем. Паколькі мы ўжо тады далёка ад'ехалі адтуль, заставалася толькі пазваніць яму. Але дома ў Алеся тэлефона не было. Я надумаў пазваніць у калгасную кантору, папрасіць, каб перадалі Алесю маю просьбу: хай ён па нашым прыездзе затэлефануе мне на работу ў «Полымя». Але і ў кантору пазваніць з Ашмян, кудой мы ізноў праязджалі, было не так проста: Кушлянскі калгас належаў да іншага, Смаргонскага раёна. Калі мяне ўсё ж звязалі з той канторай (званіў я з кабінета майго сябра рэдактара ашмянскай райгазеты Юркі Мікалаева), я нібы з-

пад зямлі пачуў далёкі жаночы голас. Гэты голас і паабяцаў выканаць маю просьбу. Але званка я ад Алеся чамусьці так і не дачакаўся.

Як потым выявілася, мы ўсё ж дарэмна сумняваліся ў Жамойціне. Неўзабаве пасля нашай паездкі ў Кушлянах ізноў пабывала група работнікаў таго ж Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, якія сказалі мне, што падмурак хаты Багушэвічаў беражна захоўваецца. Ну, а палазіў там бульдозер быццам бы таму, што няўрымслівы Алесь Жамойцін хацеў гэтакім спосабам пашукаць для музея сямейныя рэліквіі Багушэвічаў. Між іншым, яму, як расказваюць, перад тым тое-сёе на Багушэвічавай сядзібе ўдалося знайсці — вельмі цікавую, праўда, пабітую фарфоравую талерку, камень, на якім выбіта лічба — 1898, а гэта ж год, калі паэт назаўсёды вярнуўся ў Кушляны. На гарышчы Багушэвічавай хаты адшукаўся таксама абрывак старога канверта з некалькімі невыразнымі словамі, напісанымі, як мяркуецца, рукой паэта... Ну што ж, можна толькі пажадаць Алесю Жамойціну поспеху ў яго важнай рабоце па ўвекавечанні памяці нашага Францішка Багушэвіча.

ЯШУНЫ

Вядома, Свіраны, Кушляны, Жупраны — самыя важныя мясціны ў жыцці Францішка Багушэвіча. Гэта — яго зямля, «малая радзіма».

Але, каб па-сапраўднаму пазнаць і зразумець паэта, трэба, мусіць, прайсці ўсімі яго шляхамі, па якіх кідала яго доля.

У час нашай экспедыцыі мы меліся, апрача названых вёсак, наведаць і іншыя, канечне, не вельмі далёкія адсюль мясціны, што паклалі хоць які-небудзь адбітак у біяграфіі Францішка Багушэвіча.

Больш за ўсё хацелася нам бліжэй пазнаёміцца з яго роднай Віленшчынай, сустрэцца з людзьмі, якія б маглі нешта дадаць да жыццяпісу паэта, ну, і набыць у іх для музея нейкія рэчавыя памяткі.

Канцавым пунктам нашага падарожжа па Віленшчыне мы намецілі вёску (здаецца, раней гэта было мястэчка) Яшуны, дзе некалі працаваў малодшы брат Францішка Багушэвіча Апалінар і куды часта наведваўся сам паэт. Пра Яшуны ён пісаў і ў адным са сваіх твораў. Яшуны належаць да Шальчынінскага раёна, які з

аднаго боку мяжуе з Вільнюскім, а з другога — з нашым Воранаўскім раёнам Гродзенскай вобласці.

І вось па гладкіх асфальтаваных дарогах падвіленскага краю бяжыць падуладны Валераўым рукам наш лёгкі на ход аўтобусік.

Па дарозе мы час ад часу спыняемся, знаёмімся з вёскамі, гутарым з сустрэчнымі, адшукваем людзей, якія цікавяцца гісторыяй свайго краю, якія многа могуць нам сказаць, дапамагчы з матэрыяламі для музея.

Першы, каго нам параілі наведаць, быў настаяцель царквы каля вёскі Тургалі протаіерэй айцец Канстанцін Аўдзей.

Мы спынілі свой аўтобус далекавата ад яго сядзібы — не знайшлі пад'езда. Праз стары сад, свежаскошаную лугавіну з копамі пахкага зялёнага сена пайшлі цугам да яго дома. Каб не надта палохаць гаспадароў, першымі выправілі нашых дзяўчат. Сцежка да дома вяла міма навязаных на ланцугі сабак, якія, убачыўшы нас, проста рвалі тыя ланцугі, каб не дапусціць няпрошаных гасцей да ганка. Пачуўшы залівісты брэх сабак, выйшла пажылая жанчына і, адпіхваючы іх ад сцежкі, распытала нас, хто мы такія і чаго хочам. Перакрыкваючы сабак, мы ўсё ёй растлумачылі, і яна, уціхамірыўшы сваіх ваўкадаваў, прапусціла нас да дома.

Насустрач нам выйшаў на ганак высокі хударлявы сівабароды чалавек гадоў сямідзесяці ў доўгай чорнай расе. Калі мы растлумачылі яму, што да чаго, ён ветліва запрасіў усіх нас у дом, дзе пасадзіў у невялікай, але вельмі ўтульнай гасцёўні. Спачатку айцец Канстанцін гаварыў на чыстай рускай мове, а даведаўшыся, хто мы, і пачуўшы нашу гаворку, адразу ж перайшоў на беларускую мову, выявіўшы добрае яе веданне. Аказваецца, сам ён родам з нашага Вілейскага раёна, з вёскі Губы. Больш таго, ён родны пляменнік... беларускага пісьменніка дакастрычніцкай пары Касьяна Вясёлага (сапраўднае імя яго — Вікенцій Іосіфавіч Аўдзей), які пісаў і публікаваў вершы, апавяданні, драматычныя творы. З яго п'есай «Не розумам сцяміў, а сэрцам» можна пазнаёміцца ў кнізе «Беларуская дакастрычніцкая драматургія», што выйшла ў Мінску ў 1961 годзе. Працаваў ён настаўнікам. Загінуў як афіцэр царскай арміі на першай імперыялістычнай вайне. Айцец Канстанцін расказаў нам, з якім поспехам ставілася ў свой час беларуская п'еса дзядзькі «Не розумам сцяміў...» у Вільні і ў розных беларускіх мястэчках і вёсках. Вяскоўцы айца Канстанціна прыгадвалі яму такую дэталь: калі яго дзядзька прыязджаў з войска дамоў на пабыўку, то заўсёды гаварыў з людзьмі «па-просту» — па-беларуску. Усе дзівіліся, што афіцэр і гаворыць на такой мове, смяяліся: «Мужык, мужык!»

Сам айцец Канстанцін скончыў у 1937 годзе Віленскую

духоўную семінарыю, якая, між іншым, месцілася ў адным будынку з Беларускай гімназіяй. Дарэчы, у гэтай семінарыі вывучалася і беларуская мова. Для музея айцец Канстанцін падараваў каштоўны фотаздымак, дзе паказаны цэлы выпуск семінарыстаў, сярод якіх былі вядомыя дзеячы беларускай культуры.

Шмат цікавага расказаў нам святар пра віленскае жыццё трыццатых гадоў, пра малавядомыя старонкі з дзейнасці славутых людзей Беларусі. Акрамя ўсяго, ён паабяцаў звязаць нас з былым дырэктарам Наукурайскай школы Міхаілам Юстынавічам Шчасным, які жыве непадалёку і ў якога ёсць нямала матэрыялаў па гісторыі беларускай літаратуры — ён жа скончыў Беларускую гімназію ў Вільні.

Але перш за ўсё айцец Канстанцін хацеў паказаць нам сваю гаспадарку.

А паказаць і праўда было што. Такі раскошны сад. Багаты агарод. Кветнікі з мноствам вядомых і невядомых кветак. Аранжарэя, дзе яшчэ больш убачылі мы розных дзівосаў. А чаго толькі не расло ў цяпліцы! Маю ўвагу затрымала нейкая невядомая расліна з лапушыстым лісцем.

— Гэта — в'етнамскі агурок...

О, дык з такой раслінай я сёлета пазнаёміўся ўжо! Зайшоўшы яшчэ ў пачатку года на Камароўку, я ўбачыў там грамадку людзей, што тоўпіліся вакол нейкай жардзіны, якую трымаў пажылы дзядзька. Выявілася, што гэтая жардзіна, якая ўзвышалася над галовамі людзей, быў — праўда, ужо засохлы — агурок! В'етнамскі агурок. Я як агароднік не ўстрымаўся, каб не купіць цэлую жменю даволі вялікага насення. Пасадзіў, як раіў стары прадавец, у гаршку на падаконніку. Параздаваў таксама сябрам і знаёмым, завёз і ў сваю Зялёную Дуброву. Але ўзышлі і ўзяліся расці на агародзе два калівы таго насення толькі ў самай шчырай агародніцы — нашай машыністкі Маргарыты Аляксандраўны. Праўда, і яна не ведала, як іх далей даглядаць. Айцец Канстанцін, якому я расказаў пра ўсё гэта, адразу раскрыў прычыну нашых няўдач: проста гэтая расліна баіцца нават малога холаду, і яе можна вырасціць толькі ў цяпліцы.

Ад саду і агарода гаспадар павёў нас да ўласнага, рукатворнага возера. Яно было невялікае, але вельмі гожа ўпісвалася ў пейзаж. Адным берагам падыходзіла да саду, другім — упіралася да цяністага бярозавага гаю, які, бы жывы, адлюстроўваўся ў вадзе. Пры возеры быў нават рыбацкі домік, лодачная станцыя, дзе сярод розных лодак калыхалася на вадзе і маторка. У возеры, не без гонару паведаў нам гаспадар, ён развёў шмат усялякай рыбы, ёсць там нават вугры.

Калі мы палюбаваліся сапраўды цудоўным возерам, гаспадар запрасіў усіх нас пазнаёміцца яшчэ з адным яго дзівам — садовым домікам. Вельмі акуратны, з шырокімі вокнамі, у цяні дрэў. У сярэдзіне — мноства найгожых кветак. Сярод іх, у кутку, — экзатычны фантанчык. А ў цэнтры быў ужо засланы стол, дзе нас чакала закусь, якой мы даўно не бачылі. Пакаштавалі мы там і тых жа смажаных вугроў, і розных гатункаў пахкай дамашняй каўбасы, і дароў саду ды агарода. Ну, і свайго вырабу ўсялякіх він і сокаў.

— У мяне ёсць усё, — запрашаючы частавацца, без лішняй сціпласці сказаў гаспадар. — Я сваімі рукамі стварыў сабе на зямлі райскі куток.

Падумалася: такое магло быць хіба што ў Літве, але толькі не ў нас, у Беларусі. Што б толькі не прыдумалі супроць гэтага нашы зайздроснікі-ўраўнільшчыкі! Яшчэ ж зусім нядаўна кожнаму, хто асмельваўся займець, скажам, аўтамабіль, дачу, прыклейвалі злосна-пагардлівы ярлык: прыватнік, уласнік, чынілі яму ўсялякія перашкоды як грамадска шкоднаму элементу. Ды і цяпер пра тых, хто працуе на сваім дачным участку, часам можна пачуць пагардлівае: корпаецца ў зямлі, свету не бачыць за работай. А ледзь хто, асабліва ў вёсцы, нажыве сваім мазалём які дастатак, як і сёння можа пачуць злоснае: кулак! А вось калі ты забіваеш «казла» ў двары, ідзеш з вялізным мяшком за плячыма і гітарай у руцэ ў турысцкі паход альбо бегаеш па лёдзе за шайбай, вядзеш «сціплы спосаб жыцця» — ты харошы, табе павага, любоў і спачуванне! Ці не дэфармацыя гэта нашага грамадства? У аснове ж такой пагарды да «багацея» — адна з самых нізкіх чалавечых якасцей — зайздрасць.

Думаю, ад яе, ад зайздрасці, і тыя негатыўныя адносіны да заробкаў цяперашніх кааператараў, якія сваёй працай, сваім умельствам, сваім розумам набываюць сабе матэрыяльныя даброты.

На добры толк, трэба б заахвочваць, агітаваць людзей, каб яны імкнуліся жыць лепей, цікавей, каб яны самі стваралі сабе дастойныя ўмовы жыцця, напрыклад, каб бралі зямлю, рабілі на ёй такія вось «райскія куткі». Якраз на такіх гаспадароў сваёй долі трэба б арыентаваць людзей, а не на сярэдні шэры ўзровень, не на беднасць ды ўбогасць, за якімі часцей за ўсё — гультайства, п'янства, маральная разбэшчанасць.

— А цяпер можна і да Шчаснага, — калі мы адведалі хлеб-соль, сказаў гаспадар, ідучы разам з намі ад садовага домікa. — Вы садзіцеся ў свой аўтобус і прастуйце за мной. Я сёння буду ехаць на сваёй машыне.

— Дык, значыць, гэта ваша унь белая «Ніва»? — папытаў я.

— Гэта машына ў мяне для гаспадарчых патрэб... На выезд у мяня ёсць другая.

Айцец Канстанцін зайшоў у дом і выйшаў адтуль ужо ў элегантным свецкім плашчы са звязкай ключоў у руках і пакіраваў да прыземістай будыніны ў двары. Праз колькі хвілін выехаў адтуль на бліскучай чорнай «Волзе». Вось табе і айцец Канстанцін! Цяпер наўрад ці можна б было здагадацца, хто гэта сядзіць за рулём.

Убачыўшы ля парога сваёй хаты айца Канстанціна, Міхал Юстынавіч быў вельмі ўзрадаваны. Сябры абняліся. Гаспадар павёў нас у хату, пасадзіў вакол стала.

І праўда, у Шчаснага нашы музейнікі знайшлі нямала цікавых матэрыялаў, звязаных з гісторыяй беларускай літаратуры. Для музея ён падараваў аж адзінаццаць каштоўных фотаздымкаў з гісторыі Беларускай гімназіі ў Вільні. На адным з іх мы бачым вывешаны на сцяне партрэт Францішка Багушэвіча. Меў Міхась Юстынавіч і камплект «Нашай нівы», але гэтае рэдкае цяпер выданне пазычыў у яго такі ж аматар беларускай літаратуры Язэп Ермаловіч з вёскі Юшкі — калі б мы пад'ехалі туды, можна б было забраць той камплект. Але нам не ставала часу. Мы толькі запісалі Ермалковічаў адрас. Ужо недзе пасля нашага вяртання ў Мінск адна з найшчырых падзвіжніц музея Ірына Марачкіна сагітавала мужа і ўсё ж прывезла з ім той каштоўны набытак для музея.

Калі мы папрасілі абодвух паважаных людзей больш падрабязна расказаць нам пра Беларускую гімназію і Віленскую духоўную семінарыю, пра тагачаснае літаратурнае асяроддзе ў Вільні, яны з ахвотай пачалі прыгадваць сваё незабыўнае мінулае. Для нас гэта была жывая гісторыя, і мы, каб хаця не прапусціць нешта важнае, уключылі свае магнітафоны. «А ты помніш, як?..», «А таго і таго не забыўся?..» Гэтакімі пытаннямі яны нібы выцягвалі з памяці нітачкі новых і новых успамінаў — мы толькі спраўляліся перастаўляць у магнітафонах касеты.

Пад канец папрасілі іх расказаць пра тутэйшыя мясціны, у якіх выпала ім пражыць многія дзесяткі гадоў, пра іх Шальчынінскі раён, яго насельнікаў. Адказваючы на гэтае пытанне, айцец Канстанцін пачаў літаральна так (падаю дакладна спісаныя з магнітафоннай стужкі яго словы):

— Ведаеце што — тут нейкае недаразуменне. Усе беларусы тут жывуць, усе беларусы. А спрасі іх: «Ты хто?» — «Я — паляк!» А па-польску не панімае ні слова...

І праўда, кружачы на сваім аўтобусе і па Віленскім, і гэтым вось Шальчынінскім раёне, мы пры сустрэчах з людзьмі чулі толькі беларускую мову, вельмі тут каларытную. Нават не

страчалі пакуль што, каб хто гаварыў па-літоўску. Спыніўшыся каля аднаго магазіна — ці то ў Тургелях, ці то ў самім Шальчынінкаі, — мы ўбачылі на шкле акон надпісы на літоўскай мове (відаць, яны пазначалі, дзе тут ляжыць мяса, дзе рыба, дзе якія крупы...). У дзядзькі, які мясціў на багажніку веласіпеда толькі што купленыя буханкі хлеба, я, паказаўшы на тыя надпісы, папытаў, што там напісана.

— А кадук яго ведае. Я не ўмею па-літоўску, — толькі і адказаў дзядзька: ён і без слоў тых бачыць, дзе што ляжыць, тым больш што ад таго, скажам, мяса часта і застаецца ўсяго толькі гэты надпіс.

Тут, як і ў Вільнюскім раёне, людзі, з якімі мы гутарылі, таксама залічваюць сябе ў палякі.

Прычыны такой «самастойнасці» насельніцтва падвіленскага краю, «тутэйшых», відаць, тры: першая — іх каталіцкасць, якая ўсе яшчэ атаясамліваецца з польскай нацыянальнасцю, другая — тое, што ўсіх беларусаў-католікаў (а мо і не толькі католікаў?) пры Польшчы «папісалі» палякамі — хацелі яны ці не хацелі, і трэцяя прычына — шматвяковае прыніжэнне становішча беларусаў і адпаведна беларускай мовы, якая доўгі час лічылася мужычай, а цяпер мовай простага, менш адукаванага люду.

У сувязі з першай прычынай успомніўся мне тут артыкул Янкі Купалы «Вера і нацыянальнасць», у якім ён яшчэ ў 1914 годзе з болем пісаў, што змаганне дзвюх цэркваў — каталіцкай і праваслаўнай — «дзеліць беларусаў на дзве часці па рэлігіі, але, самае важнае, забівае ў іх свядомасць і пачуцці нацыянальнай еднасці. Беларуса-католіка ўгаворваюць, што раз ён католік, то ён — паляк, і не павінны братацца з тым, хто іншай веры; беларусу праваслаўнаму кажуць, што раз ён праваслаўны, то ён — расіец, і католіка-беларуса павінен сцерагчыся, бо ён — паляк...» У канцы артыкула паэт заклікаў: «Помніма, братцы, ці мы католікі, ці мы праваслаўныя, — мы беларусы, а бацькаўшчына наша — Беларусь. Не мяшайма справы рэлігіі з нацыянальнасцю...»

Як відаць, і сёння гэта не ўсе ўсведамляюць, і сёння «мяшаюць» веравызнанне з нацыянальнасцю. І не толькі ў родных мясцінах Францішка Багушэвіча і падвіленскім краі. Мне нават у Мінску ад вельмі адукаваных людзей даводзілася чуць гэтую старую казку: раз праваслаўны — значыць, рускі, раз католік — значыць, паляк. А многія ж нашы вернікі вельмі цвёрда перакананы ў гэтым.

Назваўшы сябе палякамі, падвіленскія беларусы ставяць перад літоўскімі ўладамі і адпаведныя патрабаванні. І вось у Літоўскай ССР выплывае ўжо на свет божы «польскае пытанне», узнікаюць звязаныя з ім праблемы.

У газеце «Правда» (ад 6 кастрычніка 1989 года) трапіўся мне на вочы артыкул другога сакратара райкома партыі Літвы названага Шальчынінскага раёна Ч. Высоцкага «Позірк з раёна», дзе і закранаецца гэтае «польскае пытанне». Аўтар зыходзіць са статыстыкі. Ён сцвярджае, што ў яго «інтэрнацыянальным Шальчынінскім раёне... больш як 80 працэнтаў жыхароў — палякі, 8,5 працэнта — літоўцы, 5 працэнтаў — рускія і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей». Вось так! Пра беларусаў — ні гуку! Дзе ж яны тады падзеліся, гэтыя беларусы, мова якіх гучыць тут на кожным кроку? Ды схаваліся пад два словы! Першае слова — «палякі» (тыя больш як 80 працэнтаў), другое — «іншыя нацыянальнасці», куды, пэўне ж, трапілі праваслаўныя беларусы, якія, паводле сцвярджэння таго ж айца Канстанціна, у пашпартах, у адрозненне ад католікаў, запісаны правільна — беларусамі. Ч. Высоцкі чамусьці пасаромеўся назваць іх. Ёсць падазрэнне, што нашы сціплыя беларусы ўсё ж хаваюцца тут яшчэ пад адно слова — «рускія»: якраз да іх адносяць сябе, як вядома, некаторыя праваслаўныя беларусы. Трохі ніжэй у сваім артыкуле Ч. Высоцкі падае яшчэ адну лічбу — ён даводзіць, што ўсяго «у Вільнюскім краі пражывае каля 270 тысяч палякаў». Адсюль другі сакратар райкома партыі робіць «лагічную» выснову: у рэспубліцы патрэбна «вышэйшая навучальная ўстанова для польскага насельніцтва», якая б магла «рыхтаваць спецыялістаў і з ліку палякаў, што пражываюць у іншых рэспубліках».

Магчыма, сярод гэтага «польскага» насельніцтва ёсць і сапраўдныя палякі. Ім, вядома ж, сапраўды трэба ствараць усе ўмовы для свайго нацыянальнага развіцця. Але калі ў пераважнай большасці гэта ўсё ж беларусы-католікі, якія не разумеюць свайго сапраўднага паходжання? Як тады быць? Можа, трэба б было неяк растлумачваць ім, хто яны такія? Думаю, у будучым за тое, што сёння мы адкрыем ім вочы на сапраўдны стан рэчаў, яны нам толькі падзякуюць.

Забягаючы наперад, скажу, што на ўстаноўчым з'ездзе Таварыства беларускай мовы ў Мінску я падаў запіску аднаму з прамоўцаў — прадстаўніку Таварыства беларускай культуры ў Літве Валянціну Стэху: што робіцца там для таго, каб раскрыць нашым беларусам-католікам віленскага краю вочы на сваё сапраўднае нацыянальнае паходжанне? Валянцін Стэх падрабязна расказаў з трыбуны з'езда, што робіцца ў Літве ў гэтым кірунку: перш за ўсё створана Таварыства беларускай культуры, якое працуе пры Літоўскім фондзе культуры і вядзе немалую растлумачальную работу сярод літоўскіх беларусаў, арганізавана ў Вільні згуртаванне беларускай мастацкай самадзейнасці «Сябрына», па літоўскім радыё — пакуль што адзін раз у два

тыдні — пачала гучаць перадача на беларускай мове. Ёсць ужо рашэнне — у рэспубліканскай маладзёжнай газеце «Камсамольская праўда» перыядычна друкаваць на беларускай мове адну старонку. Літоўскія ўлады гатовы адкрыць у Літве і беларускія школы. Вось ён, інтэрнацыяналізм, у дзеянні, а не на словах!

Ад айца Канстанціна і Шчаснага мы даведаліся, што вёска Мерая, у ваколіцы якой стаіць хата Міхала Юстынавіча, ёсць тое самае Паўлава, цэнтр колішняй славутай Паўлаўскай рэспублікі, пра якую я даўно ведаў з літаратуры і якой цікавіўся як унікальнай старонкай у нашай гісторыі. Ведаць ведаў, але не меў ніякага ўяўлення, дзе яна знаходзіцца. Я намерваўся нават знайсці час і пашукаць яе, паглядзець, што ад яе засталося. І вось такая неспадзяванка: мы, аказваецца, сядзім і спакойна вядзём гамонку, па сутнасці, у той самай Паўлаўскай рэспубліцы, розгалас пра якую некалі разносіўся па ўсёй Еўропе!

Стваральнікам гэтай легендарнай рэспублікі быў буйны беларускі землеўладальнік Павел Ксаверы Бжастоўскі. Ад яго імя і вёска Мерач займела другую назву — Паўлава, адсюль — і Паўлаўская рэспубліка.

І было чаму здзіўляцца суседзям-памешчыкам, ды і не толькі суседзям: у самы росквіт прыгонніцтва, у далёкім 1767 годзе, яшчэ задоўга да Вялікай Французскай рэвалюцыі багаты землеўласнік раптам сам вызваляе з прыгоннай няволі ўсіх сваіх падданых, раздае ім зямлю, аб'яўляе ўсіх насельнікаў яго ўладанняў роўнымі паміж сабой, усталёўвае сапраўды дэмакратычныя парадкі, сялянскую рэспубліку. У гэтай рэспубліцы селянін упершыню меў поўнае права выбіраць свой урад, свайго прэзідэнта. Адначасова кожны мог быць сам выбраны ў двухпалатны сойм, стаць міністрам, а можа, і прэзідэнтам. Праўда, сяляне нязменным прэзідэнтам выбіралі самога Бжастоўскага, якога не маглі не шанаваць, не любіць. У Паўлаўскай рэспубліцы, як і ў любой дзяржаве, быў свой сцяг, свой герб, чаканіліся свае грошы. Ну, і мелася сваё войска. У салдат гэтага войска была і свая форма: белыя суконныя жупаны з латуннымі гузікамі, чорныя аўчынныя папахі з чырвоным верхам, юхтавыя боты. На выпадак якога-небудзь узброенага нападу на рэспубліку згода з канстытуцыяй магло быць склікана ўсеагульнае апалчэнне — «народнае рушанне».

Той-сёй можа растлумачваць такую самаахвярнасць Бжастоўскага дзеля сваіх падданых простым дзівацтвам, прыхамаццю багацея, гульнёю ў гуманізм, данінай модзе ці яшчэ чым-небудзь. Але такое тлумачэнне ідзе, думаецца, ад зададзенай установкі: не можа так сабе чалавек адмаўляцца ад свайго

багацця, прывілеяванага становішча. Інакш кажучы, такое тлумачэнне ідзе ад нявер'я ў людскую дабрату. Мне ж здаецца, якраз яна, дабрата, спагада да чалавека, павага да яго і рухала тут Паўлам Бжастоўскім. І ці варта нам беспрычынна бэсціць высакароднага чалавека? Дарэчы, такіх людзей нямала было ў нас у часы Асветніцтва. Даволі ўспомніць тут яшчэ віленскага кароннага канцлера Андрэя Замойскага і падканцлера літоўскага Іаахіма Літавора Храптовіча, якія ў сваіх уладаннях замянялі паншчыну чыншам.

Вядома, вялікі ўплыў на гэтых людзей зрабілі гуманістычныя ідэі асветнікаў, у першую чаргу французскіх энцыклапедыстаў і асабліва пісьменніка-нарадалюба Жан Жака Русо.

Паўлаўская рэспубліка праіснавала больш чым паўвека, а канкрэтней — цэлых 60 гадоў і распалася са смерцю самога яе заснавальніка Паўла Бжастоўскага, які пад канец жыцця быў пробашчам пры касцёле ў Рукойнах і, як расказваў нам Альфонс Тамулайціс, там і пахаваны ў 1827 годзе.

У цэнтр Паўлаўскай рэспублікі — Мерач-Паўлава — мы трапілі на зыходзе дня. Усіх нас ашаламіла веліч напалову разбураных даўнейшых мураваных будынкаў, якія мы ўбачылі з дарогі, злева ад яе. З другога боку нам кінулася ў вочы гожая мураваная капліца, што стаяла сярод поля. Мы сунялі свой аўтобус каля тых велічных руінаў, пачалі іх фатаграфаваць. У варотах нейкай базы супынілі шафёра самазвала, пачалі наперабой з Ірынай Марачкінай распытваць яго пра Паўлаўскую рэспубліку. Так, ён ведае пра яе. Вунь палац Бжастоўскіх. Там — іх лядоўня. Тут во быў склад. Вёска і сёння завецца Паўлава. А за рэчкай Мерачанкай ёсць яшчэ адна вёска — Бжастова. Вядома ж, яна таксама названа ў гонар Паўла Бжастоўскага. Вось так — раз быў добры чалавек, людзі ўвекавечылі яго і імя, і прозвішча. Мы хацелі даведацца, што ж канкрэтнага засталося ў памяці паўлаўцаў ад іх колішняй рэспублікі, але шафёр сказаў, што ён спяшаецца і што лепш пра гэта можа расказаць вартаўнік, стары чалавек. На вялікі жаль, нам ужо не было часу шукаць вартаўніка. Галоўнае, мы ўбачылі, што ў Паўлаве і ваколіцах жыве ў народнай памяці тая славутая сялянская рэспубліка, якая ўзнікла на гэтай зямлі дзвесце з лішнім гадоў назад і руіны якой былі ў нас перад вачамі. Потым я даведаўся, што запісы ўспамінаў пра гэтую рэспубліку ёсць недзе ў мясцовай школе — нехта там усур'ёз зацікавіўся яе гісторыяй, якая, як мне думаецца, чакае яшчэ пяра добрага раманіста.

Усё пачутае абвяргае, відаць, віленскага літаратара І. Обста, які, як піша ў сваёй кніжцы «Мядовы бунт» мой былы таварыш па рабоце ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН

БССР Станіслаў Цярохін, яшчэ ў канцы XIX стагоддзя наведаўшы Паўлава, сцвярджаў, быццам тут пра Паўлаўскую рэспубліку ўжо ніхто, нават сівыя дзяды, не помніць. Добрае, як бачым, не забываецца і праз стагоддзі.

У Яшуны, па дарозе да якіх гэтулькі было ў нас затрымак, мы дабраліся, калі пачынала ўжо змяркацца.

Хоць збольшага пазнаёміць нас з Яшунамі мы папрасілі мясцовага настаўніка, краязнаўца Лябёнку Іозаса Юргевіча, якога знайшлі па запісаным дзяўчатамі з музея адрасе — малайцы, яны ўсё прадугледзелі.

Яшуны — даволі вялікая вёска ці мястэчка. Са шматпавярховымі дамамі.

Перш за ўсё Лябёнка звазіў нас на мясцовыя могілкі, падвёў там да сціплай магілы: тут, аказваецца, быў пахаваны беларускі пісьменнік, мастак, адказны рэдактар заходнебеларускага сатырычнага часопіса «Маланка» ў 1926-1928 гадах Іван Маразовіч, які падпісваўся псеўданімам Янка Маланка. Сам ён родам з Барысава, алё тут ажаніўся, доўга жыў у Яшунах і памёр у 1938 годзе.

Потым мы пад'ехалі да палаца Валійскіх, дзе ў 80-х гадах мінулага стагоддзя і працаваў Апалінар Багушэвіч, вёў усю гаспадарку і дзе часта прымаў свайго брата Францішка. На здымку ў складзеным Содалем альбоме мы бачылі гэтага вельмі інтэлігентнага, з адухоўленым тварам, з добрымі адкрытымі вачыма маладога чалавека. Францішак Багушэвіч прыязджаў у Яшуны не толькі для таго, каб праведаць роднага брата, які быў яму найбольш блізкі духоўна. Сюды Мацея Бурачка цягнула таксама вельмі багатая бібліятэка. Першапачаткова належала гэтая бібліятэка, як і сам палац, вядомаму польскаму астраному, матэматыку, філосафу-асветніку, рэктару Віленскага універсітэта ў 1807-1815 гадах Яну Снядэцкаму, аднаму з відных дзеячаў эпохі Асветніцтва.

Тое, што ў гэтай, звязанай з імем Францішка Багушэвіча мясціне жылі некалі такія славутыя дзеячы навукі і культуры, як Ян Снядэцкі і гісторык Міхал Балінскі, які шмат зрабіў для асвятлення мінулага Беларусі, было для мяне яшчэ адной неспа дзяванкай. З іх дзейнасцю, з іх працамі я знаёміўся, калі вывучаў творчыя біяграфіі Яна Чачота і Уладзіслава Сыракомля

Міхал Балінскі меў у Яшунах маёнтак. Тут ён ажаніўся з пляменніцай Яна Снядэцкага Зофіяй. Будучы халастым чалавекам (пасля няўдалага кахання ў маладосці даў сабе клятву ніколі не жаніцца), Снядэцкі быў па-бацькоўску прывязаны да сваёй пляменніцы. Прыязджаючы да Валійскіх, ён вельмі ўпадабаў тутэйшыя мясціны і ў 1828 годзе пабудаваў тут палац; Пасля яго

смерці палац перайшоў Балінскім.

Калі тут працаваў як даверaная асоба Апалінар Багушэвіч, гаспадаром уладанняў у Яшунах быў сын Міхала Валійскага Канстанцін. Жонка яго — Стафанія з Кастравіцкіх. Ці не з таго роду, з якога выйшлі беларускі паэт Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі) і французскі паэт Гіём Апалінэр (Гіём Альбер Апалінар Кастравіцкі)? Гаспадарка Валійскіх была немалая. Яны мелі тут нават свае заводы: мета лал іцейны, кафляны, бровар.

Палац Снядэцкага-Балінскіх стаіць у садзе над ракой Мерачанкай. Цяпер у ім калгасная кантора. Багацейшая бібліятэка, пэўне ж, апрача унікальнага кнігазбору Яна Снядэцкага, мела не менш багатыя калекцыі Міхала Валійскага, а сярод іх, вядома ж, было нямала матэрыялаў пра гарады і вёскі Беларусі, гісторыю якіх ён апісаў у сваёй «Старажытнай Польшчы». Францішка Багушэвіча, мусіць, і цікавілі ў першую чаргу гэтыя матэрыялы. На вялікі жаль, у 1939 годзе у выніку вядомых падзей гэта унікальная бібліятэка была разрабавана.

Лябёнка паказаў нам і сямейныя могілкі Валійскіх. Яны былі недалёка ад палаца, на невыскім узгорку, да якога падступае хвойнік. Гэтае месца выбраў сам Ян Снядэцкі для сябе, ён там быў першы і пахаваны. Адтуль, з узгорка, добра відаць уся яго сядзіба з прысадамі і рачулкай, што віецца ў алешніку. На магільных плітах мы прачыталі таксама імёны самога Міхала Валійскага, яго жонкі Зофіі і іншых членаў сям'і. Лябёнка даўжэй спыніўся ля пліты з імем аднаго з сыноў Міхала Валійскага — Івана. Гэта быў не хто іншы, як... бацька рускай псіхіятрыі. У «Большой Советской Энциклопедии» можна прачытаць, што Балінскі Іван Міхайлавіч, скончыўшы ў Пецярбургу медыка-хірургічную акадэмію, пачаў у 1857 годзе ўпершыню ў Расіі выкладаць псіхіятрыю як самастойную дысцыпліну, стаў прафесарам гэтай акадэміі. З далёкага Пецярбурга яго заўсёды цягнула ў родныя Яшуны, якія ён вельмі любіў. Ён праводзіў тут кожнае лета. Перад смерцю Іван Балінскі папрасіў і пахаваць яго тут. На яго магільнай пліце былі высечаны на ліцінскай мове такія словы (іх нам пераклаў Іозас Юргевіч): «Іван Балінскі, сын Міхала і Зофіі, псіхічна хворых таварыш і слуга». Гэтую эпітафію напісаў ён сам — яе знайшлі ў стале памерлага. Пасля сябе Іван Балінскі пакінуў дзевяць дзяцей.

Сапраўдны энтузіяст краязнаўства Іозас Юргевіч Лябёнка выказаў таксама меркаванне, што ў Яшунах бывалі такія славутыя паэты, як Юльюш Славацкі, Адам Міцкевіч, Тамаш Зан. Нічога не магу сказаць наконт Славацкага, што ж да двух апошніх, то яны маглі бываць у Яшунах, бо адсюль недалёка ляжалі і Балценікі, дзе жыў у сваім маёнтку Ваўжынец Путкамер са сваёй жонкай Марыляй — вялікім юнацкім каханнем Адама Міцкевіча — і куды,

як вядома, прыязджаў нешчаслівы закаханы. Бывалі тут і яго сябры Тамаш Зан і Ян Чачот. Дарэчы, Ян Снядэцкі і Ваўжынец Путкамер сябравалі, наведваліся адзін да аднаго.

ДОЦІШКІ

Пасля кароткачасовай вучобы ў Пецярбургскім універсітэце Францішак Багушэвіч у пачатку 1862 года ўладкоўваецца настаўнікам у Доцішках, у прыватнай школе памешчыка Звяровіча. Гэта — у цяперашнім Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці.

Выбраліся мы туды з Яшуноў ужо вечарам.

Галоўнае — нам трэба было да ночы паспець у Воранава, дзе былі заказаны нумары ў гасцініцы.

Як мы ні спяшаліся, але прыехалі туды недзе пасля адзінаццаці гадзін вечара.

Меркавалі пераначаваць і назаўтра ранічкай адразу пусціцца ізноў у дарогу.

Але здарылася непрадбачнае: калі мы зайшлі ў гасцініцу, выявілася, што нас там ніхто не чакае, што ніякіх заказаў у адміністрацыі наконт нас не паступала і што гасцініца і без нас забіта да адказу, нават на калідорах няма месцаў. Аказваецца, адна з удзельніц нашай экспедыцыі, заказваючы па тэлефоне гасцініцу з Мінска, надта даверылася незнаёмаму голасу з райкома партыі, нават не папыталася, з кім канкрэтна размаўляе. У выніку ўся наша група з адзінаццаці чалавек засталася насупраць ночы без начлегу.

Што ж было рабіць? Ехаць у Мінск, так і не пабываўшы ў Доцішках? Гэта б было проста недаравальна. Да таго ж шафёр Валера, які цалюткі дзень не выпускаў з рук руля, кружачы па Віленшчыне, ужо не мог везці нас амаль усю ноч праз гэтакую далеч. Дык, значыць, кукаваць цэлую ноч у вестыбюлі, а заўтра соннымі мухамі ехаць па маршруце? Яно на горшы выпадак можііа б зрабіць і так, але ж хіба зможа весці аўтобус шафёр такой «соннай мухай»?

— Як жа нам быць? — зноў стукаліся мы ў акенца дзяжурнай.

— А я адкуль ведаю — трэба было раней думаць! — І — ляп акенцам перад нашымі апушчанымі насамі.

А што, калі пазваніць дамоў сакратару райкома партыі па ідэалогіі? Мо хоць які інтэрнат паможа знайсці сваім калегам —

усё ж мы таксама ідэалагічныя работнікі! Ну, што ж — за спрос не дадуць, можа, у нос? Я папрасіў у дзяжурнай тэлефонную кніжку. Вось і нумар насупраць прозвішча сакратара райкома — Кушнянковай Нэлі Казіміраўны. Мабілізуючы ўсе свае дыпламатычныя здольнасці, я набіраю нумар тэлефона. Звязаўшыся, перш за ўсё прашу прабачэння за позны званок, потым паведамляю, што ў Воранаўскі раён прыбыла цэлая група творчых работнікаў — з Беларускага тэлебачання, часопіса «Полымя» і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Ну, і растлумачваю сітуацыю, у якую трапіла гэтая «надта важная» група, што павінна працаваць ў Воранаўскім раёне. Ці не магла б сакратар памагчы нам з начлегам? Нэля Казіміраўна проста адказала, што гэта зусім не яе клопат шукаць нам начлег, і пачала ўшчуваць нас за тое, што самі загадзя не паклапаціліся пра яго.

— Ну, кто же так делает? — паўтарала яна.

— Усё правільна, Нэля Казіміраўна, — адказаў я дыпламатычна. — Мы тут поўнасцю вінаватыя. Але калі б вы ўсё ж нам памаглі, мы сказалі б вам вялікі дзякуй. Калі ж не зможаце памагчы, што ж, мы не будзем на вас у крыўдзе. Просім толькі яшчэ раз прабачэння, што патурбавалі ў такі позны час...

— Ну, ладно, позвоните мне минут через десять...

Няўжо мая «дыпламатыя» спрацавала?

І праўда, калі я пазваніў праз тыя дзесяць мінут, Нэля Казіміраўна, не забыўшыся яшчэ раз паўшчуваць нас за неарганізаванасць, дала адрас інтэрната нейкага вучылішча, дзе нас «размесцяць».

У інтэрнаце, папярэдне патрэбаваўшы дакументы, нам выдалі на складзе «пасцельныя прыналежнасці». Да гадзіны ночы мы цягалі ў два агульныя пакоі — адзін для жанчын, другі для мужчын — матрацы ды падушкі, устанаўлівалі даўно забытыя намі жалезныя ложкі з панцырнымі сеткамі, рып ад якіх ішоў на кіламетр. Што ж да чысціні і парадку, то на гэта мы як госці мусілі — і ў пераносным, і ў прамым сэнсе — проста закрыць вочы.

Назаўтра мы меркавалі як мага раней выехаць па сваім маршруце. Трэба ж было і пабываць у Багушэвічавых мясцінах, і паспець вечарам у Мінск.

Але гэта толькі ў казцы і на паперы ўсё проста і хутка робіцца.

Каб разлічыцца за «гасцініцу», нам трэба было дачакацца, пакуль яшчэ адчыніцца вучылішчная бухгалтэрыя — якраз яна, як нам сказалі, «производит» такія «операции». Гэта была наша першая затрымка.

Другая, яшчэ большая затрымка была звязана з «операцией

отмечания» нашых камандзіровачных пасведчанняў. Вядома, іх можна было б адзначыць і ў той жа бухгалтэрыі вучылішча. Але этыкет падказваў нам зайсці ў райком партыі і падзякаваць Нэлі Казіміраўне за начлег — значыць, і камандзіроўкі мы палічылі лепш адзначыць там.

У райком пайшлі мы ўдвух з Валодзем Содалем. "Сакратарка ў прыёмнай, калі мы назваліся і папыталіся, як трапіць да Нэлі Казіміраўны, сказала, што Нэля Казіміраўна прасіла нас трохі пачакаць — яна пакуль занятая. Мы толькі здзівіліся, як гэта яна ўведала, што мы прыйшлі да яе — пра гэта ж з ёй не было ніякай гаворкі. Каб не марнаваць час, я дастаў увесь пук нашых камандзіровак і папрасіў сакратарку хутчэй іх адзначыць. Але сакратарка ўзяла пасведчанні і спакойненька засунула іх у стол.

— Нэлі Казіміраўна сказала не адзначаць, пакуль яна не вызваліцца.

Мы пераглянуліся з Валодзем: што гэта за дзівосы?

— Раз так, давайце камандзіроўкі назад, мы ў іншым месцы адзначым.

Але дзяўчына і не думала вяртаць іх:

— Нэлі Казіміраўна прасіла пачакаць — яна хутка вызваліцца.

Счакаўшы яшчэ колькі часу, мы пачалі выказваць сваё абурэнне, даводзіць, што нам няма калі таптацца ў райкомаўскай прыёмнай. Але сакратарка была непахісная:

— Нэлі Казіміраўна прасіла...

Нарэшце нас паклікалі ў яе кабінет. Калі мы ўвайшліˆ сакратар райкома партыі, яшчэ даволі маладая і стройная жанчына, пасадзіўшы нас перад сабой, проста ашаламіла абодвух, выпаліўшы нам у твар:

— Попрошу ваши документы...

Першы зрэагаваў на гэта Валодзя Содаль: А я не пакажу...

Потым Валодзя растлумачыў мне, чаму так адказаў. У яго ўжо выпрацаваўся ўнутраны пратэст супроць такіх во, як бы мякчэй сказаць, «дзействаў» афіцыйных асоб. Асаблівую падазронасць да сябе ён адчуваў у Ашмянах, куды не адзін раз ездзіў, вывучаючы мясціны Францішка Багушэвіча. Аднаго разу, спыніўшыся тут на колькі часу па дарозе да Вільні, ён убачыў, як бураць старыя, Багушэвічавай пары будынкі. Каб хоць на здымках захаваць стары від горада, пачаў спехам фатаграфаваць тыя будынкі, бегаючы ад аднаго да другога. Ён так захапіўся гэтым, што ледзь не спазніўся на аўтобус — ускочыў у яго, калі той ужо адыходзіў. Але не паспеў аўтобус яшчэ ўзяць разгон, як напарадзе, пасярод дарогі, выраслі два міліцыянеры. Выстаўленымі далонямі паднятых рук далі знак спыніцца. Ускочыўшы ў аўтобус, міліцыянеры пакіравалі проста туды, дзе сеў Валодзя, спыніліся перад ім:

— Ваши документы?..

Ловячы на сабе цікаўныя позіркі здзіўленых пасажыраў, Валодзя паказаў тады свой дакумент і растлумачыў, хто ён такі і чаго яму трэба было ў Ашмянах. Пагартаўшы, пакруціўшы ў руках той дакумент, міліцыянеры вярнулі яго і сышлі з аўтобуса. І хоць на гэтым усё кончылася, Валодзеў настрой быў тады сапсаваны. Ён нібы сутыкнуўся тады з нечым брыдкім.

І вось цяпер ізноў...

Я ж як чалавек не горды (а ўсё ж, мусіць, трэба такім быць) дастаў з кішэні сваё «палымянскае» пасведчанне — якраз жа было пры мне — і падаў сакратару райкома.

— А, Цвйрка! Так я вас знаю, — вяртаючы дакумент, сказала Нэлі Казіміраўна і пачала апраўдвацца. — Вы должны понять: у нас же — приграничный район...

Я спачатку не мог уцяміць, пра якую мяжу-граніцу ідзе тут гаворка. Толькі пасля да мяне дайшло, што Воранаўскі ж раён мяжуе... з Літвой, Літоўскай ССР!

Нэля Казіміраўна пачала расказваць нам, якое напружанае цяпер становішча ў раёне. Гэта ж заўтра ў недалёкім адсюль Вільнюсе адкрываецца ўстаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту. Туды з усёй Беларусі з'ехаліся экстрэмісты. Пасля з'езда яны, магчыма, будуць вяртацца праз Воранаўскі раён, могуць быць эксцэсы. Таму райком робіць усё, каб даць ім адпор, для чаго вядзецца растлумачальная работа. Пра барацьбу з «экстрэмісцкімі элементамі», з «нефармаламі», казала Нэлі Казіміраўна, вельмі сур'ёзна гаварылася на апошнім пленуме ЦК КПБ.

Цікава, як бы рэагавала Нэля Казіміраўна, калі б даведалася, што два такія «нефармальныя элементы», дэлегаты заўтрашняга з'езда ў Вільні, сядзяць цяпер перад ёй уласнымі персонамі! Толькі яны не зусім разумеюць, з якімі «эксцэсамі» збіраецца змагацца раённае кіраўніцтва.

Разгаварыўшыся, мы тым не менш хутка знайшлі з Нэляй Казіміраўнай агульную мову. Нават у прамым сэнсе, бо, пазнаёміўшыся з намі, яна сама пачала размаўляць, прытым вельмі добра, па-беларуску. Ад яе мы даведаліся пра сапраўды трывожную праблему, з якой сутыкнулася сёння раённае кіраўніцтва: адмаўленне часткі тутэйшага беларускага насельніцтва ад сваёй беларускасці, патрабаванне адкрываць польскія школы. Нэля Казіміраўна вельмі шчыра прасіла нас памагчы арганізоўваць у раёне сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, якія б растлумачвалі людзям пра іх сапраўднае, беларускае паходжанне, памагалі б падняць прэстыж беларускай мовы. Інакш тут можа зрабіцца «новы Карабах»! Падумалася: гэта ж такім вось нечаканым бокам вылазіць сёння бяздумная

русіфікатарская палітыка, якую многія дзесяцігоддзі нястомна праводзілі магутныя арміі верных байцоў добра арганізаванага, аснашчанага ўсімі сучаснымі сродкамі антынароднага ідэалагічнага фронту. Праўда, татальнай русіфікацыі, як бачым, не адбылося. Але бясконцае, беспакаранае прыніжэнне аднаго з вялікіх славянскіх народаў — беларускага, непрыкметнае, «ціхае», але метадычнае шальмаванне, адмаўленне яго культуры і мовы прывяло да таго, што менш свядомая частка беларусаў пачала ўжо адмаўляцца ад сябе. Вось адна са страшнейшых хвароб нашага духоўнага Чарнобыля!

Вельмі добра, што партыйныя работнікі хаця б «на месцах» усвядомілі гэта. Але ж хіба можна такія сур'ёзныя прарэхі ў ідэалагічнай рабоце зашыць латкамі пісьменніцкіх выступленняў? Тут, відаць, трэба б распрацоўваць нейкую дзяржаўную праграму дзеянняў. У высокіх жа кабінетах рэспублікі, як мне здаецца, пануе наконт гэтага поўны спакой, абыякавасць. Забегаюць там, зазвоняць ва ўсе званы, кінуцца мабілізоўваць усе тушыльныя сродкі толькі тады, калі пажар дакоціцца і да акон тых кабінетаў.

Але нам трэба не дапусціць пажару. І вельмі правільна трывожыцца, імкнецца нешта рабіць Нэля Казіміраўна, якой мы выказалі шчырую гатоўнасць памагчы. Вось тут, думаецца, трэба б было скарыстоўваць і малады энтузіазм «нефармалаў» — замест таго, каб усяляк бэсціць гэты здаровы ў сваёй аснове рух, падсцерагаць з дубінаю ў руках заклапочаных доляй Беларусі маладых хлопцаў і дзяўчат. Тут яны былі б, я ўпэўнены, заадно з Нэляй Казіміраўнай.

Размова ў кабінеце сакратара райкома закончылася тым, што Нэля Казіміраўна запісала нашы тэлефоны і дала нам таксама свой: для далейшага супрацоўніцтва. Так што мы развіталіся ўрэшце як аднадумцы. Развіталіся з усёй шчырасцю, з разуменнем складанасці праблем, якія стаяць перад сакратаром райкома партыі.

Затое, калі мы падышлі да аўтобуса, нашы сябры па вандроўцы гатовы былі невядома што зрабіць з намі за такую затрымку.

У Доцішкі мы трапілі недзе к палудню.

Даволі раскіданая, у зялёных прысадах, з вясёлымі вокнамі хат і шырокімі даляглядамі беларуская вёска. Наводшыбе здалёку відаць векавыя раскошныя ліпы панскага парку. У гэтым парку і стаяў колісь вялікі драўляны палац ліберальнага памешчыка Аляксандра Звяровіча, які, жадаючы даць асвету сялянам, адкрыў тут прыватную школу. Настаўнікам гэтай школы, мусіць, незнарок выбраў ён маладога Францішка Багушэвіча.

Пра тое, як вучыў дзяцей у прыватнай школе Аляксандра

Звяровіча малады Францішак Багушэвіч, пра самую школу шмат новых дэталяў паведаў нам сын аднаго з яго вучняў — васьмідзесяцігадовы Юзаф Міхайлавіч Свечка. Ён — вядома, паводле ўспамінаў бацькі — расказаў, што школа месцілася ў самім панскім палацы. Вучыліся ў ёй дзеці простых сялян — Звяровіч «хацеў іх граматнымі парабіць». Акрамя свайго бацькі Юзаф Міхайлавіч назваў імёны яшчэ двух вучняў Францішка Багушэвіча — гэта былі бацькаў «аднаімённік» і фамільят Міхал Свечка і Адам Савель. Запомнілася, што апошні няважна вучыўся. Цяжка даваліся яму літары. Напрыклад, ён не мог назваць літару «А». Багушэвіч казаў: назаві сваё імя і скажы, з якой літары яно пачынаецца? Хлопчык вымаўляў імя і пасля называў літару.

Цікава расказаў Юзаф Міхайлавіч і пра сям'ю Звяровічаў. Сам Аляксандр Звяровіч быў надзвычай добры чалавек, «шанаваў мужыкоў», вызваліў іх ад паншчыны. Калі пачалося студзеньскае паўстанне, ён прыняў у ім удзел, за што быў пакараны царскімі ўладамі. У адрозненне ад Аляксандра Звяровіча яго бацька быў, наадварот, вельмі жорсткім прыгнятальнікам сялян, часта збіваў іх за любую дробязь. Нават меў спецыяльнага ката, які клаў сваю ахвяру на зэдаль у садзе і біў бізунамі. Людзі апісваюць нават партрэт гэтага ката, што быў «з мужыкоў»: «...меў ён выгляд звера, вялікія круглыя вочы наверх...»

Якраз у Доцішках сустрэў малады настаўнік бурныя падзеі 1862-1864 гадоў.

Як паказвае ў сваіх кнігах Генадзь Кісялёў, напярэдадні студзеньскага паўстання па ўсёй Гродзеншчыне кружылі напоўненыя выбуховай сілай «лятучыя лісткі» (выраз Герцэна) першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда», якую выдаваў разам з сябрамі Кастусь Каліноўскі — «Яська — гаспадар з-пад Вільні» — і за адно чытанне якой царскія ўлады каралі смерцю. «Мужыцкая праўда» не магла не трапіць і да Францішка Багушэвіча. Яму маглі прынесці яе сяляне ці ягоныя вучні ў Доцішках альбо давалі пачытаць у Кушлянах, дзе яе распаўсюджваў віленскі гімназіст Антон Ясевіч.

«Дзецюкі! — чытаў Францішак Багушэвіч на роднай беларускай мове гарачыя словы праўды. — Мінула ўжо тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здасца толькі да сахі, — цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаці, і то пісаці такую праўду справядлівую, як Бог на небе. О, загрыміць наша праўда, як маланка пераляціць па свеце! Няхай пазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, но яшчэ і ўчыць сваёй мужыцкай праўды...

Ад маскаля і паноў няма чаго спадзявацца, бо яны не вольнасці, а глуму і здзерства нашага хочуць. Но не доўга яны нас

будуць абдзіраці, бо мы пазналі, гдзе сіла і праўда, і будзем ведаць, як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду. Вазьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам! А калі паны хочуць трымаць з намі, так няхай жа робяць па свентай справядлівасці: бо калі іначай — так чорт іх пабяры! Мужык пакуль здужае трымаці касу і сякеру, бараніць свайго патрапіць і ў нікога ласкі прасіць не будзе».

Тут Францішак Багушэвіч бачыў прамы заклік і да самога сябе, заклік з пытаннем: з кім яму, шляхціцу, ісці? Толькі адказ на гэтае пытанне трэба было даваць не голымі словамі. І Багушэвіч адказаў адназначна: ісці разам з мужыком змагацца за мужыцкую праўду!

Мы не шмат ведаем пра ўдзел Францішка Багушэвіча ў паўстанні 1863 года. Бо не маглі ж хваліцца пра гэта паўстанцы, якіх, не задумваючыся, слаў на шыбеніцу ці гнаў у сібірскую катаргу Мураўёў-вешальнік. Вядома толькі, што Францішак Багушэвіч пайшоў у самы вір паўстання. Магчыма, ён змагаўся ў атрадзе Людвіка Нарбута (сына вядомага гісторыка Тэадора Нарбута), які загінуў у сутычцы з царскімі войскамі пад недалёкімі ад Доцішак Дубічамі і якога замяніў малодшы брат Баляслаў Нарбут, а потым — Аляксандр Парадоўскі (Астрога). Есць таксама падставы меркаваць, што Францішак Багушэвіч быў у шэрагах ашмянскіх паўстанцаў. Як бы там ні было, з успамінаў блізкіх сяброў паэта вядома, што ён разам з паўстанцамі дайшоў да Сувалкскіх (Аўгустоўскіх) лясоў, быў у адным з баёў паранены ў нагу. Хаваючыся ад царскіх улад, жыў нейкі час у Вільні. Гэта была якраз пара расправы царызму з паўстанцамі, якіх масамі расстрэльвалі, вешалі і высылалі ў Сібір на катаргу. Адна за адной даносіліся да Францішка горкія весткі аб гібелі сяброў. У снежні 1863 года быў расстраляны на Лукішскай плошчы яго аднакласнік па гімназіі, найбліжэйшы памочнік Кастуся Каліноўскага па кіраўніцтве паўстаннем мужны рэвалюцыянер Ціт Далеўскі. Другі таварыш Францішка Багушэвіча па гімназіі Ігнацы Здановіч — правая рука Кастуся Каліноўскага ў літоўска-беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі — таксама быў схоплены царскімі салдатамі і ў тым жа снежні 1863 года павешаны. На вачах Францішка Багушэвіча былі таксама павешаны на Лукішскай плошчы і кіраўнікі студзеньскага паўстання на Беларусі Зыгмунт Серакоўскі і Кастусь Каліноўскі, пад сцягамі якіх ён хадзіў у бой. Ратуючыся ад гэтакай жа расправы, паўстанец Францішак Багушэвіч, якога па ўсім краі шукалі царскія шпікі, здолеў вырвацца з іх лап і ўцячы на Украіну.

Горыч паражэння, адчай і нязбытны жаль па крушэнні лепшых надзей, светлых мар аб народнай волі мог выказаць Францішак

Багушэвіч толькі праз два з лішнім дзесяткі гадоў. Якраз пра трагічныя вынікі паўстання 1863 года, як заўважыў Генадзь Кісялёў, выгаварвала ў 1891 годзе ўваскрэслая Багушэвічава «Дудка беларуская»:

Ну, дык грай жа, грай жа,
Усё успамінай жа...
Штодзень і штоночы
Плач, як мае вочы,
Над народу доляй,
І плач шораз болей.
Плач так даастатка,
Галасі, як матка,
Хаваючы дзеці, —
Дзень, другі і трэці
Іграй слёзным тонам
Над народу сконам!

Жывы водгалас студзеньскага паўстання можна знайсці ў шмат якіх творах Мацея Бурачка. У іх выказваліся тыя ж ідэі, якія мабілізоўвалі сялян і лепшых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя ў паўстанцкія атрады. Гісторыкі літаратуры маглі б, напэўна, адшукаць шмат якія паралелі ў творчасці Францішка Багушэвіча і, напрыклад, у «Мужыцкай праўдзе» Кастуся Каліноўскага. Адгорнем яе другі нумар: «Дзецюкі! Калі Бог стварыў усіх людзей вольнымі і ўсім даў адзінакую душу, так скуль жа гэта ўзялося, што адзін марнуе да і над людзьмі збыткуе, а другі бедны паншчыну служыць альбо аброкі і казну плаціць?..» Ці не тое ж самае кажа і Мацей Бурачок у вершы «Бог не роўна дзеле»? Нават форма бярэцца тая ж:

Чым то дзеіцца на свеце,
Што не роўна дзеле Бог?
Адзін ходзе у саеце,
У золаце з плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай — велькі труд;
Весь, як рэшата, свіціцца,
Адны латы, адзін бруд!

Альбо пачытаем яшчэ першы нумар газеты Кастуся Каліноўскага: «А гэты маніфест, што цар з сенатам і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае, да чаго ён падобны, —

ніякай у нём няма праўды, няма з яго для нас ніякай карысці. Парабілі канцылярыі, зрабілі суд... Нарабілі пісараў, пасрэд нікаў, а ўсё за мужыцкія грошы — чорт ведае нашто... А з гэтага то і відаць, што нам нічога добрага і не думалі зрабіці...»

А цяпер возьмем для параўнання верш Францішка Багушэвіча «Як праўды шукаюць»:

...Як камень у ваду, так праўда прапала!
Судоў нарабілі, начальстваў ці мала:
Пасрэднік і воласць, сінод і сенаты,
Прысуцтва і вокруг, управы, палаты.
А найбольш міравых, участковых і з'ездаў,
Што ў полі камення, што гвездаў!
Затое ж жыццё цяпер труднае стала...

Амаль паэтычны пераказ «Мужыцкай праўды»! А як перагукваецца заклік Кастуся Каліноўскага «знішчыць гэтую гнілую і разбэшчаную касту» — дваранства, яго апошнія словы перад шыбеніцай «У нас няма дваранства, усе роўныя!» з радкамі вершаў яго паплечніка па барацьбе Францішка Багушэвіча:

Маліся ж, бабулька, да бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў!
Каб прад меншым я носу не драў,
А прад большым не корчыў спіны,
Каб грэх свой прад сабой я пазнаў,
У другіх каб не відзеў віны...
Каб людзей прызнаваў за братоў,
А багацтва сваё меў за іх,
Каб за край быў умёрці гатоў,
Каб не прагнуў айчызны чужых...

Гэта — з верша «Ахвяра». А вось радкі з верша «Не цурайся»:

Не цурайся мяне, панічок,
Што далонь пакрываюць мазолі;
Мазоль — працавітых значок,
Не заразе цябе ён ніколі...
Не ўцякай ад маёй ты сярмягі —
Мне не стыдна ў ёй ані чуць,
Вот твой храк я не меў бы адвагі,

Чортаў храк на сябе апрануць.
На кашулю глядзіш крывым вокам,
Што ў хаце мне бабы пашылі,
Прапацела яна маім сокам,
Цэлы тыдзень яе не памылі...
А твая ж? Як той снег, як папер,
І пацеў хто, і ткаў, і бяліў,
І хто шыў, і хто праў... а цяпер
Ты той пот на сябе узваліў.
І кашулі той мне было б стыдна,
Што не сам на яе гараваў,
Хоць бялейша яна — не завідна —
Не вазьму, каб ты мне дараваў!..

Па сутнасці, Багушэвічава творчасць — гэта паэтычнае ўвасабленне найбольш радыкальных ідэй паўстання 1863 года на Беларусі і Літве пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Пры належных умовах Францішак Багушэвіч мог бы быць яго песняром: нельга думаць, каб ужо ў той віхурны час не пачынаў свае паэтычныя спробы дваццацітрохгадовы настаўнік. Але час патрабаваў дзеяння, і Францішак Багушэвіч палічыў патрэбным замяніць пяро на баявую зброю паўстанца. Якраз да яго, відаць, трэба аднесці вядомую прымаўку: калі гучаць гарматы — музы маўчаць. Але муза Францішка Багушэвіча змушана была маўчаць і тады, калі былы паўстанец пайшоў пакутніцкай дарогай дабравольнага выгнання блукаць па свеце ў пошуках прытулку і кавалка чорнага хлеба. «Можа быць, ніхто з такой мінай не глядзіць на гэтыя прайшоўшыя гады, як я, які гэтулькі страціў без следу: прамываў цукар у вадзе ўвесь час...», — з горыччу казаў пра свае дваццацігадовыя блуканні сам паэт. Толькі пасля вяртання на радзіму, на схіле жыцця змагла на ўсю моц загучаць песня «панарскага салаўя».

ВІШНЕВА

У час сваёй экспедыцыі мы зазірнулі яшчэ ў Віні нева — вёску ў Смаргонскім раёне.

Тут у 1886-1889 гадах Францішак Багушэвіч, наязджаючы з Вільні, працаваў даверанай асобай у маёнтку Яна Карловіча.

З ім, вядомым польскім дзеячам навукі і культуры, Францішак Багушэвіч, як мяркуюць, пазнаёміўся і на ўсё жыццё пасябраваў, калі працаваў настаўнікам у Доцішках, недалёка ад якіх, у суседняй Падзітве, быў родавы маёнтак Карловічаў.

Гэта Ян Карловіч, які, дарэчы, з вялікай пашанай ставіўся да беларускага народа, да яго мовы, культуры, збіраў і запісваў яго фальклор, дапамог паўстанцу Багушэвічу ўцячы ад учэпістых лап царскіх шпікоў на Украіну і ўладкавацца там на вучобу ў Нежынскі юрыдычны ліцэй. З удзячнасцю прыгадваючы гэтую дапамогу, беларускі паэт пісаў з Нежына Карловічавай мацеры, што ён «абавязаны яе высакароднаму сыну ўсёй сваёй будучыняй». Тут трэба яшчэ дадаць: Яну Карловічу абавязана ўся беларуская літаратура, абавязана тым, што наогул творы Францішка Багушэвіча дайшлі да нас, што яны не згубіліся ў віхурах таго неспрыяльнага для нашай культуры часу. Гэта ж якраз намаганнем Яна Карловіча былі ў 90-х гадах выдадзены зборнікі твораў Мацея Бурачка.

Пасля вяртання Францішка Багушэвіча з Укра Іны, ведаючы яго цяжкае матэрыяльнае становішча (ды і якая магла быць аплата працы мужыцкага адваката?), Ян Карловіч прапанаваў свайму сябру прыглядаць здадзены ў арэнду яго маёнтак у Вішневе. Пра стан гаспадаркі молена меркаваць з пісем Францішка Багушэвіча да Яна Карловіча і яго жонкі. Арэнда давала зусім невялікі прыбытак. Клопатаў жа было там шмат, і Францішак Багушэвіч урэшце папрасіўся вызваліць яго ад гэтай пасады.

Паказаць нам у Вішневе месца Карловічавага маёнтка, знішчанага ў час першай імперыялістычнай вайны, згадзілася былая настаўніца Вішнеўскай школы Валянціна Іосіфаўна Дыро. Стаяў ён на беразе прыгожага Вішнеўскага возера. Сёння ад маёнтка застаўся гэты раскошны парк, цяпер, як і ўсюды ў нас, запушчаны, занядбаны, а таксама сад. Два разы на год да Яна Карловіча, як расказваюць людзі, з'язджаліся з усіх бакоў, здалёку і зблізку, шматлікія госці — на святога Яна і ўвосень. Прыязджала і «пані з Гродна» — гэта, як мяркуе Валянціна Іосіфаўна, была

Эліза Ажэшка. Пра Яна Карловіча ў людзей засталіся самыя добрыя ўспаміны. Паводле іх расказаў, «не было ніводнага выпадку, каб ён зняважыў каго». Наадварот, быў сялянам часта за доктара, лячыў іх у сваіх пакоях, даваў ім прытулак. І яшчэ любіў слухаць народныя песні, запісваў іх, для гэтага часта хадзіў на сялянскія вяселлі, на іншыя святы.

Добрае ўражанне засталося ў вішнеўцаў і ад яго сына — Мечыслава Карловіча, чамусьці «хваравітага». Нарадзіўся ён тут, у Вішневе. Быў Мечыслаў Карловіч вядомым кампазітарам. З дзяцінства, як сам казаў, шчыра палюбіў беларускія народныя песні, рабіў у Вішневе запісы ўзораў беларускай музыкі, выкарыстоўваў гэтыя запісы — цытатна і ў распрацоўцы — у сваіх сімфанічных творах. Яго «Літоўская рапсодыя», напрыклад, уключана ў рэпертуар Беларускага тэлебачання і радыё. Мечыслаў Карловіч не раз сустракаўся ў Вішневе з Францішкам Багушэвічам, потым вёў з ім перапіску, спрабаваў пісаць музыку на яго творы, напрыклад, на верш «Хмаркі». Невядома толькі, ці захавалася гэтая музыка.

Валянціна Іосіфаўна ўспамінае, як у 1938 годзе ў Вішневе было наладжана вялікае свята ў памяць Мечыслава Карловіча. Тады ж быў устаноўлены яму і помнік. На жаль, гэты помнік быў знішчаны. Частка помніка захавалася. Валянціна Іосіфаўна разам з вучнямі адкапала яго ў Карловічавым парку. Але рабіла гэта крадком, бо мясцовыя ўлады з недаверам ставіліся да ўсялякіх «паноў». Гэтая частка помніка Мечыславу Карловічу і цяпер ляжыць у густым кустоўі парку. Вось яшчэ адзін жывы «паказчык» нашых адносін да культурнай спадчыны, да памяці лепшых сыноў Беларусі! На добры толк, помнік Мечыславу Карловічу трэба б было нам узнавіць, скарыстаўшы для гэтага як аснову яго рэшткі. Гэта было б данінай павагі і нашаму земляку-кампазітару Мечыславу Карловічу, і яго бацьку Яну Карловічу, які гэтулькі зрабіў для беларускай літаратуры і культуры.

Усведамляючы заслугі Карловічаў у развіцці нашай культуры, у прыватнасці кампазітара Мечыслава Карловіча, свайго земляка, выдатнага чалавека, Валянціна Іосіфаўна як магла выказала свае адносіны да яго ўласным вершам, які так і назвала — «Мечыславу Карловічу»:

Вы палюбілі гэтыя мясціны,
Дзе нарадзіліся і дзе ўзраслі.
Да нас дайшлі святыя ўспаміны
Аб людзях слаўных, што між нас жылі.
Былі вам гэтак любы песні жнеек,
Што так спявалі, з поля ідучы!

Вам у душу тады запалі неяк
Мелодыі тых песень уначы.
Вы разумелі пошум дрэў і шэпты
Трысця на ціхім возеры цудоўным.
Як хораша ўсё выказалі гэта
Вы у сваёй рапсодыі чароўнай!
О Вішнева! Яго ты ўзгадавала
І моц яму магутную дала.
Штораз яго як сына ты страчала,
Ты родным кутам для яго была.

Як мы ўбачылі, Карловічы пакінулі надзвычай добры след у памяці вішнеўцаў. Думаецца, нашаму грамадству трэба падумаць, як найлепш ушанаваць памяць і Мечыслава, і Яна Карловічаў, з імёнамі якіх неадрыўна звязана дарагое кожнаму беларусу імя выдатнага сына беларускай зямлі Францішка Багушэвіча.

ВУЗЛЫ ДАРОГ

За час экспедыцыі мы змаглі збольшага азнаёміцца толькі з некаторымі, праўда, найбольш важнымі багушэвічаўскімі мясцінамі. А іх жа на карце блуканняў аўтара «Дудкі беларускай» нямала.

Гэта перш за ўсё — Віленская гімназія, дзе вучыўся паэт. Варта было б паглядзець на цяперашні яе стан, адшукаць месца, дзе спыняўся Францішак Багушэвіч, дзе бываў у Вільні ў час вучобы. Апрача таго, трэба б выявіць і акружэнне паэта, у першую чаргу выкладчыкаў, а таксама студэнтаў, з якімі ён разам вучыўся. Вышэй ужо называліся былыя таварышы Францішка Багушэвіча па гімназіі і адначасова паплечнікі Кастуся Каліноўскага Ціт Далескі, Ігнат Здановіч, пакараныя смерцю за ўдзел у студзеньскім паўстанні. Вучыліся з ім і іншыя цікавыя хлопцы. Напрыклад, брат Ціта Далеўскага Канстанцін, які ў час таго ж паўстання камандаваў асобым атрадам, быў паранены. Пасля разгрому паўстання ўцёк за мяжу, змагаўся за народную справу ў час Парыжскай камуны 1871 года і быў расстраляны версальцамі. У адным класе з Багушэвічам вучыўся Юліян Чарноўскі — у 1863 годзе рэвалюцыйны камісар Ашмянскага павета. Трэба сказаць, з гімназіі выйшла нямала рэвалюцыянераў,

людзей, да канца адданых народу. Гэтае гімназійнае акружэнне Францішка Багушэвіча можа вельмі многа сказаць аб фарміраванні светапогляду паэта, а значыць, і аб вытоках яго творчасці.

Да важных Багушэвічавых мясцін належыць і Пецярбургскі універсітэт, дзе вучыўся паэт. Хоць і не доўга ён там пабыў, але, трэба думаць, усё ж нямала даў беларускаму паэту для ідэйнага сталення гэты прызнаны цэнтр перадавой грамадскай думкі Расіі.

А Сувалкскія, ці Аўгустоўскія, лясы, дзе хадзіў паўстанцкімі сцяжынамі Францішак Багушэвіч? Як гэта было б заманліва прайсці імі, пашукаць сляды бітваў, у якіх удзельнічаў паэт, ну, і знайсці дом Крушэўскіх, якія дапамаглі параненаму Францішку Багушэвічу ізноў стаць на ногі.

Варта б было пашукаць на Беласточчыне і ў Вільні месцы, дзе хаваўся паўстанец Багушэвіч ад царскіх шпікоў у 1863—1865 гадах.

Здаецца, ніхто з нашых даследчыкаў не пабываў яшчэ ў багушэвічаўскіх мясцінах Украіны і Расіі. А іх жа было нямала: Нежын, дзе ў 1865-1868 гадах вучыўся паэт у юрыдычным ліцэі, Чарнігаў, дзе ў 1868-1869 гадах працаваў ён памочнікам справавода Чарнігаўскага праўлення і следчым, а таксама Кралявец (цяпер Сумская вобласць), Старадуб (Бранская вобласць), Волагда, Гразявец (Валагодская воб ласць), Барзна (Чарнігаўская вобласць), Канатоп (Сумская вобласць), дзе беларускі паэт працаваў з 1869 па 1884 год судовым следчым. Колькі падзей, трагедый, расчараванняў, дум хаваецца пад гэтым пратакольным тэрмінам — «судовы следчы»!

А віленскія судовыя ўстановы, дзе па вяртанні на радзіму працаваў Францішак Багушэвіч адвакатам судовай палаты. На гэтай пасадзе ён вёў пераважна справы сялян і гарадской беднаты. Адсюль і яго празванне — мужыцкі адвакат.

Быў у біяграфіі Францішка Багушэвіча і горад Гродна. Сюды ён прыязджаў да сусветна вядомай польскай пісьменніцы Элізы Ажэшкі, шчырай прыхільніцы беларускага народа, беларускай культуры. Элізу Ажэшку звязвала з Францішкам Багушэвічам адзінства поглядаў, а таксама агульнае баявое мінулае: і польская пісьменніца, і беларускі паэт былі ўдзельнікамі студзеньскага паўстання 1863 года.

Ну, і яднала іх, вядома ж, яшчэ і літаратура. У 1888 годзе ў пісьме да Яна Карловіча Эліза Ажэшка пісала: «Быў у мяне нядаўна пан Багушэвіч і чытаў мне толькі што напісаную ім па-беларуску байку, доўгую, поўную фантазіі, цудоўную. Прыгожы гэта талент. Яго польскія вершы слабыя, але беларускія, на маю думку, па меншай меры выдатныя. Трэба б было з усёй сілай

заахвочваць яго да работы ў гэтым напрамку».

У сваю чаргу Францішак Багушэвіч з найвялікшай пашанай ставіўся да Элізы Ажэшкі. Польскай пісьменніцы ён прысвяціў адзін са сваіх лепшых вершаў — «Яснавяльможнай пані Арэшчысе».

З вялікім смуткам дачулася Эліза Ажэшка пра такую нечаканую смерць беларускага сабрата на самай мяжы новага стагоддзя. Згадваючы падзвіжніцтва нарадалюба Францішка Багушэвіча, яна пісала: «Быў ён адным з найвысакародных людзей, якія служылі нашай зямлі, а для мяне асабіста адным з вельмі нешматлікіх сяброў. Успаміны пра яго для мяне дарагія і самотныя». Не кожны мог атрымаць такую высокую ацэнку ад выдатнай пісьменніцы!

Трагізм Францішка Багушэвіча ў тым, што ён так і не ўбачыў вынікаў таго, за што змагаўся — і са зброяй у руках, і пяром паэта. Наадварот, пасля яркага ўсплёску народнага духу ў час студзеньскага паўстання яшчэ больш цёмная ноч на доўгія гады апусцілася на анямелыя палі Беларусі, а на шляху паэтычнага слова беларускага дудара да народа сталі непераадольныя перашкоды, што чыніла новая палітыка царызму. Гэты трагізм прарываўся і ў яго «дудцы», якая, зняверваючыся, часам проста нямела ад безвыходнасці:

Га! Чаму ж не граеш?
Хіба ты не знаеш,
Не ведаеш хіба,
Што, як тая рыба
Ды на лёдзе б'ецца,
Так вот я, здаецца,
Сорак гадоў б'юся,
Ніяк не звярнуся,
Ніяк не натраплю
Вадзіцы хоць каплю,
Ды такой вадзіцы,
Ды з такой крыніцы,
Што як хто нап'ецца,
Дык вольным стаецца...

І тым не менш Багушэвічава «дудка», як бачым, не знямела канчаткова. Нязбытную сілу давала ёй светлая надзея, вера, што прыйдзе дзень і на спакутаваную Беларусь.

Жыццё Францішка Багушэвіча — гэта вялікі грамадзянскі подзвіг. Яно, хай не здадуцца надта банальнымі гэтыя словы, — яркі прыклад для ўсіх нас, прыклад гранічнай сумленнасці,

самаахвярнасці, вернага служэння народу. І таму гэта вялікая радасць — яшчэ раз прайсці ўсімі тымі дарогамі, дзе, прарываючы гнятлівую немату маўчання, на ўвесь голас грала чыстая і непадкупная дудка Мацея Бурачка.

Той курган векавечны

СЕЛІШЧА

У край Купалаваіа юнацтва, да той зямлі, што дала паэту крылы для высокага палёту, падахвоціўся з'ездзіць са мной пляменнік Янкі Купалы Эдуард Іванавіч Аўлачынскі, які добра ведаў усе сцежкі «дзядзькі Янкі», сустракаўся з ім, жывучы ў гэтым салаўіным кутку Беларусі.

Па зямлі ішла восень. Але дзень быў надзіва ясны і светлы — ад шчодрага не па часе сонца, што прыпякала амаль па-летняму, раскашуючы ў чыстым бязвоблачным небе, ад яркага жаўталісця пералескаў і прыдарожных бяроз, клёнаў, ясеняў, якія не спяшаліся яшчэ скідаць свой залаты ўбор.

— Спярша паедзем у Селішча, — сказаў Эдуард Іванавіч, які быў для мяне сапраўдным гідам.

Фальварак Селішча, як вядома з біяграфіі паэта, узялі Луцэвічы ў арэнду ў 1895 годзе, калі Янку, ці, як яго звалі ў сям'і, Ясю, было недзе каля 13 гадоў. Тут, у Селішчы, адкрыліся будучаму паэту нязнаныя таямніцы чароўнай беларускай прыроды, хараство пароднай душы, шматфарбнаеˆ і мілагучнасць род най мовы. У Селішчы зведаў ён і вялікае гора — смерць бацькі, потым брата і дзвюх сястрычак. Тут ва ўсёй паўнаце спазнаў будучы паэт шматпакутную долю мужыка-беларуса, яго мазольную працу: пасля смерці бацькі васемнаццацігадоваму юнаку самому давялося заняцца гаспадаркай, узяцца, па яго выразу, «чытаць сумную кнігу памешчыцкага поля і пісаць журботную аповесць свайго гора сахой ды касою».

Я мужык-беларус —
пан сахі і касы;
Цёмен сам, белы вус,
пядзі дзве валасы...

Так, гэта тут, у Селішчы, малады гаспадар арандаванай зямлі ўпершыню пачаў спрабаваць свае сілы ў паэзіі («...на працы ў полі,

— успамінаў пазней паэт, — або ў дарозе, або на начлезе прыйдзе думка — і я пішу»). Якраз тут нарадзіліся гарачыя радкі вядомых сёння кожнаму вершаў і паэм Янкі Купалы, прысвечаных «пагарджанаму век», «сляпому, глухому» беларускаму мужыку, у якога спрадвеку былі «заліты потам горкім вочы», які прывык зносіць ад сваіх прыгнятальнікаў «лаянку і крык» і якога паэт пачаў, урэшце, будзіць ад «зімовага рабскага сну». Гэта адсюль пайшлі ў свет такія шэдэўры купалаўскай паэзіі, усёй нашай літаратуры, як «Мужык», «Там», «Я не для вас, паны, о не...», «Ворагам Беларушчыны», «Родныя песні», «З песень аб сваёй старонцы», «Гэта крык, што жыве Беларусь», «Касцам», «Я мужык-беларус...», «Яшчэ прыйдзе вясна», «Песня мая», «Выйдзі», «Зімою», «Курган», «Адвечная песня», «Яна і я», і многія, многія іншыя, якія, праўда, былі запісаны на паперы пазней. Так, толькі запісаны пазней, але, як прызнаваўся сам паэт, ён «выплакаў» іх «сэрцам, высніў... душою, б'ючыся з нядоляй, б'ючыся з бядою», г. зн. у першую чаргу тут, у Селішчы. Інакш кажучы, якраз у Селішчы, дзе Ясь, спазнаўшы на ўласнай скуры гаркоту мужычага жыцця, долю беззямельных, ва ўсёй глыбіні ўсвядоміў векавую несправядлівасць беларускага народа, была ўспоена магутная купалаўская паэзія пратэсту. Таму перш за ўсё ў Селішчы і трэба шукаць крыніцы «дум беларускіх» Янкі Купалы, якім навучыўся ён «без школы і кніг». Недарэмна ж, якраз адсюль, з Селішча, рашуча разарваўшы зачараванае кола паднявольнага існавання, пайшоў пясняр у свет, каб «над беларускай соннай нівай нязгаслы светач распаліць».

Да Купалавага Селішча, якое здавалася мне раней дзесьці за трыдзевяць зямель, аказалася рукой падаць ад Мінска. Мы ехалі кіламетраў дваццаць па Лагойскай дарозе, потым прыкладна столькі ж па гравійцы на Дзяніскі, і вот за вёскай Вялікія Бясяды, праз хвілін дзесяць гоцання па каменцы, Эдуард Іва навін скамандаваў мне прыпыніць мой «бранявік».

Дарога-каменка, на якой мы паставілі збоку ма шыну, была як прасека ў лісцвяным лесе. Бязлюддзе. Цішыня. Прайшлі па жардзяным мастку налева, і адразу ж за прыдарожнай паласой бярозава-асінава-альховага зарасніку перад намі адкрылася поле. Гэта было пераворанае нядаўна бульбянішча, на якім адразу кінуліся ў вочы даўгія капцы бульбы, закрытыя на зіму зямлёй, акуратна прыплясканыя лапатамі. За полем цягнулася пярэстая — жоўтае з зялёным — стужка лесу, якая апаясвала яго з усіх бакоў. Поле было няроўнае, з характэрнымі для Лагойшчыны ўзгоркамі, багатае на камяні.

— Гэта і ёсць Селішча, — сказаў Эдуард Іванавіч. — Вунь там быў двор Луцэвічаў...

Эдуард Іванавіч паказаў на маленькі — велічынёй з танцпляцоўку — астравок, зарослы лазняком ды асіннікам, з галінастым мацаком-дубам пасярэдзіне — ці не гэты дуб і ўбярог Купалава печышча ад канчатковага заворвання?

Грузнучы ў мяккай свежай раллі, мы пакіравалі да астраўка. Двое мужчын каля бліжэйшага бурта — адзін пажылы, другі падгалісты малады дзяцюк — павярнулі на нас галовы і доўга глядзелі, як быццам пытаючыся: «Што гэта яны шукаюць тут, на голай раллі?»

Ад колішняга жылля заўважылі на астраўку толькі зарослае травою ўзвышэнне і слабыя сляды падмуроўкі. Даўнейшае селішча Луцэвічаў стала цяпер месцам, куды бульдозеры ссоўвалі з поля каменне — тут яно валялася цэлымі грудамі. Добра патупаўшы тут, мы знайшлі ўсё ж такі адну «жывую» памятку жытла — невялічкую жалязяку з узорамі: ці то частку дзверцаў ад грубкі, ці то кавалачак юшкі ад коміна. І ўсё.

Праўда, бліжэй к дарозе, каля лесу Эдуард Іванавіч паказаў мне некалькі карабатых, падсохлых яблынь — тут быў сад. Яблыні, канечне ж, былі ўжо не Луцэвічаў, а хутчэй за ўсё пазнейшых гаспада роў. Але ж пасаджаны, ці, лепш сказаць, падсаджаны, яны былі, вядома, на ранейшым месцы. Значыць, у Селішчы — гэта мы можам з поўным правам сказаць — захаваліся яшчэ рэшткі Луцэвічавага саду — жывы помнік паэту.

Адчуванне ў мяне было незвычайнае: гэта ж мы на той самай зямлі, якую араў, паліваў некалі потам, якую схадзіў удоўж і ўпоперак малады Янка Купала, на зямлі, дзе душу юнака «акрылялі прыгажосці свету», дзе «цяністыя бітага шляху прысады і ў вырай лятучыя гусяў шнуры гармонію ўводзілі ў песенным складу, сачылі нязгоднай зваротак ігры», «дзе зялёнае поле рунеючым збожжам, цвітучая ў сонечны цвет сенажаць» яму «песню кваціліў ўзорам прыгожым, вучылі, як словы ў вянок завіваць», дзе «ад шопату спелых пшанічных калоссяў, ад шэлесту лісцяў узмежных ігруш музычнае водгулле ў песню лілося, злівалася з жальбамі скрыўджаных душ», дзе паэту «каса і сякера і цэп малацьбіты магутную волатаў сілу далі; марозы і спёкі далі гарт нязбытны» і песню «як звон, як пярун, адлілі».

Радкі купалаўскай паэзіі гучалі тут неяк зусім па-новаму — як быццам я прысутнічаў пры іх нараджэнні. Радкі пра бясконцую — ад цямна да цямна — працу мужыка-беларуса, пра спрадвечную абяздоленасць таго, хто «свет хлебам корміць, а сам мякіначку есць», пра гэту во ціхую, ворануюперавораную паэтам «матку-зямлю».

Хоць гарыста яна, камяніста яна,

Вераб'ю па калена, што сею, расце,
Дый люблю ж я яе, шкода хаткі, гумна;
О, такіх няма, мусіць, нідзе! —
З саламянай страхой мая хатка, гумно;
Непачэсна, што праўда, віднеюць яны,
Дый на іх жа сваёй клаў рукой бервяно
І зямлю раўнаваў пад звяны!..

Так, мы не ўбачылі ўжо хаты Луцэвічаў, іх гумна, нават рэштак двара, дзе гаспадарыў малады Ясь. Затое ж нікуды не знікла, засталася — во яна, перад нашымі вачыма — зямля, дзе ўсё гэта было, з тымі ж узгоркамі і лагчынамі, з тымі ж, хай і абноўленымі, зменемымі, лясамі і пералескамі, раўкамі і крыніцамі, зямля, з якой вылецела ў шырокі свет наша самая звонкая, самая шчырая песня. Але — як гэта ні дзіўна, як ні крыўдна — мы не знайшлі тут і знаку, хаця б маленькай памяткі, якая б расказала людзям, нагадала б усім нам, што якраз на гэтай зямлі з нясмелага вясковага хлапчука вырас вялікі народны пясняр, слава і гонар Беларусі.

АКОПЫ

Мы моўчкі падышлі да машыны, яшчэ раз акінулі вокам узгорысты палетак маладога Луцэвіча і, развярнуўшыся, пагоцалі па той жа каменцы назад. У нашых планах было зазірнуць яшчэ ў адну, не менш важную купалаўскую мясціну — у Акопы.

Сюды пераехалі Луцэвічы (маці паэта з дзецьмі) у 1909 годзе, пабыўшы перад гэтым некалькі гадоў на арэндзе ў Бараўцах, і сядзелі тут дзесьці каля двух дзесяткаў гадоў (арандаваны кавалак зямлі і сядзіба памешчыка Жэлігоўскага пасля рэвалюцыі перайшлі ў іх рукі), пакуль састарэлая Бянігна Іванаўна не перабралася да сына ў Мінск.

Акопы... Гэту геаграфічную назву трэба б было ўпісаць у гісторыю нашай літаратуры залатымі літарамі. Ім, Акопам, абавязана беларуская літаратура — і гэта трэба сказаць без аніякага перабольшання — самымі яркімі сваімі старонкамі. Якраз тут, у Акопах, гэтым зацішным куточку беларускай зямлі, куды ў любую вольную хвіліну на працягу двух дзесяткаў гадоў ірваўся з усіх дарог Янка Купала, куточку, дзе было яму ўсё

блізкае і мілае, дзе ён адчуваў сябе як нідзе лепш, з-пад пяра паэта вылецеў у свет цэлы вырай твораў, якія сталі гонарам і славай беларускай літаратуры, зрабіліся нашай вечна жывой класікай. «Акопы» — гэту паметку мы сустракаем пад вялікай колькасцю твораў Янкі Купалы перадрэвалюцыйнага і паслярэвалюцыйнага часу. Сярод іх такія перлы нашай паэзіі, як вершы «Гэй, наперад!», «Як у лесе зацвіталі....», «З недацветаў», «У купальскую ноч», «Не прасі», «Грайце, песні», «Жняя», «З летніх малюнкаў», «Блізкім і далёкім», «За свабоду сваю...», «Каб я князем быў», «Заручыны», «Дзве таполі», «Ты прыйдзі...», «Над ракою ў спакою», «На жалейцы», «Братка і Сястрыца», «Навука», «Тутэйшы», «На смерць Сцяпана Булата», «А зязюлька кукавала», «Па Даўгінаўскім гасцінцы», «Аб дзяўчыне», «Дзе стаяў двор панскі» і многія, многія іншыя. У Акопах былі напісаны народным паэтам і такія выдатныя творы нашай літаратуры, як паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», п'есы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», а таксама зроблены вершаваны пераклад «Слова аб палку Ігаравым». Трэба думаць, у Акопах нарадзіліся і многія з тых твораў Янкі Купалы, пад якімі няма паметкі аўтара — як дарэвалюцыйныя, так і паслярэвалюцыйныя. Пацверджаннем гэтага можа паслужыць, напрыклад, паведамленне, якое было змешчана ў 1926 годзе ў часопісе «Полымя» (№ 5) у «Хроніцы беларускай культуры», дзе гаворыцца, што «Янка Купала, які знаходзіцца ў сябе дома, у Акопах (заўважце, дома. — К. Ц.), напісаў цэлы знізак новых вершаў эпічнага характару...»

Каб трапіць у Акопы, мы з Эдуардам Іванавічам зноў вярнуліся да вёскі Вялікія Бясяды, скіравалі ў яе вуліцу. Праз калгасны двор выехалі на пясчаны прасёлак. Праз які кіламетр паказаліся прысады вёскі Харужанцы. За Харужанцамі, перад лесам, у цяні вясёлага дубка, што здалёк маячыў на сонечным узгорку, паставілі машыну.

— Акопы — за гэтым лесам, — сказаў Эдуард Іванавіч. — Можна прайсці пеша...

Да Акопаў ішла праз лес калдобістая, з грыўкамі травы між машынных і калёсных каляін дарога. Мы паволі, без спешкі — хацелася адпачыць тут душой — патупалі па ёй, узіраючыся ў прыдарожны сівец ды верас: ці не выпнецца дзе які грыб. І праўда: неўзабаве Эдуард Іванавіч прыкленчыў каля прыземістай хвойкі; калі ён выпрастаўся, у руках бліснула смуглявая галоўка баравіка.

Падахвочаныя знаходкай, мы збочылі з дарогі і ішлі паўз яе, па выбітых каровамі і датаваных, відаць, аматарамі «ціхага палявання», пакручастых сцежачках між хвой і куп'я, пільна гледзячы перад сабой: абодва мы аказаліся заядлымі грыбовікамі і, вядома ж, не маглі прапусціць моманту. Але, як выявілася, мы

не былі тут сёння першапраходцамі: то там, то сям бялелі ў траве парэзаныя кімсьці «карэньчыкі» — кольцы баравікоў, валяліся збітыя мухаморы ды — пры елках — стаўбунаватыя макрухі, якіх, як відаць, і тут не было ахвотнікаў браць: усіх адпужвае ахоўная слізістая плёнка гэтых, калі верыць кнігам, свойскіх грыбоў, падобных зверху на маслякоў. Зрэдку трапляліся нам цэлыя касякі чорных груздоў, ці хрушчоў, як завуць іх на Міншчыне, — праўда, больш старых, з парыжэлымі спадыспаду пласцінкамі. Але мы каля іх не сунімаліся — гэтак можна было і засесці на паўдарозе да мэты.

Выглядвалі больш баравікоў ды рыжкоў, асабліва Рыжкоў — яны ж надта любяць такія во сіўцы ды каровіны капыты. Шукаючы так грыбы, падумалася, што гэта ж якраз тут кружыў некалі з кошыкам і нажом Янка Купала, што мы ходзім яго грыбнымі мясцінамі...

Неўпрыкметку дарога прывяла нас на светлую паляну, перасечаную ў некалькіх месцах роўнымі і вузкімі паскамі ясных пералескаў.

Гэта пачыналіся ўжо Акопы.

Эдуард Іванавіч, калдыбаючы па ўцвярдзелых за лета грудах раллі, шоргаючы чаравікамі па пруткім яшчэ ржэўніку, падвёў мяне пад адзін з пералескаў. Там, сярод хмызу, мне здалёк ужо кінуўся ў вочы вялізны камень-валун, цёмны, з седлаватымі вы емкамі. Гэта, сказаў Эдуард Іванавіч, камень Янкі Купалы. Тут ён любіў адпачываць, пісаў на ім, як на стале, вершы і паэмы. Мы на вока змералі валун — быў ён прыкладна чатыры метры ўдаўжыню, тры — ушырыню і каля паўтара метра вышынёй. Як бы там ні было, а гэты камень не мог не звярнуць на сябе ўвагу Янкі Купалы, не мог не будзіць яго багатай фантазіі. Інакш кажучы, камень-валун у Акопах — яшчэ адзін, пастаўлены самой прыродай помнік паэту, вечны сведка яго натхнення.

Трошкі далей за каменем, між камлёў пачарнелых альшын і напалову сухіх вербалозін, цягнуўся, перасякаючы нам дарогу, глыбакаваты роў, на дне якога бялелі пясчаныя наносы — след ручая, які яшчэ нядаўна шыўся тут між кругляцу ды асочкі. Каля рова Эдуард Іванавіч паказаў мне і зарослую цяпер сажалку Луцэвічаў, на беразе якой стаяла іх лазня.

А во і сама хата Бянігны Іванаўны, мацеры паэта.

Хата, пра якую, праўда, трэба гаварыць ужо ў мінулым часе. Бо ад яе застаўся толькі падмурак і выкладзеныя каменем два скляпы. Адзін, пад былой кухняй — для бульбы, гародніны; другі, пад кладоўкай — для малака, сала, садавіны, называўся ён — спіжарня. Радавала трошкі тое, што і падмурак і скляпы вельмі добра захаваліся. Сценкі скляпоў як быццам сёння былі

выкладзены камянямі, нідзе не аб'ехалі, захаваліся нават лазы ў іх.

Эдуард Іванавіч паказаў мне, дзе былі «пакоі», спальня, калідор, лесвіца на вышкі, дзверы і, нарэшце, пакой, дзе звычайна спыняўся Янка Купала. Два акны Купалавага пакоя — ён быў вуглавы — выходзілі ў сад: адно, здаецца, на поўдзень, другое — на захад. Перад самымі вокнамі цвілі на клумбах кветкі, раскашавалі кусты руж. З акон відаць былі дубы, клёны, ясені, хвоі недалёкага лесу, прасвечвалася шырокімі прагаламі поле. Не дзіва, што так добра пісалася тут паэту.

Цяпер пасярэдзіне пакоя Янкі Купалы гаманіла з ветрам выгоністая бяроза. На месцы ж кветнікаў разрасліся суцэльнай сцяной здзічэлыя кусты руж — тыя самыя, што бачыліся з акна паэту. Вакол хаты былі яшчэ кусты бэзу, шыпшыны, а таксама рэшткі саду — састарэлыя яблыні, ігрушы.

Недалёка ад хаты мы знайшлі рэшткі калодзежа, які даўно аб'ехаў — цяпер гэта была неглыбокая яміна, з камянямі. З яміны цягнуліся ўвысь два тонкія маладыя дубкі. Эдуард Іванавіч падводзіў мяне туды, дзе былі раней гаспадарчыя пабудовы — ад іх заставаліся цяпер толькі камяні падмуркаў ці невысокія, амаль зроўненыя з зямлёй травяністыя валкі. Во тут стаяла «высакаватая будачка» — капцільня («раней яна называлася вяндлярня»). Тут — хлявы («і коні ў адным стаялі»). Тут — пуня. Тут — гумно, у якім была конная малацілка. Тут стаялі два свірны: у адным — «ссыпалі дабро», у другім, добра помніцца Эдуарду Іванавічу, віселі хамуты, сядзёлкі і ўсякія іншыя рэчы («нейкі склад быў»).

Мы абышлі ўсю, яшчэ даволі вялікую паляну. Якая разнастайнасць пародаў дрэў у Акопах, вакол былога двара Бянігны Іванаўны! Тут і светлыя беразняку і задуменныя хвойнікі, і пахмурныя рады елак, і — уперамешку з іншымі дрэвамі — клёны, дубы, ясені, арабіны, вербы, ліпы, дзікія яблыні і ігрушы... І ўсё гэта ў вясёлым асеннім убранні. Чароўны, поўны цішыні і сонца куточак!

Мы доўга тупалі па свежаапалым лісці, па сіўцовым куп'і, сачылі, як над лесам, высока ў небе плаваў, амаль не махаючы крыламі, нейкі ястрабок, і нам проста не хацелася вяртацца назад, пакідаць гэты першародны спакой, гэту амаль што некранутую красу ціхай прыроды.

Водзячы мяне па сцежках паэта, Эдуард Іванавіч расказваў аб колішнім тут жыцці, аб сваіх сустрэчах з Янкам Купалам. Праўда, пра першыя гады, калі АўлачынсКія жылі разам з Бянігнай Іванаўнай у Акопах, а потым — самастойна — на суседнім хутары Айчызна, Эдуард Іванавіч нічога не помніць, бо тады яшчэ быў зусім малы. Затое добра запомніўся яму «дзядзька Янка», калі

Аўлачынскія сядзелі на недалёкім хутары Ляўшова, які сёння зліўся з вёскай Харужанцы. Янка Купала, прыязджаючы ў Акопы, не мінаў хаты сваёй сястры ў Ляўшове — Марыі Дамінікаўны Аўлачынскай. Тым больш што з яе чалавекам — Янкам Аўлачынскім, бацькам Эдуарда Іванавіча, ён шчыра сябраваў, яшчэ з юнацтва вучыўся з ім у Беларуцкім вучылішчы, хадзіў разам на паляванне. Помніцца Эдуарду Іванавічу, як паляўнічыя падсмейваліся з Янкі Купалы, які прыходзіў з лесу з пустымі рукамі: у яго рука не падымалася стрэліць у звера, асабліва ў такога прыгожага і бяскрыўднага звярка, як вавёрка. «Хай жыве сабе ды дзяцей пацяшае», — казаў Янка Купала. Не раз сустракаўся з паэтам Эдуард Іванавіч і ў саміх Акопах, куды бегаў з Ляўшова да сваёй «бабкі» — Бянігны Іванаўны.

У памяці застаўся адзін выпадак. Аднойчы Янка Купала пайшоў у грыбы. Раптоўна ўсчалася небывалая бура, хлынуў лівень. З хаты і з гаспадарчых будынкаў ледзь не пазносіла дахі. Некалькі гадзін шалеў гэты смерч. Бянігна Іванаўна не знаходзіла сабе месца, хадзіла па хаце, плакала, узіраючыся ў вокны: прападзе Ясь — гэта ж пайшоў амаль што голы і столькі часу няма. Толькі калі мінавала бура, Янка Купала вярнуўся дадому. Ён быў мокры да ніткі, але вясёлы, з усмешкай на твары: перачакаў непагадзь, схаваўшыся пад нейкі выварацень...

Вяртаючыся з Акопаў у Мінск, мы заскочылі «на хвілінку» яшчэ ў Янушкавічы, да сябра дзяцінства Эдуарда Іванавіча — былога настаўніка, выкладчыка хіміі Мечыслава Іосіфавіча Несцяровіча, які некалі жыў побач з Акопамі — на хутары Моцеўшчына. Ён вельмі часта сустракаў тут Янку Купалу — то ў лесе ў грыбах, то на кірмашы ў Харужанцах, куды паэт любіў хадзіць, гутарыць там з людзьмі, то на сенажаці, на полі... Запомнілася, напрыклад, Мечыславу Іосіфавічу, як аднойчы ён убачыў Янку Купалу на сенакосе каля вёскі Карпілаўка, у гурце касцоў і жанчын — зграбальшчыцсена, што расселіся на грудку папалуднаваць. Частуючыся разам з усімі, Янка Купала размаўляў аб чымсьці са сваімі землякамі, смяяўся, а потым пачаў чытаць ім паэму Якуба Коласа «Новая зямля». Якраз з таго часу ўрэзаліся ў памяць Мечыславу Іосіфавічу, тады яшчэ малому хлапчуку, упершыню пачутыя з вуснаў Янкі Купалы радкі цудоўнай коласаўскай паэмы: «А збоку чмыша бык Мікіта, хвастом матаючы сярдзіта...» І, вядома ж, ніколі не забудзе Мечыслаў Іосіфавіч, як паэт аднойчы падараваў яму дзве кніжкі — «Тараса Бульбу» Гогаля на беларускай мове і фальклорны зборнік (на жаль, абедзве кніжкі згарэлі ў час вайны): Янка Купала заўсёды, прыязджаючы ў Акопы, прывозіў дзецям такія гасцінцы...

І яшчэ была ў мяне на радзіме Янкі Купалы — праўда, трохі

пазней, на другое лета — адна сустрэча. Сустрэча з ураджэнцам гэтых мясцін, нядаўнім выкладчыкам біялогіі Гродзенскага універсітэта Францам Віктаравічам Гінтаўтам.

Пра яго расказаў мне Максім Лужанін, які ведаў з публікацыі ў газеце «Літаратура і мастацтва» аб маіх росшуках крыніц купалаўскай паэзіі. Аляксандр Амвросьевіч сказаў мне ў той размове, што Франц

Віктаравіч, яго таварыш яшчэ па Белпедтэхнікўму, таксама займаецца тым жа, што і я, і што ён шмат цікавага можа расказаць пра купалаўскія мясціны.

Каб распытаць, як звязацца з Францам Віктаравічам, я набраў нумар тэлефона яго сваякоў, што жывуць у Мінску, — гэты тэлефон таксама дапамог мне знайсці Максім Лужанін. Прыветлівы жаночы голас адказаў, што Франц Віктаравіч якраз гасцюе цяпер у іх, у сваякоў, але ўчора паехаў на дні два-тры ў Вялікія Бясяды — на радзіму. Ён намерыўся пабыць там у свайго стрыечнага брата, таксама Гінтаўта.

Была якраз субота, выхадны дзень, а пад акном — бо не займеў гаража — стаяла, заўсёды напагатове, машына. Доўга не думаючы, я ўвапхнуў у партфель блакнот, мацнуў па кішэні, ці на месцы ключы, і патупацеў прыступкамі лесвіцы ўніз.

Праз якую гадзіну я ўжо стаяў у Вялікіх Бясядах на ўтравелым грудку перад варотцамі дагледжанага двара з вясёлкамі кветак пад вокнамі хаты.

Убачыўшы машыну, з варотцаў выйшла маладая жанчына з малым на руках.

— Ага, у нас Франц Віктаравіч, — адказала яна на маё запытанне. — Толькі ён цяпер не дома — пайшоў фатаграфаваць панскі двор. Гэта кіламетры паўтара-два адсюль.

— А як туды пад'ехаць?

— Туды не пад'едзеце — няма дарогі.

— То, можа, я пеша прайду?..

— Вы не знойдзеце... Хіба папрасіць бабу Стасю... Вунь яна ідзе...

Але бабка Стася, жывая, вельмі рухавая жанчына, адгаварыла:

— Правесці-то я правяла б, але мы можам размінуцца... Ды ён вот-вот павінен быць...

І праўда, не паспеў я як след разгледзецца, пахадзіць да вуліцы пасёлка (гэты пасёлак, хоць і аддзяляе яго ад Вялікіх Бясяд гравейка, усё роўна адносіцца да іх), як тая ж маладая жанчынка гукнула мне:

— Франц Віктаравіч прыйшоў ужо!..

Франц Віктаравіч, прыемны з твару, нетаропкі ў рухах чалавек, вельмі інтэлігентны, сустрэў мяне як знаёмага,

аднадумца.

Ён расказаў, што-цяпер якраз хадзіў на былую сядзібу пана Вайцяхоўскага, таго самага, што аддаваў Луцэвічам у арэнду Селішча. Франц Віктаравіч фатаграфаваў там рэшткі панскага саду, маляўнічыя куткі раскошнага парку, цудоўныя азёры-сажалкі: усё ж такі сядзіба гэта таксама моцна звязана з біяграфіяй Янкі Купалы.

Франц Віктаравіч з самых малых гадоў ведаў Ян ку Купалу: сядзіба Гінтаўтаў, якія жылі ў Ляўшове, межавалася з дваром Аўлачынскіх, дзе вельмі часта, як ужо гаварылася, гасцяваў паэт.

Я расказаў Францу Віктаравічу, як мы хадзілі тут з Эдуардам Іванавічам Аўлачынскім.

— А ці вадзіў ён вас на курган?

— Не, не вадзіў. А на які курган?

— Ды той самы... «Ўдзірванелы курган векавечны»... Пра які і паэма Янкі Купалы «Курган»...

— Але ці той? — моцна засумняваўся я.

— А мы можам разам памеркаваць... Калі хочаце, давайце пад'едзем туды, паглядзім...

Я, вядома, не мог не згадзіцца.

У Харужанцах Франц Віктаравіч папрасіў мяне спыніцца каля самай крайняй хаты.

— Тут жыве мой сваяк, ляснік. Ён пакажа, як прайсці на курган. Я хадзіў туды малым, але цяпер курган зарос лесам...

Ляснік Віктар Хадкоўскі якраз зграбаў за хатай сена. Выслухаўшы нас, ён гукнуў сына, які яму памагаў.

— Саша, звадзі людзей на Курганы... Толькі ідзі раўком.

Саша, загарэлы хлапчук гадоў дванаццаці, адклаў убок граблі і, не вельмі дзівячыся з нашага намеру, сказаў нам ісці за ім.

— Але ж той курган... «на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай», а тут ніякай ракі не відаць... — ізноў выказаў я сваё сумненне Францу Віктаравічу, ідучы з ім услед за Сашам.

— Усё правільна... Толькі пачакайце... — І, калі выйшлі за аселіцу, ён дадаў: — Вы заўважылі, па чым мы ідзём?

Мы ішлі зялёнай, з тарфянымі пралысінамі вузкай лагчынкай, якая напамінала рэчышча высахлай ракі. Пад нагамі чулася вільгаць, і мы стараліся ступаць на цубчэйшыя купіны кругляцу, з якога вытыркаліся сцяблінкі чорнагалову — ужо з белымі камячкамі пуху.

— Тут як бы нейкая балаціна?

— Вот-вот. Вы пакуль што заўважайце, а потым мы звяжам усё ў адно, — сказаў Франц Віктаравіч з усмешкай.

Гэтай лагчынкай, якую чамусьці ляснік назваў «раўком», мы дайшлі да лесу, што ішоў, падымаўся ўверх — хвоі, бярозы,

арабіны...

Да вяршыні ўзгорка дабіраліся кругамі, абмінаючы нейкія яміны, траншэі, зарослыя — аж не відаць было — збуялым скрыпенем ды маркоўнікам. На самай вяршыні ўбачылі замшэлы дот.

— Гэта і ёсць той Курган, — сказаў Франц Віктаравіч, калі мы спыніліся на ўзгорку. — Адсюль, калі ён быў бязлесы, добра праглядваліся ўсе навакольныя дарогі і вёскі... Таму вайскоўцы і скарысталі яго для сваёй мэты... Калі я быў малы, бачыў тут дзве жалезныя пліты з выбітымі літарамі. Значыць, нехта важны быў тут пахаваны. Ну, і галоўнае, чаму я думаю, што гэта той курган — паданне, што расказаў мне сябра Янкі Купалы, наш блізкі сусед у Ляўшове Янка Аўлачынскі. От паслухайце яго. Некалі, кажа паданне, жыў тут нейкі князь. Аднаго разу ўгнявіў яго чымсьці вядомы ва ўсёй ваколіцы лірнік-жабрак, які лічыўся чараўніком. Князь загадаў слугам забіць яго і закапаць на гэтым во ўзгорку. Назаўтра ўсе крыніцы, якія білі адсюль, быстрацечная рака, што ўтварала гэтыя крыніцы, у адзін момант перасохлі. Гэта была кара за забойства лірніка-чараўніка. З таго часу тут і засталося тое рэчышча, якім мы і падымаліся на ўзгорак.

Яно цягнецца аж да самай Гайны-ракі. Гэтай лагчынай-рэчышчам і цяпер нясуцца вясною бурлівыя плыні талай вады. Паданне гэта не мог не ведаць ад сябра і Янка Купала, які вельмі цікавіўся даўніной.

Калі я слухаў Франца Віктаравіча, мне вельмі яскрава ўспомніўся пачуўся той нестрыманы гул бурлівай і магутнай плыні купалаўскага «Кургана», паэмы, што бліскотка ўвабрала ў свае строфы і шматпакутную гісторыю змагання беларускага народа за волю, і стрыманую веліч не вельмі раскошнай прыроды краю, яго бессмяротныя легенды і паданні, што праз вусны людзей дайшлі да нас з самай сівой мінуўшчыны:

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,
Удзірванелы курган векавечны.
Дуб галлё распусціў каранасты над ім,
Сухазелле ў грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханнем сваім,
Аб мінуўшчыне ў жальбе галосе.
На купалле там птушка садзіцца, пяе,
У піліпаўку воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.

Хмары неба ўсцілалі мо тысячу раз,
Перуны білі з краю да краю, —
Ён стаіць — гэта памяць людская, паказ...
Толькі гутарка ходзіць такая...

Спусціўшыся той лагчынкай-рэчышчам з высокага ўзгорка-кургана ўніз, мы зноў селі ў машыну і пад'ехалі да былой сядзібы Гінтаўтаў і іх суседзяў Аўлачынскіх. Франц Віктаравіч, адышоўшыся, доўга стаяў на пустэчы каля старых цяністых ліп, што ціха шумелі ўверсе сваёй багатай лістотай.

— От тут была наша хата...

І Франц Віктаравіч расказаў мне трагічную гісторыю бацькоўскай сям'і, што жыла тут побач з Аўлачынскімі з 1919 года. У час Вялікай Айчыннай вайны, помсцячы за яго брата Станіслава, які перад вайной быў старшынёй мясцовага калгаса, а з прыходам гітлераўцаў стаў тут адным з завадатараў партызанскага руху, фашысты загналі бацьку, маці і пяцёра іх дзяцей — малодшых братоў і сясцёр Франца Віктаравіча — у пуню і разам з іншымі партызанскімі сем'ямі спалілі жывымі. Пра гэта Франц Віктаравіч даведаўся пазней, бо быў далёка адсюль, у партызанскім краі...

Жывучы ў Ляўшове, Франц Віктаравіч добра пазнаўся са сваімі суседзямі Аўлачынскімі, без якіх, на яго думку, нельга абысціся ў выяўленні вытокаў творчасці Янкі Купалы. І перш за ўсё — без першага гаспадара Ляўшова — Францыся Аўлачынскага. Быў ён з бедных, беззямельных сялян. Але раптоўна яму прываліла багацце. Ад дзядзькі па мацеры. Паехаў неяк дзядзька ў Амерыку на заработкі. Там яму ўдалося сабраць немалы капітал. Але скарыстаць яго дзядзьку не выпала: падарваўся, як відаць, на непасільнай працы, захварэў і памёр. Перад смерцю ён, адзінокі чалавек, напісаў завяшчанне, згодна з якім увесь свой набытак перадаваў старшаму сыну адзінай сваёй сястры, што была замужам за Аўлачынскім. Гэтым старшым сынам і быў Францусь, яшчэ тады падлетак. Атрымаўшы добрыя грошы, Францусеў бацька купіў каля Лысай Гары, у Ляўшове, тры валокі зямлі і пачаў абжывацца. Калі бацькі памерлі, Францусь, які пасталеў ужо к таму часу, завалодаў ляўшоўскім хутарам. Пры ім былі яшчэ дзве сястры і малодшы брат Янка, той самы Янка Аўлачынскі, з якім сябраваў Янка Купала. Стаўшы паўнапраўным гаспадаром, Францусь захацеў зрабіцца сапраўдным панам, шляхціцам. Дзеля гэтага ён падшукаў сабе ў Мінску нявесту са шляхецкай сям'і. Не важна, што Тэклюся была далёка не красуня, затое чыстакроўная шляхцянка! І, галоўнае, бацькі абяцалі і самога Францыся

прыпісаць да дваранства. Згулялі вяселлі, і Таклюся стала гаспадыняй у Франусевым доме. Хоць афіцыйна з дваранствам у Францыся нічога не выйшла, усё ж ён хадзіў як пан, пераймаючы ўсе панскія звычкі. Гаварыў ён ужо не «па-мужычы», а нейкай змешанай беларуска-польска-рускай мовай. «Вось цо да», «собственно», «тудэма-сюдэма», «пане дабрадзею» — такія яго былі любімыя слоўцы. Яго так і празвалі людзі — Восьцода. Сямейнае жыццё ў Францыся не ўдалося: Таклюся аказалася бяздзетнай, і ён пад канец запіў, упаў у розныя дзівацтвы.

Як мяркуе Франц Віктаравіч, Францыся Аўлачынскі паслужыў для Янкі Купалы прататыпам каларытнага і запамінальнага вобраза камедыі «Паўлінка» Пранціся Пустарэвіча. Гэты вобраз амаль «жыўцом» спісаны з былога гаспадара ляўшоўскага хутара.

Апрача таго, «дапамог» Францыся Янку Купалу напісаць і такія паэтычныя творы, як «Адплата кахання», «Сват», «Страх», дзе вельмі яскрава праглядваецца гэты самазваны «шляхціц». У »Адплаце кахання» выдае яго нават вельмі блізкае прозвішча — Лаўчынскі. Тут жа гаворыцца і пра яго сёстраў:

Во гэты-то шляхціч, во гэты багаты,
Пан новай і гонтамі выкрытай хаты,
Меў некалькі сёстраў, а стройных і мілых,
Прыгожых у твары, здаровых на сілах;
Кроў проста, здаецца, змяшалася з млекам, —
Спаткаўся дзе з імі — бяда з чалавекам:
Загіне напэўна з душою прастачай,
І сонца не ўгледзіць, і хаткі не ўбача!
Аж так шчыраваці патрапяць галубкі,
І іхнія грудзі, і вочы, і губкі!
А надта ж адна з іх, што звалася Зосяй,
І зграбненька ходзіць, галоўку лепш носе,
І лепей смяецца, і лепей міргае,
А ўся, як малійка, як кветка жывая!
Ці дзе загаворыць, ці песню зацягне,
То слухаў бы вечна, — так кожны прысягне...

Зося, расказваецца ў творы, пакахала простага сялянскага хлопца Янку Лявончыка («па бацьку — Прывада»), пра якога аўтар кажа з вялікай сімпатыяй:

Прыгожы быў хлопец, дзяўчатак прынада;
Што возьме, то зробіць, зух першы ў забаве,
Не мае плям чорных на сэрцы, на славе.
У вёсцы у роднай ён добрым суседам,

Янка таксама горача пакахаў Зосю. Ужо збіраліся пажаніцца. Але даведаўся пра гэта пан Лаўчынскі: «Як можна? Шляхцянка — род панскі, косць з косці — з мужыцкай крывёю змяшаціся хоча! На свет паказаці не будзе як вочаў. Той Янка, хамула, паненку абдыме...» І ён цвёрда намерыўся перашкодзіць шлюбу...

У гераіні вершаванага апавядання «Адплата кахання» Зосі ўсе, хто ведаў сям'ю Аўлачынскіх, адразу пазналі Зосю, сястру Франуся, якую ён хацеў аддаць за нейкага «моднага шляхцюка». У Янку Лявончыку зноў жа ўбачылі аднаго з парабкаў пана Аўлачынскага Лёню Сыча, якога, як і ў творы Янкі Купалы, пакахала Зося. У жыцці гэтак жа сама пан Аўлачынскі быў супраць шлюбу сястры Зосі з парабкам. Ён прагнаў Лёню з работы, а сястры, як расказваюць, прыгразіў: «Вось цо да, калі пойдзеш за хамулу Сыча, собственно фігу, а не пасаг ты ў мяне налучыш...» Каб Зося ўсё ж не зрабіла «глупства», пан Аўлачынскі пачаў прыспешваць яе жаніцьбу з аблюбаваным ім шляхціцам. Ужо і на «запаведзі» падалі, з'ездзіўшы да лагойскага ксяндза. Збіраліся гуляць вяселле. Але недзе перад самым вяселлем Лёня Сыч са згоды Зосі падкраўся да яе ўночы і, як гэта рабілася ў даўнія часы, выкраў нявесту з пасагам, пакінуўшы самога «Восьцода» з фігай. Лёня і Зося самі абвянчаліся ў Мінску, у добрага праваслаўнага «бацюшкі».

Як мяркуе Франц Віктаравіч, гэту ж жыццёвую гісторыю выкарыстаў Янка Купала і ў «Паўлінцы». Ды і сам вобраз Паўлінкі вельмі нагадвае Зосю — сястру Франуся Аўлачынскага і адначасова гераіню вершаванага апавядання «Адплата кахання».

Я слухаў расказы і меркаванні Франца Віктаравіча Гінтаўта (дарэчы, аб прататыпах купалаўскіх герояў ён рыхтуе якраз да друку артыкул) і радаваўся, што ў нас ёсць такія во апантаныя людзі, энтузіясты-краязнаўцы, якія імкнуцца дакапацца да кораня ў раскрыцці гісторыі нашай літаратуры, запоўніць тыя, часта вельмі істотныя прагалы, да якіх па той ці іншай прычыне не маглі прыйсці прафесійныя літаратуразнаўцы.

Аб знаходжанні Янкі Купалы ў Акопах і наогул на Лысагоршчыне, як умоўна называюць гэту мясцовасць самі яе насельнікі, вельмі шмат цікавага можа расказаць любы са старажылаў навакольных вёсак — Харужанцаў, Карпілаўкі, Вялікіх і Малых Бясяд, Сухой Гары, Лысай Гары, Жукаўкі і іншых. На жаль, запісам іх расказаў ніхто па-сур'ёзнаму не займаўся. А гэта значыць, што такая, вельмі яркая старонка ў біяграфіі народнага паэта, які быў вельмі цесна звязаны з жыццём свайго

народа, не будзе як след асветлена. Праўда, у апошні час зацікавіўся зборам успамінаў тутэйшых старажылаў ураджэнец гэтых мясцін літаратар Леанід Пракопчык, які шмат цікавага расказаў пра радзіму Янкі Купалы ў кнізе «Даўгінаўскія вёрсты», што выйшла ў 1977 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Толькі пабываўшы ў Акопах, у вакольных вёсках, пагутарыўшы з людзьмі, я зразумеў, чаму так цягнула сюды заўсёды Янку Купалу. Гэта ж тут яго «родны кут», тая «малая радзіма», якая стала для яго ўвасабленнем усёй Беларусі. Як вядома, Янка Купала толькі нарадзіўся ў Вязынцы, пажыўшы там усяго да года. Ужо ў 1883 годзе Луцэвічы перабраліся ў Юзэфова, а потым у суседняе Косіна цяперашняга Лагойскага раёна, папрацаваўшы там да 1889 года. Праз два гады, паспытаўшы хлеба з чужога поля ў Сенніцы і Мінску, зноў вярнуліся сюды, на Лагойшчыну — у фальварак Прудзішча, дзе сядзелі да 1895 года. Прудзішча ад Акопаў — за якіх-небудзь 5-6 кіламетраў. У 1895 годзе мы бачым Луцэвічаў у Селішчы, ад якіх да Акопаў — рукой падаць. Прудзіцца, Селішча, Акопы — гэта ж, па сутнасці, адна мясціна, якую абжывалі Луцэвічы каля чатырох дзе сяткаў гадоў! Нездарма ж Даўгінаўскі гасцінец, якім ездзіў Янка Купала сюды, да мацеры, з Мінска ці адкуль бы там ні было, паэт называў «родным» («Знаёмы гэты шлях мне родны — Даўгінаўскі вядомы шлях!»).

Тут, на невялікім абшары «камяністай», «гары стай» лагойскай зямлі, было ўсё для Янкі Купалы дарагім і блізкім, тут — усе вобразы і тэмы яго твораў. І калі паэт кажа ў сваёй аўтабіяграфіі, што такія найбольш буйныя і значныя творы, як «Адплата кахання», «Раскіданае гняздо», «Паўлінка», «Прымакі», «Тутэйшыя», «Зімою», «Сват», «Страх», «За што», ён напісаў «з жыццёвых фактаў», то трэба разумець, што гэтыя факты ён узяў якраз у сваіх родных мясцінах. Распытайце людзей з вёсак, якія акаляюць Акопы, і вам раскажуць ці не пра ўсіх прататыпаў купалаўскіх герояў. Напрыклад, пра тое, што Сцяпан Крыніцкі з камедыі «Паўлінка» — гаспадар недалёкага ад Акопаў хутара Рубеж Гіляры Аўлачынскі, што Якім Сарока — не хто іншы, як вандроўны настаўнік Мечыслаў Багдановіч з хутара Верацейка што ў аснове драмы «Раскіданае гняздо» — рэальныя падзеі з недалёкай вёскі Прытыкі, дзе быў гаспадар, якога пан выгнаў з зямлі, што ў паэме «Нікому» таксама расказваецца пра сапраўдны выпадак, пачуты паэтам у адной з вёсак пад Тайнай. Многія творы Янкі Купалы заснаваны на мясцовых паданнях, казках, песнях, якія добра ведаў паэт, якія збіраў і запісваў. У кнізе «Пуцявінамі Янкі Купалы» (1981) яе складальнік Г. В. Кісялёў змясціў цікавы дакумент — камандзіровачнае пасведчанне ад 17 чэрвеня 1921 г.,

выдадзенае І. Д. Луцэвічу «ў тым, што ён камандзіруецца на хутар Акопы Радашковіцкай воласці для збірання ў раёне воласцей Радашковіцкай, Гайна-Слабадской і Бяларуцкай Мінскай губ. этнаграфічнага матэрыялу, які датычыцца народнай творчасці, а канкрэтна: запісванне песень, казак і г. д., а таксама адшукванне і набыццё рэдкіх кніг і рукапісаў». Зем лякі паэта добра помняць, як ён запісваў па вёсках разам з настаўнікам Васілём Рынковічам мясцовы фальклор. Сястра Рынковіча — Анастасія Рынковіч з Вудаў — прыгадвае тры сшыткі з фальклорнымі запісамі, якія рабілі Янка Купала і яе брат...

Акопы былі для Янкі Купалы тым жа, што Міхайлаўскае для А. С. Пушкіна, Тарханы — для М. Ю. Лермантава, Спаскае-Лутавінава — для І.С. Тургенева, Ясная Паляна — для Л. М. Талстога, Меліхава — для А. П. Чэхава, Мікалаеўшчына — для Якуба Коласа. Усе гэтыя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю выдатных людзей, сталі сапраўды народнымі святынямі, куды людзі ідуць не толькі для таго, каб ушанаваць іх памяць, пакланіцца іх генію, але і перанесціся ў атмасферу творчасці выдатных пісьменнікаў, убачыць яе вытокі, а значыць, і лепш зразумець яе. Як гэта ні дзіўна, але вытокі творчасці нашага вялікага паэта Янкі Купалы мы па сённяшні дзень не можам паказаць свету, самім сабе. Ці не таму, што мы проста не ўяснілі для сябе, якія мясціны лічыць «малой радзімай» паэта, яго сапраўднай калыскай.

Так, у нас вельмі многа зроблена і робіцца для ўшанавання памяці народнага песняра, у тым ліку мясцін, звязаных з яго біяграфіяй. Створаны цудоўны Літаратурны музей Янкі Купалы ў Мінску, там, дзе стаяла перад вайной хата паэта, філіял музея ў Вязынцы, месцы яго нараджэння, другі філіял у Л яўках, дзе была дача песняра. Усё гэта вельмі добра. Але непараўнальна большае значэнне, чым, скажам, Ляўкі, мела для Янкі Купалы тая зямля, якая ўзгадавала яго, надзяліла яго вялікім дарам паэта, дзе кожны ўзгорак і камень, палетак і пералесак, ручай і дрэва звязаны з яго бессмяротнымі творамі.

Думаецца, нашай грамадскасці варта б было падумаць над стварэннем тут мемарыяльнага комплексу, каб паказаць вытокі творчасці вялікага паэта. Для гэтага — вядома, не адразу, недзе ў перспектыве — неабходна перш за ўсё ўзнавіць дом мацеры паэта ў Акопах. Так, гэта не проста. Тут цэлы шэраг розных складанасцяў. Але іх, я ўпэўнены, можна пераадолець. Тым больш што ў краіне назапашаны ўжо немалы вопыт узнаўлення разбураных, зруйнаваных сядзіб, звязаных з імёнамі выдатных людзей. Як вядома, двойчы ўзнаўляўся дом А. С. Пушкіна ў Міхайлаўскім (першы раз ён згарэў у 1919 г. і зноў адбудаваны ў

1937 г., у другі раз дом спапяліла вайна, і ўзноўлены ён быў у 1949 г.), згарэў і зноў быў адбудаваны дом М. Ю. Лермантава ў Тарханах. З руін былі ўзняты сядзібы Рэпіна ў Пенатах, Чэхава ў Меліхаве, Тургенева ў Спаскім-Лутавінаве. Не вельмі даўно з-за неабдуманасці будаўнікоў быў разбураны, але хутка адбудаваны нанова дом Грыбаедава ў Маскве — у гэтым доме цяпер музей выдатнага рускага пісьменніка.

Колькі гадоў назад «Литературная газета» змясціла артыкул П. Вайнштэйна «Болдзінскі ўрок» з вельмі яскравым падзагалоўкам: «На памылках вучацца... але ці не лепш пазбягаць іх». У артыкуле ішла гаворка аб недапушчальнай безадказнасці да зберажэння пушкінскага запаведніка ў Болдзіне, што прыводзіла да яго разбурэння. Толькі дзякуючы ўмя шанню Дзяржкамітэта па грамадзянскаму будаўніцтву і архітэктуры пры Дзяржбудзе СССР пачалося ўзнаўленне пушкінскай святыні. Савет Міністраў РСФСР зацвердзіў цэлы шэраг помнікаў музея-за наведніка, якія павінны быць узноўлены і рэстаўрыраваны на працягу 1982-1990 гадоў. Згодна з новым праектам, развіццё раённага цэнтра Вялікае Болдзіна прадугледжана за межамі гістарычнай часткі сяла, звязанага са знаходжаннем у ім Пушкіна. Пабудовы, якія перашкаджаюць запаведніку, намечана знесці, а зруйнаваную па непаразуменню царкву, пабудаваную дзедам паэта, узнавіць. Аб'ектамі музейнага паказу стануць, апрача галоўнага дома з экспазіцыяй аб жыцці і творчасці паэта і кухня, канюшня, лазня. У былой прыгонніцкай канторы будзе разгорнута экспазіцыя аб быце прыгонных сялян, а ў памяшканні царквы — пра падзеі рускай гісторыі і ўдзеле ў іх сваякоў А. С. Пушкіна. На сядзібе сына паэта, у сяле Львоўка, можна будзе пазнаёміцца з экспазіцыяй «Народ у творчасці А. С. Пушкіна». Пралягуць і пешыя, і аўтамабільныя маршруты для турыстаў не толькі па Болдзіне, але і ў запаведны гай Лучыннік, што, як гаворыцца ў артыкуле, нашэптваў паэту вершы, а таксама ў іншыя навакольныя сёлы і вёскі, якія помняць Пушкіна. Вернута будучыня і пушкінскаму Кісцянёву, вёсцы, якую мясцовыя праекціроўшчыкі былі ўключылі ў спіс неперспектыўных. Міністэрству сельскай гаспадаркі РСФСР сумесна з Горкаўскім аблвыканкомам даручана забяспечыць будаўніцтва сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, жылых дамоў і аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння не толькі ў Кісцянёве, але і ў Вялікім Казарынаве, Чарноўскім, Апраксіне, Новай Слабадзе — населеных пунктах, неадрыўных ад музея-запаведніка.

Вось якая грандыёзная работа распачата па адной толькі памятнай мясціне, звязанай з імем вялікага рускага паэта.

Думаецца, «.болдзінскі ўрок» і нас павінен нечаму навучыць.

Навучыць, як па-сапраўднаму, па-дзяржаўнаму ставіцца да ўшанавання славутых людзей радзімы. Што датычыцца Акопаў, то на добры толк тут неабходна б было аднавіць усю сядзібу Луцэвічаў — з калодзежам, лазняй, гаспадарчымі пабудовамі. Дарэчы, некаторыя з гэтых пабудоў як тыповыя для тутэйшых мясцін можна б было перанесці з навакольных вёсак: усё ж шмат якія з іх яшчэ захаваліся. Трэба ўлічыць, што яны, апрача ўсяго, маюць вялікую каштоўнасць і як этнаграфічныя помнікі. У мемарыяльны купалаўскі комплекс трэба б было ўключыць і ўпарадкаваць астравок сядзібы Луцэвічаў у Селішчы, рэшткі іх сядзібы ў Прудзішчах, а таксама нейкім чынам адзначыць дом у Малых Бясядах удзельніка паўстання 1863 г. С. Чаховіча, які ўпер шыню пазнаёміў Янку Купалу з рэвалюцыйнай літаратурай, сядзібу Аўлачынскіх у Айчызне і Харужанцах і іншыя выяўленыя і не выяўленыя яшчэ пакуль помнікі, звязаныя з біяграфіяй вялікага паэта.

І, вядома ж, у гэты комплекс вельмі натуральна ўвайшла б і сядзіба літаратурнага настаўніка і сябра Я. Купалы, аднаго з пачынальнікаў беларускай прозы Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага) у вёсцы Карпілаўка, да якой ад Акопаў нейкіх паўтара кіламетра. Янка Купала лічыў яе сваёй вёскай, ведаў усіх яе людзей, пісаў пра яе (гэта аб ёй, напрыклад, радкі: «Хаты тыя, хаты, дзіркі на страсе, з печы дым не ў комін, а пад столь нясе...» і г. д.). У Карпілаўцы поўнай мерай браў Я. Купала матэрыял для сваёй творчасці. Мясцовая калгасніца Грыпіна Гаеўская расказвала (яе расказ запісаў Алесь Матусевіч; гэтыя запісы захоўваюцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы): «Колькі я яму ў полі жніўных песень наспявала. Бывала, сядзе на камень, услухаецца, як мы спяваем, і ўсё нешта з Антонам Лявіцкім гаворыць і запісвае...» Калі казаць пра Ядвігіна Ш., то гэта якраз ён дапамог Янку Купалу выйсці на шлях літаратуры, вызначыць яму месца ў жыцці. Аб гэтым сведчыць сам паэт: «У 1904-1906 гг., не помню ў якім годзе канкрэтна, я пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. (жылі мы па суседству). Гэта было для мяне вялікай падзеяй, таму што я ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску. З Ядвігіным Ш. я вельмі зблізіўся. Ён многа расказваў пра незнаёмыя мне тады пісьменніцкія справы і т. п. ...» У Карпілаўцы, у гасцях у Ядвігіна Ш. бывалі Змітрок Бядуля, бацькі якога жылі зусім недалёка, у мястэчку Пасадзец зноў жа цяперашняга Лагойскага раёна, і Максім Багдановіч.

Відаць, адной са складанасцей стварэння купалаўскага мемарыяльнага комплексу можа быць тое, што Акопы — цяпер бязлюдная паляна, закінутая сярод лясоў і ўзгоркаў. Але ж такая акалічнасць адначасова можа і аблегчыць справу: як-ніяк, у гэтым

цудоўным, зацішным куточку Лагойшчыны з яе маляўнічымі лясамі і пералескамі, далінамі і ўзгоркамі (дарэчы, побач з Акопамі — адна з дзвюх самых высокіх кропак Беларусі Лысая Гара) можна б пабудаваць, напрыклад, які-небудзь дом адпачынку ці піянерскі лагер. Словам, захацеўшы, нейкае рашэнне праблемы можна знайсці абавязкова.

Паколькі помнікі, якія б маглі ўвайсці ў мемарыяльны комплекс «Акопы», не захоўваюцца, разбураюцца і далей, трэба ўжо цяпер, відаць, прыступіць да першапачатковай работы над арганізацыяй гэтага комплексу. Ініцыятарам тут мог бы стаць Літаратурны музей Янкі Купалы. Думаецца, ужо сёння, не чакаючы якой-небудзь арганізацыйнай пастановы, музею варта б было выявіць і апісаць купалаўскія помнікі родных мясцін паэта, зрабіць як мага падрабязнейшае апісанне дома Бянігны Іванаўны ў Акопах, гаспадарчых будынкаў — дзеля гэтага трэба паспяшацца распытаць усіх тых, хто добра ведаў сядзібу.

У сваёй кнізе нарысаў «Время собирать камни» вядомы рускі пісьменнік Уладзімір Салаухін, горача выступаючы за аднаўленне на беразе Волхава «безнадзейна знішчанай, сцёртай з твару зямлі» сядзібы Г. Р. Дзяржавіна Званкі, ад якой не засталося нават планіроўкі, пераканаўча паказаў, што ўсё ж затраты на яе адбудову не толькі хутка акупяцца матэрыяльна (калі там будзе адкрыты турысцкі маршрут), але — што яшчэ больш важна — акупяцца таксама «ў іншых, нематэрыяльных адносінах», намнога ўзбагаціўшы ўсіх нас духоўна; прычым затраты ў такім сэнсе «будуць акупляцца на працягу стагоддзяў». Усё гэта можна сказаць і ў дачыненні да Акопаў. Аднаўленне гэтай купалаўскай святыні дапаможа ўсім нам ва ўсёй яснасці ўбачыць глыбінныя карані вызваленчай барацьбы нашага народа, сапраўдным голасам якога, магутным і непадкупным, быў Янка Купала, дапаможа зразумець вытокі неўміручай паэзіі вялікага песняра Беларусі.

Ужо недзе пасля паездак у купалаўскія мясціны я даведаўся, што на камені Янкі Купалы ў Акопах Міністэрствам культуры БССР устаноўлены мемарыяльны знак. На вялікай мармуровай пліце золатам зяюць вельмі характэрныя словы з верша Янкі Купалы:

Песню стварыці лену, як неба,
У кожнай з ёй хаце быць мілым гасцём...
Гэтакіх толькі скарбаў мне трэба,
Гэткім я толькі жыву пачуццём.

Хай жа будзе гэты знак першым каменем у падмурак вялікага

мемарыяльнага комплексу на радзіме Янкі Купалы.

РАДЗЬКАЎШЧЫНА

У сваім падарожжы па купалаўскіх мясцінах я выпадкова натрапіў на зусім новую, невядомую дасюль назву, звязаную з юнацтвам песняра. Гэта — Ра дзькаўшчына.

У лісце да Л. М. Клейнбарта ад 23 лістапада 1927 года Янка Купала, расказваючы пра сваё жыццё, не мінае, вядома, і гадоў юнацтва, вучобы. На жаль, звесткі пра гэты надзвычай важны перыяд яго біяграфіі вельмі скупыя, тут ёсць шмат няяснага, так і не высветленага да сённяшняга дня. Ёсць у лісце такія радкі: «...З таго ж Прудзішча бацька аддаў мяне да яго сваякоў на хут. Мачаны, які межаваў з фальв. Казімірава Самойлы (дырэктара Мінск, рэальн. вучылішча). Сын Самойлы Уладзімір Іванавіч рыхтаваў мяне ў рэальнае вучылішча...»

Што ж гэта быў за хутар? Да якіх канкрэтна сваякоў аддалі тады бацькі маладога Купалу?

Нідзе ў друку я пра гэта не чытаў. Нават у кнізе Янкі Шарахоўскага «Пясняр народных дум» (1970) — самай поўнай пакуль што і, як гаворыцца ў анатацыі да яе, «першай навуковай» біяграфіі паэта.

Я вырашыў наведацца ў тыя мясціны.

Памянёныя паэтам Мачаны аказаліся не хутарам, а даволі ладнай вёскай Бяларуцкага сельсавета Лагойскага раёна. Вёскай яны былі і ў часы юнацтва Купалы. Хутар жа, дзе жылі яго сваякі, быў за кіламетр адсюль і называўся Радзькаўшчына.

Чаму ж Купала пісаў «хутар Мачаны»? Хутчэй за ўсё таму, што ён адміністрацыйна адносіўся да гэтай вёскі.

Хутар Радзькаўшчына быў у маляўнічым куточку Міншчыны. Каля самых пабудоў пятляла крынічная Вяча, зелянелі травяністыя лугавіны рачной поймы.

З другога боку да сядзібы падступаў хвойнік. Сёння ад хутара нічога не засталося. Цяпер гэта бераг вадасховішча Вяча — улюбёнае месца адпачынку мінчан.

Гаспадаром хутара быў Януары Дамашэвіч, які ажаніўся з Садаліяй — роднай сястрой Дамініка Луцэвіча, бацькі паэта. Якраз у яе, цёткі, і жыў нейкі час малады Купала, цярэбячы нялёгкі шлях у навуку.

Мне хацелася больш падрабязна даведацца пра маладосць

паэта, пра сям'ю Дамашэвічаў, пра ўсё, што яго звязвала з ёю.

У Мачанах я сустрэў 82-гадовага Кастуся Дзядзюлю, які жыў некалі на суседнім з Дамашэвічамі хутары. Ён добра ведаў іх, бываў у іхняй хаце. Помніць самога Януарыя Дамашэвіча, які «памёр з нагі — калена распухла», памятае ягоных дзяцей. Ведаў Дзядзюля і самых блізкіх суседзяў Дамашэвіча — Самойлаў і іх дзяцей таксама: Уладзіміра Іванавіча, якога ён называе Валодзькам, а таксама Шурку і Маню.

Я ўжо і не спадзяваўся знайсці сведкаў Купалавай маладосці — як-ніяк, з таго часу, калі тут бываў Янка, мінула восем дзесяткаў гадоў. Шукаць гэтых людзей трэба было хаця б на паўвека раней. Але, аказваецца, цуды ёсць на свеце! Зусім выпадкова я даведаўся, што ў Мінску жывуць аж тры стрыечныя сястры Купалы — дочкі тых самых Садаліі і Януарыя Дамашэвічаў, у якіх знайшоў сабе прытулак малады Янка.

І вось разам з супрацоўнікамі Літаратурнага музея Янкі Купалы я сярод сясцёр паэта — на кватэры адной з іх. (Як гэта ні дзіўна, але да сённяшняга дня ніхто нават не пацікавіўся імі, не распытаў іх пра сустрэчы з Купалам). Хоць усе яны даволі сталага веку (Леанідзе Янушкевіч — 73, Сцепанідзе — 86, а Соф'і — 90 гадоў), аднак выглядаюць яшчэ няблага — бадзёрыя, гаваркія. У Дамашэвічаў былі яшчэ тры сыны — Казя, Юзя і Анцік, а таксама дачка Маня. З іх жывы толькі Анцік, але пабачыцца з ім не давялося: яшчэ да вайны ён пасяліўся ў Польшчы.

Дзве малодшыя сястры — Леаніда і Сцепаніда (ці Лёня і Стэфа, як іх звалі ў маладосці) — сустракаліся з Купалам больш тады, калі ён жыў у Мінску. Але помніцца ім (хоць, праўда, цьмянавата) і малады Купала. Магчыма, з успамінамі тут пераплялiся і расказы старэйшых з сям'і: у сясцёр склалася пра яго ўражанне, як пра «смешнага», «жартаўлівага». Паводле іх успамінаў, любіў ён пажартаваць, пасваволіць. «Набярэ вады ў збан і давай аблівацца...» Або пра адносіны Купалы з іх бацькам, Януарыем Дамашэвічам, які чамусьці баяўся ракаў: «Улезе Янка ў рэчку, вышчупае рака і бяжыць: «Я пакажу дзядзьку, дзе ракі зімуюць!..»

Згадкі гэтых дзвюх сясцёр з даволі цікавымі дэталямі — і пра маладыя, і пра сталыя гады паэта — я запісаў на магнітафоне, які прыхапіў з сабой.

Але асабліва цікавыя ўспаміны старэйшай з сясцёр — Соф'і Янушкевіч, якую некалі звалі Зося, Зоська. Ёй добра запомніўся малады Купала, якога ў сям'і Дамашэвічаў вельмі любілі: «Харошы быў, мілы, няхітры...» Жыў ён у іх, аказваецца, не толькі тады, калі Уладзімір Самойла рыхтаваў яго да паступлення ў Мінскае рэальнае вучылішча, але і ў час вучобы ў Бяларускім

народным вучылішчы зімой 1897-1898 гадоў. Разам са старэйшым сынам Казем, з якім сябраваў Янка, адвозіла яго туды Садалія на фурманцы. Добра запомнілася Соф'і Янураўне, як Янка пасвіў коней, як хадзіў разам з ёй у грыбы, больш у рыжыкі, што раслі ў недалёкім хвойніку, як забаўляўся ён з дзецьмі на Вячы. Засталося ў памяці, як Янка прасіў яе, Зоську, паклікаць малых дзяўчатак з суседняга хутара — дачок урача Каборды. Хлопец штосьці пісаў на паперках, скручваў іх і, пускаючы на рэчку, казаў дзяўчаткам, каб яны пераймалі іх і дазнаваліся пра сваё шчасце.

Ніколі не забудзе Соф'я Янураўна, як — пазней ужо — падтрымліваў яе Купала, калі муж, Іван Белановіч, пайшоў на вайну — на першую імперыялістычную. Жанчына засталася з двума дзяцьмі на руках, а трэцім хадзіла. Купала наведваў яе ў Сілінцы — вёсцы паблізу Лагойска, куды яна выйшла замуж, дапамагаў, чым толькі мог. Калі аднойчы ў роспачы яна хацела атруціцца, Янка Купала адабраў у яе бутэльку з воцатам і аднёс схаваць суседзям Драздовічам. Нездарма ж у яго гонар Соф'я Янураўна і сына свайго назвала Янкам.

Прыгадала Соф'я Янураўна і бацькоў Купалы. Пра бацьку яго, якога яна называе Дбмінік, гаворыць: быў ён з «бакамі, нябрыты», «сярэдне высокі», «хазяйскі быў». Маці паэта была «нізкаватая», «вясёлая», «харошая», «спакойная». Вучыла Зосю вязаць карункі — добра валодала гэтым рамяством.

Але асабліва ўрэзаўся ў яе памяць адзін эпізод, надзвычай важны, на мой погляд, для разумення маладога Купалы — калі Янка адыходзіў «у людзі». У памянёным вышэй лісце да Л. М. Клейнбарта паэт гаворыць пра гэта вельмі скупа: «Пасля смерці бацькі давялося мне самому заняцца гаспадаркай, але яна хутка пачала мне надакучваць, бо трэба было працаваць на памешчыка, уладальніка той зямлі, якую я павінен быў араць і засяваць. І вось у 1903 г., здаецца, я пайшоў на службу...» Пакінуць зямлю Купалу падштурхнулі сямейныя няшчасці, прычынай якіх ён лічыў «беспрытульнае, поўнае розных нягод, бадзяжнае жыццё» па чужых арэндах — яму «страшна было думаць пра будучыню» (ліст да Л. М. Клейнбарта ад 1910 г.).

Купала стаяў тады перад выбарам: або аддаць усяго сябе бясконцай падняволынай працы на чужым полі дзеля кавалка хлеба, або, вырваўшыся з кабалы, пракладваць сваю ўласную дарогу ў жыцці, змагацца за разняволенне ўсяго народа.

Выбраў ён, як вядома, апошняе.

Але, аказваецца, парваць з усталяваным жыццёвым укладам сям'і было далёка няпроста. Мацеры, якая заставалася на гаспадарцы з дочкамі, цяжка было зразумець сына — адзінага на той час мужчыну ў сям'і.

Увесь драматызм адыходу Купалы ў свет і перадае расказ Соф'і Янураўны. Янкаў адыход тады настолькі ўразіў дзяўчынку, што і цяпер, на старасці, яна не можа расказаць пра гэта без слёз. (Ці не таму і захоўвала ў памяці амаль 80 гадоў усе звязаныя з ім дэталі?)

Соф'я Янураўна прыгадвае, як хтосьці з сям'і Луцэвічаў (спачатку яна гаворыць «дзядзька», г. зн. Купалаў бацька, але потым прыпамінае, што яго ўжо тады не было жывога) прыехаў да яе бацькоў у Радзькаўшчыну з просьбай дапамагчы ўгаварыць Янку не пакідаць дома. Луцэвічы прасілі дапамогі ў Дамашэвічаў недарэмна: Янка вельмі шанаваў іх. «Ён болей бываў у нашых, як дома... Мая матка была больш аддана яму, чым сыну... Вельмі любілі яны адзін аднаго...»

І вось бацька і маці Соф'і Янураўны, узяўшы з сабой і яе, тады дзяўчынку Зоську, выправіліся на падводзе да Луцэвічаў — відавочна, у Селішча (сама расказчыца не магла ўжо гэта прыпомніць).

З яе памяці не сцерліся нават дробныя дэталі, звязаныя з той паездкай. Добра запомнілася зусім немалаважнае для ўражлівай дзяўчынкі адно здарэнне ў дарозе. За Бяларучамі, у вялікім лесе раптам «захрапла кабыліца». Бацька сказаў ім, каб моцна трымаліся за калёсы. Тут выскачыў на дарогу воўк і — «прама за пыскі кабыліцу... Сяк-так абараніліся. Як пусціў бацька гэту кабыліцу, дык ледзь мы выдзержалі».

Калі прыехалі да Луцэвічаў, «кабыліца была ўся ў пене». Выйшлі гаспадары з хаты і «ўсе проста ўтаропіліся: што такое, што вы пабялеўшы нешта?..». Спачатку аж не маглі слова сказаць, так былі напужаны і задыханы.

Супакоіўшыся, селі за стол. І пачалі ўгаворваць Янку не кідаць гаспадарку. «А ён адно: дарэмна вы мяне мучыце і самі мучыцеся».

Назаўтра, пераначаваўшы, ізноў узяліся за ўгаворы, але хлопец паўтараў: «Не мучце сябе і не мучце мяне». «Мы яго вельмі жалелі, што ён адходзіў... Сядзелі, заплакалі. Добра паплакалі». Так і паехалі назад, не ўгварыўшы Янку.

— Назаўтра, — працягвае расказ Соф'я Янураўна (перадаю яго даслоўна), — ён прыйшоў з дому, на наш хутар (ён і казаў: я заўтра буду ісці). Ну, мы глядзелі... Ад нас з вакна было відаць, як ён з дарогі паверне на мост... Так помніцца мне ўсё гэта!.. «Каб ён, не дай бог, у рэчку не ўсунуўся...»— так гавораць мае бацькі. І пайшоў бацька з маткай на сустрэчу... Стаялі, глядзелі, пакуль ён мост пройдзе. Прайшоў! Ідзе! Прыйшоў у хату... «Што ж ты надумаўся-такі?..» — «Я вам і гаварыў, што не буду думаць другога, а буду думаць пайсці. Я вам, — кажа, — і гаварыў, як вы

выязджалі, што я прыйду да вас. Але ў вас не буду і да бацькоў не буду нейкі час варочацца. Нейкі час. — Ён так і сказаў: — Нейкі час варочацца...»

Соф'я Янушараўна прыгадвае, як яе бацькі, убачыўшы, што адгаварыць Янку немагчыма, збіралі яго ў дарогу (хоць Луцэвічы і прасілі іх нічога не даваць хлопцу з сабой: думалі, так ён хутчэй адумаецца): — Мама папытала, нябожчыца: «А што ты ўзяў з сабой?» — «Нічога я не браў і ў вас браць не буду». Паглядзеў бацька мой у яго кішэнях, прагледзеў усе яго рубчыкі — можа, яму далі грошы... Мама кажа: «Ты ж памрэш у дарозе, ты ж нічога не ўзяў, грошай пры табе няма...» Пераначаваў. Плачам мы ўсе па ім. Ён такі харошы быў, мілы. Ну што ж рабіць, што рабіць? Падышоў тата да маткі: «Як ты яго будзеш адпраўляць, галоднага? Трэба даць з сабой хоць трохі». Мама ўзяла торбачку палатняную — беленькая, чысценькая была... Вяндліны, сухой кілбасы палажыла! І палажыла во такія — як цяпер магу адмераць — кускі сала... Паглядзеў ён, узяў гэту торбачку — і да маткі: «Цётачка, забяры гэтае сальца, аднясі назад: торбачка мокрая зробіцца ад сала, пацячэ яшчэ, як цёпла стане... Лепш мне сушэйшай вяндлінкі падлажы... на месца гэтага...» Так і зрабілі. Тады бацька падазваў матку: «А ты грошай яму не дала?» — «У цябе ж грошы, я ж табе гаварыла: дай трохі на дарогу». Пайшоў бацька... дастаў грошы, даў яму некалькі: «Глядзі ж толькі, каб не загінуў дзе... Старайся вярнуцца чым скарэй — каб мы на цябе паглядзелі...» З гэтым ён і пайшоў ад нас.

Праз нейкі час, расказвае далей Соф'я Янушараўна, Янка прыслаў ім пісьмо. Пра што ён пісаў, яна, вядома, не помніць. Але ў памяці назаўсёды засталася адна страфа верша, які быў у гэтым пісьме:

Бацька на калодцы
Смолку рассякае,
Матка на камінку
Агонь раскладае.

Не можа не зацікавіць нас і расказ сясцёр пра сваіх бацькоў, якіх гэтак любіў Янка Купала. Маці іх, Садалія, жыла ў беднасці, асабліва да замужжа. Калі была дзяўчынай, не мела нават «людскага плац ця»: было толькі адно — і на будзень, і на свята. Пражыла яна каля трыццаці трох гадоў. Памерла з няшчаснага выпадку: ехала на падводзе, конь спу дзіўся, яна вывалілася з калёс, моцна пабілася — а была ж цяжарная. Сканала ў бальніцы ў Мінску. Пасля яе асталося сямёра дзяцей. Бацька, Яну ары Дамашэвіч, хадзіў удаўцом чатыры гады, потым ажаніўся. Калі

пачалася калектывізацыя, уступіў у калгас «Чырвоны сцяг» у вёсцы Дафарэнцыя. Памёр у 1930 годзе. Ён вельмі любіў дзяцей. У двары зрабіў для іх арэлі. Пагушкацца на іх часта прыбягалі з недалёкіх Бараўцоў, куды пераехалі Луцэвічы, родныя сёстры Янкі Купалы Марыя і Анця...

Жывуць яшчэ сярод нас сучаснікі Янкі Купалы, блізкія яму людзі, якія ведалі яго, сустракаліся з ім. Чаму б нам не распытаць іх усіх, не запісаць падра бязныя ўспаміны? Кожная іх згадка дапамагла б нам намаляваць жывы вобраз вялікага паэта, адчуць ат масферу яго памкненняў і пошукаў, лепш зразумець неўміручую купалаўскую паэзію.

1980-1983

1 - Тут і далей «зорачка» азначае, што пераклад мой. Аўтар.►

2 - Людовік Дзюба — магчыма, адзін са школьных таварышаў ці настаўнікаў Яна Чачота і Адама Міцкевіча.►

3 - Контэнт (пол.) — давольны.►

4 - Мешкаюць (пол.) — жывуць.►

5 - Ліцвіне, літвіны — так называлі ў тыя часы і літоўцаў, і беларусаў па імені агульнай для іх феадальнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага; тут ідзе гаворка пра беларусаў.►

6 - Назоліць — напэўна, назаляць.►

7 - Віленка — Вільня.►

8 - Маскалі — царскія салдаты.►

9 - Схэндожыць (польск.) — саб'е, скосіць.►

10 - Заўшэ (польск.) — заўсёды.►

11 - Піндар — старажытнагрэчаскі паэт, класік харавой лірыкі.►

12 - In crudo (лац.) — у першапачатковым выглядзе, ва ўсёй непасрэднасці.►